ARCHE Зьмест № 3’03 PAX AMERICANA

1. Зьмест / Уводзіны
2. Прадмова да ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
3. Бясконцая вайна за мір. Аляксандар Батура ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
4. Толькі ў Амэрыцы. Норман Мэйлер ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
5. Новы Сьвет, абяцаны Амэрыкай. Руслан Хестанаў у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
6. Расколіна расьце. Міхаэль Фройнд у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
7. Мультылатэралізм або гегемонія ЗША? Аліна Бельская ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
8. Сьвет пасьля вайны. Вера Рыч у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
9. Ірацкі каталізатар: Польшча-Амэрыка-Эўропа. Юрась Ліхтаровіч у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
10. Апытаньне ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
11. Навошта Лукашэнку новая ідэалёгія. Нерыюс Прэкявічус у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
12. Ідэалёгія альбо пісьменнасьць: беларускае грамадзтва на раздарожжы. Юры Чавусаў у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
13. Круглы стол у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
14. Гісторыя, памяць і фармаваньне нацыяў на постсавецкай каляніяльнай прасторы. Тарас Кузё ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
15. Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі. Віталь Сіліцкі ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
16. Купіць дом у Італіі. Марыя Вайцяшонак у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
17. Лірыка Юрася Пацюпы ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
18. Лірыка Гюнтэра Граса ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"

19. Лірыка Альгерда Сташэвіча ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
20. Дзённік 1998. Вячаслаў Адамчык у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
21. З жыцьця ня выкрасьліць нічога. Валянцін Тарас у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
22. Рэйд у ружовым маскхалаце. Сяргей Шыдлоўскі ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
23. Лісты Ларысы Геніюш да Міколы Ермаловіча ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
24. Дзе другі рукапісны зборнік вершаў Лясное Кветкі? Анатоль Сідарэвіч у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
25. Мастацтва пэрформансу ў Беларусі: Frequently Asked Questions. Гальляш Сьвірын у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
26. Гаруншчына. Ігар Карашчанка ў ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
27. Што трэба ведаць кожнаму беларусу: удакладненьні. Уладзімер Ляхоўскі, Валеры Пазьнякоў у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
28. “Архіпэляг постмадэрн”, або Аналізу халодная сьляза. Сяргей Балахонаў у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"
29. Gloriosae Memoriae: Памяці Аляксандра Крывенкі. Валер Булгакаў у ARCHE 3(26)-2003. "PAX AMERICANA". "…"

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (26) – 2003**

[image]

[image]

[image]

[image][image]2003

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]
[image]

З ь м е с т

Прадмова
Pax Americana
Аляксандар Батура. **Бясконцая вайна за мір**
Норман Мэйлер. **Толькі ў Амэрыцы**
Руслан Хестанаў. **Новы Сьвет, абяцаны Амэрыкай**
Міхаэль Фройнд. **Расколіна расьце**
Аліна Бельская. **Мультылятэралізм або гегемонія ЗША?**
Вера Рыч. **Сьвет пасьля вайны**
Юрась Ліхтаровіч. **Ірацкі каталізатар: Польшча-Амэрыка-Эўропа**
апытаньне «Arche»
Ці добра ўчынілі адраджэнцы канца 80-х, зрабіўшы выбар на карысьць “тарашкевіцы”?
Беларусь сёньня
Нерыюс Прэкявічус. **Навошта Лукашэнку новая ідэалёгія**
Юры Чавусаў. **Ідэалёгія альбо пісьменнасьць: беларускае грамадзтва на раздарожжы**
мэдыі
Круглы стол: новы паліталягічны часопіс
палітыка
Тарас Кузё. **Гісторыя, памяць і фармаваньне нацыяў на постсавецкай каляніяльнай прасторы**
Віталь Сіліцкі. **Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі**

гісторыі
Марыя Вайцяшонак. **Купіць дом у Італіі**
лірыка
Юрася Пацюпы*, *Гюнтэра Граса* і *Альгерда Сташэвіча.
запісы
Вячаслаў Адамчык. **Дзёньнік 1998**
успаміны пра XX стагодзьдзе
Валянцін Тарас. **З жыцьця ня выкрасьліць нічога**
рэцэнзія
Сяргей Шыдлоўскі. **Рэйд у ружовым маскхалаце**
ліставаньне
Лісты Ларысы Геніюш да Міколы Ермаловіча
архіў
Анатоль Сідарэвіч. **Дзе другі рукапісны зборнік вершаў Лясное Кветкі?**
беларуская думка
Гальляш Сьвірын. **Мастацтва пэрформансу ў Беларусі: Frequently Asked Questions**
беларускі сьвет
Ігар Карашчанка. **Гаруншчына**
спавешчаньні
Уладзімер Ляхоўскі, Валеры Пазьнякоў. **Што трэба ведаць кожнаму беларусу: удакладненьні**
водгук
Сяргей Балахонаў. **“Архіпэляг постмадэрн”, або Аналізу халодная сьляза**
Gloriosae Memoriae
Валер Булгакаў. **Памяці Аляксандра Крывенкі**

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/07/05**
[image]

[illegible]ізм

[image]
ARCHE Пачатак № 3 (26) – 2003
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[illegible] [illegible] [illegible] [

Нягледзячы на гэтыя прыкрасьці, дзясяткі ўрадаў і мільёны людзей на ўсім сьвеце падтрымліваюць дзеяньні ЗША і салідарызуюцца зь імі. Ня толькі таму, што спадзяюцца ў выніку апынуцца ў больш стабільным, больш кіраваным і прадказальным сьвеце, у якім будзе больш ладу і спакою. Палітыка ЗША служыць ня толькі амэрыканскім нацыянальным інтарэсам, але і спрыяе глябальнаму зацьверджаньню прыватнай уласнасьці, асабістых свабодаў, юдэяхрысьціянскага рацыянальнага сьветапогляду, што ўрэшце адпавядае індывідуальным і калектыўным чаканьням мільярдаў людзей, у тым ліку й беларускае сярэдняе клясы.

У гэтым сьвятле асаблівую цікавасьць выклікаюць вайсковыя, інфармацыйныя, дыпляматычныя мэханізмы амэрыканскага дамінаваньня. Сьвет ізноў зацікавіўся палітыкай, вайной, войскам і будучыняй. (Пра гэта цікава піша Аляксандар Батура.) Разьбіраючыся ў іх, мы міжволі шукаем адказ на пытаньне, дзе ж канцавая станцыя на шляху, які пачаўся з Багдаду, дзе тое Магадыша глябальнага характару, збой у самаўпэўненай імпэрыі, калі дасягнутая сытасьць выкліча ў геданіста апатыю? Будучыню немагчыма змадэляваць з дакладнасьцю, але яна заўжды аб'ектыўна абумоўленая. Адміністрацыя Буша сутыкаецца з супрацівам ня толькі з боку палітычных анахронікаў - аўтарытарных рэжымаў, рэлігійных фундамэнталістаў і постмарксісцкіх экстрэмістаў. Для дэмакратычных элітаў розных краінаў сьвету - у тым ліку й Беларусі - культурныя, нацыянальныя ці рэлігійныя вартасьці па-ранейшаму значаць болей за спажывецкія. Гэта стварае доўгатэрміновую процівагу імпэрыяльнаму дамінаваньню.

Артыкул Міхаэля Фройнда прысьвечаны амэрыкана-эўрапейскім адносінам. Многія эўрапейскія ўрады адмовіліся падпісаць з ЗША дамову аб нявыдачы амэрыканскіх грамадзянаў Міжнароднаму крымінальнаму суду. Эўропа патэнцыйна здольная стаць фінансава мацнейшай за Амэрыку, Кітай таксама. Між імі дэградаваная Расея з гіганцкім прыродным патэнцыялам, які трэба толькі ўзумець выкарыстаць. Але вакол Расеі з захаду і поўдня ланцуг невялікіх дзяржаваў, у якіх моцны амэрыканскі ўплыў і антырасейскія настроі. Нават у Беларусі, што ляжыць на

пэрыфэрыі амэрыканскіх інтарэсаў, найбольшы штат мае не нямецкае ці расейскае, а амэрыканскае пасольства. Рэакцыя амэрыканскіх акадэмічных і інтэлектуальных асяродзьдзяў на дактрыну Буша пераважна нэгатыўная. Асаблівую трывогу ў гэтых асяродзьдзях выклікае спэкуляцыя на дэмакратычных каштоўнасьцях у замежнапалітычных мэтах, якая вядзе да дэвальвацыі саміх паняцьцяў “свабоды” ці “гуманізму”, трывожыць іх таксама рост унутранай патрэбы амэрыканцаў у агрэсіі. (Пра гэта добра піша Норман Мэйлер.) Крытычны настрой амэрыканскіх інтэлектуалаў - зарука духоўнага здароўя амэрыканскай нацыі. Пра ўсё гэта гаворка ў нумары “ARCHE”, які вы трымаеце.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн і майстраваньне **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

Аляксандар Батура

Бясконцая вайна за мір

“Мы не баімся амэрыканцаў. Алаг іх пракляў. Яны дурныя. Яны дурныя (драматычная паўза). І іх праклялі… Мы тут падлічылі, што нікому зь іх ня выйсьці жывым, калі толькі яны хуценька нам не паздаюцца”.
Магамэд Саід аль-Сахаф,
былы міністар інфармацыі Іраку.

Кнігі, што абмяркоўваюцца ў артыкуле:

Lawrence F. Kaplan, William Kristol. *The War over Iraq: Saddam's Tyranny and America's Mission.* San Francisco: Encounter, 2003.
Bruce Berkowitz. *The New Face of War.* New York: Free Press, 2003.
Dana Priest. *The Mission: Waging War and Keeping Peace with America's Military.* New York— London: Norton, 2003.
Michael Hardt, Antonio Negri. *Empire.* Cambridge — Ma : Harvard University Press, 2000.
Paul Berman. *Terror and Liberalism.* New York—London: Norton, 2003.
Michael Mandelbaum. *The Ideas that Conquered the World: Peace, Democracy and Free Markets in the Twenty-First Century.* Cambridge

АЛЯКСАНДАР БАТУРА (нар. у 1977 годзе ў Мядзеле) — палітоляг. Скончыў факультэт права Цэнтральнаэўрапейскага ўнівэрсытэту (Будапэшт). Вучыцца ў дактарантуры “Trinity College” (Дублін) і выкладае там жа на факультэце палітталогіі. Апошняя публікацыя — у мінулым нумары “ARCHE”.

— Ма.: Public Affairs, 2002.

Будучыня зноў стала цікавай, нават моднай. Я маю на ўвазе будучыню як глябальную праблему, бо ўсіх нас, вядома, і раней цікавіла наша асабістая будучыня ці будучыня нейкай пэўнай краіны. Але будучыня як глябальная зьява, як акадэмічная дысцыпліна, як, нарэшце, журналісцкая "мода" — гэта зусім іншая рэч. Пасьля раптоўнага развалу сацыялістычнай сыстэмы, а затым — і самога Савецкага Саюзу, калі ніводзін зь вядомых саветолягаў ня здолеў ня тое што спрагназаваць, але нават разгледзець магчымасьць глябальнага палітычнага землятрусу такога маштабу, на нейкі час акадэмічнай модай стала будучыня як праблема, і на шматлікіх "подыюмах" вядомых заходніх унівэрсытэтаў прайшлі пасьпяховыя паказы мод ад Фукуямы, Гантынгтана й іншых аракулаў. Наіўна загаварылі пра "канец гісторыі" ды канчатковы трыюмф капіталізму і дэмакратыі. Пасьля былі сытыя, даволі прадказальныя гады Біла Клінтана, якія нехта абазваў Новым Сусьветным Парадкам, або Парадкам Пасьля Халоднай Вайны, калі, здаецца, найбольш сур'ёзнай праблемай для заходніх аналітыкаў стаў лёс атамнай зброі ў Расеі. І зноў памыліліся — лепей бы спыталіся сур'ёзна ў тых, хто нарадзіўся ў Савецкім Саюзе. Я, напрыклад, мяркую, што постсавецкія вайскоўцы антрапалягічна ня здольныя на вайсковыя пераваротыі "гульні" з атамнай зброяй гэтак жа, як большасьць сучасных эўрапейцаў, здаецца, антрапалягічна ня здольныя ваяваць увогуле — але гэта зусім іншая тэма.

Тыя, што казалі пра Новы Сусьветны Парадак на пачатку 90-х, трохі пасьпяшаліся. Пра сапраўдны Новы Сусьветны Парадак мы першы раз пачулі ў 1999 годзе ў Косаве, калі ён, гэты Парадак, так бы мовіць, купіў квіткі на самалёт. І сказаў усім, што ён ужо ў дарозе, а пасьля на гэтым самалёце "зь песьняй" паляцеў скрозь небасягі Сусьветнага гандлёвага цэнтру і адбамбіўся ў Аўганістане. Нарэшце, у сакавіку 2003 году Новы Сусьветны Парадак прызямліўся ў Багдадзе; ён з намі, як кажуць — усур'ёз і надоўга.

Памятаеце, у Толкіна Гендальф казаў Фрода: "Сьвет мяняецца, Фрода, я адчуваю гэта ўжо нават у паветры…" Так і тут. Усе адчуваюць, што нешта адбываецца, што міжнародная сыстэма, якая склалася пасьля другой сусьветнай вайны, больш не адпавядае сучасным рэаліям. Больш за тое, самыя ўплывовыя

акторы больш не жадаюць гуляць паводле старых правілаў. Сьвет сапраўды мяняецца. Уся міжнародная сыстэма, якая існавала на працягу больш як 50 год, пастаўленая пад вялікае пытаньне. Ня трэба сьцьвярджаць, што падзеі 11 верасьня, аўганскай кампаніі й апошняй ірацкай вайны кардынальна ўсё зьмянілі і паставілі дагары нагамі. Гэта не зусім так. Мапа сьвету засталася такой, якой была. Глябальныя праблемы — ад стану навакольнага асяродзьдзя да міграцыі — ня ўзьніклі раптам два гады таму, яны існавалі і раней. Аднак шмат што зьмянілася на ўзроўнях, якія яшчэ патрабуюць пэўнай канцэптуалізацыі. Калі да 11 верасьня ўсе мелі на ўвазе, што Амэрыка зьяўляецца моцнай супэрдзяржавай, дык цяпер усе ў гэтым упэўненыя, толькі яшчэ спадзяюцца, што, можа, не настолькі моцнай, як яна імкнецца зрабіць уражаньне.
У пэўнай ступені сусьветныя зьмены пасьля 11 верасьня зноў вярнулі нацыянальную дзяржаву на сваё месца, зь якога яна трохі была пасунутая недзяржаўнымі акторамі (карпарацыямі, напрыклад). Асобны рэгіён, Блізкі Ўсход, зрабіўся нават яшчэ больш важным, чым быў раней. Зьнікла пэўная эўфарыя наконт пазытыўных эфэктаў глябалізацыі: глябалізацыя здольная як прынесьці дабрабыт, так і суноць у кішэню тэрарыстам мабільныя тэлефоны і крэдыткі.

Таксама зразумела, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, заснаваная яшчэ 50 з гакам год таму краінамі-пераможцамі, патрабуе кардынальнага "рэ-дызайну". Па-першае (і галоўнае), Амэрыка ня хоча і не зьбіраецца гуляць паводле старых правілаў, і, калі міжнародная супольнасьць жадае захаваць ААН, зьмены непазьбежныя. Такія эканамічныя лідэры, як Нямеччына і Японія, да гэтага часу не зьяўляюцца сталымі сябрамі Рады Бясьпекі — анамальна не зьяўляюцца. Пакістан і Індыя (прынамсі яны плюс Ізраіль, але, напэўна, такіх краінаў ужо больш) зьяўляюцца атамнымі краінамі. Ні лацінаамэрыканскі, ні афрыканскі, ні блізкаўсходні рэгіёны да гэтага часу ня маюць ніякай сапраўднай вагі ў ААН. Брэтан-Вудзкія інстытуты патрабуюць ці радыкальнай рэформы, ці ўвогуле поўнага скасаваньня, бо ня здольныя вырашыць праблемы беднасьці, адсталасьці (трэба адзначыць, аднак, няздольныя як дзеля краінаў-донараў, так і дзеля краінаў-атрымальнікаў). NATO таксама сябе шукае і ня можа знайсьці;

шматлікія міжнародныя канвэнцыі — па ўцекачах, генацыдзе, кантролі за ўзбраеньнямі, ваенных злачынствах — ці не працуюць і патрабуюць лепшай імплемэнтацыі, ці ўвогуле ігнаруюцца мацнейшай краінай — ЗША. У міжнародным праве ідзе перагляд фундамэнтальнага прынцыпу міжнароднай бясьпекі — права дзяржавы на самаабарону. ЗША штурхаюць у бок больш шырокага разуменьня гэтага прынцыпу і ўключэньня ў панятак самаабароны таксама права на ўзброенае дзеяньне супраць краінаў, што падтрымліваюць тэрарыстаў.
Больш таго, Амэрыка імкнецца зьмяніць ня толькі пэўныя нормы права, а самі мэтады інтэрпрэтацыі пэўных канвэнцый і рашэньняў, прынцып Kompetenz Kompetenz, як яго называюць нямецкія юрысты. Калі хто сачыў за паводзінамі Амэрыкі і ААН у часе падрыхтоўкі да вайны ў Іраку, мог заўважыць, што Амэрыка была больш зацікаўленая ня ў тым, пра што наўпрост гаварылася ў рэзалюцыях ААН, якія, калі іх уважліва прачытаць, даслоўна не заклікаюць да ўзброенай інтэрвэнцыі ў Ірак і не даюць тым самым casus belli на вайну, а хутчэй у тым, што мелася на ўвазе, якое поле для манэўру давала рэзалюцыя па раззбраеньні Іраку (пры яе шырокай інтэрпрэтацыі).
Калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, сучасную сыстэму міжнароднага права чакае яшчэ глыбейшы, чым здаецца нават цяпер, крызыс: Амэрыка, найбольш уплывовая краіна сьвету, пашырае разуменьне “экстраардынарнасьці” ў праве, ставіць пад пытаньне самі прынцыпы інтэрпрэтацыі міжнародных нормаў права. Амэрыканскі мэтад інтэрпрэтацыі рэзалюцыі ААН па Іраку нагадваў традыцыю інтэрпрэтацыі амэрыканскай канстытуцыі (якой больш за 200 год), калі юрысты ажыцьцяўляюць амаль гермэнэўтычны аналіз тэксту, каб прыйсьці да высновы, што мелі на ўвазе 200 год таму бацькі-заснавальнікі.
Унутраная лёгіка сусьветнай сыстэмы зьмянілася, яна больш не дыктуецца патрэбай мірнага суіснаваньня сыстэмы капіталізму і сацыялізму, як было раней. Але што прыходзіць ёй на зьмену? Ці гэта аднаполюсная сыстэма сусьветнага гегемона, ці шматполюсная сыстэма (сучасны расейскі эўфэмізм для абазначэньня сыстэмы зь некалькімі акторамі, акрамя Амэрыкі), ці, можа, што іншае?

За апошні час зьявілася некалькі цікавых дасьледаваньняў, якія

спрабуюць адказаць на глябальныя пытаньні. Яны розьняцца зьместам і ідэалёгіяй аўтараў — ад нэакансэрватара Л.Каплана зь яго апалёгіяй Другой вайны ў Іраку да антыглябаліста А.Нэгры з глыбокім дыскусійным аналізам глябальных падзеяў. Аб'ядноўвае іх адно — усе разумеюць канцэптуальную розьніцу паміж сучаснымі падзеямі і мінулым. Ува ўсіх слова "Амэрыка" сустракаецца штостаронкі, усе імкнуцца адказаць на пытаньне "Што далей"? Усе шэсьць кнігаў таксама аб'ядноўвае разуменьне экстраардынарнасьці сусьветнай сытуацыі, пэўнага дысбалянсу, зь якога можа вынікнуць як далейшы хаос, так і рост дабрабыту. На шляху да будучыні вайна робіцца звычайнаю зьявай, таму стан надзвычайнасьці становіцца пэрманэнтным. Я ўмоўна разьмясьціў усе гэтыя захапляльныя кнігі ў парадку ўзьнікненьня пытаньняў: каго бамбіць, як і чым бамбіць, чаму бамбіць і ці будзем бамбіць далей.
Майкл Мандэльбаўм узгадвае вядомага амэрыканскага бэйсбаліста і філёзафа Ёгі Бэра, які некалі прыдумаў такі афарызм: "Ніколі нічога не прадказвайце — і тым больш будзе будучыні". Кнігі, пра якія пойдзе гаворка, нагадваюць уступ да рэпартажу з бэйсбольнага матчу, калі камэнтатар нагадвае асноўныя правілы, апісвае асаблівасьці поля, пералічвае асноўных гульцоў, характарызуе галоўныя стратэгіі трэнэра. Ён разважае наконт таго, як можа разьвівацца гульня, але ня здольны з упэўненасьцю прадказаць вынік. Гэтак жа і ў кнігах, пра якія пойдзе гаворка: аўтары аналізуюць падзеі нашых дзён і іх магчымы ўплыў на будучыню, а таксама палітычныя, эканамічныя, міжнародныя тэндэнцыі будучага. Усё, акрамя выніку.

1

Каго можна і каго нельга бамбіць? Хто павінен вызначаць розьніцу між тэрарыстам і змагаром за свабоду? Нарэшце, якія недэмакратычныя рэжымы трэба бамбіць, а якім трэба, наадварот, дапамагаць зброяй і інструктарамі, каб гэтыя рэжымы маглі змагацца з тэрарыстамі, а калі трэба — і з унутранай апазыцыяй? А калі гэтая апазыцыя ўжывае тэрарыстычныя мэтады? Гэта складаныя пытаньні, і яшчэ складаней разважаць пра іх без эмоцыяў (абстрагаваўшыся ад каштоўнасьцяў, як казаў Макс Вэбэр), бо так і напрошваюцца розныя аналёгіі, і ідэалягічная розьніца паміж лібэраламі,

лібэртарыянцамі і не-лібэраламі робіцца як ніколі выразнай. У часе вайны з Іракам шмат рабілася для мінімізацыі ахвяраў як сярод амэрыканскіх вайскоўцаў, так і сярод мірнага ірацкага насельніцтва. Калі кранаць піяраўскі бок гэтай стратэгіі, трэба адзначыць, што амэрыканцы мэтанакіравана рабілі ўсё магчымае, каб бамбіць толькі інстытуты рэжыму. Такім чынам, на канцэптуальным узроўні рэжым і народ робяцца рознымі паняцьцямі. Маральнасьць тут ні пры чым, амэрыканцы ставілі чыста ўтылітарныя мэты. Падобная стратэгія, як ужо адзначалася, дае магчымасьць добрага піяру, яна нібы запрашае народ звaліць ненавісны рэжым (калі гэты рэжым сапраўды зьненавідны). Нарэшце, такая стратэгія памяншае страты сярод вайскоўцаў: частку справы робяць самі тыя, каго бамбяць. Дарэчы, гэтым і тлумачыцца, чаму заходнія тэлеканалы столькі разоў перадавалі пра выбух паўстаньня ў Басры — так бы мовіць, прымалі жаданае за рэальнае.
Кожны народ мае такі ўрад, якога ён заслугоўвае. Але ці так гэта? Ці мае сувэрэнітэт і права на самавызначэньне абсалютную перавагу над, скажам, правамі чалавека? На прынцыпах неўмяшальніцтва ўва ўнутраныя справы пабудаваная ўся сыстэма міжнароднага дзяржаўнага права, і многія даволі абгрунтавана асьцерагаюцца раптоўнага і небясьпечнага перагляду старых канцэпцыяў. Але ўдумайцеся, што такое права на самавызначэньне? Гэта права народу выбіраць такое жыцьцё і ўладу, якія ён хоча. З гэтага пункту гледжаньня, калі ірацкі народ жадае быць кіраваным дыктатарам — калі ласка, да тае пары, пакуль гэты дыктатар не пачынае пагражаць суседнім народам. Але пра якое самавызначэньне можа ісьці размова, калі пры дыктатуры народ ня можа зьмяніць ураду, ня можа самавызначыцца паводле вызначэньня! Такім чынам, цалкам магчыма, што народ можа й не заслугоўваць дрэннага ўраду, які ім кіруе. Толькі ў дэмакратычнай сыстэме можна казаць, што народ заслугоўвае свайго ўраду — з той простай прычыны, што яго можна зьмяніць, калі не падабаецца. Такім чынам, ставіцца да рэжыму й народу дыфэрэнцыявана — абсалютна лягічна.

Вядома, мы апынаемся ў “шэрай” зоне, калі пачынаем разважаць пра аўтарытарныя рэжымы. Дзе межы эфэктыўнай прапаганды, “прамыўкі мазгоў”, рэпрэсій і сапраўднай

падтрымкі дыктатара? Або што рабіць, калі палова грамадзтва сапраўды падтрымлівае гэты рэжым, а другая палова ненавідзіць яго ад усяго сэрца? Колькі адсоткаў папулярнасьці патрэбна, каб сказаць, што рэжым ня мае падтрымкі, а трымаецца на адных рэпрэсіях? Гэта зноў цяжкія пытаньні, і, каб на іх адказаць, трэба вельмі пільна сачыць за ўнутранай палітычнай дынамікаю пэўнай краіны. Памятаю, некалі ў Інтэрнэце быў жартоўны прыклад бюлетэню ірацкага рэфэрэндуму пра падаўжэньне паўнамоцтваў прэзыдэнта Хусэйна: “Пытаньне 1: Ці падтрымліваеце Вы падаўжэньне паўнамоцтваў Садама Хусэйна? Пытаньне 2: Ці хочаце Вы, каб Вас і ўсю Вашую сям’ю жорстка згвалцілі і забілі?”. Сумна, але гэта клясычны выпадак, калі ў жарце зусім мала жарту. Гэта вельмі сур’ёзна.

Іракцы не заслугоўвалі такога правадыра, як Садам, хаця б таму, што ў іх ніколі не было альтэрнатывы. З гэтай прычыны я не далучыўся да паўмільённай антываеннай дэманстрацыі, якая з шумам і галёканьнем пракацілася па Лёндане ў сакавіку. Людзі несьлі трохі падрэтушаваныя партрэты Чэ Гевары і слоганы “Не ад майго імя”. Не ад чыйго імя? Не ад імя наетых, самазадаволеных эўрапейцаў, якім, шчыра кажучы, наплываць, пратрымаецца Садам яшчэ пару гадкоў ці не пратрымаецца і колькі там яшчэ тысяч курдаў ён пасьпее патруціць газам?

А пры чым тут увогуле іхнае імя? Дыскусія наконт вайны ў Іраку выйшла нейкая маніхейская. З аднаго боку, нэаконсэрватары пад сурдынку: рэжым Хусэйна небясьпечны, бо валодае хімічнай і бактэрыялягічнай зброяй, з другога — пярэстая маса зь левымі настроямі, якая сьцьвярджае, нібыта вайна вядзецца толькі дзеля нафты і што б Амэрыка ні рабіла пасьля Віетнаму — усё гэта злачынствы (пры гэтым заплюшчваючы вочы на злачынствы самога Хусэйна). Трэба ўсё ж адзначыць, што, у адрозьненьне ад партрэтаў Чэ Гевары, партрэтаў Садама Хусэйна я на дэманстрацыі ня бачыў. Сапраўдная дыскусія пачалася, калі да двухбаковай спрэчкі далучыліся тыя іракцы, якім удалося ўцячы з Іраку. Іхны “мэсыдж” быў зусім на другую тэму — а пра нас вы падумалі? Пры чым тут зброя і антыглябалізм?

Пасьля ўсяго гэтага адзначу, што на пытаньне, каго трэба бамбіць, адказ просты — нікога. Але заклік пацыфістаў “Let’s make peace, man” прынамсі спрошчана трактуе сытуацыю. Я не

сьцьвярджаю, што ў крытыцы амэрыканскае палітыкі дэманстрантамі няма каліва рацыі — сапраўды, амэрыканцы часта робяць учынкі, якія можна назваць злачынствамі, але ці толькі ў гэтым справа? Шмат хто бачыць толькі амэрыканскія памылкі, але ня бачыць масавых забойстваў, парушэньняў правоў чалавека, генацыду, нарэшце, якія адбываюцца па віне шматлікіх дыктатараў ўва ўсім сьвеце. Як ужо згадвалася раней, прынцып сувэрэнітэту, неўмяшаньня ўва ўнутраныя справы дзяржавы ёсьць самым фундамэнтальным прынцыпам міжнароднага права, на якім была збудаваная ўся сыстэма міжнародных адносінаў пасьля Вэстфальскага міру. Правы чалавека, пра якія чуеш амаль кожны дзень, застаюцца, на жаль, не нашмат больш як дэклярацыяй аб намерах. Так, нават інтэрвэнцыя ў Ірак была абгрунтаваная перасьцярогамі наконт валоданьня Садамам зброяй масавага зьнішчэньня, а ня тым, што ён вінаваты ў масавых парушэньнях правоў чалавека. Але калі ёсьць магчымасьць спыніць забойствы ці зьдзек з народаў і калі заходнія ўрады гатовыя гэта зрабіць, прынцыпам сувэрэнітэту можна паступіцца — калі не зь юрыдычных, то з маральных меркаваньняў. Цікава, што пра сувэрэнітэт і права на самавызначэньне чуеш толькі ад лідэраў аўтарытарных рэжымаў і ніколі — ад грамадзянаў гэтых рэжымаў. Нават калі Амэрыка вырашае “спрактыкаваць” лібэральны праект толькі ў адным зь дзясяткаў “дрэнных” рэжымаў — гэта непасьлядоўна, але непасьлядоўнасьць не зьяўляецца аргумэнтам супраць вызваленьня хоць адной краіны зь дзесяці. Непасьлядоўнасьць у пэўнай практыцы не азначае, што гэтая практыка дрэнная, а азначае толькі тое, што яе ўжываюць ня ўсюды.

2

Кнігу Лоўрэнса Каплана і Ўільяма Крыстала “Вайна за Ірак” Джордж Буш падарыў кожнаму сенатару і кожнаму члену Кангрэсу. Гледзячы на водгукі на кнігу на сайце amazon.com сэнатар МакКейн рэкамэндуе ўсім, у каго яшчэ засталіся сумневы ў тым, што архіважна было разбамбіць Ірак як мага хутчэй. Згодна з аўтарамі, Садам Хусэйн — вялікі паскуда, якога трэба скінуць, эўрапейцы нічога не разумеюць, і толькі адна Амэрыка ў стане зьмяніць сытуацыю. Амэрыка павінна вызваліцца з путаў “слабое і бязвольнае сусьветнае супольнасьці” і ўдарыць з усёй сілы па ворагах свабоды і дэмакратыі. На Амэрыку ў сьвеце глядзяць як на вельмі пыхлівую краіну, яе так і так ненавідзяць, дык чаго сядзець і

чакаць — даседзеліся ўжо да 11 верасьня. Амэрыка павінна быць сусьветным паліцыянтам, але таксама і правадыром. Вось ён, такі самы прыклад тунэльнага мысьленьня, як і “let’s-make-peace-man”. Першае пытаньне, якое павінна было паўстаць у Амэрыцы, — “Чаму ж нас так ненавідзяць?”. Яно й паўстала, але хутка зьнікла з вуснаў усьмешлівых дыктараў CNN, пасьля таго як Джордж Дабл’ю топнуў нагой у Кангрэсе — “Хто ня з намі, той з тэрарыстамі!”. Мо само пытаньне пастаўленае няправільна: не “чаму ненавідзяць”, а “чаму баяцца”? І ці ненавідзяць?

Узімку 2002 году ўва ўтульным multiplex-кінатэатры ў Будапэшце я глядзеў фільм “Восень у Нью-Ёрку”. Зацягнутыя ў амэрыканскія джынсы хлопцы, хрумкаючы папкорнам, як робяць мільёны іх аднагодкаў дзесьці ў Дэтройце, запляскалі ў далоні, калі пабачылі ў кіно яшчэ цэлыя хмарачосы Сусьветнага гандлёвага цэнтру. Без спачуваньня гучна загалёкалі. Вугорцы — хаўрусьнікі Амэрыкі, сябры NATO і іншых “белых” клюбаў. Я ўяўляю, колькі шчырай радасьці было ў Маскве... Я ня ўпэўнены, што Амэрыку ненавідзяць як Амэрыку — гэта спрошчанае бачаньне. Амэрыканскія мусульмане не зьбіраюцца нікуды эміграваць з Новага Сьвету. Пэўныя амэрыканскія прынцыпы, сьветапогляды і стыль жыцьця зьяўляюцца хутчэй крыніцай зайздрасьці, чым нянавісьці. Тысячы барадатых “статыстаў”, якія трасуць аўтаматамі Калашнікава на камэру і паляць амэрыканскія сьцягі, з радасьцю згодзяцца атрымаць амэрыканскую “грын-кард”. Тысячы ўцекачоў ад войнаў ці дыктатур едуць у Амэрыку, а не ў Ірак. Мадона пасьпяхова распрадасьць свой новы дыск “American Life” ува ўсім сьвеце, нягледзячы на назву. Вядома, і беларусу шмат што не падабаецца ў часам тупавата-сытым амэрыканскім грамадзтве — ад гістарычнага нігілізму да McDonalds’аў. Але ці ў нашым грамадзтве меней таго, што нам не падабаецца, — ад п’яных трактарыстаў да хамства бюракратаў?..

Амэрыка падтрымлівала і да гэтага часу падтрымлівае дыктатараў. “Лібэральны праект” ЗША ў Лацінскай Амэрыцы лепш ня згадваць. Калі Джордж Дабл’ю гатовы ваяваць супраць дыктатараў і інсталяваць дэмакратычныя рэжымы, павялічваючы эканамічны і палітычны дабрабыт (як было зроблена ў Нямеччыне і Японіі ў 1945 годзе), тым лепей для

ўсяго сьвету. Але ці так гэта? Амэрыка заплюшчвае вочы на галоўную крыніцу нестабільнасьці на Блізкім Усходзе — палестынскую праблему. Нават калі мэты вайны ў Іраку будуць дасягнутыя і Ірак чакае дабрабыт, дэмакратыя ды стабільнасьць, колькі яшчэ застанецца дыктатарскіх рэжымаў, не намнога менш жорсткіх за Садамаў, падтрыманых Амэрыкай, саюзных ёй?
Амэрыку ненавідзяць — калі ўжо ўжываць гэтае слова — не за тое, што яна імкнецца ажыцьцяўляць вызваленчыя праекты, а за тое, што яна робіць гэта непасьлядоўна, пыхліва ці ўвогуле ня робіць там, дзе гэта рабіць трэба.
За апэрацыяй “Свабода Іраку” могуць стартаваць “Свабода Судану, Сырыі...” — падстаўце згодна з жаданьнем, зьверыўшыся з дакладам Дзярждэпу пра свабоду краінаў. Крыстал і Каплан узносяць да нябёсаў амэрыканскую сусьветную місію — вызваліць усе несвабодныя народы сьвету, але абыходзяць пытаньне, чаму Амэрыку ненавідзяць. Ірак пераможаны, “Аль-Каіда” — не. Габрэі не суцішаць “Хамасу”, расейцы — чачэнаў, пакуль ня будзе знойдзены адказ на гэтае галоўнае пытаньне. Гэта, на жаль, слабое месца кнігі. Але цяпер самы час зьвярнуцца да пытаньня “Як бамбіць?”.

3

Нават калі хто не пагаджаецца, што сьвет перамяніўся пасьля падзеяў 11 верасьня, дык пасьля зьмены рэжыму ў Аўганістане і вайны ў Іраку мала хто будзе спрачацца, што кардынальна зьмянілася ўспрыманьне амэрыканскай моцы. Стала агульнавядома, што ЗША выдаткоўваюць на свае ўзброеныя сілы больш, чым дзесяць наступных наймацнейшых у вайсковым сэнсе краінаў, разам узятых. Амэрыканцы здольныя перамагчы любога праціўніка зь мінімальнымі стратамі для сябе без ужываньня зброі масавага зьнішчэньня. Калі пакінуць у баку магчымыя сутычкі ў пасьляваенным Іраку і спосабы захопу Багдаду, хуткасьць, зь якой была разьбітая ірацкая армія, паказала ўсю моц адзінай супэрдзяржавы. Былыя савецкія генэралы, вэтэраны Аўганістану, якія спачатку гудзілі амэрыканцам паразаю, мусілі змоўкнуць.
Амэрыканцы ваююць так, як ніхто раней не ваяваў. Брус Бэркавіц у сваёй кнізе “Новае аблічча вайны” піша, што галоўнай прычынай посьпеху амэрыканцаў зьяўляецца

інфармацыйная перавага. Бэркавіц апісвае інфармацыю дакладную, пастаянна абнаўляную і даступную ўсяму войску ад генэрала да апошняга салдата — тую інфармацыю, якая дапамагае знайсьці ворага ў долю сэкунды. Раней, сьцьвярджае ён, інфармацыя была толькі часткай мэханізму, а ня “клеем” паміж астатнімі часткамі, як цяпер, ды нават больш чым “клеем” — галоўнай каардынацыйнай сілай і рухавіком вайны. Каб зразумець сучасную вайну, трэба ведаць, што ўсе папярэднія складнікі вайсковай магутнасьці — колькасьць арміі, лічба танкаў — цяпер маюць значэньне хіба што на парадах. Умацаваныя пазыцыі — добрая мішэнь, танкавы кулак — мішэнь яшчэ лепшая. Новымі паказьнікамі моцы войска зьяўляюцца хуткасьць, мабільнасьць, нябачнасьць, магчымасьць за долі сэкунды данесьці патрэбную інфармацыю зьнізу ўверх ці зверху ўніз, сканцэнтраваць агонь на некалькіх квадратных мэтрах паверхні. Бэркавіц разважае пра чатыры кампанэнты сучаснай стратэгіі: асымэтрычныя пагрозы, калі нават моцнае, шматлікае войска асуджанае на паразу — у выпадку калі вораг намацаў яго слабыя зьвёны; інфармацыйныя тэхналёгіі — калі валадар больш сучасных тэхналёгій перамагае; хуткасьць прыняцьця рашэньняў — калі выйграе той, хто першы атрымлівае, перапрацоўвае і перанакіроўвае куды трэба інфармацыю; сеткавая арганізацыя — калі мабільныя часткі ўзброеных сілаў здольныя згодна з сытуацыяй разьвяртацца на 180 градусаў і раптоўна ракіравацца зь іншымі часткамі.
На думку Бэркавіца, менавіта выкарыстаньне амэрыканцамі элітных мабільных часьцей у спалучэньні з “разумнымі” бомбамі дазволілі ім выканаць свае задачы ў тым самым Аўгане, дзе зламала сабе зубы савецкая ваенная машына. Перамога над Садамам канчаткова вылечыла амэрыканцаў ад віетнамскага сындрому.

Але ці ўсё так гладка, як піша Бэркавіц? Інфармацыя сапраўды адыгрывае галоўную ролю ў сучаснай вайне. Як дасьціпна заўважае вядомы тэарэтык міжнародных зносінаў Дэр Дэрыян, вайна зрабілася віртуознай. Вялікую ролю адыгрываюць ваенныя гульні, калі ўсе магчымыя дэталі падзеяў прапрацоўваюцца напярэдадні на дысплеі кампутара. Вораг робіцца віртуальным, будучыня праз гульню — прадказальнай і таму не такой страшнай. Добра, калі ўсё ідзе паводле пляну

(чытай, як пагуляліся ў гульні). Але калі раптам вораг робіць неспадзяваны крок, будучыня зноў ператвараецца ў непрадказальную і страшную. Памятаеце, як на пачатку вайны іракцы неспадзявана ўжылі ў Эн-Насырыі партызанскую тактыку і адчайна супраціўляліся ў непрыдатным для абароны Ум-Касры? Згодна з адыгранымі раней ваеннымі гульнямі, яны мусілі весьці сябе зусім ня так. Будучыня, запраграмаваная ў мінулым, дала “глюк”. Памятаеце, у “Матрыцы” Нэо пабачыў чорнага ката ў дзьвярах і праз імгненьне — гэткага самага чорнага ката. Так было і на ірацкай вайне. Джордж Дабл’ю нават прызнаўся ў інтэрвію CNN: “Вораг аказаўся зусім іншым, чым той, зь якім мы змагаліся ў ваенных гульнях”. Але, але. Іракцы неспадзявана пачалі ваяваць так, як і было запраграмавана, — дрэнна, і саюзьнікі хутка ўвайшлі ў Багдад. Пакуль невядома, ці гэта хтосьці з атачэньня дыктатара “здаў” горад, ці гэта адбылося само сабой. Але вядома, што амэрыканцы баяліся вулічных баёў і імкнуліся не дапусьціць разьвіцьця сытуацыі паводле палестынскага сцэнару. Пры ўсёй сваёй добрай інфармаванасьці, яны ня ведалі, ці трапіў Садам пад “разумную” бомбу, ці не. Існуе шмат фактараў, якія немагчыма прамадэляваць на кампутары, шмат фактараў, якія цяжка прадказаць нават з дапамогай найсучаснейшай тэхналёгіі.
Бэркавіц занадта аптымістычны — амэрыканскія ваенныя тэхналёгіі не настолькі дасканалыя, як ён малюе. Але факт застаецца фактам: амэрыканская ваенная машына і адміністрацыя сапраўды пазбавіліся віетнамскага сындрому.

Назва кнігі Даны Прыст “Місія” сама прамаўляе [illegible] — як амэрыканскія прэзыдэнты ўсё часьцей зьвяртаюцца да ваенных сродкаў, каб дасягнуць палітычных мэтаў. У адрозьненьне ад папярэдняй кнігі, засяроджанай на тэхналёгіях, у “Місіі” мы маем справу з антрапалягічным падыходам: аўтарка размаўляе з вайскоўцамі, назірае за імі, вандруе, жыве ўнутры войска. Аўтарка разглядае войска знутры: якія людзі абіраюць вайсковую кар’еру, як гэтае войска бачыць сваю ролю ў краіне і сьвеце.
Прыст адзначае цікавы факт: кожны раз, калі амэрыканская адміністрацыя плянавала пэўныя замежнапалітычныя крокі — гуманітарную акцыю ў Самалі, антытэрарыстычныя трэнінгі

для кіргіскага спэцназу, умяшаньне ў Косаве, — гэта даручалася вайскоўцам. Які калектыў з тых, што займаюцца замежнай палітыкай ЗША, цяпер найбуйнейшы? Гэта ня “Корпус Міру” і не прадстаўнікі амэрыканскіх NGO — гэта вайскоўцы. У Іраку місія арміі была традыцыйнай — ваяваць і перамагчы, але ў цэлым амэрыканскія вайскоўцы бачаць сваю місію значна шырэй. Яны змагаюцца з тэрарызмам і наркагандлем, раззбройваюць супраціўнікаў у грамадзянскіх войнах і раздаюць апэльсыны галодным дзецям (даволі часта ў разьліку на тэлекамэры). Цяпер амэрыканскія войскі прысутнічаюць у той ці іншай ступені ў больш як сотні краінаў сьвету.

Амэрыканскае войска разьдзеленае на пяць тэрытарыяльных камандаваньняў. Мала хто ведае кіраўнікоў гэтых камандаваньняў, піша Прыст, але гэтыя пяць асобаў уваходзяць у лік самых уплывовых асобаў сьвету. Генэрал Томі Фрэнкс, кіраўнік Цэнтральнага камандаваньня (Сярэдні Ўсход і Цэнтральная Азія), напрыклад, камандаваў войскамі ў Іраку. Да яго гэтую пасаду займаў генэрал Энтані Зыні, з штабам якога аўтарка і вандравала на працягу трох год. Яна зь зьдзіўленьнем адкрыла для сябе, што ўлада камандзіраў акругаў параўнальная з уладай кіраўнікоў дзяржаваў і ў кожным разе гэтыя камандзіры маюць больш уплыву, чым амэрыканскія паслы ў краінах, якія ўваходзяць у тыя акругі. Функцыі войска ў апошнія гады значна пашырыліся, і цяпер вайскоўцы падмяняюць цывільных прадстаўнікоў ува ўсіх галінах. “Зыні зрабіўся сучасным праконсулам, нашчадкам таго гібрыда вайскоўца й палітыка, якія кіравалі некалі правінцыямі Рымскай імпэрыі, несучы парадак і цывілізацыю. Юлі Цэзар і Аўгуст — яны б зразумелі”. Аўтарка ўзгадвае, як аднавіўся парадак у Інданэзіі, ледзьве толькі адмірал Блэр, камандзір Ціхаакіянскай акругі, вырашыў узнавіць ваенную дапамогу інданэзійскай арміі, нягледзячы на шматлікія парушэньні правоў чалавека ўрадам гэтай краіны. Амэрыканскі амбасадар, які шмат часу аддаў крытыцы зьверстваў інданэзійскіх вайскоўцаў ува Ўсходнім Тыморы, катэгарычна пярэчыў афіцыйнаму візыту Блэра ў Інданэзію. Нягледзячы на фармальную вышэйшасьць амбасадара як прадстаўніка амэрыканскай дзяржавы ў Інданэзіі, адмірал толькі пасьмяяўся

з дыпляматычных высілкаў і ажыццявіў свой візыт. Прыст папярэджвае, што незаўважаны многімі пераход ад дыпляматыі ў смокінгах да дыпляматыі ўва ўніформах можа мець непрадказальныя наступствы. Фінансаваньне амаль усіх інстытутаў амэрыканскай улады на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя скарачалася. Усіх, акрамя Пэнтагону. Войска цяпер на перадавой амэрыканскай замежнай палітыкі, яно мае дачыненьні ня толькі з замежнымі войскамі, але і з урадамі, адукацыйнымі ўстановамі, грамадзтвам.
Кніга ўражвае. Аўтарка паказвае як пазытыўныя бакі дыпляматычна-вайсковай трансфармацыі, так і нэгатыўныя. Яна спалучае цьвярозы аналіз з жыцьцёвымі байкамі, таму кніга чытаецца як мастацка-журналісцкае дасьледаваньне. На жаль, яна не адказвае на пытаньне, чаму адбылося зрошчваньне вайсковых і дыпляматычных функцыяў.

4

Некаторыя камэнтатары пасьпяшаліся навесіць на падзеі апошніх гадоў ярлык міжцывілізацыйнага канфлікту. Але ці так гэта? Ёсьць пэўная розьніца між тэрарыстамі бэн Ладэна ці клікай Хусэйна і галоднымі ды неадукаванымі масамі Трэцяга сьвету, якіх больш хвалюе, як накарміць дзяцей, чым як супраціўляцца Амэрыцы.
Калі гаварыць пра фундамэнталістаў, дык іх можна знайсьці амаль у кожнай супольнасьці й рэлігіі. Амэрыканскі фундамэнталіст Джэры Фалуэл растлумачыў атаку 11 верасьня гневам Бога на прыхільнікаў абортаў і гомасэксуалістаў, але падобныя трактоўкі гэткія ж далёкія ад ідэі пратэстантызму, як, скажам, Талібан — ад ісламу. Як добра заўважыў Бэнджамін Барбэр, барацьба Джыхаду з МакСьветам — гэта не канфлікт цывілізацый. Хутчэй гэта дыялектычны выраз запраграмаванай супярэчнасьці між глябалізаванай цывілізацыяй і традыцыйнымі грамадзтвамі. Бэн Ладэн без сучаснай мабільнай сувязі застаўся б простым бэдуінам. Ну, бадай, заможным. Ідзе не вайна між цывілізацыямі, між лібэральным і нелібэральным сьветам, а вайна ўнутры сусьветнай цывілізацыі з усімі яе супярэчнасьцямі. Для многіх, хто жыве за межамі Захаду, глябалізацыя выглядае як сучасны выпадак імпэрскай стратэгіі амэрыканскай эканамічнай гегемоніі, а ня спробай злучыць увесь сьвет у адзіную сыстэму палітычнага і

эканамічнага дабрабыту.

“Імпэрыя” Антоніё Нэгры й Майкла Гарта пачынаецца [ісцідзе] жыцьцесьцьвярджальнай цытаты зь песьні Ані Ды Франка “Кожны інструмэнт можа быць зброяй, калі яго правільна трымаць”. “Імпэрыя” — адна з найлепшых існых працаў з галіны антыглябалізму. Існуе, вядома, шэраг добрых эканамічных і палітычных трактатаў пра “грымасы” капіталізму, але ў “Імпэрыі” аўтарам удалося аб’яднаць бліскучы філязофскі, гістарычны, культуралягічны і літаратурны аналіз. Майкл Гарт — вядомы амэрыканскі крытык літаратуры, Антоніё Нэгры — чалец лявацкіх брыгадаў у 70-х гадох, палітычны філёзаф і цяперашні вязень італьянскай турмы (пісаў там гэтую кнігу). Ужываючы нэамарксісцкі аналіз, аўтары паказваюць, як на зьмену клясычнаму імпэрыялізму прыходзіць новы тып Імпэрыі, заснаваны на арганічным сымбіёзе тэхналёгій, эканамічным панаваньні карпарацыяў і глябальнасьці камунікацыяў. Імпэрыя — гэта глябальнасьць, неталерантнасьць да іншых поглядаў, рэпрэсіі і пэрманэнтнае пашырэньне. Аўтары вылучаюць чатыры прыметы імпэрыі. Першая — калі структура спалучае эканамічную дамінацыю і палітычную ўладу. Такім чынам, Амэрыка, маючы наймацнейшую вайсковую машыну ў сьвеце, здольная дыктаваць умовы і палітычна, і эканамічна; нават калі Амэрыка не зьяўляецца абсалютна даміноўнай эканамічнай магутнасьцю, яна ўсё ж мае найбуйнейшую эканоміку сьвету і здольная дыктаваць сваю волю празь міжнародныя фінансавыя інстытуты. Скандал з “Энронам” чарговы раз высьвеціў змычку палітыкі з эканомікай. Па-другое, імпэрыя — гэта глябальны карнік. На глябальным ідэалягічным узроўні перавага аддаецца “сілавым” ідэям Гобза, а не лібэралу Локу зь яго ідэямі глябальнай грамадзянскай супольнасьці. Па-трэцяе, абгрунтаваньне паняцьця “справядлівай” вайны — характэрная прыкмета імпэрыі. Імпэрыя фармуецца на аснове простай моцы, але імкнецца падаваць сваю моц так, нібы яна стаіць на службе дабра і міру. Вайна робіцца нармальнаю зьявай, надзычайнае — будзённым. Моц ужываецца ня столькі ў геапалітычных, колькі ў дэманстратыўных і дысцыплінарных мэтах. Сіла ўжываецца як вайсковымі сродкамі, так і “мяккімі” — празь сетку

недзяржаўных арганізацый, якія разносяць ідэі імпэрыі ўва ўсе куткі плянэты. Адсюль вынікае чацьвертае вымярэньне імпэрыі: яе галоўная задача заключаецца ў пашырэньні “сфэры кансэнсусу”, які будзе падтрымліваць уладу імпэрыі невайсковымі сродкамі. Аўтары робяць выснову, што сучасная цывілізацыя ўступіла ў стадыю сапраўднай імпэрыі. Сусьветныя падзеі пасьля 11 верасьня, асабліва другая вайна ў Іраку, умацоўваюць імпэрыю. Сапраўды, калі дэканструяваць афіцыйны дыскурс, бачыш, што вайна з Іракам падаецца найперш як “справядлівая”, як нармальная зьява. Дарэчы, ідэя “справядлівай вайны” ўпершыню зьяўляецца ў сьвятога Аўгустына ў яго “Горадзе Бога”. І такая вайна не апошняя (дысцыплінарны момант), яна вялася ад імя ўсяго чалавецтва. Інфармацыйная прапаганда напярэдадні і падчас вайны праводзілася зь вялікім імпэтам (стварэньне кансэнсусу). Што асабліва ўражвае, дык гэта факт, што кніга была напісаная да падзеяў 11 верасьня, у 2000 годзе.

Аўтары робяць рэвэранс у бок Мішэля Фуко, згадваючы яго ідэю дысцыплінаванага грамадзтва. Грамадзтва дысцыплінуецца, а ўлада функцыянуе праз пэўныя інстанцыі, якія прэзэнтуюць лёгіку і межы таго, што можна думаць і рабіць, а чаго — не. Пазычыўшы інструмэнтар у Фуко, аўтары “Імпэрыі” ідуць далей. На зьмену дысцыплінаванаму грамадзтву ідзе грамадзтва кантролю — улада на гэты раз практыкуецца праз машыны (кампутары), якія арганізуюць нашыя мазгі і ўвесь арганізм. Так разумеецца яшчэ адзін фукальдыянскі тэрмін — “біяўлада” — улада, якая імкнецца знутры рэгуляваць форму жыцьця.
Роля нацыянальнае дзяржавы таксама трансфармуецца. Мэта транснацыянальных карпарацыяў — прымусіць дзяржавы зрабіцца проста інструмэнтамі кантролю над плынямі тавараў, грошай і асобаў, накшталт лічыльных машынак ці бухгальтараў. Вельмі істотна для імпэрыі таксама зьнішчыць “экстэрнальны пункт гледжаньня”, аналіз звонку. Нават той, хто крытыкуе імпэрыю, ня можа ведаць праўду, бо ён ёсьць часткай імпэрыі, яго думкі кантралююцца імпэрыяй і толькі імпэрыя ў стане дазволіць яму сказаць тое ці іншае. Як у “1984” Оруэла, толькі без прымусу. Як сказаў нехта зь філёзафаў, самая страшная форма несвабоды — гэта калі вязьні нават не

здагадваюцца, што яны — у турме.
Дзьве рэчы адыгрываюць істотную ролю ў стварэньні закрытай імпэрскай сыстэмы. Першая — грошы. Забаронена мець нейкія іншыя каштоўнасьці, акрамя тых, якія можна абярнуць у грошы. Капітал аддзяляе асобу ад культурна закадаваных традыцыйных тэрыторый. Паняцьця бясцэнных каштоўнасьцяў увогуле не існуе — усё мае сваю цану. Усе формы каштоўнасьцяў пераводзяцца ў адну — грашовую. Пытаньне “колькі ты каштуеш?”, якое спачатку б’е па вушах па прыезьдзе ў Амэрыку, пачынае ўспрымацца як зусім нармальнае.
Другі інструмэнт кантролю — камунікацыя. Праз сродкі масавай камунікацыі фармуецца легітымізацыя імпэрыі, камунікатыўныя каналы пераводзяцца ў спажывецкі фармат і скіроўваюцца на рэпрадукцыю біяўлады імпэрыі.
Імпэрыя ўтварае трохузроўневую структуру. На верхнім узроўні імпэрыя найбольш згуртаваная, яна ўтварае адзіны ўніфікаваны кантрольны ўзровень. На гэтым узроўні знаходзіцца ЗША — гегемон ужываньня абсалютнай улады, ніжэй пад імі — “Вялікая восемка”, Давос, Лёнданскі і Парыскі клюбы. На гэтым узроўні дыктуюцца правілы гульні, якія не павінны абмяркоўвацца. Ад першага ўзроўню ўніз ідуць плыні культурнай і біяпалітычнай улады. На другім узроўні ўлада імпэрыі артыкулюецца транснацыянальнымі карпарацыямі і, трохі ніжэй, нацыянальнымі дзяржавамі — фільтрамі. Нарэшце, унізе знаходзімся мы, простыя сьмяротныя.
Такім чынам, кантроль імпэрыі ажыцьцяўляецца праз тры складнікі. Першы зь іх — гэта атамная бомба, якая абмежавала вайну маштабамі лякальнага канфлікту, але вісіць над чалавецтвам, нібы нейкі абсалют. Другая складовая — грошы (тым больш балюча для імпэрыі было страціць будынкі Сусьветнага гандлёвага цэнтру і тым больш жорстка яна адпомсьціла). Нарэшце, трэці складнік — гэта этэр: камунікацыя, адукацыя, культура (найперш Галівуд).
Аўтары “Імпэрыі” кранаюць шмат пытаньняў — ад посткаляніялізму і аналізу заходняга лібэралізму да распаду СССР. Шкодзяць кнізе толькі шматлікія інтэрлюдыі-маніфэсты антыглябалісцкага пралетарыяту, якімі разбаўлены аналіз амаль у кожнай частцы кнігі. Аўтары разумеюць: наіўна заклікаць зьмяніць сусьветны парадак, імпэрыю, што фармуецца, і вярнуцца да папярэдняга парадку, які дыктаваўся

нацыянальнымі дзяржавамі. Наіўна, калі не сказаць больш. Ня трэба ўзгадваць, колькі мільёнаў людзей гінула ў войнах між нацыянальнымі дзяржавамі ў той стары добры час. Аўтары не заклікаюць абрынуць імпэрыю, як гэта робяць шматлікія антыглябалісты, — не. Імпэрыю трэба трансфармаваць знутры, падрываючы мэханізмы яе кантролю і інсталюючы альтэрнатыўныя, дэмакратычныя мэханізмы. Ні ў якім разе не вяртацца да сыстэмы незалежных дзяржаваў — наадварот, змагацца за яшчэ большую глябалізацыю і ўзаемазалежнасьць. Праўда, Антоніё Нэгры і Майкл Гарт ня кажуць, як гэта рабіць.

5

Але ці не перабольшваюць аўтары “Імпэрыі”? Ня [illegible] Амэрыка настолькі благая, што ўсе астатнія “дрэнныя” рэжымы нават няма сэнсу згадваць? Поль Бэрман, аўтар кнігі “Тэрор і лібэралізм”, не пагаджаецца з такімі радыкальнымі ацэнкамі. Думка знакамітага палітычнага крытыка і лінгвіста Ноама Хомскага, нібыта зьнішчэньне амэрыканскімі ракетамі фармацэўтычнага заводу ў Судане страшнейшае, чым тое, што адбылося 11 верасьня з трыма тысячамі людзей, у Бэрмана выклікае, прынамсі, неўразуменьне. Трэба прызнаць, працягвае Бэрман, што калі-нікалі масавыя палітычныя рухі захапляюцца ідэяй масавага забойства. Лічыцца, што палестынцы-самазабойцы і камікадзэ, якія скіравалі самалёты ў небасягі, “справядліва незадаволеныя становішчам”. Так, палестынцы сапраўды могуць быць незадаволеныя, але, калі некаторыя зь іх зьнішчаюць сябе і мірных людзей, дык, на думку Бэрмана, іх ідэалы такія ж экстрэмальныя, як і іх мэтады.

Для Бэрмана вайна супраць Іраку ці супраць іншых краінаў у будучыні — найперш сучасны лінкальнаўскі праект, лібэральная вайна супраць антылібэральных колаў плянэты. Вызваліць іракцаў з-пад улады Садама — тое самае, што вызваліць паўднёваамэрыканскіх нявольнікаў у часы Лінкальна. Бэрман нават аналізуе Гётысбурскую прамову Лінкальна, зь якой гэты амэрыканскі прэзыдэнт выступіў напярэдадні Грамадзянскай вайны ў ЗША, і нагадвае, што Лінкальн насамрэч заклікаў разьнесьці амэрыканскую рэвалюцыю па ўсёй Зямлі, а ня толькі сярод чорных нявольнікаў поўдня! Гэта пасьля яго заклік быў перайначаны для абгрунтаваньня абмежаваньня амэрыканскай рэвалюцыі

“асобна ўзятай краінай”. Мне гэта вельмі-вельмі нагадвае заклікі да сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, і Бэрман, чалавек адукаваны, напэўна ведае пра такое падабенства. Дарэчы, нэграм пасьля іх вызваленьня прыйшлося чакаць яшчэ амаль сто год, каб ім дазволілі сядзець у аўтобусах разам зь белымі. Колькі ж прыйдзецца чакаць вынікаў сучаснага лінкальнаўскага праекту вызваленым іракцам?

Лібэралізм можа выжыць толькі тады, калі ён падтрыманы рашучасьцю змагацца і, калі трэба, загінуць за яго. Эўрапейцы, на думку Бэрмана, на гэта ўжо ня здольныя. Без амэрыканскай вайсковай машыны эўрапейскія лібэральныя дэмакратыі даўно б ужо пазьнікалі. Разважаньні Бэрмана пра лібэралізм, як ні дзіўна, нагадваюць мне разважаньні Карла Шміта — нямецкага філёзафа і правазнаўцы, якога ў свой час закляймілі як апалягета фашызму і кнігі якога адразу зьніклі з паліцаў. Цяпер адбываецца пэўнае пераадкрыцьцё гэтага філёзафа. Палітычныя тэарэтыкі, незадаволеныя тым ці іншым аспэктам сучаснага лібэралізму, шукаюць адказаў у Карла Шміта. Адрозьненьне палітычнай галіны ад іншых галінаў чалавечай дзейнасьці ў тым, што за каштоўнасьці трэба змагацца, а дыхатамія “сябар—вораг” у палітыцы мае такое ж значэньне, як “дабро—зло” ў маралі ці “прыбытак—страта” ў эканоміцы, пісаў Шміт, а цяпер гэта можна знайсьці ў Бэрмана. Сёньня, калі асноўныя прынцыпы міжнароднага права стаяць пад пытаньнем, Бэрман, Каплан ды іншыя таксама хоцькі-няхоцькі зьвяртаюцца да канцэпту Карла Шміта пра пэрманэнтны “стан экстраардынарнасьці”. (Вызначыўшы галіну “палітыкі”, Карл Шміт ідзе далей і сьцьвярджае, што “дзяржава як палітычная зьява належыць да *jus belli*, рэальнай магчымасьці ў кожнай канкрэтнай сытуацыі вырашыць наконт ворага і спосабу змаганьня з гэтым ворагам”. Вяршэнства права (rule of law) ёсьць бадай што асноўным прынцыпам сучаснай лібэральнай дэмакратыі, калі ўсе пытаньні павінны вырашацца ў межах закону. Такім чынам, асноўнай прыкметай сучаснай дэмакратыі ёсьць нават ня выбарнасьць афіцыйных асобаў, не свабода слова, а незалежны ні ад кога судзьдзя. Але, згодна з Шмітам, спэцыфічна палітычнае пытаньне мае прыярытэт над усімі астатнімі пытаньнямі, у тым ліку юрыдычнымі. Адсюль — пэрманэнтны “стан экстраардынарнасьці”.)

Бэрман ня згодзен як з “наіўнымі” эўрапейцамі, так і з амэрыканскімі кансэрватарамі-рэалістамі. Рэалісты ставяць нацыянальны інтэрас вышэй за астатнія прынцыпы. Бэрман ня згодзен з бачаньнем вайны ў Затоцы як вайны за важкія нацыянальныя інтарэсы (чытай — нафту). Аўтар бачыць гэтую вайну хутчэй як пэўную разнавіднасьць антыфашысцкай вайны. Для яго галоўны той факт, што Садам тыран і іракцаў трэба вызваліць. Гэта перагукаецца з тэрмінам, нядаўна ўжытым знакамітым Фрэнсысам Фукуямам: ісламафашызм. Фукуяма таксама засьцерагаў ад спрошчанага разуменьня вайны толькі як вайны з тэрарызмам ці як вайны з ісламам. На ягоную думку, ідзе вайна з ісламафашызмам — радыкальна нецярпімай, дэструктыўнай і антымадэрнай дактрынай.
Дык якія мэты ставіла вайна ў Затоцы? Для Бэрмана — найперш мэту вызваленьня іракцаў. Праблема, на ягоную думку, толькі ў тым, што адміністрацыя ня здолела дастаткова маляўніча апісаць злачынствы Садама супраць свайго народу. Замест гэтага акцэнт быў зроблены на ірацкай зброі масавага зьнішчэньня, “мае ён яе ці ня мае”. Цяпер, калі такой зброі так і не знайшлі, ідзе дыскусія наконт матывацыі вайны: чаму і хто напісаў плян, як гэта адбылося. Дасьледнікі з розных акадэмічных школаў спрачаюцца, што паслужыла штуршком да вайны. Рэалісты, канструктывісты, постмадэрністы, рэлятывісты, рацыяналісты — кожны тлумачыць па-свойму. Вайна за нафту, за геапалітычнае дамінаваньне, за свабоду іракцаў, помста за замах на жыцьцё Буша-старэйшага (тлумачэньне паводле Фройда), супраць тэрарызму, прэвэнтыўная вайна супраць ужываньня зброі масавага зьнішчэньня? Якая з гэтых прычынаў стала прычынай вайны? Усе і ніводная, здаецца. Калі журналісты спыталіся міністра абароны ЗША Рамсфэлда, ці ён быў распрацоўнікам пляну гэтай вайны, ён адказаў: “Так, я прысутнічаў”. — “Вы прысутнічалі і сплянавалі?” — “Не, я ж цывільная асоба, я толькі задаваў там пытаньні, і мне адказвалі…” — “Але хто сплянаваў?” — “Я ня ведаю, у нас у штабе 500 афіцэраў-плянавікоў, мы некалькі разоў рабілі ваенна-гульнявыя практыкаваньні разам”. Можна, вядома, западозрыць, што Рамсфэлд проста не сказаў праўды, але чамусьці здаецца, што плян вайны жыў сваім жыцьцём, сам сабою. Памятаеце, як у “Ківачы Фуко” Ўмбэрта Эка? Кансьпірацыі ніякай і не было, але

ўсе акторы паводзілі сябе так, як быццам бы была…
Бэрман файна аналізуе розных ворагаў лібэралізму. Нацыстаў, бальшавікоў, ісламістаў, фашыстаў лучыць вечны міт пра падзеньне Бабілёну (ці ня ў Борхеса Бэрман пра гэта прачытаў?). Усе антылібэральныя ідэалёгіі эксплюатуюць адзін сюжэт — жылі-былі жыхары Бабілёну, сапсаваныя раскошай і прагнасьцю, яны заразілі Народ Божы сваімі дрэннымі якасьцямі. Народ Божы можна вызваліць толькі татальнай вайной, у час якой сапсаваныя жыхары Бабілёну будуць зьнішчаныя, а “чысты” Народ Божы — вызвалены.
“Заўсёды існаваў Народ Божы, цэльнае і мірнае жыцьцё якога хтосьці сапсаваў. Пралетарыят, народныя масы — для бальшавікоў, дзеці Рымскай Ваўчыцы — для італьянскіх фашыстаў, гішпанскія каталікі —для фалянгі Франка, арыйцы — для нацыстаў”. І заўсёды былі клятыя касмапаліты: жыды, масоны, разэнкрэйцэры, кітайцы, цыганы, прадпрымальнікі, сіяністы, гомасэксуалісты, дэмакраты, БНФаўцы — сьпіс можна працягваць бясконца, — якія “разбуралі” традыцыі, стабільнасьць, культуру, народ і якіх трэ было пэўным чынам ізаляваць ці зьнішчыць.

Лібэральны ж бок заўсёды падзелены. На лібэральным баку заўсёды ёсьць людзі, і часта іх нямала, якія з разуменьнем ставяцца да пазыцыі антылібэралаў, дапускаючы, што лібэралізм сапраўды дрэнны, сапсаваны. З аднаго боку, адбываецца барацьба лібэралізму з антылібэралізмам, з другога — лібэралізму з самім сабой, што зьяўляецца і сілай, і слабасьцю лібэралізму. Антылібэралізм упэўнены ў сабе. Пакуль ня лясьнецца, як ляснуўся ў 1945 ці 1989 годзе. Бэрман, трэба аддаць яму належнае, не спыняецца на гэтым, ідзе далей і даволі сьмела сьцьвярджае, што ісламізм і іншыя формы антылібэралізму ні ў якай ступені не экзатычныя — наадварот, карані незаходняга экстрэмізму можна прасачыць на самім Захадзе! Так, афіцыйны дыскурс пра вось зла і “дрэнных пацаноў”, той факт, што генпракурор Эшкрафт загадаў прыбраць “паскудныя статуі” (паўголых грэцкіх багіняў) з будынку Міністэрства юстыцыі — ня што іншае, як разнавіднасьць таго самага міту пра Бабілён! Бэрман перасьцерагае як ад наіўнасьці левакоў-лібэралаў, так і ад яшчэ больш небясьпечнай (бо ў іх руках улада) наіўнасьці

нэаконсэрватараў. Бэрман таксама папярэджвае пра сур'ёзнасьць пагрозаў. "Існуе схільнасьць разважаць пра нашага ворага як пра нейкую купку людзей — дзясятак, мо два дзясяткі асобаў, — няма з кім ваяваць. Не выключаю, што падзеі 11 верасьня падрыхтаваныя ўсяго некалькімі дзясяткамі чалавек. Але й Пёрл-Харбар атакавалі толькі некалькі сотняў японскіх лётчыкаў…"

Адказваючы Бэрману, хочацца прывесьці цытату з Зыяўдына Сардара: "Нельга растлумачыць іслам празь дзеяньні камікадзэ, як нельга растлумачыць хрысьціянства газавымі камэрамі ці каталіцызм — праз тэракт у Ома (16 жніўня 1998 году пасярод паўночна-ірляндзкага мястэчка Ома ўзарвалася бомба. 28 чалавек, сярод якіх было 9 дзетак, загінула. Ніводная з групаў не ўзяла адказнасьці за гэтае злачынства. Падазрэньні палі на IRA). Гэтыя дзеяньні па-за верай, гэта дзеяньні людзей, якія даўно сышлі з дарогі Ісламу".

Ян Бурума ў сваёй рэцэнзіі на кнігу Бэрмана ў "New York Review of Books" піша: "Ведама, добра было б, каб Штаты больш рабілі для пашырэньня свабоды і дэмакратыі, дзе і калі толькі можна… Але прынесьці дэмакратыю ў Іран, Саудаўскую Арабію, Паўночную Карэю з дапамогай вайсковай сілы будзе вельмі складана… Перароблiваньне сьвету з дапамогай арміі — ідэя ня новая. Гэткім шляхам ужо ішлі іншыя… але заўсёды пакідалі руіны там, дзе павінны былі пабудаваць утопіі…"

Цяжка не згадзіцца з гэтымі словамі. Непасьлядоўнасьць і пыхлівасьць замежнай палітыкі ЗША можа прывесьці Амэрыку да краху, як нягнуткая палітыка ў дачыненьні да Ізраілю справакавала нянавісьць да ЗША на Блізкім Усходзе. Але я б не адкідаў пасьпяховага прыкладу дэмакратызацыі Нямеччыны і Японіі з такой лёгкасьцю, як гэта робіць Бурума, што адмаўляецца пераносіць той досьвед на наш час. Вынікаў іншы раз даводзіцца чакаць дзесяцігодзьдзямі. Палітычная культура Блізкага Ўсходу патрабуе проста калясальных зьменаў, якія можа даць толькі вайна ідэяў, а не вайна ракетаў. Гэта вайна лібэральных ідэяў супраць ідэяў здранцьвелага, нязьменнага, як кажа Бэрман, грамадзтва, вайна навізны супраць стабільнасьці, вайна ідэі свабоды супраць ідэі абсалюту, ідэі захапленьня рознасьцю супраць ідэі чысьціні і традыцыі.

“Ідэі, якія заваявалі сьвет” Майкла Мандэльбаўма [1] прадстаўляюць інтэлектуальную гісторыю міжнароднага парадку да, у часе і пасьля падзеяў 11 верасьня. Аўтар верыць, што XXI стагодзьдзе, нарэшце, стане векам трыюмфу так званай “трыяды Вільсана”: мір, свабодны рынак і дэмакратыя. Ім няма альтэрнатывы.

У мінулым усе вялікія рэвалюцыі мелі ідэалягічную плятформу, альтэрнатыву ненавіснаму status quo. Лёзунгам Францускай рэвалюцыі былі “свабода, роўнасьць, братэрства”. Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі XIX стагодзьдзя імкнуліся да стварэньня нацыянальных дзяржаваў замест прагнілых імпэрыяў. Рэвалюцыянэры XX стагодзьдзя кінулі заклік “Пралетары ўсіх краінаў, злучайцеся!” з канкрэтнай, хаця й утапічнай праграмай скасаваньня прыватнай уласнасьці й прыходу да ўлады камуністычных партыяў. Тэрарысты 11 верасьня нічога не прапанавалі. Яны дзейнічалі ад імя ісламу, але насамрэч іх нічога ня зьвязвала з традыцыямі вялікай ісламскай цывілізацыі, больш за тое, уся іх плятформа, калі гэта можна назваць плятформай, датычыла толькі мусульманскай часткі, пятнаццаці адсоткаў насельніцтва Зямлі. Гэта толькі падкрэсьлівае, што дамінантныя мадэлі палітычнай і эканамічнай арганізацыі — дэмакратыя і свабодны рынак — ня маюць сур’ёзнай альтэрнатывы ў XXI стагодзьдзі. Нават найбольш актыўныя праціўнікі лібэралізму ня здольныя артыкуляваць альтэрнатыўную праграму. Дэмакратыя і рынак сталі перадумовай сучаснага жыцьця. Краіны, якія не практыкуюць тое ці іншае з трыяды Вільсана, ставяць сябе па-за межамі міжнароднага кансэнсусу. Нават несвабодныя краіны ўводзяць дэмакратычныя інстытуты хаця б для фасаду, нават Садам праводзіў быццам бы “дэмакратычныя” рэфэрэндумы: нават дыктатары ня могуць выжыць без *consensus juris*.

Прыблізна паўкнігі займае інтэлектуальная гісторыя XX стагодзьдзя. Ленінізм, фашызм, сацыялізм прайгралі, бо былі неэфэктыўнымі, нефункцыянальнымі, непапулярнымі, неадкрытымі.

1989 год прынёс *deja vu*. Тое, пра што марыў Вудра Вільсан, ператварылася ў рэальнасьць: зьнік падзел на капіталістычны і сацыялістычны сьвет, на Ўсход і Захад; лібэральныя прынцыпы арганізацыі эканамічнага і палітычнага жыцьця выйшлі пераможцамі. Лібэралізм не зрабіўся раптам унівэрсальным —

да гэтага часу існуюць краіны, якія адкідаюць такую ідэалёгію, — але лібэралізм стаў даміноўным прынцыпам арганізацыі жыцьця. Больш за тое, ні тэрарысты, ні антыглябалісты, ні антылібэральныя рэжымы ня здольныя прапанаваць нешта лепшае за лібэральную трыяду — яны здольныя толькі крытыкаваць яе! Такім чынам, міжнародная сыстэма прапануе “мэню” з трох страваў: дэмакратыя, рынак, мір — і краіны могуць выбіраць, замовіць ім ці толькі заедак, ці адразу галоўную страву, ці “хлебчык з малаком”, ці дэсэрт. Ці ўвогуле — талеркай у падлогу і ўпрочкі з рэстарану, як, напрыклад, Паўночная Карэя ці Ірак. Тады як Чэхія ці Вугоршчына замовілі адразу ўсё мэню.

Кніга Мандэльбаўма напісана лёгкім, чытэльным стылем. [image] Разьдзел “Лекі ад раку” распавядае пра кантроль за ўзбраеньнямі, “Самае небясьпечнае месца на сьвеце” — пра Тайвань і Карэю, “Логавішча драконаў” — пра Блізкі Ўсход. Аўтар параўноўвае трыяду Вільсана з кампутарам. Дэмакратыя — паводле азначэньня ўнутрыкраінная зьява. Ці зьяўляецца пэўная краіна дэмакратыяй, ці не — ад іншых краінаў ніякім абавязковым чынам не залежыць. Пабудова і падтрыманьне дэмакратыі — гэта як зборка і эксплюатацыя кампутара. Арганізацыя і падтрыманьне кантролю за ўзбраеньнямі больш падобныя да наладкі і падтрыманьня кампутарнай сеткі, якая злучае розныя кампутары паміж сабою. Рынкі патрабуюць і аднаго, і другога: і падтрыманьня асобных кампутараў-эканомік, абароны іх ад вірусаў, і падтрыманьня кампутарнай сеткі. Падтрымліваць расейскі Pentium III (яшчэ не IV) з даламаным беларускім “макінтошам” у адной сетцы будзе вельмі складана.

“Лібэральная трыяда Вільсана, — піша Мандэльбаўм, — мір, дэмакратыя, свабодны рынак — атрымала прыкладна такі ж статус, як і пісьменнасьць: яна распаўсюджаная і пануе, але не ўнівэрсальная. Традыцыйныя, ці нелібэральныя мэтады арганізацыі палітычнага і эканамічнага жыцьця ня больш легітымныя і лягічныя, чым апэляцыя да непісьменнасьці”. Мандэльбаўм — аптыміст, далёкі ад наіўных прадказаньняў. Ён разумее рэальныя праблемы, незавершанасьць лібэральнага праекту і небясьпекі, што перад ім стаяць. Тое, чаго ўсе чакалі ў эўфарыі 1989 году, — усеагульнага дабрабыту, міру і шчасьця

— не адбылося. Разумее ён і пэўныя разыходжаньні паміж заходняй рыторыкай і заходняй палітыкай. Падтрымка дэмакратыі, дапамога дэмакратыі — гэтыя словы ня несьлі канкрэтнага сэнсу. На думку Мандэльбаўма, усё залежыць ад “тыраніі культуры”. “Функцыянаваньне дэмакратычных і эканамічных інстытутаў моцна залежыць ад таго, якія каштоўнасьці дамінуюць у грамадзтве”. Важным крокам на шляху да рынку і дэмакратыі будзе разуменьне і культывацыя гэтага “культурнага клею”. Такія зьмены не адбываюцца за адзін дзень. Найлепшай адзінкай вымярэньня будзе жыцьцё аднаго пакаленьня, бо для зьмены каштоўнасьцяў, якія прэвалююць у грамадзтве, трэба, каб на зьмену асобам, чый жыцьцёвы досьвед ужо сфармаваў пэўныя каштоўнасьці, прыйшло другое пакаленьне, якое ў іншы час і пры іншых абставінах атрымала іншыя каштоўнасьці. Разуменьне і прыняцьце іншых каштоўнасьцяў, як і вывучэньне замежнай мовы, з гадамі ўскладняецца: чым старэйшы чалавек, тым цяжэй яно даецца. У нармальных абставінах грамадзтва зьмяняецца праз пакаленьне”.

І тутака заходнія краіны сутыкнуліся з пэўным парадоксам. Немагчыма дабіцца прыняцьця лібэральнага парадку ўсімі краінамі сьвету пры дапамозе старых мэтадаў замежнай палітыкі. Традыцыйныя спосабы — зброя і грошы, абяцаньні і пагрозы, бізун і пернік — не даюць эфэкту. Інсталяцыя лібэральнага парадку ў сьвеце менш залежыць ад таго, што краіны робяць па-за сваімі межамі (прынцыпы сучаснай міжнароднай сыстэмы), чым ад таго, як яны разьвіваюцца ўнутры гэтых межаў, як яны самавызначаюцца. Наконт гэтага існуе жарт: “Колькі псыхіятраў патрэбна, каб памяняць лямпачку?” — “Ніводнага. Бо лямпачка павінна памяняць сябе сама”. Джордж Дабл’ю вырашыў выкруціць лямпачку сам, не чакаючы, пакуль яна перагарыць ці калі пагасьне сьвятло ўва ўсім пакоі. Буш засьцярог, што вайна ня будзе кароткай. Напэўна, вайна будзе такой доўгай, што Буш не дачакае “Параду Перамогі над тэрарызмам” у Вашынгтоне, калі калёны зялёных барэтаў будуць кідаць зялёныя сьцягі ісламскіх тэрарыстычных групаў да падножжа мэмарыялу Лінкальна, а Рамсфэльд на белым кані і Вулфавіц на чорным будуць камандаваць парадам. Гэта здарыцца ўжо пры другой адміністрацыі. Магчыма. Некалі.

На адным жартоўным постэры з Інтэрнэту табе ў вочы ўглядаецца Джордж У.Буш. Надпіс: “Вы яшчэ ня верыце ў дэмакратыю? Тады мы ляцім да вас!”
А вы верыце ў дэмакратыю?

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Норман Мэйлер

Толькі ў Амэрыцы

НОРМАН МЭЙЛЕР — адзін з самых вядомых амэрыканскіх пісьменьнікаў, рэфарматар дакумэнтальнага раману, двойчы ляўрэат Пулітцэраўскай прэміі (1969, 1980). У 1960—70-я ён распрацаваў новы журналісцкі стыль, перанесшы раманную стылістыку і аўтабіяграфізм у рэпартажныя, камэнтарныя, публіцыстычныя тэксты. Ён нарадзіўся ў

Мэйлеравы раманы часта выклікалі спрэчкі з прычыны ягонага нанканфармісцкага стылю і непрымальнага для многіх погляду на амэрыканскі лад жыцьця. У 1960—70-я ён прадаваў палітычным камэнтатарам і эсэістам у мужчынскіх часопісах “Playboy”, “Esquire”, а таксама інтэлектуальных выданьнях, такіх, як “Commentary”, “The New York Review of Books”, сябрам выканкаму і прэзыдэнтам (1984—86) Амэрыканскага ПЭН-Цэнтру. У 1969 годзе балятаваўся ў мэры Нью-Ёрку ў якасьці незалежнага кандыдата. Ён быў шэсьць разоў жанаты і мае дзявяцера дзяцей. У 1970-я ён стаў мішэньню для фэміністак, у тым ліку і Кейт Мілет (гл. “Сэксуальная палітыка” ў “ARCHE-Кабеты”). Ён аўтар сцэнару да фільму “Аднойчы ў Амэрыцы” (1984), біяграфіі Лі Харві Освальда “Казка Освальда” (1995). Ягоны апошні раман “Эвангельле ад Сына” (1997) — гэта напісаная ад першай асобы справаздача пра жыцьцё не чужога нічому людзкаму Ісуса Хрыста. Ягоная апошняя кніга — “The Spooky Art” (2003), зборнік артыкулаў пра літаратуру. Перакладзены тутака артыкул зьявіўся ў “The New York Review of Books” 27 сакавіка. Друкуецца з ласкавай згоды аўтара.

Нью-Джэрзі (1923), вырас у Брукліне, вучыўся ў Гарвардзкім універсітэце і Сарбоне, ваяваў на Шэсці кантынентах. У 1949-м ён пачаў “Кампанію” і быў прызнаваўся, што гэта дапамагло яму стаць добрым пісьменнікам.

1

Мабыць, калі адміністрацыя Буша пачала настойваць на вайне з Іракам, сувязі паміж Садамам Хусэйнам і Асамам бін Ладэнам сапраўды былі мінімальнымі. Сьпярша гэта быў першы зь іх не даверaў другому, і наадварот. Для бін Ладэн быў праблемным чалавекам, рэлігійным фанатыкам — гарматай, якая страляе сама сабою, баевіком, якога цяжка кантраляваць. Для бэн Ладэна Садам быў паганым, неўраўнаважаным паўдуркам, найвялікшыя авантурызм якога нязьменна сканчаліся праваламі.

Акрамя таго, Садам і бэн Ладэн супернічалі. Кожны з іх змагаўся за сьветлую будучыню мусульманскага сьвету: бэн Ладэн, здавалася, думаць, дзеля прымнажэньня славы Алагавай, а Садам — дзеля зямнога задавальненьня ад бязьмежнага пашырэньня ўлады. Даўней, калі існавала Брытанская імпэрыя, каляніяльная ўлада здолела б нацкаваць Садама на Кувэйт або наадварот. Адным з старых правілаў віктарыянскай дыпляматыі было: “Дазвольце хворым высьветліць адносіны між сабой, пасьля разьбярэцеся з тымі, хто выжыў”.

Сёньня, аднак, мэты памяняліся. Бясьпека ня лічыцца чымсьці, пакуль не дасягнутая абсалютная вайсковая перамога. Адпаведна, першай рэакцыяй амэрыканцаў на падзеі 11 верасьня быў намер зьнішчыць бэн Ладэна і “Аль-Каіду”. Аднак калі кампанія захопу лідэра фундамэнталістаў у Аўганістане пацярпела паразу — нават немагчыма было зразумець, жывы ён ці мёртвы, гульня павінна была перайсьці ў новае рэчышча. Белы Дом вырашыў, што сапраўдны злыдзень сядзіць у іншым месцы, што гэта не “Аль-Каіда”, а Ірак. Палітычныя лідэры і дзяржаўныя дзеячы — сур’ёзныя людзі, нават калі яны здаюцца ідыётамі, і яны вельмі рэдка дзейнічаюць бязь нейкай глыбіннай, усьвядомленай для сябе прычыны. Менавіта пра гэтыя матывы адміністрацыі Буша я хацеў бы зараз паразважаць. Я паспрабую зразумець, што менавіта бачаць у якасьці лёгікі свайго цяперашняга рызыкоўнага пачыну прэзыдэнт і ягоная каманда.

Распачну з справаздачы Коліна Паўэла перад ААН 5 лютага. Справаздача, у якой кожны пункт быў дэталізаваны, рабілася, каб давесьці, што Садам Хусэйн (а гэта ні ў кога не выклікала вялікага зьдзіўленьня) парушаў усе правілы правядзеньня

інспэкцыяў, якія толькі мог. У Садама быў выдатны нюх на выклікі часу. Ён разумеў, што чым стараньней ставіць палкі ў колы моцных гэтага сьвету, тым больш яны стомяцца ад нуды, якая апаноўвае, калі маеш справу з закончаным хлусам, які памайстэрску ўнікае ад усіх раней узятых на сябе абавязкаў. Быць абсалютным ілгуном — талент вялікі. Калі вы ніколі ня кажаце праўды, вас настолькі ж цяжка зачапіць, як і сумленнага чалавека, які ніколі ня маніць. Калі вам скажуць, што вы толькі што прысягнулі ў супрацьлеглым таму, што вы прызнавалі ўчора, вы заяўляеце: “Я ніколі не казаў гэтага”, — або, калі вашыя словы пацьвярджаюцца запісам, абвяшчаеце, што вашыя словы крайне няверна інтэрпрэтаваныя. З дапамогай такіх маніпуляцый у шэрагі апанэнтаў уносіцца зьбянтэжанасьць. Такім чынам Садам здолеў ператрываць усе сем гадоў інспэкцыяў з 1991 да 1998-га. Ён уклаў шмат угодаў (большасьць зь іх патаемна) з французамі, немцамі, расейцамі, ярданцамі; сьпіс доўгі. Ён таксама ўмеў іграць на спачуваньні Трэцяга сьвету. Ён пераканаў шмат добрых сэрцаў на ўсіх кантынэнтах. Бязьлітасная Амэрыка морыць голадам ірацкіх дзяцей. Ірацкія дзеці сапраўды цярпелі ад эмбарга, выкліканага палітыкай Садама, але ж, калі б нават яны і не цярпелі, Садам сам патрымаў бы на хлебе й вадзе з дваццаць шасьцігодак, каб арганізаваць адпаведную фатаграфію для распаўсюду па ўсім сьвеце. Іраку прыйшлося ня соладка, і ён быў у стане гэта давесьці. Садам так добра гуляў у свае гульні, што дабіўся спыненьня інспэкцыяў у 1998 годзе.

І раней, у тым ліку і ў Белым Доме, вяліся размовы пра адпраўку войскаў у Ірак у адказ на такі сабатаж рашэньняў ААН. На жаль, прыгода Клінтана з Монікай Левінскі паралізавала папярэдняга прэзыдэнта. У атмасфэры грамадзкага скандалу ён ня мог дазволіць сабе праліцьця нават кроплі амэрыканскай крыві. Доказам таму было Косава, куды амэрыканская пяхота не ўвайшла разам зь сіламі NATO і дзе нашыя бамбавікі не заляталі ў зоны ахопу сэрбскай зэнітнай артылерыі. Бамбілі з вышыні 15000 футаў і болей. Такім чынам, пра Ірак гаворкі ісьці не магло. Ал Гор у той час, без сумневу, іграў ролю ястраба, імкнучыся палепшыць свой імідж перад будучай прэзыдэнцкай кампаніяй і, учапіўшыся за нагоду, ператварыцца з чэзьліка ў асілка — неабходная

перадумова для прэзыдэнцтва, — але слабасьць пазыцый Клінтана зьвяла ўсе пляны на нішто.
Такім чынам, у 1998-м Садам Хусэйн выйшаў з вады сухі. З тых часоў ніякіх інспэкцыяў не праводзілася. Прамова Коліна Паўэла поўнілася справядлівым абурэньнем на несумленныя і дзёрзкія паводзіны Садама-злыдня, але Паўэл, вядома ж, занадта разумны чалавек, каб дзівіцца пададзенаму пераліку злачынстваў. Прамова мела на мэце падрыхтаваць амэрыканцаў да ўступленьня ў вайну. Калі меркаваць з сацыялягічных апытаньняў, палова насельніцтва была не гатовая да такога павароту падзеяў. І гэтая частка ягонай прамовы, вядома, мела вялікі посьпех. Доказам была зьмена ў пазыцыі многіх сэнатараў-дэмакратаў, якія раней вычэквалі, а цяпер заявілі пра сваю падтрымку гэтага рызыкоўнага пляну. Так-так, яны таксама былі гатовыя да вайны.
Самым слабым месцам у паўэлаўскай прэзэнтацыі відавочных фактаў было, аднак, абвінавачаньне ў сувязях паміж Іракам і “Аль-Каідай”. Гэта адразу кідалася ў вочы. За выключэньнем Вялікай Брытаніі, сталыя сябры Рады Бясьпекі — Францыя, Кітай і Расея — відавочна не імкнуліся задаволіць жаданьне Буша распачаць вайну як мага хутчэй. Яны хацелі атрымаць пэўны час на наладжваньне ўзмоцненых інспэкцыяў, схіляючыся да правядзеньня палітыкі стрымліваньня ў дачыненьні да Іраку.
Не прайшло й тыдня, як канал “Аль-Джазіра” прэзэнтаваў запісанае інтэрвію бэн Ладэна, у якім той зрабіў некалькі намёкаў, што ён і Садам гатовыя, у прынцыпе, увайсьці ў адкрыты кантакт, хоць пры гэтым ён і назваў “сацыялістаў” у Багдадзе “няверным”. Але гэтае апошняе сьцьверджаньне ўваходзіла ў супярэчнасьць з папярэднім цьверджаньнем: “Ня шкодзіць, што пры гэтых умовах [нападу Захаду] інтарэсы мусульман [будуць у канчатковым рахунку] пярэчыць інтарэсам сацыялістаў у барацьбе супраць новых крыжакоў”. Бэн Ладэн, магчыма, пажадаў застацца неадназначным і двухсэнсоўным у сваіх ацэнках, але, тым ня менш, меркаваньне пра адзінства інтарэсаў “Аль-Каіды” і Садама таксама прысутнічала ў прамове. Што здарылася, нарэшце? Вораг ворага Садама стаўся Садамавым сябрам? Калі гэта так, гэта катастрофа. Бо пасьля перамогі над Іракам нам усё яшчэ будуць пагражаць беды, выкліканыя гэтым вайсковым

умяшаньнем. Бо ірацкая зброя масавага зьнішчэньня можа трапіць у рукі бэн Ладэна.
Бяз той зброі рэсурсы “Аль-Каіды” абмежаваныя. Але калі б Садам перадаў нават малую долю сваіх запасаў бактэрыялягічнае і хімічнае зброі бэн Ладэну, небясьпечнасьць “Аль-Каіды” ўзрасла б шматкроць.
Джордж Буш, які ціснуў на амэрыканцаў з мэтай дабіцца як мага хутчэйшага ўступленьня ў вайну з Іракам, раптам сутыкнуўся з выключным варыянтам контрастратэгіі Садама. Той быццам казаў: “Дазвольце мне падманваць інспэктараў, і вы будзеце заставацца ў адноснай бясьпецы. Можаце быць пэўныя, я не пабягу аддаваць сваё найлепшае абсталяваньне Асаму, пакуль мы зможам бясконца цацкацца з інспэкцыямі. Калі ж пачняце вайну з мной, Асама будзе рады. Магчыма, вы й пераможаце мяне, але ён і ягоныя людзі будуць радыя. Будзьце пэўныя, ён хоча, каб вы пачалі вайну з мной”.
Улічваючы, што такое разгортваньне падзеяў было прадказальным ад пачатку, можна было б запытацца, як пытаюцца цяпер шмат хто з амэрыканцаў: “Як мы далі ўзьнікнуць такой дылеме — гэтаму чортаваму выбару бяз выбару?”

Тым часам сьвет з жахам рэагаваў на Бушаву ўстаноўку на пачатак вайны. Эўрапейскае выданьне часопісу “Time” правяло апытаньне на сваім вэб-сайце: “Якая краіна нясе найбольшую небясьпеку для міру на ўсім сьвеце ў 2003 годзе?” Былі атрыманыя 318 000 адказаў, якія разьмеркаваліся такім чынам: Паўночная Карэя — 7%; Ірак — 8%; Злучаныя Штаты — 84%... Як заўважыў Джон лё Карэ ў “The Times”, “Амэрыка ўступіла ў адзін з сваіх пэрыядаў гістарычнага вар’яцтва, але гэты найгоршы з усіх, якія я памятаю”.
Гаральд Пінтэр быў яшчэ менш дыпляматычны:

“...Амэрыканскі ўрад цяпер — гэта крыважэрная дзікая жывёла. Бомбы — вось адзіная яе мова. Шмат амэрыканцаў, мы ведаем, шакаваныя пазыцыяй свайго ўраду, але яны нічога ня могуць зрабіць. Калі Эўропе ня хопіць салідарнасьці, інтэлекту, мужнасьці і жаданьня, каб кінуць выклік і супраціўляцца амэрыканскай моцы, сама Эўропа будзе заслугоўваць на словы Аляксандра Герцэна: “Мы ня лекары. Мы хвароба”.

Згодна з паведамленьнем агенцтва “Reuters”, 15 лютага больш за чатыры мільёны чалавек “ад Бангкоку да Брусэлю, ад Канбэры да Калькуты… выйшлі на вуліцы, каб асудзіць Буша як крыважэрнага падпальніка вайны”.

2

Кароткі агляд двух гадоў прэзыдэнцтва Джорджа Буша можа кінуць некаторае сьвятло на тое, чаму мы знаходзімся там, дзе мы ёсьць. Буш пачаў выконваць свае службовыя абавязкі ў пэрыяд, калі існавала магчымасьць эканамічнага спаду, дадайце сюды ўвесь нядобры арэол вакол ягонага ўступленьня на пасаду ў выніку ці то правільнага, ці то няправільнага падліку галасоў выбарцаў. Амэрыка зноўку пераканалася, што рэспубліканцы ўспадкавалі выдатную здольнасьць для вядзеньня бруднай юрыдычнай барацьбы. Рэспубліканская кампанія захопу Флорыды ў 2000 годзе нагадала апэрацыі вядомых адвакатаў і банкіраў 125-гадовае даўніны, якія з халоднай вытрымкай і пякельнай хцівасьцю пазбаўлялі ўдоваў правоў карыстаньня сваімі дамамі ці фэрмамі. Гэныя адвакаты ды банкіры і блізка ня мелі пачуцьця віны. Іхныя душы абараняў своеасаблівы маральны эквівалент тэфлёну. Моляцца ў нядзелю, а ў панядзелак ужо замыкаюць царкву. Вядома ж, гэта іх нашчадкі перамаглі ў Флорыдзе. Дэмакраты наіўна верылі, што будуць выконвацца пэўныя правілы гульні. Яны не разумелі, што пры пэўнай вышыні ставак аб правілах можна забыцца.

Легітымнасьць Буша была ад самага пачатку пад пытаньнем, а выкананьне ім прэзыдэнцкіх абавязкаў выклікала кпіны. Калі ён гаварыў сваімі словамі, гэта глядзелася праставата. Калі ж ён зачытваў прамовы, напісаныя падначаленымі, больш здольнымі ў перадачы думак у форме словаў, яму не даваліся складаныя словы. 11 верасьня зьмяніла ўсё. Уражаньне было такое, што нашыя тэлевізары ажылі. Доўгія гады мы назіралі разнастайныя драматычныя пэрыпэтыі па тэлевізары — і толькі. Мы былі адасобленыя ад гэтага. Толькі сотая частка нашых душаў зазірала па той бок экрану і зьведвала страх. Цяпер, абсалютна нечакана, жах перайшоў у рэальнасьць. Багі й дэманы заваёўвалі ЗША проста з тэлеэкранаў. Гэтым можа часткова тлумачыцца тое дзіўнае пачуцьцё віны, якое шмат каго агарнула пасьля 11 верасьня. Здавалася, быццам сіла

нябесная грымнула гневам.
І, вядома, мы не маглі не адчуваць віны за 11 верасьня. Маніякальная “грашовая ліхаманка” дзевяностых заўжды суправаджалася нашай усёпранікальнай “амэрыканскай віной”. Мы цешыліся сваёй заможнасьцю, але ўсё яшчэ адчувалі сябе вінаватымі. Мы хрысьціянская нацыя. Часьцінка “юдэя-” ў слове “юдэяхрысьціянская” — гэта мэлізм. Шмат слаўных хрысьціянаў у Амэрыцы прыпускае, што быць настолькі багатымі нядобра. Бог наўрад ці хацеў гэтага. Ісус дакладна не хацеў. Нельга назьбірваць столькі багацьця. Трэба праводзіць сваё жыцьцё ў альтруістычных учынках. Тым ня менш, гэта толькі адна палова добрай хрысьціянскай душы. Другая палова, чыста амэрыканская, цягне сваё: мачыце ўсіх. Тут можна зрабіць жорсткую, але без сумневу дакладную заўвагу: быць звычайным амэрыканцам — значыць жыць як у аксюмаране. Быць добрым хрысьціянінам, але ўвесь час прыкладаць намаганьні, каб заставацца канкурэнтаздольным. Вядома, Ісус і Івэл Кнівэл* ня вельмі добра ўжываюцца ў адной душы. Чалавечы гнеў і пачуцьцё віны набываюць унікальныя амэрыканскія формы.
Нават да 11 верасьня ў многім адчуваўся разлад. Духоўная архітэктоніка Амэрыкі пачынаючы з часоў другой сусьветнай вайны падтрымлівалася нашымі амаль легендарнымі ўстановамі бясьпекі, сярод якіх найбольш выбітнымі былі ФБР і Каталіцкі касьцёл, тоесныя ў асаблівай няўлоўнай высакароднасьці з Канстытуцыяй і Вярхоўным Судом.

Па ўсёй гэтай сыстэме былі нанесеныя моцныя ўдары. Старыя і новыя скандалы ў ФБР лучылі ў цэнтар увагі грамадзтва пасьля выпадку Гансэна, які выйшаў на паверхню ў лютым 2001 году. Звышпабожны каталік Робэрт Гансэн быў агентам савецкай выведкі, які легальна пражыў у Амэрыцы 15 гадоў. Ніхто ў ФБР ня мог даць веры гэтаму. Ён жа здаваўся найбольшым антыкамуністам з антыкамуністаў! Далей пасьля 11 верасьня пачаліся судовыя працэсы служкаў каталіцкай царквы, абвінавачаных у пэдафіліі, і гэта растравіла маральныя раны ў многіх добрых каталіцкіх парафіях. Зразумела, гэта балюча зачапіла ксяндзоў. Як мог малады чалавек ці салідны мужчына ў сутане ісьці па вуліцы і не пакутаваць ад таго, што парафіяне ў яго на дарозе адводзяць ад яго вочы ці нацягнута вітаюцца

зь ім?
Фондавы рынак працягваў падаць. Павольна, але стабільна расло беспрацоўе. Скандалы ў кіраўніцтве карпарацыяў сталі больш значнымі. Амэрыка мірылася з працяглай экспансіяй карпарацыяў у амэрыканскае жыцьцё пачынаючы з канца другой сусьветнай. Для Злучаных Штатаў яны былі залатым цялём. Але гэта было бруднае цяля, якое выпускала сьмярдзючыя газы хлусьні і маніпуляваньня, робячы надзвычайную стаўку на рэкляму. Выдаткоўвайце менш сродкаў на выраб прадукту, але надавайце вялікую ўвагу ягонаму прасоўваньню на рынку. Маркетынг быў той пачварай і сілай, якая дасягнула вялікіх посьпехаў у забіраньні Амэрыкі ў большасьці з нас. Пачынаючы з 1945 году ён дасягнуў вялікіх посьпехаў у пераўтварэньні сьвету ў менш прыемнае месца для жыцьця. Варта ўзгадаць толькі пяцідзесяціпавярховыя хмарачосы, у форме якіх ня больш фантазіі, чым у кардоннай каробцы з бальконамі, або ўнівэрсамы, аточаныя нізкаякаснымі каапэратыўнымі шматпавярховікамі, супэраўтастрады з тымі месячнымі краявідамі, што адкрываюцца зь іх, і, урэшце, покрыва пластмасы, усюдыіснай пластмасы, ад якой занікае дотык у дзяцей, пластмасы, лідэркі ў чэмпіянаце рэчываў, што змагаюцца за першынство ў ператварэньні сьвету ў менш прыемны. У распаўсюджваньні гэтае гідоты мы ўжо дасягнулі ў сваім родзе сусьветнай гегемоніі. Мы экспартавалі ўсёабсяжную эстэтычную пустэчу найбольш магутных амэрыканскіх карпарацыяў. Ніводнага новага сабору не збудавалі для беднякоў, — толькі шаснаццаціпавярховікі, ад якіх душа сохла.
Пасьля наступіла пара выкрыцьця фінансавых махінацый і забруджваньня навакольнага асяродзьдзя, якія несьлі з сабой карпарацыі. Ненажэры ад эканомікі не маглі наталіць сваіх апэтытаў. Няма такой сфэры бізнэсу, у якой бы не былі выкрытыя крымінальныя злачынствы на самых высокіх узроўнях. Калі б не 11 верасьня, Джордж Буш быў бы змушаны існаваць у неспрыяльнай інфармацыйнай атмасфэры. Можна нават сказаць, што Амэрыка перанесла шэраг удараў, якія ў сваім значэньні ня так ужо й розьніліся ад таго, што адбылося зь немцамі пасьля першай сусьветнай вайны, калі інфляцыя зьнішчыла фундамэнтальную нямецкую ідэю асобы, якая палягала ў тым, што калі чалавек цяжка працуе і ашчаджае

грошы, дык яму гарантаваная забясьпечаная старасьць. Верагодна, Гітлер так і не прыйшоў бы да ўлады празь дзесяць гадоў, калі б ня тая карказломная інфляцыя. Калі мераць той жа самай меркай, 11 верасьня зрабіла штосьці падобнае для амэрыканскага пачуцьця бясьпекі.

У адказе на гэтыя выклікі кансэрватары падзяліліся на дзьве плыні. Кансэрватары-традыцыяналісты, такія, як Пэт Б'юкенэн, меркавалі, што Амэрыка павінна засяродзіцца на сабе і шукаць вырашэньня тых з сваіх праблемаў, якія яна ў стане рашыць. Б'юкенэн быў лідэрам кансэрватараў старога гарту, што вераць у сям'ю, краіну, веру, традыцыю, дом, цяжкую і сумленную працу, абавязак, адданасьць і збалянсаваны бюджэт. Ідэі, паняцьці і прыхільнасьці Джорджа Буша збольшага несумяшчальныя з кансэрватызмам Б'юкенэна.

Буш быў не такоўскі. Аднак розьніца між ягонай і традыцыйна-кансэрватыўнай школамі мысьленьня магла стварыць дыхатамію настолькі ж выразную, як адрозьненьне паміж камуністамі і сацыялістамі пасьля першай сусьветнай вайны. "Брэндавыя кансэрватары", падобныя да Буша, на словах вызнавалі некаторыя кансэрватыўныя каштоўнасьці, але, у прынцыпе, на гэтыя вартасьці ім было глыбока напляваць. Калі яны ўсё яшчэ карысталіся кансэрватыўнай тэрміналёгіяй, дык толькі з мэтай не дапусьціць звужэньня сваёй палітычнай базы. Яны выкарыстоўвалі брэнд. Яны любілі словы кшталту "зло". Адной з найгоршых памылак Бушавай рыторыкі — калі ўгледзецца ў глыбіню таго рогу, зь якога ўсяго многа, — было празьмернае выкарыстаньне гэтага слова, нібы кнопкі, пры націсканьні на якую ён узмацняў сваю палітычную моц. Калі людзям ставяць кропельніцу з болеспаталяльным наркотыкам, які ўводзіцца ім на запатрабаваньне, некаторыя пацыенты ціснуць і ціснуць на пімпачку, каб атрымліваць новыя і новыя дозы. Буш выкарыстоўвае зло як наркотык для найбольш падаўкой часткі амэрыканскай публікі. Безумоўна, у ягоным разуменьні ён робіць гэта, бо верыць, што Амэрыка — добрая краіна. Ён сапраўды лічыць гэтую краіну адзінай надзеяй сьвету. Ён таксама баіцца, што краіна хутка робіцца больш распуснай і адзіным выйсьцем можа быць — о, рашучыя, магутныя і амаль сьвятыя словы — змаганьне за стварэньне Ўсясьветнай Імпэрыі. За жаданьнем пачаць вайну з Іракам хаваецца прага займець моцную вайсковую прысутнасьць на

Блізкім Усходзе як першы крок да захопу кантролю над усім сьветам.
Я не пабаюся сказаць наступнае: у аснове брэндавага кансэрватызму ляжыць не вар'яцтва, а нераскрытая лёгіка. Хоць мае словы на першы погляд гучаць нелягічна, яны набываюць лёгіку, калі вы прымаеце іх перадумовы. З ваяўніча-хрысьціянскага пункту гледжаньня Амэрыка амаль прагніла. Забаўляльныя СМІ паказваюць абы-што. Голыя пупкі поп-зорак на экранах гавораць самі за сябе настолькі ж красамоўна, як вочы дзікіх жывёлаў. Даходзіць да таго, што дзеці яшчэ ня ўмеюць чытаць, але ўжо ўмеюць трахацца. Такім чынам, Беламу дому можна нагадаць, што калі з Амэрыкі хочацца зрабіць аграмадную міжнародную баявую машыну, якая б крышыла ўсіх сваіх праціўнікаў, дык усю амэрыканскую сэксуальную свабоду, увесь гэты гармідар геяў, фэмініstак, лесьбіянак, трансвэстытаў, прыйдзецца зноў загнаць у падпольле — зашмат раскошы. Адданасьць, патрыятызм і самаахвярнасьць ізноў стануць галоўнымі нацыянальнымі каштоўнасьцямі (і крывадушша будзе іх суправаджаць). Калі ўжо мы робімся ўвасабленьнем старажытнай Рымскай імпэрыі ў дваццаць першым стагодзьдзі, маральная рэформа магла б аказацца вельмі дарэчы. Узброеныя сілы, несумненна, вылучаюцца большым пурытанствам, чым забаўляльныя СМІ. Жаўнеры, вядома, у баі і ў мірны час большыя вар'яты, чым звычайныя людзі, але падпарадкаваньне загадам зьверху — інструмэнт штодзённага ціску на жаўнераў — магло б стаць таксама магутным цэнзарам у мірным жыцьці.

Для брэндавых кансэрватараў вайна падаецца найлепшым магчымым выйсьцем. Ісус і Івэл Кнівэл урэшце могуць зьяднацца. Змагайцеся з злом, змагайцеся зь ім, пакуль яно не загіне! Выкарыстоўвайце гэтыя словы пятнаццаць разоў у кожнай прамове.
У амэрыканцаў ёсьць бзік. Гэты бзік — упэўненасьць, што мы, амэрыканцы, можам усё. Оў, е! — усклікаюць брэндавыя кансэрватары, мы дамо рады таму, што чакае нас папярадзе. Мы маем навыкі і ўменьні. Мы будзем лёгка пераадольваць перашкоды. Брэндавыя кансэрватары шчыра вераць, што Амэрыка ня проста здатная кіраваць сьветам, але і *мусіць* рабіць гэта. Без адданасьці ідэі Імпэрыі краіна канчаткова

сапсуецца. Гэта, як я мяркую, галоўны падтэкст ірацкага праекту, і брэндавыя кансэрватары могуць нават не здаваць сабе з гэтага справы; прынамсі, ня ўсе яны ўсьведамляюць гэтага падтэксту. Пакуль ня ўсе.
Акрамя таго, Буш мог разьлічваць на некалькі іншых важных пачуцьцяў, якія вельмі ўплываюць на наша штодзённае жыцьцё. Пачнем з таго, што амэрыканскі гонар грунтуецца сёньня на трох кітох: вялікіх грошах, спартовых дасягненьнях і зорна-паласатым сьцягу. Дзесьці траціна нашых галоўных спартовых арэнаў носяць назвы карпарацыяў (напрыклад, “Gillette”, “FedEx”). Сёлета Супэркубак НФЛ распачаўся з цырымоніі ссоўваньня амэрыканскага штандара (памерам з футбольнае поле) зь дзірвану стадыёну. Вайскова-паветраныя сілы ЗША прадчуваюць наперадзе вялікую “мёртвую пятлю”. Ці не палова Амэрыкі мае невымоўнае жаданьне пачаць вайну. Гэта задавальняе нашую міталёгію. Амэрыка, як аказваецца паводле нашае лёгікі, зьяўляецца адзінай сілай дабра, якая можа адолець зло. Джордж Буш дастаткова добры матэматык, каб вырашыць гэтае раўнаньне без чужых падказак. Ён мо лепш, чым хто іншы, адчувае, як вайна з Іракам задаволіць нашую прагу тэлевізійных відовішчаў. Ад відовішча вайны людзі “балдзеюць” — а яны сапраўды “балдзеюць”, — бо з кожным годам Амэрыка хамее. Але, але! Вайна — гэта ж таксама супэрская тэлегульня.

3

Самым непасрэдным чынам (хоць і не па адрасе) вайна з Іракам задаволіць нашую патрэбу адпомсьціць за 11 верасьня. Няважна, што Ірак ні пры чым. Бушу папросту ня варта зьвяртаць увагі на такую дробязь. Што ён і робіць з усёй сілай чалавека, які ніколі не чырванеў за свае ўчынкі. Садам, нягледзячы на ўсе ягоныя злачынствы, ня меў дачыненьня да падзеяў 11 верасьня, але прэзыдэнт Буш — філёзаф.
11 верасьня было злом і Садам — зло, а ўсё зло зьвязанае між сабою. Адпаведна, Ірак — гэта зло. Прэзыдэнт таксама “пападае ў струмень” з многімі нэакансэрватарамі ў сваёй адміністрацыі, якія лічаць, што іслам — гэта Гітлер сёньня ў дачыненьні да Ізраілю. Абарона Ізраілю — гэта плюс для Буша, улічваючы прыхільнасьці электарату; але гэта таксама канечная патрэба, асабліва з увагі на тое, што Шаронам не

пакамандуеш. Шарон моцна трымае Буша ў руках. У Шарона ў руках “Масад” — найлепшая выведка Блізкага Ўсходу, а мо і ўсяго сьвету. ЦРУ, у якога, як вядома, цяпер няшмат шпіёнаў-арабаў у мусульманскім сьвеце, ня можа абысьціся без паслуг Шарона.
Вось сур’ёзныя прычыны, каб Буш пачаў вайну. Што тычыцца нафты, дык дазвольце я працытую Ральфа Надэра, які падае статыстычныя зьвесткі:

“Злучаныя Штаты на сёньня спажываюць 19,5 мільёна барэляў у дзень, або 26% штодзённага спажываньня нафты ўва ўсім сьвеце... ЗША [павінны імпартаваць] 9,8 мільёна барэляў у дзень, або больш за палову ад спажыванага аб’ёму... Для таго каб настолькі істотная залежнасьць ад нафты не ператварылася для ЗША ў пагрозу, ЗША трэба кантраляваць 67% сусьветных запасаў нафты, якія залягаюць пад пяскамі краінаў Пэрсыдзкае затокі. У адным Іраку разьведаныя запасы нафты ацэньваюцца ў 112,5 мільярда барэляў, ці 11% ад усясьветных... Большыя радовішчы мае толькі Саудаўская Арабія”.
Я дадаў бы, што як толькі Амэрыка зойме Ірак, яна таксама зацягне пельку на шыі Саудаўскай Арабіі і рэшты Блізкага Ўсходу. Гучалі таксама прапановы ісьці на Ірак дзеля вады. Працытуем артыкул Стывэна К.Пэлтыера ў “The New York Times” ад 31 студзеня:

“Было шмат праектаў будаўніцтва так званага Трубаправоду Міру, які прынёс бы воды з паўднёвай цечы Тыгру і Эўфрату ў выпаленыя сонцам краіны Пэрсыдзкае затокі і, іншым рукавом, у Ізраіль. Рэалізацыя праекту ня зрушылася зь месца, у значнай ступені празь непрымірымасьць ірацкага кіраўніцтва. Калі Ірак акажацца ў руках амэрыканцаў, вядома, усё гэта можа зьмяніцца”.
Такім чынам, нафта — частка матывацыі для разьвязваньня вайны, хоць ЗША ніколі гэтага афіцыйна не прызнаюць. А вада магла б аказацца магутнай прыладай, здольнай замірыць апаленыя сонцам нянавісьці пустэльні. Асноўнай падставай, аднак, застаецца галоўная мара Джорджа Буша: імпэрыя!

“Якое слова, акрамя як “імпэрыя”, здольнае апісаць той кашмар, у які ператвараецца Амэрыка? — напісаў Майкл

Ігнацьеў 5 студзеня ў *“The New York Times Magazine”*. — Гэта адзіная дзяржава, якая займаецца аховай парадку ўва ўсім сьвеце пры дапамозе пяці глябальных вайсковых груповак, утрымлівае больш за мільён вайскоўцаў на чатырох кантынэнтах, разгортвае групоўкі баявых авіяносцаў, што нясуць варту ўва ўсіх акіянах, гарантуе існаваньне краінаў ад Ізраілю да Паўднёвае Карэі, запраўляе ў сусьветным гандлі і камэрцыі, насяляе сэрцы і думы жыхароў усіх куткоў плянэты сваімі марамі ды прагненьнямі”.
Як піша Цімаці Гартан Эш у “The New York Review of Books” ад 13 лютага:

“ЗША ёсьць цяпер ня толькі адзінай звышдзяржавай — яны сталіся гіпэрдзяржавай, чые вайсковыя выдаткі неўзабаве зраўнуюцца з абаронным бюджэтам наступных 15 найбагацейшых краінаў сьвету разам узятых. ЭЗ не выкарыстоўвае сваёй гаспадарчай моцы (супольны валавы нацыянальны прадукт дзяржаваў — сяброў Зьвязу хутка наблізіцца да ўзроўню амэрыканскага — 10 трыльёнаў даляраў), каб дасягнуць параўнальнай вайсковай альбо дыпляматычнай моцы”.
Напэўна, найбольш падрабязнае тлумачэньне яшчэ афіцыйна не прызнанае кампаніі стварэньня імпэрыі дае калюмніст “The Atlanta Journal-Constitution” Джэй Букман у сваёй калёнцы ад 29 верасьня:

“Калі распачнецца гэта вайна, яна будзе афіцыйным сьведчаньнем пераходу Злучаных Штатаў у якасьць разьвітай сусьветнай імпэрыі, якая пераймае ўсю адказнасьць і ўладу, выконваючы ролю сусьветнага паліцыянта. Гэта было б кульмінацыяй 10-гадовага ці трохі даўжэйшага пляну гегеманістаў, у выніку рэалізацыі якога ЗША павінны былі дабіцца сусьветнага панаваньня, нават коштам ператварэньня ў “амэрыканскіх імпэрыялістаў”, як нас заўжды называлі нашы ворагі”.
У 1992-м, праз год пасьля падзеньня Савецкага Саюзу, у Амэрыцы было шмат прыхільнікаў правых ідэяў, брэндавых кансэрватараў, якія адчулі “момант”. Амэрыка магла авалодаць сьветам. Міністэрства абароны склала праект дакумэнту, які, паводле словаў Джэя Букмана, маляваў ЗША ў вобразе *“калёса,*

які панує над сьветам, навязваючы сваю волю і падтрымліваючы мір у сьвеце пры дапамозе сваёй вайсковай і эканамічнай магутнасьці”. Калі ж зьявіўся канчатковы чарнавік праекту, ён выклікаў столькі крытыкі, што прэзыдэнт Буш-старэйшы пасьпяшаўся адклікаць яго і адрачыся згаданае ідэі.
Міністрам абароны ў 1992 годзе быў Рычард Чэйні. Праект дакумэнту быў падрыхтаваны Полам Вулфавіцам, на той час намесьнікам міністра па палітычных пытаньнях. Цяпер Вулфавіц — намесьнік міністра абароны ў падначаленьні Рамсфэльда.
За Клінтанам, ад 1992 да 2000-га, аб мары пра сусьветнае панаваньне ня згадвалі. Відаць, менавіта гэта было прычынай сьмяротнае нянавісьці да кіраўніцтва краіны з боку правых усе тыя восем гадоў. Калі б ня Клінтан, Амэрыка магла б кіраваць сьветам.
Відавочна, што гэты дакумэнт пад назвай “Праект Новае Амэрыканскае Эры”, чарнавік якога быў распрацаваны ў 1992 годзе, цяпер, пасьля 11 верасьня, стаўся кіраўніцтвам да дзеяньня для ўраду Буша. Брэндавыя кансэрватары трыюмфавалі. Яны маглі шукаць шляхоў да панаваньня над сьветам. Ірак — першы крок, а за ім у агляднай пэрспэктыве маглі б пайсьці ня толькі Іран, Сырыя, Пакістан і Паўночная Карэя, але й Кітай.
Вядома, не было б неабходнасьці падпарадкоўваць сабе ўсе гэтыя краіны. Адных досыць было б проста далучыць да сваёй сфэры ўплыву, другіх трэ было б уцягнуць у партнэрства. Можна папросту дасягнуць поўнага ўзаемаразуменьня. Нельга сказаць пра ўваходжаньне Кітаю ў сымбіёзныя адносіны з намі і пры гэтым не правесьці праекцыі на магчымыя прычыны і падставы гэтага. Нельга выключаць, што некаторыя сьветлыя галовы сярод нэакансэрватараў бачаць пэўную небясьпеку ў пэўных тэндэнцыях нашага тэхналягічнага разьвіцьця.

Наўрад ці справа скончыцца Іракам і Блізкім Усходам. Буйнейшыя невайсковыя небясьпекі ўжо вымалёўваюцца ў будучыні. Вось артыкул Скота А.Баса, зьмешчаны ў “The Boston Globe” напрыканцы студзеня:

“Навуковыя дасьледаваньні і навуковы прагрэс амэрыканскіх унівэрсытэтаў у важных галінах навукі, тэхналёгіяў,

канструктарскай думкі і матэматыкі значна залежаць ад замежных студэнтаў... Калі такая тэндэнцыя будзе захоўвацца, студэнтаў-амэрыканцаў з навуковымі ступенямі ў згаданых дысцыплінах будзе замала, каб задавальняць нашы эканамічныя, стратэгічныя і тэхналягічныя патрэбы. Прыток маладых амэрыканскіх навукоўцаў і інжынэраў рэзка зьменшыўся. У іншых прамыслова разьвітых краінах нашмат большы адсотак студэнтаў ідзе вучыцца на гэтыя спэцыяльнасьці.

У той час, калі замежных студэнтаў вабяць тэхнічныя спэцыяльнасьці, нашыя не выяўляюць да іх вялікае зацікаўленасьці. Шмат хто зь іх ня быў сур'ёзна заахвочаны, іншым жа акадэмічныя патрабаваньні пры вывучэньні стратэгічна важных дысцыплінаў, магчыма, падаюцца завысокімі.

У пэрыяд паміж 1986 і 1996 гадамі колькасьць замежных студэнтаў, якія атрымлівалі доктарскія ступені ў стратэгічных дысцыплінах, расла ў чатыры разы хутчэй, чым адпаведная колькасьць амэрыканскіх студэнтаў. У 2000 годзе 43% доктарскіх ступеняў па фізыцы атрымалі замежнікі".
Нэакансэрватары, магчыма, яшчэ спадзяюцца закінуць Кітаю прыкладна такі мэсыдж: "Гэй, вы! Вы, кітаёзы, безумоўна, разумныя. Мы гэта ведаем! Вашыя азіяцкія студэнты народжаныя для тэхналёгіяў. Людзі, якія вядуць несваборднае існаваньне, улюбляюцца ў тэхналёгіі. Яны не атрымліваюць асалодаў ад жыцьця, таму ім такі блізкі кібэрнэтычны сьвет. Тэхналёгіі для іх — свайго роду ідэал. Нам начхаць. Цешцеся сваёй тэхналёгіяй, хай яна будзе вялікай! Але, Кітаю, табе лепей зразумець: за намі вайсковая моц. Найлепшы выбар для цябе — стаць грэцкім рабом для нас, рымлянаў. Мы будзем добра абыходзіцца з табою. Ты будзеш найбольш важнай краінай для нас, выключна важнай. Але не спрабуй скокнуць вышэй галавы. Найлепшае, на што ты можаш увогуле спадзявацца, Кітаю, — гэта зрабіцца нашым грэкам".
У 30-я гады XX стагодзьдзя чалавека паважалі, калі ён забясьпечваў свае жыцьцёвыя патрэбы. У 90-х чалавеку трэ было прадэманстраваць, што ён далёка пойдзе ў якасьці скнары. Магчыма, імпэрыя залежыць ад непрыстойна багатых

найвышэйшых слаёў, якія, маючы прыроджаны бясконцы страх за свае багацьці, проста ня могуць мець у душы вялікую прыхільнасьць да дэмакратыі. Калі гэта так, то магчыма сьцьвярджаць, што велізарныя багацьці, назапашаныя цягам 90-х, маглі стварыць велізарны ціск наверсе з мэтаю пераходу ад дэмакратыі да імпэрыі. Гэта абараніла б вялікія хутканабытыя прыбыткі. Магчыма, Джордж Буш ведае, што працуе на будучыню імпэрыі, уводзячы велізарныя падатковыя палёгкі для багатых?

Вядома, тэрарызм і нестабільнасьць — адваротны бок імпэрыі. Валадары Саудаўскай Арабіі і тыя баяцца сваіх мулаў, здольных падняць тэрарыстаў на барацьбу. А як жа будзе выглядаць мусульманскі сьвет, калі сам Вялікі Шатан запануе над ім, наводзячы на Блізкім Усходзе свае парадкі?

Наўрад ці ўрад ня ведае пра магчымыя небясьпекі, таму на вусны просіцца сумны адказ, што Буш і кампанія гатовыя да буйнейшай тэрарыстычнай атакі. Як і да кананады дробных тэрактаў. І ў першым, і ў другім выпадках гэта ўзмоцніць пазыцыі ўраду. Амэрыка зноў згуртуецца вакол яго. Ужо цяпер вядома, што скажа Буш: “Гэтыя слаўныя амэрыканцы загінулі сёньня. Нявінныя ахвяры зла былі вымушаныя праліць сваю кроў. Але мы пераможам, бо мы з Богам”. Пад такім соўсам любая параза стае перамогаю.

Аднак дакуль будзе існаваць тэрарызм, датуль будзе існаваць бязьмежны страх, які ён усяляе ў людзкія душы. У часе халоднае вайны палітыку стрымліваньня апраўдвала ня толькі пэрспэктыва згубіць усё, якая пагражала абодвум бакам, але і няўпэўненасьць кожнага з бакоў у тым, ці можна знайсьці чалавека, які б упэўнена націснуў на апакаліптычны чырвоны гузік. У гэтым сэнсе не існавала дзейсных канчатковых плянаў. Як кожная з супэрдзяржаваў магла быць упэўненай у тым, што цалкам надзейны чалавек, якога абралі дзеля націсканьня гузіка, акажацца да канца надзейным, каб зруйнаваць другую палову сьвету? У самы апошні момант яго можа ахапіць цень сумневу. Рукі могуць здрадзіць яму.

Але гэта не стасуецца тэрарыста. Калі ён гатовы забіць сябе, ён таксама можа быць гатовы зруйнаваць увесь сьвет. Войны, якія мы вялі да надыходу гэтае новае эры, бывалі жахлівымі, але, прынамсі, заўжды можна было разьлічваць, што яны некалі скончацца. Тэрарызм жа не зацікаўлены ў перамовах. Яму

больш даспадобы вайна да пераможнага канца. Але трыюмфаваць тэрарыст ня можа, таму ён ніколі не перастае быць тэрарыстам. Вось сапраўдны вораг, нашмат большы, чым краіны Трэцяга сьвету, якія валодаюць ядравым патэнцыялам. Гэтыя дзяржавы ўсе да адной гатовыя жыць у стане ўзаемнага стрымліваньня з сваімі працiўнікамі і ўрэшце прайсьці да непазьбежнага яго выніку — мірных дамоваў пасьля гадоў ці дзесяцігодзьдзяў пасіўнае канфрантацыі і цяжкіх саступак. Большасьць з таго, што я дагэтуль сказаў, — гэта мастацкая праекцыя майго разуменьня нэакансэрватыўнае мэнтальнасьці, але я згодны з вамі, што рашэньне брэндавых кансэрватараў захапіць Ірак атрымала падтрымку і з боку лібэралаў. Частка лібэральных СМІ — “The New Yorker”, “The Washington Post” і некаторыя сілы ў “The New York Times” — згаджаюцца з сэнатаркамі Хілары Клінтан і Даянай Файнштайн ды сэнатарамі Джо Лібэрманам і Джонам Керы, што мы ўсё ж можам прынесьці дэмакратыю ў Ірак шляхам уварваньня. На старонках “The New York Times” ад 8 лютага Біл Келер памяркоўна ўхваляе магчымыя наступствы вайны, якая, верагодна, пройдзе хутка й пасьпяхова:

“Давайце сабе ўявім, што рэжым Садама Хусэйна захістаецца пры першай жа ракетнай атацы. Танкавыя калёны, якія вырушаць з Кувэйту, не пападуць пад абстрэл хімічнымі боегалоўкамі. Амэрыканскія сілы не сутыкнуцца з акцыямі грамадзянскага непадпарадкаваньня. Нават тады перамога ў Іраку ня вырашыць велізарнага пытаньня, якою мы бачым сваю ролю ў сьвеце. Пытаньне застанецца адкрытым. Нашая мэта — падтрымліваць сьвецкую дэмакратыю ці стабільнасьць? Некаторыя, магчыма, уключна з пэўнымі асобамі з кабінэту Буша, могуць запярэчыць, што справа толькі ў раззбраеньні. “Як толькі мы раззброім Ірак, — скажуць яны, — як толькі будзе зьнішчаная садамава Рэспубліканская гвардыя, мы зможам перадаць краіну пад уладу суніцкага генэралітэту і вярнуць войскі дадому ў 18-месячны тэрмін”. А мо, спрачаецца Келер, мы ўсё-такі ўсталюем у Іраку сапраўдную дэмакратыю, з чаго будзе мець карысьць увесь Блізкі Ўсход. Узьнікае такое ўражаньне, што гэтыя лібэралы вырашылі, нібыта калі Буша нельга спыніць, да яго варта далучыцца. Антываенная пазыцыя прывяла б да адсутнасьці

дэмакратаў ува ўрадавых кабінэтах, што адбілася б на будучыні Іраку. Гэты аргумэнт можа быць падтрыманы зь некаторымі “але”, аднак гэтыя “але” залежаць ад шматлікіх выпадковасьцяў, першая зь якіх — ці будзе вайна хуткай і нежахлівай.

Выкарыстоўваецца старая заўвага Біла Клінтана наконт боязі вайсковых умяшаньняў за мяжой: нам, маўляў, удалося пабудаваць дэмакратыю ў Японіі й Нямеччыне, таму мы здатныя пабудаваць яе ў любым іншым месцы. Але ж Японія і Нямеччына былі краінамі з аднародным насельніцтвам і даўно складзенымі нацыямі. Войскі гэтых краінаў несьлі адказнасьць за вайсковыя злачынствы. Як Нямеччына, так і Японія былі амаль цалкам зруйнаваныя, але мелі людзкія рэсурсы і здольнасьці, каб адбудаваць свае гарады. Амэрыканцы, якія працавалі на стварэньне дэмакратыі, былі вэтэранамі рузвэльтаўскага “Новага курсу” і сапраўднымі ідэалістамі, што было ўвогуле характэрна для таго пэрыяду. Ірак жа, наадварот, ніколі ня быў сапраўднай нацыяй. Сканструяваны брытанцамі пасьля першай сусьветнай вайны, ён уяўляў “салянку” з сунітаў, шыітаў, курдаў і туркмэнаў, якія ніколі не давяралі адзін аднаму.

У выніку можа ўзьнікнуць сытуацыя, падобная да аўганскай, калі краіну падзеляць між сабой палявыя камандзіры. Ніхто ня можа гарантаваць пабудовы дэмакратыі ў Іраку, але ўсё ж саманадзейнасьць не зьнікае. Здаецца, няма разуменьня таго, што, акрамя рэдкіх выпадкаў, дэмакратыя ніколі не жыве ўнутры нас, каб ёю можна было заразіць іншую краіну адно сілай уласнага жаданьня. Рэальная дэмакратыя ўзрастае з многіх крохкіх індывідуальных чалавечых змаганьняў, якія доўжацца дзесяцігодзьдзямі і нават стагодзьдзямі, каб урэшце стварыць традыцыі. Адзінай абаронай дэмакратыі, у рэшце рэшт, зьяўляюцца *традыцыі* дэмакратыі. Калі вы ігнаруеце гэтыя каштоўнасьці, вы пачынаеце гуляцца з высакароднай і далікатнай структурай. Няма нічога прыгажэйшага за дэмакратыю. Але нельга гуляцца зь ёю. Нельга ўзяць і завезьці камусьці напаказ вялікую сыстэму дэмакратыі. Гэта жахлівая саманадзейнасьць.

Дэмакратыя — рэч шляхетная, таму яна заўжды ў небясьпецы. Сапраўды, шляхетнасьць заўжды ў небясьпецы. Дэмакратыя ня вечная. Натуральнай формай кіраваньня для большасьці

людзей, улічваючы агідныя глыбіні чалавечае натуры, зьяўляецца фашызм. Фашызм — больш натуральны стан, чымся дэмакратыя. Рашэньне пачаць экспарт дэмакратыі ў любую, на свой одум, краіну, можа парадаксальна паспрыяць распаўсюджваньню фашызму ў краіне і за яе межамі. Дэмакратыя — шчасьлівы стан, якога дасягаюць толькі тыя краіны, дзе набіраецца дастатковая колькасьць індывідаў, гатовых ня толькі цешыцца свабодай, але й выконваць цяжкую працу тварэньня гэтае свабоды.

Патрэба ўва ўсёасяжнай тэорыі можа прывесьці да безьлічы памылак. Магчыма, напрыклад, я цалкам памыляюся наконт глыбінных матываў ураду. Магчыма, ён зацікаўлены не ў Імпэрыі, а ў шчырым выратаваньні сьвету. Мо нейкі Буш і нейкія бушысты сапраўды вераць у гэта. Штонядзелі ў царкве яны вераць у гэта настолькі палымяна, што ў іх на вачах выступаюць сьлёзы. Вядома, гісторыю твораць дзеяньні людзей, а ня іх пачуцьці. Нашыя пачуцьці могуць поўніцца любоўю, а дзеяньні пры гэтым будуць супрацьлеглымі. У людзкой натуры заўжды знойдзецца месца вычварэньню.

Дэвід Фрам, які працаваў сьпічрайтэрам Буша (ён прыдумаў фразу “вось зла”), падрабязна распавядае ў кнізе “Правільны чалавек: дзівоснае прэзыдэнцтва Джорджа У.Буша” пра адну сустрэчу ў Авальнай залі ў мінулым верасьні. Прэзыдэнт размаўляў з групай сьвятароў галоўных рэлігійных канфэсіяў і распавёў ім:

“Вы ведаеце, у мяне былі праблемы з алькаголем. Я павінен бы цяпер сядзець у бары ў Тэхасе, а не ў Авальнай залі. Толькі з адной прычыны я ў Авальнай залі, а ня ў бары ў Тэхасе, — я знайшоў веру. Я знайшоў Госпада. Я тут дзякуючы сіле малітвы”.

Гэта небясьпечная заўвага. К’еркегор першым заўважыў, што мы ня можам з упэўненасьцю ведаць ні тое, куды нашыя малітвы хутчэй за ўсё ідуць, ні тое, ад каго прыходзяць адказы на іх. Якраз тады, калі мы думаем, што набліжаемся да Бога, мы можам аказваць дапамогу д’яблу.

“Наша вайна з тэрорам, — кажа Буш, — пачынаецца з Аль-Каіды, але яна ня скончыцца... пакуль на ўсім сьвеце ня будуць знойдзеныя, абясшкоджаныя і зьнішчаныя ўсе тэрарыстычныя групоўкі”.

“А што калі Амэрыка ў часе гэтага пасварыцца з усім сьветам?” — пытаецца Эрык Алтэрман у “The Nation”. Боб Вудвард, спасылаючыся на словы аднаго з чыноўнікаў Белага дому, пераказвае словы Буша, зьвернутыя ім да сваіх найбліжэйшых дарадцаў: “У пэўны момант мы можам застацца ў адзіноце. Для мяне гэта нармальна. Мы ж амэрыканцы”.
Цяпер стала відавочна, што, калі ў выніку вэта Рады Бясьпекі, плюс усё шырэйшых пратэстаў у сьвеце, плюс частковага супрацоўніцтва Садама з інспэктарамі, пачнецца пэрыяд доўгатэрміновага стрымліваньня, а не вайны, калі Буш будзе вымушаны адмовіцца ад пляну ўварваньня ў Ірак, ён будзе вельмі расчараваны. Бо тады яму зноўку давядзецца застацца сам-насам з усімі невырашальнымі праблемамі! Глыбока ў душы ён можа адчуваць страх, што ў гэтым выпадку ён ня зможа ніякім чынам узьняць маральны дух амэрыканцаў. Дэмакратыя, я хацеў бы паўтарыць, гэта самая шляхетная форма кіраваньня зь вядомых нам, і прыйшла пара запытацца ў саміх сябе, ці гатовыя мы пакутаваць або нават загінуць за яе, замест таго каб рыхтаваць сябе да нікчэмнага жыцьця ў грандыёзнай бананавай рэспубліцы з урадам — папіхачом мэгакарпарацыяў, якія сваёй слановай фанабэрыяй старанна разбураюць нашы мары.

Пераклаў з ангельскай зь невялікімі скаротамі
Андрэй Клікуноў паводле “The New York Review of Books”

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/07/05**
[image]

Руслан Хестанаў

Новы Сьвет, абяцаны Амэрыкай

РУСЛАН ХЕСТАНАЎ — доктар філязофіі, прафэсар Фрыбурскага ўнівэрсытэту (Швайцарыя). Аўтар кнігі “Аляксандар Герцэн: імправізацыя супраць дактрыны” (Масква, 2001). Пераклад зроблены з ласкавай згоды маскоўскага часопісу “Отечественные записки”, у якім упершыню быў надрукаваны артыкул (у арыгінале пад

Менавіта маўленьне ўводзіць у рэальнасьць ману.
Жан Лякан

Выбар, перад якім стаіць прэзыдэнт Буш, здаецца надзвычай абмежаваным. Наўрад ці выклікае сумневы тое, што заняпад Злучаных Штатаў, бясспрэчнага лідэра на міжнароднай палітычнай сцэне, будзе працягвацца і ў наступным дзесяцігодзьдзі. Пытаньне пытаньняў ня ў тым, ці будзе амэрыканская гегемонія слабець, а ў тым, ці змогуць Злучаныя Штаты знайсьці спосаб элегантнага падзеньня зь мінімальнай шкодай для сьвету і для сябе.

Імануэль Валерстайн

20 верасьня 2002 году ўрад Злучаных Штатаў апублікаваў новую “Стратэгію нацыянальнай бясьпекі” (СНБ). Гэты ўнікальны дакумэнт дае найлепшае ўяўленьне пра сьвет, які будуе сваёй палітыкай сёньняшняя амэрыканская

адміністрацыя. СНБ ня толькі фармулюе стратэгічныя назвы прыярытэты й заданьні краіны, ня толькі апісвае “Новый мир, дасягненьня вызначаных мэтаў, але й гарантуе цалкам который акрэсьленую будучыню. І той новы сьвет абяцаны не толькі обещает амэрыканскаму народу, але й усяму насельніцтву планеты. Стратегия Мэтай гэтага артыкулу зьяўляецца ня столькі ацэнка национальной шчырасьці, зь якой зямлянам абяцаныя росквіт, безопасности свабода, ня столькі прагноз ці прароцтва, колькі СШАа ўявіць” пэўны магчымы сьвет, той сьвет, які можа стварыць (№8, 2002). СНБ пасьлядоўна й няўхільна будзе ўвасабляцца ў жыцьцё.

Новы маральны кодэкс

З пункту гледжаньня фабульнай схемы галівудзкіх прапагандысцкіх фільмаў, СНБ пачынаецца нібы з канца — зь мізансцэны, дзе абавязкова прысутнічае амэрыканскі сьцяг, на фоне якога трыюмфуе герой, што прайшоў агонь, ваду і медзяныя трубы. На самым пачатку СНБ дэкляруецца паўсюдная і канчатковая перамога каштоўнасьцяў свабоды, дэмакратыі й прадпрымальніцтва. Сьцьвярджаецца, што свабода слова, выбараў, веры, асьветы, роўнасьці полаў, а таксама валоданьня ўласнасьцю й атрыманьня карысьці ад сваёй працы прызнаныя важнымі й універсальнымі каштоўнасьцямі для кожнае асобы і любой супольнасьці. Як кожная палітычная дэклярацыя, СНБ мае яскрава выяўлены аптымістычны запал. У дадзеным выпадку аптымізм грунтуецца на перакананасьці ў рашучай перамозе сілаў Дабра над сіламі Зла. І Дабро нібыта ўжо атрымала сваё інстытуцыйнае афармленьне й увасобілася ў амэрыканскім нацыянальным праекце. Амэрыканскаму ж народу прыпісваецца ўнівэрсальная ўласьцівасьць, ці здольнасьць, названая “амэрыканскім інтэрнацыяналізмам” — ён, як сьцьвярджаецца ў СНБ, “адлюстроўвае адзінства нашых каштоўнасьцяў і нашых нацыянальных інтарэсаў”. Менавіта з пазыцыяў манаполіі на маральны аўтарытэт звышдзяржава фармулюе сваю новую геапалітычную місію. Перамога ЗША ў халоднай вайне выклікала мэтамарфозу прыроды й тактыкі Зла, якое зьдзейсьніла беспрэцэдэнтную паводле сваёй падступнасьці й цынізму тэрарыстычную атаку 11 верасьня 2001 году: “Раней нашыя ворагі мусілі мець

магутнае войска і прамысловыя магчымасьці. Але цяпер эфэмэрныя групоўкі індывідаў могуць выклікаць у нашай Бацькаўшчыне вялікі хаос і спрычыніць вялікія пакуты, і гэта будзе каштаваць ім менш за адзін танк. Тэрарысты арганізуюцца, каб праточвацца ў адкрытае грамадзтва і скіроўваць супраць нас сучасныя тэхналёгіі". Неўміручы і вечны характар свабоды варта пацьвярджаць у штодзённай барацьбе за яе ідэалы. Вайна з тэрарызмам, як прадказвае СНБ, мусіць мець практычна пастаянны характар: "Вайна супраць тэрарызму — глябальная апэрацыя нявызначанай працягласьці". А каб абараніць свабоду і адвесьці небясьпеку, "мы павінны выкарыстаць усе сродкі".

Абавязковы акцэнт на фундамэнтальнасьці, усеагульным характары такой каштоўнасьці, як свабода, аб'яднаны ў СНБ з надзвычай абстрактным ды інтуіцыйным яе разуменьнем. Панятак свабоды ўнівэрсалізуецца дзякуючы настойлівай прысутнасьці яго ў тэксьце, ужываньню на кожным кроку як унівэрсальнае зьвязкі, што лёгка яднаецца з рынкам, веравызнаньнем, сумленьнем, жанчынай, прадпрымальніцтвам, амэрыканскай нацыяй і г. д. Такое пераабцяжаранае казаньне пра свабоду мяжуе зь беспрадметнасьцю і нараджае адчуваньне маральнага аўтызму гэтага дакумэнту.
У СНБ мы бачым эклектычную й дзіўную сумесь нацыяналістычнага аўтызму і ўпартага дамаганьня сяброўства іншага — навязваньня яму пякучай неабходнасьці фармаваць надзейны двухбаковы альянс, запэўніваньня ў неабходнасьці і нават неадваротнасьці сяброўства. Моцныя путы сяброўства прапануюцца, найперш, эўрапейскім партнэрам па NATO. Стаўленьне да Расеі, спадкаемцы пераможанага ў халоднай вайне суперніка, мае дакладна акрэсьленую пэрвэрсійную прыроду, што выяўляецца ў такой тыповай радыкальнасьці зьмены знаку — нянавісьці на любоў і ласку.
Такім самым навязьлівым клопатам пра іншага прадыктаванае жаданьне сёньняшняй адміністрацыі рэфармаваць міжнародныя фінансавыя інстытуты кшталту Міжнароднага валютнага фонду ці Сусьветнага банку. СНБ прапануе, напрыклад, перайсьці ад сыстэмы крэдытаваньня да сыстэмы грантаў. Прапанаванае рэфармаваньне сусьветных фінансавых інстытутаў з дапамогай сыстэмы грантаў разам з акцэнтам на

маральную рэвалюцыйнасьць выклікае асацыяцыі з найанархічнейшымі дарынкавымі формамі эканамічных адносінаў, якія можна параўнаць хіба што з апісанай у Жоржа Батая такой старажытнай формай абмену, як патлач: “Патлач выключае хоць якое складаньне дамовы і ўвогуле ўяўляе сабой істотны падарунак з боку багатых, адкрыта прапанаваны з мэтай прынізіць, перамагчы, зьвязаць забавязаньнямі працiўніка”. На практыцы пераход ад крэдытаваньня мае пазначаць усталяваньне больш дэталёвага і жорсткага патранатнага кантролю за выкарыстаньнем сродкаў. Краіны, што маюць запазычанасьць, будуць змушаныя разьвітацца з сваім фінансавым і гаспадарчым сувэрэнітэтам, а ЗША, маючы найбольшую колькасьць актываў МВФ, ператворацца з крэдытора ў спонсара. Цікава, што такую самую мадэль спонсарскай філянтропіі й патлача СНБ прапануе зьдзейсьніць і ў саміх Злучаных Штатах, пашырыўшы на ўнівэрсытэты, няўрадавыя арганізацыі ды прыватны сэктар. “З дапамогай грантаў мы таксама будзем патрабаваць ад унівэрсытэтаў, некамэрцыйнага і прыватнага сэктараў адпаведнасьці ўрадавым праграмам”, — абвяшчае СНБ.

Манаполія на маральны аўтарытэт у міжнародных справах ня толькі пазбаўляе іншыя нацыянальныя інстанцыі правоў на маральнае асуджэньне, але й можа стацца адзінай падставай, здольнай легітымізаваць прэвэнтыўны ўдар па працiўніку, выключнае права на які адстойваюць Злучаныя Штаты. Маральны аўтарытэт можа быць таксама ўнівэрсальным тлумачальным прынцыпам усіх дзеяньняў звышдзяржавы на міжнароднай арэне. Напрыклад, Буш, раз у раз ігнаруючы пытаньне пра нафтавыя інтарэсы ЗША ў рэгіёне Пэрсыдзкае затокі, рабіў акцэнт на маральнай імпэратыўнасьці зьнішчэньня багдадзкага тырана.

Менавіта маральнае пасланьне, што месьціцца ў СНБ, зьяўляецца, на мой погляд, наймацнейшым бокам дакумэнту. СНБ малюе яскравы вобраз надзеі, абрысы маральнага космасу новага сьвету, што йдзе зь песьняй пад сьцягам амэрыканскага касмапалітычнага геданізму. Уяўленьне сёньняшніх левых нашмат бяднейшае падчас выпрацоўкі такіх манумэнтальных і аптымістычных утопіяў. Левая альтэрнатыва актыўнай жыцьцёвай пазыцыі амэрыканскага правага рэспубліканца — гэта скептычны фаталізм і пераканананасьць у неадваротнасьці

будучай катастрофы. Ясна, чаму аптымістычная пэрспэктыва, прапанаваная адміністрацыяй Буша, згуртавала амэрыканцаў на прамежкавых выбарах якраз пад сьцягамі правых рэспубліканцаў.

Эканамічны аўтызм

“Адкрыцьці” сапраўдных матываў і інтарэсаў, прыхаваных за маралізатарскай і мілітарысцкай рыторыкай Буша і ягонай каманды, — невычарпальныя. Тыя, хто не давярае адміністрацыі Буша, лічаць, што за ягонымі бясконцымі нагадваньнямі пра непасрэдную пагрозу амэрыканскай бясьпецы з боку Іраку, за ягонай абаронай прыгнечаных жанчынаў Усходу й іншадумцаў прыхаваныя карысьлівыя пляны амэрыканскіх нафтавікоў. Адзначаецца, што найбліжэйшыя і найагрэсіўнейшыя кампаньёны Буша належаць да энэргетычнага лобі. Такім жа няпоўным падаецца мне выкрыцьцё сапраўдных матываў французкай і расейскай фронды ў Радзе бясьпекі ААН — нібыта за супрацівам Францыі й Расеі аднабаковай амэрыканскай агрэсіі ў Іраку стаяць толькі (!) інтарэсы іх нафтавых картэляў, якія пабойваюцца адлучэньня ад ірацкай трубы. То бок выкрывальнікі інкрымінуюць ня толькі амэрыканскім каршуном, але й эўразійскім галубом прагматыку эканамічнага разьліку. Нафтавы матыў, вядома, тут прысутны, але, здаецца, стаўкі нашмат большыя.

Што ж да СНБ, дык глыбокі сумнеў выклікае якраз той факт, што абяцаную вайну “нявызначанай працягласьці” можна апраўдаць або абгрунтаваць эканамічна. На мой погляд, эканамічная палітыка цяперашняй адміністрацыі заслугоўвае толькі на адну трапную характарыстыку, колісь кінутую кіраўніком Фэдэральнага рэзэрву ды суаўтарам нечуванага эканамічнага буму сэрам Аланам Грынспэнам на адрас фінансавых рынкаў 90-х: “irrational exuberance” — “надмернасьць ірацыянальнага”. Прынцыпу, здольнага патлумачыць гэтую надмернасьць як адносна рынкаў, так і адносна імпэрскай палітыкі, не існуе. Тут больш дарэчна будзе перачытаць Оруэла ў кантэксьце ўжо не савецкага досьведу, а амэрыканскага гегеманізму. І згадаць ягоную непадуладную часу тэзу: “мэта ўлады — сама ўлада”, прага ўлады — гэта прыродны інстынкт, які не патрабуе тлумачэньня. Іншымі

словамі, я спрабую паказаць, якімі далёкімі ад эканамічнай прагматыкі здаюцца высілкі ўвасобіць у жыццё СНБ.
Наўрад ці можна казаць пра тое, што існуюць дакладна вызначаныя эканамістамі нормы паводзінаў эканомікі ў ваенны пэрыяд. Кожная вайна разгортваецца ва ўнікальных умовах і патрабуе спэцыфічных гаспадарчых падыходаў. Але ўсё ж існуюць пэўныя заканамернасьці й нормы, уяўленьне пра якія можа даць клясыка эканамічнае думкі й некаторыя гістарычныя прэцэдэнты.
Невялікая кніжка Джона Мэйнарда Кейнза “How to Pay for the War” (1940) была для брытанскіх, а асабліва для амэрыканскіх палітычных і эканамічных элітаў дапаможнікам па арганізацыі нацыянальнай гаспадаркі падчас другой сусьветнай вайны. Кейнз найперш зьвяртаў увагу на патрэбу падтрымліваць стабільныя цэны на асноўныя групы тавараў — харчаваньне, жытло, вопратку. Ён даводзіў неабходнасьць чатырох элемэнтарных захадаў: 1) дзяржава мусіць неадкладна рэагаваць дадатковым субсыдаваньнем на кожнае істотнае падвышэньне цэнаў; 2) дзяржава мусіць сувора кантраляваць і падтрымліваць стабільны ўзровень заробкаў. Прадметам асаблівага клопату дзяржавы тут мае быць падтрымка раўнавагі між попытам (або пакупніцкімі магчымасьцямі) і прапановай. Адсюль выцякала неабходнасьць 3) рэгуляваньня падаткаў (фактычна іх падвышэньня) і такой Кейнзавай інавацыі, як 4) гвалтоўнае ашчаджэньне (то бок пэўную частку заробкаў, прэміяў ды іншых формаў прыбыткаў варта было абавязкова адлічыць у дзяржаўную скарбонку за абяцаньне вярнуць зь невялікім працэнтам пасьля вайны). Такім чынам, дзяржава мелася ўзяць на сябе функцыю рынку і кіраваць зьмяненьнем пакупніцкае здольнасьці, каб прадухіліць інфляцыю цэнаў на асноўныя тавары. Просты кантроль за цэнамі й рацыянаваньне Кейнз разглядаў як дапаможныя сродкі.

Хоць ЗША не вялі баявых дзеяньняў на сваёй тэрыторыі, менавіта яны найбольш пасьлядоўна ажыцьцяўлялі прапанаваную Кейнзам мадэль. У 1944 годзе падаткі фэдэральнага ўраду павялічыліся ў шэсьць разоў проці 1939 году, але выдаткі вырасьлі больш істотна. Цягам кожнага году вайны выдаткі былі дзесьці ў два-тры разы большымі за

падатковыя падвышкі. Але ўсё-такі калі вынікам першай сусьветнай вайны была інфляцыя, дык вынікам другой было хутчэй яе сканчэньне, паколькі ёй папярэднічала дэпрэсія. Адміністрацыя Буша лічыць патрэбным увогуле не закранаць пытаньня пра эканамічныя наступствы й рызыкі працяглае вайны з тэрарызмам, пачаткам якой можа стацца другая вайна ў Пэрсыдзкай затоцы. Гэтак сама паводзілася адміністрацыя Ліндана Джонсана, які распачаў вайну ў Віетнаме. Ужо ўблытаўшыся ў вайну, Джонсан прызнаў, што праводзіць фіскальную палітыку ў ваенны час — гэта тое самае, што ездзіць на аўто з праваленай пэдальлю газу. Каб пераадолець бюджэтную крызу, Джонсан захацеў павялічыць падатковы цяжар і для прыватных асобаў, і для карпарацыяў. Пажаданьне спачатку не было задаволенае. Таму амэрыканцы фінансавалі вайну за кошт высокай інфляцыі, пра што яны з пэўным спазьненьнем здагадаліся і чым былі вельмі расчараваныя. Толькі ў 1968 годзе быў ухвалены закон пра ваенны падатак. А ўвогуле першыя гады вайны, аж да 1968 году, не былі такімі цяжкімі для амэрыканскай эканомікі, бо ім папярэднічаў пэрыяд значных эканамічных посьпехаў. Да таго ж, афіцыйныя асобы ўвесь час запэўнівалі, што вайна хутка скончыцца перамогай. Аднак урадавыя эканамісты, хоць і былі перакананыя, што вайна будзе працяглай і чым далей, тым больш дарагой, не маглі выкарыстаць гэтае ўпэўненасьці ў сваіх разьліках, прызначаных для грамадзтва.
Тым часам падвышэньне попыту на асноўныя тавары выклікала павелічэньне ціску на цэны, ад чаго жыцьцё зрабілася значна даражэйшым. Падвышэньне ж кошту жыцьця ўзмацніла патрабаваньні павелічэньня заробкаў. Паралельна слабела маральная падтрымка вайны. Вайна ў Віетнаме выклікала надзвычай складаную інфляцыйную сытуацыю, калі адміністрацыі прэзыдэнтаў Ніксана, Форда і Картэра змушаны былі ўводзіць кантроль за заробкамі і цэнамі. Адыход ЗША ад залатога стандарту быў вынікам тых самых эканамічных і ваенных нешанцаваньняў. У 1979 годзе інфляцыя дасягнула піку — 13,3%. Падчас узрастаньня інфляцыі фондавыя рынкі знаходзіліся ў стане стагнацыі: на пачатку вайны, у 1965 годзе, індэкс Доў-Джонс складаў 910 пунктаў, празь сямнаццаць гадоў — 884. Потым адміністрацыі Рэйгана ўдалося здужаць інфляцыю, падняўшы да гістарычна беспрэцэдэнтнага ўзроўню

працэнтныя стаўкі.

Не такімі цяжкімі інфляцыйнымі наступствамі скончылася вайна ў Пэрсыдзкай затоцы за Бушам-старэйшым. Яна падкінула інфляцыю да 6,1%. Пачаўся памяркоўны спад эканомікі. Пасьля гэтага Клінтану ўдалося зьменшыць інфляцыю да аднаго-двух працэнтаў. Істотнае скарачэньне вайсковых выдаткаў пасьля халоднай вайны выклікала доўгатэрміновы бум. Зьмяшчэньне прыярытэтаў ад вайсковых да цывільных паспрыяла працягласьці й трываласьці эканамічнага ўзьлёту ў 90-я гады.
Калі вайна з тэрарызмам, абвешчаная СНБ, будзе такой доўгай, як адкрыта абяцае дакумэнт, тады найгоршыя сцэнары здаюцца цалкам верагоднымі. А паколькі СНБ абяцае ўсталяваць вольны “рынкавы” доступ да сыравінных рэсурсаў, дык агульную карціну варта дапоўніць яшчэ адным аўтарытэтным назіраньнем. Грынспэн зьвярнуў увагу на характэрныя зьбегі гісторыі нядаўніх эканамічных рэцэсіяў і сутыкненьне інтарэсаў на рынку нафты. Разьвіцьцё ўсіх рэцэсіяў, пачынаючы з 1970 году, ішло сьледам за падвышэньнем цэнаў на нафту. Першы раз цэны скокнулі пасьля 1973-га, калі АПЭК увяла эмбарга на пастаўку нафты. Другое падвышэньне цэнаў было адказам на рэвалюцыю ў Іране ў 1979 годзе й суправаджалася дадатковым скарачэньнем вырабу нафты краінамі АПЭК. Трэцяя рэцэсія — пасьля ўварваньня Іраку ў Кувэйт. Чацьвертая рэцэсія надышла ў 1999—2000 гадах, калі краіны АПЭК зноў скарацілі выраб нафты; мацнеў нэгатыўны ўплыў і перад апошняй вайной у Іраку.
Цяперашняя адміністрацыя Буша пастаўленая ня толькі ў сытуацыю абмежаванага палітычнага выбару між дрэнным і яшчэ горшым — яна абмежаваная і ў сфэры эканамічнай невыгоднымі для манэўру абставінамі. У эканамічнай сфэры можна вылучыць дзьве галоўныя альтэрнатывы. Першая — працягваць курс, асновы якога заклала “мірная” экспансія ЗША пасьля сканчэньня халоднай вайны, то бок аднаўляць дынаміку арыентаванай на спажыўца эканомікі: зьмяншаць падаткі, разьвіваць сацыяльныя праграмы, падвышаць прыбытковасьць з капіталу ды актыўна прыцягваць замежныя інвэстыцыі. Аднак гэты курс, дзякуючы якому эканамічны рост ЗША за дзесяцігодзьдзе склаў 40% ад росту сусьветнае эканомікі,

практычна вычарпаны, бо ён выклікаў контрапрадуктыўныя дыспрапорцыі і зьяўленьне так званае “амэрыкацэнтрычнае глябальнае эканомікі”. Найменш тут можна казаць пра завершанасьць пэўнага цыклу. Разрыў у тэмпах росту між эканомікай ЗША і эканомікамі рэшты сьвету зрабіўся настолькі вялікім, што цяжка ўявіць, каб рэшта сьвету здолела задаволіць нястрымны апэтыт вядучае эканомікі да сапраўды гратэскавых замежных інвэстыцыяў. Сёньня, каб аплачваць свой гандлёвы дэфіцыт і фэдэральную запазычанасьць, ЗША мусілі б штодня атрымліваць у інвэстыцыях каля мільярда даляраў. Уявіць такое гэтаксама цяжка, як, напрыклад, Аўганістан, Нэпал ці Расею, што фінансуюць Сыліконавую даліну. Гэтая альтэрнатыва фактычна ўжо выклікала дэфляцыйны ціск ня толькі на пэрыфэрыю сусьветнае эканомікі, ня толькі на Эўропу, Японію, але і на самі Злучаныя Штаты. Калі гэты ціск узмоцніцца, немінуча надыдзе дэвальвацыя даляра на 20—40%. Яго абясцэньваньне адаб’ецца на эканоміках іншых краінаў, што змушаныя будуць пераарыентавацца з павелічэньня экспарту і ўнутранага попыту ў ЗША на ўласныя ўнутраныя рынкі й унутраны попыт. То бок глябальная амэрыкацэнтрычная эканоміка будзе згортвацца і шукаць новыя пункты раўнавагі, але найперш пройдзе фазу распаду на рэгіянальныя і нацыянальныя цэнтры эканамічнае актыўнасьці.

Другая альтэрнатыва — эканамічная мабілізацыя праз мабілізацыю вайсковую. Калі сёньняшняя адміністрацыя ЗША будзе настойваць на ажыцьцяўленьні абвешчанай СНБ, шанцы на карысьць гэтае альтэрнатывы рэзка падвышаюцца. Але такі выбар прадугледжвае захады, што супярэчаць сёньняшнім чаканьням амэрыканцаў: ня столькі паслабленьне падатковага цяжару, колькі яго ўзмацненьне, ня столькі вольны рынак, колькі яго цэнтралізацыя ды рэгуляваньне, ня столькі разьвіцьцё сацыяльных праграмаў, колькі зьяўленьне дадатковых выдаткаў на ўнутраную бясьпеку, ня столькі павелічэньне спажываньня, колькі яго абмежаваньне. Рызыка і няпэўнасьць, зьвязаныя з сусьветнымі цэнамі на нафту, далучаць дадатковы падатак на спажываньне энэргарэсурсаў. Другі сцэнар палягчае выплату запазычанасьці, але зусім мяняе характар эканомікі: спажывец не заахвочваецца, а абмяжоўваецца.

Можна было б меркаваць, што істотнае павелічэньне вайсковых выдаткаў значна зьменшыць дэфляцыйны ціск ды падштурхне рост цэнаў і попыт, але справа ў тым, што гэтыя працэсы хаваюць у сабе ўтварэньне гаспадарчае асымэтрыі, зьвязанай зь мілітарызацыяй эканомікі, якая абавязкова ўдарыць па спажыўцу. Ваенныя часы зьмяняюць і характар падзелу рызыкаў, якія, так бы мовіць, сацыялізуюцца, то бок не прыватны капітал, а менавіта дзяржава, нібыта пакліканая прэзэнтаваць публічныя інтарэсы, зробіцца самым актыўным агентам у рынкавых апэрацыях. У палітычным сэнсе такі стан можна будзе ахарактарызаваць як свайго роду “кампраміс між адміністрацыйным дэспатызмам і сувэрэнітэтам народу” — словы Алексіса дэ Токвіля, хоць і зь іншае нагоды.
Па дзеяньнях сёньняшняй адміністрацыі пакуль цяжка меркаваць, якой з альтэрнатываў яна аддае перавагу. З пункту гледжаньня эканамічнай палітыкі відавочна, што яна арыентуецца на зьмяншэньне падаткаў дзеля стымуляваньня спажыўца і ўнутранага попыту, на моцны даляр. Іншымі словамі, выбар зроблены на карысьць першай альтэрнатывы. У замежнай палітыцы, як відаць з СНБ, атачэньне Буша робіць стаўку на актыўныя вайскова-палітычныя інтэрвэнцыі, што запатрабуюць павелічэньня фэдэральных выдаткаў і, праз гэта, павелічэньня падатковага цяжару ды больш актыўнага ўмяшальніцтва дзяржавы ў эканамічнае жыцьцё краіны. Супярэчлівасьць такой пазыцыі адлюстроўвае ўнутраную фрустрацыю і ваганьні палітычнага істэблішмэнту й няздольнасьць зрабіць выбар у гульні, дзе, які б ні быў фінал, на посьпех разьлічваць складана.
Можна было б уявіць, што ЗША аддадуць перавагу нейкаму кампраміснаму падыходу, то бок балянсаваньню між дзьвюма альтэрнатывамі. Аднак цяперашні стан сусьветнае эканомікі патрабуе сапраўды жорсткага й адназначнага выбару. Дэфіцыт гандлёвага балянсу наблізіўся да 5% ВУП, што асацыюецца звычайна з крызысам нацыянальнае валюты. Акрамя таго, чыстая запазычанасьць ЗША да канца году дасягне 23% ВУП. Інвэстары пакуль што й далей укладаюць сродкі ў амэрыканскую эканоміку, ацэньваючы гэты рынак як адносна бясьпечны. Але ЗША вельмі блізкія да таго парогавага ўзроўню, калі тэндэнцыя можа рэзка разьвярнуцца і набыць процілеглую дынаміку, калі замежная запазычанасьць ЗША пойдзе ўгору

значна шпарчэй, чым тэмпы росту эканомікі. Як выказаўся Джон Ліпскі, вядучы эканаміст “JP Morgan”, тут мы маем справу ня з рызыкамі, якія можна прадбачыць, а зь нявызначанасьцю.
Толькі ваенная апэрацыя ў Іраку абыдзецца ў 100—200 млрд даляраў. У прынцыпе, гэта ня вельмі істотная сума для такой вялікай эканомікі, як амэрыканская, ВУП якой складае 10 трыльёнаў даляраў у год. Аднак суму падтрыманьня міру ў рэгіёне, каб забясьпечыць бесьперапынную пастаўку нафты, цяжка ацаніць.

Але галоўнае, што канфлікт у Іраку, з пункту гледжаньня СНБ, гэта толькі эпізод. СНБ прадугледжвае пэрманэнтную, як рэвалюцыя Троцкага, вайну з тэрарызмам, а значыць, павелічэньне вайсковых выдаткаў. Інвэставаньне ў вайсковы сэктар, у адрозьненьне ад цывільнага, не выклікае зьяўленьня новага эканамічнага цыклу, яно больш падобнае да субсыдыяваньня барацьбы з стыхійнымі бедзтвамі. Насуперак пэсымістычным пэрспэктывам амэрыканскае эканомікі, наўрад ці варта чакаць хуткай ды рэзкай дэвальвацыі даляра. Амартызацыйны эфэкт выклікае той факт, што даляр зьяўляецца асноўнай сусьветнай рэзэрвовай валютай і складае асноўную частку дзяржаўных рэзэрваў многіх краінаў. Акрамя таго, краіны, арыентаваныя не на ўнутраны рынак, а на экспарт, не жадаюць пераглядаць свае бягучыя гандлёвыя балянсы. Асабліва гэта тычыцца краінаў Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну, дзе сабралася каля 70% даляравае масы па-за межамі ЗША. Але стаўленьне да даляра ўсё адно можа рэзка пагоршыцца, калі ўявіць, што ў сёньняшніх ахопленых дэградацыяй эканамічных умовах будзе рэалізоўвацца курс СНБ на вайсковую інтэрвэнцыю. На якой стадыі цярпеньне замежнікаў скончыцца — цяжка сказаць. Сытуацыя ня мела прэцэдэнтаў, і ніводзін эканаміст ня возьмецца прадказваць, які ж гандлёвы дэфіцыт і якая запазычанасьць стануцца парогавымі для амэрыканскай эканомікі. Калі падзеі будуць складацца паводле гэтага сцэнару, ланцуговая рэакцыя пойдзе ў адпаведнасьці не зь вядомымі эканамічнымі мадэлямі, а з законамі калектыўнага псыхозу. Замежныя дзяржавы, прыватныя асобы і прадпрыемствы пачнуць панічна пазбывацца даляра ды шукаць новае манэтарнае вымярэньне свайго

багацьця. За даляр перастануць змагацца — даляраў раптам зробіцца як гразі.
Вядома, шанцы на тое, што менавіта гэты катастрафічны сцэнар разыграецца ў будучыні, пакуль што невялікія. Ён прапанаваны толькі для таго, каб падкрэсьліць меру пэрвэрсіі ды аўтызму, якія дэманструе СНБ адносна эканамічных рэаліяў. Верасьнёўскія жахі Нью-Ёрку 2001 году пацьвярджаюць, што існуюць сілы, гатовыя ісьці на тэрор і на любыя ахвяры, аж да самазьнішчэньня, дзеля рэалізацыі такой пэрспэктывы. Але мне цяжка ўявіць, каб у ЗША і нават у сьвеце, які неяк “мімаволі” зрабіўся антыамэрыканскім, былі палітыкі, зацікаўленыя ў такой рэвалюцыйнай перабудове. Хутчэй, пра СНБ забудзецца нават цяперашняя амэрыканская адміністрацыя, але, на жаль, толькі пасьля таго, як зробіць нейкую фатальную дурноту.

Інэрцыя палітыкі
СНБ стварае ўражаньне дакумэнту, напісанага для надзвычайных абставінаў. У гэтым сэнсе паказальныя два аспэкты: першы — настойлівае абгрунтаваньне неабходнасьці надаць прэзыдэнту асаблівыя ваенныя паўнамоцтвы: “Прэзыдэнта варта забясьпечыць шырэйшым колам вайсковых магчымасьцяў”; другі — закамуфляванае імкненьне да мілітарызацыі цывільнага жыцьця й цывільных інстытутаў. Надзвычайная сытуацыя нібыта патрабуе большай канцэнтрацыі ўлады ў руках прэзыдэнта, хуткага й эфэктыўнага рэагаваньня, дзеля якіх варта ахвяраваць грувасткімі й малаэфэктыўнымі дэмакратычнымі працэдурамі. Разнастайныя магчымасьці выхаду з крызыснай сытуацыі нібыта аддаюцца цэнтру й зводзяцца да адной-адзінай магчымасьці — вайсковай. Такі спосаб мысьленьня і дзеяньня адбіваецца і ў афіцыйным стаўленьні да ААН. Зьмяняецца нават характар працы амэрыканскіх дыпляматаў, якія, згодна з СНБ, зрабіліся жаўнерамі на “лініі фронту складаных перамоваў, грамадзянскіх войнаў ды іншых гуманітарных катастрофаў”. Апроч таго, яны мусяць быць здатнымі — з гуманітарнай, вядома, мэтай — дапамагаць адбудоўваць у “складаных” краінах паліцэйскія збройныя сілы, судовыя сыстэмы, заканадаўствы, мясцовыя і правінцыйныя ўрадавыя інстытуты ды выбарчыя сыстэмы.

Галоўная пагроза інтарэсам ЗША паўстае з вонкавага сьвету, а прычынай зьяўляецца ня толькі існаваньне краінаў-ізгояў, але й адсутнасьць належнага дзяржаўнага кантролю, які варта дапамагчы арганізаваць бедным і слабым краінам.
Як цьвердзіць дакумэнт, “аснова амэрыканскай магутнасьці — усярэдзіне краіны. Менавіта адсюль пачынаецца нашая нацыянальная бясьпека”. Таму якраз усярэдзіне краіны трэба, найперш, рэарганізаваць структуры нацыянальнай бясьпекі. Верасень 2001 году, адзначаецца ў СНБ, засьведчыў, якой шкоды ЗША можа нарабіць невялікая недзяржаўная арганізацыя фанатыкаў-тэрарыстаў з параўнальна сьціплымі фінансавымі магчымасьцямі. Зразумела, што сама прырода новых пагрозаў патрабуе, каб пад пільным наглядам знаходзіліся ня толькі “краіны-здрадніцы”, кшталту Іраку або Ірану, але й маргінальныя палітычныя ды рэлігійныя групоўкі — усе, хто хоць крыху неляяльны да даміноўнага спосабу жыцьця, каштоўнасьцяў або палітычнага рэжыму краіны.
На практыцы такая настанова можа азначаць толькі ўзмацненьне палітыкі адрознасьцяў, паколькі ня толькі нетрадыцыйная для краіны рэлігія, экзатычны колер скуры ці валасоў, але любы, нават мастацкі, нанканфармізм можа падацца чужым і падазроным. Гіерархічным, складана арганізаваным структурам бясьпекі, як сьведчыць зусім нядаўні досьвед, будзе надзвычай складана ня толькі арганізаваць агентурную працу ўсярэдзіне вялікай колькасьці падазроных і “патэнцыйна небясьпечных” мікрасуполак і групаў аднадумцаў, але й клясыфікаваць сабраную інфармацыю. Неадэкватнасьць дзяржаўных, гіерархічна арганізаваных структураў у барацьбе з поўнымі рашучасьці, арганізаванымі не гіерархічна, а паводле сеткавага прынцыпу суполкамі аднадумцаў нагадвае неадэкватнасьць рэгулярных часьцей, што змагаюцца з магутным партызанскім рухам. Адсюль патрэба зьвяртацца да такога сумнеўнага з усіх бакоў паліятыву, як грамадзянская пільнасьць, ініцыятыва і кантроль пад лёзунгам “Або з намі, або супраць нас”.

Такая трансфармацыя культурных і сацыяльных настановаў усярэдзіне Злучаных Штатаў ня можа не ўзмацняць адчужанасьці эўрапейскіх хаўрусьнікаў, на адрас якіх СНБ дэманструе прыязнасьць, ахвярнасьць і альтруізм, што

даходзяць часам да фальцэту. У аснове недаверу эўрапейцаў ляжыць ня толькі прыродная насьцярожанасьць да экзальтаванага сяброўства Вялікага Брата, але й уласныя эгаістычныя інтарэсы ды ўяўленьні пра годнасьць.
Першая вайна ў Пэрсыдзкай затоцы каштавала 61 млрд даляраў, зь іх 54, то бок дзьве траціны, далі краіны міжнароднае кааліцыі (краіны Пэрсыдзкай затокі заплацілі за вайну 36 млрд даляраў, Нямеччына і Японія — 16 млрд, Злучаныя Штаты выдаткавалі ўсяго 7 млрд). Цалкам відавочна, што гэтым разам эўрапейцы наўрад ці пагодзяцца плаціць за прэвэнтыўную, тым больш зьдзейсьненую ў абыход ААН ваенную апэрацыю ў Іраку. Тым больш ня хочуць яны плаціць за чужыя інтарэсы ды інтэрвэнцыянісцкія амбіцыі, вельмі дакладна сфармуляваныя ў СНБ. Эўропа, удзячная Амэрыцы за вызваленьне ад фашызму, за стрымліваньне камунізму, выросла з кароткіх штонікаў і ў апошнія дзесяцігодзьдзі дасягнула вялікай эканамічнай аўтаноміі. Пасьпяховы досьвед інтэграцыі ў Эўразьвяз такіх краінаў, як Гішпанія ці Партугалія, заахвочвае эўрапейцаў да далейшае экспансіі на Ўсход. Калі эўрапейцы не задаволеныя легкаважным стаўленьнем амэрыканцаў да глябальнага пацяпленьня і Кіёцкага пратаколу, дык аплачваць войны, выкліканыя амэрыканскай залежнасьцю ад нафтавых рэсурсаў, не жадаюць і пагатоў. Тым больш, амэрыканскі грамадзянін спажывае ў сярэднім у 2—2,5 разу больш нафтапрадуктаў, чым, напрыклад, брытанец. Розьніца ў культурных ды экалягічных настановах асабліва выразна праяўляецца ў тым, што ў некаторых эўрапейскіх краінах да ўлады прыйшлі партыі зялёных, тады як адміністрацыю Буша ўзгадавала нафтавая індустрыя.
Дарма што між Эўразьвязам і ЗША зьяўляюцца рысы будучых палітычных і культурных канфліктаў, эўрапейскія лідэры, зь невялікім выключэньнем і вельмі непасьлядоўна, дэманструюць хутчэй слабасьць і разгубленасьць, чым самастойнасьць. Яны праглынулі тое, што Злучаныя Штаты парушылі Жэнэўскую канвэнцыю ў дачыненьні да ваеннапалонных “Аль-Каіды” й “Талібану”. Яны пайшлі на прынізьлівыя саступкі, калі амэрыканскі бок запатрабаваў (гэта сфармулявана і ў СНБ) “забясьпечыць абарону сваіх грамадзянаў ад ICC (Міжнароднага крымінальнага суду) і поўнае выкананьне Закону пра абарону амэрыканскіх

вайскоўцаў”, які бароніць адных толькі грамадзянаў ЗША ад адказнасьці за вайсковыя злачынствы. Нарэшце, яны моўчкі трываюць абяцаньне СНБ пакараць кожнага, хто толькі паспрабуе дасягнуць вайсковай перавагі над Злучанымі Штатамі.

Прадметам асобнага дасьледаваньня можа стацца факт адсутнасьці хоць трохі прыкметнага шырокай публіцы абмеркаваньня новай СНБ ня толькі ў расейскай, але і ў эўрапейскай прэсе. Такія дакумэнты вартыя, аднак, пільнейшае ўвагі. Чаму? Адзначу, цалкам адвольна выбраўшы, два пункты, што як такія яшчэ не даюць поўнага адказу на пытаньне. Першы пункт зьвязаны з Вудра Вільсанам, візіянэрам і прэзыдэнтам Злучаных Штатаў, які прапанаваў прынцып “адна нацыя — адна дзяржава”. Матывацыя прынцыпу была эгалітарысцкая ды маралізатарская: спыніць дыскрымінацыю ды сэгрэгацыю, а таксама надаць усім грамадзянам роўныя правы ў межах сваіх нацыянальных дзяржаваў. З часу, як той прынцып атрымаў міжнароднае прызнаньне (ён не ўвайшоў у Статут Лігі нацыяў, але ўжо тады набыў у міжнародным праве сілу закону), высокамаральнае жаданьне абараніць нацыянальныя меншасьці ператварылася ў практыку бесьперапыннага генацыду, фізычнага зьнішчэньня ці гвалтоўнага высяленьня. Пра гэты эпізод нагадаў мне артыкул Джэймза Керала, які ў “The Boston Globe” ад 17 кастрычніка 2002 году назваў СНБ “новай праграмай маралістычнага імпэрыялізму”, а вайну ў Іраку — толькі прэлюдыяй Новай Эры. Стылістыка прамоваў прэзыдэнта і ягонага спараджэньня СНБ і сапраўды вызначаюцца маралізатарскім візіянэрствам. Пытаньне, якое цікавіць Керала, тычыцца не прыроды візіянэрства палітычных лідэраў, а грамадзтваў, якія дазваляюць сябе радыкальна трансфармаваць безь ніякіх істотных публічных дэбатаў.
Другі пункт зьвязаны з назіраньнем Дж.К.Гелбрэйта за паводзінамі амэрыканскай бюракратыі падчас вайны ў Віетнаме. Нават пасьля таго, як вядучым палітыкам і функцыянэрам зрабілася ясна, што перамога ў вайне, якую абяцаў Пэнтагон, — папросту нерэальная, што вайна выклікала інфляцыю і стагнацыю эканомікі, вайсковая і дзяржаўная бюракратыя і далей дзейнічала па інэрцыі: “Бюракратыя не

магла зьмяніць напрамак у бок спыненьня ваенных апэрацыяў… Наіўныя людзі лічылі: варта ім толькі паказаць, што мэта зьнікла, як адразу самі сабою спыняцца й дзеяньні бюракратаў. Гэта ня так. Мэта — адна з самых апошніх патрэбаў бюракратыі" ("Economics, Peace, and Laughter", 1972). Ясная рэч, у нейкім сэнсе сьвет, абяцаны СНБ, застанецца ідэфікс ці рытарычным практыкаваньнем, але фармуляваньне яго ідэі будзе мець доўгатэрміновыя наступствы і, магчыма, цягам дзесяцігодзьдзяў уплываць на глябальна-палітычна-эканамічныя тэндэнцыі. Менавіта заведзены СНБ інэрцыйны мэханізм робіць вельмі верагодным Валерстайнаў прагноз, вынесены ў эпіграф гэтага артыкулу.
Пераклаў з расейскай А.С.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

[image]
A R C H E
П а ч а т а к
№ 3 (26) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
Рэх Аўтар [image] 2003
аналізыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

Міхаэль Фройнд

Расколіна расьце
Пра сучасны стан трансатлянтычных стасункаў*

МІХАЭЛЬ ФРОЙНД — рэдактар штотыднёвага дадатку “Album” да аўстрыйскага штодзёньніка «Der Standard». Супрацоўнічае з Інстытутам імя Рэмарка пры Нью-ёрскім унівэрсытэце, які дасьледуе дачыненьні паміж Эўропай і Паўночнай Амэрыкай. Пераклад друкуецца з ласкавай згоды аўтара й выданьня.

“Годзе рабіць выгляд, быццам эўрапейцы і амэрыканцы маюць аднолькавы сьветагляд. Амэрыканцы з Марсу, эўрапейцы — з Вэнэры”.
Робэрт Каган, “Policy Review”
“Амэрыканізацыя Эўропы — гэта міт”.
Рычард Пэлз, “Not like us”

Як і ў ранейшыя гады, яны зь нецярпеньнем чакалі падарожжа: куратар мастацкіх выставак, якога ў Парыжы чакалі сустрэчы з патэнцыйнымі пакупнікамі й ахвярадаўцамі; сямейная пара, што рыхтавалася правесьці аксамітны сэзон у бухце Пазытана**; выкладчыца, якая ехала на сустрэчу з студэнтамі ў Дэсаў. Але заміж мілых сувэніраў, цудоўных успамінаў і сяброўскага абмену думкамі яны вярталіся дамоў з глыбокім

* Першапублікацыя “Der Standard, ALBUM”

расчараваньнем, выказаным словамі куратара: “Заказу варожасьцю да амэрыканцаў я не сутыкаўся ніколі”. І гэта ўсяго толькі за год пасьля 11 верасьня.
Іхныя падарожныя аповеды толькі пацьвярджаюць, што можна штодня тут і там назіраць, што прызнаюць або толькі падкрэсьліваюць сваімі абвяржэньнямі прэс-сакратары ўрадаў, на што намякаюць няўдачы на так званым найвышэйшым, а значыць і найглыбейшым узроўні і што тлумачыцца не выпадковай прыхамацьцю ці хуткаплынным інтэлектуальным капрызам таго ці іншага дзяржаўнага дзеяча, а хутчэй даўно наяўнай тэндэнцыяй: стасункі паміж ЗША і Эўропай перажываюць крызыс.
Пра гэта ўжо даўно пачалі гаварыць: па заканчэньні халоднай вайны — намёкамі, пасьля абвяшчэньня Бушам ваеннай кампаніі — часта і наўпрост. Але мы толькі-толькі пачынаем усьведамляць, наколькі глыбака й шырака сягаюць адрозьненьні. Кантынэнты дрэйфуюць у розныя бакі, Атлянтыка робіцца шырэйшай. Трансатлянтычныя лініі, угрунтаваны на ўдзячнасьці, дапамозе і вайсковай партрымцы, ды замацаваны эканамічнымі посьпехамі, здаваўся непарушным на ўсе часы. Калі падзеньне Бэрлінскага муру ўжо несла ў сабе зародак новай тэндэнцыі, Фрэнсыс Фукуяма яшчэ даводзіў (памятаеце? вечнасьць мінулася ад таго часу!), што надышоў “канец гісторыі”, што вольны рынак і лібэральная дэмакратыя зрабілі далейшую гісторыю непатрэбнай.
Як вядома, сталася адваротнае. Зьявіліся магутныя супярэчнасьці, узьніклі новыя лініі падзелу. Успомнім: Сэм’юэл Гантынгтан канстатаваў “сутыкненьне культураў” і вызначыў ісламскі блёк як адзін з чатырох, што супрацьстаяць заходняму, асьвечанаму юдэйска-хрысьціянскаму блёку. Аднак Эўропа перастала быць верным малодшым партнэрам у гэтай фракцыі. Гісторыя адно толькі пачынаецца.

Наконт гэтага ўсе зацікаўленыя бакі згодныя. Але абапал акіяну працягваецца спрэчка аб тым, у чым прычыны разыходжаньняў, наколькі разыходжаньні небясьпечныя і перадусім — якія доўгатэрміновыя наступствы і для каго яны будуць мець. Хто мае праявіць пільнасьць? Ці маюць разыходжаньні толькі палітычную прыроду, ці яны ўзыходзяць да культурных і маральных каранёў, ці толькі як далёкае рэха

Запасаў 2003 (© Der Standard, © Eurozine www.eurozine.com).

Positano — італійскі курорт. — Рэд.

адбіваюць тое, што было прадвызначана гісторыяй і асноватворнымі, дзяржаватворнымі мітамі?
Зь іншага боку, можна зусім канкрэтна запытацца — і гэтак пытаньне ўжо ставілася, — што думаюць жыхары Амэрыкі й Эўропы пра палітыку і вартасьці на супрацьлеглым баку акіяну. (Пры гэтым высьветліцца, што нават такія паняткі, як “патрыятызм” ці “хрысьціянства”, азначаюць розныя рэчы і іначай ужываюцца.)
Эўрапейска-амэрыканскія дачыненьні бяруць пачатак зь білету ў адзін канец, гэта былі ўцёкі морам ад рэлігійнай і сацыяльнай дыскрымінацыі да новага раю на зямлі. Ён, натуральна, разумеўся як супрацьлегласьць спачатнай (Англія) і пазьнейшым эўрапейскім радзімам. Так паўставала своеасаблівая падвойная ідэнтычнасьць: амэрыканцы ад самага пачатку адчувалі сваю апрычонасьць, але з аглядкай на сваё паходжаньне, незалежна ад таго, як — з гонарам ці агідай — яны да яго ставіліся. А эўрапейцы доўгі час уважалі экспэрымэнт у Новым Сьвеце за — ці то захапляльны, ці то сьмеху варты — працяг Старога.
Прычым, гаворачы пра “эўрапейцаў”, мы заўсёды маем на ўвазе пэўную фікцыю. “Амэрыканцы” пагатоў існуюць толькі ў абстрактным сэнсе, прыкладам, у апытаньнях як сярэдняе статыстычнае значэньне з моцнымі ваганьнямі. Да таго ж іхнае эўрапейскае паходжаньне — гэта прыкмета, якая ў працэнтным выражэньні зьніжаецца на карысьць Лацінскай Амэрыкі і Азіі.
У ліку першых, хто назіраў станаўленьне новага грамадзтва, быў француз Алексіс дэ Таквіль. Кнігу “Пра дэмакратыю ў Амэрыцы”, напісаную пасьля ягонага падарожжа 1831—32 гадоў, і сёньня ўважаюць за адно з найлепшых выданьняў пра гэтую краіну і яе форму кіраваньня. Ён апісаў, як рэлігійна афарбаваны ідэалізм ішоў поруч зь зямнымі матэрыяльнымі інтарэсамі; як высака цаніла маладая нацыя індывідуалізм і як не давярала дзяржаве; што надзвычай вялікі ўплыў мелі адвакаты, а таксама, у параўнаньні з Эўропай, жанчыны; як мала цікавілі жыхароў краіны тэарэтычныя спрэчкі і як амэрыканцы захапляліся практычнымі ведамі.

Дэ Таквіль меў магчымасьць назіраць, як фармуецца перакананасьць амэрыканскіх жыхароў у тым, што Амэрыка — зямля абяцаная. Адно ў 1845 годзе нейкі журналіст стварыў

выраз “manifest destiny” — відавочнае наканаваньне заваяваць кантынэнт, няўхільна адсоўваць межы. Гэты вобраз стаў актуальным троху пазьней, пры канцы XIX стагодзьдзя. На захадзе краіны тады ўжо не было фізычнай мяжы, і гэты панятак набыў мэтафізычнае значэньне. (Слынная прамова Кенэдзі пра заваёву апошняй новай мяжы, космасу, была пакліканая спалучыць мэтафару штурму нябёсаў з тэхнічнай рэчаіснасьцю.)

Абыякавасьць да сьвету за межамі ЗША, пераадоленая толькі пару пакаленьняў таму назад, ураўнаважвалася мэсіянскай сьведамасьцю амэрыканцаў, іхнай гатоўнасьцю падзяліцца сваёй блаславёнасьцю зь іншымі краінамі. Гэтая акалічнасьць абумоўлівала то экспансіянісцкую, то ізаляцыянісцкую палітыку ЗША. Уварваньні падчас абедзьвюх сусьветных войнаў паставілі амэрыканскія стасункі з Эўропай на зусім новы грунт: Амэрыка сталася палітычным гульцом, больш за тое, пасьля другой сусьветнай вайны яна атрымала магчымасьць вызначаць правілы гульні. Яна была прадвесьцем мадэрнасьці, будучыні, вызваленьня ад традыцыяў, пазбаўленьня аўтарытэтаў, маскультуры: такім быў status quo паваеннага часу, які ня ўсе віталі, але які ніхто ня мог аспрэчваць.

Вернемся, між тым, ізноў да вандроўнікаў: ад часоў Таквіля іх ладне пабольшала. Пісьменьнікі перасякалі Атлянтычны акіян у абодвух кірунках. Марк Твэн мог іранізаваць з ангельцаў гэтаксама, як і з вэрмонтцаў, Фрыдрых Герштэкер пісаў раманы пра Дзікі Захад пасьля працяглага беспасярэдняга назіраньня за ім. Нават Карл Май сам пабываў у краіне сваіх мараў, праўда, толькі post festum. У дваццатыя гады *lost generation* купляла білеты ў адзін канец да Парыжу. Гэта было прадвесьнікам жарсьці амэрыканскіх інтэлектуалаў да нечага цалкам іншага, да жыцьця, якое ўва ўласнай краіне здавалася ўжо немагчымым (альбо было занадта дарагім...).

Агульнадаступнымі і папулярнымі падарожжы з Эўропы ў Амэрыку сталі толькі за апошнія дзесяцігодзьдзі. Цяперашні падарожнік прыбывае ў ЗША нашпігаваны абяцанкамі, якія яму ўвялі ў вушы мэдыі. Але ў сапраўднасьці, падарожнічаючы па краіне з расплюшчанымі вачыма, ён можа сутыкнуцца зь сьветам Таквіля, а не тэлесэрыялаў — з супярэчлівым, чужым сьветам. Ён можа пабачыць на ўласныя вочы, што ЗША зусім не настолькі “мадэрныя”, як яго пераконвалі, а ў некаторых

абсягах надзіва традыцыйныя. Што Эўропа нашмат больш аддалілася ад Амэрыкі, а не наадварот. (Зрэшты, Стары Сьвет таксама перастае быць “прарадзімай” амэрыканцаў. Хаця цяпер каля дзьвюх трацін жыхароў Злучаных Штатаў маюць эўрапейскае паходжаньне, прагназуецца, што за 20 гадоў яны будуць складаць меншыню, перадусім у выніку прытоку лацінасаў і азіятаў.) Што сама Амэрыка поўніцца супярэчнасьцямі: шмат з таго, што можна пачуць пра гэты кантынэнт, адпавядае сапраўднасьці з дакладнасьцю наадварот — якраз таму, што гэта цэлы кантынэнт, а не гамагенная, монакультурная дзяржава (аднак і гэта слушна ізноў з дакладнасьцю наадварот: у пэўных адносінах ЗША пададуцца замежнаму госьцю нашмат аднастайнейшымі за радзіму...).

Такім чынам, падарожжы на Захад часам незаўважна і тонка ўплывалі на стаўленьне эўрапейцаў да Амэрыкі. Яны разьвенчвалі адныя міты і стваралі іншыя. Яны, прынамсі, давялі, што Злучаныя Штаты належыць успрымаць як нешта апрычонае, а не настойваць на тым, што яны ёсьць адно благой копіяй нашай уласнай культуры. З шматстайных чыньнікаў, якія ўплывалі на фармаваньне такіх складаных стасункаў, як трансатлянтычныя, асабістыя ўражаньні, магчыма, адыгрывалі ролю маленькіх сэйсмографаў, здольных прадказваць буйнейшыя зрухі.
Былі і больш яўныя прыкметы таго, што трансатлянтычны хаўрус трашчыць у швах. У залежнасьці ад краіны і ўраду канфлікты мелі больш ці менш сур’ёзныя наступствы. Гэтак, дэ Голь увесь час канфліктаваў з амэрыканскімі (і англа-канадзкімі) палітыкамі, выгнаў штаб-кватэру NATO з Францыі і супрацьпаставіў абарончаму пакту дамаслыя force de frappe* — рэч ясная, у рамках выразна заходняга сьветагляду. Лібэральная, адкрытая для эмігрантаў і асобаў, што ўхіляюцца ад службы ў войску, Швэцыя раздражняла Вашынгтон падчас Віетнамскай вайны, а прапагандаваны ў Італіі *eurocomunismo* — і да яе, і пасьля яе; ёсьць зьвесткі, што тайныя атрады пры падтрымцы ЦРУ былі гатовыя ўзьняць путч, каб прадухіліць, на іх думку, найгоршае — непажаданы для Захаду ўрад.
Пратэст супраць вайны ў Паўднёва-Ўсходняй Азіі аб’яднаў левае студэнцтва з абодвух бакоў акіяну, зьявілася пачуцьцё міжнароднай салідарнасьці, якое часткова прыцьміла розныя

карані пратэсту. Амаль сьвядомай маніпуляцыяй падаецца той факт, што ў той час у зводкі навін часта траплялі дзьве арганізацыі з аднолькавай абрэвіятурай — “SDS”. Пры гэтым амэрыканскія студэнты мелі дужа мала супольнага зь левым сацыялізмам “Сацыялістычнага Нямецкага Студэнцкага Зьвязу” (Sozialistischen Deutschen Studentenbundes), а немцам, у сваю чаргу, засталася чужой лібэральная традыцыя “Студэнтаў за дэмакратычнае грамадзтва” (Students for a Democratic Society). Восемдзясятыя гады прынесьлі кансалідацыю афіцыйных эўрапейска-амэрыканскіх дачыненьняў. Найвыразьней гэта выявілася ў салодкай парачцы Тэтчэр — Рэйган — наагул дачыненьні зь Вялікабрытаніяй для Амэрыкі былі і ёсьць найменш праблемнымі. Дый з Заходняй Нямеччынай пры Колю — пасьля неспакойных часінаў дэманстрацыяў за мір і пратэстаў супраць разьмяшчэньня ракетаў сярэдняга радыюсу дзеяньня — праблемаў таксама было мала. Распад усходняга блёку, здавалася, пацьвердзіў правільнасьць палітыкі Рэйгана, і Фукуяма мог прагаласіць канец гісторыі.

Дачыненьні паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі былі і застаюцца выняткам з правіла. З аднаго боку, на іх наклала адбітак асаблівая сымпатыя — як-ніяк, французы падтрымалі маладую нацыю ў ейнай барацьбе за незалежнасьць, прадалі ёй Вялікую Луізіяну і падаравалі Статую Свабоды. Зь іншага боку, яны пазначаныя выпадамі, якія часам перарасталі да памераў злосных дэмаршаў, але звычайна зводзіліся да больш ці менш сур’ёзных культурных сутычак — вельмі амбівалентных. У Францыі змагаюцца супраць дамінаваньня Галівуду і ўплыву ангельскай мовы на французскую, але наўрад ці яшчэ недзе ў Эўропе так сымпатызуюць амэрыканскім культурным кумірам. Можна пагарджаць “Макдональдзам”, пісаў “Wall Street Journal” летась увосень з нагоды канцэрту Спрынгстына ў Парыжы, “*but the Boss still rocks*”.
Затое для сярэдняга амэрыканскага кінагледача няма нічога дзіўнейшага за фільмы, у якіх людзі, зусім не падобныя да зорак, у чорных вадалазках, палячы цыгарэту за цыгарэтай, вядуць міжсобку бясконцыя спрэчкі — прынамсі, так выглядае стэрэатып пра французскае інтэлектуальнае кіно; сапраўдная кінапрадукцыя і без таго рэдка калі трапляе ў амэрыканскія кінатэатры. Нягледзячы на гэта, якраз у ЗША вобраз savoir vivre

знаходзіць вялікае прызнаньне пачынаючы ад моды і да кухні, альбо, на адзін узровень вышэй, ад аховы помнікаў і да аховы здароўя. “Я была крытыкам гіпэрсацыяльнай дзяржавы, — пісала нядаўна адна амэрыканская карэспандэнтка з Парыжу, — пакуль не прайшла шматмесячнага лячэньня ад раку і не атрымала ўрэшце рахунку на 50 з гакам франкаў”. Дома яна б апусьцілася за мяжу галечы. (Ангельскі гісторык, знаўца Францыі і Амэрыкі Тоні Джат кажа, што за насьмешкамі англаў над галамі крыецца чыстая зайздрасьць. А амэрыканскі гісторык Рычард Пэлз мяркуе, што эўрапейцы перадусім трансфармавалі амэрыканскі культурны імпарт, а не капітулявалі перад ім.)

Пасьля заканчэньня халоднай вайны дзьве дынамічныя тэндэнцыі — канфлікт на Балканах і наступствы 11 верасьня — выпрабоўвалі на трываласьць трансатлянтычныя дачыненьні, і дабром гэта ня скончылася.

У экс-Югаславіі выявілася, што Эўропа, нягледзячы на імкненьне да эканамічнага адзінства, ня можа ці ня хоча праводзіць супольнай замежнай і вайсковай палітыкі. Меў месца своеасаблівы падзел працы: ЗША ажыцьцяўляюць ваенную кампанію, Эўрапейскі Зьвяз вырашае пасьлейшыя гуманітарныя заданьні. З гэтага часу пра такі падзел стала гавораць: амэрыканскія ястрабы — крытычна, носьбіты новай эўрапейскай ідэнтычнасьці — самаўпэўнена.

Напад тэрарыстаў на Сусьветны гандлёвы цэнтар і Пэнтагон сьпярша адцясьніў усе разыходжаньні на задні плян. Заклікі да еднасьці і запэўніваньні ў адданасьці заходнім вартасьцям нават набілі аскоміну. Але неўзабаве няўзброеным вокам стала відаць, што фронт развальваецца.

Тут шмат што супала на розных узроўнях: зьнікненьне біпалярнага сьвету зь ясным вобразам ворага; горкае расчараваньне Эўропы на Балканах; новы тон вашынгтонскай адміністрацыі за паўгоду да нападу, пасьля зацьверджаньня ўраду Буша; усё большы скепсыс што да абсалютысцкіх прэтэнзіяў гэтага ўраду; адсутнасьць досьведу змаганьня з новым праціўнікам, супраць якога не спрацоўваюць старыя абарончыя канцэпцыі; розныя пагляды на тое, як міжнародная супольнасьць павінна абыходзіцца з краінамі-“ізгоямі”. Але гэта толькі макрапалітычныя чыньнікі. Апроч іх, ёсьць яшчэ

сацыяльныя і культурныя як разыходжаньні, так і падабенствы, што разьвіваюцца паводле собскай, практычна непрадказальнай дынамікі.
Заходнеэўрапейцы, асабліва немцы і французы, цяпер пераважна крытычна ацэньваюць ЗША. Толькі народы, якіх закранула блізкаўсходняя і антыісламская палітыка Амэрыкі, выказваюць да яе яшчэ большую нелюбоў, тады як усходнія эўрапейцы і яшчэ больш японцы сымпатызуюць ідэям, звычаям і ўяўленьням аб дэмакратыі Злучаных Штатаў. Тым ня менш, пераважная бальшыня ў Заходняй Эўропе згодная, што пры наяўнасьці яшчэ адной звышдзяржавы сьвет быў бы ў большай небясьпецы, — тут наўрад ці ёсьць розьніца паміж ангельцамі і жыхарамі кантынэнту. Яны дыстанцыююцца ад вартасьцяў вялікага хаўрусьніка, але ня хочуць, каб яму ў разе чаго хтосьці пагражаў.
За гэты пункцік чапляюцца заакіянскія крытыкі Эўропы. Маўляў, Эўрапейскі Зьвяз ня можа разьвязаць нават сваіх уласных праблемаў, але хоча адыгрываць ролю раўназначнага партнэра на міжнароднай сцэне. “Але міжнародная палітыка ў сапраўднасьці — гэта далёка ня сьвет дабра і ласкі”, — кажа з гэтай нагоды нэакансэрватыўны і вельмі паважаны ў вашынгтонскіх колах палітоляг Робэрт Каган. Без вайсковай перавагі немагчыма рабіць міжнародную палітыку. Крытыка Кагана скіравана як супраць эўрапейскіх, так і супраць амэрыканскіх “пацыфістаў”, г.зн. усіх, хто ў выпадку Іраку адмаўляе ваенны варыянт. Пры гэтым эўрапейская апазыцыя турбуе яго менш, паколькі ён ня бачыць у замежнай палітыцы Эўрапейскага Зьвязу сур’ёзнай пагрозы. Апроч вайсковай слабасьці Эўропы ён і іншыя амэрыканскія нэакансэрватары накшталт Уолтэра Расэла Міда з Рады па міжнародных адносінах канстатуюць стагнацыю эўрапейскай эканомікі: “Джэксаніянцы* мяркуюць, што Эўропа найхутчэй будзе губляць уплыў і надалей, бо яе насельніцтва ня толькі зьмяншаецца, але і старэе, таму што яе эканоміка будзе разьвівацца павальней за эканомікі разьвіцьцёвых краінаў, ня кажучы пра амэрыканскую”.
Дэмаграфічныя праблемы Эўразьвязу дастаткова вядомыя і наўрад ці могуць быць разьвязаныя іначай, як праз радыкальна новую іміграцыйную палітыку. Затое эканамічныя прагнозы Кагана й іншых далёка не бясспрэчныя. Гісторык Чарльз Капчэн

тлумачыць назву сваёй кагадзе апублікаванай кнігі “Канец Эры Амэрыкі” маючым адбыцца ўздымам Эўропы (а таксама тым, што ЗША будзе цяжка захаваць аднапалярны парадак у сьвеце). Сацыёляг Рычард Сэнэт таксама пераканаы ў тым, што ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве Эўропа мае большыя шанцы на павелічэньне свайго міжнароднага значэньня, чымся ягоная бацькаўшчына (якую ён нядаўна пакінуў, каб асяліцца ў Англіі).

Сьпіс амэрыканскіх крытыкаў амэрыканскіх дачыненьняў альбо афіцыйнай пазыцыі што да Эўропы, прынамсі, настолькі ж даўгі, як і прыхільнікаў, — назавем зь першых толькі тых, у каго прозьвішча ў арыгінальным напісаньні пачынаецца на літару “С”: Картэр і Клінтан, Ноэм Чомскі і легендарны тэлежурналіст Уолтэр Кронкайт. У Эўропе таксама лініі падзелу расколваюць палітычны істэблішмэнт, дзеячоў навукі й культуры. Разам зь цяперашняй пагрозай вайны ў Іраку іх паглыбляюць экалягічныя праблемы, пытаньні замежнай дапамогі, межаў сацыяльнай апекі дзяржавы, ролі рэлігіі, нарошчваньня ўзбраеньняў і, урэшце, пытаньне, якія вартасьці трэба адстойваць.

Гэта можа скончыцца фундамэнталізмам (у якім ужо цяпер абвінавачваюць амэрыканцаў). Дрэйф кантынэнтаў, трансатлянтычнае ўзаемаразьмяжоўваньне ўжо пачалося, але яшчэ невядома, наколькі далёка яно зойдзе. На яго можна ўплываць. Магчыма, трэба зноў падарожнічаць, рэальна ці віртуальна. Нас чакаюць вялікія адкрыцьці, мы яшчэ шмат чаго ня ведаем — напрыклад, хто такія плюралісты, якія, паводле гісторыка Г.А.Вінклера, у Амэрыцы ўсё яшчэ вядуць рэй. Прагрэсіўнай, антыдагматычнай палітыцы акурат цяпер патрэбныя хаўрусьнікі на іншым, усё далейшым беразе.

Зь нямецкай мовы пераклаў
Алесь Пяткевіч

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Аліна Бельская

Мультылатэралізм або гегемонія ЗША?

АЛІНА БЕЛЬСКАЯ (нар. 1979 у Менску) — магістрантка факультэту сацыяльных навук Хельсынскага ўнівэрсытэту. У Фінляндыі з 1997 году, куды эмігравала, ратуючыся ад крымінальнага перасьледу па справе Шыдлоўскага — Лабковіча.

Разважанні пасля канферэнцыі “Будучыня трансатлантычных адносінаў”, што прайшла ў Хельсінках 16 траўня 2003 году.

Ваенныя дзеянні ў Іраку скончыліся, але ў прэсе адразу з’явіліся папярэджанні, што святкаваць поўную перамогу рана. У адрозненне ад войнаў у Персідскай затоцы і Афганістане, вайна ў Іраку не знайшла аднадушнай падтрымкі міжнароднай супольнасці. Даўно падзеі міжнароднай палітыкі не выклікалі такой рэакцыі ў насельніцтва Еўропы; звычайна замежная палітыка — справа вузкага кола экспертаў. Кіраўнікі краінаў Еўразьвязу, за выключэннем Нямеччыны, Францыі і Бельгіі, часам насуперак волі шматтысячных дэманстрацый, падтрымалі вайну супраць Іраку на падставе тых аргументаў, што прапанавалі Радзе Бяспекі ААН дзяржаўны сакратар ЗША Колін Паўэл і прэзідэнт Злучаных Штатаў Джордж Буш.

У руху пратэсту былі дзве плыні: адна пацыфісцкая, супраць любога ўжывання сілы, другая больш аналітычная, супраць беспадстаўнага ўжывання ваеннай сілы, бо Злучаныя Штаты не

здолелі дастаткова ясна давесці свой галоўны закід — што Ірак валодае зброяй масавага знішчэння і ўяўляе небяспеку для ўсяго свету. Доказаў дагэтуль няма. Не адзін разважлівы чалавек, відаць, падзівіўся, як Злучаныя Штаты здолелі згубіць усю падтрымку, якую выказаў ім свет пасля тэрарыстычнага акту 11 верасня 2001 году.
Пасля атакі на вежы гандлёвага цэнтру ў Нью-Йорку некаторыя аналітыкі паспяшаліся заявіць, што з гэтай даты пачаўся новы адлік у гісторыі міжнародных адносінаў у свеце, як калісьці Фукуяма паспяшаўся аб'явіць пра заканчэнне гісторыі, бо яму падалося, што пасля распаду Савецкай імперыі пераможны марш дэмакратыі і ліберальнай ідэалогіі па свеце непазбежны. Гісторыя ж не скончылася, яна працягвае баламуціць людзей ва ўсіх кутках свету, а міжнародныя адносіны працягваюць знаходзіцца ў стане турбуленцыі, у які яны патрапілі пасля распаду двухполюснага свету. Калі паглядзець на тое, аб чым дыскутавалі і дыскутуюць аматары міжнародных адносінаў дзесяць гадоў таму і цяпер, дык тэмы нязменныя. На пытанне "Ў якім свеце мы жывём?" чуюцца адныя і тыя ж адказы. Хто кажа — у аднаполюсным, дзе адзінай супердзяржаваю з'яўляюцца Злучаныя Штаты, а хто — у шматполюсным, дзе галоўную ролю адыгрываюць розныя рэгіянальныя блокі і вялікія дзяржавы.

Падобна на тое, што галоўнай дактрынай Злучаных Штатаў робіцца унілатэралізм, бо "што яшчэ можа быць вынікам дзеяння адміністрацыі, настольная кніга якой — макіявеліеўскі "Князь"? Гэтак скончыў сваю лекцыю перад хельсінкскімі студэнтамі Чарльз Кіглі. Злучаныя Штаты цяпер часта называюць імперыяй, але імперыяй не ў новым сэнсе, які быў нададзены гэтаму слову падчас халоднай вайны, калі Злучаныя Штаты і Савецкі Саюз любілі ахрысціць адзін аднаго "імперыяй зла", а ў сэнсе зусім не негатыўным, які гэтае слова мела ў афіцыйным палітычным лексіконе XIX стагоддзя. Тады імперскую міжнародную палітыку ўспрымалі як нешта пазітыўнае. Метраполія адказвала за спакой не толькі на сваёй тэрыторыі, але і ў свеце праз дамовы з іншымі вялікімі дзяржавамі. У культурным плане метраполія несла свае каштоўнасці, якія цаніліся сярод карэннага насельніцтва. Каб падтрымліваць мір на далёкіх тэрыторыях, мясцовая эліта

сацыялізавалася ва ўніверсітэтах метраполіі, а пасля ехала кіраваць сваім насельніцтвам. Паводле многіх стандартаў другая палова XIX стагоддзя была “залатым” часам, асабліва ў параўнанні з тым, што пачалося ў 1914-м годзе. Тым не менш, імперская палітыка набыла выключна негатыўную ацэнку з развіццём нацыяналізму і, як вынік, антыкаланіялізму на гэтых тэрыторыях.

Пры канцы XIX — на пачатку XX стагоддзя амерыканская дыпламатыя таксама імкнулася ўплываць на глабальныя падзеі. Амерыканскі прэзідэнт Тэадор Рузвельт нават вывеў уласную дыпламатычную дактрыну: “Гавары мякка, але кій з сабою май”. Многія дзяржаўныя лідэры пагадзіліся б з такой дактрынай і сёння, шмат хто аддаў бы ролю сусветнага паліцэйскага Злучаным Штатам. Адзінае, на што забыўся прэзідэнт Джордж Буш, калі рыхтаваў дыпламатычны фронт для вайны ў Іраку, гэта спачатку паспрабаваць “мякка паразмаўляць” не толькі з ворагам, але і з усімі зацікаўленымі бакамі, і тым самым пахіснуў добрае стаўленне да Злучаных Штатаў у эўрапейскіх краінах. Хаця ў прынцыпе гэта не так ужо і важна, бо ў аснове амерыканскай палітыкі бяспекі на першым плане стаіць праекцыя сілы і застрашванне.

У адказ на амерыканскую палітыку Еўрапейскі Звяз з свайго боку апошнім часам пачаў спавядаць мультылатэралізм, заснаваны на неабходнасці ўдзелу як мага большай колькасці зацікаўленых бакоў. Мультылатэралізм часта лічыцца палітычнай дактрынай слабейшага, якому патрэбныя саюзнікі, але ці заўсёды прапановы слабейшага горшыя за прапановы мацнейшага? Звычайна наадварот, бо слабейшы, каб перамагчы, мусіць прапанаваць нешта, заснаванае на кансэнсусе, палітыку, якую могуць прыняць і якой могуць прытрымлівацца некалькі бакоў, што можа зрабіць свет больш стабільным. Да таго ж гэтая дактрына мае ў аснове галоўны прынцып, які прапанавалі свету самі Злучаныя Штаты, — прынцып узаемастрымлівання і збалансаванасці. Гэтая дактрына спрыяе больш за ўсё малым дзяржавам, якіх прынамсі запрашаюць да стала выказаць свой пункт гледжання. Малыя краіны заўсёды будуць уважліва слухаць, што маюць сказаць краіны вялікія, але пры такім раскладзе ім будзе дадзеная магчымасць хоць неяк паўплываць на падзеі.

Так, Еўропа слабейшая за Злучаныя Штаты, і розніца ў вайсковай сіле будзе расці, але ў той жа час Еўрапейскі Звяз з'яўляецца самым шчодрым донарам свету. Так бы мовіць, зброя супраць хлеба. Еўропа перажыла ў мінулым стагоддзі дзве вайны, якія пакінулі яе ў руінах, яшчэ жывуць тыя, хто памятае жахі другой сусветнай, а сістэма адукацыі мае на мэце выхаваць непрыманне гвалту. Пасля дзвюх войнаў Еўропа паднялася спачатку эканамічна, а пасля і маральна, а Еўрапейскі Звяз прапанаваў усяму свету магчымую мадэль будучага развіцця. З ідэйнай, маральнай і матэрыяльнай падтрымкай Злучаных Штатаў Еўропа дасягнула міру і дабрабыту, але большасць, падаецца, забылася на гэты паспяховы прыклад.

Пасля вайны пачалася адбудова Іраку. Прыкладаў паспяховага адбудавання дзяржаваў не так ужо і шмат. У галаву, акрамя Еўропы, прыходзіць толькі Японія пасля другой сусветнай вайны. Але ў той час узровень жыцця скрозь быў ніжэйшы за сучасны, асноўныя гульцы цяперашняй сусветнай палітыкі ляжалі ў руінах, а натуральныя рэсурсы не лічыліся адным з галоўных прыярытэтаў нацыянальнай бяспекі. Усе нядаўнія прыклады — былая Югаславія, Афганістан, былы СССР пасля халоднай вайны — пакуль цяжкавата залічыць да паспяховых спробаў.

Большасць дыпламатаў пагаджаецца, што сілавое вырашэнне канфліктаў не з'яўляецца паспяховым, але іншага шляху пакуль што няма — будучым дыпламатам прыйдзецца паламаць галаву над новымі магчымымі спосабамі вырашэння новых праблемаў, якія паўстануць перад імі.

Магчыма, добры варыянт прапаноўвае Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў з яе шматбаковым падыходам да праблемаў бяспекі і падкрэсленай сувяззю паміж мірам, дабрабытам і бяспекай. Нават такія чыста фінансавыя інстытуты, як Сусветны банк і Міжнародны валютны фонд, спрабуюць уключыць сацыяльны аспект у праграмы эканамічнага развіцця, а таксама прапаноўваць экспертам і грамадзянам краінаў, якія патрабуюць дапамогі, паўдзельнічаць у распрацоўцы праграмаў пад крэдыты. Узмацненне Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў, якое падтрымлівае Еўропа, запатрабавала б прымянення дактрыны мультылатэралізму. Пасля распаду Савецкага Саюзу на міжнародную сцэну выйшлі новыя моцныя гульцы —

недзяржаўныя грамадскія арганізацыі, мас-медыі, фабрыкі думак. Пакрысе яны адбіраюць у кіраўніцтваў нацыянальных дзяржаваў манаполію на вядзенне міжнароднай палітыкі. Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў, а таксама, у меншай ступені, Еўрапейскі Звяз здолелі інкарпараваць гэтыя арганізацыі ў сваю дзейнасць. Зразумела, што дзейнасць недзяржаўнага сектару на глабальным узроўні не панацэя, але супрацоўніцтва і ўплыў на розных узроўнях ад глабальнага да мясцовага — крок наперад.

Добрым прыкладам супрацоўніцтва дзяржаваў, трэцяга сектару і міжнародных арганізацыяў з'яўляецца "Дэкларацыя тысячагоддзя", прынятая на саміце тысячагоддзя ў верасні 2000 году. Яна акрэсліла восем галоўных напрамкаў пажаданага развіцця свету: ліквідацыя крайняй галечы і голаду, забеспячэнне пачатковай адукацыі ўсім хлопчыкам і дзяўчынкам, падтрымка роўнасці між мужчынамі і жанчынамі і пашырэнне правоў і магчымасцяў жанчын, асабліва ў галіне доступу да адукацыі, скарачэнне дзіцячай смяротнасці, паляпшэнне аховы мацярынства, барацьба з СНІДам, малярыяй і іншымі захворваннямі, забеспячэнне экалагічнай устойлівасці і фармаванне глабальнага партнёрства ў мэтах развіцця. Апошняя мэта ўключае ў сябе вялікі комплекс задачаў — ад спрыяння развіццю вольнага гандлю і руху капіталаў без мытаў і іншых перашкодаў аж да супрацоўніцтва з фармацэўтычнымі кампаніямі ды палягчэння доступу да новых тэхналогіяў у супрацоўніцтве з прыватным сектарам. Гэтыя мэты шмат у каго могуць выклікаць усмешку і недавер, бо з'яўляюцца занадта ідэалістычнымі, але менавіта павышэнне жыццёвага ўзроўню ў бяднейшых краінах забяспечыць бяспеку краінам багацейшым. Свет пасля вайны ў Іраку радыкальна не зменіцца ні ў лепшы, ні ў горшы бок. Вайна ў Іраку толькі паскорыла ці абвастрыла лініі развіцця, якія назіраліся да яе. Што тычыцца Злучаных Штатаў, дык яны застануцца яшчэ на нейкі час адзінай краінай-выратавальніцай свету, бо, па-першае, ніводная іншая краіна і ніводзін іншы рэгіянальны блок не хочуць і не здольныя заняць гэтую пасаду, па-другое, Злучаныя Штаты не хочуць здаваць гэтую пазіцыю, па-трэцяе, іншага раскладу пакуль што не існуе. Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў пры падтрымцы ўсіх мацнейшых дзяржаваў мела б магчымасць паспрабаваць сябе ў

ролі глабальнага паліцэйскага, але эксперымент, які пачаў Еўрапейскі Звяз, калі краіны добраахвотна адракаюцца ад часткі свайго суверэнітэту, наўрад ці ў найбліжэйшыя часы будзе прыкладам для іншых. Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў будзе працягваць шукаць сваю ролю ў свеце. Сваю нішу ў міжнародных адносінах будзе шукаць і NATO. Больш за ўсіх будзе непрыемнасцяў у Еўрапейскага Звязу. Злучаныя Штаты больш не падтрымліваюць аб'яднання Еўропы, як раней, хутчэй наадварот, шмат у якіх галінах бачаць у ЕЗ канкурэнта. Таму пры пашырэнні і ўзмацненні ЕЗ еўрапейскім палітыкам прыйдзецца лічыцца з магчымым супрацьдзеяннем ці, прынамсі, уплывам Злучаных Штатаў. Асабліва з уступленнем новых сяброў, схільных падзяляць палітычныя міфы хутчэй Злучаных Штатаў, чым Еўропы, і спадзявацца, асабліва ў пытаннях бяспекі, больш на самаўпэўненыя Злучаныя Штаты, чым на асцярожную Еўропу. Магчыма, паскорыцца працэс распрацоўкі супольнай замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі ЕЗ, а таксама стварэння войскаў хуткага рэагавання.

Вайна ў Іраку паўтарыла прэцэдэнт парушэння суверэнітэту дзяржаваў і не абсалютна адпаведнай міжнароднаму праву інтэрвенцыі, якая абгрунтоўвалася толькі маральнымі меркаваннямі. Калі ў выпадку Югаславіі яшчэ вяліся прававыя дыскусіі на тэму, ці мае юрыдычныя падставы гуманітарнае ўмяшанне ў справы іншай дзяржавы, то ў выпадку Іраку такая дыскусія была ўжо непатрэбная. З аднаго боку, існаванне дыктатуры не можа быць дастатковай падставай для ўмяшальніцтва ў справы краіны без цвёрдых доказаў, што ад гэтай краіны сыходзіць небяспека для свету. З другога, наўрад ці гэткія ўмяшанні прымусяць дыктатарскія рэжымы задрыжаць ад жаху ці нейкім чынам паспрыяюць развіццю дэмакратыі.
У падтрымку гэтай тэзы маем і беларускі прыклад.
Для звычайных жа людзей усё застанецца так, як і было. Для бальшыні свет застанецца такім жа жорсткім і непрадказальным, з прысутнасцю тэрору, грамадзянскіх войнаў, хваробаў, экалагічных катастрофаў. Пасля тэрарыстычнага акту на вежах нават спакойны заходні свет зведаў, што значыць жах і няўпэўненасць, з якімі жыве бальшыня насельніцтва Зямлі, уключаючы амаль што ўсе былыя рэспублікі Савецкага Саюзу. Але гэтае пачуццё хутка

пройдзе, бо мы прызвычаіліся бачыць падобныя рэчы па тэлевізіі. Большасць з таго, што нам паказваюць, — гэта ілюзіі, у якія хочаш вер, хочаш ня вер. Нават сапраўдная вайна на тэлеэкране выглядае як кампутарная гульня. Тут прыгадалася карыкатура ў фінскай газеце “Хельсінгін Санамат”: вайсковец сядзіць за кампутарам і паказвае хлапчуку, як будзе весціся вайна ў Іраку: “Некалькі вайсковых аб’ектаў пазначаем курсорам, а зараз націскаем “Delete”.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Вера Рыч

Сьвет пасьля вайны

ВЕРА РЫЧ — паэтка й перакладчыца. Скончыла Оксфардзкі й Бэдфардзкі каледжы ў Лёндане. Выкладае славянскія літаратуры ва Ўнівэрсытэце Вірмінгему. Асабістая вэб-старонка http://www.belarus-misc.org/v-rich.htm. Яе папярэдняя публікацыя ў АРСНЕ — артыкул "Беларусь: ні дыктатура, ні дэмакратыя" (№ 2-2003).

"Сьвет ужо ня будзе такім, які ён быў раней!" Як часта мы чуем гэтыя словы пасьля якіхсьці сэнсацыйных падзеяў — дзяржаўных пераваротаў, прыродных катаклізмаў ці значных навуковых адкрыцьцяў. Але чамусьці сьвет застаецца сьветам, а зьмены звычайна мала яго мяняюць. Гісторыі, дый чалавечай памяці, уласьціва мінімізаваць мінулыя катастрофы — незалежна ад таго, ці спраўджваюцца "прадказаньні" адносна іх магчымых наступстваў. Між тым, найчасьцей прагнозы памыляюцца. Памятаю, якую занепакоенасьць выклікала вайна 1991 году ў Пэрсыдзкай затоцы. Мне давялося якраз у часе тае вайны ўзяць удзел у прадстаўнічым міжнародным сэмінары, прысьвечаным пераменам клімату на плянэце. Усе экспэрты сыходзіліся ў думках, што наступствам вайны стане экалягічная катастрофа ў Індыі. Дым ад падпаленых у Кувэйце нафтавых сьвідравінаў "бясспрэчна" зьменіць яе мусонны клімат; спрэчкі выклікала толькі пытаньне, пачнуцца дажджы раней ці пазьней звычайнага і ці колькасьць ападкаў будзе меншай за норму (вынікам чаго стануцца суша і голад) або краіну чакаюць катастрафічныя паводкі. А насамрэч нічога

гэтага не адбылося: мусоны дзьмулі, як і раней, а дажджу выпала роўна норма!
Здараецца і адваротнае, калі падзеі выпярэджваюць самыя сьмелыя прагнозы. У 1990 годзе на Кангрэсе дасьледнікаў Савецкага Саюзу і Ўсходняй Эўропы у Гарагейце найбуйнейшыя акадэмічныя выдавецтвы прэзэнтавалі каталёгі падрыхтаваных да друку кніжак з шматабяцальнымі загалоўкамі “СССР: да рубяжу тысячагодзьдзяў” і “Нямецкая Дэмакратычная Рэспубліка: эканамічныя пэрспэктывы 90-х”. Працам гэтым з цалкам зразумелых прычынаў не судзілася пабачыць сьвет. Таму я буду асьцярожная ў прагнозах, асабліва таму, што прапанаваная мне тэма — нядаўняя вайна ў Іраку — ляжыць па-за межамі маёй непасрэднай прафэсійнай кампэтэнцыі.
Каралеўскі інстытут міжнародных сувязяў (RIIA), сяброўкай якога я зьяўляюся, засяродзіў сваю ўвагу на двух найважнейшых аспэктах вайны і яе наступстваў: рэзкім пагаршэньні адносінаў між ЗША і Эўрапейскім Зьвязам ды ўплыве вайны на расклад сілаў у блізкаўсходнім рэгіёне. Першы канфлікт, у дэталях абсмактаны прэсаю і адзначаны вялікімі звадамі на высокім дыпляматычным узроўні, безумоўна, будзе раней ці пазьней згладжаны, бо ніхто ў ім не зацікаўлены. Што датычыць Вялікай Брытаніі (хаўрусьніцы ЗША ў вайне), дык антываенная палітыка “старой Эўропы” — Францыі й Нямеччыны — толькі ўзмацніла нежаданьне брытанцаў далучацца да “зоны эўра” і паглыбляць інтэграцыю ў ЭЗ у цэлым. Адначасова зьменшыўся давер да прэм’ер-міністра Брытаніі Тоні Блэра, цяпер ужо ня толькі ў шэрагах правае і цэнтрысцкае апазыцыі (кансэрватараў і сацыял-лібэралаў), але і ўнутры ягонай Лейбарысцкай партыі.

Пра ўплыў вайны на расклад сілаў на Блізкім Усходзе ў мэдыях гаварылі меней. Між тым, гэта ня менш цікавая тэма. Магчымае ўзьдзеяньне вайны на суседзяў Іраку можна падсумаваць наступным чынам.
Іран: скіданьне Садама Хусэйна, верагодна, паскорыць сёньняшнія дэмакратычныя зьмены ў Іране. Аднак паскорыцца і раскол іранскага грамадзтва; стасункі з ЗША не абавязкова сапсуюцца, яны могуць і палепшыцца.
Саудаўская Арабія: палітычная і эканамічная вага краіны ў

рэгіёне будзе зьмяншацца, уплыў у АПЭК рэзка ўпадзе, і без таго распаўсюджаная варожасьць да ЗША вырасьце, рэгіянальная, племянная і кланавая сьвядомасьць будзе ўмацоўвацца. Саудаўскі рэжым — пярэстая кааліцыя кіроўнага дому Аль-Саудаў і вагабіцкага духавенства — будзе сутыкацца з многімі праблемамі.

Ярданія: вайна можа мець для яе найбольшыя эканамічныя і палітычныя наступствы, асабліва калі ізраільска-палестынскі канфлікт абвострыцца. Найлепшым выйсьцем для Ярданіі было б узьнікненьне такога новага рэжыму ў Багдадзе, які быў бы легітымны ў вачах іракцаў і — зьвернем увагу — *не* ўспрымаўся б як навязаны амэрыканцамі.

Сырыя: сырыйская эканоміка моцна залежыць ад Іраку. Перакрыцьцё нафтаправодаў і спыненьне гандлю з Іракам будуць азначаць для Сырыі страту каля двух мільярдаў даляраў штогод. Дамаск спадзяецца адыграць важную ролю ў аднаўленьні Іраку, разьлічваючы, што большая частка будучага імпарту ў Ірак з Эўропы пойдзе праз сырыйскі порт Тартус. Курдзкая меншасьць у Сырыі складае каля 1,5 мільёна (пад 10 % насельніцтва). Калі ірацкія курды атрымаюць-такі аўтаномію, Сырыя можа сутыкнуцца з ростам палітычных патрабаваньняў сваёй курдзкай меншыні.

Турцыя: як сябар NATO і кандыдат на ўступленьне ў ЭЗ, Турцыя ўблыталася ў амэрыканска-эўрапейскі канфлікт і ў саму вайну. Больш таго, яе нядаўна выбранаму і новаму на палітычным алімпе кіраўніцтву (з Партыі міру і справядлівасьці) прыходзілася балянсаваць між падтрыманьнем сяброўскіх дачыненьняў з ЗША (жыцьцёва неабходных крызыснай турэцкай эканоміцы) і ажыўленьнем ісламізму ў краіне (у выніку чаго насельніцтва масава спачувала Іраку, а не ЗША). У Турцыі таксама жыве вялікая курдзкая меншасьць, але Анкара разглядае любыя памкненьні курдаў да культурнае самабытнасьці як пагрозу турэцкай дзяржаве. Прызнаньне за ірацкімі курдамі права на самавызначэньне таксама будзе разглядацца туркамі як патэнцыйная пагроза.

Улічваючы такое суседзтва і магчымасьць дэстабілізацыі ўсяго рэгіёну, адбудова пасьляваеннага Іраку запатрабуе дыпляматычных высілкаў. Наколькі можна меркаваць, ЗША ня

маюць яснай стратэгіі аднаўленьня краіны. Афіцыйна мэтаю вайны было выяўленьне і ліквідацыя ірацкае зброі масавага зьнішчэньня; пасьля ўжо амэрыканскія прадстаўнікі загаварылі пра скіданьне дыктатарскага рэжыму і вызваленьне ірацкага народу. Але хто зьменіць Хусэйна? Ягоныя палітычныя апанэнты або мёртвыя, або ў выгнаньні. Ці ЗША павінны стварыць урад на базе ірацкай эміграцыі (які, ёсьць небясьпека, у краіне могуць успрымаць як марыянэткавы), ці максымальна захаваць наяўныя ўладныя структуры, правёўшы зьмены толькі ў найвышэйшых эшэлёнах улады? Калісьці, у часе "халоднай вайны", многім амэрыканскім палітыкам здавалася, што варта камуністам у СССР і яго сатэлітах сысьці з палітычнай арэны, як там адразу ж узьнікне дэмакратыя амэрыканскага тыпу. Цяпер у публічных выступах "вызваліцелі" Іраку таксама мала гавораць пра сваю пасьляваенную адказнасьць. Як гаворыцца ў аналітычным дакладзе RIIA, гэтая стрыманасьць тлумачыцца, сярод іншага, наяўнасьцю розных падыходаў у розных амэрыканскіх структураў: Пэнтагон схіляецца да "макратрансфармацыі", а Дзярждэпартамэнт — да "мінімальнае", безь перабудовы асноўных дзяржаўных інстытутаў.

Шмат значыць і той факт, што ўзброеныя сілы ангельска-амэрыканскае кааліцыі выявіліся непадрыхтаванымі да пераходу ад ваеннае ролі да падтрыманьня міру.

Па лёгіцы сытуацыі, маглі быць два сцэнары разьвіцьця падзеяў. Першы: нягледзячы на рэпрэсіўнасьць Хусэйнавага рэжыму, значная частка насельніцтва аддае перавагу яму, а не сумнеўнаму "вызваленьню" замежнымі войскамі. Другі: іракцы так ненавідзяць рэжым Хусэйна, што пры першым зручным выпадку помсьцяць былым прыгнятальнікам. Пад канец ваеннай часткі канфлікту падзеі пайшлі па другім сцэнары; аднак марадзёрства ў Басры і Багдадзе сталіся для "вызваліцеляў" непрыемным сюрпрызам. Каб аднавіць парадак, ім прыйшлося зьвярнуцца па дапамогу да ірацкай паліцыі — той самай паліцыі, якая, у вачах насельніцтва, была інструмэнтам прыгнёту зрынутага "вызваліцелямі" рэжыму. Тым часам працягваецца дыскусія наконт ірацкае зброі масавага зьнішчэньня (і наконт таго, ці была яна ўвогуле), а таксама, у выпадку калі такой зброі не было, наконт маральнага права на "вызвольную вайну". Ірацкая вайна і

этычныя, палітычныя ды практычныя праблемы, што выніклі пасьля яе, ня будуць проста ці хутка вырашаныя. “Бягучая гісторыя” канфлікту ўжо стаіць на кніжных паліцах; на чарзе яе навуковы аналіз.
Пераклаў з ангельскай Андрэй Скурко

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

[image]
A R C H E
П а ч а т а к
№ 3 (26) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
Рах Аўтар [image] 2003
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

Юрась Ліхтаровіч

Ірацкі каталізатар: Польшча-Амэрыка-Эўропа

Ні пра што не пісалі ў сакавіку альбо красавіку столькі, колькі пра вайну ў Іраку, вызваленьне Іраку, апэрацыю ў Іраку. Прасьцей назваць тых, хто ня выказаўся адносна Іраку, чым пералічыць усіх, хто выступіў з камэнтарамі ці прагнозамі на будучыню. Ірацкая вайна дала падставу для шматлікіх заяваў аб новых пагрозах і радыкальных геапалітычных перамонах у сусьветным парадку. Пры гэтым думкі падзяліліся: адны выкрываюць імпэрыялізм Амэрыкі і палохаюць усясьветным хаосам[1], другія сьцьвярджаюць карыснасьць амэрыканскай гегемоніі (З. Бжазіньскі) альбо дэкляруюць патрэбу *pax americana*[2].

У першым выпадку аргумэнтацыя грунтуецца на «прынцыпе “адваротнага эфэкту”. Гэта значыць, што ЗША, вызначыўшы Ірак у якасьці цэлі, хочуць дасягнуць некалькіх мэтаў. Першая зь іх — кантроль над фінансавымі рынкамі пры дапамозе рэгуляваньня цэнаў на нафту, дзякуючы таму што ірацкія нафтавыя радовішчы трапяць пад амэрыканскі кантроль. Другую мэту вызначае жаданьне ўплываць на разьвіцьцё

ЮРАСЬ ЛІХТАРОВІЧ (нар. 1978 у Маладэчне) — палітоляг. Скончыў франка-беларускі факультэт палітычных навук і праблемаў эўрапейскай інтэграцыі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Магістрант Варшаўскага ўнівэрсытэту. Апошняя публікацыя — артыкул “Структура расійскіх палітычных элітаў і іх стаўленьне да беларуска-расійскай

падзеяў у Іране, г. зн. кантраляваць эвалюцыю пантэрацыі рэжыму ў гэтай краіне, якая можа пайсьці ў спрыяльным для ЗША кірунку. Трэцяя мэта — павялічыць магчымасьці кантролю за дзеяньнямі Ізраілю, стратэгічная аўтаномасьць якога паменшыцца пры моцнай амэрыканскай пантэрацыі ў Іраку. Наступным, найбольш праўдападобным кірункам у амэрыканскай палітыцы пасьля Блізкага і Сярэдняга Ўсходу павінен стаць Далёкі Ўсход. Значнасьць гэтага рэгіёну вынікае не з пагрозы атамнай праграмы Паўночнай Карэі[3], а з магчымасьці выбудовы стратэгічнага партнэрства з Кітаем, пры якім зрэалізуецца амэрыканскае ўяўленьне аб сусьветнай раўнавазе, што можа абапірацца на існаваньне дзьвюх імпэрыяў, зь якіх адна (Кітай) будзе “васалізаваная” другой (ЗША).

Пры гэтым амэрыканцы забываюцца пра наяўнасьць “адваротнага эфэкту”. Пакуль што яны думаюць, што адзеі павінны разьвівацца так, як яны прадугледжваюць, але сытуацыя на Блізкім Усходзе можа пайсьці ў адваротным кірунку: крызыс будзе толькі паглыбляцца, рабіцца менш палітычным, а больш рэлігійным, цывілізацыйным. У выніку мы станем сьведкамі павелічэньня геапалітычнага хаосу і рэгіянальнай напружанасьці.

інтэграцыі” ў кнізе “Беларуска-расійская інтэграцыя” (Менск: Энцыкляпэдыкс, 2002).

[1] Ludowic Woets, “Schaping the World”… Les Etats-Unis, la guerre en Irak et le désordre mondial”, *Diplomatie*, № 2, mars-avril, 2003, p. 19—20.

[2] Stanisław Stomma, “Pax Americana”, *Więź*, № 5, 2003.

[3] Як гэта падаў у адным з сваіх артыкулаў Г. Кісынджэр. Гл.: Henry A. Kissinger, “Nuklearny szantaż”, *Rzeczpospolita,* 18—19 stycznia, 2003.

У другім выпадку, наадварот, гаворка йдзе пра тое, што стабілізацыя сусьветнага парадку магчымая толькі пры актыўным удзеле ЗША, таму што толькі гэтая краіна мае адпаведныя рэсурсы, каб выконваць падобную ролю. “Як у позьняй старажытнасьці тагачасная сытуацыя патрабавала *pax romana* — наймацнейшая дзяржава падпарадкоўвала сабе цэлы сьвет, — так і цяпер павінна быць якаясьці сіла, што ахоўвала б і падтрымоўвала сусьветны парадак”[4]. Зразумелая прыцягальнасьць падобных разважаньняў, асабліва для экспэртаў, якія могуць бясконца працягваць падобныя дэбаты, доўжыць аргумэнты й гістарычныя паралелі, апісваць новыя пагрозы і прыдумваць рашэньні. Аднак на самай справе рэчаіснасьць нашмат прасьцейшая. Вакол пытаньня раззбраеньня Іраку ідзе шматузроўневая гульня, дзе сутыкаюцца чаканьні й інтарэсы розных гульцоў, краінаў, рэгіёнаў. Цікавым прыкладам тут зьяўляецца Польшча, наш непасрэдны, “другі” сусед. (Традыцыйна першым лічыцца Расея, але расейская пазыцыя ў стасунку да апэрацыі ў Іраку ў

[4] Stanisław Stomma, гарсіма,

краіне добра вядомая, чаго ня скажаш пра пазыцыю Польшчы.) Найбольшую цікавасьць уяўляе параўнаньне камэнтароў няўрадавых экспэртаў і афіцыйнага бачаньня постірацкай сытуацыі.
На першы погляд здаецца, што польская палітычная эліта, мэдыі і грамадзтва былі надзіва аднагалосныя ў сваім стаўленьні да вайсковай апэрацыі ў Іраку. Грамадзкая думка спачатку была даволі крытычнай адносна ўдзелу польскіх узброеных сілаў у ірацкай апэрацыі. Аднак, у адрозьненьне ад Заходняй Эўропы, тут не адбывалася вялікіх дэманстрацыяў супраць вайны і не было масавага грамадзкага супраціву. Большасьць грамадзтва была даволі абыякавая, нашмат больш цікавасьці выклікалі актуальныя пытаньні ўнутранага жыцьця краіны.

Затое вельмі актыўную пазыцыю заняла палітычная эліта, прычым аднолькавую пазыцыю занялі і дзеячы, якія прадстаўляюць былыя колы “Салідарнасьці”, і прадстаўнікі калішняй ПАРП. Падобную аднагалоснасьць выказвалі й колы, што ствараюць “грамадзкую думку” (тут трэба ўлічваць, што звычайна такія газэты, як *“Gazeta Wyborcza”* і *“Rzeczepospolita”*, часопісы кшталту *“Polityka”* ды *“Wprost”* займаюць антаганістычныя пазыцыі; у выпадку ж Іраку існавала поўнае аднадумства). Амэрыканскую інтэрвэнцыю ў Іраку крытыкавалі толькі “Яцак Курань, некалькі палітолягаў, пара арабістаў і ксёндз Станіслаў Мусял, які выказваўся надта экзальтавана, каб прыцягнуць адпаведную ўвагу ў грамадзтве”[5].
З найбольш распаўсюджаных тлумачэньняў падобнага стаўленьня называецца польская глыбінная сымпатыя да ЗША, якая ўзмацняецца перакананасьцю наконт адзінства амэрыканскіх ды польскіх інтарэсаў і гістарычным нявер’ем у моц і дапамогу з боку эўрапейцаў. Таксама часта даводзіцца чуць пра непрыманьне[6] таталітарызму і дыктатарскіх рэжымаў. Падобныя разважаньні абапіраюцца на гістарычнай, “Wspólne палякаў і культуру сучаснай палітычнай эліты. Яшчэ ж ныя шматлікія змагары з камунізмам. Большасьць зьніжэньня, як і палітыкі правага і правацэнтрысцкага кірунку, сістэмы, распад СССР і атрыманьне Польшчай “незалежнасьці ў маладай ступені залежалі ад магутнасьці Амэрыкі й ейнай палітыкі ў дачыненьні да камуністычнага блёку, асабліва пасьля прыходу

[5] **Aleksander Hall, “Wspólne interesy i własne zdanie”, *Rzeczpospolita*, 24–25 maja, 2003, s. A5.**

да ўлады Рональда Рэйгана. Таму нічога дзіўнага, што лідэры польскіх правых партыяў маюць натуральную схільнасьць да атаесамленьня пытаньня свабоды ў сьвеце, польскага нацыянальнага інтэрасу з магутнасьцю і пазыцыяй Амэрыкі. Што тычыцца кіроўнай групы, партыі сацыял-дэмакратаў, то сытуацыя не выглядае так адназначна. Некаторыя палітолагі мяркуюць, што яны наўпрост прынялі замежнапалітычную лінію, прапанаваную ў 1989—92 гадох палітыкамі, якія выйшлі з руху “Салідарнасьці”[7], і не змаглі выпрацаваць сваю пазыцыі. Да таго ж гэтая новая замежнапалітычная лінія не выклікала супраціву з боку посткамуністычных эліт дзеячоў, бо сатэлітызм у іх застаецца ў крыві, а дамінуючай пазбыцца. Месца колішняга СССР занялі ЗША, а застаецца скіраванаю на прадказваньне жаданьняў супэрдзяржавы, каб цябе, як добрага вучня, заўважылі ўзнагародзілі[8]. Іншыя камэнтатары мяркуюць, што праамэрыканізм вынікае з унутраных праблемаў (карупцыйны крызыс — г. зв. афэра Лява Рывіна, прэзыдэнта Квасьнеўскага і прэм’ера Мілера, старога пакаленьня палітыкаў, павязанага сецівам кліенталісцкіх стасункаў, і новага, маладзейшага, сфармаванага ўжо ўва ўмовах несавецкай Польшчы[9]), у выніку чаго замежная палітыка робіцца залежнаю ад прыватных кар’ерных інтарэсаў прэзыдэнта ці прэм’ера, калі абодва ставяць то на Амэрыку[10], то на Эўропу[11] як на сваю ўласную кар’ерную будучыню. Згодна зь іншымі тлумачэньнямі, замежная палітыка Польшчы фармуецца ў варшаўскіх палітычных “салёнах”. Гэтым тлумачыцца актыўная пазыцыя Польшчы на тле ірацкага канфлікту ў эўра-амэрыканскай спрэчцы, калі, не разумеючы да канца прыроды нязгоды паміж былымі хаўрусьнікамі, польскія палітыкі занялі крайне праамэрыканскую пазыцыю, мяркуючы, што менавіта яна забясьпечыць ім больш выгадаў. На дадзены момант гэтая лінія не аказалася да канца непасьпяховай.

[6] Палякі ўжываюць слова *сіла* у *сілавой* палітыцы, якое найбольш актыўнае і дасканалае ў **гіпатэзе, **найпрызнаньне** **і ацэнцы** **пачуцьцяў** **адмаўленьня** **чаго-нібудзь**.**

[7] Асноўным элемэнтам гэтай палітыкі была інтэграцыя Польшчы ў NATO і ЭЗ.

[8] Aleksander Hall, тамсама.

[9] На гэтую тэму гл. артыкулы Bronisław Wildstein, “Elity polityczne III Rzeczypospolitej”, альбо Jadwiga Staniszkis, “Kryzys III Rzeczypospolitej”.

[10] Тут можна ўзгадаць чуткі пра вылучэньне прэзыдэнта А.Квасьнеўскага на пасаду Генэральнага Сакратара NATO.

[11] Дарма што Польшча яшчэ ня стала сябрам ЭЗ, польскія кіраўнічыя колы пачалі дзяліць будучыя

пасады ў эўрапейскіх інстытуцыях.

У пятніцу 2 траўня прэзыдэнт ЗША Дж. Буш абвесьціў, што асноўная вайсковая апэрацыя ў Іраку скончылася пасьпяхова, ірацкі народ вызвалены з-пад дыктатуры Садама Хусэйна, зьнішчаная сур'ёзная пагроза бясьпецы ЗША. Разам з тым было абвешчана аб пачатку наступнай фазы апэрацыі, якая атрымала назву "Ірацкая свабода" і азначае адбудову гэтай краіны ды стварэньне ўмоваў для функцыянаваньня дэмакратыі. За два дні перад гэтым у Лёндане распачаліся перамовы з удзелам шэрагу краінаў аб разьмяшчэньні міжнародных стабілізацыйных сілаў у Іраку, які будзе падзелены на тры сэктары. Адказнасьць за бясьпеку і падтрыманьне парадку ў паўднёвым сэктары ўскладаецца на Польшчу. Больш за тое, Амэрыка назвала гэтую дзяржаву чацьвертай краінай кааліцыі, што дазваляе польскім фірмам паўдзельнічаць у адбудове Іраку[12]. Калі дадаць магчымы перанос амэрыканскіх ваенных базаў з тэрыторыі Нямеччыны ў Польшчу, то складаецца, ўражаньне, што Польшча — другі паводле значнасьці, Вялікай Брытаніі, хаўрусьнік амэрыканцаў у Эўропе. Адсюль заявы амэрыканскіх палітыкаў, напрыклад З. Бжэзінскага, тое, што Польшча можа адыграць паважную ролю ў раўнапраўным сябрам ЭЗ і незалежным саюзьнікам ЗША, нармалізацыі эўра-амэрыканскага дыялёгу, пакажуць польскую сытуацыю ў вельмі пазытыўным сьвятле. Акрамя тое, амэрыканскі бок спадзяецца, што Польшча адыграе істотную ролю ў стварэньні ўсходняй канцэпцыі галоўнае месца павінна адводзіцца перацягваньню Захад[13]. (Іншае магчымае тлумачэньне такога мовіцца ў амэрыканскага прэфэраваньня Польшчы дае З. Найдэр, які бачыць у гэтай палітыцы жаданьне ЗША аслабіць ЭЗ, разьбіць яго знутры. У такой раскладцы Польшча іграе ролю нават не траянскага каня, а траянскага асла, яна губляе магчымасьць уплываць на эўрапейцаў пры вырашэньні іншых важных для Польшчы пытаньняў, якімі ЗША не цікавіцца, — напрыклад, пытаньняў усходняй палітыкі пашыранага ЭЗ. Да таго ж, Эўропа ня бачыць варшаўскага палітычнага салёну, за бачыць праблемы краіны: стагнацыю ў эканоміцы, беспрацоўе, бюджэтны дэфіцыт, адсутнасьць рэфармаванага

[12] **Гэтая ідэя ўжо знайшла падтрымку ў Нямеччыне, Францыі, Італіі, Іспаніі, Партугаліі, Грэцыі, Турэччыне, Украіне, Расеі, Беларусі, Эстоніі, Латвіі, Літве, Славеніі, Славаччыне, Чэхіі, Венгрыі, Румыніі, Балгарыі, Албаніі, Македоніі, Харватыі і Ізраілі.**

[13] **Карысна для Амэрыкі, абмежкова**

грамадзкіх фінансаў, што значна аслабляе прыцягальнасць Польшчы ў вачох большасьці дзяржаваў — удзельніц ЭЗ.

патрэбна для Польшчы ЭЗ.)."

Так Зьбігнеў Бжазіньскі ахарактарызаваў ролю Польшчы ў будучым ЭЗ і патрэбу польска-амэрыканскага хаўрусьніцтва ў постірацкай сытуацыі падчас свайго выступу "Амэрыка і Эўропа: новыя выклікі, старыя рэаліі" ў Варшаўскім унівэрсытэце 15 траўня 2003 году.

Ужо цяпер робіцца ўсё больш відавочным, што заходнеэўрапейскія сталіцы, Бэрлін і Парыж, лічаць за лепшае размаўляць наўпрост з амэрыканцамі, а польскую пазыцыю трактуюць як "здраду". Маўляў, яшчэ ня стаўшы сябрам ЭЗ, гэтая краіна ўжо праводзіць сваю палітыку, не ўзгадняючы яе зь іншымі эўрапейскімі партнэрамі. У далейшым пагрозай для Польшчы можа быць непрыхільнае стаўленьне да яе з боку гэтых краінаў. Даволі яскрава гэта праявілася ўжо падчас апошняга красавіцкага саміту ў Атэнах, дзе адбылося падпісаньне трактату аб пашырэньні і дзе эўрапейцы вельмі скептычна паставіліся да польскай прапазыцыі выпрацаваць двухкірункавую ўсходнюю палітыку Эўразьвязу: адну — у стасунках з Расеяй, другую — зь Беларусяй, Украінай і Малдовай. На дадзены момант большасьць краінаў ЭЗ схіляецца да думкі, што дастаткова адной усходняй палітыкі, якая б ахоплівала ўсе гэтыя краіны запар, з галоўным акцэнтам

на інтэграваньне Расеі ў эўрапейскую інстытуцыянальную прастору. У такім выпадку, на думку Рамана Кузьняра[14], для польскіх дзяржаўных інтарэсаў цана такой палітыкі аказалася б задужа высокаю: маргіналізацыя Ўкраіны, паглыбленьне ізаляцыі Беларусі і аслабленьне дагэтулешніх эўрапейскіх інстытуцыяў супрацы і бясьпекі — як ЭЗ і NATO. Пагатоў абедзьве гэтыя інстытуцыі перажываюць сур'ёзныя праблемы з выбарам далейшай стратэгіі разьвіцьця і выпрацоўкі адэкватных адказаў на новыя выклікі.

Апошнія падзеі паказалі, што Эўропа не гатовая самастойна змагацца з новымі пагрозамі міжнароднага характару. Эўразьвяз ня мае неабходных інструмэнтаў і з стратэгічнага пункту бачаньня ўразьлівы перад новымі глябальнымі праблемамі. У такой сытуацыі, на думку палітолага А. Каміньскага, сыход Амэрыкі з кантынэнту і аслабленьне NATO робіць Расею адным з ключавых элемэнтаў новай эўрапейскай сыстэмы бясьпекі, што для Польшчы нясе пагрозу апынуцца ў нямецка-расейскіх абцугах[15].

З пункту гледжаньня ўрадавых экспэртаў з МЗС, ЭЗ складаецца не настолькі нявыгадна для Польшчы. Ірацкі крызыс стаў усяго толькі чарговым каталізатарам пацьвердзіў, што на міжнароднай арэне палітыкі да якогасьці канкрэтнага пытаньня (як, напрыклад, Іраку) зьяўляецца часткай яшчэ большай сукупнасьці адносінаў. Ірак стаў каталізатарам нашмат шырэйшых сусьветных працэсаў, не выключаючы пытаньня супрацоўніцтва ў ЭЗ[16]. На сёньняшні дзень міжнародная палітыка, дыпляматыя і бясьпека застаюцца ў кампэтэнцыі дзяржаваў, на эўрапейскім узроўні дамінуе падыход міждзяржаўнага супрацоўніцтва. Адным з наступстваў ірацкага крызысу ёсьць усьведамленьне таго, што ЭЗ мусіць перадаць правядзеньне міжнароднай палітыкі супольным інстытуцыям. Гэта азначае, што перадусім павінна быць вырашанае пытаньне інтэграцыйнага паралелізму, то бок паралельнага сяброўства тых самых дзяржаваў у NATO і ЭЗ.

14 Roman Kuźniar, September 11 — Enterprise NATO and Europe's Implications, *The Polish Quarterly of International Affairs*, winter 2002, s. 30–31.

15 Antoni Z. Kamiński,

“Suwerenność państwa polskiego w nowym układzie europejskim”, Instytut Nauk Politycznych, PAN.

[16] Ryszard Stemplowski, “Katalizator iracki”, Polski przegląd dyplomatyczny, t. 3. n. 2 (12), marzec—kwiecień 2003, s. 5—14.

Другім важным пытаньнем застаецца справа эўра-амэрыканскіх адносінаў. Ізноў жа вайна ў Іраку не адкрыла нічога новага: падзел унутры Эўразьвязу паміж Францыяй ды Нямеччынай з адного боку і Вялікай Брытаніяй з другога існаваў даўно. Пытаньне пра ролю ЗША ў эўрапейскай інтэграцыі і стаўленьне да гэтай краіны з боку розных эўрапейскіх краінаў застаецца без адказу з 1960-х гадоў. Распад СССР прымусіў перагледзець некаторыя пастуляты, а апошнія падзеі абвастрылі існыя супярэчнасьці. Прычым гаворка ня йдзе пра абсалютнае, культурнае непрызнаньне Амэрыкі Эўропай, а Эўропы Амэрыкай. Для ЗША Эўропа надалей застаецца партнэрам, хаўрусьнікам, толькі слабейшым партнэрам (junior partner).

Эўропа ж у ірацкім канфлікце не выступала супраць ЗША, а толькі падавала ўласнае бачаньне і ацэнку характару пагрозы, зрабіўшы акцэнт на неабходнасьці выкарыстаньня ўсіх магчымых невайсковых сродкаў і канечнасьці міжнароднага супрацоўніцтва для стабілізацыі сусьветнага парадку. Што тычыцца польскай ацэнкі французскай і нямецкай пазыцыі, то польскія экспэрты гавораць пра няскончаную "дэімпэрыялізацыю Францыі"[17]. Гэта значыць, што апошняя дыстанцыюецца ад менш разьвітых краінаў ЭЗ і яго будучых сяброў, спрабуе падаваць сябе як альтэрнатыву ЗША ўнутры ЭЗ і ў адносінах з арабскім сьветам, бо яна яго лепш ведае і разумее. Што датычыць Нямеччыны, палякі лічаць, што падобная пазыцыя вынікае з уласьцівасьцяў пасьляваеннага разьвіцьця гэтай краіны, у аснове тоеснасьці грамадзянаў якой ляжыць эканамічная магутнасьць. Пры гэтым Шродэр у сваёй унутрыпалітычнай лініі апэлюе да перадваеннай традыцыі нямецкіх сацыял-дэмакратаў, пазыцыі антываеннай "Германіі". У значнай ступені гэта накладае свой адбітак і на замежную палітыку. У будучыні чакаецца, што Нямеччына надалей застанецца хаўрусьнікам ЗША, тады як стасункі паміж Францыяй і Амэрыкай могуць быць сур'ёзна перагледжаныя. Для Польшчы, апрача ўжо згаданых нэгатыўных наступстваў, пазытыўным выглядае тое, што яна зможа як бы двойчы адыгрываць канструктыўную ролю. Па-першае, у якасьці сябра *in spe* ЭЗ яна зможа больш актыўна карыстацца з Ваймарскага трохкутніка, прапануючы супольнае вызначэньне праектаў узмоцненага супрацоўніцтва і часьцей праводзячы кансультацыі. Польшча мае дастаткова магчымасьцяў, каб паказваць ляяльнасьць да эўрапейскай інтэграцыі і адкідаць абвінавачаньні ў тым, што яна ці то траянскі конь, ці то траянскі асёл ЗША. Іншым кірункам польскай дзейнасьці ў ЭЗ можа быць сумеснае зь Вялікай Брытаніяй ініцыяваньне паляпшэньня стасункаў ЭЗ—ЗША праз заахвочваньне шырэйшага кола краінаў да трансатлянтычнага супрацоўніцтва.

Па-другое, польскае МЗС спадзяецца, што добрыя стасункі з урадам ЗША дазволяць Польшчы выступіць прамотарам эўрапейскай пазыцыі ў Амэрыцы. Маўляў, ЗША мае дачыненьне не зь няўдзячнасьцю эўрапейцаў, а з усё мацнейшай адзінай пазыцыяй Эўропы, і трэба імкнуцца да ўзаемнага паразуменьня

17 Там самым.

паміж ЭЗ і ЗША.
Такім чынам, сярод асноўных наступстваў ірацкага канфлікту польскія афіцыйныя экспэрты бачаць паскарэньне выбудовы адзінай замежнай палітыкі і палітыкі бясьпекі Эўрапейскага Зьвязу, прыцірку тандэму ЭЗ—ЗША ў сусьветнай сыстэме і праверку эфэктыўнасьці функцыянаваньня ААН у новых умовах.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Ці добра ўчынілі адраджэнцы канца 80-х, зрабіўшы выбар на карысьць “тарашкевіцы”?

Юры Тарасевіч,
праграміст, Горадня

“Не было “пераходу на тарашкевіцу”, бо “тарашкевіцы” не існуе. Арыгінальнаю ня пішуць, меркаваньні 1926 году трапілі ў “наркамаўку”, сучасная рэінкарнацыя не адбылася. Што ў нашым друку называюць “клясычным правапісам” — сымуляцыя. Мо так называюць вяртаньне да запраўдных нормаў беларускай мовы? Не відно, па-за асобнымі ізаляванымі ініцыятывамі. Найбольшым дасягненьнем застаўся мяккі знак (яшчэ “выбухное г”). Слоўніка — няма. Сур’ёзных прапановаў для школьніцтва і навукі — вобмаль. Узяліся мяняць сьвет і не паклапаціліся пра найгалоўнейшы інструмэнт, які наагул можа мець нацыя. Патрацілі пятнаццаць гадоў на пагоню за мітам, на змаганьне з адзіным, бадай што, рацыянальным унёскам у мову, які зрабілі саветы. Нават з палітычнага гледзішча гэта было шаленства: падзялілі і без таго малалікіх прыхільнікаў, самі сабе падкапалі глебу пад нагамі. Каму было патрэбнае

гэта? Бо пэўна, што не на нашу карысьць... А залатога дзесяцігодзьдзя ўжо ня вернеш. Памылка, памылка, адно не разумеем яшчэ, якая фатальная.

Уладзіслаў Яндзюк,
праграміст, Прага
Na žal, u tym časie abrać łacinku nichto nie advažyŭsia, tamu, naturalna, taraškievica była adzinym vybaram. Novaja biełaruskaja dziaržava musić jak najchutčej "legalizavać" łacinku a spryjać jejnamu pašyreńniu.

Юры Пацюпа, паэт,
выкладчык Гарадзенскага ўнівэрсытэту
імя Янкі Купалы, Горадня
Адкажу пытаньнем на пытаньне: *а ці быў у нас выбар?* "Адраджаць" "наркамаўку" — гэта тое самае, што прапагандаваць Петруся Броўку. Для адраджэньня мовы патрэбен адпаведны эмацыйны стан, кожны яе носьбіт павінен стаць суб'ектам, творцам, а не затурканым вучнем, які з-пад палкі зубрыць "дзеравенскі язык". Нічога паступальнага, рамантычнага "наркамаўка" прапанаваць не магла.
На жаль, 1995 год скруціў мазгі некаторых з нас так, што ад гора бедалагі сталі клясьці Пазьняка, а ў АГП бачыць незалежніцкую сілу. (Гэтак шалёны сабака ад болю кусае сваіх.) У мове ж некаторыя ўжо гатовыя кадыфікаваць хоць "трасянку", абы нешта ўратаваць. Але так паводзяцца слабыя, спадзеючыся выпрасіць у ката палёгкі, а насамрэч выракуючы сябе на няўхільную павольную ды пакутніцкую сьмерць.
Калі глядзець праўдзе ў вочы, дык трэба шчыра прызнацца, што адраджэньне і сьцьверджаньне беларускае мовы — гэта цяжкі рэжым самадысцыпліны, гэта складаная сыстэма прадуманых і няпростых дзеяньняў. Бальшыня з нас проста стаміліся і махнулі рукой: *будзь як будзе!* Простыя носьбіты мовы, пагадзіўшыся ўрэшце з "наркамаўкаю", незаўважна для саміх сябе прызналіся, што ніколі добра ня ведалі мовы і не знайшлі ў сабе сілаў яе вывучыць. Мовазнаўцы таксама тым самым прызналіся, што ня маюць і ніколі ня мелі яснае канцэпцыі моўнага будаваньня, што ня здольныя нічога прапанаваць паспалітаму беларусу, апроч лёзунгу "Гаварыць на роднай

мове”. *Толькі ня трэба, спадарове, рабіць мову закладніцаю ўласнае творчае імпатэнцыі!*

На гэтым можна было б паставіць кропку і годзе. Але ўзьнятае пытаньне не такое простае і, як падаецца, мае двайное дно. Найперш хочацца ўдакладніць: што такое “тарашкевіца”? Калі сьледаваць беспасярэдняму значаньню слова, дык “тарашкевіца” — гэта правапіс. Ці варта дзеля правапісу падымаць такі вэрхал?

І ўсё ж ужываньне гэтага слова паказвае: пад “тарашкевіцаю” даўнімаецца нешта большае, чым правапісныя нормы. Дылетанты нават маюць гэткае цьмянае ўяўленьне, быццам існуе нейкі ідэальны адменьнік беларускае мовы, аднойчы скадыфікаваны Браніславам Тарашкевічам, адкуль мы чэрпаем усё найлепшае і ня можам сягнуць дна. Постаць аўтара сьціплае граматыкі для школ у іх вырастае да абсягаў тытана і дэміюрга. Хоць насамрэч ніякае кадыфікацыі мовы Тарашкевіч ніколі не рабіў. Жаднае “тарашкевіцы” як мовы няма і ніколі не было. У гэтым пляне такія пісьменьнікі, як Янка Купала, Якуб Колас, або аўтары слоўнікаў браты Гарэцкія, Байкоў, Некрашэвіч, кожны паасобку, для кадыфікацыі мовы зрабілі куды больш. Я ўжо не кажу пра Яна Станкевіча, які ў Заходняй Беларусі, а потым на эміграцыі адзін рабіў для мовы, для моўнае практыкі больш, чым уся савецкая Акадэмія навук за ўсю яе гісторыю існаваньня.

Тое, што ня правапіс, а мову называюць “тарашкевіцай”, вельмі кепскі сымптом. Ён паказвае: *моўнае мысьленьне замяняецца правапісным.* Веданьне запраўднае, “несавецкае” мовы дасягаецца зусім простым “магічным” спосабам: ужываньнем мяккага знаку, адумысным вымаўленьнем замежных слоў ды “джэнтэльмэнскім наборам” модных і абсалютна недарэчных (тут я пагаджаюся з Шубам і Падлужным) украінізмаў ды палянізмаў: *падчас* (замест *у час*), *напрыканцы* (замест *у канцы*, *пад канец*), *прыгадаць* (замест *успомніць*), *распавядаць* (замест *расказваць*) і г.д. Гэты ўбогі узус, гэтая птушыная гамонка, у астатнім на 99% складзеная з русіцызмаў ды расейскіх ка́лек, выдаецца — брат ты мой! — за “тарашкевіцу”, а не абы-што... Я чытаў некаторыя нашыя друкаваныя выданьні, пісаныя нібы на “тарашкевіцы”, а насамрэч — проста з ужываньнем мяккага знаку. Мова “Звязды” ў параўнаньні зь імі — вяршыня дасканаласьці, “супэртарашкевіца”.

Калі ж не зважаць на падмену мовы правапісам і ўсё ж гаварыць пра мову, то альтэрнатывы ў нас няма. Або мы адродзім запраўдную беларускую мову (“тарашкевіцу”, як кажуць тыя самыя дылетанты), або наагул уся гэтая гульня ня вартая сьвечак. Хто не разумее таго — той, хутчэй за ўсё, сам ня ведае беларускае мовы. За свае словы я гатоў адказваць. Мне пашчасьціла да школы гадавацца ў дзеда на хутары. Беларуская мова для мяне родная не намінальна. Я яе ведаю ня з кніжак і таму не баюся ў нечым пахібіць, ужыць дыялектызм. Пазьней, заглыбіўшыся ў старабеларускія тэксты, у тэксты старой “Нашае Нівы”, эмігранцкія працы, я зразумеў, што “наркамаўка” (карыстаюся недакладным паспалітым тэрмінам) — гэта не беларуская мова, а яе імітацыя. Проста перакручаная расейская.

Ня варта цэлы этнас напружваць дзеля гэтай брыдоты. Ня варта дурыць людзям галовы. Мне “наркамаўка” агідная настолькі, што я ёй зычу сьмерці ў кожным разе. Калі не “тарашкевіца” — тады лепш расеізацыя. Тады ў РНЕ можна запісвацца. А яшчэ лепш — поўная і незваротная палянізацыя. Перафразуючы расейскага клясыка, скажу: няхай “славянские ручьи сольются в польском море”. Перад наступам глябалізацыі чаму не зрабіцца панславістам? Але, дзякуй Богу, такой альтэрнатывы няма. І ёсьць яшчэ порах у парахаўніцах! І мы яшчэ пазмагаемся за беларускасьць. Бо неімітаваная беларуская мова, “тарашкевіца”, ня мае сабе роўных у сваіх мажлівасьцях. Чым больш я яе вывучаю, тым больш зьдзіўляюся яе сыстэмнасьці, багацьцю і харасту.

Разумею, што многіх, асабліва пісьменьнікаў старэйшага пакаленьня, якія пачыналі за савецкім часам, мая катэгарычнасьць абурыць. Яны ж пачуваюцца зьвязанымі з “наркамаўкаю”. Але ня варта сьпяшацца з высновамі. Я нікога не зьбіраюся скідаць з “параходу сучаснасьці” і ніколі не рабіў гэтага раней. Рэч у тым, што беларуская мова вершаў і мастацкае прозы ў асноўным ляжыць па той бок памянёнае альтэрнатывы. Першае: бальшыня нашых пісьменьнікаў выйшла зь вёскі, дзе бытавала жывая народная гаворка. Другое: мастацкая мова абымае такія пласты лексыкі, якія ў савецкія часы менш за ўсё падпадалі пад расеізацыю. Хутчэй нашае — і маладзейшае за нас — пакаленьне ня здольнае авалодаць жывой гутарковаю моваю і вартае быць выкіненым на сьметнік.

Чаму мы раптам спачувальна загаварылі пра “наркамаўку”? Бо ўсё менш ведаем беларускую мову. Усё часьцей моўнае мысьленьне замяняем правапісным. І вось, знайшлі просты спосаб зымітаваць беларусізацыю — вярнуцца да “наркамаўкі”. Пад канец хацелася б прытачыць шэраг парадоксаў нашае моўнае сьведамасьці, якія я доўно ўжо назіраю.

Парадокс-1: “дэмагог” (палітычны). Змагаемся за пашырэньне беларускае мовы, але ня дбаем пра яе якасьць. (Пашыраны сярод палітыкаў і іншых “актывістаў”.)

Парадокс-2: “сава” (ідэалягічны). На расейскай ці няякаснай, зрасеізаванай беларускай мове лаем усё расейскае, як тая сава, што лучыла ў цень арла. (Пашыраны сярод “нацыяналістаў”.)

Парадокс-3: “кляпан” (гнасэалягічны). Паблажліва ставімся да асобных расеянізмаў, але адразу выкрэсьліваем незразумелае для нас беларускае слова. (Пашыраны сярод рэдактараў газэт.)

Парадокс-4: “шызафрэнія” (эстэтычны). Шукаем патрэбнае чыста беларускае слова, але, як толькі дасьведчаны чалавек падказвае нам яго, кажам, што гэта нешта ня тое. (Пашыраны сярод “спэцыялістаў”, якія спрабуюць карыстацца беларускаю мовай.)

Парадокс-5: “кастрацыя” (сыстэмны). Так пнемся пазбыцца расеянізмаў, што ладны абсяг нармальных беларускіх слоў не ўжываем. (Пашыраны сярод “пурыстаў”.)

Усё тое, што я тут пасьпеў сьпешна і хаатычна накідаць, сьведчыць пра адну страшную рэч: у нас склалася дзьвюхмоўе, якое Леў Шчэрба назваў *адна мова з двума тэрмінамі*.

У запраўднасьці ўжо няма беларускае мовы. Ёсьць адна, расейская, — з расейскім і беларускім тэрмінамі. А адраджаць мову варта як асобную сыстэму мысьленьня. Мова, якая існуе толькі намінальна, — самападман, яе не павінна быць. Але ня варта апускаць рукі. Мы жывем у глябалізаваным сьвеце, дзе пад пагрозай усе мовы. Калі мы можам зьнікнуць сёньня, летувісы — заўтра, а французы — пазаўтра, дык няма вялікай розьніцы. І ўсё ж, я думаю, людзі рана ці позна нацешацца палітычнаю гігантаманіяй, як нацешыліся асушэньнем балот, цаліной і камунізмам. А тады адзінаю альтэрнатываю стане сыстэма культурных манадаў — мноства аўтаномных, а неізаляваных культурных асяродкаў, якія будуць станавіць сабою альтэрнатыўныя мадэлі існаваньня й мысьленьня.

Васіль Быкаў,
народны пісьменьнік Беларусі,
Менск

Даўно было відавочна, што беларуская мова, апроч зьнешняй пагрозы, перажывае ўнутраны крызыс — як наступства русіфікацыі, саветызацыі, бюракратызацыі — катастрафічнае зьмяншэньне моўна-нацыянальнай ідэнтычнасьці. Наркамаўскі правапіс 1933 году, а затым і выданьне акадэмічных працаў пад рэдакцыяй акадэміка-паслухмянца Крапівы ўсё набліжалі мову да апошняй мяжы. Таму, мабыць, натуральна, што адраджэнцы, ня маючы магчымасьці паўплываць на гэты катастрафічны працэс, зьвярнуліся да старой граматыкі Браніслава Тарашкевіча. Але бяда ў тым, што граматыка Тарашкевіча ўжо для свайго часу была ня надта прыстасаваная, а праз 50—60 год, вернутая да жыцьця ў іншы гістарычны пэрыяд, у многіх адносінах стала анахранічнай. Для жывой мовы было б вельмі хваравіта — раптоўны пераход з канца XX стагодзьдзя ў стан, уласьцівы мове на пачатку стагодзьдзя. Як на маю думку, дык трэба было б тую апэрацыю рабіць болей ашчадна, выбарачна, ці што. З улікам выдатнага і адмоўнага, што было ў Браніслава Тарашкевіча. Найперш, безумоўна, узаконіць правапіс мяккага знаку і “я” перад націскам, а пасьля ісьці паступова, а галоўнае, у духу традыцыйнага беларускага маўленьня. І вядома ж, з улікам агульнапрызнанай асновы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, якую заклалі Янка Купала і Якуб Колас. Раптоўны, за адзін раз, зварот да “тарашкевіцы” не апраўданы і дэструктыўны. Ён болей пабурыў, чым стварыў. Цяпер мы маем становішча, калі бальшыня беларусаў усіх узростаў проста аказаліся непісьменнымі, бо ня ведаюць, як пісаць і як мовіць. Улады адступацца ад “наркамаўкі” ня хочуць, а беларусы паўсюдна прыняць “тарашкевіцу” ня могуць. Народ і будзе ўсё больш зьвяртацца да расейскай мовы, дзе існуе шматгадовы моўны “парадак”, па якім гэтак сумуе народ.

Ян Максімюк,
палітычны аналітык, Прага

У 80-я гады “тарашкевіца” зьявілася ў беларускім адраджэнскім руху разам з нанава распаленым “хаценьнем людзьмі звацца” і з нанава адкрытымі бел-чырвона-белым сьцягам і Пагоняй.

Несумненна, што “тарашкевіца” ў той час была неадлучным атрыбутам жывой антысавецкай беларушчыны (ёю ж зусім натуральна карысталася заакіянская эміграцыя!), таму яна ніякім чынам не магла выпасьці з нацыяствараднага “праекту” адраджэнцаў. І яна давала ейным карыстальнікам дадатковае пачуцьцё свабоды, разьняволеньня з прыгону савецкай беларушчыны. Таму магчыма нават сказаць, што гэта “тарашкевіца” знайшла адраджэнцаў, а не яны яе.
Для мяне асабіста выбар паміж “наркамаўкай” і “тарашкевіцай” паўстаў з усёй вастрынёй у пачатку 90-х, калі я быў акунуўся з галавою ў пераклад “Уліса” Джэймса Джойса і шукаў адэкватнай “моўнай прасторы”, у якую можна было б зьмясьціць лінгвістычна-стылістычныя вычварэнствы гэтае кніжкі. “Тарашкевіца” тады ўявілася мне перш за ўсё як раскаваная моўная сыстэма, якая дала шырокі прастор і магутны імпульс для перакладніцкіх пошукаў новага слова і фразы — а ня толькі як асобны ад савецкага правапіс. Гэтага погляду, дарэчы, я не зьмяніў і да сёньня. Інакш сказаўшы, наркамаўскі правапіс мяне не інсьпіруе ні да пісаньня, ні да чытаньня па-беларуску. Зь цягам часу, чытаючы “адраджэнскую літаратуру” 90-х, я дайшоў да высновы, што так або неяк падобна думае бальшыня маіх улюбёных аўтараў. У іхных тэкстах было ня толькі больш “ь” і “э” ў параўнаньні з наркамаўскімі, але і больш сьвежага ды цікавага. Я думаю, што перш за ўсё вяртаньню “тарашкевіцы” ў беларускае прыгожае пісьменства мы абавязаны тым, што гэтае пісьменства не загнулася назусім, а абнавілася і працягвае намацваць сабе шляхі ў трэцім тысячагодзьдзі. Зусім сур’ёзна.
Хоць і даўно ўжо я не наведваўся ў Менск, ды ўсё ж адчуваю, што хто-ніхто там спрабуе зрабіць “тарашкевіцу” — разам з Пазьняком з аднаго боку і Лукашэнкам з другога — віноўніцай у правале “беларускага адраджэньня”. Маўляў, наствараліі мы БНФаў і напрыдумлялі новых словаў, але толькі для сябе, бо народ нас не разумее і абыходзіцца “бяз нас”. Значыць, давайце рабіць так, як і народ, што вывучае белмову ў школах у савецкім правапісе. Магчыма, у гэтым ёсьць свая палітычная слушнасьць, нават неаспрэчная. Ды толькі да выжываньня мовы гэтая слушнасьць ня мае вялікага дачыненьня. Жывучасьць беларускай мовы на сёньня, па-мойму, вызначае ня колькасьць людзей, якія на ёй гавораць, а колькасьць тых, якія ў гэтай

мове нешта істотнае кажуць. У гэтым сэнсе я пакуль што ня бачу за “наркамаўкай” нейкай сьвятлейшай будучыні. Мяркуючы з досьведу ірляндцаў і нарвэжцаў, якія ўжо больш за сто гадоў (з выдатнай і непахіснай дапамогай дзяржаўнага апарату і бюджэту) беспасьпяхова адкопваюць свае вясковыя мовы з-пад каляніяльных завалаў (ірляндзкую — з-пад англійскага, а нованарвэскую — з-пад дацкага), ня толькі хібная “адраджэнская стратэгія” і байструкаватасьць дзяржаўнай улады вінаватыя ў працяглым заняпадзе беларускай мовы ў беларускай краіне. Хутчэй за ўсё, тут ёсьць яшчэ нешта страшнейшае, безназоўнае. Гэта яшчэ адзін аргумэнт, што “тарашкевіца” тут можа быць зусім ні пры чым. З другога ж боку, зусім магчыма, што гэты заняпад і ёсьць такой фатальнай і непазбыўнай акалічнасьцю, якая дазваляе беларускай мове выжываць, то бок ейным карыстальнікам казаць усё яшчэ нешта істотнае. Інакш кажучы, мы ўсё яшчэ хочам змагацца...

Сяргей Абламейка,
літаратар, журналіст, Прага

Не, няправільна. З вышыні сёньняшняй веды ўжо можна сказаць, што — не. Сам я застаюся прыхільнікам “тарашкевіцы”, не прымаючы савецкага гвалту над мовай. Я нават ня ўмею пісаць на наркамаўцы — развучыўся за апошнія 18 гадоў, бо з 1985 году яе не ўжываю. Ужываньне “тарашкевіцы” тады было формай антысавецкага пратэсту, непрыманьня савецкіх рэаліяў. Быў і яшчэ адзін аспэкт. Літаратурная мова ў Эўропе традыцыйна фармуецца на падставе сталічных гаворак — гэта значыць тых, што існуюць вакол сталіцы дзяржавы ці народу. “Тарашкевіца” стваралася на падставе віленскіх гаворак — у ваколіцах Вільні і сёньня так гавораць, чыстую “тарашкевіцу” можна і цяпер пачуць, напрыклад, у вёсках Мядзельскага раёну. Таму ўжываньне “тарашкевіцы” ў 80-я гады было і формай непрызнаньня перадачы Вільні літоўцам у 1939 годзе. Але падабаецца гэта нам ці не, сёньня сталіца Беларусі — Менск...

Таму як журналіст, як вядучы, які да таго ж некалькі гадоў працаваў рэдактарам інтэрнэт-выпуску Беларускай службы радыё «Свабода», — адным словам, як практык, я бачу і

праблемы, якія паўстаюць праз нарматыўны і граматычны разнабой у беларускіх галовах. Пры гэтым ня трэба забывацца, што моладзь разам з “тарашкевіцай” у 80-я гады завяла і традыцыю ўжываньня пэўнага пласту словаў, на якія ў савецкай і постсавецкай Беларусі людзі забыліся (ці іх прымусілі забыцца). А любоў да “тарашкевіцы” ў нэафітаў часта пераходзіць у словатворчасьць — у выніку нараджаюцца словы-пачвары, а іх аўтары забываюцца на стыль і густ. Адзін малады прыхільнік “тарашкевіцы” ня ведаў слова “паморак” і напісаў “згіненьне жывёлы”... А пра сынтаксычныя хібы і гаварыць ня варта. Таму я заўсёды раю (вядома, тым, хто здольны прымаць парады) больш чытаць Гарэцкага, Кузьму Чорнага, Брыля і Адамчыка. А сам сёньня ўжо разумею, што ў 80-я гады дастаткова было абмежавацца мяккім знакам і “я” пераднаціскным — быў бы шыкоўны кампраміс. Але не было таго, хто б парадзіў...

Аліса Бізяева,
аглядальніца газэты “Человек и Интернет”,
стваральніца рэсурсу litara.net, Менск

Мне падаецца, што іх выбар быў даволі просты: граматыка Тарашкевіча адпавядала большасьці абраных сымбаляў, была бліжэйшая да каранёў, не сапсаваная русіфікацыяй. А цяпер складана адказаць на пастаўленае мне пытаньне. З аднаго боку, граматыка Тарашкевіча лепей перадае мілагучнасьць беларускае мовы, больш адпавядае яе фанэтыцы. Але “тарашкевіца” ня стала агульнапрынятым правапісам, і рознасьць напісаньняў стала яшчэ адным выяўленьнем рознасьці поглядаў на нацыянальнае адраджэньне. І без таго рэдкае, беларускае слова, напісанае “тарашкевіцай”, у акадэмічных і грамадзкіх інстытутах часта ўспрымаецца значна горш, чым пададзенае па-расейску.

Калі я вучылася на журфаку, пісала свае курсавыя “наркамаўкай” і чытала «ARCHE» “тарашкевіцай”. У крытычных творах вельмі шанаванага мною Пятра Васючэнкі не было мяккіх знакаў, а ў творах ня менш шанаванага Ігара Бабкова — былі. Людзям, якія сапраўды хочуць захаваць нацыянальную мову любымі сродкамі, няма патрэбы спрачацца з-за правапісу. Яны абралі беларускую мову і часта гатовыя карыстацца тым правапісам, якога вымагае сытуацыя.

Ільля Глыбоўскі,
супрацоўнік фундацыі «Чалавек у нядолі»,
Прага
Chutčej nie, byŭ jinšy, bolš prahresiŭny šlach (dyj ciapier jašče nia pozna jim pajści). Dla mianie hałoŭnaje pytańnie nie ŭ hramatycy, a ŭ hraficy. Pry vykarystańni łacinki źnikaje prablema miakkaha znaku, vakoł jakoj nia pieršaje dziesiacihodździe jduć pustyja sprečki. Spraščajecca tranślitaracyja imionaŭ ułasnych, vizualna pieradajucca “h” i “g”. Na hety šlach stali nia tolki bolšaść słavianskich narodaŭ, ale j małdavanie, tatary. Adnyja tolki vyhody ŭ sfery sučasnych technalohij i kamunikacyj adrazu na niekalki hod napierad pasunuć naš narod. Łacinka moža papravić i niekatoryja kompleksy biełarusaŭ.

Павал Жук,
бізнэсовец, Менск
Некарэктна гаварыць пра выбар: выбару не было. У канцы 80-х гадоў мінулага стагодзьдзя была пачатая справа пабудовы новай Беларусі, адраджэньня нацыі. Мова — яе асноўны атрыбут, які фармуе мэнтальнасьць, ідэнтыфікуе нацыю. Савецкая беларуская мова ня магла і ня можа выконваць гэтыя задачы. Як тады, так і цяпер праблема ў мове, а не ў правапісе. У той, ужо далёкі, час вярнуліся да забытай моўнай базы, якую паспрабаваў фармалізаваць у правілы правапісу Тарашкевіч і якая давала шанец адарвацца ад савецкай белмовы. Усе дакумэнты тае эпохі, прамовы і г.д. пісаліся адраджэнцамі на “тарашкевіцы”. Тады ўжо стала зразумела, што гэтая аснова недастатковая і яе трэба дарабляць, адаптоўваць да рэаліяў. Навуковага асэнсаваньня і абгрунтаваньня ня зроблена да гэтага часу. Былі спробы выданьня слоўнікаў, у асноўным спэцыялізаваных, але гэта былі высілкі энтузіястаў. Таксама і мова незалежнай прэсы, ад “Навінаў БНФ”, потым “Свабоды”, “Нашай Нівы”, грунтавалася на палкім жаданьні адарвацца ад “саўка”. Аднаго жаданьня было мала. “Савок” перамог. Пакуль. Мара пабудовы Краіны Беларусі застаецца і павінна рэалізавацца. Бо нацыя, якая вучыць мову па трасянкавых слоўніках, чытае творы, напісаныя беларускай савецкай мовай, асуджаная на марудную, а значыць, больш небясьпечную

асыміляцыю. Асабіста я спрабую дасканаліць сваё ўжыванне “тарашкевіцы”.

Уладзімер Каткоўскі,
праграміст, стваральнік інтэрнэт-рэсурсу pravapis.org,
Франкфурт-на-Майне

Гэта быў абсалютна правільны выбар, у якім было два аспэкты: сымбалічны і практычны. Галоўны сымбалізм у тым, што мы адмяжоўваліся ад нежывой, сувэнірнай мовы БТ і радыёкропкі. Сымбалізм быў і ў тым, што мы адмовіліся ад бальшавіцкай рэформы 1933 году. Гэта значыць “два ў адным”: і ад камунізму, і ад непатрэбнай русіфікацыі.

Практычны аспэкт, я думаю, зразумелы. Па-першае, стандартная, але зацьвярдзелая і зьмярцьвелая сыстэма “наркамаўкі” не дае мове разьвівацца. Фактычна, “наркамаўка” праспала XX стагодзьдзе і працягвае спаць у XXI-м. Па-другое, “наркамаўка” вельмі адмоўна ўплывае на вымаўленьне тых, хто вывучае беларускую мову ў школе як другую, хоць быццам бы і “родную” мову.

Выбар быў цалкам правільны, але вялікая памылка і найвялікшая праблема палягае ў тым, што не было зроблена “сучаснай нармалізацыі”, якую нам спадар Вячорка абяцаў вельмі даўно. Гэтая сытуацыя зрабіла з прыхільнікаў клясычнага правапісу нейкіх моўных анархістаў і вельмі папсавала імідж “мяккім знакам”. Я зь вялікім нецярпеньнем чакаю на новы стандарт клясычнага правапісу. (Гл. таксама http://www.livejournal.com/users/rydel23/155068.html)

Сяржук Сокалаў-Воюш,
паэт, Прага—Нью-Ёрк

Адраджэнцы канца 80-х ніякага выбару не рабілі. Пэрсанальна перада мной ніколі не паўставала пытаньне пераходу на “тарашкевіцу”. Проста аднойчы я даведаўся, што яна ёсьць, і адразу ж пачаў яе ўжываць.

Гэта прыкладна тое самае, што з гісторыяй. Вывучаў у школе савецкую і савецкі варыянт беларускай, а потым, калі зразумеў, што ўсё гэта хлусьня, пачаў шукаць адпаведную літаратуру й вывучаць тое, што лічыў праўдзівым і сапраўдным.

Ці правільна зрабілі адраджэнцы... А ці правільна зрабілі марскія жывёлы, стаўшы земнаводнымі, сухапутнымі? Ці

правільна робіць дрэва, калі чапляецца каранямі за скалу, а іншае — за глебу на раўніне?
Пытаньне “тарашкевіцы” — гэта пытаньне натуралёвасьці, якая дазваляе выжыць і жыць, пытаньне гармоніі.
Па-мойму, сам факт узьнікненьня такіх пытаньняў сьведчыць пра грамадзтва, у якім мы жывём. Рэфарматары скажуць, што падобнае грамадзтва трэба рэфармаваць, а я думаю, што перад тым трэба чалавеку даць магчымасьць зразумець самога сябе і стаць самім сабою. Тады пытаньня, які правапіс ужываць, папросту ня ўзьнікне.
Вы можаце запытацца, што было б, калі б адраджэнцы не пачалі ўжываць клясычнага правапісу... Ня ведаю. Напэўна, я быў бы адзіным, хто трымаўся б яго.

Сяргей Шупа,
лінгвіст, Прага—Вільня
На самое пытаньне я адказваць ня буду, бо ў самім ім ужо закладзеная ідэя супрацьстаяньня двух варыянтаў літаратурнай беларускай мовы. Я выкажуся наконт самой гэтай ідэі.
Ніякай праблемы “супрацьстаяньня” “наркамаўкі” і “тарашкевіцы” няма. Уяўная “ўнармаванасьць” “наркамаўкі” і “неўнармаванасьць” “тарашкевіцы” — гэта ўсё фікцыя.
Беларуская мова — адна і адзіная. З гледзішча культуры мовы яна можа быць добрая і дрэнная. І як добрую мову ніяк не сапсуе “наркамаўка”, гэтак і дрэнную ніяк не ўратуе “тарашкевіца”. “Наркамаўка” ніяк не абмяжоўвае творчасьці, гэтак сама як “тарашкевіца” не дае *carte blanche* на безагляднае саматужніцтва.
Міжусобныя антаганісты — ворагі адпаведна “наркамаўкі” і “тарашкевіцы” — гэта ў пераважнай сваёй большасьці недастаткова пісьменныя ў беларускай мове людзі, якія падсьвядома сваю малапісьменнасьць адчуваюць і спрабуюць схавацца за папрокі — маўляў, “наркамаўка” зрусіфікаваная або на “тарашкевіцы” ніхто ня ведае, як правільна пісаць. Трэба проста павышаць культуру мовы, тады ўсялякія “мухі” наконт “супрацьстаяньня” зьнікнуць самі сабою.
Істотнай розьніцы паміж “наркамаўкай” і “тарашкевіцай” няма. Вымаўленьне накшталт [*сьвет*] ці [*ня быў*] аднолькавае і там, і там. Розьніца ў напісаньні — справа густу. Розьніца ў

напісаньні мае абсалютна сыстэмны характар, і пераключэньне туды-сюды ніякіх праблем не стварае. Што да ўсялякіх філолагаў/філёлягаў, сыстэмаў/сістэмаў — дык абодва варыянты аднолькава беларускія. Таксама справа густу. Магчыма, існаваньне аднаго варыянту шмат што спрасьціла б. Ідэалам быў бы сынтэз “наркамаўкі” і “тарашкевіцы”, напрыклад: узяць “наркамаўку”, вярнуць туды мяккія знакі, “ня”, безь вялікага фанатызму падгладзіць правапіс запазычаньняў. Разьвітацца зь фі*лёля*гамі і *сы*стэмамі, але захаваць А*мэ*рыку і Б*эр*лін. Што да “тарашкевічнай” лексыкі (Нямеччына, тэлевізія і падобнае), дык яна гэткая самая “тарашкевічная”, як і “наркамаўская”. Аднак, на жаль, афіцыйныя мовазнаўцы ня дбаюць пра далейшы лёс мовы і адмаўляюцца ісьці насустрач тым, хто ўжывае “тарашкевіцу”, тым самым падтрымваючы надалей існаваньне двух варыянтаў літаратурнай мовы, — пра сынтэз у імя еднасьці Інстытут мовазнаўства ня дбае.
Ну й тае бяды. Няхай жыве разнастайнасьць :)

Максім Шчур,
філёзаф, паэт, Прага—Стакгольм
На пачатку 90-х гадоў “рэпрэсаваны правапіс” стаўся адным з сымбаляў змаганьня за зьмену палітычнай эліты — і гэтым ператварыўся з пытаньня моўнага ў палітычнае (прыгадайма паэму Сержука Сокалава-Воюша “Мяккі знак”, адмысловы маніфэст адраджэнскага руху). Адраджэнцы абралі “тарашкевіцу” перадусім з палітычных меркаваньняў і пачалі ёю карыстацца спантанна ды часам вельмі адвольна. Зразумела, што тыя, хто выступаў за нацыянальную эмансыпацыю, з захапленьнем успрынялі “новую” тэндэнцыю ў мове: “пераадкрыцьцё” “тарашкевіцы” пазбавіла дзяржаву, а значыцца, і Камуністычную партыю фактычнай манаполіі на беларускую мову, абудзіла ў людзях хвалю цікавасьці да яе й разбурыла міт аб спрадвечнай нязьменнасьці расійска-беларускіх стасункаў, у тым ліку і ў галіне мовы. Усё гэта сьведчыла аб перамене палітычнага клімату ў краіне. Аднак у цэлым адраджэнцы тады пераацанілі псыхалягічную й ідэалягічную падрыхтаванасьць беларускага народу да прыняцьця вялікай колькасьці радыкальных зьменаў адначасова.

Ільга сказаць, што з палітычнага гледзішча “тарашкевіца” нічым не нашкодзіла адраджэнцам, але й нічым не дапамагла, аднак эмацыйна падтрымала рух, бо стварыла ўражаньне, быццам на ягоным баку веданьне нейкай адмысловай праўды. На жаль, гэтае ўражаньне не было праўдзівым. Як паказала далейшае разьвіцьцё сытуацыі, празьмерная палітызацыя нацыянальнага пытаньня ў той час была няўдалым і заўчасным крокам. У той час я таксама быў “з прынцыпу” паспрабаваў пісаць у школе “зь мяккімі знакамі” — і адразу ж атрымаў за дыктоўку двайбан. Прыблізна тое самае сталася з нашымі “дарослымі” адраджэнцамі: іхную “радыкальнасьць” у гэтым рэчышчы льга ўспрымаць як адну з праяваў нясьпеласьці ўсяго тагачаснага руху. Галоўнае — ня як пісалася, а што пісалася. Напэўна, замест крайняй палітызацыі моўнага пытаньня й адкрытай канфрантацыі з афіцыйным правапісам варта было найбольш значныя навуковыя й літаратурныя творы, напісаныя й выдадзеныя да 1933 году (перадусім літаратурную клясыку — Купалу, Коласа, Гарэцкага, а таксама творы аўтараў-эмігрантаў), мэтаскіравана перавыдаць у арыгінальным правапісе, а не ў такім выглядзе, у якім яны былі вядомыя бальшыні з савецкіх часоў.

Зразумела, што, каб у той час быў дазволены выхад “сучаснай” кніжкі, надрукаванай “несучасным” правапісам, трэ было ўмець паразумецца ня толькі з тагачаснымі ўладамі, але й зь беларускімі рэдактарамі “савецкай школы”, якія традыцыйна належаць да самых кансэрватыўных і пільных у сьвеце й практычна ня ведаюць, чым рэдактура адрозьніваецца ад цэнзуры. Таксама ясна, што ў краіне з адсутнасьцю ўяўленьня аб прыватнай уласнасьці й ня толькі аўтарскіх, але й іншых правох чалавека растлумачыць гэтае адрозьненьне цяжка яшчэ й сёньня. У Савецкім Саюзе добра ведалі, што цэнзуру найлепш маскаваць менавіта пад рэдактурай. Рэдакцыі ўяўлялі сабой адно з адгалінаваньняў улады, надзеленае паўнамоцтвамі ідэалягічнага кантролю, *былі* гэтай уладай у дачыненьні да тэкстаў і іхных аўтараў. Прычым так паводзілі сябе ня толькі рэдактары, але й перакладчыкі. Даходзіла да сьмешнага: гэтак, напрыклад, у чэскім перакладзе “Чорнага замку Альшанскага” бракуе (сярод многіх іншых пасажаў) апошняй фразы, “О, жыцьцё!” — толькі таму, што перакладалі з “удасканаленага” расійскага перакладу, надрукаванага ў

“Нёмане” ў 1980—1981 гадох. Чый гэта быў пераклад, не нагадаеце?
Наагул, ідэалягічны кантроль за культурай з боку дзяржавы магчымы праз матэрыяльную несамастойнасьць гэтай культуры ды фактычную адсутнасьць прыватных выданьняў. Ён і сёньня застаецца такой самай праблемай, як і калісь.
Улучэньне ў правапісную норму неабходных і найбольш жыцьцяздольных элемэнтаў “тарашкевіцы” сталася б магчымае й патрэбнае толькі тады, калі “прыватнае” карыстаньне імі настолькі распаўсюдзілася б, што пытаньне пераходу на новы варыянт правапісу на дзяржаўным узроўні зрабілася б мэтазгодным. Пры такім разьвіцьці падзеяў сёньня мы ўжо рэгулярна сутыкаліся б калі не з “тарашкевіцай”, дык зь відочна “тарашкевізаванымі” варыянтамі “наркамаўкі” ў друку — хаця ў школе, магчыма, усё яшчэ вучыліся б “па-наркамаўску”. Але зноў-такі — якіх гадоў пяць—дзесяць, ня болей. З улучэньнем у школьныя праграмы ўзгаданых клясычных тэкстаў рана ці позна паўстала б пытаньне новай нормы.

Сяргей Дубавец,
рэдактар, Вільня
Пытаньне і некарэктнае, і бескарыснае, і недакладнае (пра канец 80-х). А праблема тут чыста маральная. Гэта праблема ацэнкі сталінізму і русіфікацыі ў Беларусі. Пакуль такое ацэнкі ня будзе хоць бы з боку беларускае інтэлігенцыі, два правапісы будуць суіснаваць, адзін — як увасабленьне антыбеларускага і прасавецкага курсу аўтарытарнае ўлады, як вобраз прыгнёту, другі — як вобраз незалежнае беларушчыны.
Наяўнасьць двух правапісаў, вядома, замінае. Але ў нашым гістарычным часе безь вяртаньня да клясычных нормаў нават тое адраджэньне, якое ёсьць сёньня (прыток моладзі ў беларушчыну), было б немагчымае. Сымболіка каляніялізму неспалучальная з эстэтыкай адраджэньня. Гэта выбар паміж мёртвым і жывым.

Івонка Сурвілла,
Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі,
Атава
Абсалютна правільна. Не магу сабе і ўявіць іншага выбару.

Апытваў Алесь Пяткевіч, Прага

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Нерыюс Прэкявічус

Навошта Лукашэнку новая ідэалёгія*

НЕРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС (нар. 1975 у Каўнасе) — палітоляг. Скончыў Каўнаскі ўніверсытэт імя Вітаўта Вялікага. Выкладае паліталёгію ў ўніверсытэце Паўднёвага Стакгольму.

*** З гроні лёсу, палітыка Беларусі — непасрэднай суседкі Літвы — знаходзіцца даволі далёка ад сферы маіх даследчыцкіх інтарэсаў. Да напісання гэтага артыкулу мяне**

Гэты дакумент прыцягнуў маю пільную ўвагу з дзвюх прычынаў. Па-першае, мяне даўно цікавяць партыйныя ідэалогіі. Ідэалагічныя заявы важныя, бо яны могуць нешта сказаць пра будучыя стратэгіі. Паколькі палітыка Беларусі застаецца досыць адрознай ад палітыкі суседніх з ёю краінаў, цікава зірнуць на абгрунтаванне гэтай беларускай выключнасці. Па-другое, прамова надзвычай празрыстая. Туманныя палітычныя заявы — сапраўднае бедства для даследчыка, якога цікавяць партыйныя ідэалогіі. Аднак гэты дакумент даволі шчыры і вылучаецца надзвычай багатым зместам, ахопліваючы самыя розныя сферы і закранаючы ключавыя пытанні беларускай палітыкі.

Маёй галоўнай мэтай у гэтым артыкуле з'яўляецца асвятленне асноўных рысаў палітычнага светапогляду Аляксандра Лукашэнкі, паказаных у прамове. Відавочна, што тэкст выступу прэзідэнта Беларусі пісаўся некалькімі людзьмі: у ім маюцца

шматлікія пераходы ад аднаго стылю да другога. Такім чынам, канчатковае рашэнне аб уключэнні ці выключэнні пэўных элементаў мусіў рабіць асабіста А.Лукашэнка. Я таксама пазбягаю любых спасылак на іншыя крыніцы, што б пацвердзіць або абвергнуць вобраз, пабудаваны ў прамове адной асобна ўзятай прамовы. Задача палягае ў іншым: здабыць як мага больш карыснай інфармацыі з аднаго дакументу.

Праблемы сучаснай ідэалагічнай працы

Аналіз прамовы Аляксандра Лукашэнкі на семінары 27 сакавіка 2003 года

Тэкст, які з'яўляецца прадметам абмеркавання, быў узяты з афіцыйнага веб-сайту прэзідэнта Беларусі. Ахвотны ход разважанняў могуць адшукаць яго стэнаграмы па адрасе http://www.president.gov.by/rus/president/speech/2003/mar/.

На прамове Аляксандра Лукашэнкі на семінары 27 сакавіка адбілася моцнае адчуванне ўразлівасці, неабароненасці, з усяго відаць, жывуць беларускія палітычныя вярхі. А.Лукашэнка прызнае пагаршэнне стану беларускай эканомікі ("народ живет нелегко, ситуация непростая") і прыводзіць два шэрагі даволі традыцыйных аргументаў, разлічаных на тое, каб супрацьстаяць магчымай незадаволенасці насельніцтва. З аднаго боку, ён робіць націск на ролі нематэрыяльных стымулаў, падкрэслівае патэнцыял ідэалогіі для вырашэння праблемы дэфіцыту сродкаў і заклікае да самаахвярнасці. А.Лукашэнка аддае належнае яснасці савецкай ідэалогіі і прызнае яе эфектыўнасць. З іншага боку, А.Лукашэнка згадвае спадзяванне чалавека толькі на ўласныя сілы як адзіны станоўчы аспект ліберальнай ідэалогіі, якая ва ўсім астатнім характарызуецца выключна адмоўна. Гэта не замінае яму зрабіць з гэтага спадзявання на ўласныя сілы адзін з асноўных элементаў сваёй дзяржаўнай ідэалогіі.

Прамова поўніцца намёкамі на пагрозу звонку. Гэтая пагроза бачыцца ў культурным уплыве Захаду і ў прывабнасці заходняга ладу жыцця, які звязваецца з жорсткасцю і вычварэннямі. Прысутнічае таксама адчуванне прамой пагрозы з боку Захаду ("впору говорить о "либеральном терроре") і "лібералізаванай" Расіі (галоўным чынам, яе бізнес-інтарэсаў). Урывак пра Ірак, як падаецца, найлепш перадае гэтую трывогу. Прэзідэнт падкрэслівае магчымую небяспеку ("и мы будем втянуты в эту войну") і абараняе (хоць, здавалася б, без дай прычыны) беларуска-іракскія адносіны ("мы не нарушили

международное право, ни один закон, ни одну резолюцию”).
Ідэалогія разглядаецца як сродак выпрацоўкі імунітэту супраць уплываў звонку, да таго ж, мэтаскіраваная інфармацыйная дзейнасць можа таксама палепшыць імідж Беларусі на міжнароднай арэне.
Унутраная пагроза разглядаецца як не менш небяспечная. Небяспеку для цяперашняга ўраду ўяўляе пранікненне апазіцыянераў у дзяржаўныя ўстановы, страта падтрымкі ўладаў сярод моладзі або яе пасіўнасць, як у савецкія часы. Інтэлектуалы і творчыя асобы разглядаюцца як ідэалагічна ненадзейныя. Паводле А.Лукашэнкі, прафсаюзы замест таго, каб займацца сваімі непасрэднымі справамі, уцягнуліся ў палітыканства. Усе гэтыя ўнутраныя праблемы аб’яднаныя ў прамове супольным матывам ідэалагічных недапрацовак. Таму падзенне папулярнасці нізкаякасных дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі (“жанровая и тематическая бедность”) у спалучэнні з пранікненнем у Беларусь расійскіх медыяў успрымаецца як сур’ёзная пагроза.
Асаблівая ўвага надаецца таксама афіцыйнаму замацаванню ролі прэзідэнта ў якасці “бацькі-заснавальніка” і закладанню ягонай доўгатэрміновай спадчыны. Пра гэта гаворыцца надзвычай разгорнута. А.Лукашэнка разумее, што адных выбарчых кампаній для падтрымкі аўтарытэту дзяржаўных установаў недастаткова. Прэзідэнт адмовіўся ад ідэі выдаць сваю кнігу або збор артыкулаў, але ягоная прапанова — падручнік па ідэалогіі — досыць падобная да гэтай ідэі, бо большасць тэкстаў, якія маюць быць уключаныя ў падручнік (перадвыбарныя праграмы, прэзідэнцкія прамовы, законы), былі створаныя самім А.Лукашэнкам.
У цэлым складаецца ўражанне, што новы праект пабудовы дзяржаўнай ідэалогіі прадыктаваны досыць кароткатэрміновымі інтарэсамі. Задача стварэння доўгатэрміновае спадчыны першага прэзідэнта Беларусі не падаецца важнай з наступных прычынаў. Агульная структура дзяржаўных інстытутаў, распісаная ў наступных раздзелах прамовы, не забяспечвае палітычнай пераемнасці. Становішча існых інстытутаў улады выглядае няпэўным нават на цяперашні час, таму іх выжыванне ў будучыні яшчэ больш сумнеўнае. Сістэма моцна залежыць ад цяперашняга прэзідэнта, і прамова не ўтрымлівае ніякай інфармацыі пра

магчымых пераемнікаў. Больш таго, прамова не ўказвае на факт існавання інстытутаў улады, здольных да незалежных дзеянняў у выпадку адстаўкі цяперашняга прэзідэнта. Падсумоўваючы сказанае, задача стварэння спадчыны падаецца хутчэй рытарычнай, чым разлічанай на рэалізацыю.

Гэта дае мне магчымасць зрабіць выснову, што прэзідэнт заклапочаны пераважна бягучымі ўнутранымі праблемамі. Замежная пагроза, нягледзячы на важнасць, якая ёй надаецца ў прамове, не можа быць рэалізавана без пэўнай падтрымкі знутры краіны. У адваротным выпадку ўмяшальніцтва каштавала б занадта дорага (улічваючы адсутнасць у Беларусі значных рэсурсаў). Такім чынам, усе меры, заяўленыя ў прамове, павінны, як мяркуецца, аднавіць саслабелы за апошні час уплыў дзяржавы на разнастайныя каналы інфармавання насельніцтва. Бо ў выпадку дэзінтэграцыі ўсёй цяперашняй унутранай апазіцыі не будзе як ажыццяўляць непасрэдную пагрозу з-за мяжы.
Што для А.Лукашэнкі з'яўляецца асноўнай функцыяй ідэалогіі? Даволі ясна, што прэзідэнта не хвалюе палітычная мабілізацыя насельніцтва, што ён імкнецца да змяншэння палітычнай актыўнасці ў грамадстве ("некоторые профсоюзные лидеры по-прежнему занимаются политикой"). Больш таго, дзяржаўная ідэалогія разглядаецца як абарончая абалонка палітычнай сістэмы, у той час як унутранай мэтай ураду з'яўляецца эфектыўнае кіраванне ("Десять лет прожили, власть эффективно работает, стараемся и так далее"). Такім чынам, накшталт як першая сусветная вайна мела пакласці канец усім войнам, гэтаксама новая дзяржаўная ідэалогія ствараецца з асноўнай мэтай скончыць усе ідэалагічныя дыскусіі ў беларускім грамадстве.

Пошук новых установак
Прамова поўніцца спасылкамі на савецкае мінулае. Адметна, што некаторыя з гэтых заўваг маюць асабісты характар (напрыклад, урывак, прысвечаны савецкім сімвалам у школах). Савецкая мінуўшчына разглядаецца як неадлучная частка беларускай гісторыі, "наша" (беларуская?) ідэалогія атаясамліваецца з савецкай ідэалогіяй. Не дзіва, што марксізм-ленінізм прадстаўлены як галоўны кампанент новай

беларускай дзяржаўнай ідэалогіі. Адначасова кансерватызм выяўлены ў асноўным як ідэалогія супрацьстаяння сацыяльным зменам, а лібералізм асацыюецца з эксплуатацыяй. Тры асноўныя ідэалагічныя дыскурсы ацэньваюцца ў прамове па-рознаму. Сацыялізм тлумачыцца ў асноўным праз ягоную савецкую форму, што прывязвае новую беларускую ідэалогію да савецкай сістэмы. Кансерватызм, як яго прадстаўляе прамова прэзідэнта, звязваецца з традыцыйнымі каштоўнасцямі аграрнага грамадства і характарызуецца недахопам інтэлектуальнай глыбіні. Лібералізм выкарыстоўваецца толькі як сродак заахвочвання да большай самастойнасці і спадзявання на ўласныя сілы. Што яшчэ цікавей, усе гэтыя ідэалагічныя пункты гледжання вырваныя з кантэксту і не стасуюцца паміж сабой.

Пытанне нацыянальнай тоеснасці таксама складанае. Прысутнічае некалькі спасылак на арганічную канцэпцыю дзяржавы — ідэалагічны імунітэт, родная ідэалагічная глеба, каштоўнасці, што паўсталі ў працэсе натуральнага адбору. Узаемадачыненні паміж дзяржавай і народам апісваюцца ў патэрналістычных тэрмінах (“социальная опека и уважительные отношения”). З іншага боку, нацыяналізм асуджаецца як адзін з фактараў разбурэння Савецкага Саюзу, і А.Лукашэнка мяркуе, што гісторыі Беларусі надаецца зашмат увагі. Наступная загадка — гэта цывілізацыйная прызма, праз якую прэзідэнт глядзіць на беларускую дзяржаву і грамадства. А.Лукашэнка акрэслівае заходнюю цывілізацыю як чужую і агрэсіўную ды супрацьпастаўляе ёй “усходнееўразійскую”, “усходнеславянскую”, або “ўсходнееўрапейскую” цывілізацыю. Прэзідэнт бачыць у Беларусі бастыён “усходнееўразійскай цывілізацыі”, якая можа таксама атаясамлівацца з краінамі былога Савецкага Саюзу (“нашего постсоветского пространства”). Ён падкрэслівае супольнасць славянскіх каранёў з Расіяй і Ўкраінай ды ганарыцца сваёй ідэяй увесці расійскую ў якасці другой дзяржаўнай мовы, дарма што цяперашні расійскі культурны ўплыў характарызуе ў адмоўных тэрмінах.

Эканамічныя праблемы таксама далёка не вырашаныя. Паводле беларускага прэзідэнта, дзяржава павінна выступаць у першую чаргу ў якасці гаранта стабільнасці, а не крыніцы матэрыяльнага дабрабыту. Іншымі словамі, за матэрыяльны

дабрабыт людзей адказвае не дзяржава, а ў першую чаргу самі людзі. Прысутнічаюць таксама намёкі на будучую прыватызацыю (“случится так, что государственной доли не будет”). Аднак ідэя спадзявання людзей толькі на свае сілы не прымаецца безагаворачна. Беларуская эканамічная мадэль акрэслена таксама як сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка з прэваліраваннем канкурэнцыі (“идеи конкуренции”) і роўнымі магчымасцямі для дзяржаўнага і прыватнага сектараў, што ў агульных рысах нагадвае “шведскую мадэль”. Можна таксама знайсці выказванні пра сацыяльную справядлівасць і дзяржаўную апеку. Акрамя таго, права прыватнай уласнасці на зямлю разглядаецца як неўласцівае Беларусі, а прыватныя СМІ рызыкуюць сутыкнуцца з непрыхільнасцю дзяржавы. І што вельмі паказальна, заяўлены кампраміс паміж незалежнасцю і дабрабытам, як і ўвядзенне ідэолагаў ва ўсе арганізацыі (як дзяржаўныя, так і прыватныя), ускосна сведчыць пра тое, што ўсё гэта робіцца з палітычных меркаванняў.

Як можна зразумець гэты шэраг супярэчнасцяў? Прапаную вярнуцца да магчымых выгадаў стварэння новай дзяржаўнай ідэалогіі. Паколькі галоўнай мэтай, у маім разуменні, з’яўляецца не мабілізацыя беларускага грамадства, а заахвочванне ў ім вернападданасці і паніжэння ўзроўню запытаў, няма неабходнасці ў паслядоўнай ідэалагічнай сістэме. Прэзідэнт адбірае ідэалагічныя сцверджанні, якія адпавядаюць падставовым мэтам. Савецкі ідэалагічны кампанент, добра знаёмы тутэйшаму насельніцтву, забяспечвае шмат каму з беларусаў пачуццё стабільнасці. Кансерватыўны і ліберальны кампаненты, пры ўмове поспеху ўладаў, мусяць дыстанцыяваць грамадзян ад актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці.
Падобныя сцверджанні можна выказаць і пра нацыянальную тоеснасць. Хоць ідэя беларускай выключнасці павінна засцерагчы ад замежнага ўплыву, А.Лукашэнка не звяртаецца да агрэсіўнага нацыяналізму. Адной з прычынаў тут можа быць тое, што гэткі нацыяналізм безумоўна прывёў бы да замежнага ўплыву. Не ведаю, наколькі сведамым было рашэнне выкарыстоўваць паняцце ўсходнееўразійскай цывілізацыі, але яго можна назваць удалым для прэзідэнта. З аднаго боку,

паняцце цывілізацыі не акрэслена дакладна і не звязваецца з праблемамі этнічнай прыналежнасці, так што яно не можа быць перанятае і эфектыўна выкарыстанае патэнцыйнымі супернікамі з шэрагаў палітычнай эліты. З іншага боку, гэтая ідэя можа паслужыць апраўданнем эканамічным праблемам краіны і яе нестандартнай замежнай палітыцы. Такім чынам, праблема беларускай нацыянальнай тоеснасці пакідаецца ў замарожаным стане.
Калі казаць пра эканамічную палітыку, я б адзначыў прысутнасць дзвюх супярэчных мэтаў. З аднаго боку, прэзідэнт яўна заклапочаны зніжэннем эканамічных паказчыкаў і разглядае канкурэнцыю як магчымы сродак іх паляпшэння. Інакш зніжэнне ўзроўню жыцця можа прывесці да зніжэння падтрымкі ўраду як сярод насельніцтва, так і сярод чынавенства. З іншага боку, развіццё рыначнай эканомікі яшчэ больш павялічыць няроўнасць у грамадстве, выклікаючы незадаволенасць ніжэйшых класаў. Больш таго, замежныя інвестары і новы клас прадпрымальнікаў будуць імкнуцца да большага палітычнага ўплыву і ў ходзе гэтага могуць поўнасцю “скупіць” урадоўцаў. Таму А.Лукашэнка спрабуе знайсці нейкае прамежкавае рашэнне; будучыня пакажа, ці дасць яно плён.

Імідж дзяржаўных установаў
Прамова дае чытачу магчымасць у значнай ступені зразумець наяўную і патэнцыйную структуру дзяржаўнай улады ў Беларусі. А.Лукашэнка разгортвае свае погляды на грамадзянскую супольнасць і размяркоўвае задачы між дзяржаўнымі органамі (пераважна ў другой палове прамовы). Такім чынам, мы атрымліваем інфармацыю пра тыповыя ўзоры ўзаемадзеяння паміж дзяржаўнымі інстытутамі, якую можна прыблізна паказаць у выглядзе трох’яруснай схемы.
[image]
Верхні ярус складаецца з адной асобы — самога прэзідэнта. У прамове ён прадстаўлены як галоўны спецыяліст, што прымае рашэнні і асабіста займаецца гэткімі разнастайнымі справамі, як, напрыклад, павышэнне якасці школьных падручнікаў, выбар тэм для кінафільмаў, удасканальванне зместу раённых газет. Ён таксама размяркоўвае абавязкі паміж дзяржаўнымі органамі, што ў канчатковым выніку прадугледжвае таксама неабходнасць вырашаць спрэчкі паміж

імі.
Другі ярус складаецца з дзяржаўнага чынавенства, якое знаходзіцца пад непасрэдным кантролем прэзідэнта і займаецца ажыццяўленнем ягонай палітыкі на практыцы. Гарызантальныя адносіны паміж асобнымі інстытутамі, як падаецца, вызначаюцца ў кожным канкрэтным выпадку самім А.Лукашэнкам. Адміністрацыя прэзідэнта адыгрывае большую ролю, чым іншыя часткі бюракратыі, аднак яна не перашкаджае прамому ўмяшальніцтву прэзідэнта ў іншыя ведамствы. Армія і служба бяспекі згадваюцца (як правіла, з вялікай пашанай) асобна ад прэзідэнцкай адміністрацыі; апошняя можа толькі "прасіць" ("задействуйте их, попросите") іх дапамогі, а не дзейнічаць разам з імі. У ідэале беларускае чынавенства павінна было б складаць элітны корпус, адданы дзяржаўнай ідэалогіі, а дзяржаўная сістэма адукацыі — быць часткай гэтага корпусу ("вмонтированными в эту систему власти"). Паводле А.Лукашэнкі, нелаяльнасць да ўлады раўназначная нізкаму прафесіяналізму.
Трэці ярус змяшчае грамадзянскую супольнасць, як яна прадстаўлена ў прамове, і палітычна рэлевантныя групы інтарэсаў. Прамова ўказвае на жаданне кантраляваць іх з дапамогай адпаведных міністэрстваў. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даручаецца Міністэрству адукацыі, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі — Міністэрству прамысловасці. Неабходна заўважыць, што абедзве арганізацыі маюць парасонавую структуру з тэндэнцыяй да цэнтралізацыі. СМІ (кантраляваныя Міністэрствам інфармацыі) разглядаюцца, з аднаго боку, як завада для ідэалогіі, а з другога, як магутны сродак уздзеяння ("журналистика — профессия государственная"). Расійская праваслаўная царква застаецца па-за зонай прамога дзяржаўнага ўплыву, што можа растлумачыць неадназначнае стаўленне да яе прэзідэнта. Іншая цікавая рыса — публічнае адмаўленне ўсялякай палітычнай ролі недзяржаўных арганізацый.

Механізм палітычнае пераемнасці адсутнічае
Гэтая схема ажыццяўляецца пакуль толькі часткова, яе дэталі можна аспрэчваць, але галоўныя ідэалы падаюцца дастаткова яснымі. Калектыўнаму лідэрству ў савецкім стылі, з ягонымі складанымі працэдурамі кааптацыі і рэпрэзентацыі, прыходзіць

на змену сістэма, якая характарызуецца індывідуальным лідэрствам і дзяржаўна-карпаратыўнымі элементамі. Стасункі паміж прэзідэнтам і высокімі чыноўнікамі будуюцца на асабістых адносінах (да апошніх Лукашэнка звяртаецца па імёнах). Ствараецца таксама ўражанне частых перамяшчэнняў у асяроддзі дзяржаўных чыноўнікаў — у прамове згадваецца шмат новых прызначэнняў. Цалкам лагічна, што не існуе палітычнай арганізацыі (партыі або руху), якая б яднала гэтую сістэму ў адно цэлае — ідэалагічная праца даручаецца ў асноўным чыноўнікам.

У такой сістэме ёсць як выгадныя, так і нявыгадныя для цяперашняй улады аспекты. З аднаго боку, шанцы на ўзнікненне больш ці менш сур'ёзнае плыні незадаволеных унутры палітычных вярхоў мізэрныя. Палітыка спрыяння пасіўнасці насельніцтва аслабляе арганізаваную апазіцыю ўнутры грамадства. З іншага боку, сістэма не гарантуе належнай палітычнай пераемнасці і перадачы ўлады. Змена рэжыму ў гэтым выпадку можа прывесці краіну да палітычнага і сацыяльнага хаосу.

Прамова А.Лукашэнкі выразна выявіла погляды, уласцівыя цяперашнім беларускім уладам. Тым не менш, яна не азначае нейкае фундаментальнае навіны ў прэзідэнцкай палітыцы. Ашаламляльных інавацый няма, прамова з'яўляецца проста спробай сістэматызаваць стратэгіі, якія ўжо выкарыстоўваліся раней.

Пераклала з ангельскай
Мілана Міхалевіч паводле аўтарскага арыгіналу

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

Юры Чавусаў

Ідэалёгія альбо пісьменнасьць: беларускае грамадзтва на раздарожжы

ЮРЫ ЧАВУСАЎ (нар. 1978 г. у Менску) — палітоляг, публіцыст. Сябра рэдакцыйнай рады часопісу “Палітычная сфера”. У ARCHE друкуецца ўпершыню.

Тэксты, якія аглядаюцца ў артыкуле:

Слука А. *Нацыянальная ідэя: сістэмны аналіз праблемы.* Менск: Нацыянальны інстытут адукацыі; Мазыр: Белы вецер, 2001.
Даклад прэзыдэнта Беларусі А. Лукашэнкі на сэмінары кіраўнічых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіраваньня 27 сакавіка ў г.Менску.
Крупник С., Мацкевич В. *Функциональная грамотность в системе образования Беларуси.* Минск: Академия последипломного образования, 2003.

Беларусь зазнала ў сваім разьвіцьці як пэрыяды ідэалягічнага плюралізму, так і часы манапольнага дамінаваньня адной ідэалёгіі. Гэтая праблематыка знаходзіцца ў цэнтры ўвагі грамадазнаўцаў. Гэта адна з асноўных праблемаў палітычнай

навукі, дый зь дзяржаўных трыбунаў зноў гучаць ідэалягічныя заклінаньні. У гэтым кароткім аглядзе будуць прааналізаваныя матэрыялы, у якіх абмяркоўваюцца мэты і шляхі ідэйнага разьвіцьця беларускага грамадзтва.

1

Былы кіраўнік ідэалягічнага аддзелу Адміністрацыі прэзыдэнта Алег Слука прадэкляраваў задачай сваёй працы вызначэньне “сутнасьці асноўнага закону разьвіцьця беларускага народу” — нацыянальнай ідэі. Пры гэтым словы “нацыянальная ідэя” і “ідэалёгія” для аўтара зьяўляюцца сынонімамі, але першы тэрмін ён настойліва раіць пісаць выключна зь вялікай літары. Такая фармулёўка праблемы патрабуе працы, значна больш аб’ёмнай за 160 старонак Слуковай кнігі, — гэткая тэма пасавала б да праграмы навуковага інстытуту ці міждысцыплінарнага дасьледаваньня групы навукоўцаў. Зрэшты, так і было: з 1997 году на заданьне Адміністрацыі прэзыдэнта група палітолягаў, эканамістаў, сацыёлягаў, сфармаваная ў Інстытуце сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў, распрацоўвала “Ідэалёгію беларускай дзяржаўнасьці: канцэпцыю, мадэль, праграму рэалізацыі”. Вынікам працы тае групы, у склад якой уваходзіў і А.Слука, зьявілася манаграфія “Мадэль устойлівага разьвіцьця Рэспублікі Беларусі: ідэалёгія, сыстэма кіраваньня, мэханізм рэалізацыі ў саюзе з Расеяй”, хоць і невялікая аб’ёмам, але сыстэмная. Манаграфія ж Слукі ўяўляе сабой фрагмэнт памянёнага дасьледаваньня, адаптаваны для шырэйшага кола чытачоў. У ёй сканцэнтраваныя пастуляты, на якіх мусіць будавацца ідэалягічная праца. На першы погляд, гэтая кніга, напісаная ўзьнёслай мовай, не належыць да навуковых дасьледаваньняў: яна занадта агульная, няпэўная — нават спасылкі і цытаты аформленыя неахайна — і хутчэй асацыюецца з плыньню палітычна-філязофскай сэрвільнай рэфлексіі. Аўтар проста пяе панэгірык “Нацыянальнай Ідэі”, якая “ня мае множнага ліку”. А хто аказвае ёй, высакароднай, супраціў, выказваецца за плюралізм думак, тыя — небясьпечныя анархісты.

Галоўны клопат аўтара — як сумясьціць высокі (так дэкляруецца і даводзіцца) узровень разьвіцьця беларускага

грамадзтва з вартасьцямі традыцыяналісцкае, патэрналісцкае культуры. Пры гэтым аўтар непазьбежна трапляе ў пастку альтэрнатыўных мадэрнізатарскіх тэорыяў: ён атаесамляе Беларусь з краінай з так званай “здаганяючай мадэрнізацыяй”, неаднаразова падкрэсьліваючы пазытыўны досьвед Кітаю. Пачынаючы з 70-х гадоў у сьвеце зьявілася безьліч такіх тэорыяў, якія асэнсоўвалі намаганьні Расеі, Японіі, Турэччыны (у розныя часы) забясьпечыць дзяржаве высокі ўзровень тэхналёгіяў пры адначасова нізкім узроўні дэмакратыі. Карацей, аўтар вядзе Беларусь па асаблівым шляху ў будучыню — які, заўважым, непазьбежна будзе тупіковым, бо ня можа быць дзьвюх сучаснасьцяў у глябалізаваным сьвеце, і досьвед “халоднай вайны” ў гэтым пераконвае. Сам аўтар прызнае, што законы інфармацыйнага грамадзтва адзіныя на ўсёй плянэце, але для яго гэта не запярэчвае магчымасьці асаблівага “беларускага шляху разьвіцьця”.

Што да зьместу нацыянальнае ідэі, дык з гэтага выданьня вынікае, быццам яна для беларусаў складаецца ў асноўным з прагі да матэрыяльнага дабрабыту і непрыманьня заходніх вартасьцяў, заходняй мас-культуры. Цікава, як зьбіраюцца абараняць краіну ад монстраў мас-культуры — Мікі Маўса і Толкіна, Галівуду і НХЛ?

У наратыў А.Слукі (як і ў сьпічы афіцыёзных палітолягаў, што муляюць вочы лянотнаму гледачу БТ) умела ўплеценыя цытаты зь Янкі Купалы. Выданьне ўвогуле вытрыманае ў духу “паліткарэктнасьці па-беларуску”: гэтак, у падразьдзеле, прысьвечаным гістарычнаму разьвіцьцю беларускай дзяржаўнасьці, БНР ня згадваецца; Эўропа, якая, на думку аўтара, акупаваная войскамі NATO, адначасова сама вядзе нэакаляніяльную палітыку ў краінах “трэцяга сьвету”; Захад ня мае права ўмешвацца ў справы Чачэніі; вайна зь Югаславіяй — злачынства з боку міжнародных структураў. Аўтар ганьбіць Вярхоўны Савет XIII скліканьня, што зьбіраўся аб’явіць імпічмэнт усенароднаабранаму прэзыдэнту. Захад асацыюецца для аўтара з словамі “СНІД”, “наркаманія”, а жыцьцё плянэты азначанае процістаяньнем “заможная Поўнач — бедны Поўдзень”. Такім чынам, выданьне можна сьмела рэкамэндаваць у якасьці паўнавартаснага дапаможніка пры падрыхтоўцы палітінфармацыяў на вытворчасьці, лекцыяў па палітэканоміі рынкавага сацыялізму ў школах, а таксама як

настольную кніжку палітрука.
Але нягледзячы на тое, што акрамя сп. Слукі ў гэтым жанры папрацавала яшчэ некалькі навукоўцаў-публіцыстаў (найшчырэй выказваецца сп. В.Мельнік: “Давайце дэмаскуем прэзыдэнцтва: нацыя набыла свайго лідэра і зь ім вырушвае ў далейшы гістарычны шлях” — менавіта так называецца разьдзел у ягонай кнізе “Беларусь: власть, политика, идеология”, Менск, 1998), ідэалягічная праца ў дзяржаве не расквітнела. Досьледы навукоўцаў-грамадазнаўцаў не сфармавалі ідэалягічнага канону. Распрацаваная навукоўцамі канцэпцыя кепска клалася на прапагандысцкую мову, была заскладанай для простага чытача і кепска працавала на практыцы. Да таго ж ёй не хапала таго галоўнага, чаго патрабаваў “замоўца”: гэтая схема была занадта акадэмічнай, адцягнутай ад рэчаіснасьці. Тут адбілася прыналежнасьць аўтараў да старой школы навуковага камунізму зь ягонай “навуковай ідэалёгіяй”. Менавіта ў выніку свайго навуковага, ці квазінавуковага характару яна не была дастаткова гнуткай, каб вагацца ў адпаведнасьці з палітычнай лініяй адміністрацыі.

На адрас стваральнікаў канцэпцыяў (у тым ліку і сп. Слукі) кідалі абвінавачаньні і ў адарванасьці ад сапраўднай палітычнай барацьбы. Створаны імі канструкт быў прыдатны для выкарыстоўваньня ўва ўмовах закрытага грамадзтва і кансалідаванага аўтарытарнага рэжыму, але не прыстасаваны для ўжываньня ў палітычнай барацьбе, не вытрымліваў канкурэнцыі з традыцыйнымі ідэалёгіямі, імпартаванымі з Захаду (гаворка ідзе не пра імпарт цэльных ідэалягічных канструктаў, а пра рэцэпцыю асобных элемэнтаў заходняга ладу жыцьця, які пашырае свой уплыў пакрысе, але няўхільна). Сапраўды, ну як можна ганьбіць “загніваючы Захад” ува ўмовах адносна празрыстых межаў?
Спроба выпрацоўваць нацыянальную ідэю сіламі навукоўцаў паказала толькі тое, што нацыянальную ідэю немагчыма стварыць у кабінэтах. Нацыянальную ідэю стварае натоўп на вуліцы альбо… харызматычны лідэр, які прамаўляе перад натоўпам, адчувае ягоную “энэргетыку” і плыве на хвалях калектыўнага несьвядомага. Тады ідэалёгія адпавядае бягучым палітычным мэтам уладаў і дакладна адлюстроўвае пераканаьні ўладных элітаў. І таму ідэалягічнымі дактрынамі

беларускай дзяржавы сталіся не дапаможнікі па правядзеньні палітінфармацыяў, а сэлектарныя нарады і прамовы кіраўніка дзяржавы перад рознымі аўдыторыямі. Менавіта ў цытатах з гэтых прамоваў (безьліч якіх раскідана па гумарыстычных Інтэрнэт-сайтах) зьмешчана сапраўднае ідэалягічнае крэда беларускага рэжыму. Какетлівыя выказваньні “дзяржаўных” палітолягаў (якія і цяпер працуюць над падручнікамі па ідэалёгіі), нібыта падмуркам беларускай ідэалёгіі ёсьць Канстытуцыя, выклікаюць усьмешку. Словы прэзыдэнта — вось адзіная аснова ідэалёгіі. Існаму рэжыму была патрэбная не навуковая ідэалёгія, а сродак для прамыўкі мазгоў народу. У ідэалёгіі яго цікавіць перш за ўсё прапагандысцкі складнік.

2

У мінулыя гады пытаньні ідэалёгіі таксама закраналіся ў прамовах першай асобы дзяржавы, але не былі акцэнтаваныя як асобная тэма. У 2003 годзе прэзыдэнт быў вымушаны заняцца ідэалёгіяй асабіста, прычым у вельмі складаных умовах. На розных кірунках скарачаецца база для легітымацыі: міжнародная сытуацыя, як заўжды, складаная, электаральная падтрымка марудна, але няўхільна скарачаецца, і нават раней надзейная “расейская карта” больш не выглядае джокерам у прэзыдэнцкай калодзе. Адкрытая пэрсаніфікацыя дзяржаўнае ўлады, аўтакратыя і курс на адасабленьне Беларусі ад міжнароднай супольнасьці — вось “сёньня” беларускай ідэалёгіі. Адным з найбольш яскравых прыкладаў (і адначасова своеасаблівым катэхізысам) сучаснай *дзяржаўнай* ідэалёгіі сталася прамова А. Лукашэнкі на сэмінары кіраўнічых работнікаў.

Гэты даклад складаецца зь дзьвюх частак — “матэрыяльнай” і “працэсуальнай”. Першая ўяўляе сабою характарыстыку зьместу беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі, яе асноўных складнікаў. Другая прысьвечаная працэсуальнаму складніку гэтай ідэалёгіі, характарызуе сыстэму ідэалягічнай працы. І калі першая — даволі акадэмічная зьместам і формаю лекцыя, дык другая — узьнёслая прамова ў традыцыйным (і пасьпяховым) для Лукашэнкі стылі, напоўненая шматлікімі прыкладамі і адступленьнямі.

Каб зразумець, што ж зьмянілася ў ідэалягічнай рэчаіснасьці Беларусі, коратка адзначым асноўныя тэзы, якія зьмяшчае гэты

даклад. Перш за ўсё кідаецца ў вочы тое, што манаполія на дзяржаўную ідэалёгію цяпер ужо зусім не прыхоўваецца.
У якасьці прыкладу прымаецца савецкая мадэль ідэалягізаванага грамадзтва, гаворкі пра плюралізм думак у дзяржаўным апараце і быць ня можа. Даецца ўстаноўка, што манаполія дзяржаўнай ідэалёгіі — неабходны атрыбут любой дзяржавы ўва ўсе часы. І, маўляў, ідэалягізаванасьць заходніх грамадзтваў пераўзыходзіць нават савецкую практыку.
Хоць прэзыдэнт пераконвае, што гэткая ідэалёгія ствараецца не пад пэрсаналіі (“не пад мяне” — кажа ён), паводле ўласнага ж прызнаньня, яго перадвыбарная праграма 1994 году стала, “па сутнасьці, першым маніфэстам беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі”, які, маўляў, заклаў будучыя асновы нашага грамадзтва.
Характарызуючы месца свайго ідэалягічнага канструкту ў схеме традыцыйных ідэалёгіяў, А.Лукашэнка дэманструе спакойнае стаўленьне да марксісцкай і кансэрватыўнай ідэалёгій. Пры гэтым марксізм успрымаецца як ідэалёгія сацыяльнай справядлівасьці і роўнасьці, калектывізму і патрыятызму. Блізкасьць беларусам кансэрватыўнай ідэалёгіі А.Лукашэнка тлумачыць “памяркоўнасьцю” і “талерантнасьцю”, якія ўспрымаюцца як аксіёма.

Больш складанае стаўленьне А. Лукашэнкі да лібэральнай ідэалёгіі — агрэсіўнай, паводле ягоных словаў, ідэалёгіі сацыяльнае няроўнасьці людзей, ідэалёгіі нажывы, бездухоўнасьці й індывідуалізму. Пэўныя яе элемэнты ўспрымаюцца, але адначасова выказваецца нелюбоў да лібэралізму “гаспадароў сьвету” — англа-амэрыканцаў і заходняй цывілізацыі ўвогуле, якія праводзяць “лібэральны тэрор”.
Для гэтага варыянту нацыянальнай ідэалёгіі характэрныя эклектычнасьць і запазычаньні зь іншых ідэалягічных сыстэмаў. Адначасова аўтар апэлюе да “глебы”, адзначае неабходнасьць грунтавацца на ўласнай культурнай традыцыі, на “сваім падмурку”, пад якім разумеецца перадусім “рускае” — гэта значыць усходнеславянскае, і на “традыцыйных для нашай цывілізацыі каштоўнасьцях”, перш за ўсё калектывізьме. Пазначаны й мэханізм пашырэньня гэтай мадэлі сьветапогляду. Ён заключаецца ў сыстэмнай ідэалягічнай рабоце (рабоце, а не

барацьбе!). Вялікая роля надаецца Беларускай праваслаўнай царкве, якая мусіць быць уключаная ў забесьпячэньне ідэалягічнай функцыі дзяржавы. У астатнім аўтар арыентуецца на савецкую ідэалягічную сыстэму, якую ён прапануе сумясьціць з свабодай слова, свабодай друку і вольнага абмену інфармацыяй. Як гэта можна зрабіць, на жаль, не ўдакладняецца.

У цяпершняй лукашэнкаўскай ідэалёгіі ёсьць шмат супольнага з ідэямі "новых правых". Нельга сказаць, што цень Алена дэ Бэнуа залунаў над Беларусяй, але некаторыя моманты прэзыдэнцкай ідэалягічнай дактрыны нагадваюць папулісцкія тэзы Жан-Мары Лё Пэна. Подых нацыяналізму ў афіцыйнай ідэалягічнай дактрыне можа быць патлумачаны простым ахаладжэньнем адносінаў з Расеяй. Назіральнікі канстатуюць гэтую тэндэнцыю зь лета 2002 году, і нам падаецца, што яна зьяўляецца аб'ектыўна дэтэрмінаванай і доўгатэрміновай. Натуральна, шмат у чым тут грае ролю фактар асабістых зносінаў зь лідэрам усходняга суседа, але ўсё ж такі аўтарытарны рэжым заўжды мае цягу да аўтаркіі, як эканамічнай, так і палітычнай. Лёзунг "Купляйце беларускае!" набыў палітычную афарбоўку. Цяпер беларусам прапануюць замест "саюзнай дзяржавы" купляць іншы папулісцкі тавар — эклектычны нацыяналізм айчыннай вытворчасьці.

Навукоўцам даручана пашыраць і разгортваць агучаную з высокай трыбуны канцэпцыю. Цэлыя навуковыя калектывы ўжо распачалі пісаньне падручнікаў беларускай ідэалёгіі. Ходзяць чуткі, што ў хуткім часе ўва ўсіх вышэйшых навучальных установах курс "паліталёгія" будзе заменены на курс "беларуская ідэалёгія".

3

Што ж могуць прапанаваць незалежныя інтэлектуалы ў якасьці альтэрнатывы навастворанаму ідэалягічнаму монстру? Гэтак званая апазыцыйная думка ня высунула цэльнага ідэалягічнага праекту. Яна займаецца пераважна аналізам афіцыйнай ідэалягічнай дактрыны. Таксама гэтая тэматыка ўзгадвалася ў публікацыях на старонках часопісаў "ARCHE", "Адкрытае грамадства", у "Аналітычным бюлетэні беларускіх фабрык думкі". На жаль, як палітычны праект "апазыцыйная ідэалёгія" ня склалася.

На гэтым тле невялічкая кніжка Сьвятланы Крупнік і Ўладзімера Мацкевіча, выдадзеная мізэрным накладам, зьяўляецца маленькім, але элегантным траянскім конікам. Ня ставячы перад сабой амбіцыйных мэтаў, дасьледуючы пытаньні функцыянальнай пісьменнасьці (факталягічны матэрыял, няхай сабе і сабраны ў 1999 годзе, надзвычай багаты), аўтары будуюць схемы разьвіцьця беларускай адукацыі, зьвязваючы яго з пытаньнямі разьвіцьця грамадзтва.

Мацкевіч і Крупнік не прапануюць простага праекту альтэрнатыўнай ідэалёгіі — яны нават не дэкляруюць падобнай мэты. Аўтары толькі канстатуюць, што беларусам бракуе функцыянальнай пісьменнасьці. Іначай кажучы, беларускі грамадзянін можа напісаць ліст, але ня можа напісаць яго па-ангельску і адправіць яго электроннай поштаю. Такі аналіз лягічна падводзіць да высновы, што нармальнае разьвіцьцё нашае краіны немагчымае безь пераадоленьня функцыянальнай непісьменнасьці. Паскораная мадэрнізацыя прывяла да таго, што Беларусь ажыцьцявіла індустрыялізацыю, але яшчэ не пражыла веку асьветніцтва. Да 1991 году кожны беларус (як і кожны жыхар Савецкага Саюзу) мог лічыцца пісьменным у межах сярэдняга набору жыцьцёвых становішчаў. Тэрытарыяльная і міграцыйная абмежаванасьць, ізаляванасьць інфармацыйнай прасторы, нізкая прафэсійная дынаміка абумоўлівалі статычнасьць жыцьця. Беларусь проста не валодала дастатковым чалавечым патэнцыялам для ажыцьцяўленьня пераменаў. Пасьля 1991 году вольны рынак працы і элемэнты рынкавай эканомікі, кампутарызацыя і пашырэньне інфармацыйных плыняў, падарожжы за мяжу і зьвязаныя зь імі шокі ад уласнай бездапаможнасьці — усё гэта выклікала пачуцьцё фрустрацыі.

Закансэрваваныя ў савецкім хранастазісе, беларусы не навучыліся прыстасоўвацца да інавацыяў. Гэта не магло не закрануць і палітычнай сфэры, бо інавацыі тут былі найбольш радыкальнымі, яны папросту шакавалі. Нам цяжка даюцца перамены, таму на выбарах 1994 году мы і прагаласавалі супраць пераменаў. Але ў глябалізаваным сьвеце немагчымае існаваньне анкляву традыцыйнасьці ў асобна ўзятай краіне. Спробы пабудаваць новую жалезную заслону асуджаныя на фіяска. Таму мэтай для беларускага грамадзтва мусіць быць, разам з нарошчваньнем ВУП і дабрабыту, павышэньне

пісьменнасьці насельніцтва на новым узроўні. Веданьне моваў і кампутараў, здольнасьць арыентавацца ў фінансах і праве, экалягічная сьвядомасьць і, зразумела, грамадзянская культура — вось тое, што можа вывесьці Беларусь з крызысу. Як цяпер непісьменнасьць чыноўніка, палітыка, выбарца суіснуюць у адзіным полі, так і фармаваньне пісьменнага грамадзяніна краіны створыць новую сытуацыю, у якой ня будзе месца патэрналісцкай дыктатуры.

Якім чынам сфармаваць новую функцыянальную пісьменнасьць? Аўтары не даюць адназначнага адказу. Гэты працэс такі ж складаны, як і працэс фармаваньня грамадзянскай супольнасьці. Сучасную грамадзянскую пісьменнасьць фармуюць і недзяржаўныя навучальныя ўстановы, і незалежныя СМІ, і адукацыйныя праграмы няўрадавых арганізацыяў. Да таго ж, у гэтай сфэры працуе эфэкт мультыплікатару: чым больш людзей робяцца функцыянальна пісьменнымі, тым лягчэй гэты працэс ідзе далей. Функцыянальная пісьменнасьць — гэта ня “рэч-у-сабе”, а “рэч-для”.
У сучаснай афіцыйнай ідэалягічнай дактрыне таксама адзначаецца, што адукацыя ёсьць прыярытэтным кірункам дзеяньняў дзяржавы, але гэта ня зьвязваецца з функцыянальнай пісьменнасьцю. Уладам не патрэбныя функцыянальна пісьменныя асобы — незалежныя, непадкантрольныя і таму патэнцыйна небясьпечныя. Дзяржава зацікаўленая ў адукацыі, але не ў пісьменнасьці. Нездарма ж мы маем Міністэрства адукацыі, але не Міністэрства асьветы.
Кніжка Крупнік і Мацкевіча — гэта яшчэ не падручнік ідэалёгіі, але ўжо дапаможнік для тых, хто зьбіраецца распрацоўваць альтэрнатыву лукашэнкаўскай ідэалёгіі. Аўтары зрабілі базу, безь якой ня можа пачацца распрацоўка палітычнай ідэалёгіі: яны вызначылі патрэбу. Пераможная выбарчая кампанія пачынаецца з вызначэньня патрэбаў выбарца. Калі патрэба вызначаная, можна прапанаваць выбарцу тое, што яму патрэбнае. Прапануем патрэбнае — ён за нас галасуе, мы перамагаем — гэтак функцыянуе палітычнае жыцьцё, калі разглядаць яго як рацыянальны працэс, як гандаль на палітычным полі. Гэтак і выбар ідэалёгіі заўжды ёсьць выбар між уяўным і рэальным, між ілюзорнымі і сапраўднымі

патрэбамі.
Афіцыйныя навуковыя інстытуцыі будуць і далей пашыраць агучаную Лукашэнкам канцэпцыю, распрацоўваць на яе падставе цэлыя дасьледніцкія праграмы і праекты. Кніга “Белорусская модель развития: механизм реализации” (Е.Матусевіч, Н.Шаўцоў, Г.Пашкоўскі і інш., Менск, Інстытут сацыяльных і палітычных дасьледаваньняў, 2003, 168 с.), напрыклад, на аналізе працы ідэалягічнай вэртыкалі разьвівае цэлую канцэпцыю эфэктыўнай прэзыдэнцкай улады, пабудаванай вакол моцнага лідэра. Варта адзначыць практычную накіраванасьць выданьня — нарэшце тэарэтыкі ідэалёгіі беларускай дзяржавы павяртаюцца тварам да практыкі ідэалягічнай працы. Але кожнаму, хто параўноўвае падобныя выданьні з манаграфіяй Крупнік і Мацкевіча, становіцца зразумела, што праца афіцыёзных ідэолягаў непазьбежна нагадвае сярэднявечную схалястыку, кшталту дыскусіяў на тэму Раю і Пекла. Камусьці гэтыя дыскусіі пададуцца прадуктыўнымі, але практычная рэалізацыя выпрацаваных у іх ідэалягічных праектаў выклікае вялікі сумнеў.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Новы паліталягічны часопіс
Круглы стол

***23** красавіка ў Беларускім ПЭН-Цэнтры адбыўся круглы стол з нагоды выхаду другога нумару новага часопісу **“Палітычная сфера”**. Часопіс прадстаўлялі аўтары і сябры рэдакцыі выданьня — асьпіранты катэдры паліталёгіі БДУ Андрэй Казакевіч, Юры Чавусаў, Таціяна Чуліцкая і магістрант тае ж катэдры Андрэй Ягораў, а таксама студэнтка аддзяленьня паліталёгіі БДУ Наталька Базылевіч. У імпрэзе, апроч таго, узялі ўдзел філёзаф Ігар Бабкоў, эканаміст Міхал Залескі, рэдактары газэтаў “Навінкі” і “Наша Ніва” Паўлюк Канавальчык ды Андрэй Дынько, рэдактар часопісу “ARCHE” Валер Булгакаў, палітолягі Ніна Антановіч і Юрась Ліхтаровіч, гісторык Ігар Лялькоў, студэнты й асьпіранты менскіх унівэрсытэтаў.*

Андрэй Казакевіч: Сама ідэя часопісу зьявілася ў канцы 2001 году ў асяродзьдзі студэнтаў аддзяленьня паліталёгіі юрыдычнага факультэту БДУ. Першы нумар выйшаў на пачатку 2002 году. Праз пэўныя арганізацыйныя і іншыя складанасьці ягоны наклад быў больш чым абмежаваны (15 асобнікаў), таму ён шырока не анансаваўся, а распаўсюджваўся пераважна ў электронным выглядзе. Досьвед першага нумару быў адначасова і нэгатыўны, і пазытыўны. Летась адбыліся пэўныя зьмены ў рэдакцыі, а таксама большая ўвага была зьвернутая на інфармацыю. Большасьць з тых, хто быў тады студэнтам,

сталі асьпірантамі, і мы можам казаць, што рэдакцыя атрымала акадэмічную спэцыялізацыю.
Раней ставілася пытаньне: “Ці будзе гэта грамадзка-палітычны часопіс? Будзе ён надаваць увагу бягучым падзеям ці станецца навуковым акадэмічным выданьнем?” Усе гэтыя спрэчкі скончыліся тым, што вырашылі выдаваць навуковы (ці пераважна навуковы) часопіс. У ім будзе адлюстроўвацца ўсё, што тычыцца непасрэдна грамадзтва (нейкія апэратыўныя падзеі). Але дзеля гэтага ня варта ахвяраваць навуковымі дасьледаваньнямі. Тыя самыя патрабаваньні мы ставім перад артыкуламі: яны не павінны быць ані папулісцкімі, ані ідэалягічнымі, а найперш навуковымі.
Часопіс пакуль не зарэгістраваны, і яго можна абазначыць як якасны, але пакуль што “самвыдаў”. Рэгістрацыя будзе магчымай у тым выпадку, калі яна не запатрабуе зьмены фармату альбо нечага, што будзе перашкаджаць нашай незалежнасьці ў спробе стварыць адрозную ад іншых рынкаў (як палітычных, так і культурных) плятформу мысьленьня. Галоўным прынцыпам гэтага выданьня (апрача таго, што яно зьяўляецца навуковым) ёсьць ягоная міждысцыплінарнасьць. Плянуецца, што яно ня будзе прысьвячацца толькі адной пэўнай дысцыпліне — паліталёгіі альбо сацыялёгіі. Часопіс будзе прысьвячацца дасьледаваньню палітыкі ўвогуле, без абмежаваньняў. Што тычыцца мовы, дык мы вырашылі, што выкарыстаньне дзьвюх моваў больш адпавядае стану акадэмічнай (і ня толькі) супольнасьці. І нягледзячы на тое, што ў абодвух нумарах дамінуюць тэксты на беларускай мове, ёсьць артыкулы і па-расейску. Мы лічым, што гэта ня толькі не перашкаджае, але ёсьць і дадатковым стымулам для пашырэньня часопісу альбо для актуалізацыі пэўнае веды.
Апошні прынцып — прынцып інтэрытарыяльнасьці, альбо самастойнага мысьленьня. Мы спрабавалі (і будзем рабіць гэта надалей) не займацца тым, чым займаецца большая частка беларускай акадэмічнай палітычнай навукі: быць лістком навінаў пра тое, што напісалі ў Бэрліне, Нью-Ёрку, Лёндане альбо Маскве. Гэта тычыцца рэцэпцыі кожнага тэксту або кожнага палітычнага факту — зыходзіць з нашага канкрэтнага кантэксту. Рэцэпцыя мусіць быць самастойнай, бяз гэтага яна папросту губляе сэнс навуковае веды.

Тацяна Чуліцкая: У Беларусі можна казаць пра наяўнасьць двух відаў палітычнай навукі. Першы — унівэрсытэцкая палітычная навука, якая разьвіваецца ўва ўнівэрсытэтах на катэдрах паліталёгіі, на сэмінарах, у летніх школах. Але менавіта гэтая навука не залежыць ад самой супольнасьці, яна толькі папулярызуе веды альбо, у найлепшым выпадку, крытычна асэнсоўвае веды, напрацаваныя кімсьці іншым — у прыватнасьці, альбо расейскай, альбо сусьветнай паліталёгіяй. Што тычыцца другога тыпу, дык яго можна назваць альтэрнатыўнай палітычнай навукай. Гэта дасьледаваньні, якія ідуць уразрэз з паўсталай акадэмічнай традыцыяй. Гэта прыклады крытычнага арыгінальнага мысьленьня над праблемамі, актуальнымі для Беларусі, там прапаноўваецца свая мэтадалёгія дасьледаваньня. Разьвіцьцё менавіта гэтага другога тыпу надзвычай важнае для Беларусі. Гэтай “альтэрнатыўнай навукай” займаецца пэўнае кола людзей, але казаць, што гэта спэцыялізаваная навуковая супольнасьць, відаць, яшчэ рана. Стварэньне нашага часопісу (своеасаблівага інстытуту) будзе спрыяць разьвіцьцю і наданьню больш пэўных формаў гэтай альтэрнатыўнай палітычнай навуцы і альтэрнатыўнай паліталягічнай супольнасьці.

А.К.: Акрамя таго, у Беларусі існуе супольнасьць палітычных дасьледнікаў. І праз тое, што камунікацыя ў гэтай супольнасьці вельмі абмежаваная і разьбітая на сэктары, існуе вялікая праблема аб’екту палітычнага дасьледаваньня. Асабліва гэта тычыцца акадэмічнае палітычнае навукі, для якой Беларусь калі і становіцца аб’ектам дасьледаваньня, дык толькі ўскосным. А наагул гэта вельмі непапулярны аб’ект дасьледаваньня дзеля яго цяжкасьці і вялікай каньюнктурнасьці.

Наталька Базылевіч: Пры напісаньні навуковых працаў ёсьць такі прынцып: трэці, ці чацьверты, ці пяты разьдзел павінен прысьвячацца Беларусі. Чаму толькі трэці, чацьверты ці пяты, калі Беларусь ёсьць галоўным аб’ектам дасьледаваньня беларускага палітоляга? Беларускі палітоляг ня можа пазбыцца рэчаіснасьці, у якой ён жыве. А жыве ён у Беларусі, і Беларусь таксама знаходзіцца ў ім. Для яго гэта мысьленчая дадзенасьць. Усялякае дасьледаваньне павінна мець наўвеце, што Беларусь ёсьць. Нават мэтадалягічнае дасьледаваньне павінна тычыцца гэтага аб’екту. Сам аб’ект павінен быць

значным, і дасьледнік павінен быць неабыякавым да гэтага аб'екту. Гэта не суб'ектывізм, а неабходная ўмова таго, каб дасьледаваньне мела сэнс. Зь зьяўленьнем нашага часопісу мы спрабуем павярнуць палітычную навуку да аб'екту ейнага непасрэднага дасьледаваньня. Кожная краіна мае сваю палітычную навуку: не бывае нейкай унівэрсальнай палітычнай навукі, хіба што ў мэтадалягічным сэнсе. Непасрэдна ж дасьледаваньні рэчаіснасьці, якія маюць сэнс і значэньне, могуць весьціся толькі праз прызму Беларусі — для Беларусі і ўва ўмовах Беларусі.

А.К.: Акрамя таго, што Беларусь як аб'ект становіць вялікую праблему для дасьледаваньня, існуе вялікая праблема атрыманьня нейкай эмпірычнай інфармацыі пра палітычную сфэру гэтага аб'екту. Гэта зьвязана і з традыцыяй разьвіцьця беларускай навукі, і з пэўнымі структурамі дзяржапарату, і ўвогуле з палітычнай ды адміністрацыйнай традыцыяй.

Андрэй Ягораў: Адзін з водгукаў на нашае выданьне гучаў так: "Аўтарам вельмі хацелася, каб у Беларусі зьявіўся разумны паліталягічны часопіс". Прыкметай такога разумнага часопісу, напэўна, ёсьць прысутнасьць эмпірычных дасьледаваньняў. У нашым часопісе наяўнасьць гэтых дасьледаваньняў сутыкаецца з праблемнасьцю набыцьця такіх ведаў ува ўмовах Беларусі. Зьвязана гэта зь некалькімі фактарамі, і адзін зь іх — гэта зьмястоўная інфраструктура здабычы такіх зьвестак. Другі — высокія кошты дадзеных для навукоўца і дасьледніка нефармальнага кірунку. Акрамя таго, гэтыя зьвесткі ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, што існуе ў Беларусі, у пэўных сфэрах закрытыя. Такія эмпірычныя дадзеныя, калі мы здольныя знайсьці іх, часам не адпавядаюць навуковым стандартам праз тое, што ня маюць дастатковай навуковай валіднасьці і не адпавядаюць рэаліям разьвіцьця беларускай палітычнай супольнасьці. Шлях пераадоленьня гэтай сытуацыі — гэта кантэкстуальнае вывучэньне ўсіх існых крыніцаў палітычнае інфармацыі.

А.К.: Акрамя непасрэдна ідэалягічных праблемаў, палітоляг мае вялікую праблему пры вызначэньні сваёй пазыцыі як навукоўца ў рэальным сацыяльным асяродзьдзі, і асабліва — калі ён тым ці іншым чынам зьвязаны зь нейкай палітычнай дзейнасьцю. Гэта нармальна, калі палітоляг так ці інакш

ангажаваны ў палітычную сфэру. Але ён павінен вельмі добра заўважаць мяжу, цераз якую ён ня можа пераходзіць. Пераход яе азначае разбурэньне яго як навукоўца і разбурэньне ягонага крытычнага мысьленьня.

Юры Чавусаў: Праблема, якая непазьбежна паўстае перад выданьнем, што прэтэндуе на аналіз палітычнай рэчаіснасьці, — суадносіны паміж навуковым поглядам і поглядам, які грунтуецца на ідэалёгіі. Пры зьяўленьні нашага часопісу і сярод рэдакцыйнай рады былі дыскусіі, і звонку: маўляў, часопіс добры, але ў некаторых матэрыялах адчуваецца ідэалягічная скіраванасьць. У Беларусі ў сёньняшніх умовах кожная згадка палітыкі робіцца прыкметай нейкага ідэалягічнага стану. Ёсьць ідэалёгія дзяржаўная, ёсьць апазыцыйная. Сапраўдны дасьледнік, натуральна, жыве ў ідэалягічнай беларускай прасторы, але, хоць і ня можа пазбавіцца ад яе, ён мусіць імкнуцца дасьледаваць яе непрадузята: грунтавацца не на нейкіх ідэалягічных штампах, а на навуковых (перш за ўсё філязофскіх) мэтадалягічных падмурках. Прынцыпам нашага выданьня будзе непрадузятае дасьледаваньне: калі ў нашым часопісе зьяўляюцца тэксты, якія маюць дакладную ідэалягічную скіраванасьць, дык толькі ў якасьці эмпірычнага матэрыялу, які мы мусім ужо другасна аналізаваць. Калі, напрыклад, заўтра ў нашым часопісе зьявіцца ідэалягічная прамова прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі на сходзе ідэалягічных работнікаў, яна будзе не маніфэстам рэдакцыйнай рады, а матэрыялам для дасьледаваньня. Гэта надзвычай цікавы матэрыял для дасьледаваньня! Такія матэрыялы былі і ў першых нумарах нашага часопісу, і будуць надалей.

А.К.: Яшчэ хацелася б сказаць некалькі словаў пра свабоду і пра тое, што яна можа значыць для дасьледніка. На нашу думку, дасьледнік мае свабоду быць. Ён ня мае свабоды выбару, свабоды адмовы, ня мае свабоды быць іншым альбо быць нікім. Перш за ўсё — свабода быць дасьледнікам і фармаваць сваё мысьленьне ў пэўныя структуры.

Пытаньне з залі: А ці варта рэгістравацца? Можа, лепей заставацца незарэгістраваным выданьнем? Навошта губляць час?

А.К.: Зарэгістраванае выданьне можа зрабіцца рэцэнзаваным, а рэцэнзаванае — інстытуцыялізаваным. Гэта выхад на значна

большую аўдыторыю. Незарэгістраванае выданьне цяжэй распаўсюджваць, цяжэй прэзэнтаваць, яно мае менш даверу ў людзей, якія цябе ня ведаюць ці прынамсі ня чулі пра цябе. Рэгістрацыя ж дазваляе і павысіць якасьць выданьня, бо да яго будзе прыходзіць больш шырокае кола аўтараў, яго будуць больш заўважаць і крытыкаваць. Чым больш крытыкі, тым лепш можна рабіць. Спадзяюся, наступны нумар у нас будзе ўжо зарэгістраваным.

Валер Булгакаў: Уся рэдакцыя мае тое ці іншае дачыненьне да практычнай акадэмічнай паліталёгіі. А чые яшчэ ўплывы вы зазналі падчас свайго сталеньня?

Н.Б.: Мяне натхніў шэраг сэмінараў, дзе мне пашчасьціла пазнаёміцца з такімі палітолягамі, як Уладзімер Мацкевіч, Уладзімер Роўда. У далейшай сваёй працы я арыентавалася на гэтых двух палітолягаў.

А.Я.: Я таксама адчуваў уплыў У.Мацкевіча празь ягоныя сэмінары. Гэтаксама, як і Андрэй Казакевіч, я скончыў Беларускі калегіюм, дзе на сэмінарах Ігара Бабкова мы мелі дачыненьне зь беларускім дыскурсам.

Ю.Ч.: Маё сталеньне як палітоляга адбывалася пад уплывам нашай катэдры паліталёгіі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Але таксама зазнаў уплыў У.Мацкевіча і ўдзельнічаў у ягоных сэмінарах, у сэмінарах І.Бабкова.

А.К.: У мяне найперш трэба згадаць катэдру паліталёгіі. Але падчас навучаньня на ёй (прынамсі, пасьля першага курсу) мы адчувалі сябе не палітолягамі, а юрыстамі. І тое, што тычылася паліталёгіі, было адведзена ў практыкі асабістых кантактаў, у нейкія гурткі. Для гэтага часу было характэрнае адмаўленьне таго, з чым мы сутыкаліся на катэдры: мы, напрыклад, не любілі Вэбэра, таму што яго вельмі любілі на катэдры. Нашым прарокам быў Бурд'ё. Сёньня гэта ўжо ня так сур'ёзна. Значны ўплыў у студэнцкія гады — постмадэрнізм, постструктуралізм і г. д. Беларускі кантэкст быў атрыманы за кошт Калегіюму і "Фрагмэнтаў" — як самога выданьня, так і ягонага галоўнага рэдактара.

В.Б.: Хочам мы таго ці не, але рэальны рынак альтэрнатыўных палітычных дасьледаваньняў параўнальна даўно склаўся. Там разьмеркаваныя часам нават дасьледчыя тэмы, ёсьць пэўныя калектывы, інстытуцыянальныя структуры, якія не адзін год

працуюць у гэтым рэчышчы. У адрозьненьне ад адукацыйнай навукі рынак у паліталягічным сэктары існуе: ёсьць аналітычныя службы кшталту той, якую ўзначальвае сп. Роўда, і г.д. Хто ў недзяржаўным сэктары займаецца дасьледаваньнямі жыльлёва-камунальнай гаспадаркі? Ніхто. А ў паліталягічнай сфэры пазыцыі засьведчаныя. Ці бераце вы гэты фактар пад увагу? Ёсьць спакуса ўспрымаць сытуацыю як tabula rasa, але ж пэўныя фігуры на гэтай шахматнай дошцы ўжо ёсьць.

А.К.: Ёсьць розьніца паміж акадэмічнымі палітычнымі дасьледаваньнямі і дзяржаўнай паліталёгіяй, зьвязанай з такімі інстытуцыямі, як ІСПД пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Там іншыя і правілы паводзінаў, і нормы, паводле якіх яны дзейнічаюць.

Цяпер што да таго, быццам нешта ўжо ёсьць… Для кожнага студэнта, які навучаецца на аддзяленьні паліталёгіі, зразумела, што нічога няма. Калі мы будзем браць НІСЭПД, дзе бюлетэнь на дзьве траціны складаецца з аналізу сацыялягічнага дасьледаваньня, дык гэты аналіз яшчэ ня ёсьць сацыялёгіяй. Сацыялёгія пачынаецца, калі робіцца надэмпірычнае сацыялягічнае дасьледаваньне. Калі мы будзем казаць пра спсп. Роўду ці Чарнова, то гэта альбо адукацыйная рэч (ёсьць апісаньне таго, што такое левыя і правыя, але няма актуальнага палітычнага дасьледаваньня), альбо яно выходзіць у фармаце грамадзка-палітычных выданьняў кшталту “Грамадзянскай ініцыятывы” ці “Адкрытага грамадзтва”. Гэта выданьні, разьлічаныя не на палітычныя дасьледаваньні як гэткія, а прызначаныя для палітыкаў альбо для людзей, блізкіх да палітыкі. Іхная галоўная аўдыторыя не навукоўцы, бо навукоўцы могуць выкарыстоўваць гэтыя тэксты толькі як аб’ект ці як крыніцу дадатковай інфармацыі, а не як тое, што дасягае нармальных стандартаў навуковых дасьледаваньняў. Я ня ведаю, наколькі шырокі і наколькі магчымы рынак навуковай паліталягічнай прадукцыі ў Беларусі, але тое, што ён не заняты, — гэта факт рэчаіснасьці. Казаць пра канкурэнцыю “Палітычнай сферы” з выданьнем кшталту “Грамадзянскай ініцыятывы” ці “Адкрытага грамадзтва” бессэнсоўна, бо яны ня ёсьць канкурэнтамі, гэта зусім розныя канструкцыі па сваім спажыўцу. Я ўжо не кажу пра НІСЭПД, бо там проста апрацоўваюць лічбы.

Ю.Ч.: Гэтыя інстытуцыі нам сапраўды не канкурэнты, бо там

працуюць людзі, якія ёсьць патэнцыйнымі аўтарамі і чытачамі нашага часопісу. Нашая мэта — ня проста аб'яднаць, зрабіць зборнік навуковых дасягненьняў незалежных дасьледчыцкіх інстытутаў, а зрабіць нешта большае.
Сапраўды, ёсьць сэктар незалежнай паліттэхналёгіі. Але было б няслушным казаць, што гэта адзіная паліталёгія, якая існуе ў краіне, — ёсьць яшчэ паліталёгія дзяржаўная: у краіне прымаюцца дзяржаўныя палітычныя рашэньні. І прымаюцца яны асэнсавана, там ёсьць элемэнт аналітыкі. Гэта таксама паліталёгія, палітычныя тэхналёгіі. Нам бы хацелася аб'яднаць гэтыя дзьве плыні, таму што і адны, і другія працуюць з адным матэрыялам — Беларусяй, хоць у іх розныя магчымасьці ў сфэры рэсурсаў. Глебай для такога навуковага яднаньня магла б стаць акадэмічная паліталёгія — навуковая веда, якая магла б быць карыснай і для апазыцыйнай паліталёгіі, і для дзяржаўнай.

Н.Б.: Кажуць, што ў Беларусі няма палітычнай практыкі. Але калі ня будзе акадэмічнай палітычнай навукі, рэфлексіі, то ня будзе і практыкі: практыка як паўнавартаснае функцыянаваньне аб'ектаў палітыкі і можа зьявіцца, толькі калі ёсьць рэфлексія.
А.К.: Хацеў бы дадаць наконт таго, якая розьніца паміж намі і недзяржаўнымі палітолягамі. Для недзяржаўнай паліталёгіі найбольш важны пэрыяд — да выбараў: вызначыць — хто, дзе, як і ўсе магчымасьці паўплываць на палітычную сытуацыю. Для нас жа самы галоўны пэрыяд — пасьля выбараў, калі ўсё зразумела і можна ўзяць сытуацыю як аб'ект, разрэзаць і паглядзець, з чаго яна складаецца.
Н.Б.: Мы ня будзем шукаць, хто вінаваты ў тым, што ў кагосьці нешта ня выйшла.
Пытаньне з залі: А чаму вы думаеце, што ваш часопіс будзе зьяўляцца і надалей? А калі ён ня будзе зарэгістраваны?
А.К.: Калі мы будзем распаўсюджваць яго накладам, ня большым за 300 асобнікаў, то можам і не рэгістраваць. Ён будзе існаваць у якасьці незарэгістраванага выданьня, якое стварае пэўную прастору ў грамадзтве для дасьледнікаў у сфэры палітыкі.
Пытаньне з залі: Якой сацыяльнай катэгорыі прызначаецца ваш часопіс? Ці будзеце вы спадзявацца на камэрцыйны

посьпех пасьля рэгістрацыі?
А.Я.: Мы разьлічваем на навуковую супольнасьць і інтэлектуалаў, якія разважаюць пра палітыку, маюць навуковы падыход да палітычных зьяваў у Беларусі. Як навуковы часопіс, гэтае выданьне будзе цікавым усёй супольнасьці, у тым ліку і той, што яшчэ толькі гадуецца: палітолягам, юрыстам, эканамістам і г.д.
А.К.: Найперш прадстаўнікам гуманітарных спэцыяльнасьцяў, якія цікавяцца палітычнымі праблемамі. Мы будзем спрабаваць стаць міждысцыплінарным выданьнем. Будзем уздымаць праблематыку сацыялёгіі, палітыкі, узаемадзеяньня палітыкі і культуры... Што да камэрцыйнасьці... Я думаю, калі мы выйдзем на “нуль” (ня ў “мінус”), дык гэта будзе добра.
В.Б.: У першым нумары вашым правапісам была “тарашкевіца”, а ў другім вядзе рэй “наркамаўка”. Гэта зьвязана з ратацыяй рэдакцыйнага калектыву ці гэта даніна модзе?
А.К.: Найперш гэта была заяўка на сацыялізацыю. Мы павінны гуляць паводле правілаў, якія існуюць у грамадзтве. Ёсьць афіцыйны правапіс — мы павінны выкарыстоўваць мову, якая ёсьць легітымнай для большасьці.
А.Я.: Пытаньне мовы вельмі важнае для нашай акадэмічнай палітычнай навукі, якая лепш успрымае афіцыйны правапіс і зарэгістраваныя выданьні. Нават слова “палітычная” выклікала спалоханасьць у акадэмічных колах.
Н.Б.: Варта сказаць і пра тое, што “тарашкевіца” дагэтуль неўнармаваная, ёсьць некалькі ейных варыянтаў. І карэктарам, напрыклад, было б вельмі цяжка працаваць з тэкстамі. Да таго ж, гэта не зусім “наркамаўка” — паводле сынтаксысу, марфалёгіі гэта “тарашкевіца”, але бязь мяккіх знакаў і некаторых асаблівасьцяў напісаньня. Мы спрабуем карыстацца добрай беларускай мовай безь некаторых небеларускіх асаблівасьцяў “наркамаўкі”.
В.Б.: Вы хочаце быць міждысцыплінарным выданьнем. Вы хочаце злучыць у сваім дасьледчым рэчышчы прадстаўнікоў розных асяродкаў, супрацоўнічаць зь дзяржавай і апазыцыяй. Ці няма тут небясьпекі праграмнага канфармізму ці нечага падобнага?
А.К.: Мы не зьбіраемся супрацоўнічаць зь дзяржаўнай і апазыцыйнай паліталёгіяй як такой — маецца на ўвазе супрацоўніцтва толькі з пэўнымі асобамі, тымі, хто можа

прадукаваць тэксты, мысьленьне. Хто яны — апазыцыя, дзяржава, — ня важна. Нашая мэта — стварыць пэўную прастору ці арганізаваць тую прастору, якая ўжо ёсьць. Стварыць прастору, аўтаномную ад рынкаў, якія сёньня ўжо існуюць. Тут няма ніякага канфармізму. Прынамсі, ступень канфармізму тут значна меншая, чым у дзяржаўнай ці недзяржаўнай паліталёгіі.
В.Б.: Ці не маглі б вы падрабязьней распавесьці пра канфармізм недзяржаўных палітолягаў, убачаны вачыма не журналіста ці работніка трэцяга сэктару, а палітоляга?
А.К.: Канфармізм праяўляецца ў іх вылучнай апазыцыйнасьці, якая ўтварае сабой пэўны штамп. Яны ня могуць аналізаваць дзеяньняў прэзыдэнта ці дзяржаўнай установы як проста дзеяньне, якое можа быць пазытыўным і нэгатыўным. Яно адразу нясе для іх пэўную нэгатыўную характарыстыку. Такая паліталёгія заідэалягізаваная: ідэалягічныя канструкты зададзеныя задоўга да таго, як чалавек пачынае аналізаваць нейкую палітычную зьяву. Канфармізм праяўляецца нават у выбары аб'ектаў дасьледаваньня. Яны разумеюць, што працягваць існаваць яны змогуць толькі тады, калі будуць задавальняць пэўныя патрэбы, зьвязаныя з палітыкай дэмакратызацыі, напрыклад, альбо з працай у трэцім сэктары. Яны павінны адпавядаць гэтым канонам, якія задаюцца ня імі самімі, а ўмовамі, у якіх яны існуюць. Таму я лічу, што гэтая паліталёгія ёсьць больш канфармісцкая, чым тое, што спрабуем стварыць мы. Магчыма, далей мы страцім тую аўтаномію, што ў нас ёсьць, але на гэтым этапе мы будзем рабіць тое, што нам хочацца і што лічым патрэбным. Мы ня маем ніякіх ідэалягічных установак, спрабуем крытычна глядзець на ўсё.

Ю.Ч.: У другім нумары якраз ёсьць матэрыял У.Мацкевіча, дзе выдатна паказана, чым адрозьніваемся мы ад інстытуцыялізаваных формаў недзяржаўнай паліталёгіі. Мы маргіналы, сярод нас няма гіерархіі, таму кожны мусіць даказваць сваёй працай, што ён мае права называцца палітолягам.
Ігар Лялькоў: Пажадана на будучыню, каб падаваліся зьвесткі пра аўтараў артыкулаў.
А.К.: Мы сьвядома не давалі такой інфармацыі ў гэтым нумары. У якасьці экспэрымэнту мы не пісалі пра тое, кім мы

ёсьць.
І.Л.: Але вы імкняцеся стаць навуковым часопісам, а канон такога выданьня якраз вымагае падаваць зьвесткі пра аўтараў.
А.К.: Мы імкнёмся да статусу навуковага часопісу, але мы не абавязаныя адпавядаць усім канонам, якія склаліся ў акадэмічнай супольнасьці. Мы выконваем тое, што лічым мэтазгодным.
Міхал Залескі: Ці гатовыя вы да скандалу? Калі вы будзеце добра працаваць, то абавязкова знойдзеце нешта цікавае.
А калі знойдзеце нешта цікавае, то будзеце моцна недаспадобы тым, хто нічога цікавага знайсьці ня можа.
А.Я.: Скандал — гэта вельмі карысна для ўсёй беларускай паліталёгіі, у якой пануе маналягічнасьць выказваньня: ты кажаш, а табе ніхто ніяк не апануе.
В.Б.: Наколькі я разумею, ваша праграма ў тым, што вы спрабуеце адыходзіць ад стэрэатыпу, моцна ўкарэненага ў беларускім грамадзтве, калі палітолягамі былі палітычныя журналісты, палітычныя камэнтатары і ўсе людзі, якія ўмела ўжываюць слова “палітыка”. Адбываецца пошук сябе ў эўрапейскім кантэксьце. Бо адрозьнівае Цэнтральную Эўропу ад постсавецкай прасторы тое, што на гэтай прасторы дастаткова выказвацца на тэмы палітыкі, каб праслынуць “палітолягам”. Тое ж самае з культуролягамі... Ці правільна я зразумеў вашую пазыцыю?
А.К.: Цалкам. Мы спрабуем вельмі выразна дыстанцыявацца ад практыкі называць палітолягамі людзей, якія ня ёсьць ні навукоўцамі, ні нават людзьмі, блізкімі да гэтай сфэры. Асабліва што тычыцца палітычнай журналістыкі. Мы рэпрэзэнтуем традыцыю, што склалася ў коле прафэсійных ці паўпрафэсійных навукоўцаў, якія займаюцца палітычнымі дасьледаваньнямі.
Н.Б.: Палітыка — такая сфэра, у якой кожны мае права выказвацца, і нікому нельга гэта забараніць. У такой сытуацыі мы нават ня маем права нікому забараніць называць сябе палітолягам. Але сапраўдная паліталёгія магчымая, толькі калі ёсьць дысцыпліна дасьледаваньня.
Ігар Бабкоў: Калі ўжо гаворка зайшла пра скандал, дык якраз мяне і ўгаворвалі зрабіць маленькі скандал, які адначасна быў бы філязофска-кансэрватыўным выступам. І нават прыдумалі назву скандальнага выступленьня — “Прастытуткі, матылькі і

палітолягі”. Выступленьне цалкам мусіла базавацца на Арыстотэлю, на ідэі прыналежнасьці да пэўнай сутнасьці. Думка вельмі простая. Ёсьць палітолягі, і для іх натуральна займацца паліталёгіяй. Паколькі для палітолягаў натуральна займацца паліталёгіяй, то ўрэшце яны выдаюць паліталягічны часопіс. Гэта здаецца поўным глупствам, банальнасьцю: для палітолягаў натуральна займацца паліталёгіяй, для матылькоў натуральна лётаць з кветкі на кветку, для прастытутак натуральна шукаць таго, хто заплаціць. Але ў апошнія 10 гадоў у беларускай сытуацыі адбылося татальнае перамяшэньне ўсіх пазыцыяў: матылькі выдавалі паліталягічныя часопісы, прастытуткі пісалі вершы, паэты шукалі сабе гаспадароў. Усё сутнасна зьмяшался. І выхад “Палітычнай сферы” — для мяне аптымістычны знак таго, што ўсё ўрэшце ўстае на свае месцы. Таму невыпадковыя для гэтага часопісу такія рэчы, як дысцыплінарнасьць і інстытуцыялізацыя. Гэта людзі, якія прафэсійна займаюцца паліталёгіяй, зьбіраюцца рэалізоўваць сваё мысьленьне: пісаць тэксты, выкладаць, ладзіць сэмінары. Таму іхная галоўная аўдыторыя — студэнты-палітолягі, выкладчыкі, іхныя калегі й г.д.

В.Б.: Вельмі сымптаматычна, што стваральнікі “Палітычнай сферы” — людзі беларускай мовы і, відаць, беларускай культуры. Існуе меркаваньне, што людзі расейскай культуры ў Беларусі задавальняюцца прадуктамі расейскай інфармацыйнай прасторы. Беларускамоўных жа “інтэлектуальных” выданьняў у Беларусі зьяўляецца апошнім часам ці ня больш, чым расейскамоўных. На маю думку, гэта тлумачыцца тым, што беларускамоўныя грамадзяне незадаволеныя наяўным status quo, пасіўным спажываньнем таго культурнага прадукту, які прапануецца расейскімі культуртрэгерамі. Ці ёсьць такая залежнасьць?

А.К.: Людзі ня толькі беларускай мовы, але і беларускай культуры значна больш увагі зьвяртаюць на Беларусь, якая для іх ёсьць праблемай. А ў расейскіх выданьнях яны ня могуць прачытаць пра гэта. Па-другое, для людзей беларускай культуры няма адчуваньня таго, што яны — правінцыялы. Гэта іншы тып палітычнай і дасьледчай культуры, які вымагае рабіць нешта, а ня толькі спажываць. Тыя, хто адчувае сябе правінцыяй, ня могуць нават уявіць, што тут патрэбна нешта ствараць. У іх праграма — зьехаць туды і там некім стаць.

І.Б.: Ня трэба “абальшчацца” ўласнай беларускамоўнасьцю і тым, што мы самыя разумныя, самыя цэнтральныя і неправінцыйныя. Традыцыя татальнага ігнараваньня расейскамоўных асяродкаў ні да чога добрага беларускую “тусоўку” не прывяла. Калі пры канцы 80-х — на пачатку 90-х быў вельмі моцны выкід тэкстаў, ідэяў і беларушчына была ў авангардзе, яна прабіла нейкі мур, празь які асьцярожна пратачыліся ўсе астатнія. На сёньня расейскамоўныя асяродкі значна абагналі беларускамоўныя інтэлектуальныя групы і суполкі, якія абсалютна стагнуюць. На жаль, беларускамоўнае мысьленьне і адпаведныя асяродкі сталіся закладнікамі палітычнае сытуацыі, калі апошнія пяць гадоў яны абслугоўваюць тактычныя мэты і задачы беларускай апазыцыі. Яны перасталі чытаць кніжкі, самастойна думаць і ацэньваць, што рэальна адбываецца ў сьвеце. Паўзь іх прайшла гуманітарная думка апошніх пяці—сямі гадоў. Гэта ўсё перакладаецца цяпер на расейскую мову, выкладаецца ў Менску ўва ўнівэрсытэтах, на гэтым абараняюцца дысэртацыі, курсавыя, дыплёмныя... Думка, што мы ўсё яшчэ “цэнтральныя”, — ілюзія. Для мяне істотна ў часопісе пазытыўнае стаўленьне: ня думка “Хто наперадзе?”, не імкненьне захапіць дыскурсіўную ўладу, а проста — зрабіць пэўныя рэчы, якія мусяць быць зробленыя.

Ю.Ч.: Мне не хацелася б, каб так дыскутавалася пытаньне мовы. Проста так склалася, што ў Беларусі артыкулы пра беларускую палітыку пішуцца па-беларуску. А па-расейску пішуцца артыкулы пра палітычную сыстэму Злучаных Штатаў.

В.Б.: Але ці ёсьць у беларускамоўных стваральнікаў такіх праектаў момант суб’ектыўнага дамешку — адчуваньне неабходнасьці такіх выданьняў для беларускай культуры? Матывацыя ня толькі дасьледніка, але і грамадзяніна?

І.Б.: Можа, так і было раней. Але на сёньня настала такая сытуацыя, калі ў нейкім патэнцыйным канфлікце паміж маёй калегай, расейскамоўнай філёзафкай, і беларускамоўным чалавекам, які пачне мне казаць: “Топос” благі, а “Фрагмэнты” харошыя”, я вазьму бок Тацяны Шчытцовай. Сёньня адбываецца паварот да сярэднявечных цэхаў. Ранейшыя матывацыі, якія былі ў беларускай сытуацыі пачатку 90-х, не працуюць. Надыходзяць новыя лініі падзелаў, якія аказваюцца больш

істотнымі: прафэсійныя супольнасьці, інстытуцыі, мысьленьне як такое... З чым гэта зьвязана? Можа быць, з тым, што мы самі зь зьдзіўленьнем выявілі: калі адбылася першасная інстытуцыялізацыя ў беларускай сытуацыі, пазыцыі занялі палітыкі. Задача палітыка — змагацца за ўладу. У гэтым сэнсе ўсе яны: беларускамоўныя, расейскамоўныя — аднолькавае г...но. І ніхто мяне не пераканае, што прафэсійны беларускамоўны палітык лепшы за расейскамоўнага філёзафа, паэта, літаратара. Надыходзяць новыя падзелы.
Але ёсьць тут і вельмі пазытыўныя моманты: паўстае прастора для новых дыялёгаў. Паўстаюць новыя межы, якія мы ўсё адно будзем пераступаць, парушаць, нешта рабіць.
В.Б.: Ніхто ня ставіць пад сумнеў, што беларускамоўныя беларусы нічым ня лепшыя за расейскамоўных беларусаў. Гаворка ішла пра тое, што нашыя расейскамоўныя калегі трошкі іначай бачаць сытуацыю, чым мы, і мы мусім сканцэнтравацца на вырашэньні іншых задачаў.
А.К.: Каб скончыць гутарку наконт таго, ці была ў нас нейкая асаблівая матывацыя апроч прагі да веды, скажу: прынамсі ў мяне ніякіх спэцыфічных памкненьняў не было. Я дапускаю, што культурай кіруе падсьвядомае, аб'ектыўнае, але для сябе я ніякіх мэтаў ня ставіў.

Занатаваў
Зьміцер Дзядзенка

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн і майстраваньне **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Тарас Кузё

Гісторыя, памяць і фармаваньне нацыяў на постсавецкай каляніяльнай прасторы

ТАРАС КУЗЁ — палітолаг, дасьледчык нацыяналізму. Нарадзіўся ў Англіі ўва ўкраіна-італійскай сям'і. Выкладае паліталёгію ў Таронцкім універсытэце. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» — эсэ «Чатыры элемэнты пераходнага перыяду (Украінскі нумар)». Артыкул друкуецца з ласкавай згоды аўтара.

Адным з вынікаў распаду СССР у сьнежні 1991 году стаўся дэкалянізацыя апошняй у сьвеце імпэрыі. Зыходзячы з гэтага, у сваім артыкуле я хацеў бы давесьці дзьве тэзы. Па-першае, палітыка імпэрскага цэнтру ў Савецкім Саюзе мела шмат супольнага з палітыкай іншых імпэрскіх дзяржаваў у дачыненьні да Ірляндыі, Азіі й Афрыкі. Па-другое, постсавецкія каляніяльныя краіны ў галіне фармаваньня нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва праводзяць прыкладна такую ж палітыку, як і іншыя посткаляніяльныя краіны, бо таксама імкнуцца пазбавіцца — часткова ці цалкам — каляніяльнай спадчыны. І тут асноўную ролю адыгрывае вызваленьне гісторыі ад стэрэатыпаў, навязаных былым імпэрскім цэнтрам, стварэньне або адраджэньне нацыянальнай гістарыяграфіі, якая б дапамагала кансалідаваць новую нацыянальную дзяржаву. Усе краіны, у тым ліку і традыцыйна прыналежныя

да “цывілізаванага Захаду”, выкарыстоўвалі і працягваюць выкарыстоўваць нацыянальную гістарыяграфію, міты, легенды як складнік нацыянальнай сьвядомасьці.
Артыкул падзяляецца на тры часткі. У першай разглядаецца савецкая імпэрская спадчына і савецкая нацыянальная палітыка ў дачыненьні да гістарыяграфіі. У другой дадзеная тэма аналізуецца ў рэчышчы тэорыі нацыяналізму і гістарычных мітаў, дасьледуецца спадчына савецкай каляніяльнай палітыкі, а таксама адраджэньне нацыянальнай гістарыяграфіі ў посткаляніяльных краінах на тэрыторыі былога СССР. У трэцяй частцы паказваецца, як чатыры зь іх — Украіна, Беларусь, Малдова і Казахстан — даюць рады каляніяльнай спадчыне. (У трох выпадках адбываецца адраджэньне нацыянальнай гістарыяграфіі як складніка фармаваньня нацыі й незалежнай дзяржавы, а ў чацьвертым — беларускім — выпадку, каб умацаваць ідэалёгію панславізму, улады падтрымліваюць расейска-савецкую гістарыяграфію. У Малдове пасьля перамогі камуністаў на парлямэнцкіх выбарах 2001 году і абраньня прэзыдэнтам камуніста Ўладзімера Вароніна адбываецца вяртаньне да савецкай гістарыяграфіі.)

Савецкая нацыянальная палітыка: роля гісторыі й памяці
СССР — каляніяльная імпэрыя
Былы СССР адпавядае азначэньню імпэрыі з дакладна акрэсьленым цэнтрам (Масква, РСФСР) і пэрыфэрыяй (усе астатнія рэспублікі). У цэнтры месьціліся дзяржаўныя ўстановы імпэрыі, якія ўзначальвала ўладная эліта, а кіраваньне на ўскраінах ажыцьцяўлялі прызначаныя дзяржавай чыноўнікі. Узаемадзеяньне між ускраінамі адбывалася толькі праз пасярэдніцтва цэнтру[1]. Майкл Дойл вызначае імпэрыю як “адносіны, пры якіх адна дзяржава фармальна ці неафармальна кантралюе палітычны сувэрэнітэт іншых дзяржаў”[2]. Падобнае азначэньне дакладна адпавядае савецкім рэаліям. Эліта, надзеленая ўладай, знаходзілася ў цэнтры, ускраіны яму падначальваліся. Мясцовая эліта кіравала ўскраінамі ад імя цэнтру. Цэнтар падпарадкоўваў сабе, кантраляваў і эксплюатаваў ускраіны, гаспадарыў над імі, выконваў ролю пасярэдніка, пераразьмяркоўваў сродкі[3].
Паноўнай ідэалёгіяй у савецкай імпэрыі быў марксізм-ленінізм і, што для нас яшчэ больш істотна, расейскі імпэрскі шавінізм

ЗАЎВАГІ:
1 Alexander J. Motyl, “Why Empires Reconsidered: Imperial Collapse and Imperial Revival in Comparative Perspective,”

Расейцаў называлі “старэйшымі братамі” ў шматнаццацігадовай савецкай дзяржаве. За савецкім часам толькі РСФСР мела рэспубліканскіх органаў кіраваньня, Расея — адзіная з пятнаццаці рэспублік — не падавалася як “радзіма” сваёй тытульнай нацыі[4]. “Радзімай” для расейцаў быў увесь Савецкі Саюз — такая палітыка наўмысна імкнулася зблытаць, злучыць у адно расейскае й савецкае самавызначэньне.

У выпадку з заходнімі імпэрыямі нацыянальныя дзяржавы ўтварыліся да заваяваньня калёніяў у іншых частках свету. Таму Ангельшчыне і Францыі было параўнальна лёгка разьвітацца з сваімі калёніямі — яны маглі вярнуцца да ўзьніклай раней за імпэрыю нацыянальнай дзяржавы. Але былі два выключэньні, калі паміж цэнтрам і пэрыфэрыяй размываліся межы, — Ірляндыя і Альжыр, дзьве калёніі, улучаныя ў адпаведна брытанскую і францускую мэтраполіі[5]. Разрыў з унутранымі калёніямі каштаваў мільёна жыцьцяў у Альжыры і крывавага канфлікту ў Ірляндыі, які і дасюль не сьціхае на тэрыторыі Ольстэру.

У 1927—1947 гадох, падчас пераходнага пэрыяду да поўнай незалежнасьці, Ірляндыя была дамініёнам, падобна ехаіных “белых” брытанскіх калёніяў (напрыклад, да Канады). Незалежная Ірляндыя страціла прамыслова разьвітыя, але неаднародны паўночны рэгіён: Ольстэр адышоў да Брытаніі. Украіна ж, наадварот, успадкавала аналягічную вобласьць — Данбас, дзе пражывае 20% яе насельніцтва. Паміж Ірляндыяй і Вялікай Брытаніяй заўсёды захоўваліся асаблівыя адносіны. Грамадзяне Ірляндыі мелі ў Вялікай Брытаніі роўныя правы з тамтэйшым насельніцтвам, маглі ўдзельнічаць у выбарах, калі атабарваліся ў Аб’яднаным Каралеўстве. Праз моцныя эканамічныя сувязі (як і ўва ўкраінска-расейскім выпадку) Ірляндыя і Вялікабрытанія захавалі шчыльныя стасункі. Калі ў 1922 годзе ўтварылася Ірляндзкая Вольная Дзяржава, 90% яе экспарту прыпадала на Аб’яднанае Каралеўства. З 1917 гадоў мінулага стагодзьдзя робяцца захады, каб зьменшыць гэтую залежнасьць ад брытанскага рынку, але і на сёньня 50% ірляндзкага экспарту йдзе ў Аб’яднанае Каралеўства. Вялікабрытанія — найбуйнейшы сярод эўрапейскіх краінаў інвэстар у ірляндзкую эканоміку. Ува Ўкраіне ўладная эліта бачыць у інвэстыцыях з Расеі патэнцыйную пагрозу нацыянальнай бясьпецы, бо такім чынам павялічваецца расейскі

[1] Comparative Politics, Vol. 31, No. 2, 1999, pp. 127—146.

[2] Michael Doyle, *Empires* (Ithaca: Cornell University Press, 1986), p. 45.

[3] Alexander J. Motyl, *Revolutions, Nations, Empires. Conceptual Limits and Theoretical Possibilities* (New York: Columbia University Press, 1999), p. 117—130.

[4] РСФСР **атрымала рэспубліканскія**

ўплыў на стратэгічна важныя галіны гаспадаркі. Аддзяленне Ірляндыі ад Аб'яднанага Каралеўства толькі крыху ўзмацніла сувязі (эканамічныя, чалавечыя, культурныя) паміж дзьвюма дзяржавамі[6].

Найбольш яскрава паралелі паміж Ірляндыяй і Ўкраінай прасочваюцца ў тым, як пераадольваецца калянізацыя і спадчына. Ірляндзкая Вольная Дзяржава, а з 1949 году Ірляндзкая Рэспубліка імкнулася адрадзіць ірляндзкую гэльскую мову, але з задумы нічога ня выйшла. Сёньня ўсяго 2% насельніцтва карыстаюцца ірляндзкай у штодзённым ужытку. Бальшыня ірляндцаў можа прымаць брытанскае радыё й тэлебачаньне. Штосьці падобнае адбываецца й ува Ўкраіне, дзе захоўвае сваю папулярнасьць расейскае тэлебачаньне.

У абодвух выпадках магутны ўплыў мовы-гегемону з суседняй краіны паглыбляе наступствы калянізацыі — англізацыю й русіфікацыю.

Аддзяленне Ірляндыі толькі ў 1990 г. пасьля абраньня Ўкраінай Расеі Барыса Ельцына.

[5] **Taras Kuzio, *Ukraine. State and Nation Building* (New York: Routledge, 1998), pp.18—21, 178—179, 231, 235.**

[6] **Anthony H.Birch, "Minority Nationalist Movements and Theories of Political Integration,"** ***World Politics*****, Vol.30, No.3, 1978, pp.341—344.**

На момант набыцьця незалежнасьці і ў Ірляндыі, і ўва Ўкраіне насельніцтву быў уласьцівы падвойны патрыятызм: ангельска-

ірляндзкі і расейска-савецкі. Англа-ірляндцы ганарыліся сваёй ірляндзкасьцю, але і не адмаўлялі сувязі з “вышэйшай” ангельскаю культурай[7]. Яны былі патрыётамі *краю*, і таксама як “расейска-савецкія” адчуваюць прывязанасьць да ўкраінскай зямлі. Аднак ці былі яны “сапраўднымі ірляндцамі”? Паколькі назваць сапраўднымі ўкраінцамі “расейска-савецкія”, калі яны не гавораць па-ўкраінску[8]? Ідэі “краёвага патрыятызму” супрацьстаўляўся этнічна-культурны канцэпт нацыі, высунуты Гэльскай Лігай у Ірляндыі і Таварыствам украінскай мовы і Рухам ува Ўкраіне. Нацыянальнае вызваленьне звязвалася з культурным нацыяналізмам, які мусіў абараніцьці ад культурнага й моўнага наступу ангельшчыны ў адным выпадку, расейшчыны — у другім. Адсюль — заклікі перакрэсьліць стагодзьдзі англізацыі ды русіфікацыі. А паколькі ўдалося ірляндзкую або ўкраінскую этнакультурную гегемонію ў Ірландыі і ўва Ўкраіне наўрад ці магчыма, то набыцьцё нацыяналізмам цывілізаваных формаў замаруджваецца — апошняе адбываецца толькі тады, калі ўладная эліта пачуваецца ўпэўнена. (Падобнае становішча і ў Крыму, Паскаў.) У Фінляндыі, Шатляндыі, Каталёніі[9] панаваньне ірляндзкай, ангельскай, каталёнскай моваў надавала ўпэўненасьці, бо яна не сутыкалася з пратэстам абураных занядбаньнем сваёй мовы і культуры. Гэта садзейнічала разьвіцьцю нацыяналізму ў больш цывілізаваным выглядзе[10].

У ірляндзка-брытанскім выпадку і дасюль не разьвязаная праблема “крыўды на калянізатара”. Ня варта спадзявацца, што ўкраінска-расейскія адносіны нармалізуюцца цягам найбліжэйшых дзесяцігодзьдзяў. Урэшце, польска-ўкраінскае замірэньне пачалося толькі пасьля 1945 году, яму спрыялі рух “Салідарнасьць” і паляк Папа Рымскі, які ў чэрвені 2001 году наведаў Украіну. Ірляндзка-ангельскія дачыненьні вельмі нагадваюць украінска-расейскія. Ірляндыя страціла, а Ўкраіна ледзь ня страціла сваю мову. Ірляндыю калянізавалі ангельцы да шатляндцы, Украіну — расейцы. І ўсе ў Ірляндыі і ўва Ўкраіне перасьледавалі каталікоў (у Ірляндыі каталікі атрымалі выбарчае права нашмат пазьней за пратэстантаў). Ірляндзкі парлямэнт распусьцілі й аб’ядналі з брытанскім. У абедзьвюх краінах адбылася асыміляцыя вышэйшых слаёў грамадзтва. І ірляндцы, і ўкраінцы зрабіліся “неіснуючымі” сялянскімі нацыямі, пазбаўленымі паноўных клясаў.

7. John Hutchinson, “Archaeology and the Irish Discovery,” *Nations and Nationalism*, Vol.7, No.4, 1991, pp.505—520.

8. Па гэтым пытаньні гл. Terence Brown, *Ireland. A Social and Cultural History, 1922—1985* (London: Fontana, 1981), pp.47, 53, 62—63, 79, 84, 92—93, 98, 107; Victor Kiernan, “The British Isles: Celts and Saxons,” у Mikulas Teich and Roy Porter, eds., *The National Question in Historical Context* (Cambridge: Cambridge University Press, 1993),

У Ірляндыі загінулі тысячы, ува Ўкраіне — мільёны. Абедзьве краіны зазналі голадамор, да якога ў Ірляндыі чыноўнікі, ува Ўкраіне ў вялікай ступені спрычыніліся ўлады. Мільёны ірляндцаў і ўкраінцаў зьехалі ў Паўночную Амэрыку, таксама (ува ўкраінскім выпадку) — у Сібір і на расейскі Далёкі Ўсход[11].

І ў Ірляндыі, і ва Ўкраіне каланізацыя спыніла рост насельніцтва, між тым як у мэтраполіях ён ішоў хуткімі тэмпамі. У 1654 годзе, калі Масковія і Казацкая Рада падпісалі Пераяслаўскую дамову, колькасьць насельніцтва абедзьвюх краінах была прыкладна аднолькавая. Сёньня ў яна ўтрая большая, чым ува Ўкраіне. Супастаўляючы Фінляндыю й Ірляндыю, Біл Кісэйн падкрэсьлівае, што ў XIX стагодзьдзі фінскае насельніцтва павялічылася ўтрая ў той час як ірляндзкае — скарацілася ўдвая. Калі б колькасьць насельніцтва ў Ірляндыі расла гэткімі ж тэмпамі, як у Фінляндыі, то на пачатак XX стагодзьдзя ірляндцаў налічвалася б 13 мільёнаў.

І ў ірляндзкім, і ўва ўкраінскім выпадках непрыязнасьць перадавалася з пакаленьня ў пакаленьне, паўплываючы на фармаваньне вобразу Іншага — зь ім яшчэ сутыкнецца гістарыяграфія, а таксама новая нацыянальная мадэрнасьць[12]. Як паказаў Эдвард Саід, з ірляндцамі на працягу стагодзьдзяў абыходзіліся як з культурна ніжэйшымі барбарамі, выраджэнцамі[13]. Ангельская й расейска-савецкая нацыянальная палітыка пагарджала гэльскай ды ўкраінскай мовамі, лічыла іх “мужыцкімі”, непрыдатнымі для сучаснага сьвету. З часоў Сярэднявечча пра ірляндцаў, валійцаў, таксама шатляндцаў (падпарадкаваць якіх збройным шляхам так і не ўдалося) пісалі як пра “барбараў”[14]. Шатляндзкая Рэфармацыя пашанцавала, бо яны прынялі пратэстанцтва. Раўнінных шатляндцаў паважалі за працавітасьць, а ў 1707 годзе Ангельшчына падпісала з Шатляндыяй дамову аб утварэньні Былы СССР больш нагадваў Асманскую, чым якую-колечы заходнюю імпэрыю. Ані ў Турцыі, ані ў Расеі да ўтварэньня імпэрыі ня склаліся нацыянальныя дзяржавы, дайшоўшы да калянізаваныя землі ўшчыльную прылягалі да тэрыторыяў мэтраполіі. Царская Расея, СССР ды Асманская імпэрыя спрыялі фармаваньню расейскай і турэцкай нацыянальнасьці: усе тры памянёныя дзяржавы сьціралі разрозьненьні

[10] Пра гэта глядзіце: **Eric Lyons, *Culture and Anarchy in Ireland, 1890—1939*** (Oxford: Oxford University Press, 1982), стар. 8, 9, 16, 22, 32, 42, 48, 57 і 84.

[11] Глядзіце: **Patricia Hernández and Patrick Heuriaz, “Twentieth-Century Transformations in Catalonia and the Ukraine: Ethnic Implications in Education,”** *Comparative Education Review*, **Vol.37, No.1, 1993, стар. 31—49.**

[12] Глядзіце: **Bill Kissane, “Nineteenth-**

стрыжнявым народам (зь якога меліся паўстаць расейская ды турэцкая нацыі) і астатняй імпэрыяй. Над большасцю з этнічным самаўсьведамленьнем пераважала імпэрыяй расейскае (савецкае) ды асманскае.

Cecilia Nationalism in Finland and Ireland: A Comparative Analysis,” *Nationalism and Ethnic Politics*, Vol.6, No.2, 2000, pp.25—42.

[11] Гл. Canon Nicholas Frayling, “An English Repentance,” *The Guardian*, 11 March 2000.

[12] Гл. Taras Kuzio, "Identity and Nation Building in Ukraine. Defining the 'Other'," *Ethnicities*, Vol.1, No.3, 2001, pp.343—365.

[13] Edward Said, *Culture and Imperialism* (London: Vintage, 1994), p.266.

[14] Jeremy Paxman, *The English.*

A Portrait (London: Penguin, 1999), p.45.
Гл. таксама Mary J.Hickman, "Reconstructing, Deconstructing 'Race': British Political Discourses about the Irish," *Ethnic and Racial Studies*, Vol.21, No.2, 1998, pp.288—307.

[15] Stephen Velychenko, "Empire Loyalism and Minority Nationalism in Great Britain and Russia, 1707—1914: Institutions, Law, and Nationality in Scotland and Ukraine," *Comparative Studies in Society and History*, Vol.39, No.3, 1997, pp.413—441.

[16] Гл. Taras Дзякуючы высілкам Кемаля Ататурка, нацыяналістаў

маладатурка, пасьля заняпаду Асманскай імперыі, нікла турэцкая нацыянальная дзяржава. Пасьля распаду Савецкай імпэрыі расейцы ня сталі ствараць уласнай незалежнай дзяржавы. Замест гэтага ў 1922 годзе Расея разам з іншымі ўсходнеславянскімі краінамі выступіла сузаснавальніцай СССР, які з 1934 году вярнуўся да царскай нацыянальнай мадэлі, скіраванай на зьліцьцё імпэрска-тэрытарыяльнае (*imperial*) і этнічнае расейскае ідэнтычнасьці.

З жніўня да сьнежня 1991 году нерасейскія рэспублікі аддзяліліся ад СССР, прыняўшы дэклярацыі аб сувэрэнітэце. РСФСР вымушаная была з гэтым пагадзіцца. Яна стала адзінай савецкай рэспублікай, якая не абвесьціла незалежнасьці ад СССР. Расейскія лідэры жадалі захаваць канфэдэратыўны зьвяз незалежных дзяржаваў на постсавецкай прасторы, у якім Расея па-ранейшаму вяла б рэйкі, але без старога савецкага цэнтру. Гэткае бачаньне СНД рашуча адрозьнівалася ад ідэі “цывілізаванага разводу”, якую падтрымлівала Ўкраіна, — для яе незалежнасьць была абсалютным паняткам. Праз усе 90-я гады Расейская Фэдэрацыя вагалася паміж стварэньнем уласнай прарасейскай дзяржавы і саюзам зь Беларусяй. Іншыя дзяржавы СНД падпарадкаваньне, а не раўнапраўнае аб’яднаньне знаходзіць падтрымкі нават у такіх прарасейскіх краінаў, як Арменія і Казахстан.

У трох эўрапейскіх посткаляніяльных краінах — Беларусі і Малдове — мэтай каляніяльнай палітыкі было або цалкам асымільваць народы, што разглядаліся як атожылкі адзінага расейскага племені (украінцаў і беларусаў), або стварыць новую нацыю, штучна аддзяліўшы бэсарабаў (малдаванаў) ад румынаў. У стаўленьні імпэрскіх уладаў (як царскіх, гэтак і савецкіх) да Казахстану было болей чыстага калянізатарства, чым у дачыненьні да Ўкраіны і Беларусі: тыя ўважаліся за “расейскія” (гэта значыць усходнеславянскія) землі, а значыць, не былі “чужымі”. Аднак зь пяці цэнтральнаазіяцкіх краінаў Казахстан мае найдаўжэйшую гісторыю зносінаў з Расеяй і разам з Кіргізіяй і Таджыкістанам працягвае займаць у СНД прарасейскую пазыцыю[16].

Украіна і Беларусь атрымалі цяжкую каляніяльную спадчыну, ад якой наўрад ці можна будзе калі-небудзь вызваліцца дарэшты. Расейская была мовай прагрэсу (урбанізацыі,

Kuzio, T. “Geopolitical Pluralism in the CIS: The Emergence of GUAM,” *European Security*, Vol.9, No.2, 2000, pp.81—114;

Taras Kuzio, “Promoting Geopolitical Pluralism in the CIS: GUAM and Western Foreign Policy,” *Problems of Post-Communism*, Vol.47, No.3, 2000, pp.25—35.

індустрыялізацыі), а таксама мовай савецкай улады. Украінская ды беларуская лічыліся мясцовымі дыялектамі, на зьмену якім прыйдзе расейская мова, як толькі абодва гэтыя ўсходнеславянскія народы асымілююцца ў адзіную расейскую нацыю. Украінцы засвойвалі сусьветную культуру праз пасярэдніцтва расейскай мовы, між тым як украінская зрабілася сацыяльна ніжэйшай мовай бяз будучыні, пакінутай паміраць у вясковых хатах.

Савецкая гістарыяграфія і фармаваньне нацыі

Пасьля 1934 году савецкая гістарыяграфія пераважна вярнулася да мадэлі гісторыі, прынятай у царскай імпэрыі. Прачытаўшы такую гісторыю, “сам цар застаўся б збольшага задаволены”, як заўважыў Лоўэл Тылет[17]. Гістарыяграфія служыла імпэрскай нацыянальнай палітыцы кампартыі, распрацоўвала й навязвала новую нацыянальную міталёгію, каб аб’яднаць усе народы вакол расейскага “старэйшага брата”. Да пачатку 50-х савецкая гістарыяграфія зь яе мітамі прайшла поўнае кола вяртаньня да расейска-імпэрскай. На часы Сталіна пасьля некалькіх рэвізіяў савецкая гістарыяграфія “ператварыла савецкую вэрсію ўкраінска-расейскіх дачыненьняў у дакладную копію афіцыйна прынятай у царскім часам”[18]. У 1954 годзе “Тэзы аб узьяднаньні” да 300-й гадавіны Пераяслаўскай дамовы 1654 году паміж Украінаю і Масковіяй шмат у чым паўтаралі ды адтваралі схемы “афіцыйнай нацыянальнай палітыкі” Мікалая I, упершыню сфармуляваныя ў 30-х гадох XIX стагодзьдзя (выдадзеная ў 1837 годзе “Русская история” Мікалая Ўстралава адыгрывала ў гэтай палітыцы істотную ролю).

Аснаватворнымі момантамі “адмысловага гістарыяграфічнага міту”, які імкнулася пашырыць савецкая гістарыяграфія, былі:

— рэабілітацыя імпэрскага мінулага царскай Расеі;

— вышэйшасьць “вялікаросаў” — правадыроў ды “старэйшых братоў” усіх астатніх;

— адсутнасьць нацыянальнай варожасьці паміж расейцамі й нерасейцамі як цяпер, гэтак і ў мінулым;

— гэтыя міты мусілі спрыяць станаўленьню савецкага (расейскага) патрыятызму;

— нерасейскія народы не заваёўваліся, а далучаліся да Расейскай і савецкай імпэрыяў толькі шляхам “аб'яднаньня”

[17] L.R. Tillet, “Soviet Second Thoughts on Tsarist Colonialism,” *Foreign Affairs*, Vol.42, No.2, 1964, p.310. Гл. таксама L.R. Tillet, “Nationalism and History,” *Problems of Communism*, Vol.16, No.5, 1967, pp.36–45.

[18] Stephen Velychenko,

ды “ўзьяднаньняў”;
— “аб’яднаньні” ды “ўзьяднаньні” мелі выключна адаўчыя вынікі ці, прынамсі, былі “меншым злом” (гэта значыць, для Цэнтральнай Азіі было “лепш” “узьяднацца” з Расеяй, чым скарыцца Брытаніі);
— большая цэнтралізацыя была прагрэсіўным крокам;
— нацыяналістычныя выступленьні супраць імпэрыі не адпавядалі жаданьням народаў, якія толькі таго пагрунулі, каб зьліцца з расейскім “старэйшым братам”;
— нерасейскія народы Саюзу няздольныя стварыць уласныя незалежныя дзяржавы;
— расейская цывілізатарская місія прынесла шмат карысьці суседнім народам;
— малдаване не былі этнічнымі румынамі;
— панаваньне Расеі над Украінай і Беларусяй было не вынікам “заваёвы”, а простым вяртаньнем пад царскую апеку.

Згодна з новай нацыянальнай палітыкай у вэрсіях 1947 і 1954 гадоў, усходнія славяне належаць да адзінай гістарычнай супольнасьці, імя якой — *“русский народ”*[20]. Украінцаў і беларусаў уважалі ўжо не за асобныя этнасы, а за мясцовыя атожылкі расейскага племя. Таму незалежная дзяржава для іх — зьява ненатуральная, існаваць яна можа выключна “часова”, да “ўзьяднаньня” з Расеяй (чаго з 1994 году і дабіваецца Беларусь)[21].

Савецкая гістарыяграфія зь яе русацэнтрызмам абмяжоўвала супольную гістарычную памяць ды самаўсьведамленьне народаў у складзе СССР разуменьнем сваёй этнаграфічнай адметнасьці як геаграфічнай адзінкі Расеі. На ўсходзе Украіны і ў Беларусі гэтая царска-савецкая гістарыяграфія ўмацавала “ўсерасейскасьць”, якая ўжо трывала ўвайшла ў людзкую сьвядомасьць. Яна трансфармавала супольную гістарычную памяць, нацыянальную сьвядомасьць, што фармавалася пад уплывам мадэрнізацыі, у этнаграфічны мясцовы патрыятызм, які не супярэчыў савецка-расейскаму патрыятызму.[22]

“The Origins of the Official Soviet Interpretation of Eastern Slavic History. A Case Study of Policy Formulation,” *Forschungen Zur Osteuropaischen Geschichte*, Vol.46, 1992, p.238.

19 L.B.Tillet, *The Great Friendship. Soviet Historians on the Non-Russian Nationalities* (Chapel Hill: University of North Carolina Press, 1969), p.4.

Гл. таксама Anatole G.Mazour, *Modern Russian Historiography* (London: Greenwood Press, 1975).

[20] Stephen Velychenko, “The Official Soviet View of Ukrainian History,” *Journal of Ukrainian Studies*, Vol.10, No.2, 1985, p.84.

[21] Паводле вынікаў сацыялягічнага апытаньня, праведзенага ў 1993 г., тры чвэрці этнічных расейцаў у Расеі меркавалі, што ўкраінцы ня ёсьць асобным народам і таму не павінны мець сваёй асобнай дзяржавы. Гл. Paul A.Goble, “The Ukrainian Security Trap,”

***The Ukrainian Quarterly*, Vol.50, No.3, 1994, p.230.**

[22] Stephen Velychenko, "National History and the 'History of the USSR': The Persistence and Impact of Categor ies," y Donald V.Schwartz and Razmik Panosian, eds, *Nationalism and History. The Politics of Nation-Building in Post-Soviet Armenia, Azerbaidzhan and Georgia* (Toronto: University of Toronto, Centre for Russian and East European Studies, 1994), p.28.

Гісторыя і нацыянальнае самавызначэньне на постсавецкай прасторы

Гістарыяграфія і фармаваньне нацыі: тэарэтычныя развагі

Джонатан Фрыдман сьцьвярджае, што "інтэлектуальная аб'ектыўнасьць ілжывая", паколькі гісторыя ніколі не бывае сапраўды аб'ектыўнай — "тоеснасная палітыка заключаецца ў тым, каб зьвязваць цяпершчыну з жыцьцесьцьвярджальным

мінулым. Таму мінуўшчына выбудоўваецца згодна з памкненьнямі тых, хто цяпер піша падручнікі гісторыі”[23].
А значыць, “уся гісторыя, у тым ліку і сучасная гістарыяграфія, ёсьць міталёгіяй”, бо “гісторыя — адлюстраваньне цяпершчыны ў мінулым”[24].
Немагчыма сфармаваць новае нацыянальнае самаўсьведамленьне, якое аб’ядноўвала б насельніцтва, без апірышча на мітатворчасьць[25]. Празь міты абуджаецца разуменьне супольнага лёсу, яны “робяць акцэнт на згуртаванасьці ў барацьбе супраць ворагаў, больш яскрава акрэсьліваюць межы”[26]. Каб адрадзіць і вынайсьці новую “ўяўленую супольнасьць”, нацыяналісты зьвяртаюцца да мінулага. Як піша Энтані Д.Сьміт, “бязь мітаў, калектыўнай памяці ды сымбаляў, што праводзяць падзел паміж удзельнікамі супольнасьці і “чужынцамі”, без культурнай эліты, якая распрацоўвае й вытлумачвае міты, сапраўдны ўлад існаваць ня можа”[27]. “Міты надавалі культурнай супольнасьці адчуваньне значнасьці ды зьмястоўнасьці, адчуваньне прыналежнасьці да арганізаванага народу”[28], — працягвае ён. Калянізатары імкнуцца сьцерці гістарычную памяць, разам зь ёю — і нацыянальную сьвядомасьць, каб такім чынам спрасьціць асыміляцыю. Таму адраджэньне гістарычнай памяці, узнаўленьне нацыянальнай гістарыяграфіі шчыльна звязаны з адраджэньнем нацыянальнай сьвядомасьці ў супрацьпастаўленьні зь Іншым — былой імпэрыяй. Прычына ў тым, што “пытаньне, каму “належыць” мінулае, — гэта пытаньне, хто заўсёды й паўсюль здольны вызначыць сабе Іншае”[30]. Бальшыня насельніцтва вітае пераасэнсаваньне мінуўшчыны, перагляд гісторыі ў адпаведнасьці з інтарэсамі посткаляніяльнай дзяржавы, але “ў нацыянальнай меншыні можа ўзьнікнуць пачуцьцё здрады”[31]. Расейцам цяжка звыкнуцца з тым, што ўва Ўкраіне, Малдове й Казахстане яны сталіся нацыянальнай меншынёй (у Беларусі яны зрасьліся з кіраўнічай элітай тытульнай нацыі). Да таго ж ранейшая расейская палітыка ўжо не разглядаецца ў новаўтвораных незалежных дзяржавах у дадатным сьвятле.
Пасьля таго як былыя гаспадары прымушалі іх думаць, што самі яны няздольныя даць рады без дапамогі “старэйшага брата”, нацыянальныя эліты як у “трэцім сьвеце”, так і ў краінах былога СССР імкнуцца вярнуць сабе пачуцьцё ўласнае у

[23] **Jonathan Friedman, “Myth, History and Political Identity,” *Cultural Anthropology*, Vol.7, No.2, 1992, p.207.**

[24] **Jonathan Friedman, “The Past in the Future: History and the Politics of Identity,” *American Anthropologist*, Vol.94, No.4, 1992, p.837.**

[25] **David Miller, *On Nationality* (Oxford: Clarendon Press, 1995).**

[26] **John A. Armstrong, “Nations Before Nationalism,” у**

годнасьці. А для гэтага неабходна спыніць расавую дыскрымінацыю і пазбавіцца ад комплексу непаўнавартаснасьці, прышчэпленага імпэрскімі ўладамі[32]. Асноўнае ў справе вяртаньня самапавагі — давесьці ўласную нацыянальную гістарыяграфію[33]. Як сьцьвярджае Томі Бгабга, “мэта каляніяльнага дыскурсу — паказаць, што каланізаванае насельніцтва ўжо дзеля сваёй расавай прыналежнасьці складаецца з выраджэнцаў, каб тым самым апраўдаць заваёву ды ўсталяваць сваю сыстэму рабаваньня ды навучаньня”. Калянізатар навязвае “скоранаму народу” сваё бачаньне ягонай гісторыі, бо гэта адзін з мэтадаў “авалодваньня, кіраваньня й панаваньня над розумам, эрамі дзейнасьці”[34].

Калі былая калёнія (як у беларускім выпадку) ня мела, што была ў савецкую эпоху калёніяй, тады ў яе *нямае прычынаў* адмаўляцца ад традыцыйнай савецкай гістарыяграфіі ўслаўляла “старэйшага брата” ды, як і яе папярэднік царскіх часоў, не прызнавала за беларусамі й украінцамі права на самастойнасьць. Як падкрэсьліваюць Ян Янмаў і Кольшта, Украіна, будуючы незалежную дзяржаву, надалей абапіраецца на савецкую гістарыяграфію. Адзначаем краіна ставіць сабе на мэце не дзяржаўнасьць, а нацыянальнае (як, да прыкладу, Беларусь пад кіраўніцтвам прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі), то ёй можна па-ранейшаму паходзіць на гістарыяграфію савецкага часу[35].

У посткаляніяльных дзяржавах уладная эліта стаіць перад гісторыкамі задачу давесьці права і прывілей кіраваньня насельніцтва мець уласную гісторыю. Без нацыянальнай гісторыі яны так і застануцца пасіўнымі аб’ектамі чужынных працэсаў, а іх нацыянальную сьвядомасьць і надалей будуць фармаваць былыя калянізатары[36]. Скрыўленьне, перайначваньне гісторыі калянізаваных — істотны мэтад каляніяльнай палітыкі. І датычыў ён як былога СССР, так і краінаў Афрыкі ды Азіі: “Згодна зь нейкай вычварнай лёгікай, ахвяры зьвяртаюцца да мінуўшчыны прыгнечаных, каб знайсьці ў ёй тое, спляжыць, сплюндраваць… У канчатковым выніку каляніяльныя ўлады імкнуліся пераканаць карэнных жыхароў, што калянізатар прынёс сьвятло да іх у цямрэчу[37].

У постсавецкіх краінах ідзе пакутлівая барацьба за ўвесьці рэй у культурнай палітыцы новых незалежных

John Hutchinson and Anthony D. Smith, eds, *Nationalism* (Oxford: Oxford University Press, 1994), p. 145.

[27] Anthony D. Smith, “Ethnic Myths and Ethnic Revivals,” *Archives Europeennes de Sociologie*, Vol. 25, 1984, p. 288. Самі міты

падзяляюць міты нацыянальнае выдаюць міты пахадзіцельна міты міграцыі і/або вызначальныя міты рацыянальных міты будуць гераічных часоў, міты трагічнага мінулага і міты вураджэньня і абуджэньня.

Гэты выпуск *Nations and Nationalism,*

дзяржаваў: “натывістам” ці “асыміляваным”. Ці, можа, “натывістам” давядзецца пайсьці на кампраміс з “асыміляванымі”, дзяліць зь імі ўладу, а культурныя вершнасьць ня будзе належаць ні тым, ні другім? Магчыма, Украіна ўяўляе такі прыклад кампрамісу паміж “натывістамі”-ўкраінафіламі й “асыміляванымі”-русафіламі[38]. Дзякуючы групы маюць розныя погляды на фармаваньне нацыі, на зьмест нацыянальнае гістарыяграфіі ды міталёгіі. “Натывісты” бачаць каляніяльную мінуўшчыну выключна ў змрочных фарбах. “Асыміляваныя” ж, наадварот, калі і крытыкуюцьце, дык толькі выбаркава, камуністы, напрыклад, увогуле разглядаюць гэты час як “залаты век”, што не падляглае крытыцы.

Vol.7, No.4, 1991 прысьвечаны “Archaeology and Nationalism.”

[28] Friedman, “The Past in the Future,” p.801.

[29] Kuzio, “Identity and Nation Building in Ukraine.”

[30] Friedman, “The Past in the Future,” p.854. Гл. таксама Helen Parkins, “Archeology and Nationalism: Excavating the Foundations of Identity,” *Nations and Nationalism*, Vol.3, No.3, 1997, pp.451—458; ды Philip L.Kohl, “Nationalism and Archeology: On the Reconstruction

of the Remote Past," *Annual Review of Anthropology*, Vol.27, 1998, pp.223—246.

[31] Will Kymlicka, *Multicultural Citizenship* (Oxford: Clarendon Press, 1996), p.189.

[32] Rupert Emerson, *From Empire to Nation* (Cambridge, MA: Harvard University Press, 1967), pp.381—382.

[33] Shmuel Sandler, "Ethnonationalism and the Foreign Policy of Nation-States," *Nationalism and Ethnic Politics*, Vol.1, No.2, 1995, p.258.

[34] Homi K. Bhabha, *The Location of*

Culture (London: Routledge, 1994), p.70.

[35] Jan G. Janmaat, *Nation-Building in Post-Soviet Ukraine. Educational Policy and the Response of the Russian-Speaking Population* (Amsterdam: Netherlands Geographical Studies, 2000); Pal Kolsto, *Political Construction Sites. Nation-Building and the Post-Soviet States* (Boulder: Westview, 2000). Гл. мой агляд абедзьвюх кніг у *Journal of Ukrainian*

Studies, Vol.25, No.1—2, 2000.

[36] Partha Chatterjee, *Nationalist Thought and the Colonial World* (Minneapolis: University of Minneapolis Press, 1986), p.37.

[37] Franz Fanon, *The Wretched of the Earth* (New York: Grove Press, 1963), pp.210—211.

[38] Arunas Juska, "Ethno-political Transformation in the States of the Former USSR," *Ethnic and Racial Studies*, Vol.22, No.3, 1999, pp.524—553.

Вяртаньне мінулага: фармаваньне нацыяў у былым СССР Савецкі Саюз перадаў у спадчыну 15 дзяржавам, што ўзьніклі на яго тэрыторыі, блытаныя, няпростыя ўяўленьні пра нацыянальную ідэнтычнасьць. Найбольш ад русіфікацыі й дэнацыяналізацыі пацярпелі ўкраінцы й беларусы, бо іх імкнуліся цалкам асыміляваць у савецкую імпэрскую Расею. Зь 15 дзяржаваў толькі чатыры — тры балтыйскія (Літва, Латвія, Эстонія) і Арменія мелі скансалідаваныя нацыянальныя супольнасьці[39]. У астатніх краінах насельніцтва яшчэ не набыло характэрных прыкметаў таго, што палітолягі ды антраполягі называюць калектыўнай самаідэнтыфікацыяй. Таму ў працэсе "пераходу ад імпэрыі" для постсавецкіх дзяржаваў надзвычай істотную ролю адыгрывае фармаваньне нацыянальнай грамадзянскай супольнасьці ды ўсталяваньне інстытутаў дзяржаўнасьці. Як падкрэсьліваюць Бэвэрлі Кроўфард і Арэнд Ліпард, недафармаванасьць нацыі "ня сабе найбольшую пагрозу праекту палітычнага й эканамічнага лібэралізму ўва Ўсходняй Эўропе"[40]. Дзяржавы не ўмеюць здатнымі праводзіць сваю палітыку, а нацыі павінны заваёўваць самаадданасьць грамадзянаў[41]. І вось постсавецкія дзяржавы апынуліся ў патавай сытуацыі: з аднаго боку — "перажыткі імпэрыі", з другога — "недаразьвітая дэмакратыя", з трэцяга — "недафармаваныя нацыі"[42].

У постсавецкую эпоху ўспадкаваная ад СССР савецкая тоеснасьць ня зьнікла, а падлегла пераацэнцы. "Навет пасьля таго, як СССР фармальна спыніў існаваньне, яго дэманструкцыя працягваецца і можа ператварыцца ў бясконцы працэс"[43], — сьцьвярджае Бэйсынджэр.

Такім чынам, ад Савецкага Саюзу новым незалежным краінам дасталася цяжкая спадчына, якая і перадвызначае кірунак, тэмпы і зьмест дзяржава- і нацыятварэньня. На думку Бэйсынджэра, розныя культурныя ідэнтычнасьці "не заўсёды супрацьстаяць адна адной, улучаюцца адна ў адну, накладаюцца адна на адну", паколькі дзяржаўныя межы часта не супадаюць з арэаламі нацыянальнай ідэнтычнасьці. Дзяржавы бываюць і "недавершанымі" супольнасьцямі, дзе сутыкаюцца, перакрыжоўваюцца розныя ўяўленьні пра сувэрэнітэт"[44].

У шмат якіх постсавецкіх краінах не зусім зразумела "нацыянальнай ідэі". Ад таго, якую форму яна ўрэшце рэшце,

[39] Pal Kolsto, "Nation-Building in the Former Soviet Union," *Journal of Democracy*, Vol. 7, No. 1, 1996, pp. 118—132.

[40] Beverley Crawford and Arend Lijphart, "Enduring Political and Economic Change in Post-Communist Eastern Europe: Old Legacies, New Institutions, Hegemons, Norms and International Pressures,"

залежыць, хто будзе культурна весьці рэй у дзяржаве. Незалежнасьць посткаляніяльных дзяржаваў (у тым ліку і ўтвораных пасьля распаду СССР) — рэч “нетрывалая, хадлівая хістаньням і выпрабаваньням”[45]. Паколькі Расейская Фэдэрацыя сталася правапераемніцай СССР, то яна паводле азначэньня сталася спадчыньніцай імпэрыі. Больш за тое, “у нацыянальных мітах, якія складаюць падмурак дзяржавы і надаюць зьнітаванасьць яе ідэі, былы захопнік выступае ў ролі галоўнага антаганіста”[46].

Як даводзіў Уіл Кімлічка, у вызначэньні цэнтру, мэтаданай культуры (гэта значыць “культурнай гегемоніі”), дзяржаўнай (афіцыйнай) мовы, дзяржаўных сымбаляў, гістарыяграфіі, на кожную дзяржаву ў той ці іншай ступені ўплывае ленінізм. Усе постсавецкія краіны ўспадкавалі этнакультурнае разуменьне нацыяў ад савецкае нацыянальнае палітыкі. Кожная рэспубліка (за выняткам РСФСР) лічылася радзімай сваёй тытульнай этнічнай групы, дзе — тэарэтычна — дадзеная этнічная група мусіла весьці рэй, а яе мова — мець прыдатны статус[47]. Як і ўсялякая іншая грамадзянская дзяржава, постсавецкія дзяржавы ня могуць бесстароньне падыходзіць да пытаньняў, хто мусіць адыграць вызначальную ролю пры акрэсьленьні дадзенай палітычнай супольнасьці толькі тытульная нацыя ці тытульная нацыя і расейцы; на якой нацыянальнай гістарыяграфіі спыніць свой выбар, ці зьяўляецца былая мэтраполія “іншым”; колькі мець дзяржаўных моваў (толькі сваю ці таксама расейскую); якія абраць нацыянальныя сымбалі (сьцяг, гімн, герб).

***Comparative Political Studies*, Vol.28, No.2, 1995, p.189.**

[41] **Barnett Rubin, “Conclusion: Managing Normal Instability,” у Barnett Rubin and Jack Snyder, Eds., *Post-Soviet Political Order. Conflict and State Building* (London: Routledge, 1998), p.177.**

[42] **Jack Snyder, “Introduction: Reconstructing Politics Amidst the Wreckage of Empire,” у *Ibid.*, p.8.**

[43] **Mark Beissinger, “Demise of an Empire State: Identity, Legitimacy, and the Deconstruction of Soviet**

Politics," y Crawford Young, ed., *The Rising Tide of Cultural Pluralism. The Nation-State at Bay*? (Madison: The University of Wisconsin, 1993), p.110.

[44] Mark Beissinger, "The Persisting Ambiguity of Empire," *Post-Soviet Affairs*, Vol.11, No.2, 1995, p.157.

[45] *Ibid.* p.173.

[46] *Ibid.*

Постсавецкія краіны цяпер шукаюць сваю “страчаную” гісторыю ў перадімпэрскіх часох, каб давесьці, што і ў іх быў свой “залаты век”, што мінуўшчына пацьвярджае іх права мець уласную незалежную дзяржаву[48]. Гэта асабліва істотна тады, калі паміж былой мэтраполіяй і калёніяй застаюцца тэрытарыяльныя спрэчкі. Кожнай нацыі неабходна ўсьведамленьне супольных гістарычных каранёў, каб у далёкім мінулым пабачыць парасткі нацыянальнай еднасьці[49]. У Індыі нацыянальная гісторыя зьвяртаецца да аднаго дзяржавы, карэннымі насельнікамі якой задоўга да заняцьця брытанцаў былі індусы[50]. Гэтаксама і ў постсавецкіх краінах асаблівая ўвага надаецца даімпэрскаму, дакамунісцкаму, пэрыяду як падмурку новай нацыянальнай гісторыі. Ж, што ў францускіх калёніяў навучалі (а ў Францускай Палінэзіі 100, 1995, p. 109; навучаюць), што яны — “нашчадкі галаў”. У СССР не расейцаў навучалі, што ім была непатрэбная незалежнасьць, ліквідацыі заўсёды жадалі толькі аднаго — аб’яднацца з расейскім “старэйшым братам”. Таму ўсе спробы аднавіць

[47] **Гл. George Schopflin, “National Identity in the Soviet Union and East Central Europe,” *Ethnic and Racial Studies*, Vol.14, No.1, 1991, pp.3—14.**

[48] **Edward Shils, “Nation, Nationality, Nationalism and Civil Society,” *Nations and Nationalism*, Vol. 1, No.1, 1995, p. 100; Thomas H. Eriksen, *Ethnicity and Nationalism.***

самастойнасьць разглядаліся як “здрада”, бо разьвіталіся ад адзінства.

Жыхары посткаляніяльных краінаў разьяднаныя паводле рэлігійных, рэгіянальных і клясавых прыкметаў. Рэгіянальныя, толькі эліта падзяляе дзяржаватворную канцэпцыю фармаваньня “ўяўленай супольнасьці”. Што да паспалітага насельніцтва, то яно атаясамлівае сябе са сваёй невялікай мясцовасьцю і не праяўляе адданасьці новаўтворанай нацыянальнай дзяржаве[51]. І ў “трэцім сьвеце”, і ў краінах былога СССР звычайны замаруджаны працэс фармаваньня нацыі і дзяржавы ідзе поруч з дэкалянізацыяй.

У постсавецкіх краінах, як і ў посткаляніяльным сьвеце, адбываецца “пераход ад імпэрыі”, калі на базе ўсходнеславянскай квазідзяржавы будуецца нацыянальная дзяржава[52]. “Разьвітаньне з імпэрыяй” у постсавецкіх краінах адрозьніваецца ад “разьвітаньня з аўтарытарызмам” у Паўднёвай і Цэнтральнай Эўропе, а таксама ў Ларынскай Амэрыцы: там стварэньне нацыі і дзяржавы наўрад ці адыгрывала колькі-небудзь значную ролю ў дэмакратычных пераўтварэньнях. “Пераход ад імпэрыі” ў посткаляніяльных жа краінах мае чатыры складнікі: фармаваньне нацыі, пабудова дзяржавы, а таксама ў асобных выпадках — дэмакратызацыя і стварэньне рынкавай эканомікі. Цывілізаваны нацыяналізм і нацыянальнае адзінства дапамагаюць пераадолець разьяднанасьць грамадзтва, якая некалі паспрыяла іх заваяваньню[53].

Імпэрыі найбольш разбураюць культурныя асновы калектыву. У нашым выпадку — культуру тытульных нацыяў на Ўкраіне, Беларусі і Казахстане. Карэннае насельніцтва мастацтва зрусіфікавалася або стала дзьвюхмоўным. Як дадаецца Джэры Смоліч, “сацыяльныя групы можна вылучыць у асобныя культурныя супольнасьці акурат на падставе стрыжнявых вартасьцяў. Калі група страчвае свае стрыжнявыя вартасьці, то ў выніку яна распадаецца як супольнасьць, здольная захоўваць сваю еднасьць празь вякі”[54].

Калі размываюцца гэтыя стрыжнявыя вартасьці (мова, культура, нацыянальная гістарыяграфія, калектыўная памяць), калі пад пагрозай нацыянальная ідэнтычнасьць, а таксама значнасьць набывае культурнае жыцьцё. Менавіта ў сэнсе культурнай асновы адбывалася гуртаваньне народаў для

Anthropological Perspectives **(London: Pluto Press, 1993), p.69.**

[49] **Walker Connor, “Beyond Reason: The Nature of the Ethnonational Bond,” *Ethnic and Racial Studies*, Vol.16, No.3, 1993, pp.376—377.**

[50] **Craig Calhoun, “Nationalism and Ethnicity,” *Annual Review of Sociology*, Vol.19, 1993, pp.225—226.**

[51] **Ana M. Alonso, “The Politics of Space, Time and Substance: State Formation, Nationalism and Ethnicity,” *Annual Review of Anthropology*, Vol.23, 1994, p.387.**

супраціву імпэрыі. У позьнесавецкую эпоху народныя рухі ў трох балтыйскіх краінах, ува Ўкраіне і Беларусі, у Малдове, Грузіі й Арменіі выніклі на хвалі змаганьня за нацыянальныя і агульнадэмакратычныя правы, бо савецкая імпэрская палітыка несла небясьпеку іх культурам і мовам.

Небясьпекі дадало перасяленьне расейцаў у нерасейскія рэспублікі былога СССР. Расейскіх перасяленцаў[51] у вялікіх колькасьцях накіроўвалі ў Латвію ці Эстонію, ва Ўкраіну і Беларусь, у Малдову і Казахстан. У 80-х гадох тытульная нацыя склала менш за палову насельніцтва ў Казахстане і крыху больш за 50% — у Латвіі.

У посткаляніяльных дзяржавах, як у краінах былога СССР, эліту і паспаліты люд часта падзяляюць культура, мова, рэгіянальныя адрозьненьні, розныя замежнапалітычныя арыентацыі. Адныя захоўваюць вернасьць роднай культуры, іншыя асыміляваліся ў культуру былога імпэрскага цэнтру — Расеі, пераемніцы СССР. Ідэалягічны раскол паміж “натывістамі” й “асыміляванымі” асабліва відавочны ў прыкладах Украіны, Беларусі і Казахстану. Савецкая нацыянальная і эканамічная палітыка прывяла да дамінаваньня тытульных нацыяў, стварыла сытуацыю, калі вялікія[52] насельніцтва складаюць расейскамоўныя.

У Беларусі каляніяльная спадчына аказалася нашмат[53] магутнай, што Аляксандар Лукашэнка з самага пачатку, калі ён быў абраны на прэзыдэнта, спрабуе зноў далучыць краіну да былой імпэрыі[55]. Гэта адзіны выпадак, калі калёнія[56] вырашыла вярнуцца пад уладу мэтраполіі. Што да Аляксандра Лукашэнкі, дык ён з сваёй глыбока савецкай мэнтальнасьцю малодшага брата Расеі” ня бачыць супярэчнасьці ў сваёй палітыцы, пераканаўшы, што паміж Беларусяй і Расеяй нямашчыма сутнасных нацыянальна-этнічных адрозьненьняў[57], што беларускі досьвед, калі калянізацыя ацэньваецца станоўча, — гэта зьява анамальная для посткаляніяльных дзяржаў.

51. **Emerson, *From Empire to Nation*, p.150.**

52. **Mette Skak, *From Empire to Anarchy: Post-communist Foreign Policy and International Relations* (London: Hurst, 1996), p. 18.**

53. **Гэта таксама адносіцца і да Малдовы.**

54. **Myron Weiner, “Political Integration and Political Development,” *Annals of the American Academy of Politics and Social Science*, Vol.358, 1965,**

pp.52—64.

[53] Emerson, *From Empire to Nation*, p.380.

[54] Jerzy J.Smolicz, "Tradition, Core Values and Intercultural Development in Plural Societies," *Ethnic and Racial Studies*, Vol.11, No.4, 1988, p.394.

[55] **Гл. Stephen Eke and Taras Kuzio, “The Socio-Political Roots of Authoritarian Populism in Belarus,” *Europe-Asia Studies*, Vol.52, No.3, 2000, pp.523—547.**

[56] ***Ibid.***

Гісторыя і нацыянальная ідэнтычнасьць на постсавецкай прасторы: чатыры прыклады

Украіна

Адліга другой паловы 80-х гадоў дала магчымасьць абмяркоўваць раней забароненыя тэмы, у тым ліку і ў гістарыяграфіі. У выніку, па-першае, гістарычных дзеячоў, якіх раней выяўлялі толькі ў чорных колерах, сталі часьцяком абельваць, па-другое, гісторыкі сталі задаваць пытаньні “чаму?” ды “хто вінаваты?”[57] і, нарэшце, вызначылася цікавая тэндэнцыя: гісторыкі пераважна паходзілі з нацыянальна больш сьвядомай Заходняй Украіны. Адной з прычынаў таму, у сваю чаргу, — перавага выхадцаў з Заходняй Украіны сярод украінскай дыяспары, якія фундуюць перавыданьні раней забароненых кнігаў з гісторыі Ўкраіны ці самі пішуць новыя. Пасьля 1990—91 гадоў стала модна цытаваць замежных навукоўцаў. Упершыню апублікаваная ў 1989 годзе і з таго часу тройчы перавыдадзеная кніга канадзкага гісторыка Арэсла Субтэльнага “Гісторыя Ўкраіны” разышлася агульным накладам 800.000 асобнікаў па-ўкраінску ды па-расейску й зрабілася самым масавым папулярным падручнікам гісторыі. Маштабы шкоды, учыненай украінскай гістарыяграфіі ў савецкі час, відаць на выбуху цікаўнасьці напрыканцы савецкага часу да забароненых тэмаў і асобаў. У канцы 80-х — пачатку 90-х адбылася рэабілітацыя ўкраінскіх пісьменьнікаў, інтэлігентаў, палітычных, гістарычных дзеячоў. Саюз пісьменьнікаў стварыў

[57] **E.H. Carr, *What is History?* (Harmondsworth: Penguin, 1973), p.90.**

камісію на чале з Дмытром Паўлычкам, каб дасьледаваць “белыя плямы” ўва ўкраінскай гісторыі[58]. Са старонак усяе ўкраінскае прэсы гучалі заклікі палепшыць вывучэньне, дасьледаваньне й апісаньне гісторыі Ўкраіны[59] — напачатку яны зусім не віталіся рэакцыянэрамі з КПУ[60].

Але плаціну прарвало і КПУ нічога не магла зрабіць. Украінскія гісторыкі спасылаліся на сваіх расейскіх калег, якім дазволілі рэабілітаваць сваіх гісторыкаў і вярнуцца да выразна імпэрскай расейскай гістарыяграфіі[61]. У 1988 годзе 100-тысячным накладам была перавыдадзеная 12-томная “История государства Российского”, у якой расейская гісторыя разглядаецца ў вялікадзяржаўным рэчышчы, а ўкраінцы й беларусы ўважаюцца за атожылкі адзінага “русского народу”. Нефармальныя аб’яднаньні, палітычныя партыі, народныя фронты пачалі разьвенчваць расейска-савецкія гістарычныя міты; адначасова іх усё больш і больш крытыкавала інтэлігенцыя, а таксама нацыянал-камуністы. Заснаванае ў сакавіку 1989 году ўкраінскае таварыства “Мэмарыял” імкнулася адрадзіць гістарычную памяць, паўплываць на сьвядомасьць народу праз раскрыцьцё “белых плямаў” савецкай гісторыі. Упершыню пераасэнсоўваліся савецкія сьвяты.

З 1986 да 1991 году Інстытут гісторыі Акадэміі навук Украіны павялічыў долю ўкраінскай тэматыкі ў сваіх дасьледаваньнях з 57 да 90%, уключыў у іх кола пэрыяд Кіеўскай Русі, які раней дазвалялася вывучаць толькі расейскім гісторыкам. Але да шырокай аўдыторыі здабыткі адроджанай нацыянальнай гістарыяграфіі дайшлі толькі па 1990—1991 гадох, калі дзяржаўная ўлада, СМІ загаварылі на мове апазыцыі[62]. Пашырэньне нацыянальнай гістарыяграфіі, вяртаньне да яе пайшлі шпарчэй, калі ў студзені 1992 году Ўкраіна набыла незалежнасьць.

Калі ўкраінцы сьцьвярджаюць, што будуюць сваю дзяржаўнасьць на падмурку “тысячагадовай традыцыі”, то маюць на ўвазе, што сярэднявечную Кіеўскую Русь проста ўважаць за першую протаўкраінскую дзяржаву. Вядома, гэта ставіць у складанае становішча расейскіх ды заходніх гісторыкаў, якія традыцыйна прытрымліваліся імпэрскіх стэрэатыпаў XVIII—XIX стагодзьдзяў: маўляў, “Киевская Русь” была першай “русской” дзяржавай[63]. Бяз Кіеўскай Русі Расея аказваецца маладзейшай за Ўкраіну.

58 ***Літературна Україна,*** **6.10.1988.**

59 ***Культура і життя,*** **7.02 і 13.03.1988.**

60 ***Правда України,*** **9.06 і 31.07.1987.**

61 ***Радянська***

Гісторыя існуе ня толькі дзеля гісторыкаў, музэяў, акадэмічных часопісаў. Наадварот, лічыць прэзыдэнт Кучма, “мы мусім сьвядома вывучаць гісторыю. Здабыткі гісторыкаў павінны ўплятацца ў жывую тканку сучаснага грамадзтва, абавязкова ўжывацца на практыцы. Таму мы павінны цьвяроза й аб’ектыўна ацаніць свае дасягненьні ды пралікі на шляху, якім мы йдзем”[64].

Антраполяг Кетрын Уондэр падкрэсьлівае, наколькі істотную ролю адыгрывае гісторыя для посткаляніяльнай Украіны: “Гісторыя прапануе багатыя радовішчы сыравіны, каб стварыць постсавецкую нацыянальную культуру, давесьці сваё права на дзяржаўнасьць. Новыя гістарычныя міты, новыя вэрсіі гісторыі, выкладзеныя ў гістарычных працах, і ёсьць тым нарожным камянём, на якім новая ўкраінская дзяржава спрабуе ўмацаваць нацыянальнае пачуцьцё на падставе супольнага гістарычнага мінулага ў краіне зь вельмі размаітым, да таго ж палітычна пасіўным насельніцтвам”[65].

У новай нацыянальнай міталёгіі Ўкраіна паўстае “эўрапейскай” міралюбнай дзяржавай, якая сталася ахвярай іншаземных заваяваньняў. Сваёй палітычнай культурай яна адрозьніваецца ад Расеі, мае традыцыю дэмакратычных інстытутаў, а таксама доўгую гісторыю, якая пацьвярджае яе права на незалежнасьць[66]. Галоўны ўрок украінскае гісторыі ў тым, што справакаваны Саветамі галадамор 1932—33 гадоў, які адняў 7 мільёнаў жыцьцяў, Чарнобыльская катастрофа 1986 году ды іншыя трагедыі здарыліся толькі таму, што Ўкраіна на той час не была сувэрэннай дзяржавай[67]. Такім чынам, самастойнасьць разглядаецца як плюс, яе ўслаўляе інтэлектуальная й уладная эліта як адзіную магчымасьць пазьбегнуць паўтарэньня былых трагедыяў. Гісторыя адыгрывае значную ролю ў тым, каб адстаяць спрадвечнае права ўкраінцаў на свае землі, калі яго пачынаюць аспрэчваць іншыя дзяржавы, і перадусім Расея[68]. Выкладаньне ды папулярызацыя ўкраінскай гісторыі неад’емныя ад фармаваньня нацыі й дзяржавы. Гісторыя ня толькі дае ўкраінцам адчуваньне повязі з продкамі, але й імкнецца зьнітаваць насельніцтва ў адзіную нацыянальную супольнасьць, спрыяе вяртаньню да “сусьветнай гісторыі” ды “эўрапейскай цывілізацыі”. Штогод 24 жніўня ўкраінцы ідзе ў незалежнасьці адзначаецца ў Кіеве вайсковым парадам ды тэатралізаванай дзеяй, у якой паказваецца пераемнасьць:

***Україна*, 3.03; *Культура і життя*, 13.03.1988.**

62 Гл. Taras Kuzio, *Ukraine. Perestroika to Independence* (London:

новаўтворанай дзяржавы з 1000-гадовай гісторыяй, што папярэднічала.

Macmillan, 2000), pp.94—95 і 101—104.

[63] Kolsto, *Political Construction Sites*, p.35. Гл. таксама Taras Kuzio, "Historiography and National Identity Among the Eastern Slavs: Towards a New Framework," *National Identities*, Vol.3, No.1, 2001, pp.109—132.

[64] З прамовы

Кучмы ў заходнеўкраінскім горадзе Львове з нагоды 80-годзьдзя Ўкраінскай Народнай Рэспублікі (УНР) ў 1998 г. (*Урядовий курьер*, 3.11.1998).

[65] Catherine Wanner, *Burden of Dreams: History and Identity in Post-Soviet Ukraine. Post-Communist Cultural Studies* (Pennsylvania: Pennsylvania State University Press, 1998), p.xxiv.

[66] ***Ibid.*, p.103.**

[67] **Taras Kuzio, "Ukrainians in Search of Their Identity," *RFE/RL Newsline*, Vol.4, No.193, 5 October 2000.**

[68] **Гл. Taras Kuzio, "Borders, Symbolism and Nation-State Building: Ukraine and Russia," *Geopolitics and International Boundaries*, Vol.2, No.2, 1997, pp.36—56; ды Taras Kuzio, "Russia Continues to Hold Up Border Demarcation with Ukraine," *RFE/RL Newsline*, 30 October 2001.**

Пасьля таго як на працягу пяці дзесяцігодзьдзяў пляжылася імя “нямецкага шпега”, “буржуазнага нацыяналіста” Міхайлы Грушэўскага — гісторыка пачатку XX стагодзьдзя, старэйшыны ўкраінскай гістарыяграфіі, яго рэабілітацыя зрабілася надзвычай важнай задачай. З набыццём незалежнасьці прапанаваная Грушэўскім гістарычная схема зрабілася, можна скажаць, афіцыйнай лініяй[69]. На думку прэзыдэнта Кучмы, значнасьць постаці Грушэўскага — у яго адданасьці ўкраінскаму “нацыянальнаму адраджэньню, абуджэньню генэтычнай памяці, у глыбокім разуменьні ўласнае гісторыі”. Грушэўскі “распрацаваў канцэпцыю гістарычнага разьвіцьця ўкраінскага народу”, — працягвае прэзыдэнт Кучма, — і ягоная 11-томная “Гісторыя Ўкраіны-Русі” Грушэўскага “назаўсёды” у “гісторыкі Расеі” пераважна пакідалі па-за ўвагай, і толькі ў калегі ўсяляк ганілі) — гістарычная Біблія ўкраінскага народу, фундамэнтальная праца…”[70].

Украіна працягвае ствараць/будаваць грамадзянскую, адкрытую нацыю, карані якой — у культуры, гісторыі пераважнае карэннай, тытульнай этнічнай групы, гэта значыць украінцаў. У выкладаньні гісторыі ўкраінская сыстэма адукацыі на ўсёй тэрыторыі ўлучна з Крымам абапіраецца на нацыянальную гістарыяграфію. Як паказваюць Янмаат і Нэнсі Попсан, зьмест школьных падручнікаў аднолькавы для ўсіх рэгіёнаў краіны. “Падручнікі, ухваленыя Міністэрствам (адукацыі), выкарыстоўваюцца па ўсёй Украіне”[71], — піша Попсан. Школьныя падручнікі выхоўваюць у дзяцей павагу да канстытуцыі, мовы, дзяржаўных сымбаляў, нацыянальных традыцыяў ды вартасьцяў, а таксама талерантнасьць да іншых народаў. У школе ўкраінскую гісторыю вывучаюць як частку сусьветную[72].

Ацэнкі ўкраінскіх гісторыкаў, як і зьмест школьных падручнікаў, зьмяніліся па сямі ключавых пытаньнях:

1. **Кіеўская Русь** разглядаецца або як цалкам прадукцыйная дзяржава, або як утварэньне, на спадчыну якога ўкраінцы маюць пераважнае права. Дзяржаўным сымбалем Кіеўскай Русі быў трызуб, а грашовай адзінкай — грыўня (дадатковы аргумэнт на карысьць “1000-гадовай традыцыі дзяржаўнасьці”[73]).
2. **Пераяслаўская дамова 1654 году** не інтэрпрэтуецца ўжо як “узьяднаньне” дзьвюх галінаў аднаго народу, а як

[69] **Гл. выдадзены Кучмам зборнік прамовы да Міхайлы Грушэўскага (Кіеў: Україна, 1996).**

[70] **Дзьвіцьця Кучма, *History, Myths and Symbols: Kuchma Ukraine. State and Nation Building*, pp. 198–229.**

[71] **Цыцыцыца напісанае ў дзяцей за**

[72] **Цыцыцыца напісанае ў дзяцей за**

канфэдэратыўны хаўрус роўных. Украіну да яго змусіла нежаданьне Польшчы прызнаць Русь (Украіну й Беларусь) трэцім чальцом Польска-Літоўскага гаспадарства.

3. **Царская ўлада** ацэньваецца адмоўна, бо мела вынікам прыгон, страту нацыянальнай эліты й дэнацыяналізацыю.

4. **Аўстрыйскае панаваньне** малюецца ў больш дадатным сьвятле, бо дазволіла сфармаваць украінскую нацыю.

5. **Падзеньне імпэрыяў:** Украінская Народная Рэспубліка, Дырэкторыя й Гетманшчына 1917—1921 гадоў разглядаюцца як законныя спробы стварыць уласную дзяржаву.

6. **Сталінізм** — непрыхаваная вайна супраць украінскай мовы, культуры, нацыянальнай эліты. Штучна выкліканы голадамор 1933-га — генацыд украінцаў.

7. **Другая сусьветная вайна:** партызаны-нацыяналісты з Украінскай Паўстанцкай Арміі пераважна малюецца барацьбітамі і супраць нацыстаў, і супраць Саветаў. Для ўкраінскай постсавецкай гістарыяграфіі гэта самы прыхаваны й складаны пэрыяд.

71. Nancy Popson, "History Textbooks in Ukraine: Introducing Children to the 'Ukrainian Nation'" — рукапіс, падрыхтаваны да штогадовага сходу Association for the Study of Nationalities, New York, 13—15 April 2000, p.8. Надрукавана пад назвай "The Ukrainian History Textbook: Introducing Children to the 'Ukrainian Nation'" *Nationalities Papers*, Vol.29, No.2, 2001, pp.325—350.

[72] Гл. Victor Stepanenko, *The Construction of Identity and School Policy in Ukraine* (Nova Science, 1999); ды Jan G.Janmaat, "Identity Construction and Education: The History of Ukraine in Soviet and Post-Soviet Schoolbooks," у Taras Kuzio and Paul D'Anieri, eds, *Nation Building and National Security in Ukraine* (Westport: Praeger, 2002).

[73] Wilfried Jilge, "Staatssymbolik und Nationale Identitдt in der Postkommunistischen Ukraine," *Ethnos-Nation*, Vol.6, Nos 1—2, 1998, pp.85—113.

Беларусы аказаліся не сьціплейшымі ад украінцаў — яны сьцьвярджалі, што будуюць сваю незалежнасьць на падмурку “шматвекавой традыцыі дзяржаўнасьці”. У 1991—1994 гадох у Беларусі пачала разгортвацца праграма нацыянальнага адраджэньня празь пераасэнсаваньне мінуўшчыны з нацыянальнага гледзішча. Расея малявалася не вызваліцелькай, а хіжым зьверам, а вернутыя з забыцьця змагары з Масквой ушаноўваліся як нацыянальныя героі. Нацыянальная Акадэмія навук разам з грамадзкімі дзеячамі пачала прапагандаваць беларускі нацыянальны этас[74]. Джордж Сэнфард выказаў думку, што “чым маладзейшая дзяржава, тым большая імавернасьць зьяўленьня ў яе новай гістарыяграфіі “залатога веку”[75]. І ім стаўся пэрыяд Вялікага Княства Літоўскага, якое ўлучала ўсю Беларусь і ў якім беларуская мова й беларускія законы мелі статус дзяржаўных. У 1991—1995 гадох Беларусь афіцыйна выкарыстоўвала герб ВКЛ — Пагоню.

Пасьля 1991 году нацыянальная гістарыяграфія імкнулася адрадзіць легендарную мінуўшчыну, якая падкрэсьліла непарыўную сувязь Беларусі з Заходняй Эўропай, адарвала ад Расеі й “слаўную” гісторыю, у выніку гістарыяграфія ператварылася ў поле змаганьня “натывістаў” і “характэрных” за нацыянальную ідэнтычнасьць беларусаў[76]. На працягу тых гадоў, што папярэднічалі абраньню ў 1994 годзе Аляксандра Лукашэнкі, беларуская гістарыяграфія ўслаўляла часы ВКЛ і адмоўна ацэньвала расейскую імпэрскую палітыку канца XVIII стагодзьдзя, бо тая спрычыніла да дэнацыяналізацыі Беларусі.

У 1991 годзе ў Менску перавыдаецца “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі” Ўсевалада Ігнатоўскага (1926 г.). Як і “Гісторыя Ўкраіны-Русі”, гэтая гістарычная праца вымалёўвала адрозную ад расейскай, гісторыю Беларусі з уласнай нацыянальнай ідэнтычнасьцю. Новыя “героі”, што ўвайшлі ў беларускай гісторыі пасьля 1991 году, ваявалі ня толькі з тэўтонскіх рыцараў, татараў ды палякаў, але й маскоўцаў, расейцаў. Яны меліся падкрэсьліць повязь Беларусі з Захадам, заклікаць да вяртаньня ў Эўропу, выявіць адрознасьць беларускай гісторыі, беларускага нацыянальнага характару ад расейскіх. Вось як апісвае задачы сярэдняй адукацыі ў 1991—

[74] **Напрыклад, імкнулася Беларуская акадэмія навук** **Беларусі** **экспэдыцыя** ***Літаратуры і мастацтва*****, 19.02.1993.**

[75] **George Sanford, “Nation, State and Independence in Belarus,” *Communist and Post-Communist Politics*, Vol.3, No.3, 1997, p.230.**

1994 гадох адзін беларускі навуковец: “Вывучэньне беларускай гісторыі ў 5—11-х клясах павінна спрыяць нацыянальна-культурнаму адраджэньню беларускага этнасу праз азнаямленьне зь непаўторным гістарычным шляхам, матэрыяльнай і духовай культурай (беларускага) народу, ацэнку яго нацыянальнай самабытнасьці і каштоўнасьцяў у кантэксьце славянскай, эўрапейскай і сусьветнай культуры”[77]. Абраньне ў ліпені 1994 году прэзыдэнтам А.Лукашэнкі павярнула беларускую гістарыяграфію назад, у панславянскае, русафільска-савецкае рэчышча. Лідэр расейскіх лібералаў дэмакратаў-нацыяналістаў У.Жырыноўскі вітаў рашэньне Лукашэнкі адмовіцца ад новых падручнікаў па гісторыі, напісаных і выдадзеных пасьля 1991 году, з прыняцьцем іх “нацыяналістычнага ўхілу”[78]. Адпрэчыўшы здабыткі нацыянальнай гістарычнай школы, замацаваныя ў 1991—94 гадох, Лукашэнка вярнуў старыя савецкія падручнікі гісторыі, каб зьнівэляваць адрозьненьні паміж беларусамі і расейцамі, абгрунтаваць свае панславянскія ідэі, прадаўчыць краіну да былой савецка-расейскай мэтраполіі. Найбольш паважаныя беларускія пісьменьнікі пратэставалі супраць “гэтай спробы павярнуць назад раку гісторыі, атакі на духовую і інтэлектуальную свабоду нашага народу”[79]. Але Лукашэнка застаецца непахісным, бо бачыць у вяртаньні да Сонэрства савецкай гістарыяграфіі ўзору 1934 году спосаб заплюшчыць падтрымку сваёй палітыцы, скіраванай на стварэньне беларуска-расейскага саюзу[80].

Зноў адбылася цэнтралізацыя Акадэміі навук Беларусі, спыніліся ўсе непажаданыя для ўладаў дасьледаваньні. “На незалежных гісторыкаў сёньня глядзяць як на апазыцыянэраў”, — наракае адзін аўтар[81]. Віцэ-прэм’ер У.Замяталін папярэдзіў, што “правакацыйныя” матэрыялы будуць выкрасьленыя з падручнікаў па гісторыі Беларусі, бо “нацыяналістычная апазыцыя” падтрымлівае альтэрнатыўную гістарыяграфію, якая асуджае рэпрэсіі 30-х гадоў супраць беларускай культуры[82].

Вось асноўныя ідэалягічныя пастуляты цяперашняй русафільскай праімпэрскай беларускай гістарыяграфіі:

1. Самавызначэньне беларусаў зьвязваецца з расейскай, усходнеславянскай прасторай, а не з Заходняй Эўропай. Роля беларусаў у гісторыі ВКЛ замоўчваецца. Як заўважае Стывэн Б’юрант, “тых, хто хоча зьвязаць лёс Беларусі з Расеяй, мала

[76] **Rainer Lindner, “Besieged Past: National and Court Historians in Lukashenka’s Belarus” — pyramic, падрыхтаваны ў Annual Convention of the Association for the Study of Nationalities, Columbia University, 16 April 1999.**

цікавіць Вільня, Віленскі край, беларуская спадчына Вялікага Княства”[83].
2. Перасьлед беларускай мовы й культуры як за царскім рэжымам (напрыклад, зьнішчэньне Грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы ў 30-х гадох XIX стагодзьдзя, забарона беларускай мовы ў 1866 годзе), гэтак і за Саветамі (напрыклад, масавыя забойствы ў Курапатах у 1937—1941 гадох) абыходзіцца ўвагай.
3. Савецкая ўлада была “дабрадайнай” для Беларусі[84].
4. Да СССР Беларусі не існавала. Таму аснова Беларускай дзяржаўнасьці — Савецкая Беларусь.
5. У былым СССР Беларусь была “малодшай сястрой” Расеі.
6. Расейцаў зноў выяўляюць толькі “вызваліцелямі” і ніколі — захопнікамі.
7. У 1995 годзе нацыянальная сымболіка была замененая на перароблену савецкую.
8. Беларусь была адным з найбольш “адукаваных” рэгіёнаў СССР.
9. Да беларускай мовы пагардліва ставяцца як да нацыянальнай гаворкі. Калі чалавек бярэ за родную мову расейскую, ён ўважаецца за адзнаку “прагрэсу”.

[77] Міхась Біч, “Пра нацыянальную канцэпцыю гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь”, *Беларускі гістарычны часопіс*, Сакавік 1993, с.23.

[78] Kathleen J.Mihalisko, “Belarus: Retreat to Authoritarianism,” у Karen

Dawisha and Bruce Parrott, eds, *Democratic Change and Authoritarian Reaction in Russia, Ukraine, Belarus and Moldova* (Cambridge: Cambridge University Press, 1997), p.246.

[79] *Звязда*, 18.08.1995.

[80] Гл. Taras Kuzio and Marc Nordberg, "Nation and State Building, Historical Legacies and National Identities in Belarus and Ukraine: A Comparative Analysis," *Canadian Review of Studies in Nationalism*, Vol.26, Nos 1—

2, 1999, pp.69—90.

[81] IFEX Action Alert, 15 July 1999.

[82] *RFE/RL Newsline*, 25 February 1999.

[83] Stephen R.Burant, "Belarus and the 'Belarusian Irrendenta' in Lithuania," *Nationalities Papers*, Vol.25, No.4, 1997, p.654.

Малдова

Савецкі рэжым утварыў Малдаўскую рэспубліку пасля грамадзянскай сусьветнай вайны з Бэсарабіі ды ўкраінскага Прыднястроўя. Як і ў выпадку з Македоніяй, асобную нацыянальную ідэнтычнасьць самасьвядомасьць малдаванаў мэтанакіравана ўмацоўвала ды насаджала былая мэтраполія. Хоць спачатку ў Маскве сьцьвярджалі, што дзяржава будуецца на падмурку шматвекавой традыцыі, за гэтымі словамі можна не бачыць нейкі рэальны зьмест, толькі калі прызнаць прыналежнасьць Малдовы да Румыніі як адной з трох традыцыйных румынскіх зямель. Калі зь сярэдзіны 90-х малдаўская эліта пачала выступаць супраць аб'яднаньня з Румыніяй, то, каб даказаць сваё права на дзяржаўнасьць, яна зьвярнулася да мінулага гісторыі незалежнай дзяржаўнасьці Малдовы ў 1918 годзе.

У былым СССР малдаўскую ідэнтычнасьць насаджала савецкая ўлада, каб пацьвердзіць легітымнасьць свайго панаваньня ды пераканаць усіх у тым, што этнічна гэты рэгіён не належыць Румыніі. Малдаўскую (гэта значыць румынскую) мову перавялі на кірыліцу. Малдаўская савецкая гістарыяграфія імкнулася прыменшыць гістарычныя повязі з Румыніяй і перабольшыць славянскія карані Бэсарабіі. Да прыкладу, сьцьвярджалася, што 40% малдаўскіх словаў маюць славянскае паходжаньне.

84 Як напісаў Дэвід Марплз, "сучасныя беларусы схільныя настальгічна глядзець на савецкае мінулае". Гл. ягоную кнігу *Belarus. A Denationalised Nation* (Amsterdam: Harwood Academic Publishers, 1999), p.23.

85 Judy Batt, Federalism Versus Nationalism in Post-Communist State Building: The Case of Moldova," *Regional and Federal Studies*, Vol. 7, No. 3, 1997, p. 25.

86 *Ibid.*, p. 29.

Таму Малдова — “асабліва няўстойлівая новая дзяржава”[85].
Як і шмат якім іншым постсавецкім рэспублікам, ёй даводзіцца шукаць раўнавагу паміж умацаваньнем фэдэратыўных структураў і забесьпячэньнем правоў нацыянальных мяншыняў. Жорсткі ўціск мяншыняў, выкліканы боязьзю сэпаратызму ды нежаданьнем прызнаць, што Малдова — поліэтнічная дзяржава, прывялі да міжнацыянальных канфліктаў з Прыднястроўем і Гагаузіяй. Дзяржаўныя межы Малдовы вызначала кіраўніцтва былога СССР. Прызнаць гэта азначае для Малдовы прызнаць шматнацыянальнасьць краіны, яе культурную разнастайнасьць[86].
Праблема гагаузаў (цюрскага народу, які вызнае хрысьціянства) вырашылася праз наданьне ім аўтаноміі.
З Прыднястроўем усё больш складана, бо пытаньне сягае тых часоў, калі ў 1924 годзе ў межах Украіны ўтварылася Малдаўская АССР, якую пасьля 1945 году далучылі да Малдавіі. Яе ўваскрасілі ў верасьні 1991 году ў супрацьвагу ідэі паяднаць Малдову з Румыніяй. Расейскамоўныя *homo sovieticus* на чале Прыднястроўя праводзяць панславянскую, прасавецкую палітыку.
Як і іншыя постсавецкія дзяржавы, Малдова мусіць вызначыцца ў дачыненьні да Расеі. Але Малдова павінна вызначыцца і што да Румыніі, зь якой яна мае супольны сьцяг, супольную мову, а з XIX стагодзьдзя, калі казаць пра Бэсарабію, і супольную гісторыю. Творчая інтэлігенцыя арыентуецца на Румынію, у большасьці сваёй выступае за аб’яднаньне. Такім чынам, утварылася даволі дзіўная сытуацыя, калі інтэлігенцыя, якой належыць асноўная роля ў забесьпячэньні “культурнай гегемоніі” ды стварэньні новай нацыянальнай гістарыяграфіі, адмаўляе само існаваньне малдаўскай дзяржавы як “штучнага” расейска-савецкага ўтварэньня. Як і ў многіх посткаляніяльных дзяржавах, творчая інтэлігенцыя адарваная ад насельніцтва (пераважна вясковага), 80% якога ідэнтыфікуюць сябе толькі з сваёй мясцовасьцю. Таму аб’яднаньне з Румыніяй падтрымліваюць толькі 5—10% малдаванаў[87]. А гэта азначае, што праз разрыў між творчай інтэлігенцыяй і рэштай грамадзтва праблема самаідэнтыфікацыі яшчэ доўга ня страціць сваёй вастрыні[88].
У выніку рэформы школьных праграмаў у школах вывучаецца румынская нацыянальная гісторыя, падкрэсьліваецца

[87] ***Infotag,*** **11 February**

прыналежнасьць новаўтворанай дзяржавы да “Эўропы”, а не Эўразіі. У рэчышчы дэрусіфікацыі адбыўся пераход на лацініцу, вуліцам і гарадом вярнулі іх гістарычныя бэсарабскія назвы. Але пад гэтымі працэсамі цяпер падведзеная рыса. У 1994—2000 гадох малдаўская эліта ўзмоцнена прапагандавала ідэі малдаўскай дзяржаўнасьці, а не панрумынскасьці. Малдаўскім уладам не пазайздросьціш: яны вымушаны будаваць лібэральную нацыянальную дзяржаву, балянсуючы паміж творчай інтэлігенцыяй, арыентаванай на аб’яднаньне з Румыніяй, і левымі, якія хочуць, каб Малдова, на прыклад, Беларусі, памкнулася назад, у абдымкі былой расейскай савецкай імпэрыі[89]. Зь перамогай камуністаў на выбарах 2001 году малдаўская нацыянальная палітыка ў моўных і гістарыяграфічных пытаньнях вярнулася ў савецкае рэчышча. Па-сэпаратысцку настроенае Прыднястроўе, кіраўніцтва якога ў 1992 годзе пры падтрымцы савецкай, а пасьля расейскай арміі пасьпяхова вяло барацьбу з Малдовай, арыентуецца на Расею, на ўсходнеславянскую культурную прастору. Як заявіў прэзыдэнт прыднястроўскага сэпаратысцкага анкляву Сьмірноў, “нам наканавана арыентавацца на Расею”[90]. Прыднястроўскія сэпаратысты маюць хаўрусьнікаў у астатняй Малдове сярод левых, якія жадаюць, каб канстытуцыя надавала статус тытульных дзьвюм нацыям — малдаванам і расейцам, каб дзяржаўнымі абвяшчаліся дзьве мовы — малдаўская і расейская.

Каб Прыднястроўе засталося ў складзе Малдовы, неабходна аслабіць значэньне румынскае ідэнтычнасьці малдаванаў. Малдаўскае кіраўніцтва стаіць перад няпростым выбарам: альбо захоўваць нацыянальную дзяржаву як *de facto* досыць мяккую канфэдэрацыю Бэсарабіі ды Прыднястроўя (за што выказваецца былая мэтраполія Расея), альбо далучыць Бэсарабію да Румыніі, вярнуцца да міжваеннага статусу правінцыі. Такім чынам, посткаляніяльная спадчына працягвае адыгрываць у малдаўскай палітыцы вызначальную ролю, а “пытаньне нацыянальнага самавызначэньня будзе заставацца рухавіком малдаўскай палітыкі”[91].

1998.

88. Charles King, “Moldovan Identity and the Politics of Pan-Romanianism,” *Slavic Review*, Vol. 53, No. 2, 1994, p. 368.

89. *Ibid.*, p. 357.

[90] ***Московский комсомолец*, 29.01.1998.**

[91] **King, "Moldovan Identity and the Politics of Pan-Romanianism," p. 368.**

[92] **Гл. "The Central Asian**

калянізацыю, сэкулярызацыю, русіфікацыю ды шматлікія змешаныя шлюбы. Расейскія каляністы рэдка калі зьмешваліся з тамтэйшым насельніцтвам, мала хто браў зьмяшаныя шлюбы, і ў сябе клопату вучыць мову карэнных жыхароў. Імігранты-расейцы ўсьведамлялі сваю прыналежнасьць да СССР, а не да рэспублікі, у якой жылі. У Казахстане (і ў Кіргізіі), як ва Ўкраіне і Беларусі, этнічная разьяднанасьць тытульнай нацыі зашкодзіла кансалідацыі.

Ціск “зьнізу” — з боку творчай інтэлігенцыі — узмацніўся ў адказ на ціскам “зьверху” — з боку былой камуністычнай эліты, якая пасьля прымусіў пяць цэнтральнаазіяцкіх дзяржаваў зьняць (ці, прынамсі, адкласьці) тага праекту нацыянальнага будаўніцтва, калі мясцовы патрыятызм адмаўляецца на карысьць агульнанародзенага. У большасьці краінаў Расею пачалі ўважаць не за “старэйшага брата”, а за калянізатара, расейцаў паволі выціскалі з вышэйшых дзяржаўнай адміністрацыі, бізнэсу, банкаўскай сфэры, юрыспрудэнцыі. Іх паблажлівае стаўленьне да “нецывілізаваных” цэнтральнаазіяцкіх культураў было асабліва недарэчным мясцовым лідэрам, якія адраджаюць гістарычныя традыцыі, якія давесьці, што іх культурныя карані нашмат больш старажытныя й велічныя за расейскія, што да прыходу Расеі ў Цэнтральнай Азіі быў “залаты век”. Канстытуцыйна гарантуецца перавага тытульнай нацыі, культура і “карані” якой абараняюцца нацыянальнай дзяржавай. Расейскі ўплыў пашырыўся ці, прынамсі, зьменшыўся ў Казахстане (і Кіргізіі), бо там эліта нацыянальна падзяляюцца на казахскамоўных “натывістаў” і расейскамоўных “асымільваных” казахаў)[92].

Цэнтральнаазіяцкія дзяржавы легітымізуюць сваю дзяржаўнасьць праз новыя міты, якія даводзяць іхнія гістарычныя права на свае тэрыторыі. Складнікам новай дзяржаўнай ідэалёгіі робяцца традыцыйныя грамадзкія, культурныя і нацыянальныя вартасьці карэннае нацыі. Асобны цэнтар вяртаньня гістарычнай мінуўшчыны — вяртаньня цэнтральнаазіяцкіх нацыянальных герояў часоў “залатога веку”. Царская Расея атрымала адмоўную ацэнку, а Расея больш не ўспрымаецца як “носьбіта цывілізацыі”[93]. Па ўсёй Цэнтральнай Азіі помнікаў Леніна паўстаюць манумэнты героям дасавецкай пары, якіх часьцяком кляйміла савецкая гістарыяграфія[94].

Перад Казахстанам стаіць асабліва цяжкая задача фармаваньня

States as Nationalizing States” у Graham Smith, Vivien Law, Andrew Wilson, Annette Bohr and Edward Allworth, *Nation-building in the Post-Soviet Borderlands: The Politics of National Identities* (Cambridge: Cambridge University Press, 1998), pp. 139—166.

[93] **Gul Shirin Akiner, “Melting Pot, Salad-Bowl or Cauldron? Manipulation and Mobilization of Ethnic and Religious Identities in Central Asia,” *Ethnic and Racial Studies*, Vol. 20, No. 2, 1997, pp. 362—398.**

нацыі, ня толькі таму што яго грамадства падзяляе ці ўспрымае моўнай прыкметы, але й таму, што Казахстан — дзьвюхнацыянальная дзяржава з прыкладна роўнай колькасьцю расейскага й казахскага насельніцтва. І ўсё ж Казахстан сьцьвярджае, што будуе сваю дзяржаву на падмуроўкі шматвяковай гадовай традыцыі дзяржаўнасьці, якая ўзыходзіць да часоў Залатога Ханства сярэдзіны XV стагодзьдзя. Паўстаньні ў 1916 годзе супраць набору ў царскае войска і ў 1986-м супраць прызначэньня расейца першым сакратаром Камуністычнае партыі Казахстану тлумачацца як праявы прагненьня пазбавіцца ад іншаземнага панаваньня.

Каб абказашыць поўнач краіны, у 1998—1999 гадох сталіцу перанесьлі з Алматы ў Астану — новы палітычны й дзяржаўна-адміністрацыйны цэнтар краіны. (Праект каштаваў 1 млрд даляраў.) У новай сталіцы адкрылі помнік “тым вялікім героям, якія ў змрочныя часы не шкадавалі сілаў, каб абараніць бацькаўшчыну”. Новаўтвораная дзяржава называецца поліэтнічным грамадствам і ў той жа час адвечнай радзімай казахскага народу. Праўда, пры гэтым выкарыстоўваюцца толькі казахскія сымбалі й міты[96]. Казахская мова пашыраецца коштам выцісканьня расейскай, а 1998 год у рамках дзяржаўнай палітыкі, скіраванай на падтрымку казахскай нацыянальнай ідэі, быў абвешчаны “годам нацыянальнага адзінства і нацыянальнай гісторыі”.

У Алмаце ў 5-ю гадавіну незалежнасьці ў прысутнасьці прэзыдэнта Турцыі быў адкрыт вялікі манумэнт незалежнай Казахскай дзяржаве. Помнік цюрскаму продку-ваяру мусіць сьведчыць пра даўгую гісторыю Казахстану. У 5-ю гадавіну незалежнасьці прэзыдэнт Нурсултан Назарбаеў *урачыста* зьвязаў змаганьне за сувэрэнітэт краіны з нацыянальнымі выступленьнямі 1986 году — відавочна, ствараючы новы міт вытокаў дзяржаўнасьці. “Дзень незалежнасьці” Казахстану сьвяткуецца 12 сьнежня — у дзень, калі ў 1986 годзе пачалося “паўстаньне” супраць расейскай імпэрыі[97]. Паводле словаў прэзыдэнта Назарбаева, адраджэньне казахскай гісторыі азначае “адраджэньне духу нацыі”[98]. Дамовы з Расеяй 1731 і 1740 гадоў разглядаюцца як часовыя пагадненьні, а не як добраахвотнае ўзьяднаньне, як сьцьвярджала расейская і савецкая гістарыяграфія. (Падобным жа чынам зьмянілася ацэнка Пераяслаўскай дамовы 1654 году ў постсавецкай

94 Ці Richard **Boudreaux, “5 Nations in Search of Identity,” *Los Angeles Times*, 25 December 1996.**

95 ***Дадаткова:*** **11.06.1998.**

96 **Гл. Paul Kolstø, “Anticipating Demographic**

украінскай гістарыяграфіі.)

Superiority: Kazakh Thinking on Integration and Nation Building," *Europe-Asia Studies*, Vol.50, No.1, 1998, pp.51—69; Ian Bremmer, "Nazarbaev and the North: State Building and Ethnic Relations in Kazakhstan," *Ethnic and Racial Studies*, Vol.17, No.4, 1994, pp.619—635; ды Bhavina Dave, "National Revival in Kazakhstan: Language Shift and Identity Change," *Post-Soviet Affairs*, Vol.12, No.1, 1996, pp.51—72.

[97] Гл. Taras Kuzio, "Nationalist Riots in Kazakhstan," *Central Asian*

***Survey*, Vol.7, No.4, 1988, pp.79—100.**

[98] Adam Michnik, "Speaking with the Kazakh President," *Transitions*, Vol.4, No.1, 1997, p.29.

Высновы

У 13 з 14 нерасейскіх рэспублік былога Саюзу адбываецца "разьвітаньне з імпэрыяй", якое ўключае ў сябе разбудову і кансалідацыю нацыянальных дзяржаваў. Толькі ў Беларусі не назіраецца "пераходу ад імпэрыі", неад'емная частка якога — перамены ў нацыянальнай гістарыяграфіі. Малдова спрабуе пайсьці ўсьлед за Беларусяй, але невядома, да чаго прывядзе падобная палітыка, бо яна сутыкаецца з моцным супрацівам. У гэтым артыкуле разглядаліся прыклады чатырох постсавецкіх дзяржаваў у пяці рэгіёнах. Па-першае, фармаваньне нацыі ў трох зь іх (за выняткам Беларусі) ажыцьцяўляецца паводле лібэральнай мадэлі і спалучаецца з будаўніцтвам грамадзянскае нацыянальнае супольнасьці[99]. Па-другое, адзіная з разгляданых краінаў — Беларусь — пайшла іншым шляхам, бо дзяржаўная ўлада апынулася ў руках "асыміляваных" — расейскамоўных homo sovieticus. Яны спрабуюць правесьці беспрэцэдэнтны экспэрымэнт па інтэграцыі калёніі назад у былую імпэрыю — Расею. Малдова можа паспрабаваць зрабіць тое самае, што і Беларусь. Па-трэцяе, "постімпэрская трансфармацыя" ўва Ўкраіне, Малдове і Казахстане сутнасна адрозьніваецца ад тых працэсаў, што дзеяліся ў 70-х—80-х гадох у Лацінскай Амэрыцы (тая вызвалілася з-пад партугальскага й гішпанскага панаваньня ў

XIX стагодзьдзі) і ад таго, што раней адбывалася ў Цэнтральнай Эўропе. “Разьвітаньне з імпэрыяй” у постсавецкіх дзяржавах больш нагадвае досьвед посткаляніяльных краінаў Афрыкі й Азіі.

Па-чацьвёртае, Малдова дае прыклад фармаваньня, а не разбурэньня нацыі пры камуністах, як і Македонія ў былой Югаславіі. Украіна і Казахстан “вяртаюцца” да нацыянальнай гістарыяграфіі, зьнішчанай за часам імпэрыі. Ці ў Беларусі лукашэнкаўцы ўпэўненыя, што ніякай “нацыі” не было і што Расея была дабрадзейным “старэйшым братам”. І таму з чатырох прыведзеных прыкладаў Малдова, здаецца, нагадвае той тып посткаляніяльнай краіны, да якога могуць быліся калёніі заходніх імпэрыяў.

Па-пятае, Расея і Турцыя, у адрозьненьне ад заходнеэўрапейскіх дзяржаваў, не стварылі нацыянальных дзяржаваў да фармаваньня імпэрыі. Турэцкая нацыянальная дзяржава ўзьнікла толькі пасьля разбурэньня Асманскай імпэрыі. Распад Савецкай імпэрыі дае Расейскай Федэрацыі шанец ператварыцца ў нацыянальную дзяржаву. У Расеі дасюль не зьявіўся лідэр, падобны да Кемаля Ататурка, які б рэзка парваў з імпэрскім мінулым і зрабіў ставку на карысьць нацыянальнай дзяржавы. Кіраўніцтва Расеі ніяк ня можа вызначыцца, быць Расеі нацыянальнай дзяржавай ці ачольваць новы саюз і прэтэндаваць на ролю “вялікай дзяржавы” (як раней казалася, у такім выпадку Украіна і Беларусь), ці сумяшчаць гэтае і другое. Царская і савецкая імпэрыі пакінулі расейскаму грамадзтву постімпэрскі крызыс самаідэнтыфікацыі, зьвязаны з пошукам адказу на пытаньне, дзе ўсё ж знаходзіцца “Расея”. Гэта моцная спакуса наноў аб’яднаць імпэрыю (пра што сьведчыць беларускі прыклад).

Наастатку хацелася б сказаць, што галоўная думка гэтага артыкулу ў тым, што пераасэнсаваньне мінулага, адраджэньне нацыянальнай гісторыі і калектыўнай памяці адыгрываюць аснаватворную ролю ў “разьвітаньні з імпэрыяй” і пераадоленьні каляніяльнай спадчыны. У постсавецкіх дзяржавах (апроч Беларусі) вяртаньне нацыянальнай гісторыі адбываецца адначасова з адмаўленьнем ад царска-савецкіх імпэрскіх гістарычных мадэляў, якія пазбаўлялі гэтыя нацыі мінуўшчыны, цяпершчыны і будучыні. Новая нацыянальная

99 Пляўгаўскі Кузіо, “Nationalising States or Nation Building? A Review of the Theoretical Literature and Empirical Evidence,” *Nations and Nationalism*, Vol.7, No.2, 2001, pp.135—154; Пляўгаўскі Кузіо, “The Myth of the Civic State: A Critical Survey of Hans Kohn’s Framework for Understanding Nationalism,” *Ethnic and Racial Studies*, Vol.25, No.1, 2002, pp.20—39.

гісторыя імкнецца давесьці права новаўтвораных дзяржаў на незалежнасьць, зьвяртаючыся да “залатога веку” ў даімпэрскай гісторыі. Яна пацьвярджае права карэннай нацыі на свае тэрыторыі, не згаджаецца з навязаным імпэрыяй вобразам сваёй нацыі як “малодшага брата”, а яе культуры — як “ніжэйшай”, правінцыйнай.
У сваю чаргу, абавязак навукоўцаў — зьмясьціць працэсы “разьвітаньня з імпэрыяй” у постсавецкіх краінах у кантэкст дэкалянізацыі, што адбывалася ўва ўсім сьвеце пасьля другой сусьветнай вайны.

Пераклаў з ангельскай
Міхась Авечкін
паводле Nationalities Papers, Vol.30, No.2, 2002

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн і майстраваньне **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ (нар. у 1972 у Менску) — палітоляг. Дацэнт катэдры эканомікі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту.

Віталь Сіліцкі

Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі

Аўтар выказвае падзяку “Central European University Special and Extension Programs”, а таксама “Freedom House” (Будапэшт) за дапамогу, якая зрабіла магчымай напісаньне гэтай працы.

Уводзіны

Да канца XX стагоддзя Еўропа сутыкнулася з дзвюма краінамі, антыдэмакратычнасць палітычных рэжымаў у якіх не выклікала сумненняў. Прэзідэнт Сербіі, а потым Югаславіі Слабадан Мілошавіч і яго беларускі калега Аляксандр Лукашэнка падзялялі рэпутацыю апошніх дыктатараў на кантыненце. Адметныя характарыстыкі абодвух рэжымаў адпавядалі вызначаным вядомым палітолагам Хуанам Лінцам крытэрам аўтарытарызму як сістэмы “з абмежаваным... палітычным плюралізмам, без вызначанай і абавязковай ідэалогіі, але ж з

выразнымі ўстаноўкамі, без экстэнсіўнай ці інтэнсіўнай палітычнай мабілізацыі, апрача як на некаторых стадыях развіцця, у якой лідэр распараджаецца ўладай у слабавызначаных, але вельмі прадказальных межах”[1]. Да таго ж, абодва рэжымы адзначаліся высокай канцэнтрацыяй фармальнай і нефармальнай улады ў руках адной асобы, што дазваляе вызначыць іх як персаналісцкія, “дзе доступ да ўлады і перавагі ад улады залежаць найболей ад рашэння асобнага лідэра”[2]. І хоць персанальны аўтарытарызм — з’ява звыклая, скажам, на постсавецкай прасторы, адметнасцю Мілошавіча і Лукашэнкі была іх здольнасць усталяваць “квазідэмакратычную легітымнасць”, г.зн., заваяваць рэальную падтрымку грамадства ў канкурэнтнай палітычнай барацьбе для таго, каб потым пабудаваць яскрава недэмакратычную сістэму ўлады.

У гэтым Сербія і Беларусь адрозніваліся ад, скажам, большасці краінаў Цэнтральнай Азіі і Закаўказзя, дзе пераход ад савецкага таталітарызму да персанальнай аўтакратыі адбыўся ў мяккім рэжыме (Казахстан, Узбекістан, Туркменістан) альбо ў выніку грамадзянскай вайны (Азербайджан і Таджыкістан). Высокаперсаналізаваная сістэма ўлады, падобныя прынцыпы адносінаў паміж дзяржавай і грамадствам, ізаляцыя рэжымаў (а ў выпадку Сербіі — і самой краіны) міжнароднай супольнасцю — усё гэта рабіла Сербію і Беларусь у 1990-х гадах падобнымі адна да адной і адметнымі ад большасці краінаў Усходняй Еўропы, дзе адбываўся пераход да дэмакратыі. Гэтыя падабенствы кантраставалі з надзвычай рознай “спадчынай мінулага”, якая, здавалася б, запэўнівала, што дзве краіны апынуцца на супрацьлеглых палітычных траекторыях пасля краху камуністычнай сістэмы. Так, дастаткова нагадана і сказана пра гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя перадумовы лукашэнкаўскага аўтарытарызму ў Беларусі. Аднак Сербія, якая апынулася ў падобных умовах, вызначалася часамі Ціта больш высокай ступенню эканамічнай і палітычнай лібералізацыі ды адкрытасцю перад Захадам, у чым яна відавочныя перавагі перад Беларуссю — эканамічным і вайсковым фарпостам савецкай імперыі. Моцнае пачуццё нацыянальнай самасвядомасці ў сербаў таксама радыкальна кантрастуе са станам беларускай “дэнацыяналізаванай нацыі”[3]. А менавіта адсутнасцю нацыяналізму некаторыя дасследнікі тлумачаць узыход Лукашэнкі[4] (цікава тое, што менавіта

1. **Juan J. Linz and Alfred Stepan. Problems of Democratic Transition and Consolidation: Southern Europe, Latin America, and Post-Communist Europe. Baltimore: Johns Hopkins University Press, 1996. P. 38.**

2. **Barbara Geddes, What do We Know**

нацыяналізм вызначаўся большасцю даследнікаў як галоўная крыніца сербскага аўтарытарызму). Далей, існавалі спецыфічныя адрозненні ў дынаміцы будавання посткамуністычнай аўтарытарнай сістэмы, такія, як паходжанне дзяржавы, час і паслядоўнасць пераходу ад камуністычнай да посткамуністычнай дыктатуры, а таксама роля вайны ў фармаванні палітычнага рэжыму. Нарэшце, нягледзячы на падабенствы, дзве краіны размінуліся напрыканцы 1990-х гг. Рэжым Мілошавіча скалапсаваў пасля таго, як ён прайграў у 2000 годзе прэзідэнцкія выбары, ім жа і арганізаваныя. Аднак прэзідэнцкія выбары ў Беларусі ў 2001 годзе паказалі, што здольнасць беларускага аўтакрата пацвердзіць свае прэтэнзіі на ўладу шляхам маніпуляцыі выбарчым працэсам застаецца надзвычай высокай. Найбольш сумным аспектам паразы для апанентаў Лукашэнкі з'яўляецца тое, што беларускі прэзідэнт сапраўды здолеў заваяваць большасць галасоў, а парушэнні выбарчага права і маніпуляцыі дазволілі яму толькі задэкляраваць большую ступень перамогі, а не выкрасці яе ў апазіцыі.

About Democratization after Twenty Years? // Annual Review of Political Science. Vol.2 1998. P.121.

[3] David Marples. Belarus: A Denationalized Nation. Harwood Academic Publishers, 1999.

[4] Гл.: Kathleen Mikhalisko. Belarus: A Return to Authoritarianism // Democratic Changes and Authoritarian Reactions in Russia, Ukraine, Belarus, and Moldova / Ed.Karen Dawisha and Bruce Parrot. Cambridge: Cambridge University Press, 1998; Stephen Eke, Taras Kuzio. Sultanism in Eastern Europe: Explaining the Roots of Authoritarian Populism in

Belarus // Europe-Asia Studies. Vol.52, no.34. 2000. P.523—537.

Гэтая праца мае тры мэты. Першая мэта — растлумачыць прычыны, з якіх посткамуністычныя аўтарытарныя рэжымы ўзнікаюць як больш жыццяздольная альтэрнатыва дэмакратыі, выжываюць на працягу даволі доўгага часу, нягледзячы на эканамічны заняпад і моцны ціск звонку, і ўрэшце знікаюць ці трансфармуюцца. Другая мэта — больш тэарэтычная. Я паспрабую прааналізаваць, як наяўныя тэорыі трансфармацыі палітычных рэжымаў пасуюць да вывучэння ўзнятай праблематыкі і якія існуюць магчымасці для канцэптуальнай і тэарэтычнай інавацыі ў гэтай галіне. Трэцяя мэта — на падставе вопыту Сербіі я паспрабую прааналізаваць магчымыя сцэнары палітычнай трансфармацыі Беларусі ў будучым. Даследаванні посткамуністычнай трансфармацыі ў сваёй большыні канцэнтруюцца на праблематыцы дэмакратыі і робяць акцэнт на аналізе чыннікаў, якія спрыяюць яе выжывальнасці і кансалідацыі. Нават калі стала зразумелым, што толькі меншасць з былых камуністычных краінаў пасля доўгага перыяду трансфармацыі адпавядаюць крытэрам заходняй ліберальнай дэмакратыі[5], "дэмакратызацыйны стэрэатып" усё роўна пераважаў — даследнікі пачалі надаваць прыметнікі для азначэння "нестандартных" дэмакратыяў, вызначаючы іх як "хісткія", "недасканалыя" альбо "неліберальныя". Аднак за гэтым адчуваўся дэфіцыт увагі да відавочна недэмакратычных вынікаў посткамуністычнага палітычнага развіцця, канцэнтрацыі на праблематыцы аўтарытарызму. Краіны, якія было немагчыма "падвесці" пад "парадыгму дэмакратызацыі", аналізаваліся як выключэнні. Як правіла, даследнікі канцэнтраваліся на недахопах, якія б спрыялі дэмакратычнаму развіццю, скажам, у Беларусі ці Сербіі, у параўнанні, напрыклад, з Украінай ці Польшчай. Аднак такая стратэгія аналізу не апраўдала сябе тады, калі стала відавочным, што аўтарытарныя тэндэнцыі распаўсюдзіліся на значна большую колькасць краінаў, чым прызнавалася раней. Сёння, калі і старыя, і новыя краіны (да іх можна аднесці Расію ці Украіну) ужо разам

[5] Падвядзенне пад **ацэнкі** "Freedom House", **Indices**, да **такіх** 2001 **годзе**, **належалі Славенія, Польшча, Чэхія,**

канцэптуалізуюцца як “гібрыдныя рэжымы”, ці “канкурэнтныя аўтакратыі”[6], яны разглядаюцца як больш падобныя на аднаго, чым здавалася раней. А значыць, разгляд гібрыдных рэжымаў як нейкіх недарэчнасцяў ці выключэнняў з агульнага кантэксту трансфармацыі ўжо сам па сабе выглядае недарэчным.

Славакія, Венгрыя, Славенія, Харватыя, Балгарыя, Румынія, Літва, Латвія і Эстонія, якія вызначаны як “вольныя”. У той жа час Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Узбекістан, Туркменістан, Таджыкістан, а таксама рэгіёны Косава, Прыднястроўе, Абхазія і Паўднёвая Асецыя вызначаны як “нявольныя”, а астатнія — Расія, Украіна, Малдова, Грузія, Арменія, Азербайджан, Боснія, Македонія і Албанія — як часткова вольныя.

[6] Larry Jay Diamond.

Thinking about Hybrid Regimes // Journal of Democracy. Vol.13, no.2. 2002. P.21—35; Steven Levitsky and Lucan Way. The Rise of Competitive Authoritarianism // Journal of Democracy. Vol.13, no.2. 2002. P.51—65

Канцэнтруючыся на праблематыцы аўтарытарызму, я задаюся пытаннем “чаму паўстаў аўтарытарны рэжым?”, а не “чаму пацярпела паразу дэмакратыя?” ці “чаму дэмакратычная трансфармацыя скончылася няўдачай?”. Паколькі дыктатуры могуць быць апісаныя такой жа колькасцю прыметнікаў, як і дэмакратыі, для таго каб апісаць і растлумачыць канкрэтны тып палітычнага рэжыму, недастаткова проста прааналізаваць фактары, якія прадухілілі дэмакратычную трансфармацыю. Болей за тое, сённяшнія дыктатарскія сістэмы ў посткамуністычным рэгіёне не могуць быць аналізаваныя як простыя рэінкарнацыі таталітарнага мінулага, бо тады мы вымушаны былі б згадзіцца, што ў жыцці гэтых краінаў нічога не змянілася. Такая стратэгія мыслення надзвычай небяспечная. Яна не дазваляе заўважыць, што ў пераважнай большасці новых аўтарытарных рэжымаў адсутнічаюць найбольш выпрацаваныя і сістэматычныя механізмы таталітарнага кантролю, такія, як манаполія камуністычнай партыі на ўладу і наяўнасць гарманічнай афіцыйнай ідэалогіі, якая б легітымізавала ўмяшальніцтва дзяржавы ў кожную праяву палітычнага, эканамічнага, грамадскага і нават прыватнага жыцця. Нават калі ўлічыць, што руіны таталітарнай сістэмы інтэграваныя ў новую палітычную канструкцыю, а некаторыя яе механізмы (такія, як панаванне дзяржаўнай уласнасці, цэнзура ці карныя органы) старанна

рэканструяваныя, усё гэта не дае падставы вызначыць новыя палітычныя рэаліі як таталітарныя: сапраўды, абмежаваны палітычны плюралізм, некаторая свабода дзеяння для няўрадавага сектару ды незалежнай прэсы і даволі ліберальная сацыяльная атмасфера не пасуюць да ідэальнага тыпу, апісанага, напрыклад, Оруэлам. А значыць, і фундаментальная логіка існавання падобных рэжымаў адрозніваецца ад уласцівай савецкай сістэме. Іншымі словамі, калі краіна не дэмакратызавалася, гэта яшчэ не значыць, што яна не трансфармавалася (проста трансфармацыя, якая адбылася ў ёй, была іншай прыроды). Разважанні, што Сербія ці Беларусь вярнуліся да дыктатуры, бо ў іх не існавала ўмоваў для крызісу старой сістэмы, не дазваляюць заўважыць, што многія фактары, якія спрыялі дэмакратызацыі ў краінах Усходняй Еўропы (такія, як крызіс легітымнасці старой сістэмы, узнікненне палітычнага плюралізму, эканамічны крызіс ці рост сацыяльнай актыўнасці і аслабленне механізмаў таталітарнага кантролю), не толькі былі ў наяўнасці, але якраз і сталіся штуршком да ўзнікнення новых недэмакратычных рэжымаў Мілошавіча і Лукашэнкі. Інакш кажучы, два лідэры не перадухілілі, а выкралі трансфармацыю і скарысталі яе ў сваіх мэтах, атрымаўшы перамогу ў канкурэнтнай палітычнай барацьбе і здолеўшы прадставіць сябе на пэўны час як болей прывабную альтэрнатыву ў параўнанні з дэмакратычнымі апанентамі. Я будую свой аналіз двух рэжымаў менавіта ў кантэксце “выкрадзенай” і перанакіраванай трансфармацыі.

Чаму варта звярнуць увагу на такія, здавалася б, акадэмічныя і тэарэтычныя аспекты аналізу? На мой погляд, толькі на падставе адэкватнага аналізу генезісу палітычнага рэжыму можна зразумець механізмы яго функцыянавання і выжывання, ці, выкарыстоўваючы лацінскую тэрміналогію, акрэсліць яго *modus operandi* і *modus vivendi*. І толькі калі вызначаныя структура і механізмы палітычнага рэжыму, можна вызначыць магчымыя сцэнары яго трансфармацыі. Што да параўнальнага аналізу, ягонай галоўнай перавагай з’яўляецца тое, што на падставе фактаў, якія мы ведаем, мы можам рабіць высновы аб падзеях, якія для нас пакуль з’яўляюцца невядомымі. Пры ўсіх адрозненнях паміж досведам Беларусі і Сербіі (якія самі з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для аналізу і будуць

разгледжаныя ніжэй), шматлікія падабенствы дазваляюць пры дапамозе адпаведнай метадалогіі аналізу зазірнуць у будучыню беларускага палітычнага развіцця.

Звернемся да дыскусіі наконт пытання, ці магчыма “ўставіць” посткамуністычную трансфармацыю ў рамкі распаўсюджаных тэорый трансфармацыі, што былі выпрацаваныя на досведзе Паўднёвай Еўропы, Лацінскай Амерыкі і астатняга трэцяга свету. Большасць літаратуры па посткамуністычнай трансфармацыі грунтуецца на двух тэарэтычных падыходах, што былі пакінутыя ў спадчыну “транзіталогіяй”. Першы падыход лічыць галоўнымі структурныя перадумовы для дэмакратыі, якія амаль што праграмуюць дзеянні палітычных гульцоў. Другі падыход бярэ пад увагу саміх гульцоў і аналізуе іх здольнасць дамагчыся пэўных палітычных вынікаў ва ўмовах, што вызначаюцца непрадказальнасцю. Спробы вызначыць адэкватнасць старых тлумачэнняў скончыліся тым, што да старога багажу пераменных дадаліся новыя (найбольшым дадаткам стаў нацыяналізм і нацыянальная ідэнтычнасць, што адлюстроўвалі спецыфіку посткамуністычных трансфармацый, а адначасова і працэс нацыянальнага будаўніцтва). Нарэшце, пацвердзілася старая выснова Сэмюэла Хантынгтона, які больш за дзесяць год таму заявіў, што “(1) ніводны фактар не з’яўляецца дастатковым, каб растлумачыць развіццё дэмакратыі ва ўсіх краінах ці ў асобнай краіне; (2) ніводны фактар не з’яўляецца неабходным для развіцця дэмакратыі ў кожнай краіне; (3) дэмакратызацыя ў кожнай краіне з’яўляецца вынікам камбінацыі фактараў”[7]. Тлумачэнні, што ўключаюць некалькі фактараў, ці пераменных, аднак, павінны, па-першае, імкнуцца да абмежавання іх колькасці — для таго каб праца мела нейкую тэарэтычную вагу і не зводзілася да высновы, што “ўсё мае ўплыў”; па-другое, абмежаваць тое поле фактаў і выпадкаў, на якія тлумачэнне пашыраецца, — каб пазбегнуць “расцягвання канцэпцыі” да межаў, калі яна губляе хоць нейкую тлумачальную здольнасць; і па-трэцяе, паказаць, як вызначаныя даследнікам фактары звязаныя паміж сабой — што прыводзіць да спецыфічнага палітычнага выніку, які б адрозніваўся ад таго, што было б, калі б хоць адзін з іх “выпадаў”. Менавіта існаванне такой комплекснай прычыннай узаемасувязі паміж некалькімі фактарамі і дазваляе выкарыстоўваць стары аналітычны багаж для будавання

тэарэтычнай канцэпцыі замест увядзення новых тэорый альбо высвятлення, якая са старых больш адэкватная.

[7] Samuel Huntington. The Third Wave: Democratization in Late Twentieth Century. University of Oklahoma Press, 1991.

Структурныя тлумачэнні палітычных трансфармацый вызначаюць грамадскія, эканамічныя і культурныя перадумовы, што робяць “пераходныя краіны” больш ці менш падобнымі да ідэальнага тыпу заходняй ліберальнай дэмакратыі нават да таго, як палітычны пераход пачаўся. Да такіх перадумоваў адносяцца больш высокі ўзровень эканамічнага развіцця і нізкі — сацыяльнай няроўнасці, узровень урбанізацыі і індустрыялізацыі, адукацыйны ўзровень грамадства, досвед рынкавай эканомікі за папярэднімі часамі, што пакінуў у спадчыну сярэдні клас і прадпрымальніцкую этыку. Наадварот, адсутнасць гэтых перадумоваў не спрыяе ўмацаванню дэмакратыі ці нават яе з’яўленню.

Культурныя тлумачэнні ў сваёй логіцы паўтараюць структурныя, калі лічыць, што культура — гэта пэўная “ментальная структура”, што адлюстроўваецца ў чалавечых думках, каштоўнасцях і, як вынік, у дзеяннях. Культура адрозніваецца сваёй трываласцю і здольнасцю да рэпрадукцыі праз інстытуты і ўладныя адносіны, якія яна легітымізуе і дыктуе. Таму якасці пэўных “ментальных структур”, што

вызначаюць грамадскую свядомасць, і робяць грамадства больш ці менш схільным да таго ці іншага тыпу палітычнага рэжыму. Звычайна такія тлумачэнні абмяжоўваюць “арэал дэмакратыі” да пратэстанцкіх і каталіцкіх грамадстваў, дзе масавая культура вызнае такія вартасці, як “роўнасць у правах”, індывідуалізм і давер паміж асобамі[8].
Паколькі структуры ўяўляюць сабой спадчыну мінулага, відавочнай перавагай структурнага падыходу з’яўляецца тое, што ён дазваляе звязаць цяперашняе з мінулым і праз гэта — выпрацаваць бачанне будучага. Пры такім падыходзе палітычны працэс губляе містычную нявызначанасць і бескантэкстнасць. Болей за тое, менавіта структурны падыход, выразна акрэсліваючы фактары, на якія звяртае ўвагу, дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць параўнальны метад у даследаванні і рабіць пэўныя генералізацыі.

[8] Гл.: Samuel Huntington. The Clash of Civilizations and the Remaking of the World Order. Touchstone Books, 1998; Culture Matters: How Values Shape Human Progress / Eds. Samuel Huntington and Lawrence Harrison. Basic Books, 2001.

Аднак, нягледзячы на відавочныя перавагі, структурны метад мае і свае недахопы. Па-першае, большасць тлумачэнняў носіць імавернасны характар, бо структурная спадчына ў найлепшым выпадку акрэслівае дыяпазон магчымасцяў для пэўнага грамадства, але не здольная растлумачыць канкрэтны вынік у акрэсленым дыяпазоне. Да таго ж, структурны аналіз палітычных трансфармацый спрацоўвае лепш за ўсё, калі трэба растлумачыць розніцу ў “палярных” выпадках — скажам, у посткамуністычным палітычным развіцці Польшчы і Туркменістану. Але ж ці здольны ён эфектыўна спрацаваць пры аналізе “памежных” выпадкаў ці, скажам, адрозніць аўтарытарызм ад “гібрыдных рэжымаў” або “гібрыдныя рэжымы” ад “канкурэнтных аўтакратый”, калі ўсе вышэйзгаданыя палітычныя канструкцыі спалучаюць у сабе элементы як аўтарытарызму, так і дэмакратыі? Дарэчы, тут структурны аналіз губляе з поля зроку важную акалічнасць: адно і тое грамадства, як правіла, дзейнічае ва ўмовах “структурнай разнастайнасці”, калі розныя і супярэчлівыя аспекты сацыяльнай, культурнай і эканамічнай спадчыны павінны, згодна з логікай рэчаў, праграмаваць супярэчлівыя вынікі палітычнага развіцця[9]. Такая супярэчлівасць ужо была паказаная напачатку, калі былі пералічаныя, здавалася б, моцныя “структурныя перадумовы” для дэмакратыі ў Сербіі, згодна з якімі яна яшчэ на пачатку 1990-х мусіла крочыць разам з Польшчай і Эстоніяй, а не з Беларусяй. З іншага боку, уявіце сабе традыцыйнае мангольскае грамадства, якое на працягу дзесяцігоддзя заставалася адным з самых вольных у свеце! І зусім цікава будзе адзначыць, што па некаторых структурных фактарах, якія выкарыстоўваліся беларускімі і заходнімі назіральнікамі для тлумачэння беларускага аўтарытарызму (скажам, дэмаграфічная структура, узровень эканамічнага развіцця ці адукацыйны ўзровень насельніцтва), Беларусь знаходзілася наперадзе, а не ў хвасце трансфармацыйных краінаў! (І гэта не значыць, што структуры нічога не вызначаюць; аднак менавіта на падставе такіх параўнальнага метаду мы прадэманструем, якія абмежаванні на падобны ход падзеяў у, здавалася б, супрацьлеглых кантэкстах.) Па-трэцяе, структурны аналіз разглядае нікі палітычнага развіцця як запраграмаваныя, пры гэтым выводзячы мноства сваіх высноваў post factum. Пры

[9] “Грамадства, якія **трымаюцца на** **практыках** **абмежаванні** **мностваў** **рознага** **структур,** **існуюць на**

поля зроку губляецца дынаміка палітычнага працэсу. Для палітычнага даследніка і практыка ў роўнай ступені важна не толькі што адбылося, але і калі адбылося, як і ў якой паслядоўнасці. Сёння, напрыклад, можна перарабіць старыя аргументы і сказаць, што “структурныя” і культурныя перадумовы дэмакратыі ў Беларусі і, скажам, Расіі ды Украіне істотна не адрозніваліся, таму ва ўсіх гэтых краінах урэшце ўсталяваўся той ці іншы тып недэмакратычнага рэжыму – гэта будзе абсалютна слушна. Аднак менавіта адсутнасць і як такая палітычная канструкцыя была ўсталяваная і тое, як яна функцыянуе, і тое, як яна далей будзе трансфармавацца (ці здолее захавацца на працягу перыяду часу). Напрыклад, цалкам лагічна будзе зрабіць выснову, што трансфармацыя персаналісцкіх аўтарытарызмаў (што маглі ўзнікнуць толькі на пачатку трансфармацыйнага перыяду, калі працэсы эканамічных рэформ не завершаны) і алігархічных “гібрыдаў” (што ўсталяваліся пад уплывам працяглай эканамічнай і палітычнай трансфармацыі) у дэмакратыі паводле розных сцэнараў.

дэмакратыі, умераванай, дэфектнай у розных варыянтах і самадастатковай, якія трымаюцца на розных тыпах і ўзроўнях легітымнасці, і як яна развіваецца (William H. Sewell, A Theory of Structure: Duality, Agency, and Transformation // American Journal of Sociology. Vol.98, issue 1, 1992, July. P.16).

Альтэрнатыўны тэарэтычны падыход, які дазваляе зразумець працэс і вынікі палітычнай трансфармацыі, можна вызначыць як “стратэгічны”. Ён базуецца на выснове, што “сітуацыі, у якіх нечаканыя падзеі, недастатковая інфармацыя, паспешлівыя і рызыкоўныя рашэнні, неакрэсленасць матываў і інтарэсаў, гнуткасць і нават нявызначанасць палітычнай ідэнтыфікацыі ды талент асобных індывідуумаў часта абумоўліваюць палітычныя наступствы, вылучаюцца высокай ступенню няпэўнасці”[10].

Як вынік, стратэгічны падыход адводзіць чалавечаму фактару цэнтральную ролю ў вызначэнні вынікаў палітычных трансфармацый, прызнае, што палітычныя рэжымы могуць быць змайстраваныя гульцамі, якія прадэманструюць дастатковы здольнасці “ў абмежаваных у часе палітычных гульнях”. “Майстраванне” дэмакратыі пры гэтым можа адбывацца ва ўмовах, калі структурныя фактары не абяцаюць поспеху падзеяў.

[10] **Adam Przeworski, in: Guillermo O'Donnell, Philippe Schmitter, and**

Праблемы, што ўзнікаюць пры выкарыстанні “стратэгічнага”

падыходу для аналізу палітычных трансфармацый, адрозніваючыся тым, з якімі можна сутыкнуцца пры “структурным” аналізе. На гэты раз перабольшваецца заблытанасць і непрадказальнасць іх вынікаў, а таксама робіцца не зусім апраўданая ўстанова аб бескантэкстнасці працэсаў трансфармацыі і аб аналізе неабмежаваных магчымасцях будавання дэмакратыі “на голым месцы”. Больш за тое, звычайна стратэгічны падыход нават адмаўляе ў самой магчымасці выкарыстання навуковых метадаў пры аналізе, аддаючы перавагу эсэістычнаму асуджанню працэсаў без адпаведнай сістэматызацыі вынікаў даследавання. У найлепшым выпадку стратэгічны падыход пакідае павярхоўнае бачанне працэсу, тое, што ў апошні час атрымала назву “парадыгма трансфармацыі”, якая базуецца на схематычным акрэсленні трох асноўных яе стадыяў (лібералізацыя, дэмакратызацыя і кансалідацыя дэмакратыі), праз якія нібыта павінна прайсці кожная краіна, што пераходзіць ад дыктатуры да дэмакратыі, да таго ж на кожнай стадыі ключавым фактарам поспеху з’яўляецца менавіта майстэрства ўнутраных ці вонкавых палітычных актораў[11]. Такі падыход уздымае шэраг праблемаў не толькі для даследнікаў (вымушаных адмовіцца ад спробы зразумець не толькі тое, *што* адбываецца, але і *чаму*), але і для практыкаў: парадыгма трансфармацыі робіць важкі акцэнт на магчымасць будавання “дэмакратыі без перадумоў” і на тое, што працэсы дэмакратызацыі паўсюль больш-менш аднолькавыя. Гэта вядзе да механічнай рэплікацыі вопыту “будавання дэмакратыі” ў кожнай новай краіне, што ўрэшце прыводзіць да частковай ці поўнай няўдачы такіх высілкаў. Структура і спадчына ўсё ж аказваюцца фактарамі, якія проста нельга ігнараваць.

Lawrence Whitehead. Transitions from Authoritarian Rule. Baltimore: Johns Hopkins University Press, 1986. P. 5.

Роля нацыяналізму і ўзаемасувязь паміж нацыяй і дэмакратыяй, працэсам нацыянальнага будаўніцтва і дэмакратызацыяй вельмі неадназначныя. Нацыяналізм — ідэалогія “вельмі гнуткая ў адносінах да рэжыму, дзяржавы і эканомікі. Так, нельга, як некаторыя робяць, атаясамліваць нацыяналізм з пэўнымі палітычнымі праектамі”[12]. Нацыяналізм можа адыграць вельмі станоўчую ролю ў працэсе дэмакратызацыі ў той ступені, у якой ен умацоўвае магчымасці супольнасці ў грамадстве, якое, у сваю чаргу, неабходна для гарантавання лаяльнасці да дзяржавы — што з’яўляецца галоўнай перадумовай дэмакратычнага ладу[13]. У той жа час гэта стварае “кансэнсус наконт базавых каштоўнасцей” і пачуццё супольнасці лёсу, змяншае значэнне палітычных ці іншых адрозненняў паміж яго прыхільнікамі і, такім чынам, ліквідуе глебу для канфліктаў, што могуць перарастаць у падпарадкаванне адной групы іншай. У той жа час, нацыяналізм можа пагражаць дэмакратыі ва ўмовах, калі нацыя вызначаецца ў межах, што не супадаюць з межамі дзяржавы і супольнасці, якая яе ўтварае, бо такое вызначэнне стварае глебу для выключэння некаторых групаў з палітычнага працэсу ці для палітыкі тэрытарыяльнай агрэсіі. Менавіта “нацыяналістычныя дыктатуры” вызнаваліся некаторымі назіральнікамі як галоўная пагроза працэсу дэмакратызацыі[14].

[11] **Гл.: Thomas Carothers. The End of Transition Paradigm // Journal of Democracy. Vol.13, no.1. 2002. P.5—21.**

[12] **Valerie Bunce. Subversive Institutions: The Design and Destruction of Socialism and the State. Cambridge University Press, 1999. P.150.**

[13] **“Як і прынцып большасці, дэмакратыя патрабуе**

Я інтэрпрэтую праблематыку нацыяналізму ў межах адзін з вышэйазначаных тэарэтычных падыходаў. З аднаго боку, “нацыі” — гэта сацыяльныя і культурныя канструкты, ці “структуры”, што фармуюць працэс трансфармацыі і рэгулявання ўзаемадзеяння паміж людзьмі і групамі людзей, аказваюць уплыў на стратэгіі палітычных гульцоў. З другога боку, нацыянальнае будаўніцтва — гэта стратэгія, праз якую рэалізуецца палітычная трансфармацыя (актуальная ці патэнцыяльная) тэзісу для посткамуністычнага рэгіену відавочнае: “нацыя” з’яўляецца дадзенай ці стабільнай канструкцыяй, этнічная ці якая ніколі не сканчаецца і якая фармуецца, між іншым, праз працяглай барацьбой паміж людзьмі за ўладу, грошы і культурныя сімвалы”[15]. Такім чынам, простай узаемасувязі паміж дэмакратыяй і нацыяналізмам не існуе. Як правіла, монаэтнічныя дзяржавы без істотных нацыянальных меншасцяў маюць большыя шанцы на паспяховае дэмакратычнае будаўніцтва, бо ў іх не існуе ці амаль не існуе глыбокага этнічнага канфлікту і супярэчнасці паміж працэсамі дэмакратыі і нацыі. Такія супярэчнасці часцей існуюць у поліэтнічных дзяржавах. У астатніх выпадках, калі нацыянальныя перамены адбываюцца да таго, як працэс нацыянальнай кансалідацыі завяршыўся, менавіта палітыка нацыянальнага самавызначэння (ці перавызначэння) выконвае кіруючую ролю ў завяршэнні палітычнай трансфармацыі. Тое, ці будуць палітычныя сістэмы “грунтавацца на шырокіх і ўстойлівых грамадзянскіх прынцыпах такім чынам, каб усе грамадзяне мелі роўныя правы”[16], залежыць ад палітычных актораў і іх здольнасці будаваць ці руйнаваць пачуццё супольнасці сярод грамадзянамі, вызначаць “дэмас нацыі” і “дэмас дзяржавы” паасобку ці разам ды разводзіць або сумяшчаць сацыяльныя вартасці і сімвалы, што з’яўляюцца крыніцамі самапавагі грамадства, з прынцыпамі і вартасцямі дэмакратычнага

адзін з (мабыць, на ўказ, ці дзяржавам — Айні). Крытэры ўзаемакарыснага працэсу праз якую працягласці. Нацыя” з’яўляецца дадзенай, стабільнай канструкцыяй, этнічная ці якая адзінкі. Калі сама гэта адзінка не прысвяцца перавызначэнай… надзвычайна існуе ў надаюць дэмакратычных пераўтварэнняў” (Robert A.Dahl. Democracy and its Critics. New Haven: Yale University Press, 1989. P. 207).

[14] Гл. Нацыяналістычныя дыктатуры супраць адкрытага грамадства. Менск: Фонд Сораса, 1992.

[15] **Bunce V.**
Op. cit. P.12.

[16] **Linz J.J. and**
Stepan A.,
Op. cit. P.25.

Мой падыход спрабуе аб'яднаць моцныя бакі абодвух

падыходаў і інтэграваць іх у адзіны. Па-першае, я разглядаю “структурную спадчыну” як акалічнасць, якая абмяжоўвае рамкі магчымага для палітычных актораў, пакідаючы за межамі дасягальнага некаторыя праекты, аднак сама па сабе не гарантуе нейкага канкрэтнага палітычнага выніку ў межах магчымага. Скажам, пэўныя абмежаванні маглі прадухіліць развіццё падзеяў у Беларусі паводле польскага ці прыбалтыйскага сцэнару, але гэта не азначае, што яны не маглі ісці паводле ўкраінскага ці, скажам, балгарскага варыянту. Па-другое, структурная спадчына не толькі абмяжоўвае дзеянні палітычных актораў, але і з’яўляецца пэўнай крыніцай інфармацыі і рэсурсаў, якую яны могуць выкарыстоўваць у сваіх дзеяннях. Што з магчымага адбываецца насамрэч, вызначаюць дзеянні і стратэгіі палітычных актораў, іх “абазнанасць” і здольнасць улічыць абмежаванні ды скарыстацца магчымасцямі, якія пакідаюць “структуры”. Такім чынам, стратэгіі выяўляюцца паспяховымі, калі палітычныя акторы здольныя максімальна скарыстацца “структурамі”. Калі яны няздольныя да гэтага, стратэгіі аказваюцца самаразбуральнымі. Фармаванне і трансфармацыя палітычных рэжымаў у такой інтэрпрэтацыі ўяўляе сабой гісторыю поспеху і няўдачы адпаведных палітычных праектаў, што рэалізоўваліся, умоўна кажучы, “аўтакратамі” і “дэмакратамі”. Першая частка даследавання аналізуе фармаванне персаналісцкіх рэжымаў у Сербіі і Беларусі. Ідэнтыфікуючы ключавыя структурныя фактары, якія дазволілі аўтарытарным лідэрам прыйсці да ўлады, я паказваю, як сацыяльна-эканамічныя і культурныя супярэчнасці, што існавалі ў абодвух грамадствах задоўга да пачатку палітычных пераменаў, трансфармаваліся ў палітычныя падзелы і прывялі да сітуацыі, у якой грамадствы былі расколатыя па самых фундаментальных пытаннях, уключна з пытаннем дэмакратыі. Гэтыя расколы былі ўдала выкарыстаныя Мілошавічам і Лукашэнкам, якія здолелі мабілізаваць грамадскую падтрымку, апелюючы да найбольш кансерватыўных і аўтарытарна настроеных частак грамадства, выкарыстоўваючы тактыку “культурнага” і “сацыяльнага” папулізму. Здольнасць абодвух лідэраў да фармавання “аўтарытарнай большасці” ў грамадстве была ўзмоцненая расколам у кіраўнічых на той час элітах і самагубнымі палітычнымі стратэгіямі, што былі абраныя

прыхільнікамі дэмакратычных пераменаў, якія ці не здолелі эфектыўна супрацьстаяць папулісцкім памкненням пераможцаў у палітычнай барацьбе, ці хоцькі-няхоцькі дапамагалі іх перамозе.

Другая частка прысвечаная аналізу арганізацыі і функцыянавання персаналісцкіх аўтакратый. Паспяховая канцэнтрацыя амаль неабмежаванай асабістай улады адкрыла для абодвух лідэраў магчымасці “перараблення” дзяржаўных інстытутаў на сваё жаданне, фармавання механізмаў захавання ўлады і будавання адносінаў паміж дзяржавай і грамадствам, што мелі падобныя асноўныя рысы ў дзвюх краінах. Аднак калі механізмы выжывання рэжымаў былі амаль аднолькавыя, дык механізмы функцыянавання мелі пэўныя адрозненні, што тлумачылася розніцай у часе і дынаміцы пераходу ад камуністычнай да посткамуністычнай дыктатуры ў кожнай з краінаў. Неперарыўны пераход ад адной формы недэмакратычнага рэжыму да іншай у Сербіі і паходжанне Мілошавіча з былой партнаменклатуры дазволілі яму зрабіць сваю Сацыялістычную партыю Сербіі (пераемніцу кампартыі) адным з інструментаў улады. Гэта стварыла неабходнасць легітымізацыі партыйнага ўплыву ў новых умовах, а таксама магчымасць выкарыстання больш “цывільных” метадаў кантролю і нават стварэння дэмакратычнага фасаду. Паводле фармальных крытэраў Сербія ў 1990-х гадах была напаўпрэзідэнцкай рэспублікай, і выжыванне Мілошавіча ў значнай меры залежала ад яго здольнасці да кааліцыйнай тактыкі ў парламенце. Наадварот, Лукашэнка прыйшоў да ўлады як палітычны аўтсайдэр без трывалых каранёў у кіраўнічай наменклатуры. Яго ўзлёт стаў магчымы дзякуючы “дэмакратычнаму эпізоду” ў беларускай палітыцы ў 1991—1994 гадах. У гэтых умовах Лукашэнка мусіў ажыццяўляць кансалідацыю ўлады, уводзячы больш фармалізаваныя механізмы персанальнай прэзідэнцкай улады. Розніца ў арганізацыі палітычных рэжымаў таксама была прадыктавана ўздзеяннем вонкавых фактараў.
Выжываючы ва ўмовах “жорсткай” міжнароднай ізаляцыі, Мілошавіч быў вымушаны адаптавацца да эканамічнага заняпаду шляхам стварэння комплекснага механізму парушэння санкцыяў, што патрабавала ўзнікнення і

ўзмацнення “ўнутранага кола” крыміналізаванай алігархіі (партыйная бізнес-алігархія ў Сербіі пачала паўставаць яшчэ за часамі рынкавага сацыялізму ў “старой” Югаславіі; але ж яе росквіт, безумоўна, прыпаў на часы Мілошавіча). Лукашэнка тым часам меў магчымасць мінімізаваць наступствы мяккай ізаляцыі з боку Захаду шляхам стварэння палітычнага і эканамічнага саюзу з Расіяй, што дазволіла яму працягваць папулісцкую палітыку, ажывіць камандную эканоміку і дасягнуць на пэўны час высокай ступені сацыяльнай стабільнасці.

У трэцяй частцы я аналізую, наколькі стратэгіі дэмакратычнай апазіцыі ў абедзвюх краінах адпавядалі прыродзе палітычных рэжымаў, сацыяльным умовам, у якіх яны функцыянавалі, і ці былі яны сапраўды накіраваныя супраць падмуркаў аўтарытарнай улады. Я зыходжу з таго, што некаторыя фактары — такія, як высокая ступень падтрымкі аўтарытарнай улады грамадствам, сацыяльная і культурная моц аўтарытарных рэжымаў ды іх інстытуцыянальная канструкцыя, — стваралі перад апазіцыяй неабходнасць барацьбы з рэжымамі за грамадскую падтрымку. У той жа час, неабходнасць атрымання “квазідэмакратычнай легітымнасці” Мілошавічам і Лукашэнкам у некаторай ступені адкрывала магчымасці для канкурэнтнай стратэгіі (але не абавязкова праграмавала яе поспех). Палярна супрацьлеглыя адказы двух апазіцыйных рухаў на выклікі, створаныя рэжымамі Мілошавіча і Лукашэнкі, запраграмавалі іх розныя здольнасці да палітычнага поспеху.

Гэтая розніца праявілася падчас прэзідэнцкіх кампаній 2000 году ў Сербіі і 2001 году ў Беларусі. Аналізу дзвюх кампаній прысвечаная чацвёртая частка. Перамога дэмакратычнай апазіцыі Сербіі не толькі адлюстравала грамадскі попыт на палітычныя перамены, але і з’явілася вынікам “работы над памылкамі”, якую зрабіла сербская апазіцыя пасля дзесяцігоддзя беспаспяховай палітычнай барацьбы. У Беларусі параза апазіцыі была запраграмаваная яе папярэдняй тактыкай палітычнага самазабойства (асноўнымі элементамі якой з’яўляліся ўнутраныя супярэчнасці, сістэматычнае існаванне ў паралельным грамадстве, адмова ад удзелу ў сістэмнай палітыцы і няздольнасць улічыць у палітычнай дзейнасці інтарэсы шырокіх грамадскіх колаў, за выключэннем свайго

ўласнага). У гэтых умовах беларуская апазіцыя выявілася бездапаможнай перад падвойнай заслонай адміністрацыйнага рэсурсу і грамадскага непрымання, прычым пераадоленне менавіта другога, як паказвае сербскі досвед, з'яўляецца найбольшым выклікам для яе будучых дзеянняў. Нарэшце, пятая частка аналізуе магчымасці і імаверныя сцэнары палітычнай трансфармацыі ў Беларусі на аснове папярэдняга аналізу.

1

"Выкрадзеная трансфармацыя": паходжанне аўтарытарнай улады

Палітычныя працэсы, што прывялі да фармавання аўтарытарных рэжымаў у Сербіі і Беларусі, разгарнуліся ў розныя прамежкі часу і ў рознай паслядоўнасці. "Антыбюракратычная рэвалюцыя" (такую назву атрымала кампанія Мілошавіча, скіраваная супраць найвышэйшага рэспубліканскага і федэральнага кіраўніцтва), што прывяла сербскага прэзідэнта да ўлады, адбылася ва ўмовах аднапартыйнай сістэмы, была распачатая прадстаўніком вышэйшага эшалону наменклатуры (адзначым, аднак, што структура ўлады ў Югаславіі была такой, што кіраўнік рэспубліканскай кампартыі не з'яўляўся фігурай нумар адзін у рэспубліцы: пры наагул дэцэнтралізаваным размеркаванні ўлады ў вышэйшым эшалоне паміж партыйнымі, дзяржаўнымі, гаспадарчымі і вайсковымі органамі гэтай ролі хутчэй адпавядаў прэзідэнт рэспублікі) і прывяла да аднаўлення палітычнай дамінацыі Саюзу камуністаў Сербіі, пазней Сербскай сацыялістычнай партыі, якая перамагла ў першых шматпартыйных выбарах у 1990 годзе. Лукашэнка пачаў адкрытае змаганне за пасаду прэзідэнта Беларусі ў 1993 годзе, ужо пасля распаду СССР і знікнення КПСС. Адрозненнем беларускага досведу ад сербскага быў кароткі, але істотны дэмакратычны эпізод, падчас якога краіна жыла ва ўмовах адноснай палітычнай свабоды[17]. Дарма што падзеі жніўня 1991 году не прывялі да заняпаду старой наменклатуры, асноўным сродкам захавання яе ўлады на працягу трох год было выкарыстанне большасці ў Вярхоўным Савеце. Таксама, хоць

беларускі парламент быў абраны ў 1990 годзе пры аднапартыйнай сістэме, прадстаўнікі апазіцыі мелі магчымасць удзельнічаць у выбарах у якасці незалежных кандыдатаў і здолелі заваяваць 37 з 345 месцаў (разам з дэпутатамі, што на пачатку працы парламенту ўваходзілі ў дэмакратычны клуб, супольны “апазіцыйны рэсурс” таго парламенту дасягаў, а часам і перавышаў 100 галасоў, што, калі быць аб’ектыўным, прыкладна адлюстроўвала расклад сіл у грамадстве на той час). Менавіта існаванне “дэмакратычнага эпізоду” і, як вынік, аслабленне былой наменклатуры прывялі да таго, што на першых прэзідэнцкіх выбарах перамог аўтсайдэр, які кінуў выклік усёй палітычнай эліце, як дзяржаўнай, так і апазіцыйнай.

Нягледзячы на важныя адрозненні, што існавалі паміж гістарычнымі, сацыяльнымі і культурнымі спадчынамі, з якімі Сербія і Беларусь наблізіліся да посткамуністычнага перыяду свайго існавання, можна выдзеліць і фундаментальныя падабенствы. Яны, на мой погляд, і стварылі ўмовы для фармавання вельмі падобных адзін да аднаго палітычных рэжымаў у 1990-я гады. Некаторыя з іх стануць зразумелымі, калі прааналізаваць структуру грамадскай падтрымкі рэжымаў і пабачыць яе поўную ідэнтычнасць у дзвюх выпадках з дыяметральна супрацьлеглай палітычнай спадчынай камунізму!

[17] Паводле ацэнак Freedom House, Беларусь мела ў 1992–93 гадах адзін з самых высокіх узроўняў палітычных і грамадзянскіх свабод у былым СССР.

[18] Манаев О. Электорат Лукашенко: за и против президента // *Белорусская деловая газета.* 1998. 25 марта.

Гістарычнае ўзнікненне сацыяльных разломаў у двух грамадствах

Вядома, варта ўзгадаць, што наступствы “позняй” мадэрнізацыі адчуваліся і адчуваюцца паўсюль у посткамуністычным рэгіёне. Таму гэтае тлумачэнне трэба разглядаць у кантэксце і цеснай узаемасувязі з другім. Абедзве краіны наблізіліся да перыяду палітычнай трансфармацыі з глыбокім (і які ўсё паглыбляўся) крызісам нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Дарма што гэты крызіс меў, зноў жа, дыяметральна супрацьлеглыя прычыны і формы, ён выклікаў вельмі падобныя ўнутрыпалітычныя наступствы для двух грамадстваў (у адрозненне ад замежнапалітычных). Калапс федэральнай дзяржавы ў былой Югаславіі прывёў да ўзнікнення фундаментальных супярэчнасцяў паміж “дэмасам сербскай нацыі” (што ўключаў у сябе сербаў па ўсёй тэрыторыі СФРЮ) і “дэмасам сербскай дзяржавы” ў форме Рэспублікі Сербіі (які быў выключна поліэтнічны з вялікімі нацыянальнымі меншасцямі, што, дарэчы, мелі шырокую аўтаномію за камуністычнымі часамі). Гэты крызіс прывёў да неабходнасці перавызначэння “Сербіі” і “сербскасці”, якое ў крайняй форме вяло да канфлікту з настолькі ж радыкальнымі нацыянальнымі і тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі з боку іншых нацый былой Югаславіі і да этнічных

канфліктаў унутры самой Сербіі. У Беларусі прычынай крызісу стаў нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці грамадства, што пасля распаду СССР прывяло да надзвычай нізкага ўзроўню лаяльнасці да новай дзяржавы і мінімальнага пачуцця адзінства, неабходных для таго, каб даць старт дэмакратычнай трансфармацыі грамадства. Аднак важнай акалічнасцю з'яўляецца тое, што з розных прычынаў і ў Сербіі, і ў Беларусі адсутнічала супольнае, прынятае пераважнай большасцю грамадства вызначэнне нацыянальнай ідэнтыфікацыі ды яе палітычная, гістарычная і культурная інтэрпрэтацыя (зазначым, што ані гіпернацыяналізм у Сербіі, ані поўнае непрыманне нацыяналізму ў Беларусі не падзяляліся ўсім грамадствам). Неабходнасць перавызначэння саміх сябе ва ўмовах расколу прыводзіла да "культурных войнаў" унутры самой тытульнай нацыі. Гэтыя войны маглі быць гарачыя ці халодныя, але іх сутнасцю было адно і тое ж: палітыкі атрымлівалі магчымасць маніпуляваць распаўсюджанымі ў часткі грамадства каштоўнасцямі і ідэнтычнасцю, каб прывязаць да іх сваю спецыфічную палітычную ідэалогію, легітымізаваць свае палітычныя амбіцыі, а пры патрэбе і палітыку, што накіроўвалася на маргіналізацыю ці дыскрымінацыю культурных ці палітычных меншасцяў. Ва ўмовах, калі палярныя ідэнтыфікацыі (ці інтэрпрэтацыі адной і той жа ідэнтыфікацыі, напрыклад, не толькі ці з'яўляюся я сербам або беларусам, але і што ў палітычным сэнсе значыць быць сербам або беларусам) належалі да групаў, падзеленых вышэйазначанымі сацыяльнымі чыннікамі, імавернасць разгортвання аўтарытарнымі апартуністамі "культурных войнаў" была надзвычай высокай.

Афіцыйная ідэалогія цітаўскай Югаславіі спалучала камуністычную дактрыну ў яе "мяккай форме" з "мадэрнізатарскім" бачаннем федэральнай дзяржавы і новага поліэтнічнага грамадства (мадэрнізацыяй у галіне нацыянальнай палітыкі, камуністычнай лібералізацыяй, адкрытасцю Захаду, схільнасцю да рынкавых эксперыментаў у эканоміцы і інш.). Грунтуючыся на традыцыях антыфашысцкага партызанскага супраціву часоў другой сусветнай вайны, нацыянальная дактрына Ціта рабіла акцэнт на ідэях "братэрства і адзінства", якія супрацьстаялі спадчыне этнічных

войнаў і канфліктаў на Балканах. Палітычнай канструкцыяй, што адпавядала такой ідэалогіі, была камбінацыя неабмежаванай персанальнай улады самога Ціта і старанна падтрымліванага балансу сілаў і інтарэсаў паміж рознымі рэспублікамі ды этнічнымі групамі, у якім Сербія магла лічыцца метраполіяй толькі вельмі ўмоўна. Пасля смерці Ціта асноўным апанентам ягонай дактрыне стаў сербскі нацыяналізм, які жывіўся тэзісам аб дыскрымінацыі сербаў у камуністычнай Югаславіі. Кульмінацыяй выкліку стала публікацыя ў 1986 годзе мемарандуму Сербскай акадэміі навук і мастацтваў. Занепакоенасць перасследам этнічных сербаў у Косаве трансфармавалася ў ім у заклік да стварэння новай "сербскай нацыянальнай праграмы", што мусіла прывесці да кансалідацыі адзінай сербскай этнічнай бацькаўшчыны. Сербская гісторыя інтэрпрэтавалася як чарада пакутаў, ахвяраў і чужаземнага гвалту, а федэральны праект — як частка стратэгіі іншародных сілаў па знішчэнні сербскай нацыі. Гэты выклік афіцыйнай ідэалогіі прывёў да вяртання ў сербскі палітычны дыскурс "нацыянальнага традыцыяналізму", угрунтаванага на сукупнасці каштоўнасцяў і стэрэатыпаў, якія можна апісаць як "патрыярхальны патрыятызм". Ён ідэалізаваў як базавыя рысы сербскасці патрыярхальную сацыяльную арганізацыю на вёсцы — традыцыйную сістэму грамадаў, а таксама каштоўнасці сацыяльнага канфармізму, эгалітарызму і неабмежаванай лаяльнасці да палітычных лідэраў[19]. У гэтай трактоўцы сапраўдная Сербія захоўвалася ў вёсках, тады як Бялград і іншыя мадэрнізаваныя гарады былі папросту "заходнімі шлюхамі"[20].

Асноўнай ідэалагічна-культурнай лініяй разлому, якая абумовіла палітычныя падзелы ў Беларусі, стала супрацьстаянне "нацыянальна-дэмакратычнага дыскурсу" з "расійскім" і "савецкім кансерватызмам" — гэтых дзвюх сістэм мыслення і самавызначэння. "Нацыянальна-дэмакратычны" дыскурс будуецца на бачанні цяперашняй Беларусі як гістарычнай спадкаемцы Вялікага Княства Літоўскага, яе разглядаецца як прататып беларускай дзяржавы, сённяшняй Народнай Рэспублікі, крыніцы сучаснай нацыянальнай дзяржаўнасці. Беларусь прызнаецца неад'емнаю часткаю заходняй цывілізацыі, што было парушана напрыканцы XVIII стагоддзя яе анексіяй Расійскай імперыяй. Этнічная

[19] Ian Bremmer, *Send in the Tanks and Call Moscow: Inside the Breakup of the Soviet Empire* (New York: Scribner, 1995), 128–129.

падзея прывяла да сыходу з еўрапейскага шляху развіцця, да разбурэння асноваў дзяржаўнасці і нацыі, яе моцнага ўплыву і нацыянальнай эліты. Беларуская нацыянальная праграма ўключае ў сябе не толькі дасягненне незалежнасці, але і дэрусіфікацыю — як палітычную, так і культурную[20].

Westview Press: 2000. P. 82–85.

20 Eric Gordy. *The Culture of Power in Serbia: Nationalism and the Destruction of Alternatives.* Pennsylvania State University Press, 1999.

Расійскі ж дыскурс разглядае Беларусь як неад'емную частку трыадзінства Вялікае, Малое і Белае Русі. Ён адмаўляе ў праве на існаванне Беларусі не толькі як самастойнай дзяржавы, але як і нацыі, "штучнае" ўзнікненне якой было выклікана шэрагам трагічных гістарычных абставінаў[21].

21 Сергеев Н., Фадеев А. Анатомия Союза России и Белоруссии // *Независимая газета*. 1998. № 8.

"Савецка-беларускі" дыскурс займае сярэднюю пазіцыю паміж двума антаганістычнымі. Ён, з аднаго боку, прыхільна ставіцца да ідэі "трыадзінага славянскага народу", з іншага боку — абмежаванае права Украіны і Беларусі на дзяржаўнасць і культурна-моўную адметнасць. Чаму беларусаў называюць "самымі савецкімі" з усіх народаў былога СССР. Акрамя палітыкі сістэматычнай русіфікацыі і знішчэння нацыянальнай эліты, забыцця традыцый нацыянальнай дзяржаўнасці і еўрапейскай спадчыны ў масавай свядомасці, адыграў ролю і той факт, што савецкая прапаганда паспяхова ператварыла сваю ідэалогію ў сурагат нацыянальнага светапогляду. Савецкі рэжым, па-першае, падаў сябе стваральнікам беларускай дзяржаўнасці ў форме БССР у 1919 годзе і аб'яднальнікам нацыі ў выніку падзеяў 1939 году. Па-другое, ён выпрацаваў свой уласны гістарычны міф аб партызанскай барацьбе за часамі другой сусветнай вайны як нацыянальна-вызваленчым руху[22]. Па-трэцяе, ён падкрэсліваў сваю ролю ў імклівым эканамічным развіцці і мадэрнізацыі беларускага грамадства ў часы пасляваеннай індустрыялізацыі. Такім чынам, савецкая міфалогія адлюстроўвала гістарычную памяць да- і паваенных генерацый, што к сярэдзіне 1990-х

склалі асноўную частку беларускага электарату, і прывяла да ўзнікнення ў постсавецкі час “савецкага кансерватызму”. Варожае стаўленне значнай часткі беларускага грамадства да нацыянальна-дэмакратычнай ідэалогіі не азначае, што ў яе цалкам адсутнічае беларуская самасвядомасць. Як адзначае заходняя даследчыца, “не выклікае здзіўлення, што шматлікія заходнія назіральнікі трапілі пад уплыў памылковага меркавання, нібыта беларусы лічаць сябе расійцамі. Гэта не так, але справа ў тым, што шмат хто з іх не ведае, што значыць быць беларусам па-за савецкім кантэкстам”[23].

Супярэчлівыя і канкурэнтныя інтэрпрэтацыі нацыянальнай ідэнтычнасці і гісторыі палярызавалі грамадствы прыкладна па тых жа лініях, што і сацыяльна-эканамічныя фактары. Мадэрнізавальны югаслявізм у Сербіі закрануў пераважна буйныя гарады і асяродкі, дзе пражывалі этнічныя сербы. Наступствы сістэматычнай русіфікацыі ў XIX—XX стагоддзях і адсутнасць памяці пра ўласную дзяржаўнасць у рэшце рэшт не дазволілі нацдэмаўскай ідэалогіі ў Беларусі стварыць моцную канкурэнцыю “савецкаму” дыскурсу і асновы нацыянальнага светаўспрымання. За выключэннем асобных рэгіёнаў на паўночным захадзе Беларусі, дзе захавалася беларуская мова і ў значнай ступені нацыянальная самасвядомасць, нацдэмаўскі дыскурс знайшоў сваіх хіба што ў асяроддзі адукаванай моладзі ў той сітуацыі, калі беларускі нацыяналізм адпавядаў іх памкненням да ўдзелу ў еўрапеізацыі.

[22] **Партызаны і падпольшчыкі-нацыяналісты ў Другой сусветнай вайне таксама адыгралі важную ролю ў фарміраванні сучаснай беларускай нацыянальнай свядомасці. Іх гераізм і самаахвярнасць, якія ўвасабляюць сабой лепшыя традыцыі беларускага народа, з’яўляюцца важным элементам нацыянальнай гісторыі, і таму ўвага да іх, якой не было ў савецкі час, натуральна ўзрасла пасля распаду СССР. Гэта, безумоўна, з’явілася станоўчым фактарам, які спрыяў фарміраванню нацыянальнай свядомасці беларусаў, але ў той жа час, падштурхнула працэс фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці на масавым узроўні”. Michalisko K. Op. cit. P.223.**

Michalisko K. Op. cit. P.236.

Супадзенне сацыяльнага і культурнага падзелаў дазволілі Мілошавічу і Лукашэнку мабілізаваць грамадскую падтрымку на платформе, якая спалучала “культурны” і “сацыяльны” папулізм. Абодва лідэры здолелі такім шляхам заваяваць падтрымку пераважна сярод сялян старэйшага веку, што на доўгія гады ўтварылі іх “жорсткія” электараты, а таксама, асабліва на пачатку палітычных кар’ер, узмацніць сваю сацыяльную базу за кошт “гарадскіх сялян”, якія таксама вылучаліся схільнасцю да аўтарытарнай палітыкі і палітыкаў. “Сацыяльны” папулізм даў магчымасць простага і зразумелага тлумачэння прычын эканамічных і палітычных крызісаў, што апанавалі краіны ў выніку краху старой сістэмы (звычайна роля ахвярнага казла адводзіліся старым бюракратычным элітам), і каналізацыі грамадскай незадаволенасці (якая ў дзвюх краінах падчас прыходу да ўлады адпаведна Мілошавіча і Лукашэнкі была надзвычай высокай) супраць дэмакратычных пераменаў, а не на іх карысць. “Культурны” папулізм заключаўся ў маніпуляцыі калектыўнай памяццю і масавымі каштоўнасцямі дзеля стварэння надзвычай палітызаванага “маральнага коду” грамадства, вылучэння ўнутраных і вонкавых ворагаў, легітымізацыі палітычных мэтаў асобных дзеячоў як мэтаў калектыўных і прызначэння іх выразнікамі калектыўнай волі.

Культурны папулізм быў асноўнай палітычнай зброяй Мілошавіча. Яго ператварэнне з лаяльнага цітаўца ў часы панавання старой сістэмы ў галоўнага сербскага нацыяналіста адбылося 24 красавіка 1987 года ў Косаве, куды ён прыехаў як лідэр сербскіх камуністаў. Мітынг пратэсту сербскай меншасці супраць уціску з боку албанцаў каля будынку, дзе Мілошавіч трымаў нараду, выліўся ў сутыкненні між дэманстрантамі і мясцовай, пераважна албанскай, паліцыяй. Умяшальніцтва Мілошавіча ў сутыкненне на баку сербаў, яго словы “нікто не мае права біць вас” сталі легендарнымі сярод сербаў усёй Югаславіі, якія пачалі бачыць у ім новага лідэра і надзею на бяспеку ва ўз’яднанай бацькаўшчыне. Пасля вяртання з Косава Мілошавіч склікаў пленум Саюзу камуністаў Сербіі, на якім заявіў, што “пытанне Косава — гэта ўжо не палітычнае

пытанне, гэта пытанне жыцця ці смерці бацькаўшчыны”[24]. Узяўшы за ідэалагічную аснову мемарандум Сербскай акадэміі навук, Мілошавіч пачаў кампанію мабілізацыі масавай падтрымкі на платформе ўтварэння “адзінай дзяржавы, у якой будуць жыць усе сербы”. Яго антыалбанская і антыцітаўская кампанія ажыццяўлялася праз масавыя мітынгі, якія атрымалі назву “народных святаў”. Такія мітынгі, у якіх за 1987—89 гады ўзялі ўдзел не меней за паўтара мільёна чалавек, часцяком сканчаліся пагромам сялібаў неўпадабаных Мілошавічам мясцовых кіраўнікоў і партыйных камітэтаў (асабліва часта гэта здаралася ў аўтаномных правінцыях, дзе Мілошавіч не меў фармальнага права мяняць кіраўніцтва). Гэтая кампанія таксама адлюстроўвала “сацыяльны” папулізм мабілізацыі паводле Мілошавіча, які, нагадаем, называў сваю кампанію “антыбюракратычнай рэвалюцыяй”. Яго крытыка цітаўскага эканамічнага і палітычнага ладу старанна скіроўвалася супраць вышэйшага федэральнага і мясцовага (але не сербскага) кіраўніцтва, якое абвінавачвалася ў тых самых грахах, што і партнаменклатура ва ўсім посткамуністычным рэгіёне (зажраліся, абраслі прывілеямі, адарваліся ад народу), але з іншым падтэкстам: рэгіянальныя і федэральныя апаратчыкі абвяшчаліся ворагамі сербскай нацыі.

[24] **Robert Thomas. *The Politics of Serbia in the 1990s.* Columbia University Press: 1999. P.44.**

У адрозненне ад Мілошавіча, асноўным палітычным метадам Лукашэнкі ў барацьбе за ўладу быў сацыяльны папулізм. Прызначаны ў 1993 годзе кіраўніком парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй, ён скарыстаўся з росту незадаволенасці эканамічным крызісам, што напаткаў Беларусь пасля распаду СССР. Лукашэнка сканцэнтраваў сваю дзейнасць на новай пасадзе на барацьбе супраць усёй палітычнай эліты, што сфармавалася пасля перабудовы. Паваротным момантам у яго кар’еры быў выступ перад парламентам 14 снежня 1993 году, у

якім ён абвінавацiў усіх дзеячоў ураду і парламенцкай апазіцыі ў карумпаванасці. Лукашэнка здабыў сабе імідж “народнага Робін Гуда”, які ў адзіночку змагаецца супраць прадажнай дзяржаўнай бюракратыі і мафіі. Праз некалькі дзён невядомы правінцыйны палітык ператварыўся ў нацыянальнага героя. Праз некалькі месяцаў ён трыумфальна выйграў прэзідэнцкія выбары, праўда, у другім туры. Культурны папулізм, аднак, таксама быў важнай часткай лукашэнкаўскай палітычнай стратэгіі. Ён матэрыялізаваўся ў палітыцы рэсаветызацыі Беларусі (у сімвалічным, а не палітычным сэнсе) і вяртанні той самай канцэпцыі і бачання нацыі, народу, гісторыі, ворагаў ды сяброў, што дамінавалі ў масавай свядомасці. Цікава, што па вяртанні БССРаўскага сцяга і герба ў якасці дзяржаўнай сімволікі Лукашэнка звярнуўся да сваіх самых верных паплечнікаў — да ветэранаў, аб’явіўшы, што ён вярнуў на самай справе іх годнасць і ідэнтычнасць: “Мы вярнулі вам сцяг дзяржавы, за якую вы змагаліся. Мы вярнулі вам памяць і сэнс чалавечай годнасці”[25]. Лукашэнка працягваў усталяванне сімвалічнай сувязі паміж сваёй уладай і савецкай спадчынай, абвясціўшы (праз рэферэндум) 3 ліпеня, дзень вызвалення Менску ад нямецкай акупацыі, Днём незалежнасці Беларусі. Нягледзячы на ўсю розніцу ў кантэксце, Мілошавічаў нацыяналізм і Лукашэнкава саветызацыя мелі падобныя палітычныя вынікі. Па-першае, абедзве стратэгіі легітымізавалі лідэраў, прывязваючы іх да каштоўнасцяў, стэрэатыпаў і памяці сваіх прыхільнікаў у грамадстве, праводзячы выразную лінію паміж “сваімі” і “чужымі”. Па-другое, нацыянальны традыцыяналізм у Сербіі і савецкі кансерватызм у Беларусі звязвалі ідэнтыфікацыю з канкрэтнай палітычнай платформай, фармулюючы асноўныя прыметы “серба” і “савецкага беларуса” ў тэрмінах, несумяшчальных з прынцыпамі дэмакратыі, якая аб’яўлялася канцэпцыяй разбуральнай, чужароднай і навязанай звонку, пераважна сіламі, што неслі адказнасць за гістарычныя пакуты абодвух народаў. Быць супраць Мілошавіча ў Сербіі азначала быць паплечнікам албанцаў, харватаў, ЗША, Ватыкану, Германіі, Турцыі, сусветнага габрэйства (камбінацыя па патрэбе)[26]. Лукашэнка, з свайго боку, называў сваіх апанентаў фашыстамі, такім чынам выкарыстоўваючы глыбокую гістарычную траўму народу, пакінутую ў спадчыну другой сусветнай вайной.

[25] **Лукашэнка А. Выступ перад ветэранамі // *Советская Беларусия.* 1996. 8 мая.**

Этнічныя войны на Балканах Мілошавіч атаясамліваў з гістарычнай бітвай на Косавым полі ў 1389 годзе (у якой, дарэчы, албанцы ваявалі на баку сербаў), тады як Лукашэнка выкарыстоўваў істэрыю вакол пашырэння NATO на ўсход, параўноўваючы яго з гітлераўскім Drang nach Osten (зноў-такі забыўшыся, што большасць сучасных сяброў NATO былі партнёрамі СССР па антыгітлераўскай кааліцыі). Косава і Брэсцкая крэпасць, магутныя сімвалы ў палітычных дыскурсах дзвюх краінаў, выкарыстоўваліся як гістарычныя прыклады супраціву заходняй цывілізацыі (недарэчнасці такіх інтэрпрэтацый можна пакінуць на сумленні тых, хто імі карыстаўся). Па-трэцяе, абодва лідэры выкарыстоўвалі традыцыі патэрналізму ў адносінах паміж дзяржавай і грамадствам, што падмацоўваліся ўведзенымі імі палітычнымі дыскурсамі, і часцяком ідэнтыфікавалі сябе з культавымі гістарычнымі фігурамі. Калі для Мілошавіча гэта быў цар Лазар, правадыр сербаў пад Косавам, то для Лукашэнкі — Пятро Машэраў. Эксплуатацыя патэрналізму, па-чацвёртае, спрыяла апраўданню палітыкі, накіраванай на гамагенізацыю грамадства, г.зн. на ўніфікацыю каштоўнасцяў і інтарэсаў ды адмаўленне ў праве на індывідуальную свабоду і думку, а таксама ў праве на самаарганізацыю грамадства, паколькі любы палітычны пасрэднік паміж лідэрам і масамі трактаваўся як чужародны элемент.

[26] Тыповае выказванне праўрадавай газеты аб апазіцыйным лідэру за часамі Мілошавіча: “Слухаеш выступ сп. Драшкавіча, а здаецца, што чуеш сп-ню Олбрайт (дзяржсакратара ЗША) ці сп.

Сораса, сп. Мока (міністра замежных справаў Аўстрыі), Ізэтбегавіча (прэзідэнта Босніі) ці Туджмана (прэзідэнта Харватыі)... Мы мяркуем, што дзяржава мае ўладу і сродкі, каб абараніць сваю годнасць і годнасць грамадзян ад НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПАРАЗІТАЎ" (вялікімі літарамі як у арыгінале. — Аўт.) Цытавана па: Gordy E. Op. cit. P.76.

Папярэдні аналіз прыводзіць да высновы, што ў абедзвюх краінах існавалі сацыяльныя перадумовы для аўтарытарнага посткамуністычнага развіцця. Яно, аднак, ні ў якім разе не было запраграмавана ў той форме, у якой адбылося. Так, напрыклад, раскол і палярызацыя грамадства азначае існаванне сацыяльнай базы для альтэрнатыўных варыянтаў палітычнага развіцця. Безумоўна, што і ў Сербіі, і ў Беларусі сфармаваліся значныя сегменты грамадства, якія адрозніваліся непрыманнем аўтарытарнай палітыкі. Гэтыя сегменты, аднак, былі не толькі недастаткова вялікімі на пачатку 1990-х, каб прадухіліць пазнейшы ход падзеяў, але і больш неаднароднымі, чым гамагенізаваны электарат аўтарытарных палітыкаў, што

зніжала магчымасці іх кансалідацыі вакол адзінай палітычнай альтэрнатывы. У той жа час дэмакратычныя палітычныя эліты не адрозніваліся воляй да кансалідацыі і пабудовы шырокіх кааліцый альбо не мелі адпаведнага досведу, як выкарыстоўваць грамадскі патэнцыял дзеля здабыцця палітычнай перавагі. Аднак прыклад некаторых пераходных краінаў з падобнымі "структурнымі" і "культурнымі" падзеламі сведчыць, што аўтарытарнага папулізму можна было пазбегнуць пры ўмове кампрамісаў паміж палітычнымі элітамі ці праз палітычную стратэгію, што мінімізавала б культурныя падзелы ў грамадстве. Напрыклад, параўноўваючы палітычныя працэсы ў былой Югаславіі і былым СССР, можна прыйсці да высновы, што распад Савецкага Саюзу (я не кранаю чачэнскай вайны і інш.: важна тое, што аналагам сербска-харвацкага канфлікту на Балканах магла быць вайна Расіі і Украіны, а баснійскай вайны — татальны ўзброены канфлікт у Сярэдняй Азіі, уключаючы Казахстан і Ўзбекістан) адбыўся адносна мірна пераважна праз тое, што падчас падзеяў 1990—1991-га палітычныя эліты ў Расіі здолелі нейтралізаваць этнічны расійскі нацыяналізм, які ўжо пачалі выкарыстоўваць камуністычныя сілы ў спробе прадухіліць развал Саюзу. Успомнім, што менавіта ў той час намаганнямі праельцынскіх элітаў паўстала вызначэнне "расіяне", якое, у адрозненне ад "расійцаў" (русских), уключала ў сябе ўсіх жыхароў Расійскай Федэрацыі, але не расійцаў Украіны ці Прыбалтыкі. Палітыка тэрытарыяльнай экспансіі была на нейкі час дэлегітымізавана, і гэта паспела адбыцца яшчэ да таго, як імперскія настроі пачалі зноў узмацняцца; СССР паспеў знікнуць адносна мірна. У гэтай сувязі цікава прасачыць, як па-рознаму фармуляваўся палітычны дыкурс у Расіі і Сербіі. Так, сербскі нацыяналізм актыўна культываваў падзел на дэнацыяналізаваных "сербіянцаў" (srbjanci, аналаг "расіянаў"), што жылі ў Рэспубліцы Сербіі, і сапраўдных "сербаў" з Босніі, Харватыі і Косава, што неслі ў сабе аўтэнтычныя нацыянальныя рысы і дух[27]. Цікава таксама параўнаць посткамуністычныя палітычныя траекторыі Беларусі і Украіны. Фармаванне нацыянальнай дзяржавы і больш трывалых дэмакратычных інстытутаў у паўднёвай суседкі Беларусі таксама ішло ў падобных палітычных і культурных умовах[28]. Там, аднак, недахоп нацыяналізму быў кампенсаваны кампрамісам сярод

палітычных элітаў, што дазволіла заблакаваць магчымасці палітычнымі і інстытуцыянальнымі сродкамі змяніць статус-кво, які склаўся пасля 1991 году (маецца на ўвазе больш дэцэнтралізаваная канцэнтрацыя ўлады праз увядзенне напаўпрэзідэнцкай рэспублікі і адмова ад палітычнай практыкі паводле прынцыпу “пераможца забірае ўсё”). У Беларусі падобнага міжэлітнага кампрамісу не адбылося, наступствам чаго стала сама магчымасць прыходу Лукашэнкі да ўлады. Падсумоўваючы, можна прыйсці да высновы, што галоўнымі фактарамі, якія абумовілі фармаванне канкрэтнай формы аўтарытарнага праўлення ў межах тых магчымасцяў, якія адкрывалі сацыяльныя фактары, былі, па-першае, канфрантацыя паміж асноўнымі палітычнымі элітамі, што на нейкі перыяд стварыла “вакуум улады” ў абодвух выпадках, і, па-другое, самагубчыя палітычныя стратэгіі асноўных апанентаў Мілошавіча і Лукашэнкі.
Працяг будзе

[27] Гл. Thomas R. Op. cit.

[28] Як гэта ні дзіўна, але, нягледзячы на відавочна больш высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці ўкраінскага грамадства, грамадскі энтузіязм наконт

палітычнай незалежнасці ніколі значна не перавышаў таго узроўню, што існаваў у Беларусі. Нагадаем, што на рэферэндуме 1991 году каля 70% украінцаў (і 82% беларусаў) галасавалі за саюз. У 1994 годзе геапалітычныя арыентацыі ўкраінскага і беларускага насельніцтва выглядалі прыкладна аднолькава. І нават у 2001 годзе больш за палову ўкраінцаў станоўча ставіліся да ідэі далучэння да саюзу Расіі і Беларусі. Як мы бачым, нацыянальны праект ва Ўкраіне рэалізаваўся больш

элітным, чым грамадскім шляхам.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Марыя Вайцяшонак

Купіць дом у Італіі

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК (нар. 1942 у Зьмяінагорску Алтайскага краю) — пісьменьніца й журналістка. Апошняя кніга — “Сад нявіннасьці” (2002).

На яе можна разьлічваць,
Калі мы ні ў чым ня ўпэўнены,
Але да ўсяго цікавыя.
Віслава Шымборска, “Сёе-тое пра душу”.

Горы з самалёту выглядалі толькі што крута замяшанай рошчынай: творца апошні раз узьбіў і рукі атрос — яшчэ відныя сьляды пальцаў. “Перад тым як пакінуць самалёт (у выпадку аварыі), трэба зьняць абутак на высокіх абцасах і сынтэтычныя панчохі”, — трапілася на вочы інструкцыя аб тэхніцы бясьпекі. Як выявілася, і сышоўшы з таго самалёту — ня тое што скочыўшы, — табе жадаецца хадзіць па гэтай зямлі басанож, як хадзілі калісьці паломнікі.

А пакуль мы з дачкой проста пакупнікі, мы прыляцелі купляць дом, вядома, ня вілу Катэна кардынала Конці, палац зь зямлёй у 3000 м^2 (была аб’ява ў часопісе “АД”). Пакуль я проста жанчына-разьвядзёнка, якая пахавала сваё каханьне, і па мне, як па старадаўнім помніку адналюбства, цьвітуць лішайнікі, асабліва на руках. Я старая птушка, якая ляціць у цёплую

краіну, калі надыходзяць “халады”. І, марачы з даўніны пра Італію, хвалююся, бы падчас сустрэчы з блізкім чалавекам, які ведаў мяне яшчэ ў маладосьці.
Пакуль знаёмімся з Італіяй на самым інтымным узроўні: у акне кватэры, дзе мы спыніліся, вісіць, сохне сподняя бялізна, прасьцірадлы, спушчаныя з вышэйшага паверху: сёньня — зь сінім брыжком, учора — з ружовым. Вялікі вецер адносіць на хвіліну “ветразі” ўбок, тады ўспамінаеш, што ты не на моры, а на зямлі, бачыш вуліцу, дамы і... таксама прасьцірадлы.
— Спадзяюся, гэта не бытавы прэрафаэлізм, які ставіў сваёй мэтай адрадзіць шчырасьць, цноту раньняга італьянскага мастацтва яшчэ да эпохі Рафаэля? — дачка мастацтвазнаўца, “ветразі” яе проста абураюць.
Раптам шуганўў дождж, наверсе забегалі, расчыняліся рамы, жанчыны здымалі бялізну, сьмяяліся. Што гэта было? Сьмех то зьнікаў у пакоях, то зноў зьяўляўся на вуліцы, то ўжо ў нас, пад стольлю птушанём, — сьмех, як шчэбет. Жанчыны гулялі з дажджом, сьпяшаліся яго апярэдзіць. Яны цешыліся самі зь сябе, з свайго спрыту.
Ізноў раз-пораз грукаюць дзьверы, брэша сабака, летучы на выгул, бяжыць за ім гаспадар, насьвістваючы мэлёдыю арыі Рыгалета. І так кожную раніцу, калі яшчэ самы сон, у доме на лесьвічнай пляцоўцы распачынаюцца вясёлыя ловы. “Дарыян!” — павітаўся ён пры сустрэчы і зноў засьвістаў, бы на цьвітучай галіне каля свайго гнязда, і зноў арыю Рыгалета. Так мы яго і называлі за вочы.
— Неверагодна! Трэба было спыніцца ў гатэлі! — у гэтым я з дачкой цалкам згодная.

Сёньня ўдалося — нічога не вісела перад вачыма — разгледзець немаладую італьянку на бальконе насупраць. Яна звычайна сядала шыць упаўдні, калі сонца гуляла зь ейным пярсьцёнкам. Засяроджанасьць, магчымая хіба ў цішы, калі не адчуваеш нават свайго дыханьня, чужога позірку, — і гэта амаль на вуліцы, сярод гулу машын, галасоў. Сочыць за сваімі пальцамі амаль на мяжы сузіраньня. Два-тры накіды перак і ўверх, і зноў два-тры накіды хуткім дзявочым жэстам. Шые ці вышывае, пераздымаючы малюнак? А мо дае мне знакі: тут Дом паўсюль, ты, чалавеча, нарэшце дома. І каб ты ў гэтым пераканаўся, ёй пільна трэба перазьняць вось гэтыя даўнейшыя

строі.
Мы ўсё жыцьцё заглядаем італьянцам у твар, наведваючы музэі, але цяпер, калі б толькі жанчына ў бальконнай раме падняла на мяне вочы, я зрабіла б выгляд, што ня бачу яе, — я не адпавядаю ейнаму творчаму моманту, яшчэ тут не асвойталася. Ну проста catastrofe sociale! Я амаль бачыла, як нехта здымаў з майго каменнага пляча хатуль клопату, той, што я і мае суродзічы заўсёды носяць з сабой, адрываў сільлю рукі з пасінелымі пазногцямі ад калымажкі, у якой кожны з нас валачэ гістарычны досьвед: арышты, ссылкі, войны. І нічога ня варта тое, што цяпер ты вядомая архітэктарка, нядаўняя жонка буйнога прадпрымальніка, бо ты нарадзілася ў зямлянцы і пра цябе было сказана ў маленстве: не сябруй зь ёй, яна жабрачка. За мной сьціпла цягнецца цугам мой сялянскі род, жывыя і мёртвыя, яны пільнуюць, каб надта далёка не адскочылася, не забылася на іхныя бядоты. На пытаньне, што новага, адказваем сьпехам пра хваробы, няўдачы. Бо калі толькі каму пахвалюся, што маё дзіця здаровенькае, яно адразу захварэе, сказала неяк адна маладая прыяцелька. Мы самі, дарослыя, ня ўпэўненыя ні ў чым, і гэта перадаецца наветам малым безабаронным істотам. І так спрэс. За ўсё гэта мы ня любім адно аднаго, не давяраем: век замінаем самі сабе ў чэргах, у аўтобусах, на пляцоўках дому. Тым больш нам шкодзіць вясёлы брэх сабакі, чужыя прасьцірадлы — як ганьба. Кожны з нас у гэтым цывілізаваным сьвеце — кволае чалавечае дзіця: лёгка крыўдзімся, жалімся і гняўліва крыўдзім самі.
Бальконная рама ўжо апусьцела: пэўна, жанчыну паклікалі піць каву. Пэўна, так разыходзяцца па сваіх справах ноччу ў музэях жанчыны Рафаэля, Ларэнцэці — а хоць бы і грэбень у валасах паправіць перад люстэркам.

— Я яшчэ доўга буду цябе чакаць?
Дачка яшчэ не зразумела: тут нельга марна згубіць час, ён тут пражываецца без аскепкаў. А калі што і згубіцца, то нехта абавязкова падыме і… занясе ў музэй. Вядома, мы сьпяшаемся, але наш гаспадар (у яго мы хочам купіць дом) тэрмінова мусіў ад'ехаць.
Час не губляецца. Ёсьць сустрэчы, да якіх трэба рыхтавацца ўсё жыцьцё, чакаючы ў акне сусьвету, — яны ўжо быццам адбыліся. Ёсьць такія доўгачаканыя лісты — я іх ужо атрымліваю. Ёсьць і

краіны — Італія. Я ледзьве вытрымліваю ейныя дысцыпліны, ня кажучы пра дачку. Хоць тут няма патрэбы карыстацца накшай этыкай, чым тая, якую ведаеш зь Біблії.
Званы храмаў напамінкам. На вуліцах шчыльная людзкая плынь. Але пачуваешся надзіва бясьпечна: ніхто нікога не зачэпіць, не піхне — быццам чуюць адзін аднаго па ультрагуку, як птушкі. З вуліцы на вуліцу, бы з пакою ў пакой, асядаючы адпачыць, пагаварыць на лавах, на прыступках, проста пад сьцяной на зямлі — якраз час сыесты. І дождж скрыльля не замочыць, бо дармавыя парасьнікі ля кожнай крамы, гатэлю, кавярні. Ніводнага пахмурнага твару: пакутаваць, смуткаваць — разам з Богам; з братам — весяліцца, радавацца, што адпавядае запаветам сьвятога Францішка з Асызы, апекуна гэтых людзей і гэтай зямлі. Збочыш няўцямна на маленькі панадворак, пачуўшы музыку, і ніколі не згадаеш, зь якога акна гукі, бы фартэпіяна недзе проста ў кустах. І наагул, адчуваньне, што ты трапіў на вясёлы баль, а сам прыехаў… у гарбузе, запрэжаным тараканамі. І ніяк не ўдаецца знайсьці пэўны жэст, адпаведна апрануцца, бы пасьля манаскага габіту. О Божа!
— Ты ўжо даўно ня носіш гэткіх шырокіх спадніц! — спрабуе спыніць мяне дачка ў краме.
Не зважаю, яна не здагадваецца, што я паралельна жыву і ў нерэальным сьвеце, дзе нашу зусім накшыя ўборы — і неабавязкова набедраныя павязкі і скуры, што ёй лягчэй за ўсё ўявіць. Стары, малады — мы ня ведаем веку сваёй душы.

На вуліцах час ад часу зьяўляецца чалавек у інваліднай калымажцы, пасярод людзкой плыні, пасярод плыні машын. Заўсёды нечакана на гэтым балі, бо сэрца ўжо пільнуецца толькі весялосьці. Заўсёды з аднолькавым выразам твару, — паляруш? Упаўдні яму цяжка ўтрымаць галаву, яна зьвяла хіліцца на плячо, бы ад сонца, і чалавек спыняецца там, дзе яго сон засьпеў, ледзь пасьпеўшы крыху ад'ехацца ўбок. Чыста апрануты, дагледжаны; нехта рупліва выпраўляе яго з дому, як з пакою ў пакой, да людзей, аслабаняе сабе рукі з спакойным сэрцам. Ніхто тут не сумняецца, што ён мае вартасьць у боскіх вачах. Чую, у кавярні хтосьці называе ягонае імя (Марчэла), і гаспадар сьпешна выходзіць на вуліцу, абслугоўвае. Скора вярнуўся і раптам засьпяваў уголас, мэлёдыя незнаёмая, але пазнаеш, што гэта працяг той, што гучала ўвесь час унутры і

нарэшце вырвалася з уздыхам.
Пакутаваць з Богам, з братам весяліцца.
Падыходзіць чарга і, пачуўшы “маю італьянскую”, гаспадыня дае мне рэшту проста ў руку і загінае пальцы, каб не ўпусьціла далоў, не згубіла, як малому дзіцяці. Буду потым прыходзіць сюды кожную раніцу, як па боскую ласку. І наагул тут не адчуваеш іншамоўя. Тут недастаткова веданьня мовы, як і недастаткова развагаў розуму, бо мае моц імгненнае ўражаньне вока ці несьвядомае адчуваньне цела, што звычайна найважней пры сустрэчы з блізкім чалавекам. Тут мне “перакладаюць” з італьянскай жабракі. Яны жывуць побач з статуямі сьвятых, багіняў прыгажосьці. На плошчах, на сходах храмаў — побач стварэньні чалавека і Бога. На твары жабрака годнасьць асобы, ён не ізгой, гэта быццам тая сьвятая беднасьць, якую выбірае чалавек сам, як сьвяты Францішак. Некаторыя маюць сабе сабаку, а то і болей, вунь і сучка са шчанятамі, акуратна захінутая пледам, каб не турбавалі турысты сваім подзівам, — маленькая гаспадарка. Хай сабе цяпло не ад агню, не ад ачагу, але цяпло жывой, даверлівай істоты стварае прытулак там, дзе б ты ні спыніўся на зямлі: дом там, дзе ты не адзінокі. У каталікоў сабака таксама мае душу — Францішак вярнуў да Хрыста ня толькі зьняверaных людзей, вярнуў і жывую прыроду. Вунь жабрачка падмывае хвасты каля ручайка маленькага фантану сваім гадаванцам, іх чацьвёра, — ранішні мацыён. Цывілізацыя (турысты) глядзіць на іх сьцішана, прагна, бы чакаючы сваёй чаргі недзе ў тропіках каля вадапою.
— Сыньёра! Падыміце голаў, пачакайце, я хачу бачыць ваш твар...
Але хіба я яшчэ ня ведаю, не пазнаю Італію з твару?!
Сюды жабракоў Бог пусьціў дзеля знаку, напамінку: кожны чалавек мае сэнс — сьвяты Францішак, ходзячы па зямлі, нават на каменьне ступаў з страхам і глыбокай пашанай, адчуваючы любоў да таго, хто назваў сябе каменем. Італія — гэта імгненьне, тая прасьветная гадзіна, калі нарэшце адпусьціць цяжкая хвароба: вызваліўшыся ад болю, крыўды, бядот, зьвяртаешся да дрэва, да птушкі, да мора, маючыся вымавіць з палёгкай галоўныя словы, словы любові.
— А вось у Англіі…
— А ў Англіі, каб ты тое ведала, забаранілі галубоў на плошчы

і звольнілі чалавека, які іх карміў! А Карэя скінула ракету каля Японіі і патлумачыла сваю нявіннасьць тым, што ў гэтым месцы нэўтральныя воды. Хіба ёсьць нікім не заселеная вада? Як і лес ці поле?
О, менавіта тут будзе мой дом! Нарэшце ён спэўніцца. Зморана спыняюся, засынаю на хаду, як смоўж, быццам усё яно з мной.

Заходжуся ў храм, дачка застаецца на вуліцы. Цёмна, рознакаляровыя шкельцы вітражоў высокіх вокан ледзьве прапускаюць сьвятло, гараць ахвярныя сьвечкі. Здагадваюся, што храм сёньня адпачывае, але ж дзьверы не на замку. Анікога, толькі пад паднябеньнем галасамі птушак перагаворваліся анёлы. Кленчу, жагнаюся, рука цяжкая, бы ёю хто водзіць. “Ойчэ наш, ктуры ест...”, — адчуваю, што вымаўляю знаёмыя словы зусім інакш, не па памяці, калі амаль губляеш сэнс слоў ад звыкласьці, бегласьці вымаўленьня, гаворыш звычайна, хапатліва, ні да кога не зьвяртаючыся — ня бачачы Бога перад сабой. Цяпер я быццам паўтарала словы за тым, хто стаяў побач, і, ня ведаючы, што казаць далей, чакала голасу, каб тураваць.
Адчула, нарэшце, што тэкст, завучаны ў дзяцінстве, ёсьць МАЛІТВАЙ.
Адыходзячы, заўважаю постаць у манаскім габіце. Але ж не было чуваць крокаў?! Выйшаўшы, чытаю: гэта касьцёл сьвятога Францішка.
Наведваемся сюды ў часе службы. Стары ксёндз сустракае сваіх парафіянаў у дзьвярах. Вось вядзе дзяўчыну, праз увесь храм да лавы, выпусьціў ейную руку наастатку, бы выпусьціў птушку, ледзь прыўзьняўшы ўверх, дзе болей паветра, прасторы, каб разьвінуліся крылы.
— Нам абавязкова трэба трапіць у Ватыкан!
— Ватыкан яшчэ пакуль не мая парафія… Я яшчэ толькі пацеры навучылася мовіць...
Я блазную? У Ватыкан трэба ісьці не праз гандлёвыя шэрагі — у нас жа наўме купіць дом. Я яшчэ не намацала нагой таго намоленага шляху да Ватыкану, ён павінен пачынацца ад самага твайго парогу, адкуль ідзеш.
У кавярні, куды зайшліся выпіць экспрэса па-італьянску, дзяўчынка гаспадыні падносіць нам папяровую сурвэтку. На ёй флямастэрам нашыя партрэты — дзьве скіфскія каменныя

бабы! Мы сьмяемся разам, нарэшце разьняволена, моцна, з нас цешыцца старая італійка насупраць, бы нарэшце ўдалося-такі зьняць з гэтых нетутэйшых пахмурных істотаў нейкай невядомай тут моцы праклён. Яна нешта да нас гаворыць, чую шапаценьне капяжу, няўлоўны дотык да маіх перасохлых вуснаў — мова вакол шумела вадаспадам.
Увечары плынь людзкая значна гусьцее. Каля ўваходу ў кавярні, рэстарацыі запальваюцца сьвечкі, Марчэла далучаецца да ўсіх і едзе па вуліцы, быццам таксама шпацыруючы, крыху падняўшы голаў. Плынь запавольваецца. Людзі рухаюцца, як у водавароце, пераходзяць адзін да аднаго, пакуль ня знойдзецца супольная бяседа — па два, па тры, — ужо толькі спыніцца і размаўляць. Нехта раз-пораз віхне каля цябе на ровары, насьвістваючы начной птушкай, — не зачэпіць.
Засынаючы, чуеш, як грукаюць дзьверы, — пэўна, вярнуўся дамоў Рыгалета, і надзіва робіцца ўтульней у ложку і спакайней, як было ў дзяцінстве, калі старэйшыя ў сям'і клаліся спаць апошнімі, пільнуючыся, пакуль ты абасьнеш.

Ёсьць нейкая асаблівая інтымнасьць нават у тым, калі зазіраеш, расхінаючы лісьце прымулы на падваконьні, знаходзіш сонныя пупышкі кветак, скручаныя маленькімі зародкамі ўва ўлоньні. Калі няўцямна бярэшся паліваць гіяцынт, кветку дажджу, менавіта тады, калі за акном ідзе дождж. Калі сядаеш у аўтобус разам зь незнаёмымі людзьмі, што едуць у Вальтэру. Нарэшце паглядзець дом, ён паблізу Вальтэры.
Дарога ўвесь час пад гару, крутыя адхоны, ты ў паветры, толькі што не на самалёце, незнаёмае дагэтуль пачуцьцё ўзьнёсласьці, пэўна, як у часе клінічнай сьмерці. Тая пара вясны, калі ў садох падразаюць аліўкавыя дрэвы. Насустрач зусім блізка ляціць з мутой ручай, варочае камяні, бы шукаючы, як мы ў дзяцінстве, вягалаў. Але анівошта ня можа мяне вярнуць назад, да былых зямных змыслаў.
Нарэшце спыніцца, нарэшце намацаць пад нагой токі гэтай зямлі, якія шукаюць выйсьця ў шумлівых гаворках тутэйшых людзей, вырываюцца выбухамі сьмеху, гучаць мэлёдыяй!
Вунь той дом, на пагорку, паказвае гаспадар. Быццам блізка воку, але нас адносіць хваляй пагоркаў то ўбок, то ўніз. Дарога размыта дажджамі, няма сьледу, сюды можна дайсьці толькі сэрцам. Ужо тая дарога цераз маё плячо — яе цягнеш як на

сабе. Вось і ён, Дом, з высокім каменным ганкам, зялёныя аканіцы, — Дом, да якога ішла ўсё сваё жыццё. Рухалася, як на інваліднай калымажцы, а мне, сьмеючыся, кідалі ў пеляну каменьне — я зь яго спрабавала скласьці падмурак. Паказвалі пальцамі ў другі бок, калі губляла дарогу, блудзіла. Падвязвалі пустую кансэрвавую бляшанку ззаду да кола, як паблажлівай істоце. “Празь якіх пару гадоў я буду стары дзед, дай мне пабыць яшчэ шчасьлівым”, — сказаў муж і пайшоў да маладой...

Дом у два паверхі, быццам чужыя сьцены, ты іх ня ўзводзіў, але яго яшчэ не пакінуў Бог. Высьлізганыя парэнчы, старая мэбля, дзе-нідзе шчарбатая цэгла, толькі гэта ўжо як дэкор, сьведка стагодзьдзяў — антык, яго не хаваюць пад слоем сучасных фарбаў, — як той казаў, чароўнасьць расколіны. Нарэшце збылася туга па старым доме! Цяпер толькі так: вечар, лямпа на доўгім дубовым стале і — гаварыць, гаварыць бясконца аб тым, што начны лівень змыў зямлю з карэньня яшчэ сонных ружаў, што ў адным месцы цячэ страха. Замаркоціцца крыху і падумаць: а ці не напісаць ліст у Менск? Падняць медзяную жэзву, выпушчаную з рук былой гаспадыні, набраць вады, паставіць на агонь. Дома я ўсё гэта рабіла сьпешна, бяз густу, пужалася, што мала часу маю на тое, шкадуючы яго на дробязі. Цяпер я вылечылася ад пуду, чым бы ні займалася: я гатую каву, я “выхоўваю сад”, і не на французкі манер, — тут ён звычайна нязмушана пераходзіць да самой прыроды. Я распальваю камін — робіш работу, быццам чытаеш вершы. Кожны мой рух адбіваецца ў вечнасьці, бы ў люстэрках. Нічога тут не губляецца — ты цяпер звычайная служыцелька свайго храму быцьця, дрэва, каменя. Засталося толькі выставіць на тэрасу крэслы, сесьці на ровар (кошык замацаваць сьпераду ці ззаду?) і — па рыбу ў Вальтэру! Ці да мора, туды, дзе яно не ўпіраецца лобам у каменны парапэт, як зачынены буйны зьвер, — да мора хочацца падысьці блізка, ступіць у ягоны вільготы сьлед у часе адліву. На электрычцы — у Вэнэцыю! З самага ранку, каб пасьпець дамоў завідна, як, бывала, з поля ці зь лесу. Заглядаць у твары карыятыдаў, багіняў прыгажосьці, — хто яны? у чым? што трэба? як? каб табой любаваліся? Падняць руку, закінуць за голаў, каб грудзі выглядалі гронкамі?! Я ня ведаю такіх таямніцаў, да мяне не дайшлі запаветы Творцы: сачыць, пераймаць прыгажосьць лілеяў і птушак нябесных, чым

кіруецца зь дзяцінства кожная італьянка… Вярнуцца ў дом, поўня запаліць свой ліхтар, усю ноч пераносіць яго з пакою ў пакой. Агні няблізкіх селішчаў у гарах, на пагорках — ноччу яны ўсе ў небе, толькі што бліжэйшыя за зоры. Крыжавіньне аконнай рамы ляжа каля босых ног. “Я выйму з вас сэрца каменнае і дам вам сэрца плоцкае...” — чую сьвятога Францішка ў час пацераў. І ня спаць пасьля ютрані, каб пасьпець “прыпасьці да кожнай “меданоснай хвіліны быцьця”. Выйсьці ў поле, ахвярна разаслаць на траве настольнік, пакласьці дабультовую ежу, запрасіць птушак да столу і... пайсьці дамоў, пакінуўшы “гасьцей”, каб не перашкаджаць, — ахвяра хвалы.

— Мы купляем дом у правінцыі...
— У Італіі няма правінцыі! І наагул: Гётэ ані разу ня быў у вялікім горадзе, каб не парушыць свайго сьветаадчуваньня, свайго сьветапогляду.
— Я расчараваная…
— А я гатова тут вучыцца нават расчараваньню.
— Ты амаль з мной не размаўляеш...
Ня хочацца гаварыць, нешта абмяркоўваць, пражываеш гэтыя некалькі дзён, бы ўвесь час сьцішана мовіш пацеры. Дык што: калі табе бязь меры падабаецца вобраз жыцьця, вобраз мысьленьня, прырода — можа, гэта ўжо і ёсьць твая радзіма?! Мы дамовіліся з гаспадаром, толькі што не разьлічыліся. Вярталіся ў горад, дзе былі спыніліся, апошнім аўтобусам. Апошнім? — гэтае слова раптам вылучылася з астатніх, набыло разьвітальны сэнс, быццам ад’яжджаеш назаўсёды. Адразу пазначыўся край твайго жыцьця, далей ты ўжо будзеш жыць, быццам атрымаўшы страшнае заключэньне доктара — дні твае палічаныя. Апошні?! Але на прыпынку людзі, яны… сядаюць у аўтобус? Яны вяртаюцца ў Вальтэру? Неверагодна! — чорная, коўзкая дарога, стромкія адхоны і ноч! Доўга стаю, углядаюся ў твары, праводжу і... быццам вяртаюся разам зь імі. Яшчэ ёсьць надзея. Ёсьць асабістая повязь паміж тымі людзьмі, зь якімі разам едзеш ДАМОЎ.
Сьвяты Францішак будзе суправаджаць маю душу ўсё астатняе жыцьцё — і ўвесь час горнай дарогай…
Прыехаўшы ў Менск, я баялася свайго твару, жэсту: мяне могуць не зразумець на вуліцы. І ня тое каб я “прыдбала

мясцовыя характэрныя рысы”, стала італьянкай, але гэтая гатоўнасьць усьміхнуцца, загаварыць, прывітацца, быццам мы ўсе запрошаныя ў госьці і сустрэліся ў доме Гаспадара.
Часта стала сустракаць аднаго жабрака. За плячыма перацятыя вяроўкай папяровыя скруткі, кардонныя скрынкі, сабраныя на сьметніках. Усё гэта тырчыць, кратаецца на ветры, бы скрыльле, — лятучы жабрак?! І крочыць ён заўсёды павольна, навобмацкі. Сустракаю на адным і тым жа месцы, у адзін і той жа час, бы адлюстраваньне зь іншых зямель. Адважваюся даць яму крыху грошай. Ён спыніўся, ветраючы скрыльлем, узрадаваўся. Стаім, сьмяёмся над гэтымі грашыма, абое разумеючы ў жыцьці большае за іх і радыя ім як прычыне спаткацца — загаварыць, усьміхнуцца, прывітацца...
Дасылаю тэлеграму ў Італію з адмоваю ад куплі. Уваходжу нарэшце ў свой ЧУЖЫ дом і спрабую жыць інакш, чым было дагэтуль. Адшукаць на дзедавым гарышчы куфры даўнейшыя, ручнікі, лубкі, латкі, церніцы. Тое, што зблоцілася праз маю нядбайнасьць, узнавіць, перазьняць, як у акне седзячы з іголкай. Падняць старое кола ад тарантаса і па ім згадваць поры году вечнасьці. Я не адракаюся ад самай маленькай чалавечай ролі, бо нам даецца плоцкае сэрца замест каменнага ня толькі дзеля нас саміх.
Калі ж зрэдку выпадае ад’ехацца за мяжу і адчуць, што там таксама нешта ўразіла, прытрымліваю сэрца, не пускаю далей парогу, бо інакш, выдаецца, ужо буду любіць Італію ня ўсёй душой.
Ляпаюць раз-пораз дзьверы. На дзявятым паверсе, нада мной, новыя жыхары, новыя гукі — пэўна, нехта гуляе ў тэнісны мячык. Гэта немагчыма! — ну проста псыхічнае атачэньне! Трэба пайсьці пасварыцца! Пастукаць па батарэі! Але... Але надзіва ўдаецца ўявіць, шго гэта на маёй страсе гуляе дуронае кацяня...

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн і майстраваньне **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Юрась Пацюпа

---

* * *

Усё складаецца як верш:
пачнеш зь любосьці — скончыш песьняй.
Было каханьне сама перш,
а потым — вечнасьць.
Засьне травінка на губах.
Спачатку крок, спачатку слова.
Як яблыку, расінцы ўпасьць,
спыніць размову.
І сарамяжлівасьць суніц.
І паўната зрынатых сьлівак.
А крок наступны не прысьніць,
бо немажліва
зьлічыць ні зор, ні пчол, ні слоў.
Як той паэт, на мове птушак
адно і скажаш пра любоў,
так, каб ня схлусіць.
На мове доўгага жыцьця.
На мове погляду, крананьня...
І сочыць сьліўка, каб упасьць
табе ў далоні.

* * *

Наступны санэт напісаны сылябічным цэзураваным

адзінаццаціскладовікам (5 + 6), ці, дакладней кажучы, цыклічным спосабам з выкарыстаньнем асымэтрычнага памеру — дзьвюхстопнага дактылю плюс дзьвюхстопнага пэону першага. Няхай ён паслужыць разбурэньню догмы пра непрыдатнасьць сылябікі.
Ларысе

Заўсёды восень у тутэйшым краі:
дрэвы ўжо зь лета з хвораю лістотай,
цяжкім паветрам дыхае балота,
а гусей стада зямельку жагнае.
Там над кладамі павуціньне тае,
хоча аплесьці майго сонца злота,
ціхае сэрца даймае згрызота,
бо хмаркай стала ядыная, тая.
Моўчкі падыдзе за туманам сінім,
сьлязіма ўніжа палынова вецьце —
гэтую памжу, схамянуся, скіну...
А яна зь неба праліецца ўрэшце,
душу абойме, і пачую: мецяць
кроплі, як быццам цьвікі ў дамавіну.
22.09.2002 г.

Рытурнэль проклятых паэтаў

ахвярую Ларысе
Катул,
ты рогі нёс свае ад Лесьбіі, як німб,
і вось накрыў мяне сумнеўнай славы гул.
Віён,
з законам на нажах, ты сораму ня знаў,
і я Лісу люблю, нашто мне добры тон?
Баркоў,
што дзіўны лад шукаў у гомане карчмы,
пазыч для сьвету мне зь дзясятак добрых слоў!
Рэмбо,
зламаны смык, ты сам — на мелі карабель,

ня трэба выбіраць, шаптаць: “Або — або...”
30.04.2003 г.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Гюнтэр Грас

Прэтэнзіі на права

Больш нікога не прапусціць
і аж да самазабыцця
стаяць у чарзе па селядцы.
Пад шчыльным покрывам аблокаў
мы змагаемся за месца ля акна.

Tour de France

Калі групу лідэраў
абагнаў жоўты матылёк,
шмат хто з удзельнікаў гонкі
адмовіўся яе працягваць.

Раніца ў нядзельку

Як пяшчотна яны, заглыбіўшыся ў сябе,
стурбаваныя драпінай з палец даўжынёю,
мыюць сваё аўто
ды ягоны бампэр.

Дэкадэнцтва

Хоць свежыя яйкі ўтрымліваюць аспірын,
пеўням баліць галава,

ды ўсё роўна гойсаюць;
як нервова ўвесну вылупляюцца кураняты.

Пуга

Паколькі кожны труп кладзе нечаму пачатак,
паколькі не бывае абсалютна трывалай скуры
і добра вядомай таямніцы,
паволі прабіваецца, бы тое золата,
з-пад снягоў вясна.
Яшчэ спіць пуга, і ў гэтай пузе
загорнуты красавік.
Яшчэ нехта пілуе дровы, думаючы пра зіму;
і побач праходзіць жанчына,
але яму не да яе.
Хлапец стаіць на падворку,
касавурыцца і трымае пугу.
Пасля ён паволі паварочваецца,
паварочваецца і не касавурыцца больш; не,
павярнуўшыся, ён ляскае пугай удоўжкі з домам.

Арфей

Я тады прылічваў сябе да публікі
і заняў быў месца ў семнаццатым радзе.
Так, трымаючы ў руках праграмку,
я нарэшце дачакаў антракту:
капельмайстра ўсяго я пакрэмзаў,
раялю ўрэзаў па пысе і выбіў флейце
вока; і бубны запоўніў свінцом — чым жа яшчэ?
Трэба было выстрыгчы валасы ў паловы ўсіх інструментаў.
Хто тады сарваў працяг майго прадстаўлення?
Білецёры адчулі сілу,
кідалі мне скрыпкі, пластроны кашуляў,
у чорна-белую, як ноты, лінейку.
Арфістка, хоць яна і жанчына,
над мною схілілася, у міласэрнай сукенцы.
Я так захапіўся ейнымі струнамі,
што паразумяваюся цяпер адно на мігі:
мілагучнасць, я не чую цябе, мне нельга

прасіць яе праграмкі.

Зь нямецкай мовы пераклаў
Лявон Баршчэўскі

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Альгерд Сташэвіч

— Козачкі… восем тыдняў… пятнаццаць баксаў пара…
— Ой, мамуля, якія маленькія козачкі, якія прыгожанькія, мамуля, давай набудзем.
— Козачкі… маленькія козачкі… спецыяльныя пакаёвыя козачкі… пятнаццаць баксаў пара…

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Вячаслаў Адамчык

Дзённік 1998

Спадчына: “сярод сваіх і чужакоў яна нам ласкай матчынай”, — пісаў Купала. Мне ў спадчыну дасталася старая шафа з бацькавымі рукапісамі. Чарнавікі апавяданняў і раманаў, нататнікі і дзённікі. Шафа, поўная сшыткаў, спісаных татавай рукою. Што з імі рабіць? Як да іх падступіцца? З якога боку? Вырашыў — з адваротнага. Выбраў дзённікі за 1998—2001 гады, набраў і раздаў у часопісы; 2001 — у “Полымя”, 2000 у “Дзеяслоў”, 1999 у “Маладосць”, 1998 у “ARCHE”. Калі пройдуць часопісныя публікацыі, набяру і раздам 1978—1997, папярэднія дзённікі за 1962—1977 гады ён паспеў падрыхтаваць і апублікаваць сам. Вынікам гэтай працы будзе кніга: Вячаслаў Адамчык, “Дзённік 1962—2001”.

22 студзеня 1998 году.
Учора, убачыўшы кароткую тэлеперадачу, дзе на ўвесь экран прыгожа і фацэтна глядзеўся адзін з найсімпатычнейшых і найстарэйшых нашых літаратараў, нечакана і нават з дзівам для сябе зразумеў, чаму ён выжыў, прайшоўшы ўсе кругі пекла: фронт, палон (армія Ўласава), Рур, Данбас — нямецкія і савецкія вугальныя капальні. Аказваецца, ён няўзнак, спадцішка, не на ўвесь голас, але ўмее пахваліць начальства.

Дабрата Машэрава... А чым жа ж скончылася? Здрадаю, самаю найгоршаю, вынішчэннем даастатку беларускага пакутнага слова.
Мне, прынамсі, прыгадваецца, як ён <М. Я.> ціхенька сядзеў, ссутулена і прыгнута ўцякаючы ад усіх спрэчак, сварбы, выступленняў, таемна толькі распытваючы пра судовыя працэсы, што ішлі над карнікамі з батальёну Дзерлівангера... Да іх, палонных, што перакінуліся на службу да немцаў, у яго, палоннага, меўся асаблівы інтэрас.
Пра пачатак вайны, уцёкі з Менску, акружэнне пад вёскаю Мясны Бор ён умеў яскрава, шматкалёрна расказваць, напісаў шэра і бескалёрна.
Не менш унікальная рэч наша памяць. Асабліва памяць дзяцінства.
Сваю расстраляную запальнымі снарадамі ўлетку 41-га Варакомшчыну я магу аднавіць па нейкіх нязначных на першы погляд, але зваблівых для сямігадова[га] падлетка рэчах. Напрыклад, па карычневым паліваным кату-скарбонцы, што стаяў на выштукаванай шафе, ці па настольнай керасінавай лямпе з малочным абажурам, па металічным будзільніку на трох ножках з нікеляваным, нібы веласіпедным, каўпачком званка наверсе, нават па жоўтым пачатку кукурузы, тады яшчэ не моднай, што сеялася колькімі калівамі пры мяжы ў вясковым гародзе. Дзядзькаў хутар, што прыгожа і паэтычна ўздымаўся шарымі будынкамі над высокаю рачною стромаю, з якое абвальваліся круглыя, як перакаці-поле, кусты ядлаўцу, — па высокіх шастах радыёантэны: на стале ў хаце чарнела каробка дэтэктара з пружыністымі дужкамі навушнікаў. Адпаведна кожнай гэтай дэталі ў памяці аднаўляецца ўся хата, цесны двор — брукаваны ці не, вуліца, адгароджаная парканам ці выкладзенымі ў рад валунамі-камянямі, і паўстае ўся спаленая вёска.
Дзіўна, але я хачу ў яе вярнуцца.
Пасля полудня я зрабіў круг, праехаўшы тралейбусам № 5 за Чэрвеньскі рынак у свой ЖЭС, каб праясніць справу з кватэрнай аплатай і рамонтам залітага ваннага пакою.
“Вам будзе паведамленне, вам пазвоняць”, — сказаў высокі, падобны да выблядка Л. начальнік, мінаючы ўсю чаргу перад глухімі дзвярыма.

Пятніца, 22 студзеня 1998 году.
Да ўсходу сонца, раніцаю, у акне зверху — густа-сіняе неба, пасярэдзіне — ясна-сіняе, знізу — светла-зеленаватае.
На поўдні над шпілем вакзалу — сярпок старога месяца, а злева ад яго — ружовы, падсвечаны сонцам дым. І сонца ў іскрыстай кароне — яно прасвечвае белыя, празрыстыя, як марля, перыстыя аблокі.
Ужо марознымі вечарам і раніцаю над праспектам Скарыны, як над горадам Нукусам у спякотнай Каракалпакіі, стаіць залаты пыл. Учора надвячоркам у ім ажно хавалася нізкае сонца.
На тратуарах і на праезджай паласе пластом ляжыць падсушаны, перамешаны з калійнаю соллю пясок, якім пасыпалі снег і лёд. І аўтамабілі, як на пясчанай дарозе, падымаюць хмары пылу.
17.20. Пад сонца і марозік па бясснежнай дарозе (снег, лёд толькі ў лесе), акружанай зялёнай рунню, з'ездзілі на дачу.
Каля жалезнай, прывязанай на вяровачку брамы нас — стары "мерседэс" — сустрэла з брэхам гання галодных сабак. З старажоўкі выйшаў малады вартаўнік з чорнай павязкай ("язычок") на воку. З-за дзвярэй вызіраў мілавідны тварык ці не п'янай старажыхі.
Вартаўніку падарылі трохлітровы слоік марынаваных гуркоў і торбу з буракамі. Нехта ўжо спрабаваў у шыбе адкалупаць штапікі — улезці ў дачны дом.
Дадому ехалі праз ждановіцкія дачы. Я ўбачыў нялюдскі, без даху, двухпавярховы цагляны дом пад старымі бярэзінамі — дачу Быкава. Яна спланавана напэўна лепш, чым мая, але эстэтыкі, хараства ў ёй няма. Куды больш фацэтна глядзеўся дом нікому невядомага гэбіста Ягорава.

Нядзеля, 25 студзеня 1998 году.
9.10. Як учора — марозны (–7°С), бясснежны ранак. Сонца ў марлі расцягнутых, паласатых хмараў з кавалачкам ружова-жаўтлявай тэнчы (вясёлкі) (з правага ад сябе боку).
Учора — Чэрвеньскі рынак, дзе мы з Нінаю, абышоўшы ў белым аднапавярховым доміку мясныя сталы, назапасіліся харчамі на тыдзень. У канцы дня — Міраслаў з пляскатаю бутэлечкаю брэндзі. Лячыўся, перабіваў боль, бо яму і рвалі, і свідравалі зубы. Расказваў пра напытаныя кватэры, якія аглядаюць, каб купіць адну з іх пад офіс.

На вул. Янкі Купалы, ці, праўдзівей, на рагу пр. Скарыны і вул. Купалы — чатырохпакаёвая (першы паверх) — страх якая дарагая. Побач з кінастудыяй прадаецца трохпакаёвая, напалавіну таннейшая.

Аўторак, 27 студзеня 1998 году.
19.50. Не магу ўжо без агіды глядзець рас. тэлебачанне, слухаць абрыдлую балбатню таўстамордых куліковых, строевых, прымаковых...
Сёння, убачыўшы на другі бок вуліцы чорную лайку з белым хвосцікам, белым каўняром і белымі лапамі, сам-насам смяяўся: як назваць сабачку — белахвосцік ці чарнамордзік?
Некалькі гадзін праседзелі з Нінаю перад дзвярмі юрыстак у натарыяльнай канторы, але справу з тастаментам (мая) і дараваннем ці адарваннем кватэры (Нініна) так і не залатвілі — не хапіла ўсіх даведак і розных копіяў.

Панядзелак, 30 студзеня 1998 году.
8.30. З носу зноў ідзе кроў. Боль у галаве, звон у вушах. Не магу варухнуць рукамі. Дрыжыць сэрца. Гатаваў сабе манку і чакаў, што рухну там, каля газавай пліты на кухні.
Гаснуць усе спадзяванні. Усплываюць думкі пра адно і тое ж... Не дапісаныя апавяданні, не створана кніжка дзённікаў, засталіся толькі ў планах аповесці і п'есы.
Бязвольны, чуць жывы. Не магу перамагчы сваю слабасць, каб уключыць электрамашынку. Як казала маці, вяноуць рукі.
17.20. Белы мядзведзь, што ледзьве ўжо ходзіць, на прыгнутых нагах, сёння ўручыў граматы расійскім тэлежурналістам за іхняе, як сказала дыктар з Масквы, уважительное отношение к президу. Лукашенко. Аднак Расія цэніць прадажнікаў і здраднікаў. Вайна, прыхаваная, таемная, падпаленая рускімі фашыстоўцамі і нацыяналістамі (Бабурын), ідзе за Ўкраіну. Як усім абабураным (абасцаным) хочацца вярнуць страчаную імперыю. Але фігу — не выйдзе, позна схамянуліся. Прыбалты, каўказцы і азіяты адчулі ўжо смак незалежнасці: хто захоча адзець хамут ці ярмо руска-азіяцкай няволі? Казахі, узбекі, туркмены, літоўцы, украінцы?

Серада, 28 студзеня 1998 году.
8.30. Прачнуўся ледзьве жывым. Прыйшоў на кухню, і з носу на

кашулю пачала капаць кроў. Галава як звон. Мусіць, трэба прылегчы.
Нездароўчаю пайшла ў паліклініку і Ніна.
Ад змены надвор'я мы абое занядужалі ці што?

Аўторак, 3 лютага 1998 году.
9.30. Больш як паўгадзіны за сталом, а фрашку пра нізенькага і клыпатага, што пэўна перахварэў на ангельку, музыканта Гальяша так напісаць і не мог.
Ды, зрэшты, хацелася напісаць не пра яго, Гальяша, што граў у Варакомшчыне вечарынкі і ў часе п'янай бойкі мог схавацца ў сенцах, накрыцца ночвамі і пераспаць перадрагу, а пра пераклад беларускіх летапісаў на сучасную наркомаўскую мову, дзе нашае імя Гальяш перадаецца праз рускае Ілля, а беларуская ідыёма "з ласкі божае" чамусьці перакладаецца на расійскі лад — "з міласці божае".
І гэта ў неблагой і патрэбнай кніжцы з серыі "Беларускі кнігазбор" — "Летапісы і хронікі".
Не зразумеў і здзівіўся, дзеля якой патрэбы перакладалі "Баркулабаўскую хроніку", бо харство, каларыт і арыгінальнасць беларускага слова страціла свой бляск, незвычайную першароднасць, пацямнела і сцерлася, як старая манета. Адбылося ўсё наадварот — дзеяпіс не аднавіўся, а змерк і пацямнеў.
Дзякуй Богу, я маю на руках тыя/тры акадэмічныя тамы беларуска-літоўскіх летапісаў, выданыя яшчэ праз Мікалая Ўлашчыка, і магу зазірнуць у арыгінал. Можа з ласкі божае будуць перавыданыя і яны.

Серада, 4 лютага 1998 году.
8.10. Чуемся нездароўчымі — і я, і Ніна. У яе задуха, алергія, у мяне — несціханы боль галавы, што аддаецца ў правае вока. Праўда, я вінаваты сам — прычасціўся і справакаваў гэты боль. Звечара ўспухла і налілося крывёю павека. Вока заслязілася. Яно і сёння нібы запарушана — не дае спакою. А над ім, у скроні, — боль. З носу зноў паказалася кроў.
Нарэшце афармлены завяшчанні. Праўда, нам з Нінаю давялося паўдня пратаўчыся ў чарзе перад дзвярыма натарыуса, каб аформіць дакументы — мне на кватэру, Ніне — на офіс.

Учора, зайшоўшы познім вечарам, Міраслаў кампенсаваў нашыя страты на дзяржпошліну і выдаткі за юрыдычную кансультацыю: цяпер, куды ні ступі, усюды мусіш плаціць. Даўно мы не вярталіся ў лепшыя традыцыі графаманска-сталінскай прозы, сёння забытых і пахаваных навечна стаховічаў-гурскіх, аднак кніжкі дранчукоў-марчукоў-лукшаў, выданыя па лініі самвыдату, паказваюць на тое, што можна, зрэшты, вярнуцца і ў эпоху неандэртальства.
Не зборнікі прозы, а смярдзючыя смеццявозы, падфарбаваныя ў зялёны лукашэнкаўска-энкавэдзісцка-юдаўскі колер, пачалі ўжо дыхаць адпаведным пахам з паліцаў мінскіх кнігарняў.
Сівенькі — не дзіва, што ў дзеда сіва, — як законнік (манах) з келлі якога-небудзь падмаскоўнага манастыра, Іван Антановіч шчабятліва ненатуральнаю расійскаю моваю — нібы няма ў бел. дзяржаве законнай і гістарычнай беларускай? — расказваў пра інтэрас Беларусі да рэспублік Югаславіі.
Але ж і там, не ў прыклад прадажнікам антановічам-лукашэнкам, гавораць на серба-харвацкай. Ад свайго роднага не адхрышчваюцца.

Чацвер, 5 лютага 1998 году.
20.00. Гутарка з Валодзем у яго офісе (п. Скарыны, 14, кв. 24), куды я падняўся разам з крывалапым суседскім сабачкам. Валодзевыя планы — кіно, кніжкі, — ад якіх я жахаўся. Спусціўся з шостага паверху ўвесь узмакрэлы ад гарачыні і гутаркі, а ў двары мяне астудзіў пухкі снегапад і лаянка прастытутак, што п'янаю зграяю вываліліся з нейкае блізкае канторы.
"Да я не хочу зарабатывать деньги п…, а иметь настоящую работу!" Я азірнуўся: сярод двух рослых мужчын пахісталіся апранутыя ў кажушкі дзве асалавелыя маладзіцы. Ім гадоў пад сорак. Мне міжволі падумалася: як жа ж яны гадуюць і даглядаюць сваіх дзяцей?

Пятніца, 6 лютага 1998 году.
8.30. То дыміць завейны дробны снег, то ў разрывах сіняватых хмараў залаціцца сонца і глыбокі блакіт зманвае вока, як светлая надзея на штосьці таемна-радаснае. Не дарам у падлеткавыя гады на глухой адзіноце верылася, што там, за напухлымі, мяккімі і зыркімі хмарамі, звалены адна на адну,

існуе жыццё, і шархоткімі галубінымі крыллямі ўзмахваюць кучаравыя анёлы, і сядзіць сівенькі, басаногі бог.

Субота, 7 лютага 1998 году.
9.05. Стаяў каля пліты на кухні, варыў сабе манную кашу і нават не ўчуў, як на кашулю на грудзях закапала з носу кроў. Покуль не ўбачыў цёмна-чырвоныя рагі.
У галаве болю вялікага няма, ёсць адчуванне п'янаватай цяжкасці і звону ў вушах.
Прылёг у кабінеце на канапу, але й не ўлежаў, падняўся да стала.
Пасля ўчарашняй адлегі сёння –5 °С, марозік. З непрыветна-абложнага неба працярушваецца ледзьве відочны сняжок.
І вось чарговая бяда — са столі ў ванным пакоі капае вада. На пятым паверсе над намі ўсю ноч тупалі, весяліліся і не закруці[лі] краны, ці што? Трэба зноў званіць дыспетчару.
11.30. Нарэшце прагуляўся. Вядома, больш па магазінах — шукаў вяршкі. Іх цяпер у міг вока разбіраюць.
На праспекце сустрэў былых цэкоўскіх фюрэраў. Яны азіраліся на мяне, як ваўкі.

Нядзеля, 8 лютага 1998 году.
Гэтак маўчаў Мележ, да якога няпрошанымі ўварваліся спярша Шамякін, потым — Чыгрынаў. Апошні нават падбадзёрваў, адпраўляючы на той свет Мележа: "Няма чаго, Іван Паўлавіч, хвалявацца: літаратура застаецца ў надзейных руках". Тады ён быў сакратаром Саюзу пісьменнікаў і стварaў эпапею, перапісваючы жыўцом цэлыя старонкі з шматтомніка "Вялікая айчынная", нашпігаванага ілжывай і савецкай дакументалістыкай.
Каля кантэйнераў ужо ідзе бітва за смецце: малады нагамі таўчэ старэйша[га], што прысеў на кукішкі і на снезе перабірае нейкія знойдзеныя транты.
19.50. Па расейскім тэлебачанні няма ўжо ніводнай цікавай перадачы. Як абрыдлі ўсе гэтыя барсукі ці парсюкі Сванідзе, што паўтараюць бачанае і чутае.

Панядзелак, 9 лютага 1998 году.
Два разы — у суботу і пятніцу — заходзіў у ЦУМ (купляў дыван) і два разы пры дзвярах бачыў кабету з бурачковым

спітым тварам. У яе на грудзях вісела скарбонка, а на галаве была завязаная белая хустка з чырвоным крыжыкам.
Калісьці расійскі гісторык Васіль Ключэўскі праваслаўных пастыраў і іхніх наложніц называў тунеядскай моллю. Сёння гэтая моль яшчэ больш сфальшывілася, спілася і разбэсцілася. І колькі яе з сатанінскай дзікай Расіі налятае на безабаронную Беларусь.
Спярша з'ездзіў у "Белгіпразем" — праектны інстытут землеўпарадкавання (пэўна не так ён называецца) на Казінца, 86, дзе ўзяў копіі актаў на прыватызацыю зям. (дачных) участкаў, заплаціўшы ажно 600 тыс. руб., потым — у райвыканкам (Кальварыя), дзе пастаяў перад замкнёнымі дзвярмі, бо пасля полудня не было прыёму.
У чацвер прыйдзецца прайсці ледзьве не той самы круг.

Серада, 11 лютага 1998 года.
8.00. Перажыта бяссонная пакутная ноч.
У першым сне, пасля якога і прачнуўся, снілася ўсхваляванае ветрам жыта. Я, напружваючы ўсе сілы, цяжка брыў па ім. Ад дарогі ў кірунку нашага лесу, які даўно спілаваны і выкарчаваны, але які не раз уваскрасае перада мною ў маіх снах.
У тунелі пераходу — Арсень Ліс з палкаю (наехаў "форд"), на праспекце — трохі захмялелы Сцяпан Міско, паказваючы на транспарант "13 лютага Машэраву — 80": "Ён уваходзіў у групу Сікорскага і расстрэльваў заходне-бел. падпольшчыкаў і рэвалюцыянераў у 1943 годзе. У мяне ёсць дакумент-спраўка".

Нядзеля, 15 лютага 1998 году.
15.20. Абышоў наўкруга ўсе харчовыя магазіны, а вяршкоў так і не купіў — нідзе няма. Выцягваючы худую шыю, каля гарэлачнае крамы стаяў <Татур>, колішні знакаміты бабнік і нястомны п'яніца. Яму ці не восемдзесят? Усе маралісты і цвярозанікі даўно паўміралі, а ён яшчэ пільнуецца кілішка. Як чы[й] лёс. Танк некалі выцікоўваў, хто колькі п'е і колькі мае каханак. Пэўна ад зайздрасці, што сам не дабраў. У яго была адна ахвота і прагнасць — ордэны і медалі. Іхні бляск яго спакушаў болей, як бляск жаночага сцягна.

Аўторак, 17 лютага 1998 году.

Зранку ўчора цяжкі дзень: банк, перад дзвярыма якога, каб заплаціць пошліну, я добра вымак, потым — аддзел райвыканкаму, дзе я задыхаўся ад гарачыні, чакаючы, покуль афармяць выпіску паўторных актаў на прыватызацыю дачнага ўчастка (арыгіналы ў часе пярэбараў згубіліся).
Нарэшце — магазіны.
Дадому вярнуўся ледзьве жывы.
13.00. Заходзіў Валодзя. Наша гутарка на кухні, ад сённяшніх праблемаў Іраку і Каўказу да яго звышцяжкай і акружанай падазронасцю і выведамі працы.
У Вільні Аленаю куплена кватэра. Дзесьці поруч з сінагогаю. Але хто ў ёй будзе жыць?

Серада, 18 лютага 1998 году.
13.30. На пераходзе вуліцы каля паштамту, калі я ўслед за жанчынаю пайшоў на зялёны святлафор, з праспекту на мяне на ўсёй хуткасці скіраваў іржавы (жыгуль) самаходзік. За баранкам сядзеў нейкі вусаты лукашэнкавец. Я ледзьве ўскараў вывернуцца. Мне ўспомніўся Арсень Ліс, на якога і наехаў гэтакі самы злыдзень.
Як напладзілася сёння нехрысцяў, што толькі і думаюць, каб што скрушыць, разбіць, зламаць і знішчыць.

Чацвер, 19 лютага 1998 году.
Жыву адчуваннем страху смерці, асабліва прачнуўшыся ўночы і задыхаючыся ад тытунёвага дыму, што пранікае аднекуль у спальню, ад гарачыні ў сэрцы, болю ў галаве і ламоты ва ўсім целе.
Штодзённая змена надвор'я — то мароз, то адлега — перабываецца вельмі ўжо цяжка. Гэтыя кіслыя дні шкодзяць і Ніне. Хоць у яе задуха пачынаецца разам з алергіяй — чырвона-агністымі плямамі, што ўкрываюць усё цела.
+7°С. Ні зіма, бо няма снегу, ні вясна, бо няма сонца. Хмурны, насуплены дзень з вільготным паўднёвым ветрам. На пляцы Незалежнасці і на праспекце дзьме, як з рэактыўнага сапла.
У людных, цесных і задушлівых тралейбусах нясцерпна смуродзіць нямытымі бамжамі і атрутнымі лілова-апухлымі алкаголікамі.
Ледзьве жывымі вярнуліся з Нінаю з Чэрвеньскага рынку, так і не купіўшы ні цялячай вантробкі, бо была цёмная (карычнева-

сіняя), ні свінога мяса, бо аказалася мала грошай.

Субота, 28 лютага 1998 году.
11.30. Камароўскі рынак, як у часе акупацыі, акружаны паліцэйскімі патрулямі. Іх, у плямістай блакітнай форме, усюды па двое. Цэны — не дакупіцца, таксама як вайною. І ўсё ж такі мы з Нінаю адшкадавалі дзвесце тысяч на цялячую вантробку. Сабе — і, вядома, Чэсіку. Балазе ўчора "гуманітарную дапамогу" аказаў Міраслаў. Купілі і тварагу. Дарэчы, заўсёды падбіраем кабету з беларускай гутаркай. Калі чуем нетутэйшы расійскі акцэнт — абыходзім. Чужы чалавек заўсёды падазроны.

Серада, 4 сакавіка 1998 году.
Уздоўж жоўтага дому з карычневым мокрым дахам ідзе шыракаплечы і касалапы мужчына ў касматай, намоклай шапцы, падмахвае сабе чорнай папкай на раменьчыку і нясе па лужынах перавернуты глыбока ўніз свой адбітак.
Ён чымсьці нагадвае мне Максіма Танка. Грузнасцю, хадою, паставаю ці гэтаю, намоклаю, як бабёр, рудаватаю шапкаю. Танк, салідны мужчына, мне здаваўся болей падобным да каваля ці мельніка, хоць і аўтар "Энеіды" Вергілій быў таксама рослы, пастаўны і меў воблік селяніна, калі верыць Светонію і яго "Тайнам рымскага двара".
Адзін хіба Купала выглядаў без ніякіх скідак на паэта, як, вядома, і Багдановіч. Толькі на астатніх размножаных фотаздымках малады Багдановіч зарэтушаваны і падроблены пад вусатага фатографа Ждановіча (Чывіса), які рабіў гэтыя пераздымкі.
У старога дзеда, што намагаецца пераадолець косы завулак, каб падняцца ім на праспект Скарыны праз арку міма нашага дому і магазіну падпісных выданняў, з кожным днём крок робіцца ўсё карацейшым і карацейшым. Сёння ён, здаецца, ступае на месцы, памагаючы сабе ляскай (тросцю) і прасунуўшыся наперад не больш як на сантыметраў дзесяць. Ён, вастраносы сівы мужчына, заўсёды ў адной уніформе — штучным зношана-парудзелым чорным футры, гэтакай жа штучнай шапцы і ў вайсковых злінялых штанах, здаецца, нібы хворы на голаў. Я помню яго яшчэ з трынаццатага тралейбуснага маршруту, тады адзінага, што і [неразб.]. Ён,

гэты мужчына гадоў пяцідзесяці, апрануты ў вайсковы шынель і фуражку з чырвоным аколышам, сядзеў заўсёды на пярэднім сядзенні і, пераймаючы трубу, напэўна барытон, губамі выдзімаў вайсковыя маршы. Мне здавалася, што ён быў калісьці ў вайсковым аркестры.
20.30. У Расіі вэрхал і лямант у абарону гэтак называнага русскоязычного элемента ў Латвіі. Нават іржавымі брэжнеўскімі пашчэнкамі варушыў гугнявы Прымакоў. А хто, і дзе, і калі заступіўся за латышска- ці беларускамоўнае насельніцтва?

Чацвер, 5 сакавіка 1998 году.
14.25. Сустрэча з Валодзем на праспекце Скарыны, звыклая гутарка, што пераходзіла ў нервовасць і дробную сварбу ("Ды я нікога не баюся! Я магу плюнуць на Лукашэнку і Ельцына! Пра Алену здымаюць фільм!"). Потым, у прадуктовым магазіне ўжо, бліскаючы ўстаўнымі залатымі мосцікамі, — адстаўнік Марцынкевіч, у старамодным капелюшы, у старамоднай куртцы ("Я адступаў ад Зэльвы, біўся на Бярэзіне, пад Магілёвам"). А за акном — навалы сівых, з сіняватым сподам, вясновых хмараў. Яны сплываюць на ўсход, не чапляючыся за ветразі з вострымі гарматнымі штырамі стадыённых (чатырох) асвятляльнікаў.
<…>

Субота, 7 сакавіка 1998 году.
7.15. Не сплю з 5-ці. Збіраліся былі з Нінаю з'ездзіць у Ракаў на рынак. Дакляраваў узяць у свой "форд" ці "опель" сусед. Але ён, мусіць, паехаў, забыўшыся пра нас, — учора быў пад газам, калі запрашаў.

Аўторак, 10 сакавіка 1998 году.
Сухі, прадзьмуты скразнякамі праспект. Пад нагамі — лёд, у вочы — дробная жарства. Цяжка і трохі касалапа насустрач мне — адутлаваты, у рыжай, насунутай на вушы шапцы адзінокі Навуменка. Не размінуцца — павіталіся. Я, чуючы смяртэльна-лядовы холад ад яго рукі, кажу:
— Вось, хацеў купіць томік Карла Ясперса.
— Каго?
— Кніжку Ясперса, — крычу.

— Салаўёва? — ён дастае з кішэні хустачку і выцірае свой прастуджаны нос.
— Ясперса, чуеця?
— Ну, чую, але ён не пісьменнік.
— У тым жа ж справа, што філосаф.
— Трэба чытаць... — ён моршчыцца, варушыць пальцамі, нібы абмацвае грашовую купюру, — рускіх, як, напрыклад...
— Розанава, — падказваю я.
— Не, — ён зноў цярэбіць трыма пальцамі, як паказвае сілуэт зайчыка на сцяне.
— Бярдзяева?..
— Ага, — нарэшце з палёгкаю ўздыхае ён і ловіць хустачкаю распухлы пачырванелы нос.
— Мяне цікавіць Ясперс. Яго тэорыя вінаватасці, праўдзівей — пакаяння нямецкага народу.
— Вінаватымі яны сябе не лічаць. Вось і цяпер Расія стане прыдаткам Захаду, крыніцай сыравіны... Украіне Крым аддалі... А потым быў праклён на непакорных чачэнцаў і няўдзячных прыбалтаў.
— А як жа нам, беларусам? — пытаю.
— Кніжкі не выходзяць. Я ўжо нічога добрага не чакаю. Засталося толькі перавярнуцца, але пад тралейбус не ляжаш... Мы развіталіся. Я пайшоў, чуючы ізноў смяртэльны холад яго рукі.
Талстой у 70 яшчэ дзіка раўнівы, нязгодлівы, незгаворлівы. На кіёчак апіраецца, а ў сваты ідзе.

Чацвер, 12 сакавіка 1998 году.
Успомніўся Скрыган з яго задзірыстым носікам ды яго ўяўная храбрасць і даверлівая пахвальба ўхажорствам за ленінградскай перакладчыцай:
— І бутэлечку вінца распілі/раскаштавалі.
— Няўжо?
— Дзіва што.
Яму, Скрыгану, здаецца, было ўжо за восемдзесят.
І мне помніцца наша праходка над стромымі берагамі крынічнай Іслачы, сонечны пагодны верасень, кіёчкі ў нашых руках і спачын пад дубамі, што асыпалі спелыя жалуды, і зноў, як ён казаў, яго сцежкаю праз трысцё, каля завінаў, атуленых знямоглымі старымі вербамі, ізноў залаты пясчаны і абрывісты

грудок з цёплымі хвоямі, ласкавы вецер у расхрыстаныя грудзі, рачны/лугавы скошаны прастор лясное даліны са звілістаю, няструмнаю рэчачкаю ў шпалерах алешніку...

Субота, 14 сакавіка 1998 году.
14.30. Ніна ідзе ў тэатр на “Тутэйшых”. Я іх, дарэчы, калісьці бачыў — вельмі слабаваты, па-дзіцячы крыклівы і валтузлівы спектакль. Тэатр Янкі Купалы ператварыўся не ў народны правінцыйны, а ў вясковы драмгурток.
Рэжысёры — малапісьменныя людзі, магілёўскія правінцыялы, артысты без гонару, грацыёзнасці, дыкцыі і высокай адукацыі.

Аўторак, 17 сакавіка 1998 году.
8.20. Учора непатрэбная спрэчка з сынамі. Хоць яны, Валодзя і Міраслаў, вымагаюць ад мяне немагчымае: выпатрабаваць у камітэце паліграфіі ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць. <…>
Учора папрасіў у сыноў: выдайце хоць адну маю кніжку. Не выдадуць. Міраслаў тут жа ж абязвечыў мяне: “Мы выпускаем тое, што купляецца. А тваю ж кніжку не прадасі”.

Чацвер, 19 сакавіка 1998 году.
8.15. Учарашняе:
Камітэт па друку. Дзве гадзіны ў чарзе перад кабінетам начальства. <…>
Не прынёс уцехі і мой заход у выдавецтва “Мастацкая літаратура”: кніжку ў друк не здалі.
Дырэктар, падрыгваючы ножкамі, рвецца, кажуць, у прэзідэнцкую зграю і беларускамоўных рэдактараў мяняе на расійскамоўных. Вось адкуль пачынаецца вынішчэнне беларускага слова. Кніжку маю ўжо няма каму адрэдагаваць. Каб хоць чым узрадаваць і абнадзеіць сябе, купілі з Нінаю новы дыван. Балазе “Нёман” выплаціў неблагі ганарар.
У кватэры бязлад: другі дзень тынкоўшчыкі рыхтуюцца атынкаваць у ванным пакоі столь, але руху ніякага — то пяску няма, то цэменту, то сіта, то лесвіцы.
Адшкадаваўшы ад ганарару некалькі сот рублёў, нарэшце набыў К.Ясперса (праўда, 1 том) і Вайнінгера. Бо з пенсіі ўжо кніжкі не купіш.
Я не зношу ні брэх сабакі, ні сіпаты голас прэзідэнта. Кажуць, асіпласць чалавеку пакідае ў спадчыну заразлівая

хвароба — пранцы.

Субота, 21 сакавіка 1998 году.
Ніна на белым пікапе з чорнымі аконцамі паехала ў Ракаў на рынак. Паклікаў сусед, наказаўшы яшчэ ўчора вечарам. Паслухаўшы ўчарашні гістэрычны крык мінскага вусатага, як прусак, конюха, падумаў, што надыходзіць блізкі канец ці яго разбойнага панавання, ці яго вар'яцкага жыцця. Запомнілася яго фраза: "Запад при помощи национал-фашистов в угоду лжедемократам Москвы хочет свергнуть в Бел. президентскую власть" (ці праўленне?).
9.00. Вярнулася з Ракава Ніна ледзьве не з пустою карзінаю (кашом). Купцоў на рынку аказалася ў дзесяць раз больш, чым прадаўцоў. Вусаты прусак ужо забараніў прадаваць цялят. І на ўвесь торг быў адзін баран і некалькі свіных туш. Не зважаючы на высокія цэны, наезджы люд усё хватаў з рук.

Пятніца, 3 красавіка 1998 году.
3 гадзіны ночы. Не сплю. Перажываю, круцячы (пракручваючы) у памяці тасьму, на якой у кожным кадры буйным планам мільгаюць агідныя твары. Апомніўся і пытаюся ў сябе: чаму бачыцца толькі благое? Няўжо памяць не зрабіла засечкі на добрым?
І ўбачылася затравелая малаезджаная дарога сярод сіне-ружовага жыта. Падменены бацькам на пашы, я бягу дадому снедаць. Мне, басаногаму, усяго шэсць. І хутаранскі сыты кот валачэ па разоры, схапіўшы зубамі між вачэй, злоўленага зайца. Ужо нежывога.
Чэрвеньская светлая нядзелька. Мяне чакаюць на стале пухкія грэцкія аладкі і... кароценькая, на паўгадзіны, свабода.
Кажуць, старасць пачынаецца тады, калі пачынаюцца ўспаміны. Яна пачалася ў мяне заўчасна, нават у дваццаць гадоў. Я ўспамінаў светлы нядзельны ранак. Сябе на затравелай дарозе сярод жыта. Успамінаў у трыццаць, сорак. Потым — у пяцьдзесят... Цяпер.
Хрыпата ў грудзях перакочваецца, як пранік па качалцы, — грук-грук-грук.
Чорны памёр у новай, толькі што палучанай кватэры ў доме на Савецкай вуліцы. Вокны выходзілі на плошчу, на таполі, што шарэнгаю ішлі ад фабрыкі-кухні. Але ж па якой старане стаяў

дом? На той, што засталася, дзе вісіць мемарыяльная дошка Шырме, ці на той, што гадоў трыццаць назад разбурылі? Але ўжо і ў Віткі, кніжку якога калісьці рэдагаваў і ў якой паўторна прачытаў пра гэта, ужо не спытаеш.
Нават забылася, што Чорны, адчуўшы, што не можа гаварыць, намагаўся яшчэ напісаць запіску: “Заві пісьм...” Але не дапісаў — страціў прытомнасць.
Гадаю сам і баюся патэлефанаваць яго дачцэ (Чорнага) — Рэні, каб не пачуць ад яе, што будынак разабралі. Адзін з тых (трох) невысокіх двухпавярховых дамоў трохі збоку ад касцёлу. А можа, у тым, дзе быў “залаты магазін”? Успомніўся і драўляны асадзісты дом на рагу Ленінградскай і Савецкай, дзе размяшчалася рэдакцыя газеты “Літаратура і мастацтва”, і трамвайная лінія, што ішла ад вакзалу ўздоўж універсітэцкага гарадка і зварочвала на Савецкую, а з яе — ужо на Валадарскага і — уніз... Мы ўскоквалі тут, недзе каля рэдакцыі “Літ. і мастацтва”, у грукатлівы трамвай, спаласаваны на падлозе драўлянымі рэйкамі, і ехалі на Нямігу — там быў універсітэцкі інтэрнат у двухпавярховым доме з надворнымі драўлянымі лесвіцамі, жалезнаю брамаю, забрукаваным дваром і культмагам на першым паверсе. Няміга, 21, пакой № 5...

Серада, 8 красавіка 1998 году.
Мая гутарка з хлопцамі — стварыць насуперак бальшавіцкім і пэн-клубаўскім згуртаванням свой гуманістычны літаратурны звяз ці хоць бы суполку — не знайшла ў іхняй душы водгаласу (водгуку). У іх даволі свайго клопату. А супрацьстаяць дзяржаўным структурам яны не могуць: небяспека страціць работу. Бо і так з усіх бакоў абложаныя канфідэнтамі і іхнімі даносамі.
Гілевіч, якога спаткаў на праспекце, — ён, як ксёндз, у чорным плашчы і чорным берэце, і ружовашчокі, як ксёндз, — прымаў маю ідэю, але бачыў і марнасць справы: у суполку, як заўсёды, прашыюцца розныя здраднікі і прадаўцы.
18.30. Тэлефонная перамова з рэдакцыяй часопісу “Беларусь”. Мая паездка на вул. Захарава. Чорнымі “іксамі” (Х ці +) адзначаныя тыя фразы ці старонкі, якія мусяць быць вынятыя. Мой ультыматум. Не ведаю, чым усё скончыцца, але свае 13 ці 15 старонак я мушу забраць.

Цэкоўскі слізняк Шабалін, тып адкрыта прадажны, спадзяецца вытаргаваць <…> яшчэ на пару гадоў рэдактарскае крэсла. Але яны, як мне здаецца, ужо распараджаюцца не сваім часам. Па дарозе завітаў у “Полымя”. Можа, прапанаваць туды сваё апавяданне? Праўда, яно мне штосьці не пасуе. Паўторы, паўторы…

Чацвер, 9 красавіка 1998 году.
Словы з нашае варакомскае гаворкі (гутаркі): страхалюд, азіят, злыдзень, таўлуй (гультай, абібок).
Дзеразавацца (жарты строіць з малым). Дзеці дзеразуюцца і шалеюць. Дзеразуешся як маленькі. Праманьваць — жартаваць. Паліто як уліта сядзіць на ём. Акурат як шыта на яго.

Панядзелак, 13 красавіка 1998 году.
У славенскім слоўніку натрапіў на слова šlichta (шліхта) і ўспомніў варштат, што займаў паўхаты, маці ў такую велікодную пару за кроснамі. Паткаўшы, яна час ад часу шліхтуе — мажа/націрае, макнуўшы шчотку ў міску з клейкім крухмалам і семенем, шырокую пасму асновы, што ідзе з навою ў нічальніцы і берда.
Ці не паўвека мінула, а як яскрава і выразна ўспомнілася.

Серада, 15 красавіка 1998 году.
9.00. Я абяссіліў сябе ўчарашняй злосцю, што ператварылася ў невыносную бяссонніцу. І вось пад нудны дождж сяджу спаралізаваны ўсімі болямі.
Занадта крыўдлівы стаў. Прымаюся да ўсяго. А для здаровага жыцця патрэбна дробка абыякавасці. Як дробка солі ў кожнай страве.
У Расіі несціханы гвалт і лямант у абарону русскоязычных, што насяліліся і распладзіліся ў Латвіі. Ніхто толькі не бароніць бяспраўных і галодных у самой Расіі.
Уздымаючы на шчыт чужыя праблемы, уладу купіўшыя ў Маскве і Крамлі (нямцовы, лужковы і тулеевы) намагаюцца заглушыць справядлівы гнеў сваіх абяздоленых і ўтаіць, затуманіўшы вочы свету, уласнае казнакрадства і прадажнае гандлярства.
Для Расіі гэта не нова, калі разгарнуць Ключэўскага. Ды санкцыі не раз ужо прад’яўляліся, асабліва перад чарговым

паходам на Рыгу. Яшчэ задоўга да Рыжкова ці цяперашняга Лужкова, нават з часу Пятра.
У Беларусі роўнасць правоў ператварылася ў роўнасць бяспраўя. Я палучаю пенсію, адэкватную [пенсіі] прыбіральшчыцы. Страціўшы матчыну мову, мушу гаварыць на слэнгу ці жаргоне калгаснага брыгадзіра. І, як калгасны брыгадзір, у слове з трох літараў рабіць чатыры памылкі — яшчо.
Іронія і парадокс лёсу: за беларуса, пакрыўджанага ў Латвіі, можна заступіцца, за беларуса, бяспраўнага і зганьбаванага на сваёй жа Бацькаўшчыне, — не.
Нашы карэнні спадцішка і па-зладзейску падсякаюць, каб дрэва ўсохла.

Пятніца, 17 красавіка 1998 году.
16.45. Мужчына, абмоклы на вясновым дажджы, без шапкі, лысаваты, аброслы барадою, вузкавокі, падобны да Салжаніцына, пакапаўшыся ў кантэйнерах з смеццем, нясе пад пахаю свой скарб — каляровую торбу — і, накульгваючы, пакідае заліты дажджавою вадою наш двор.
Вось табе і адзін дзень Івана Шухава ў акружанай спецназам сённяшняй непрытульнай Беларусі.
<…>

Нядзеля, 19 красавіка 1998 году.
Усё ж па-беларуску трэба пісаць растопленае волава, а не расплаўленае. Топкае сала, але і топкі метал.
Перайкі каля рыжаватых, нагнутых абадамі стрымбулёў голага маліннік: ястраб задраў сітаўку. Таму ўчора, перапуджаныя трагічным здарэннем, яны не садзіліся ў наш гарод. Між імі існуе, маецца нейкая свая, чалавекам не спасцігнутая, інфармацыя.
І трэба ж: перагараваўшы зіму, прыляцела пташачка з выраю і згінула тады, калі настала пара звіваць гняздо.

Аўторак, 21 красавіка 1998 году.
Дом літаратара, ці ўжо корпус управы аператыўнай управы. Настылы, адключаны ад ацяплення. Рада. Ссутулены, з дрыготкімі рукамі Зуёнак, кучаравы, нечым падобны да партрэтнага Валошына. Няголены па-гебрайску, з адутлаватым

тупым тварам Дудараў. Хваравіта-злосны, з сінімі тонкімі губамі Бураўкін.
Навуменка з праваленым ротам. Падобны да нейкага снежнага чалавека, шыракаплечы і грузны Гніламёдаў. На зарослым, шчаціністым вялікім твары ані іскры розуму...
Выбіралі на пасаду старшыні прахадзімца і чужынца з цягучым-нудным голасам Някляева...
Куды ж ніжай можна апускацца?

Пятніца, 24 красавіка 1998 году.
Ад з'езду пісьменнікаў прыкры асадак на душы: залішне шмат было нервовага крыку, як, дарэчы, і п'янага (Сыс).
Гутарка пра літаратуру ніяк не магла прасачыцца праз наш адчай і боль — Гілевіч, хоць і паўтараўся, і быў, як заўсёды, аднастайны ў сваіх прамовах, але гаварыў слушную праўду.
Мой заклік стварыць саюз прафесійных літаратараў прагучаў ці не дысанансам.
Дарэчы, Гілевіч не пацвердзіў, што пакідае шэрагі Саюзу, у якім заўладалі здрайцы і звычайныя графаманы. А я спадзяваўся яго падтрымаць.
Шамякіны-савіцкія рассылалі па радах звароты да з'яднання са зграяю расійскіх ультранацыяналістых (Бандарэнка, Бялоў), якія самапростам, без запрашэння ўварваліся на беларускі з'езд з кіпамі сваіх газет і лістовак.
Сярод дня трывожная навіна — разгромленыя рэдакцыі беларускіх газет і часопісаў: "ЛіМ", "Беларусь", "Полымя".
Выблядак пачаў карыстацца метадамі гестапа. Спачатку ноч выламаных дзвярэй, а за ёю — ноч павальных аблаў.

Субота, 25 красавіка 1998 году.
8.30. Надвячоркам — Міраслаў з не менш адчайным і роспачным запытаннем: як жыць і працаваць далей? Заставацца тут ці выехаць — хоць бы ў Польшчу? Я параіць нічога не мог. Аднак сказаў: калі ёсць прадчуванне немінучага арышту, то трэба ўцякаць.
Папраўдзе — пачынаецца ноч кінжальных нажоў.
У Беларусі вынішчаецца нават сама назва "беларус". Тут, як нідзе, звілі сабе гняздо ўсе расійскія камуна-фашыстоўскія саюзы. Сюды збеглася гнанае з Прыбалтыкі маскоўскае гэбэ і энкавэдэ, усе шпегі і охранные доносители.

14.30. Гутарка з Валодзем: нам усім трэба думаць пра эміграцыю. Сітуацыя вымагае. Жыць у бяспраўнай краіне немагчыма. Міраслаў, збіўшыся з толку, прапанаваў Лондан. Валодзя — Вільню, я — Беласток. У Англіі — Чэсік. Што рабіць? А мой, зрэшты, архіў, асабліва — дзённікі? А тастамент: пахаваць, рассыпаць попел на варакомскім полі. Чарнобыльскі шлях. Бел-чырвона-белыя сцягі над бясконцаю калонаю маніфестантаў, што цячэ ў асветленай цясніне гарадской вуліцы. Дзеці з лампадкамі. Расцяжныя жалобныя гукі звона. Ускрыкі: “Не-за-ле-жнасць! Не-за-ле-жнасць!” Інвалід у калясцы.
П’яны з сівымі вусамі з тратуару ім наперакор: “Да здравствует СССР!” Хлопчык гадоў сямі з пабітым тварам адпіхае п’янага дзеда.

Аўторак, 19 мая 1998 году.
9.10. Учора: выдавецтва, гутарка з дырэктарам, з новым рэдактарам (Шупенька). Але ці выйдзе нарэшце кніжка, яшчэ невядома.
14.30. Гутарка з Валодзем перад кнігарняю “Падпісныя выданні” на праспекце. У іх з Міраславам дрэнныя справы: ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць Камдрук не выдае.
Потым сустрэча з Міраславам каля ліфта — ён прыходзіў забіраць свае дакументы. Якою вясельнаю зграяй нас, Адамчыкаў, акружыла каляпрэзідэнцкая і калялітаратурная дружына.
Для сыноў паўстала пытанне: як выжыць?
16.20. Каб купіць што-небудзь з сабою на дачу (заўтра вязе на сваім джыпе нявестка Таня), мусіў размяняць — і нарэшце абмяняць дваццаць даляраў. Каля аконца абменнага пункту чарга на пакупку “зялёных”.
Дарэчы, як пачынаю заўважаць, знікаюць беларускія назвы харчовых прадуктаў і з’яўляюцца сыр сусанінскі, каўбаса маскоўская, сыр волжскі. Між іншым, каўбаса маскоўская вырабляецца на Ваўкавыскім мясакамбінаце, сыр сусанінскі — ці [не] на Дзятлаўскім маслазаводзе (малачарні).

Серада, 27 мая 1998 году.
Сёння ў Доме літаратара, які ўжо па загадзе прэзідэнта зрабіўся корпусам № 5 оперупраўлення, засядае кнесет, ці

вялікі хурал новай рады Саюзу пісьменнікаў.
Выбары чарговых сакратароў. Тут ужо нібы на даўнейшай палескай бяседзе, калі ў хаце быў адзін стол, адна лава, адзін відэлец і адна чарка, што ішла па крузе, нехта сядзеў за бяседным сталом, а нехта цярпліва чакаў сва<ёй> раты, тулячыся на прызбе.
Сёння той-сёй, нарэшце выпакутаваўшы пэўны час, з прызбы пяройдзе ў хату за бяседны стол. На покуць, зарослы павучынаю сплетняў, святы ўгоднік ужо пасаджаны з'ездам літаратараў месяц назад.
Дзіўная, аднак, рэч: усе ганарыстыя кіраўнікі, што хадзілі задзёршы нос, страціўшы пасаднае крэсла, раптам уцінаюць голаў у плечы і нябожацца, як свіныя таткі.
Вось і сёння — адзін стары, згорблены, а калісьці з выпучанай грудзінай вядомы фраер, нястомны бабнік, выбірае на камяністых сотках палявы шпат, раз за разам наступае на лапату, другі, трохі маладзейшы, насунуўшы кепачку, ссутулена стаіць на зялёнай мяжы і таксама раз за разам нагінаецца, выцікоўваючы на букеце што толькі ўгледзелася бульбы каларадскіх жукоў.
18.45. Нарэшце выбрана кіраўніцтва суполкі бел. літаратараў: тры срулі і пры іх Іпатава.

Чацвер, 28 мая 1998 году.
7.30. Як бы гэта не хадзіць у Саюз пісьменнікаў, ні з кім там не знацца і нікога не бачыць.
Ад учарашняй рады я, кажучы ў рыфму, не рады. Адчуванне такое, нібы я нешта ўкраў, некага аблаяў ці валяўся да непрытомнасці п'яным.
У сакратары <і літфонду> выбралі авантурыстаў і круцялёў. Пры чым яны да нас, літаратараў, і мы да іх, злыдухоў.
Але ці палучу нарэшце ганарар, каб паехаць сёння на дачу. Другі месяц не выплачваюць грошай.
"О, як трудна грош даецца!" — ці не так запісаў у сваім дзённіку Язэп Драздовіч?
І яшчэ яго: "Усюдых фальш, манеўр, стратэгія на выйгрыш". Гэта нібы пра новае кіраўніцтва суполкі літаратараў, якое будзе дзейнічаць пад эгідаю трох Б: будзінаса, бядулі, бураўкіна. А пры іх тая ж кароценькая Іпатава, што змяніла, кажуць, чацвёртага мужа. У свой гарэм чэмярыс Някляеў назбірае

маладзенькіх паэтэсаў. Шлях дзяўчатак, што забаўляюцца вершамі, на старонкі “Крыніцы” ляжыць праз ложа.
Чалавецтва, вядома, перажыло і горшыя часы (часіны), але сёння, як ніколі, напладзілася даўганосікаў-цветаедаў, што амаль у кожнай кветачцы на беларускай безабароннай яблыні яны вывелі чарвячка. Толькі і бачыш, як плаўна пагойдваюцца на павучынах, раскалыханыя лёгкім ветрам, светла-зеленаватыя пярсцёначкі.
Брыджуся ісці ў Дом прэсы, каб не напаткаць там кароткага і тоўстага, як свінабой, Ліпскага альбо такога выблядка, як Ягуда-Ягоўдзік.
Але трэба — безгрошоўе змушае. Сёння нарэшце плацяць ганарар.

Чацвер, 4 чэрвеня 1998 году.
Перачытваючы Кузьму Чорнага, бачыш, што беларуская проза на пачатку сваім экспрэсіўнае, зіхатлівае і эфектнае слова шчодра і, як кажуць, па поўніцы чэрпала з народнае гутаркі. Чым больш было прыгадана і ўжыта народных, а прынамсі і дыялектных выразаў, параўнанняў, прымавак і прыказак, тым і больш беларускім, уласна-праўдзівым рабілася апавяданне ці раман.
Цяпер проза вымагае іншых задач: не страціўшы слова з народных гаворак, знайсці не менш экспрэсіўнае сваё. Стылізацыя пад народнасць паніжае ўзровень прозы, як апрашчае яе да прымітыву літаратурна-газетны стыль, асабліва калі ісці ўслед за моваю бел. газет, калькаванаю з расійскай — не дай Божа парушыць інтэграцыю! — ненатуральнаю, немілагучнаю, іншы раз нават з адваротным сэнсам. Гэтак калісьці нашкодзілі нам пераклады Леніна, уладна, па загадзе з непісьменных вярхоў набліжаючы да арыгіналу, усякаючы і нявечачы бел. стылістыку, бел. пабудову слоў і сказаў, яе рытм.
І тым не менш з Чорнаўскіх апавяданняў хочацца выпісаць — усё ж такі цягне сваё, змалку чутае слова — некалькі забытых ужо выразаў:

Два браты — дзве натуры (характары)
Падтуліўшы плечы
Зыначыла ўсё жыццё
Зводдаляк

Цвёрдым крокам
Прыджгаў
Завіхаўся
Дзіўная рэч
Угрунтаваўся
Смутак, жальба
Зяленіва ядлаўцу
Заказваў на сход
Што мае да мяне?
Знаку няма
Ушчэнт разбіў
За чалавека не мелі (не лічылі)
Пляц
Паспрыяць
Як маецца?
Гадоў два таму
Цвеліцца
Абнямог
Вобмаль
Меркнуў дзень. Схмурнеў алешнік
Грэбля чарнела торпам
Звыклым парадкам
Наўпрасты (у Чорнага — напрамік)
Цярэспаля
Літасць
Замінацьме
Гаматны (вялікі) піджак
Як бачыш, насяку
Без жадных разваг
Леташняй зімою
Не зашкодзіць
Нястраўнасць
Дзень перагараць
Тры гады — вялікі час у чалавечым веку
Дубэльты ў вокны
Маладзік і сходныя дні

Панядзелак, 8 чэрвеня 1998 году.
16.45. Папраўдзе, панядзелак цяжкі дзень. У выдавецтве не прачытаны рэдактарам (Шупенька) рукапіс (машынапісны

тэкст) майго зборніка. У магазіне мяне аблічылі на 40 тыс. руб. У тэлефонным апараце забыўся размоўную картку. Са столі ў ванным пакоі цячэ вада. “Куратнік, — смяяўся водаправодчык, зайшоўшы ў кватэру. — Хто зверху, той...” У домакіраўніцтве (ЖЭС) быў непрыёмны дзень.

Словам, на сонцы за дзень добра напёкся, наштурхаўся ў задушлівых тралейбусах, а карысці ніякай.

Балазе памаглі хлопцы, падкінуўшы на беднасць.

Працяг будзе.

Прадмова і публікацыя Ўладзімера Адамчыка.

Валянцін Тарас

З жыцьця ня выкрасьлiць нічога

Непадобны
Босы сьлед на сьнезе
Еўдакія Лось
Коля Лупсякоў
“А лепш за мяне пішыце самі!”
Роза Цьвік

ВАЛЯНЦІН ТАРАС (нар. 1930 у Менску) — пісьменьнік, віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-Цэнтру. Папярэднія часткі ягоных успамінаў друкаваліся ў “Нёмане”. Іх публікацыя была спыненая аўтарам пасьля таго, як часопіс увайшоў у лукашэнкаўскі холдынг “Літаратура і мастацтва”.

Непадобны

Рыгор Бярозкін, літаратурны крытык, тонкі знаўца паэзіі (ня толькі беларускай, але і сусьветнай), быў чалавекам драматычнага лёсу. Яму было дваццаць два, калі ў красавіку 1941 году ён быў арыштаваны органамі НКВД як “беларускі буржуазны нацыяналіст, удзельнік антысавецкай змовы” і пасаджаны ў Чэрвеньскую турму. 22 чэрвеня пачалася вайна, і ў ноч на 26-га, калі немцы падыходзілі ўжо да Чэрвеню, палітзьняволеных Чэрвеньскай турмы вывелі на расстрэл

у найбліжэйшы лес.
Бярозкіну цудам удалося ўратавацца: калі прагрымелі першыя стрэлы, ён упаў і зрабіў выгляд, што мёртвы. Расстрэльная каманда нэрвавалася, сьпяшалася, не правярала, хто мёртвы, хто жывы, і Рыгор адляжаўся сярод трупаў. Затым ён дабраўся да Магілёва, там зьявіўся ў ваенкамат, сказаў, што ўцёк з захопленага немцамі Менску, што дакумэнтаў у яго няма, таму што дом яго разбамбілі і ўсе дакумэнты загінулі ў агні: “Прашу накіраваць мяне на фронт”.
Ён праваяваў чатыры гады пад сваім уласным імем і прозьвішчам, удзельнічаў у абароне Масквы, у Сталінградзкай бітве, некалькі разоў быў паранены, узнагароджаны баявымі ордэнамі, атрымаў афіцэрскае званьне і закончыў вайну ў Бэрліне, дзе стаў працаваць у адной з газэтаў савецкіх акупацыйных войскаў. А ў ліпені 1949 году яго зноў арыштавалі, дадаўшы да папярэдняга абвінавачаньня яшчэ адзін злачынны ўчынак: уцёк зь месца зьняволеньня!

Дапытваў яго той самы сьледчы, які вёў яго справу да вайны, і сьледчы гэты адразу ж сказаў яму, што “сваім неабдуманым учынкам” ён, Бярозкін, вельмі моцна ўскладніў сваё становішча. Бярозкін ня мог сказаць сьледчаму, што ўцёк з-пад расстрэлу, што “абдумваць” не было калі, — сьледчы тут жа прышыў бы яму “злосны паклёп на нашыя органы, якія нікога і ніколі не расстрэльваюць бяз суду”! Ён толькі спытаў, як можна назваць уцёкамі тое, што зь ім адбылося? Дый куды ён уцёк! Не да немцаў жа, а на фронт! “На фронт, на фронт! — перадражніў яго сьледчы. — Чаму ж ты, сука, не загінуў на фронце? Загінуў бы — і герой! Няма чалавека — няма справы. Сьпісана ў архіў. А ты аб’явіўся. І цяпер справу трэба даводзіць да канца. Сам вінаваты. І чхаць мне на тое, што ты ўцёк на фронт. Куды ты, яўрэй, мог яшчэ ўцячы ад немцаў? Але галоўнае тое, што ўцёк. Ад органаў уцёк, ад савецкага правасудзьдзя!” Арыштаванаму ў адказ на гэтую тыраду даводзілася маўчаць. Змоўк на нейкі час і сьледчы. Думаў. А потым раптам усхапіўся: “Вось ты пісьменьнік, так? Разумны, так? А ведаеш, што Максім Горкі пра чалавека сказаў? Ведаеш, не? Ну, што ён сказаў?” Бярозкін адказаў: “Гэта агульнавядома. Горкі сказаў, што чалавек — гэта гучыць горда...” — “Не! — радасна ўскрыкнуў сьледчы. — Горкі сказаў, што калі чалавек

не здаецца — яго зьнішчаюць!” — “Горкі сказаў, калі **вораг** не здаецца…” — паспрабаваў удакладніць цытату Бярозкін, але сьледчы закрычаў: “Хера! Чалавек, які сюды трапіў, і ёсьць вораг! Так што каліся, сука!”
Цытату з Горкага ў інтэрпрэтацыі гэбісцкага гаркаведа Бярозкіну давялося абдумваць амаль восем гадоў — у адным зь лягераў, разьмешчаных далёка на поўначы. Толькі ў 1956 годзе ён выйшаў на свабоду з даведкай аб поўнай рэабілітацыі. Вярнуўся ў літаратуру, стаў працаваць у рэдакцыі “Нёману”, загадваў двума аддзеламі — паэзіі і крытыкі. У “Нёмане” мы зь ім і пазнаёміліся, сталі блізкімі сябрамі. Гэтую гісторыю з цытатай з Горкага я пераказаў зь яго слоў, хоць ён расказваў яе з гумарам, сьмешна паказваючы свайго сьледчага, яго жлобскую, прыблатнёную мову, перадаючы, як сьледчы задумваўся: калупаўся ў носе і выцягваў з ноздраў “козьлікаў”, зь вялікай цікавасьцю разглядаў іх, як праявіў “гуманнасьць”: “Ведаеш, Бярозкін, я не хачу цябе біць, сіл няма, падла, учора перабраў, зразумеў, так? А біць трэба, зь мяне ж запытаюцца, скажуць, што я, хлюпік, ворага шкадую. Я дзьверы крыху прыадчыню, а ты крычы, зразумеў, так? Крычы, сука, мацней крычы!” (Сьледчы выконваў вядомую дырэктыву Сталіна і Жданава аб неабходнасьці ўжываць мэтады моцнага ўзьдзеяньня пры допытах арыштаваных ворагаў народу, калі арыштаваныя ня хочуць супрацоўнічаць з органамі і добраахвотна даваць паказаньні. Абгрунтоўвалася дырэктыва тым, што, маўляў, у краінах капіталу ў адносінах да камуністаў ужываюцца самыя садысцкія катаваньні: вока за вока, зуб за зуб!.. І хоць гэтая дырэктыва была разасланая органамі НКВД у 1937 годзе, яна дзейнічала і ў сорак першым, і ў сорак дзявятым, і ў наступныя гады — да самага ХХ зьезду КПСС.)

Прыкладна ў 1958 годзе Бярозкін даведаўся, што былы сьледчы звольнены з органаў і працуе недзе на дрывяным складзе падлікоўцам. І вырашыў зь ім сустрэцца.
— Што ён вам сказаў, Рыгору Салямонавічу? Як паводзіў сябе?
— А вельмі проста! Скардзіўся на жыцьцё, што жонка яго кінула, што зарплата фіговая. І, ведаеш, не апраўдваўся. Маўляў, час быў такі, а я чалавек маленькі. Што загадвалі, тое і рабіў. Кажа, ты не зь мяне пытайся, а з тых, хто цябе пасадзіў, хто на цябе “телегу” пісаў.

— Сказаў хто?
— Сказаў. Хоць я даўно і безь яго ведаў.
— Хто?
…З адным з аўтараў “телеги”, на якой Бярозкін паехаў у ГУЛАГ, мы сядзелі за адным сталом у рэстаране “Беларусь” — у тым старым, пры старой гасьцініцы “Беларусь”, якая цяпер называецца “Сьвіслач”, — Грыша, я, Навум Кісьлік, Федзя Яфімаў. “Тележный мастер”, маленькі, тоўсты, зь мітусьлівымі, спалоханымі вачыма, нас частаваў. Гэта былі дні XXII зьезду КПСС, з Маўзалею вынесьлі цела Сталіна, ляцелі з сваіх пастоў высокія партыйныя і гэбэшныя чыны — здавалася, настае расплата за трыццаць сёмы, за ледзь не прайграную вайну з Гітлерам, за “справу дактароў”. За ўсё. І “тележный мастер” нэрваваўся, крахтаў, соп, а Грыша, пацягваючы з кілішка каньяк, глядзеў зь нейкай пакутлівай цікавасьцю на таго, хто пацеў, раз за разам аблізваў перасохлыя вусны, — пузаценькага “тележника” — і пытаўся:
— Айзік, скажы мне ўсё ж, чаму ты гэткае гаўно? Я мог цябе пасадзіць, але не пасадзіў. Ты мог мяне не пасадзіць, але пасадзіў. Чаму, Айзік?
Айзік узмахваў кароткімі, пульхнымі ручкамі.
— Ай! Перастань! Дзяўчынка, дайце нам яшчэ бутэльку каньяку!
Дзіўна, што Бярозкін часта кантактаваў з гэтым чалавекам, мог гадзінамі спрачацца зь ім пра літаратуру і заўсёды, калі гаворка заходзіла пра Айзіка, казаў: “Ведаеце, хлопцы, мне яго шкада. Ён разумны, усё разумее, начытаны фэнамэнальна. Хоць, канечне, ён і гаўно. Таму што палахлівец. І ведае сам, што палахлівец, таму цынічны і нахабны, як усе палахліўцы. Але размаўляць зь ім цікава”.

Ён быў надзіва цярплівы да людзей, нават калі яго закраналі за жывое, наўмысна, з подлым разьлікам ці, здаралася, проста па эмацыянальным невуцтве, па ўбостве абывацельскага розуму, што быў засьмечаны наборам сьвінцовых стэрэатыпаў.
У чэрвені 1967 году, калі на Блізкім Усходзе толькі што скончылася “шасьцідзённая вайна”, у выніку якой Ізраіль атрымаў перамогу над арабскімі краінамі, газэта “Правда”, якая напярэдадні вайны пісала, што “дарэмна нехта імкнецца запалохаць арабаў ваеннаю перавагай Ізраілю, таму што ніякай

ізраільскай перавагі даўно няма”, цяпер змрочна пыталася ў перадавым артыкуле: “Чым растлумачыць гэткае цяжкае паражэньне арабаў?” І сама ж адказвала: “Перш за ўсё, вялізнай ваеннай перавагай Ізраілю над яго арабскімі суседзямі. Ізраіль, узброены да зубоў ЗША, Англіяй і Францыяй...” Ну, і гэтак далей. Як быццам Эгіпэт і яго саюзьнікі былі ўзброены Савецкім Саюзам не да зубоў, а толькі да кліноў…

Ашаламляльны вынік “шасьцідзённай вайны” абмяркоўваўся тады ў кожным доме, у кожным, як прынята ў нас казаць, працоўным калектыве. Гаварылі аб гэтым і ў “Нёмане”. Рыгор Салямонавіч зьвярнуў увагу на пазыцыю “Правды”, на два яе процілеглыя перадавыя артыкулы:

— Дык была ваенная перавага Ізраілю ці яе не было? Магчыма, справа не ў ваеннай перавазе, а ў салдатах? Відавочна, ізраільскія салдаты лепш за арабаў ведаюць, за што ваююць? Да таго ж, ім няма куды адступаць: за іх сьпінай мора, і яны ня могуць дазволіць, каб Ізраіль скінулі ў мора, аб чым марыць Насэр. Акрамя таго, яны памятаюць, што сказаў Насэр пра Айхмана: “Айхмана судзяць не таму, што ён зьнішчыў шэсьць мільёнаў яўрэяў, а таму, што ня зьнішчыў усіх”.

І тут тэхрэд “Нёману”, маленькая, сухенькая, нейкая чарнатварая, як арабка, палкая нафарбаваная брунэтка (Бярозкін называў яе “Беласьнежка”), усклікнула:

— Рыгор Салямонавіч! Яны ж ня самі ваююць! За іх жа немцы ваююць! Так, так, Рыгор Салямонавіч, яны нанялі немцаў! Ну, а немцы ваяваць умеюць, мы гэта выпрабавалі на ўласнай скуры!

— Вы дакладна ведаеце, што за іх ваююць немцы? — з сваёй заўсёды крыху мэлянхалічнай іроніяй спытаўся Бярозкін. — Гэта абсалютна дакладныя зьвесткі? Адкуль яны ў вас?

— Гэтага я вам сказаць не магу, — з асаблівым значэньнем падціснула вусны Беласьнежка, — але гэта абсалютна дакладна! Я асабіста не сумняюся. Вы ж ведаеце, я франтавічка, і за ўсе чатыры гады я ня бачыла на фронце ніводнага яўрэя! Вы бачылі?

— Уявіце сабе, бачыў, — усьміхнуўся Бярозкін. — У люстэрку, калі галіўся.

Але Беласьнежка ніколькі не зьбянтэжылася.

— Ну які ж вы яўрэй? Вы зусім не падобны да яўрэя.
— Ну што ж, — зноў усміхнуўся Рыгор Саламонавіч, — відаць, у Ізраілі аказалася цэлая армія такіх непадобных. Ці падобных да мяне. Тут ужо глядзіце, як вам лепш.
Яна, перасмыкнуўшы худымі плечыкамі, выйшла. І толькі калі яна выйшла, Бярозкіна ўзарвала. Ён ускочыў, нэрвова закурыў папяросу (ён курыў “Беламор”, казаў: “Зэк павінен курыць “Беламор” — ён яго будаваў, ну, а калі не яго, дык які-небудзь іншы канал шчасьлівага жыцьця!”), захадзіў па пакоі.
— Ня могуць разьвітацца з сваёй любімай цацкай — мітам пра яўрэйскую баязьлівасьць. Малюсенькі Ізраіль, гэты шмэндрык Давід, надаваў па карку Галіяфу? Гэтага ня можа быць, бо ўсе яўрэі баязьліўцы! А калі перад вачыма жывы яўрэй, які ваяваў, і ваяваў някепска, яму аказваюць вялікую літасьць: выключаюць яго зь яўрэйскага племені! “Ну, які ж вы яўрэй? Вы зусім непадобны”. І не растлумачыш жа, што гэта не камплімэнт, а гнюснасьць. Не падобны? Да каго? Да самога сябе? Але я падобны!
Расьціснуў папяросу ў папяльнічцы і раптам засьмяяўся:
— Зрэшты, я ж беларускі буржуазны нацыяналіст!
Вось адзін зь яркіх успамінаў пра яго — жыцьцёвы эпізод, які, па-мойму, многае гаворыць пра яго як пра чалавека.
Мы, кампанія сяброў, сядзелі ў яго дома, на кухні: ён запрасіў нас выпіць па кілішку. Сядзім, размаўляем, а яго жонка, Юлія Міхайлаўна, накрывае на стол. Вельмі марудна, задумліва. І час ад часу прыадчыняе лядоўню, менавіта прыадчыняе, прасоўвае руку ў шчыліну і выцягвае то сыр, то каўбасу, то шматок сала. Выцягне, адкроіць некалькі кавалачкаў таго, другога, трэцяга, і зноў — у шчыліну — засоўвае ў лядоўню. І ўвесь час уздыхае, думаючы пра нешта сваё, патаемнае, і на твары яе напісана, што мы перашкаджаем ёй думаць, адарвалі ад важных, глыбокіх думак сваім прыходам і паўлітроўкай у кішэні. Але што зробіш?
І раптам Рыгор Салямонавіч, адкінуўшыся на спінку крэсла, вельмі спакойна, толькі зь нейкім дзіўным прыжмурам, пытаецца:
— Юля, ты ведаеш, чаго табе ўсё жыцьцё не стае?
Юлія Міхайлаўна зьдзіўлена глядзіць на яго:
— Ня ведаю... А ты ведаеш?
— Я ведаю, — кажа Бярозкін і ўстае з крэсла. — Табе не хапае

жэсту! Лядоўні так не адчыняюць! — Ён падыходзіць да лядоўні. — Лядоўню адчыняюць вось так! — Ён насьцеж расхаляпвае дзьверцы. — Прадукты зь яе не выцягваюць, як медзякі з скарбонкі, — іх дастаюць і кладуць на стол! — Ён кладзе на стол кавалак сыру і сала, колца каўбасы. — І наразаюць іх вось так. — Ён бярэ нож і хутка, умела, прыгожа наразае сыр, сала і каўбасу вялікімі, але ня тоўстымі, порцыямі. — Ты зразумела, Юля? І не сярдуй на мяне, тут усе свае. Як сям'я...

Ён садзіцца, акідвае позіркам стол і, разбураючы некаторую няёмкасьць, якую адчуў кожны з нас, калі ён вучыў Юлію Міхайлаўну "жэсту", бярэ ў рукі бутэльку "Столичной", разглядвае яе і гаворыць з камічнай панікай у голасе:
— Мала гарэлкі, хлопцы!
Гэта было яго любімае выслоўе — кожны раз, калі надаралася садзіцца зь сябрамі за стол, колькі б бутэлек на ім ні стаяла. О не, ён ня быў п'яніцам, любіў пачаставаць, любіў, каб за сталом былі самыя розныя людзі — для спрэчак, для спаборніцтва ў дасьціпнасьці. І ў шчодрасьці. Яму падабалася крыху абыякава кідаць на стол свае купюры.
Аднойчы ён сказаў мне:
— Ведаеш, чытаючы вершы, дый прозу, я магу вызначыць, жмінда пісьменьнік у жыцьці ці ня жмінда. У жміндаў шмат марнаслоўя ці скрупулёзных падрабязнасьцяў, а разам з тым нейкай сьціснутасьці, скрытнасьці ў самой форме, у радку, у інтанацыі.
Думаю, тут ён ня меў рацыі. Гюго, напрыклад, быў скупы, а колькі шчодрых натур у ягоных раманах, дый іншыя прыклады можна прывесьці, а вось у кнігах самога Бярозкіна, і праўда, поўная адпаведнасьць натуры, характару і пісьма: шчодрасьць душы, шчырасьць, натуральнасьць. Прачытайце хоць бы "Постаці"!
Жыцьцё да канца было да яго жорсткім і несправядлівым. І як! Ён памёр за два гады да сваёй фізычнай сьмерці — як чалавек. Страшны інсульт напаткаў яго пасьля таго, як у 1980 годзе ён выйшаў па пэнсію. Гэта быў не параліч — страшней і горш. Інсульт поўнасьцю знішчыў яго сьвядомасьць, адабраў ня толькі памяць і мову, але і розум наагул.
На другі ці на трэці дзень пасьля інсульту ў Грышы мы

з Алесем Адамовічам прыйшлі да яго ў бальніцу. Яшчэ заставаліся праблескі свядомасьці, ён пазнаў мяне і Алеся, зь цяжкасьцю вымавіў: “Са-ша... Ва-ля...” А калі я наведаў яго ўжо ня ў гэтай бальніцы, а ў Навінках, у спэцыяльным аддзяленьні, — гэта ўжо быў ня Грыша. Бессэнсоўны блукаючы позірк, глухое мычаньне, нейкі страшны, мокры клёкат у горле... Але лекары сказалі мне, што калі-нікалі, вельмі рэдка, сьвядомасьць вяртаецца да яго і тады ў ягоных вачах зьяўляецца жах. Жах і нянавісьць. Працягваецца гэта хвіліну, дзьве...

Калі лекары сказалі, што ў хвіліны прасьвятленьня ў ягоных вачах зьяўляецца нянавісьць, я падумаў, што, відаць, яму здаецца ў гэтыя мінуты, што ён зноў у турме, у камэры: у спэцпалатах у Навінках на вокнах краты...

Ён памёр 1 сьнежня 1981 году, па сутнасьці, памёр ня ён, а яго цела.

У гадавіну яго сьмерці мы — я, Кісьлік, Федзя Яфімаў і Аляксандар Дракахруст — далі адзін аднаму слова, што будзем прыходзіць да яго на магілу кожнага першага сьнежня. Усе разам. Пакуль мы разам. Пакуль яшчэ разам. А калі каго-небудзь ня стане, будуць прыходзіць тыя, хто застаўся. Пакуль жывыя...

Ён бы вельмі зьдзівіўся і, відаць, засьмяяўся б, даведаўшыся, што пахаваны сярод памерлай партыйнай эліты, сярод магіл адказных таварышаў з ЦК, генэралаў, міністраў, начальнікаў глаўкаў і іншых важных пэрсон (Юлія Міхайлаўна дабілася, каб яго пахавалі ў гэтым партыйным арэапагу на Маскоўскіх могілках).

Над яго магілай стаіць бюст работы Заіра Азгура. Галава рымляніна, крыху схіленая ў смутку, антычная ў сваёй высакароднасьці і нейкай самотлівай вытанчанасьці...

З кожным годам яго мармуровае аблічча становіцца ўсё больш сумным. І я ня думаю, што гэта толькі здаецца. Паміж часам, які выпаў на яго долю, і цяперашнім часам — бясконцасьць... Але мы, прыходзячы на магілу і выпіваючы побач зь ім памінальную чарку, кожны раз намагаемся вярнуць яго да сябе ягоным жа жартам: “Мала гарэлкі, хлопцы!”

І вельмі шмат журбы...

Босы сьлед на сьнезе

[зьмест]

Распавядаючы пра мінулае, даючы ацэнку даўнім падзеям, учынкам людзей пэўнага гістарычнага часу, нельга забывацца пра небясьпеку абэрацыі памяці, калі ненаўмысна, незаўважна для сябе самога пачынаеш ацэньваць гэтыя падзеі, тлумачыць чалавечыя ўчынкі, зыходзячы зь сёньняшніх сваіх пазыцыяў, зь сёньняшняга свайго разуменьня таго, што адбывалася некалі. Па-расійску ў такіх выпадках кажуць: “Задним умом крепок” (па часе розум мае). Я гэтага баюся і не хацеў бы выстаўляць сябе больш разумным, чым быў дваццаць, сорак, шэсьцьдзесят гадоў таму. Да прыкладу, распавядаючы пра вайну, я павінен памятаць, што, хоць я быў ня толькі ейным сьведкам, але і ўдзельнікам, я ня быў тады дарослым чалавекам, а быў падлеткам, таму ні ў якім разе ня мог думаць пра тое, што бачыў, так, як думаю сёньня.

Я пайшоў у партызаны ў 1943 годзе, трынаццацігадовым хлапчуком, з глыбока патрыятычных памкненьняў. І гэта быў савецкі патрыятызм. Я любіў ня проста Бацькаўшчыну, а савецкую Бацькаўшчыну, быў нашпігаваны кнігамі Аркадзя Гайдара — дарэчы, вельмі таленавітага савецкага дзіцячага пісьменьніка, які апяваў рамантыку Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, — захапляўся “Дрыгвой” Якуба Коласа, “Міколкам-паравозам” Міхася Лынькова, трызьніў кінафільмамі пра тую ж грамадзянскую вайну, такімі, як “Чапаеў”, “Дарыко”, “Хведзька” (пра хлапчука-будзёнаўца), “11 ліпеня” (пра вызваленьне Менску ад белапалякаў у 1920 годзе), “Калі заўтра вайна”. Выхаваны ледзь не зь пялюх усім гэтым савецкім рамантызмам, а ў дадатак яшчэ і савецкай школай, я як ваўчаня гатовы быў перагрызьці горла кожнаму, хто хоць слова скажа супраць савецкай улады. Хлапчук-партызан з майго апавяданьня “Выпадковы стрэл”, адданы савецкі патрыёт, які бабахнуў з карабіну ў свайго ж партызана, вясковага дзецюка-заходніка, і ледзь не забіў яго толькі за тое, што хлапец мацюком аблаяў калгасы, — пэрсанаж не прыдуманы... І ўсё ж менавіта ў партызанскім лесе пакрысе пачаў разбурацца падмурак майго савецкага выхаваньня. Спачатку гэта было наіўнае неразуменьне таго, чаму партызаны, людзі, якія пайшлі ў лес па сваёй волі, не па позьве з ваенкамату, бо якія ж ваенкаматы на акупаванай немцамі тэрыторыі, — чаму гэтыя людзі так баяцца асобага аддзелу? Лепш трапіць у рукі немцаў, чым выклікаць увагу да сябе з

боку асабістаў. Я неадноечы бачыў, як палохаецца чалавек, калі яго раптам выклікаюць у асобы аддзел: белы становіцца, што палатно. Неўзабаве я паспытаў гэта на сабе. Хоць тое было хутчэй сьмешным, чым страшным. Ну вядома, сьмешным яно выглядае цяпер, з адлегласьці шасьці дзесяцігодзьдзяў, а тады...

...1943 год. Зіма. Лягер партызанскага атраду "За Савецкую Радзіму" ў Налібоцкай пушчы. У зямлянцы ўзводу, у якім я самы маладзенькі баец, ня сьпяць, хоць даўно прагучэла каманда "адбой". А паколькі ў нас няма ні радыё, ні газэтаў, ні кніжак — а калі б і былі, усё адно перад сном не пачытаеш, бо зямлянка асьвятляецца недагарачкам сьвечкі, пры якой нават твараў не разгледзіш, — хлопцы бавяць час у размовах: распавядаюць розныя байкі, анэкдоты, жыцьцёвыя гісторыі. Уношу сваю лепту і я, хоць ніякіх жыцьцёвых гісторыяў у мяне ў запасе няма. Хлапчанё. Але ў мяне ёсьць дар імітацыі — я ўмею падрабляць чужыя галасы, інтанацыю, асаблівасьці гаворкі. На гэты раз вырашаю пазабаўляць хлопцаў імітацыяй нямецкай мовы, якой ня ведаю (дарэчы, па сёньняшні дзень). Цяпер, праз шэсьцьдзесят гадоў, мне цяжка ўспомніць тую абракадабру, якую я тады агучыў, таму прыкладна: "Ахтунг! Ахтунг! Дас вэттэр унд хандэн, унзэр віль босэн, фэрфлюктэр штабэн гір люфтэ, гай нэр зыбен шысэн дзі волен шахер-махер волен махэн дэр бляйтэ!" Такі прыблізна быў набор словаў у маёй "нямецкай" прамове. Жаднага сэнсу ў ёй не было, гукаперайчмальная лухта. Хлопцы парагаталі, пазьдзіўляліся, як гэта ў мяне ўдаецца, — сапраўды, нібы немец гергеча. І захраплі. А на наступны дзень мяне выклікалі ў асобы аддзел! І начальнік асобага аддзелу Вяцёлкін, загадаўшы мне сесьці перад ягоным сталом на высокі зэдлік, злавесна-ціха спытаў: "Чаму ты, калі цябе прымалі ў атрад, не сказаў, што ведаеш нямецкую мову?" Я вылупіў вочы: "Нямецкую мову?! Я ня ведаю ніякай нямецкай мовы!.." — "Як гэта ня ведаеш? — Вяцёлкін прасьвідраваў мяне пранізьлівым позіркам. — А хто ўчора ў вашай зямлянцы без запінкі па-нямецку шпарыў? Ня ты?" Зь перапуду я не адразу ўцяміў, што да чаго, а здагадаўшыся, пачаў шпарка, глытаючы словы і заікаючыся, тлумачыць, што гэта была за нямецкая мова. Вяцёлкін слухаў з каменным тварам, а калі я скончыў, загадаў, каб я паўтарыў

яму сваю ўчорашнюю імітацыю. Я сяк-так паўтарыў, ня цалкам, бо ад страху тая мая абракадабра на момант вылецела ў мяне з галавы. Вяцёлкін з хвіліну глядзеў на мяне моўчкі, твар у яго быў па-ранейшаму каменны, вочы бязьлітасныя. Нарэшце, пабарабаніўшы пальцамі па стале, сказаў суха: “Добра, можаш ісьці”. Я ўскочыў з зэдліка, выцягнуўся па стойцы “сьмірна”, павярнуўся церазь левае плячо кругом, падаўся да дзьвярэй. І тут ён у сьпіну мне нягучна, але выразна прамовіў нейкую нямецкую фразу. Я, вядома, не зразумеў, але інстынктыўна азірнуўся на голас. І зноў кінула ў жар і ў холад ад вяцёлкінскага бязьлітаснага позірку. Ён глядзеў не міргаючы, як яшчарка. І раптам скупа ўсьміхнуўся: “Не зразумеў?” — “Не зразумеў, таварыш начальнік асобага аддзелу!” — “Ну, калі не зразумеў, тваё шчасьце”. І ён зноў усьміхнуўся, ужо больш прыязна: “Ідзі!”

Сапраўды, маё шчасьце, што Вяцёлкін збольшага ведаў нямецкую мову. Але перадусім маё шчасьце ў тым, што ён мне паверыў. Бо мог і не паверыць, мог вырашыць, што напярэдадні, мінулым вечарам, я страціў пільнасьць і выдаў сябе, а цяпер выкручваюся, цяпер прыдумляю нейкую абракадабру, каб выратавацца. Мог вырашыць, што я ня той, за каго сябе выдаю: можа, я зь беларускіх немцаў, фолькс-дойч, і засланы ў атрад гестапаўцамі. (Дарэчы, ня трэба думаць, што такіх выпадкаў не было, — немцы засылалі да партызанаў сваю агентуру, у тым ліку і падлеткаў.) Нічога неверагоднага ў гэтым маім дапушчэньні няма — Вяцёлкін мог спыніцца на сьмяртэльнай для мяне вэрсіі... Ну, а адкуль ён даведаўся пра маё веданьне нямецкай мовы — зразумела: нехта “стукнуў”. “Набзьдзеў”, як сказаў Мікола Аксючыц, сталы ўжо мужчына з нашага ўзводу, адзін з тых, хто мяне апякаў як малечу. Калі я расказаў яму, зь якой нагоды мяне выклікалі ў асобы аддзел, і наіўна спытаў, адкуль Вяцёлкіну стала вядома пра маю “нямецкую” прамову, Аксючыц засьмяяўся: “Яшчэ Кузьма Пруткоў заклікаў: “Бзьдзі!” Вось нехта з нашых ціхенькіх хлопчыкаў — а колькі іх у кожным узводзе, ніхто ня ведае — на цябе і набзьдзеў. *Проявил бздительность!..*” (Я тады ня ведаў, што Кузьма Пруткоў — гэта сатырычны літаратурны пэрсанаж з расійскай клясыкі XIX стагодзьдзя, які пастаянна паўтараў: “Бди!” — ператворанае Аксючыцам, чалавекам начытаным

і вострым на язык, у “Бзьдзі!”. З тае пары, зь лёгкай рукі Колі Аксючыца, заву стукачоў *бздунамі*.)
...Але было і сапраўды страшнае!..
Напрыканцы 1943 году расстралялі разьведчыцу нашага атраду Алену Станкевіч. Расстралялі як здрадніцу, як агентку СД, хоць увесь атрад ведаў, што гэта хлусьня, што гэта асабісты зьвялі зь ёю свае рахункі. Дакладней, адзін зь іх, з асобага аддзелу брыгады, у якую ўваходзіў наш атрад. Хлопцы расказвалі, што некалі Алена дала таму асабісту адлуп, адмовілася зь ім спаць, а калі ён палез да яе гвалтам, жарнула рукаяткай пісталета па галаве. Амаль год ён шукаў прычыну, каб адпомсьціць дзяўчыне, і нарэшце знайшоў.
Недзе ў лістападзе 43-га Алена разам зь яшчэ адной нашай партызанкай, Лідай Кізілай, пайшла на нейкае заданьне ў Менск, і там, на Камароўскім базары, дзяўчаты трапілі ў паліцэйскую аблаву. Паліцаі не лавілі нікога канкрэтна, а затрымлівалі ўсіх, хто здаваўся ім падазроным. Дзяўчат адвезьлі ў турму на вуліцы Валадарскага, адкуль празь некалькі дзён прывялі ў паліцэйскі пастарунак на Лагойскім тракце, як тады называлася цяперашняя вуліца Якуба Коласа. (Будынак пастарунку — цяпер гэта жылы дом — і сёньня стаіць на вуліцы Коласа насупраць трамвайнага прыпынку “Дарашэвіча”.) Але аказалася, дзяўчат прывялі не на допыт, а для таго, каб яны памылі ў пастарунку падлогу і наагул прыбралі — паліцаям спатрэбілася дармовая рабсіла. Пачалі дзяўчаты ўборку ў адным з пакояў на першым паверсе, прычым ніхто іх не ахоўваў — пакінулі адных у тым пакоі зь вядром вады, анучамі і швабрамі. Дзяўчаты спакойна адчынілі акно, скочылі ў задні дворык, адтуль кінуліся ў суседні і ўцяклі! Праз колькі дзён яны вярнуліся ў атрад, шчасьлівыя, узрушаныя, самі ня верылі свайму шчасьцю: як гэта паліцаі іх праміргалі? Неверагодна!

І раптам Алену Станкевіч арыштаваў асобы аддзел брыгады. Яе адну, Ліду Кізілу толькі дапрасілі. Што дакладна інкрымінавалі Алене, ніхто ня ведаў, і я магу спаслацца адно на чуткі, якія хадзілі ў атрадзе зь зямлянкі ў зямлянку. Шэптам. Казалі, што менавіта на ўцёках дзяўчат і сыгралі асабісты, маўляў, занадта проста ўсё выйшла з тымі ўцёкамі. Як у кіно. Казалі, што той асабіст, якому Станкевіч некалі дала адлуп, абвінаваціў яе, што

яна даўно ўжо завэрбаваная СД, што паліцэйская аблава, у якую яна трапіла разам зь Лідай Кізілай, была інсцэніроўкай, што ў турме на Валадарскага, калі яе выклікалі з камэры нібыта на допыт, яна ў кабінэце начальніка турмы перадала сваім шэфам з СД зьвесткі пра дысьлякацыю нашай брыгады. Што да ўцёкаў, то і гэта было працягам інсцэніроўкі: паліцаям, маўляў, загадалі даць дзяўчатам уцячы. Абедзьвюм таму, што гэта адводзіла падазрэньні ад Станкевіч. Кізіла тут ні пры чым. Яна не магла ведаць, што ўратавалася толькі таму, што ёю СД прыкрыла свайго агента. І хоць у гэта ніхто з партызанаў, якія добра ведалі Алену, ня верыў, сама па сабе вэрсія асабістаў выглядала праўдападобна. Думаю, што яны самі й пусьцілі тыя чуткі, арганізавалі “ўцечку інфармацыі” — нехта паверыць!.. Ва ўсякім разе, засумняецца...

Праз чатырнаццаць гадоў, у 1957-м, сям’я Алены і былыя разьведчыкі нашай брыгады дамагліся перагляду яе справы. І яна была цалкам рэабілітаваная пасьмяротна. Усе абвінавачаньні аказаліся фантазіяй асабістаў.

У мяне ёсьць фатаздымак Алены, яго дала мне Ліда Кізіла, вядома, не тады, у лесе, а праз шмат гадоў пасьля вайны. Недзе ў 60-м годзе я задумаў напісаць апавяданьне, сюжэт якога будаваўся на тым, што здарылася з Аленай, расказаў пра сваю задуму Лідзе, і яна падаравала мне той здымак: “Для натхненьня!” Апавяданьне (яно называецца “Ні хвіліны раскаяньня”) было надрукаванае ў часопісе “Нёман”, потым уваходзіла ў мае кнігі прозы. Але сёньня мне ня дужа прыемна яго перачытваць. Таму што яго разьвязка, на мой сорам, штучная, прыцягнутая за вушы. У мяне мая гераіня застаецца жыць: справядлівы камісар атраду, “сапраўдны камуніст”, вызваляе дзяўчыну з лапаў нягодніка-асабіста... Можна было б сказаць, што я пайшоў на такі паварот сюжэту пад ціскам цэнзуры, галоўліта, як яна называлася ў савецкі час, каб аптымістычнай канцоўкай выратаваць асноўны тэкст апавяданьня. Але не хачу хлусіць, ніхто на мяне ня ціснуў — цэнзар сядзеў ува мне самім. Дакладней, я ў многім яшчэ заставаўся ў палоне савецкага мысьленьня, а савецкасьць — незвычайны фэномэн! Ведаеш страшэнныя факты злачынстваў “роднай улады”, але аддзяляеш іх ад прыроды гэтае ўлады, ад яе першапачатковай сутнасьці, не згаджаешся прызнаць, што злачынная сама ўлада, і вінаваціш толькі асобных кепскіх

людзей. Гэта, дарэчы, была ня толькі мая ілюзія, але і ўсіх тых, каго сёньня называюць “шасьцідзясятнікамі” ХХ стагодзьдзя, што, з жахам адхіснуўшыся ад сталіншчыны, з агідай — ад брэжнеўскага “рэальнага сацыялізму”, верылі ў “сацыялізм з чалавечым тварам”. Хоць ён існаваў адно ў галовах саміх шасьцідзясятнікаў, гэтых апошніх савецкіх ідэалістаў-рамантыкаў. Быў іхняй марай. Данінай ёй і было сканструяванае мною выратаваньне маёй гераіні. Усё так! Але дзевятнаццацігадовая дзяўчына з тонкім прыгожым тварам глядзіць на мяне з фатакарткі з смуткам і маўклівым дакорам... І зноўку ўглядаюся ў далёкі партызанскі лес.

...Адноечы мяне накіравалі ў штаб брыгады сувязным. (Тэлефоннай сувязі паміж тым штабам і атрадамі не было, і тэрміновыя распараджэньні ці паведамленьні перадаваліся ў зашыфраваных пісульках праз сувязных.) І там, у лягеры штабу брыгады, я пачуў такое, пра што ў Савецкім Саюзе загаварылі ўголас толькі ў 1956 годзе.
Сям’я аднаго з брыгадных асабістаў (прозьвішча ягонага ня памятаю) жыла ці то ў Берасьці, ці то ў Баранавічах, і нехта данёс на яе немцам, даказаў, што гэта сям’я энкавэдыста. І ўсю сям’ю немцы павесілі... Даведаўшыся пра гэта, асабіст з гора напіўся і хадзіў па ўсіх брыгадных зямлянках, плакаў, пытаўся ў кожнага, хто яму сустракаўся, біў сябе кулаком у грудзі: “Ты когда-нибудь видел, чтобы чекист плакал? Я никогда не плакал! Я стрелял людям в затылок — и не плакал!
Я заталкивал людей в душегубки — и не плакал! А сегодня я плачу! Мою семью убили! Мать, жену, деток!.. Гады! Звери!..”
Вядома, гора гэтага чалавека было страшным, невыносным, але я, хлапчук, жахнуўся і ягоным словам пра стрэлы ў патыліцу, і пра душагубкі. Што ён вярзе?! Хіба ў нас ёсьць душагубкі? Гэта ў фашыстаў душагубкі! Гэта фашысты страляюць у патыліцу! Разам з мною сьведкам гэтых асабіставых прызнаньняў быў маладзенькі партызан Сьцёпа, які таксама быў зьбянтэжаны тым, што пачуў, і мы зь ім пайшлі ў зямлянку начальніка друкарні Баранавіцкага падпольнага абкаму партыі (абкам і ўсе ягоныя службы знаходзіліся ў лягеры штабу брыгады), пачалі распытваць таго начальніка, як гэта можа быць — тое, што казаў асабіст. Начальнік, таксама зьбянтэжаны, разгублены, ня мог нам сказаць, што мы нешта

выдумляем, бо толькі што асабіст пабываў і ў яго з пытаньнем: “Ты когда-нибудь видел, чтобы чекист плакал?” І, хаваючы вочы, начальнік пачаў нам тлумачыць, што ў Камуністычнай партыі было шмат ворагаў, што краіна кішэла шпіёнамі, здраднікамі, шкоднікамі, і напярэдадні вайны з Германіяй ад іх трэба было пазбаўляцца як мага хутчэй і зьнішчаць іх усімі сродкамі. Ачысьціць тыл ад “пятай калёны”...
Як ад ворагаў пазбаўляюцца як мага хутчэй, я неўзабаве ўбачыў на свае вочы.
У 1944 годзе, на пачатку студзеня, альбо напрыканцы сьнежня 43-га, дакладна ня памятаю, наша брыгада раззброіла і нэўтралізавала аддзелы польскай Арміі Краёвай (АК), якія дзейнічалі ў Налібоцкай пушчы. Армія Краёва, як вядома, падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лёндане і прытрымлівалася дырэктывы весьці барацьбу адначасова супраць абодвух “акупантаў” — немцаў і бальшавікоў. Дырэктыва гэтая была прынятая яшчэ ўвосень 1939 году ў адказ на сакрэтнае пагадненьне паміж Сталіным і Гітлерам аб падзеле Польшчы, але пасьля нападу Германіі на Савецкі Саюз дзеяньне дырэктывы было прыпыненае. Да пары да часу атрады АК, створаныя на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ваявалі толькі зь немцамі, нярэдка ў хаўрусе з савецкімі партызанамі. Але на зыходзе 43-га году паміж імі пачаліся сутычкі: польскі ўрад у Лёндане заявіў аб сваіх правох на Заходнюю Беларусь як неад’емную частку Польшчы. Калі на тэрыторыі самой Польшчы ў атрадах АК змагаліся чатырыста тысячаў жаўнераў, то ў беларускіх лясох іх было зусім мала. У Налібоцкай пушчы іх раззброілі на працягу некалькіх дзён. Ды калі б толькі раззброілі!.. Камандзіра налібоцкай акаўскай брыгады і ўвесь ягоны штаб адправілі самалётам у Маскву, а малодшых афіцэраў расстралялі… Некалькі чалавек зь ліку гэтых афіцэраў утрымліваліся пад вартай у лягеры нашага атраду. Я таксама разы два стаяў на варце каля ўваходу ў зямлянку, у якой яны сядзелі, выводзіў па адным “да ветру”, і яны кожнага разу жартавалі: “Цо, хлопаку, бэндзеш пільноваць мое злото?” Гэта і на самай справе было забаўна: дарослы мужчына сядзіць пад сасной на кукішках, а чатырнаццацігадовы падлетак стаіць над ім з карабінам напагатове!

Напэўна, ім і ў галаву не прыходзіла, што іх расстраляюць. Бо

за што? Яны здаліся без супраціўленьня, яны таксама біліся зь немцамі. Не, нічога кепскага зь імі ня здарыцца! Добры знак, што іх ахоўвае хлапчук. Значыць, ня бачаць у іх ворагаў, ведаюць, што яны не зьбіраюцца ўцячы, — хіба цяжка было б вопытнаму жолнежу, дужаму даросламу чалавеку абяззброіць і скруціць гэткага смаркача?..

...Я стаяў на варце каля калодзежу (быў у атраде такі пост, каб хто не атруціў ваду), калі тых афіцэраў вялі на расстрэл. Яны йшлі па вузенькай сьцежцы, пратаптанай у глыбокім сьнезе, у аднаго зь іх была ў руцэ рыдлёўка, і я, халадзеючы ад жаху, зразумеў, навошта яна: ёю выкапаюць у сьнезе яму, а потым закідаюць сьнегам целы... Той, з лапатай, зірнуў на мяне зь нейкай дзіўнай усьмешкаю — так праз шмат гадоў глядзеў на мяне перад сьмерцю бацька. І з зайздрасьцю, што я застаюся жыць, і з радасьцю, што застаюся, што сьвет застаецца...

Была адліга, падаў мокры сьнег, клаўся на плечы і на канфэдэраткі чатырох акаўцаў... Толькі канфэдэраткі і паказвалі на тое, што гэтыя людзі — жолнежы, апранутыя ў даматканыя вясковыя штаны і суконныя курткі, абутыя ў самаробныя катанкі. За акаўцамі йшлі трое ў белых кажухах, у кубанках, з аўтаматамі ППШ, здаравенныя, мардатыя, незнаёмыя мне... Хвілінаў празь дзесяць прасакаталі кароткія аўтаматныя чэргі, абудзілі, як сарокі, нямую цішыню пушчы…

А праз паўгадзіны ўвесь атрад паднялі па трывозе, загадалі: пашыхтавацца ланцугом, прачэсваць лес, шукаць босы сьлед на сьнезе. Нехта заўважыў, што адзін з акаўцаў вылез са сьнежнай магілы. Недастрэлілі!..

“А чаму сьлед босы? — спытаў я ў Міколы Аксючыца. — Яны ж у катанках былі!” — “Разулі, лапушок, — неяк нэрвова-весела сказаў Мікола. — Перад тым як кокнуць!..”

На босы сьлед выйшла якраз наша аддзяленьне, і па гэтым сьледзе мы йшлі, можа, з кілямэтар, пакуль ён не згубіўся ў засьнежаных хмызьняках на беразе Іслачы…

…Калі пасьля вайны на Нюрнбэрскім працэсе над галоўнымі нямецкімі ваеннымі злачынцамі паўстала пытаньне аб Катыні і ўсе падсудныя адхрышчваліся ад катынскага расстрэлу многіх тысячаў польскіх афіцэраў, даказваючы, што гэта злачынства на сумленьні НКВД, я ведаў, што гэта так і ёсьць. Таму што памятаў той босы сьлед на сьнезе.

Нехта скажа (дый кажуць многія!), што ўжо няма сэнсу

вярэдзіць такія старыя раны. Аднак сэнс ёсьць. Таму што, як сказаў мудры паляк Станіслаў Ежы Лец, сьлед многіх злачынстваў мінулага вядзе ў будучыню.
1995, лета

Еўдакія Лось

[зьмест]

...**У** лютым 1959 году аддзел літаратуры і мастацтва “Звязды” застаўся без загадчыка: Аляксандра Шаўня звольнілася, пайшла працаваць у “Настаўніцкую газету”, а прызначанага замест Шаўні Мікалая Матукоўскага зваліў цяжкі інфаркт.
І аддзел звалiўся на мяне. У тым жа лютым загадам па рэдакцыі я быў прызначаны выконваючым абавязкі загадчыка аддзелу. Месяцаў шэсьць працаваў адзін, безь літработніка, і мяне заядала “бягучка”, асабліва незьлічоныя матэрыялы добраахвотных карэспандэнтаў з усіх гарадоў, мястэчак і вёсак Беларусі. Пісаць адказы аўтарам на іх допісы, прычым адказы падрабязныя, было маім абавязкам; за “марынаваньне” чытацкай карэспандэнцыі галоўны рэдактар “Звязды” В.А.Пыжкоў караў сурова. Строга ставіўся да гэтага і адказны сакратар рэдакцыі Нічыпар Пашкевіч. Так што я марыў, каб мне далі літработніка, які зоймецца менавіта “бягучкай”.
І нарэшце мая мара зьдзейсьнілася — у аддзел прыйшоў літработнік. Паэтка Еўдакія Лось.
Нейкі час, вельмі кароткі, паміж намі была згода, хоць за “бягучку” Еўдакія Якаўлеўна ўзялася без усялякай радасьці. Тым ня менш, усё ішло нармальна, без узбрыкваньняў з боку Дусі. Да таго дня, пакуль яна не даведалася, што я — беспартыйны. Даведалася выпадкова: мы сядзелі кожны за сваім сталом, я нешта вычытваў, правіў, Дуся адказвала на пісьмы, як раптам адчыніліся дзьверы і сакратарка Пыжкова абвясьціла: “На партсход, у кабінэт Васіля Андрэевіча!” Дуся хуценька прыбрала паперы ў стол, падфарбавала губы, паправіла валасы, паглядзелася ў люстэрачка і паднялася: “Ну, пайшлі?” А я ёй кажу: “Мяне гэта ня тычыцца, я беспартыйны”. Дуся жахнулася, высока ўскінула бровы: “Вы беспартыйны?” Такім тонам, нібы я прызнаўся ёй у цяжкім злачынстве.
З таго дня Дусю як падмянілі. Прыйдзе раніцай на работу, буркне: “Добры дзень!”, сядзе за стол і доўга сядзіць моўчкі, задумліва глядзіць некуды ў столь, барабаніць па стале пальцамі. Нарэшце, цяжка ўздыхнуўшы, бярэцца за чытаньне

“бягучкі”, але амаль адразу страчвае да яе цікавасьць, зноў глядзіць у столь. Аднойчы, калі я паклаў перад ёю чарговы стос чытацкіх лістоў, успыхнула, пачырванела, надзьмула губы: “Што вы мне ўвесь час падсоўваеце гэтую муць? Гэта ня мой маштаб! Я ўсё-такі паэтка, скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы!” Раззлавана паднялася і пайшла з пакою сваёй грузнаватай хадой. Твар у яе быў прыгожы, з правільнымі рысамі, а вось фігура — нейкая цяжкаватая, да ўсяго яе псавала прыгорбленасьць. Праз колькі хвілінаў я выглянуў у калідор: Дуся прахаджвалася па ім, заклаўшы рукі за сьпіну, як мужчына. У Дусіным абліччы, дарэчы, і было нешта мужчынскае, грубаватае, і голас часам быў мужчынскі, глухаваты. Калі што якое, дык Дуся, як кажуць, не цырымонілася...

Я нейкі час не разумеў, хоць і здагадваўся, якая муха яе ўкусіла. Здагадку маю пацьвердзіла яна сама, без дыпляматыі. Настаў дзень, калі яна, з паўгадзіны пасядзеўшы моўчкі й задумліва гледзячы ў столь, раптам спытала: “Валянцін, вам не здаецца, што гэта няправільна — тое, што загадчык аддзелу — вы? Таму што вы беспартыйны! І нават ня член Саюзу пісьменьнікаў, а я ў Саюзе ўжо чатыры гады!”
Я сапраўды яшчэ ня быў членам Саюзу, мяне прынялі ў 1961-м. Усьміхаюся ў адказ: “Вы хочаце сказаць, Еўдакія Якаўлеўна, што загадваць аддзелам павінны вы, а ня я? Калі ласка! Скажыце пра гэта Пыжкову. Калі ён прызначыць вас на маё месца, я, дальбог, пярэчыць ня буду”. — “А што?! — загарэлася Дуся. — Пагавару з Пыжковым! Вы не крыўдуйце, але гэта ненармальна: чаму я, камуністка, член Саюзу пісьменьнікаў, павінна вам падпарадкоўвацца?!” Сказана гэта было з такой прастадушнай упэўненасьцю і па-дзіцячаму наіўнай шчырасьцю, што я і сапраўды не адчуў ніякай крыўды. Засьмяяўся: “З Богам, Дуся!”
Ня ведаю, што ёй сказаў Пыжкоў, але пасьля размовы зь ім Дуся гэтай балючай для яе тэмы больш не закранала. Аднак і падпарадкоўвацца мне было звыш яе сіл! Яна пачала прыходзіць на работу калі захоча, магла наагул не прыйсьці, а назаўтра не лічыла патрэбным патлумачыць, чаму яе ўчора не было. І па-ранейшаму гадзінамі задумліва глядзела ў столь. Я цярпеў, не рабіў ёй аніякіх заўваг, здагадваючыся, што,

напэўна, яна неўзабаве пойдзе з рэдакцыі — выпатрабуе сабе ў высокіх інстанцыях адпаведнае яе партыйнаму і членсаюзаўскаму рангу месца і пойдзе.
Гэтак мы і суіснавалі яшчэ месяцы два. Дуся, праўда, старалася быць з мною ветлівай, часам пыталася, што яна павінна рабіць. Пытаецца, а ў самой твар — пыхліва-пакрыўджаны, вочы чужыя. Таму я быў дужа зьдзіўлены, калі яна запрасіла мяне да сябе на ўлазіны, — Саюз пісьменьнікаў даў ёй кватэру ў Зялёным Лузе. Вырашыў пайсьці, падумаў, што, магчыма, яна хоча ўлагодзіць нашы адносіны.
Аўтобусы ў першы тады мікрараён Зялёнага Лугу хадзілі рэдка, тралейбуснай лініі яшчэ не было і ў паміне. Не было і вулічных ліхтароў. Увечары цяжка было знайсьці патрэбны табе дом: цемра, толькі асобныя вокны сьвецяцца. Да таго ж да дому няпроста падысьці: усюды траншэі, ямы, горы будаўнічага сьмецьця. А яшчэ надвор'е ў той вечар было жахлівае — ішоў праліўны халодны дождж. Я паблукаў з гадзіну, пакуль знайшоў Дусін дом. Дзьверы мне адчыніла сьвяточна апранутая Дуся: атласная шэра-залацістая сукенка з шырокім дэкальтэ, на шыі матава-белыя шкляныя каралі, у вушах кліпсы, таксама матава-белыя шарыкі, пышная завіўка, на пальцах сьветла-ружовы манікюр. І ўся яна пахла нейкімі дарагімі духамі. Узрадавана, гасьцінна заўсьміхалася і тут жа жахнулася: "Божа, у вас наскрозь мокрыя ногі! У што ж мне вас пераабуць? Мужчыны ж у хаце няма!.." Я ўручыў ёй свой падарунак — невялічкую настольную лямпу, каробку цукерак "Чырвоны мак", бутэльку добрага масандраўскага партвэйну. Прымаючы ўсё гэта, Дуся сарамліва сказала: "Вялікі дзякуй, Валянцін Яфімавіч, але віно навошта? Выпіўкі хапае!.."

Для мяне знайшліся нейкія тапкі, жаночыя, але аказаліся якраз па назе, і мы з Дусяй прайшлі ў пакой, дзе быў накрыты стол пэрсон на пятнаццаць. Каля стала стаяла Дусіна маці, нешта на ім перастаўляла — цёмнавалосая зь ніцямі сівізны, зусім яшчэ не старая жанчына з грубаватым сялянскім тварам, цёмна-карычневым ад вечнага загару. І больш у пакоі нікога не было. Я аказаўся першым госьцем. А праз паўгадзіны стала ясна, што і адзіным. Дуся ўвесь час прыслухоўвалася, ці не прыйшоў хто-небудзь, ці ня стукаюць у дзьверы (званок яшчэ не паставілі), і скісала на вачах, пахмурнела. Я сказаў, каб яна не

перажывала: раён далёкі, аўтобусы ходзяць кепска, а яшчэ цемра, дождж як зь вядра, таму нікога і няма да гэтай пары: шукалі, шукалі, дый паехалі дахаты. Дусіна маці падхапіла маю думку, сказала, што, відаць, так яно і ёсьць і чакаць больш ня будзем: “Давайце вячэраць, есьці хочацца!” Але нельга было не заўважыць, што яна перажывае ня менш за Дусю (столькі ўсяго на стол панастаўлялі, куды гэта цяпер падзець?), а думку маю падхапіла, спачуваючы дачцэ.
Сталі вячэраць. Выпілі па чарцы, па другой: я — гарэлкі, Дуся з маці — віна, а закусіць, дзякуй Богу, было чым — і салаты, і чырвоная рыба, і бутэрброды з ікрой, і шынка, і хатняе духмянае сала, а яшчэ гарачая бульба зь вялізнымі сакавітымі катлетамі. Дуся крыху павесялела, расчырванелася, мы зь ёй нават патанчылі пад патэфон (яна паставіла танга), і я пераканаўся, што яна можа быць абаяльнай, мілай, што яна не бяз гумару. Танцуючы з мной, расказала, як была аднойчы на прыёме ў нямецкім консульстве (гэдээраўскім) і консул запрасіў яе на вальс: “Танчым, кружымся, а мне хочацца сказаць яму што-небудзь прыемнае па-нямецку. Але нічога, акрамя “хэндэ хох!” (“рукі ўгору”), не магу ўспомніць!” Потым мы пілі гарбату з тортам, выпівалі пакрысе, і Дуся расказвала пра сябе, чытала вершы. Добрыя вершы, і мне было дзіўна, што тая Дуся, якую я да гэтага вечара ведаў, хваравіта-амбіцыёзная, грубаватая, па-мужыцку прасталінейная, піша такую пранікнёную лірыку, так тонка адчувае прыроду, што ў яе наагул высокая культура пачуццяў.

Над гэтымі старонкамі пра яе аднавіў у памяці па адной з Дусіных кніжак маленечкі верш “Кропля”, які тады хораша ўразіў:

Хадзіла ля кустоў сьцяжынкай
І не заўважыла, калі
На іх разложыстых галінках
Буйныя кроплі зацьвілі.
Адна, налітая, як вока,
Вось-вось пральецца... Што рабіць?
Я абыходжу куст далёка,
Каб вочка гэта не разьбіць.
І ў думках, чыстае, цалую...

Хацеў таго ці не хацеў —
На гэту кропельку малую
Мой сёньня дзень пабагацеў!

Над вершам гэтым зноў падумалася, што дарэмна многія цяперашнія маладыя паэты адкідваюць, закрэсьліваюць усю беларускую савецкую паэзію, лічаць яе цалкам ангажаванай, цалкам заняволенай сацрэалізмам, яго догмамі. Гэта ідзе ад невуцтва, ад няведаньня, ад моды на "мадэрн". Паэзія як такая — проста паэзія — існавала, жыла, трапятала і ў савецкі час, прабівалася праз догмы, як трава праз асфальт. А казённыя, кепскія, графаманскія, дый заангажаваныя вершы існавалі і існуюць пры любой уладзе. Карацей кажучы, перш чым адмаўляць усю беларускую паэзію савецкага часу, яе трэба ведаць. У тым ліку і вершы Еўдакіі Лось.

...На жаль, той наш давяральны, сяброўскі вечар аказаўся першым і апошнім, пасьля яго яна яшчэ больш мяне не залюбіла. Ледзь-ледзь здароўкалася, холадна ківала, у адказ на любую заўвагу фыркала злосна. Псыхалягічна гэта ня цяжка растлумачыць: яна пакутавала ад таго, што ніхто, акрамя мяне, не прыйшоў да яе на навасельле, бачыла ўва мне сьведку ейнай, як ёй здавалася, ганьбы і, напэўна, думала, што я зласьліва радуюся гэтаму і ўсім пра гэта распавядаю. Але, Бог сьведка, ніякай зласьлівай радасьці ў мяне не было, наадварот, я спачуваў ёй (хоць, вядома, мяне не магла ня ўразіць такая яўна жорсткая дэманстрацыя нядобрага стаўленьня да Дусі з боку тых людзей, якіх яна ў той вечар чакала) і нікому пра той вечар не расказваў, хіба што самым блізкім сябрам, дый тое пасьля ейнай сьмерці.

Калі Дуся ўжо не працавала ў "Звяздзе" і я таксама, нашыя адносіны крыху палепшалі, яна нават папрасіла мяне, каб я пераклаў на расійскую мову некалькі ейных вершаў для нейкага маскоўскага часопісу. Публікацыя тая ў мяне не захавалася, таму ня памятаю, што гэта быў за часопіс, і вершаў тых ня памятаю. Акрамя аднаго. (Ён увайшоў у маю кнігу "Запах мёда", у якой сабраныя найлепшыя вершы беларускіх паэтаў, вынік маёй перакладчыцкай працы за сорак гадоў.)

"Не родись красивой, а родись счастливой!"
Поговорка старая по сердцу — крапивой!
Век уплыл мой девичий песней лебединой...

Не была последней меж девчат девчиной!
Была небогатой, да всего хватало.
Долю даже в горе я не проклинала.
...Время пробегает, лебедь уплывает,
Отраженье белое речка вспоминает...
Слишком много камня, вьюги слишком много
Под ноги швырнула мне дальняя дорога.
Не сойду с дороги и не заплутаю,
Но присловье старое часто вспоминаю,
Поговорку эту, что сечёт крапивой:
“Не родись красивой, а родись счастливой!..”
Яна памерла ад раку летам 1977-га.
“Время пробегает, лебедь уплывает, отраженье белое речка вспоминает...”. Паэтка Еўдакія Лось застаецца ў памяці гэтым “белым адлюстраваньнем”. А тая пыхлівая, дужа партыйная Дуся — гэта нехта зусім іншы...

Коля Лупсякоў

[зьмест]

У 50-я гады мінулага стагодзьдзя слова **бомж** ужывалася зрэдку, калі, дай Бог памяці, наагул існавала: бамжы тады яшчэ не былі паўсядзённаю зьявай, як цяпер, тым больш бамжы-інтэлігенты. Праўда, пра Колю Лупсякова цяжка сказаць, што ён быў інтэлігент, хіба што паводле роду заняткаў. А бомж ён быў клясычны. Ён начаваў на вакзалах, у кацельнях, у грамадзкіх прыбіральнях, на гарышчах, у пад’ездах, хадзіў у страшэнных лахманох, непаголены, нямыты, нечасаны, сьмярдзючы — ад яго несла смуродам асяродку, у якім ён “абітаў”, застарэлым перагарам таннага віна, пахам кепскіх цыгарэт. Рот у яго быў агідны, сьлюнявы, з чорнымі гнілымі зубамі, сінія вочы, як у вар’ята, скіраваныя і на цябе, і некуды ў бок. Грошай у яго ніколі не было, і, зьявіўшыся ў Доме друку, ён абыходзіў літаральна ўсе рэдакцыі, “страляў” рублі. Каго ні сустрэне, адразу, не здароўкаючыся: “Слухай, будзь чалавекам, пазыч рубель!” (Янка Брыль расказвае, што аднойчы быў сьведкам таго, як Лупсякоў у пакоі адной з рэдакцый вываліў з кішэні на стол кіпу “настраляных” рублёў, акуратна палічыў і захіхікаў: “Во колькі ў Доме друку дурняў — столькі ж, колькі рубельчыкаў! Ведаюць, што ніколі не аддам, а даюць!”)
Ці быў Лупсякоў і сапраўды вар’ятам, юродзівым, ці толькі прыкідваўся, у чым упэўнены Іван Антонавіч? На маю думку,

ён сьвядома абраў спосабам жыцьця бадзяжніцтва, таму што гэта давала яму поўную свабоду, пазбаўляла ад усіх забавязаньняў перад людзьмі, у тым ліку і перад сям'ёй (у яго некалі была сям'я, жонка і дзеці, на якіх ён проста забыўся альбо пастараўся забыцца). Аднак, думаю, ён, хоць і ня быў вар'ятам у поўным сэнсе слова, усё ж быў псыхічна нездаровы. Тут трэба памятаць, што ён быў цяжка паранены на фронце ў 1943-м, асколак снараду прадзіравіў яму галаву і застрэміўся глыбока ў мозгу, што з гадамі, відаць, і зрабілася прычынай псыхічнай хваробы. Характэрна, дакладней адметна, што "стукнутасьць" Лупсякова выявілася ў шпіёнаманіі, — ён жа быў савецкі чалавек і вар'яцтва 1937-га, відаць, хавалася ў ягонай душы, як у мозгу той асколак...

"Шпіёна" Коля знайшоў у "Звяздзе", а "шпіёнам" гэтым быў першы намесьнік галоўнага рэдактара Вячаслаў Пятровіч Палескі. Чаму Коля "выйшаў" менавіта на Палескага, Бог ведае. Можа, таму, што ў Вячаслава Пятровіча быў "ня наш выгляд": выпешчаны, пародны, панскі твар, крыху пагардлівы, імпазантная постаць, унушальны і разам з тым іранічна паблажлівы голас. Нічога ад вяскоўца, хоць паходзіў ён зь сялянскай паляшуцкай сям'і. Лупсякоў яго баяўся, ніколі не заходзіў да яго ў кабінэт, толькі зрэдку, п'яны, прыадчыняў дзьверы, прасоўваў у шчыліну голаў і выкрыкваў: "Ты шпіён! Шпіён!" І ўцякаў, як хлапчук-шкоднік, спалохана азіраючыся. Пра тое, што Палескі шпіён, варожы дывэрсант, Коля кожны раз, калі заходзіў у рэдакцыю, расказваў па чарзе ўсім зьвяздоўцам. Зойдзе ў аддзел, моўчкі пастаіць, падыміць сьмярдзючай "Прымай" і раптам сьцішана кажа: "Слухай, кінь сваю работу, давай выйдзем у калідор — я табе нешта скажу!.." — "Навошта ў калідор? Мы ж тут адны, расказвай!" Азірнецца па баках, падыдзе да стала, нахінецца, наблізіць да цябе зарослы брудна-рудым шчаціньнем твар, таямніча шэпча: "Ты ведаеш, што Палескі шпіён? Ня ведаеш... А я ведаю, я ж на фронце разьведчыкам быў!.. Я яго наскрозь бачу!" — "Чый жа ён шпіён, Коля?" — "Чый, чый! Шпіён, і ўсё!" (Палескі хоць і пасьмейваўся з Колевых "падазрэньняў", аднак пачуваў сябе ніякавата, нават нейкая дзіўная разгубленасьць ценем прабягала па твары. Ня так ужо было яму і сьмешна, бо ў 38-м Вячаслаў Пятровіч быў арыштаваны як "вораг народу".

Праседзеў, праўда, нядоўга, некалькі месяцаў: яго выпусьцілі, калі быў абвешчаны ворагам народу М.Яжоў, кіраўнік НКВД і ў гэтым злавесным наркамаце пачалі нібыта змагацца зь яжоўскімі “перагінамі” ды вызвалілі частку ўяўных ворагаў.) І вось гэты стукнуты бомж, брудны, нямыты і нечасаны, апрануты ў сьмярдзючыя лахманы бадзяга пісаў выдатныя апавяданьні і нарысы! У іх не было і ценю вар’яцтва (калі, вядома, забыцца на тое, што пісьменьніцтва само па сабе ёсьць род вар’яцтва, без “вар’яцінкі” няма пісьменьніка, наагул творцы), не было неахайнасьці ў мове, ніякай штучнасьці: ясная, жывая, разумная проза. І хоць з тых далёкіх часоў я яго не перачытваў, яскравае ўражаньне засталося, а я давяраю першаму ўражаньню, якое выклікае прачытаная кніга альбо той ці іншы чалавек. Праўда, калі гаворыш пра Лупсякова, уражаньне, якое ён пакінуў як чалавек, не састыкоўваецца з уражаньнем ад ягоных апавяданьняў і нарысаў, чымсьці блізкіх, як мне тады здавалася, да апавяданьняў і нарысаў вядомага расійскага пісьменьніка пазамінулага стагодзьдзя Мікалая Памялоўскага, які, дарэчы, таксама быў у пэўнай ступені бамжом, асабліва напрыканцы жыцьця, калі сьпіваўся...

Усе свае рукапісы Коля Лупсякоў меў пры сабе, але што гэта былі за рукапісы! Брудны, зашмальцаваны тоўсты сшытак, расьпіханыя па розных кішэнях блякноты і блякноцікі, асобныя аркушыкі і проста кавалкі паперы, адарваныя ад газэт “палі”, пакрытыя Колевымі крэмзаламі (почырк здаваўся абсалютна незразумелым, але пачнеш чытаць — і аказваецца, усё разборліва). Заходзячы ў аддзел літаратуры і мастацтва з нарысам альбо апавяданьнем для “Звязды”, Коля прасіў даць яму тузін чыстых лістоў паперы, выкладваў усе свае блякноты і блякноцікі, папяровыя шматкі і, зазіраючы ў іх, перапісваў апавяданьне на чыставік, чарнілам, вельмі акуратна, ніколі не рабіў кляксаў, хаця да чарніла і ручкі быў нязвыклы, пісаў толькі алоўкам. Перапісваючы, час ад часу ўздыхаў: “От жа адвык я працаваць за сталом, сьпіна баліць і рука. Я ж пішу ў стозе сена, на пузе лежачы, альбо на лавачцы, на сьвежым паветры, — любата!” Як ён піша на лавачцы, на сьвежым паветры, я аднойчы бачыў у Купалаўскім сквэры. Была восень, здаецца, сярэдзіна кастрычніка, накропваў дождж. Мы з паэтам Навумам Кісьлікам ішлі некуды праз сквэр і раптам убачылі

Лупсякова: ён сядзеў на лавачцы, загарнуўшыся ці то ў нейкі пастухоўскі балахон, ці то ў салдацкую плашч-палатку з капюшонам, і пісаў у блякноціку, нізенька апусьціўшы галаву, трымаючы блякноцік на калене. Побач з Колем на лавачцы стаяла бутэлька нейкага таннага віна, закаркаваная кавалкам газэтнай паперы. Мы ня сталі перашкаджаць і нават не паздароўкаліся, хоць ён, калі мы наблізіліся да лавачкі, падняў галаву і паглядзеў на нас невідушчымі вар'яцкімі вачыма.
А лежачы на пузе ў стозе сена, ён пісаў у вёсцы Папаратнае, на Жлобіншчыне, дзе была яго родная хата і дзе ён гасьцяваў, у асноўным летам, у сваіх старэнькіх бацькоў.
Многія спрабавалі час ад часу неяк паўзьдзейнічаць на Лупсякова (жыць у грамадзтве і быць ад яго свабодным немагчыма, асабліва ў савецкім грамадзтве), вялі зь ім размовы "за паратунак душы", каб вярнуць Колю "ва ўлоньне цывілізацыі", аднак нарываліся ў адказ на адборныя мацюкі. Таму вярнуць Колю ў тое "ўлоньне" паспрабавалі хітрасьцю. А пасадзейнічалі гэтаму Колевы ж грошы. І не малыя. У 1957-м ці 58-м годзе, дакладна ня памятаю, у Лупсякова выйшла ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве даволі аб'ёмістая кніга, здаецца, "Дняпроўская чайка" ці "Вераб'іная ноч", таксама дакладна ня памятаю, за якую ён павінен быў атрымаць салідны ганарар. (Чвэрць заробку ў яго вылічвалі на алімэнты, але ўсё адно грошай ад таго ганарару заставалася шмат.) І вось некалькі чалавек зьвяздоўцаў, у тым ліку і я, таксама Ўладзімер Жыжэнка, які ў той час працаваў у Белдзяржвыдавецтве і быў рэдактарам Колевай кнігі, утварылі нешта накшталт камісіі па выратаваньні Лупсякова. Узначаліла гэтую камісію бібліятэкарка "Звязды" Зоя Федчанка. Мы дамовіліся з бухгальтэрыяй выдавецтва, каб Лупсякову ганарар на рукі не выдавалі (ён павінен быў толькі расьпісацца ў ведамасьці), а выдалі нам: мы на атрыманыя грошы прывядзём Колю ў боскі выгляд. Апранём з ног да галавы, але спачатку адправім у лазьню. Сказана — зроблена. Валодзя Жыжэнка павёз Лупсякова ў лазьню, там жа, у цырульні пры лазьні, яго перад мыцьцём пастрыглі, пагалілі, зрэзалі чорныя пазногці. І на руках, і на нагах. А потым Валодзя Жыжэнка прывёз Колю ў ГУМ, дзе за яго ўзялася Зоя Федчанка: купіла яму бялізну, падабрала прыгожы элегантны касьцюм, сталёва-шэры, з "блёстачкай", кашулю сьветла-

блакітнага колеру, сьветла-шэры гальштук, шкарпэткі, чорныя пантофлі, фэтравы капялюш і лёгкі шэра-зялёны плашч. Ува ўсё гэта Коля апрануўся там жа, у ГУМе, у прымерачнай кабіне, адкуль выйшаў — не пазнаць! Джэнтэльмэн. Пра што сказаў сам, гледзячы на сябе ў люстэрка: “Ты глядзі, які я зрабіўся жальтмэн!” З ГУМу Колю прывезьлі ў Дом друку, дзе паглядзець на яго зьбегліся ўсе рэдакцыі. Захапляліся, ахалі, а Роза Аронаўна Цьвік, стыль-рэдактарка “Звязды”, старая дзева, якая на кожнага глядзела як на патэнцыяльнага жаніха, сказала, чырванеючы як паненка: “О, які пхыстойны мужчына! Я бі за яго війшла!..”

З тыдзень Коля хадзіў па ўсіх паверхах Дому друку ў вобразе “прыстойнага мужчыны”, а потым зьнік. І паявіўся месяцы праз два, ужо ўвосень, у сваім ранейшым выглядзе — у сьмярдзючых лахманох, у нейкіх апорках на босую нагу, зарослы ранейшым брудна-рудым шчаціньнем. З колішніх абноваў на ім была толькі кашуля, даўно ўжо ня сьветла-блакітная, а шэрая, як пыл, з зашмальцаваным каўняром — яе ні разу ня пралі з таго часу, як апранулі. Калі спыталі: “Што ж ты, Коля, зноў так апусьціўся?” — ён агрызнуўся: “Я нікога не прасіў, каб мяне прычэсвалі! Ня лезьце да мяне!” (Ён часам мог злосна агрызнуцца. Неяк Аляксандра Шаўня, загадчыца аддзелу літаратуры і мастацтва, доўга і нудна рабіла яму заўвагі наконт нейкага ягонага апавяданьня, ён слухаў, слухаў і раптам гаркнуў, вылупіўшы страшныя вочы: “П... дурная!” Выхапіў рукапіс з рук Шаўні і выйшаў, бразнуўшы дзьвярыма.) Уся наша “камісія” па вяртаньні Лупсякова “ўва ўлоньне цывілізацыі” была засмучана. Разьлік жа быў на тое, што Лупсякоў, прыведзены намі ў нармальны выгляд, не захоча разбураць свайго новага аблічча, пасьвятлее розумам і сам жахнецца розьніцы паміж сабою-бадзягам і сабою — элегантным мужчынам у капелюшы. Але ён даказаў, што проста ня можа быць такім, як усе. Ува ўсім! Калі я ўбачыў яго ў ранейшым выглядзе, то паверыў байцы, якую пра яго расказвалі: пра тое, як ён аднойчы ехаў цягніком на даху вагона. На нейкай станцыі міліцыянэр запатрабаваў, каб Коля зьлез з даху і паказаў дакумэнты. Коля ня стаў спрачацца, зьлез і паказаў міліцыянэру пашпарт. І білет у той жа вагон! Міліцыянт вылупіў вочы: “Навошта ж вы ўскараскаліся на дах,

калі ў вас ёсьць білет!” На што Коля адказаў: “А там дыхаецца вольна, ня тое што ў тым купэ, дзе і не павернешся!” Дыхаецца вольна — у гэтым, відаць, разгадка недарэчнай на першы погляд асобы Міколы Лупсякова. Ён не выносіў несвабоды. Хоць, магчыма, я яго рамантызую. Наш выдатны літаратурны крытык, нябожчык Рыгор Бярозкін выказваўся наконт Колі жорстка: “Люмп! Але пісьменьнік добры”. Вось і я ўпэўнены, што добры. І, думаю, многія яго апавяданьні, асабліва аповесьць “Пабіраха”, вытрымалі выпрабаваньне часам. І да нашых дзён прыйшліся б якраз дарэчы. Ёсьць у іх перазоў з нашым сёньняшнім жыцьцём-быцьцём.

“А лепш за мяне пішыце самі!” [зьмест]

...**І**дзе першы мой месяц у “Звяздзе”. Загадчыца аддзелу літаратуры і мастацтва Аляксандра Аляксандраўна Шаўня ў адпачынку, і аддзел вяду я. Галава ў мяне крыху кружыцца, і нос задзіраецца: з студэнцкай лавы трапіў адразу на такую вышыню! Яшчэ б не задзірацца носу! У аддзел амаль штодзень заходзяць людзі, чые імёны ведае ўся рэспубліка і нават увесь Савецкі Саюз, зьвяртаюцца да мяне па бацьку, уважліва мяне слухаюць, калі я раблю нейкія заўвагі наконт іхніх артыкулаў, вершаў, апавяданьняў, нарысаў, якія яны прапаноўваюць “Звяздзе”, і я ўвесь перапоўнены ўсьведамленьнем уласнай значнасьці, хоць і разумею ў глыбіні душы, што яны паважаюць ня столькі мой аўтарытэт (няма яшчэ ніякага аўтарытэту!), колькі аўтарытэт “Звязды”.

І вось аднойчы ў чарговы нумар ідуць вершы Петруся Броўкі. Я знаёмлюся зь імі ўжо непасрэдна ў карэктуры, таму што іх здалі ў набор, мінаючы мяне: Броўка аддаў вершы непасрэдна галоўнаму рэдактару, той — адказнаму сакратару “Звязды” Нічыпару Пашкевічу, а Пашкевіч неадкладна паставіў іх у паласу. “Вычытай карэктуру, — кажа мне Пашкевіч, — і завязі паласу Пятру Ўсьцінавічу, ён адпачывае ў Каралішчавічах. Патрэбны ягоны подпіс на карэктуры. Такі парадак. У Каралішчавічы цябе завязуць на рэдакцыйнай машыне”.

Сказаў і пайшоў. А я прачытаў вершы адзін раз, другі, трэці, потым узяў самапіску і пачаў іх правіць! Вельмі рашуча і адважна. Цяпер ужо ня памятаю, што гэта былі за вершы, але карэктуру, пярэстую ад маіх крамзоляў, бачу перад сабою і па

сёньняшні дзень. Пашкевічу я гэтых сваіх правак не паказаў, таму што быў абсалютна ўпэўнены, што цяпер вершы “зайгралі”.
Прыязджаю ў Каралішчавічы (афіцыйная назва — Дом творчасьці пісьменьнікаў імя Якуба Коласа, паблізу ад вёскі Каралішчавічы, з правага боку Магілёўскай шашы, здаецца, на 13-м кілямэтры), уваходжу ў пакой Броўкі. Пётар Усьцінавіч паціскае мне руку, запрашае прысесьці, я аддаю яму паласу, ён, узьдзеўшы акуляры, садзіцца за стол, бярэ аловак і пачынае чытаць. Літаральна праз паўхвіліны чую ціхі і разам з тым злавесны, як мне падалося, голас: “Што гэта такое?” І Броўка паказвае мне карэктуру. “Як што? — я спалохана ўстаю з канапкі. — Карэктура...” — “А хто гэта тут накрэмзаў?” — паранейшаму ціха і зласьліва пытаецца Броўка. “Чаму накрэмзаў? Гэта — праўкі... Я хацеў... Бачыце...” — “Я ўсё бачу, не сьляпы! — ужо чырванеючы ад гневу, узвышае голас Пётар Усьцінавіч. — Таму і пытаюся, хто гэта зрабіў? Вы?” — “Я...” — “А хто вам дазволіў? Я пытаюся, хто вам дазволіў, малады чалавек? Гэта што, вашы вершы? Тут жа напісана во, уверсе, — Пятрусь Броўка!” — “Я хацеў, каб было лепш, — прамармытаў я. — Мне здавалася...” — “І слухаць не жадаю, што вам здавалася! Вы ня маеце ніякага права перарабляць мае вершы! Нават калі яны кепскія! Я і сам не інвалід”. — “Але, Пятро Ўсьцінавіч, — усё ж адважыўся запярэчыць я, — паглядзіце, так жа лепш!”
Я паспрабаваў узяць паласу зь ягоных рук, але ён ня даў: “Усе вашы праўкі я закрэсьліваю! Бо гэта пісаў ня я, а вы. Няхай будзе горш, але маё, разумееце? А лепш за мяне вы ўжо самі пішыце, добра?”

Адклаўшы аловак і ўзяўшы аўтаручку, ён старанна затушаваў усе мае крамзолі, напісаў унізе паласы: “Чытаў Пятрусь Броўка”. І аддаў мне паласу. Правёў да дзьвярэй і каля парогу раптам абняў мяне рукою за плечы, зірнуў у вочы, сказаў на вуха, як сакрэт: “Не расказвайце нічога рэдактару, бо вам дастанецца на арэхі. Я ўсё-такі Пятрусь Броўка. А лепш за мяне, паўтараю, пішыце самі!” Адчыніў дзьверы, паціснуў мне руку, а ў самога ў вачах сьмех — і добры, і разам з тым іранічны.
Пазьней, недзе ў 59-м, мне давялося езьдзіць зь ім у адной пісьменьніцкай брыгадзе па Віцебшчыне, у дні Дэкады

расійскай літаратуры ў Беларусі. Ён ні разу не нагадаў мне, як я некалі ўзяўся правіць ягоныя вершы, толькі позірк, скіраваны на мяне, кожны раз сьвяціўся тым жа сьмехам. Апошні раз я сустрэў яго ў парку Горкага, за які мо месяц да сьмерці паэта, — ён прагульваўся па алеі, з кіёчкам, слабенькі, сівенькі, зьняможаны дзядок. Толькі вочы засталіся ранейшымі — жывымі, разумнымі. Я сказаў яму, што перакладаю на расійскую мову яго верш пра кнігу (у выдавецтве “Мастацкая літаратура” рыхтаваўся да друку зборнік вершаў паэтаў сьвету, прысьвечаных КНІЗЕ). “Толькі пакіньце ў сваім перакладзе што-небудзь і ад мяне самога, — усьміхнуўся Пётар Усьцінавіч. — Бо іначай не падпішу карэктуры!..” І, як некалі ў Каралішчавічах, абняў мяне адной рукою за плечы.

Вядома, Броўка быў не раўня вялікім клясыкам нашай паэзіі — Янку Купалу, Якубу Коласу, ён, так бы мовіць, быў прызначаны клясыкам партыйнымі інстанцыямі. І таму быў недатыкальны для крытыкі “зьнізу”. І прывык да гэтага. А таму вельмі хваравіта рэагаваў на любыя спробы аб’ектыўна разабрацца ў ягонай творчасьці. У прыватнасьці, да канца жыцьця ня мог дараваць Алесю Адамовічу артыкул, у якім грунтоўна крытыкаваўся раман Броўкі “Калі зьліваюцца рэкі” (яго апанэнты кпілі: “Калі зьліваюцца рэкі — кладзецца сон на павекі”).

Але самым жорсткім крытыкам аказаўся час. Сёньня выразна бачыш, перачытваючы тамы паэзіі Броўкі, як ягоны скасьцянелы палітычны дагматызм, так званая партыйнасьць, зьнявечыў талент паэта. А талент, безумоўна, быў! І добрая жменя залацінак яго засталася — лірыка. Чыстая, беспартыйная лірыка. Найлепшае ўвайшло ў пасьмяротны зборнік “Исток моей судьбы” (ён выйшаў у перакладах на расійскую мову, у тым ліку і маіх), у якім чуваць нягучны, задушэўны, ласкавы голас паэта, дадзены яму Богам. Яму б сьпяваць заўсёды гэтым голасам, а ён усё жыцьцё фарсіраваў яго, надрываў, гвалціў, уздымаючы да громападобнага патасу. І выходзіла фальшыва. Таму што не павінен лірычны тэнар раўці басам...

Роза Цьвік

[зьмест]

...**Н**я памятаю ні назову, ні прозьвішча аўтара артыкулу, які мне даручылі падрыхтаваць да друку ў першы мой працоўны

дзень у “Звяздзе” (я быў залічаны ў штат рэдакцыі на пасаду літработніка аддзелу літаратуры і мастацтва на пачатку жніўня 1955 году). Цьмяна памятаю адно зьмест — нешта цягамотнае пра асаблівасьці творчасьці Міхаіла Шолахава, якому ў 55-м споўнілася пяцьдзясят год. І хоць нарадзіўся ён у траўні, усе партыйныя газэты Савецкага Саюзу надалей працягвалі адзначаць ягоны юбілей, такое было ўказаньне ЦК КПСС. Напісаны быў той артыкул на расійскай мове, што мяне зьдзівіла: чаму для беларускай газэты чалавек напісаў па-расійску? Я ня ведаў яшчэ, што гэта ў парадку рэчаў, што па-расійску напісаныя амаль усе матэрыялы, якія паступаюць у “Звязду”. Нават зь вёскі! І каб жа толькі гэта! У той жа першы мой “зьвяздоўскі” дзень я выявіў, што многія супрацоўнікі рэдакцыі паміж сабою, з наведвальнікамі, на рэдакцыйнай “лятучцы” гавораць па-расійску!..
На беларускую мову матэрыялы перакладалі машыністкі, і праца іх была катаржнай, кожны матэрыял ім даводзілася друкаваць двойчы, а то і тройчы. Таму што спачатку матэрыял, напісаны па-расійску, правіўся ў аддзеле на мове арыгіналу, пасьля чаго яго аддавалі на пераклад. Але машыністкі, нават найлепшыя, самыя кваліфікаваныя, не былі журналісткамі, і пераклады іхнія былі даслоўныя, уяўлялі сабою “кальку” з расійскай мовы. Таму ў аддзеле пераклад зноў правіўся, даводзіўся да ладу і здаваўся на перадрук. Аднак перадрукаваны матэрыял нельга было здаваць адказнаму сакратару рэдакцыі бязь візы стыль-рэдактара. А стыль-рэдактар так яго крэмзаў, што патрабаваўся яшчэ адзін перадрук. Амаль заўсёды.

Стыль-рэдактарам тагачаснай “Звязды” была Роза Аронаўна Цьвік, кабета неабдымных габарытаў; твар у яе заўсёды быў ружовы, нібы распараны, быццам яна толькі што з лазьні. І заўсёды яна нешта жавала, хрумкала то сухарык, то моркаўку, то мятную “шкляную” цукерачку. На абед у сталоўку Роза Аронаўна не хадзіла, пры яе грузнасьці ёй было цяжка спускацца і падымацца па лесьвіцы, і яна абедала на сваім рабочым месцы: дзьве каструлькі з абедам — першая і другая стравы — яна прыносіла з дому і ў абед разагравала на электраплітцы. Калі надаралася зайсьці ў пакойчык стыль-рэдактуры ў абедавы перапынак, Роза Аронаўна ўзрадавана

прапаноўвала пакаштаваць яе боршч (*бохшч* — картавіла яна жахліва, і акцэнт быў той яшчэ!), альбо рыбную катлетку, альбо цымэс (тушаную моркву), прастадушна шкадавала, што няма каму ацаніць і пахваліць яе талент гаспадыні, ейнае ўменьне гатаваць: “Калі б ві білі мой мужік, ві б ведалі, што лепш за мяне бохшч ніхто не згатуе!” Самотная старая дзеўка, Роза Аронаўна была крыху чокнутая на замужжы, гэта быў ейны “пункцік”, і, як толькі скажаш ёй камплімэнт (“Вы сёньня цудоўна выглядаеце!” ці “О, якая ў вас прыгожая сукенка!”), дыханьне яе станавілася ўсхваляваным, круглы, што блін, твар з ружовага ператвараўся ў пунсовы, і, закатваючы пад лоб маленькія шэра-зялёныя вочкі, што, мабыць, уяўлялася ёй какецтвам, яна гульліва пыталася: “Я вам падабаюся? Ві мне таксама! Ві вельмі пхыемны мужчына, я бі за вас пайшла!” Колькі ёй гадоў і колькі табе, яна не задумвалася, а ёй было пад пяцьдзясят: рэдзенькія валасы, сабраныя на макаўцы ў куксачку з блакітным банцікам, былі зусім сівыя. Час ад часу замест куксачкі яна заплятала валасы ў дзьве караценькія коскі, і таксама з банцікамі. Гэта было камічна: таўшчэзная, як бэгемоціха, Роза Аронаўна і банцікі! Праўда, з сваіх габарытаў яна сама пасьмейвалася: “Я нішто сабе цьвік, га?” Я неяк пацікавіўся, адкуль у яе такое прозьвішча, Цьвік? Можа, дзед альбо прадзед працаваў на фабрыцы, дзе выраблялі цьвікі? Але Роза Аронаўна сказала, што нічога падобнага: прозьвішча ейнага дзеда было Цьві, і ня проста Цьві, а Бэн Цьві, што на старажытнагабрэйскай мове азначае *сын аленя*, і ня проста аленя, а высакароднага: на іўрыце *цьві* — гэта высокародны алень. Але калі дзед атрымліваў пашпарт, “цахскія чыноўнікі запісалі яго Цьвіком”. Так што на самай справе яна аляніха, а ніякі ня цьвік. Але, з другога боку, яна ня супраць: прозьвішча атрымалася чыста беларускае, і гэта правільна, бо яна, Роза Аронаўна, хоць і габрэйка, але таксама і беларуска: “Белахуская мова для мяне г-ходная!” Мову яна ведала дасканала, глыбінна, чаго ня скажаш пра большасьць тагачасных зьвяздоўцаў, якія мала таго што пісалі шэра, казённа, дык яшчэ і зь беларускай граматыкай, з правапісам былі не ў ладах. Колькі худасочных артыкулаў, нарысаў, рэпартажаў, прайшоўшы праз рукі Розы Аронаўны, хоць з боку элемэнтарнай пісьменнасьці не выклікалі нараканьняў! Бываюць жа такія парадоксы: картавая габрэйка з глухога

мястэчка (зь якога менавіта, на жаль, ня памятаю) зрабілася стражніцай чысьціні беларускай мовы.

Часам моўны пурызм Розы Аронаўны прыводзіў да кур'ёзаў, пра адзін зь якіх не магу не расказаць. Неяк ішла ў нумар караценькая інфармацыя ТАСС, у якой паведамлялася, што амбасадар ЗША ў Маскве Чарльз фон Болен адбыў у Вашынгтон для кансультацыяў з сваім урадам, але назаўтра чытачы "Звязды" даведаліся, што з Масквы ў Вашынгтон адбыў амбасадар Чарльз фон Хворы! Прозьвішча амбасадара памяняла, візуючы інфармацыю яшчэ да набору, Роза Аронаўна, а дзяжурныя па нумары гэтага не заўважылі. Сьмех сьмехам, аднак на гэты раз Роза Аронаўна атрымала за сваю моўную пільнасьць строгую вымову: у тыя часы нават самая дробязная недакладнасьць у падачы афіцыйнай тасаўскай інфармацыі разглядалася як надзвычайнае здарэньне. А тут ня дробязь — высокапастаўленага замежнага дыплямата фон Болена перахрысьцілі ў Хворага! І хто? Роза Аронаўна Цьвік! Ці не наўмысная гэта сіянісцкая правакацыя? (Я не перабольшваю, былі ў "Звяздзе" людзі, якія маглі так падумаць, — напрыклад Міхаіл В-ч, цяжка хворы на антысэмітызм чалавек. У яго нават габрэйскія імёны выклікалі юродзкае хіхіканьне: як пачуе імя Хаім альбо Гірш, пачынае хіхікаць і пры гэтым густа чырванее, нібы пачуў нешта непрыстойнае.) Аднак я схлусіў бы, калі б сказаў, што ўвесь калектыў "Звязды" быў атручаны гэткага кшталту антысэмітызмам, большасьць ставілася да сваіх калегаў-габрэяў нармальна. Праўда, на *побытавым* узроўні. Палітычнае мысьленьне ў дачыненьні да габрэйскага пытаньня наагул было ўва ўсіх капээсэсаўскае, ніхто не сумняваўся ў варожай сутнасьці "бязроднага касмапалітызму" і "сусьветнага сіянізму". Аднак гэтыя азначэньні не распаўсюджваліся на сваіх, зьвяздоўскіх габрэяў: ну якая Роза Цьвік касмапалітка ці сіяністка? Яшчэ адзін дзіўны савецкі фэномэн!.. Зрэшты, тое самае было ўласьціва і многім немцам у нацысцкай Германіі: "Габрэі, вядома, сьвіньні, зь імі трэба змагацца, але мой сусед-габрэй харошы чалавек, нібы і не габрэй нават!" Што да Розы Аронаўны, то яна ставілася да антысэміцкіх выбрыкаў спакойна: "Заві мяне гахшком, толькі ў печ не засоўвай, як у Асьвенцыме". Абуралася яна адно тады, калі той жа В-ч ці яшчэ хто-небудзь

задаваўся адным зь “вечных” антысэміцкіх пытаньняў: “Чаму ўсе габрэі ў гады вайны адседжваліся ў Ташкенце?” — “Я не біла ў Ташкенце, — злавалася Роза Аронаўна, — я біла ў пахтызанскай зоне! І Навум Юшпхах ня біў у Ташкенце, ён біў на фхонце!” Дарэчы, Навум Юшпрах, літработнік аддзелу партыйнага жыцьця, быў яшчэ больш характэрны габрэй, чым Роза Аронаўна габрэйка, ён картавіў як усе габрэі сьвету, разам узятыя, і ня толькі на “р”, а, здавалася, на ўсе літары! Тварам Юшпрах быў падобны — як Барыс Пастарнак, паводле азначэньня Маякоўскага, — адначасова да араба і ягонага каня. Праўда, Навум быў падобны не да пародзістага скакуна, а на каня-аратага. Цікава, што ў часе вайны гэты беларускі габрэй з “конскім тварам” служыў у кавалерыі, у казацкім корпусе!

Ды вярнуся да Розы Аронаўны.
У сваім змаганьні за чысьціню мовы яна не магла яе зьмяніць і пакутавала ад таго, што ў 1933-м годзе “адмянілі Тарашкевіча”. Ні розумам, ні тым больш сэрцам яна не прымала “наркамаўкі”: “Я вам скажу, цяпехашняя мова нейкая нясмачная, як сушаная бульба, зь яе выціснулі сокі. Паспхабуй зхабіць з такой булбы пюхэ!..” Ня ведаю чаму, але мне Роза Аронаўна давярала і вяла з мной крамольныя, небясьпечныя на той час размовы пра тое, што стары правапіс, якому навучаў Браніслаў Тарашкевіч у сваёй “Беларускай граматыцы для школ”, быў заснаваны на фанэтыцы народнай мовы, на ейных унутраных, адно ёй уласьцівых законах, а “наркамаўка” мову зрусіфікавала, штучна зьмяніла ейнае прыроднае гучаньне: “Наход так не гавохыць, як цяпех пішуць!” Яшчэ большай крамолай быў сумнеў у слушнасьці палітычнай ацэнкі старога правапісу, і Роза Аронаўна выказвалася на гэты конт таямнічым паўшэптам: “Ві падумайце, пхавапіс абвясьцілі клясава вахожым, Тахашкевіча — шпіёнам! Значыць, і ягоная г-хаматыка шпіёнская? Можа такое біць? Я ня ведаю!” І яна шматзначна падціскала губы.
...Нішто не ўзьнікае зь нічога: у далёкім мінулым — у дзяцінстве альбо ў юнацтве — заўсёды адшукаецца каліўца семені, зь якога праз многія гады вырастае дрэва сталых тваіх пераканьняў, — у маёй душы каліўца трывожнай думкі пра лёс беларускай мовы пасеяла Роза Аронаўна Цьвік. Але толькі цяпер я гэта да канца разумею, а тады, што тут хлусіць, ейны

клопат ня быў па-сапраўднаму маім клопатам, я быў далёкі ад нацыянальна-сьвядомага асяродзьдзя, спакойна ставіўся да таго ж дзьвюхмоўя: у “Звяздзе” маю руку вяло беларускае слова, а па-за рэдакцыяй я пісаў расійскія вершы і апавяданьні, гаварыў па-расійску. Толькі праз тры дзесяцігодзьдзі выліўся з душы верш:

“...У бубны дахаў вецер б’е...”
О мова, я знайшоў цябе
На Багдановічавай глебе!
Грамы гурчаць у хмарным небе,
Каменьне бруку дождж дзяўбе,
Ратуе горад ад сьпякоты.
І ні згрызоты, ні самоты,
І даспадобы мне грымоты
Важкіх, развалівых грамоў:
Я чую ў іх грымоты слоў
Немітусьлівай ёмкай мовы,
Мне родны ейны гул вясновы —
Гамонка прашчураў-Дзядоў!
Мой шлях да іх — шлях да сябе,
Вяртаньне да сябе самога.
На вулках гораду старога,
О мова, я знайшоў цябе!..
(“У Траецкім прадмесьці”, 1986 г.)

Скажуць: дык што, ты цалкам адхрышчваешся ад расійскай мовы, на якой пісаў столькі гадоў, на якой выйшлі амаль усе твае кнігі? Не адхрышчваюся. Але стаю сёньня на тым, пра што пісаў у 1995 годзе на старонках тады яшчэ прыстойнай “Народнай газеты”: “...Русский язык для меня такой же родной, что и белорусский. Но в беде ныне белорусский, вот почему нельзя, просто преступно придавать русскому языку статус государственного, вводить государственное двуязычие. Это было бы правомерно, находись оба языка в равном положении, если бы русский не подавлял, не вытеснял, не обрекал на немоту своего собрата, если бы белорусской мове не отводили место Золушки в ее собственной хате...”

Шкадую, што ні гэтых слоў, ні маіх беларускіх вершаў ніколі не пачуе Роза Аронаўна Цьвік. Яна даўно памерла, так і ня зьведаўшы радасьці гатаваць *бохшч* для свайго мужыка.

Выразна бачу перад сабою яе круглы, што румяны блін, дабрадушны твар, сівенькія коскі з банцікамі, чую ейны голас: “Тавахыш Тахас, ві здольны жухналіст, мне падабаюцца вашыя ахтыкулы, але ві ня ведаеце белахускіх канчаткаў!” На жаль, беларускіх канчаткаў я ня ведаю і сёньня. Ня столькі граматычных, хоць і тут было б што паправіць Розе Аронаўне, колькі гістарычных. Страшна, калі спраўдзіцца тое, што прадказаў гараскоп Беларусі Францішку Скарыну пяцьсот гадоў таму:

На куски Беларусь разорвут,
Нашлют кровососов ораву,
Будут прятать под спуд
Слово её и славу.

Гэтыя радкі Рыгора Барадуліна зь ягонай ліра-паэмы “Самота паломніка” прагучалі ў 1990-м годзе на старонках “Нёману”. Але гэта і мае радкі, мой боль, таму што пераклад паэмы на расійскую мову зрабіў я. Сёньня тая паэма — натхнёнае слова пра Скарыну, глыбокі роздум пра лёс роднай мовы, роздум і трывожны, і суровы, і шчымлівы — згадалася ўся, разам з успамінам пра сьмешную картавую беларускую габрэйку Розу Цьвік.

Хоць яна ніякі ня цьвік, а высакародная аляніха!...

жнівень, 1997 г.

Працяг у ARCHE 5-2003.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/07/03
[image]

Сяргей Шыдлоўскі

Рэйд у ружовым маскхалаце

Кісліцына Ганна. *Blonde attack.* — Менск: Логвінаў, 2003.

Амэрыканцы ў Іраку. Ніхто ня верыць у рацыю бакоў канфлікту. Але ўсе ўскосна фундуюць вайну, карыстаючыся TV. Этычныя гледзішчы саступаюць эстэтычным запатрабаваньням, маральныя выдаткі апраўдваюцца маляўнічасьцю відэакарцінкі ды пафігічным разгонам маналёгаў Жырыноўскага. Такога шоў яшчэ не было.

Вартасьць ідэалёгіі выражаецца ў тым, наколькі маляўнічы сюжэт яна здольная забясьпечыць у выніку сваёй рэалізацыі. Размытыя межы паміж літаратурай і TV-рэальнасьцю: фабулу якой кшталтуюць сцэнарысты. Вуснамі грамадзкіх дзеячоў прамаўляюць літаратурныя падзёншчыкі. Пытаньне “зловяць ці ня зловяць бэн Ладэна”, інтануецца імі з драматызмам непапраўных графаманаў. “Цывілізаваны сьвет”, праўдзячы прароцтвы Маклюэна, усё больш нагадвае глядзельную залю правінцыйнага тэатру, збудаванага ад шатні да буфэту паводле сыстэмы Станіслаўскага. Беларусам яшчэ хопіць месцаў на галёрцы, пачакайма трэцяга званка...

Але дарэмна: дапытлівыя беларускія жанчыны ўжо ўступілі ў сьвет татальнай літаратуры. Калі ласка — першыя ўражаньні:

СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ нарадзіўся ў 1973 годзе ў Полацку. Закончыў гістфак Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Выкладаў гісторыю культуры ў Полацкім дзяржаўным унівэрсытэце. Апошняя публікацыя — эсэ “Прастора гераічнага” (часопіс “Правінцыя”, №3 — 4).

новая кніга Ганны Кісьліцынай “Blonde attack”.
Non fiction — стандарт гэтага літаратурнага сэзону. Прафэсіяналы пяра апранаюць запатрабаваны камэрцыйным попытам камуфляж і выходзяць у поле. Ружовыя вушкі трусіка на вокладцы зборніка крытычных эсэ Ганны Кісьліцынай “Blonde attack” могуць падмануць толькі беларускага літаратара, што пэрманэнтна выпадае з кантэксту эпохі. Для назіральнага ж сучасьніка зразумела адразу — гэта маскхалат. Такіх вачэй не схаваеш. Яны нібы з плякату “Родина-мать зовёт”. Пальчыкам. Адназначна моцная заяўка на вокладку “ARCHE” і другі фатаздымак Ганны Кісьліцынай, разьмешчаны ў гэтай кнізе.

У краіне Чорнага Войны, дзе кожны сам за сябе, а навакольле — спрэс партызанскія тылы, дывэрсійныя мэтады апраўданыя. Крытык выйшаў у ружовым маскхалаце на сьцяжыну вайны. Вайны? Хутчэй “ловаў ветру”, што больш адпавядае прыродзе крытычнага занятку. Зрэшты, ловы спэцыфічныя. Калі палюе амазонка, недарэчна наракаць на ўдары ніжэй пасу. Непужаную фаўну беларускага літ-дыснэйлэнду крытык з вачыма Маці-радзімы — гэтага славянскага тыпу фатальнай жанчыны — прыцьвічвае зь лёту. Апэляваць беларускім літаратарам у гэтых варунках застаецца хіба толькі да “Грынпісу”, але ніяк не да гісторыі.
Што было найперш — яйка ці курыца? У дачыненьні да сучаснай беларускай літаратуры гэтае пытаньне разьвязанае адназначна. Першым быў, ёсьць і будзе крытык. “Крытык-жанчына”, удакладняе Ганна Кісьліцына. “Ці не паходзіць слова “крытыка” ад назову востраву Крыт — першарадзімы фэмінізму?” — пытаецца яна на старонках эсэ “Крытыка — жаночая справа”, сеткавая вэрсія якога набыла папулярнасьць і спарадзіла розгалас задоўга да сваёй папяровай публікацыі. Ладная частка імёнаў, што сустракаюцца на старонках кнігі “Blonde attack”, для чытача, неабазнанага ў актуаліях менскага самвыдату, гучыць як адкрыцьцё. Балазе Кісьліцына шчодра цытуе рэцэнзаваных аўтараў. Гэта нагадвае футурызм, той выпадак, калі біяграфія паўстае папарадзе бібліяграфіі. І справа нават ня столькі ў тым, што героі крытычных эсэ Кісьліцынай недастаткова эксплюатавалі друкарскі варштат, колькі ў самой прыродзе іх творчасьці. Вішнёў, Сін, іншыя сябры літаратурнай

суполкі “Бум-бам-літ”, што патрапілі ў калекцыю літаратурных партрэтаў “Blonde attack”, пазыцыянавалі сябе як пэрформэры. Пэрформанс — што дзірка ад бубліка; каб зафіксавацца сэнсам, гэтая пустата вымагае асады “цела” крытыка — крытыка-інсьпіратара, крытыка-супольніка, крытыка-гаспадыні, што смажыць і ўзнагароджвае сваіх пэрформэраў дранікамі. Узнагародніца і ўзнагарода ў адной асобе.
Нават Генры Мілер па-беларуску — гэта Кісьліцына плюс Мілер. Зразумела, у такой пазыцыі шмат самаіроніі, якой вымагае сама тэхніка сучаснага эсэістычнага пісьма, у адваротным выпадку робіцца задужа відавочным першаўзор гэтага жанру на постсавецкай прасторы — расейскамоўныя пераклады ангельскіх эсэ Бродзкага з усёй іх некантраляванай двухсэнсавасьцю.

“Blonde attack” чытаецца як раман. Яго пэрсанажы — “големы” беларускага літаратурнага працэсу. І сама Ганна Кісьліцына выглядае гераіняй сваіх жа артыкулаў. Дакладней, яе роля блізкая да функцыі жыхароў Алімпу ў старагрэцкіх мітах.
У гэтым спэцыфіка прафэсіі крытыка ў параўнаньні з рамяством гісторыка літаратуры. У працы першага значна большую дапамогу можа аказаць уласны дзёньнік, чым архіўныя росшукі. Крытык — прафэсійны сьведка, у ягоным пакліканьні нешта ад абавязку палявога арбітра, арбітра-тарэра. Крытыка і карыда ўжо ніколі ня будуць мужчынскай манаполіяй.
Ёсьць у гэтым і адваротны бок — калі ведаеш чалавека асабіста, пачынаеш шукаць ягонае творчае крэда ў суадносінах паміж колерам вачэй, улюбёным трункам ды норавам ката. Тады лепш пішацца пра рабочы стол, чым пра работы. Тэксты пісьменьніка драбнеюць да пэтыту камэнтару перад ягоным галоўным творам — буднямі. Але Ганну Кісьліцыну цяжка абвінаваціць у браку дыстанцыі датычна аб’ектаў яе прафэсійнай увагі.
Сучасны спажывец набывае, як вядома, разам з рэччу жыцьцёвы стыль, свой новы вобраз. Датычыць гэта і літаратурнага прадукту. Таму літаратар мусіць клапаціцца ня толькі пра пісьмовы тэкст, але і пра этас, жыцьцёвы стыль, што нясе яго кніга.
Калі ж аўтары безбародыя, як у выпадку “Бум-бам-літу”, іх

можна скарэктаваць празь іншыя часткі вобразу. Так паўстае, калі скарыстаць выраз Ігара Бабкова, “новая крытычная парадыгма”.
Дарэмна шукаць тут нейкую беларускую спэцыфіку. Хутчэй, гэта агульнаэўрапейская тэндэнцыя, калі прафэсійныя літаратуразнаўцы робяцца галоўнымі заказчыкамі-праектантамі літаратурнага працэсу. Менавіта як праект, пажаданы сцэнар развою беларускай літаратуры і ўспрымаеш тэксты Ганны Кісьліцынай.
Беларускі крытык, узгадаваны на левых фэнзынах засьцянковай шляхты XIX стагодзьдзя, традыцыйна заідэалягізаваны. Але любая ідэалёгія выглядае сёньня як эксцэнтрыка. Цяжка сказаць, чаго чакае сучасны чытач ад крытычнага тэксту, але адназначна — не правідловага павучаньня. Кісьліцына, якая не злоўжывае займенькікам “мы”, пакідае свайму чытачу выбар. Магчыма, гэта і ёсьць жаночае праяўленьне “элемэнту полу”, прыхільнасьць якому ў літаратуры дэкляруе крытык.
Лютасьць ідэоляга саступае ў творах Кісьліцынай жаночай лютасьці (“Крытыка — жаночая справа”, “Цяжарны супэрмэн”, “Фэмініcтычныя нататкі”). Поўху ад ружовага трусіка, умоўна кажучы, зазнаў не адзін мужчынскі фэйс бел-літ працэсу. А бязь лютасьці няма крытыка, натхненьне — гэта ж у паэтаў. Калі ідэалёгіі цалкам капітулююць, у сухой рэшце тэкстаў застаецца толькі досьвед — агульначалавечы, жаночы, досьвед свабоды і каханьня.
Бліск і галеча сучаснага бел-літу разьмеркаваныя паводле полавай прыкметы. Бліску акурат настолькі, наколькі ў літаратуры прысутнічае жаночага — экстравэртнай скіраванасьці за межы гета. Галеча як спадарожніца пурызму ды аскетызму — цалкам на сумленьні мужчын-літаратараў, што задоўга да нараджэньня знанай авечкі Долі навучыліся памнажаць уласныя шэрагі шляхам ідэалягічнага кланаваньня. Іранічнае азначэньне “цяжарны супэрмэн” (назва аднаго з эсэ Ганны Кісьліцынай) — гучыць у гэтым зьвязку праграмна, як абагульнены вобраз беларускага мужчыны-літаратара.

Можа скласьціся ўражаньне, што крытык “палюе” вылучна на мужчын-літаратараў, але гэта недарэчнае меркаваньне. Вось жа, у эсэ “Што такое каханьне ў параўнаньні зь біфштэксам?” Кісьліцына недвухсэнсоўна выступае на баку Багдановіча-

мужчыны, Багдановіча-хлопчыка, калі заўгодна, і ягонага права на бясшлюбнасьць і бязьдзетнасьць супраць навагаў літаратуразнаўцаў уладкаваць асабістае жыцьцё клясыка пасьмяротна. Ёсьць заканамернасьць — чым больш увагі надаеш літаратарам, тым менш цікавішся літаратурай. Хто цытуе Палуяна? Палуянам трызьняць — здубелым трупам пэрформэра-самагубцы. Мыляць вяроўку. Што прыцягвае больш — "Мадонны" Багдановіча ці яго самотны ложак з угвэзданай крывёю навалачкай? Налятай, яны здохлі. Але жывы графаман, як ні круці, усё ж лепшы за несьмяротнага клясыка: чытач падабае сьвежую кроў, крытык — рабіць балюча.
Літаратуразнаўства забаўлена мінулым. А вакол сучасных твораў пануе напятая цішыня. У гэтым ёсьць заканамернасьць. Талент не належыць сучаснасьці, ён ня наш-ваш, ім цяжка маніпуляваць. У найлепшым выпадку права абмяркоўваць сучасьніка дэлегуецца хранікёрам-Экерманам, прыпісаным за некім да скону, як прыпісваюць дзеншчыкоў. А зазвычай, крытык — гэта прадавец, крэатыўнік, што абслугоўвае часопісныя анонсы. Мо таму С.Дубавец, С.Кавалёў, І.Бабкоў, што вызначалі некалі крытычную моду, урэшце пераквалiфікаваліся.
Творчасьць тых жа Мудрова, Вашка, Сідарука нагадвае гуканьне ў пустату. Нечая пустата часам і зрэзануе — тады зьяўляюцца імпрэсіі-водгукі, якія гавораць збольшага пра сваё, скарыстоўваючы чужы твор як фармальную нагоду азвацца. Дыялёгу не атрымліваецца. Самай вялікай узнагародай аўтару будзе творчы партрэт у "Крыніцы" — як пажыцьцёвая маска натужнага стаўленьня сучасьнікаў, змушаных нешта пра цябе гаварыць. Жывая і неабыякавая, кніга Ганны Кісьліцынай — адна зь нямногіх, якая сапраўды своечасова рэагуе на беларускія літаратурныя актуаліі.
Нашая літаратура ніколі не праходзіла сур'ёзнага выпрабаваньня зорнасьцю. Калі расьцягнуць куміраў на сувэніры, ці застанецца што ад айчыннай літаратуры? Ці перанясе яна, напрыклад, страту Багрымавай жырандолі? Жырандоля Багрыма, вусы Багушэвіча, цнота Багдановіча — гэта, можа, і ёсьць самыя праўдзівыя артэфакты беларускай культуры, астатняе ж, кшталту тэкстаў, — нешта другаснае, як бел-літ — нудны школьны курс, такі ж неабавязковы, як "грамадазнаўства"? Ганна Кісьліцына, эмулюючы для нашых

літаратараў атмасфэру прызнаньня, зьдзяйсьняе цікавы сацыяльны экспэрымэнт. Чакаем працягу.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн і майстраваньне **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Лісты Ларысы Геніюш да Міколы Ермаловіча

“СТУКАЙЦЕ Ў АКНО ЛЯ ГАНКУ”

Паўтысячы кілямэтраў у два бакі мусіў праяжджаць Мікола Ермаловіч, выбіраючыся на пагасьціны да Ларысы Геніюш. На адну дарогу ад Маладэчна да Зэльвы і назад ішоў дзень. Але далёкая дарога гісторыка не палохала. Ён звык пад перастук колаў працаваць, чытаць і нават пісаць, расклаўшы паперы на свабоднай лаўцы. Паводле маіх прыблізных падлікаў, Ермаловіч правёў у электрычцы больш за два гады — 750 дзён, 18 000 гадзін! У Зэльву часам трапляў позьнім вечарам, а то й сярэдначы, калі дабіраўся цягніком. Хату ад няпрошаных гасьцей Геніюшы нанач зачынялі на засаўку. “Стукайце ў акно ля ганку”, — падказвала “пароль” паэтка гісторыку. А ў лісьце да Зоські Верас у 1969 г. дзялілася радасным уражаньнем: “На днях заехаў да нас М.Ермаловіч — ах, які цікавы, харошы, дарагі сябра!” Звычайна стрыманая ў пахвальбе, паведамляла ў Маскву Міколу Ўлашчыку: “Быў у нас сябра М.Ермаловіч. Я слухала яго з захапленьнем!” Геніюш ведала цану Ермаловічавым дасьледаваньням, верыла ў тое, што позна ці рана яны будуць запатрабаваныя грамадзтвам. Так яно й сталася ў 1990 г., калі выйшла “Старажытная Беларусь” і

Мікола Ермаловіч пераехаў жыць у Менск. Аднойчы ён патэлефанаваў мне дахаты: “Я чуў, што вы робіце для “Беларускага кнігазбору” том Ларысы Геніюш. Мы ж амаль суседзі, прыходзьце, маю цікавыя матэрыялы”. Праз паўгадзіны я быў на вуліцы Рафіева, дзе жыў гісторык. У той вечар я атрымаў ад яго неспадзяваны й каштоўны падарунак — 19 лістоў паэткі й некалькі фатаздымкаў, якія зьберагаюцца ў маім хатнім архіве. Усе лісты будуць апублікаваныя ў кнізе эпісталярнай спадчыны Л.Геніюш, якая рыхтуецца да выданьня ў адным зь менскіх выдавецтваў.

Зэльва, 1 красавіка 1974 г.

Шчырапаважаны і дарагі сябра Мікола!

Як маецеся, як Ваша здароўе? Мы тут зусім пасьля нечакана мучыцца з сэрцам. Нічога не парадзіш, няма, бо колькі ж яно можа вытрымаць, гэтае чалавечае сэрца?

Пасылаю вам артыкул нейкага М. Федзюкова з нашай зэльвенскай “Працы”. Хачу, каб мне паясьнілі, чаго не разумею.

Ці белар[ускія] землі ўвайшлі ў склад Вялік[ага] Княст[ва] Літоўскага, ці сяньняшняя Летува ўвайшла ў склад, па сутнасьці, бел[арускага] Княства? Калі ўвайшлі нашыя землі, дык ці ж з прычыны мангола-татарскага іга ў Маскве?

Хто [гэта] — т[ак] зв[аныя] літоўскія фэадалы, якім нашае сялянства мусіла даваць дадатковыя зборы? На якой мове яны гаварылі? А можа, былі каталікамі толькі?

Няўжо ў Вялікім Княст[ве] Літоўс[кім] да канца XIV [стагодзьдзя] існавала паганства? Дык жа сам Ягайла быў хрышчоным праваслаўным князем і насіў імя Якаў!

А Лаўрышаўскі манастыр? А сам Міндоўг?

Чаму рымскаму трону (якому?) удалося падпарадкаваць сабе правасл[аўную] царкву?

Няўжо царкоўнікі ў той час будавалі абарончыя храмы дзеля выратаваньня сваёй маёмасьці? Такія храмы абарончыя — у той час? Калі ласка, паясьнеце мне ўсё гэта, бо запуталася, ніц не разумею!

Весткі, дзе якія, дапаўзьлі і да нас… “Акцёры” дурныя, а той “рэжысёр” прамахнуўся, думаю. Надта ўжо белымі ніткамі шыта. Сяджу і плачу над дурнямі, і ўстыд, што такія родзяцца…

Ваша Ларыса Геніюш.

[1] **Маецца на ўвазе гісторык Іларыён Ігнаціенка (нар. 1919).**

Зэльва, 18 лютага 1975 г.

Дарагі і шчырапаважаны сябра Мікола!

Вось і вестачка ад Вас. Цешуся, што адпачываеце. Хочацца, каб паправілі, падмацавалі сваё здароўе. Пішу да Вас з асаблівай радасьцю, бо здаецца мне, што я вярнулася здалёк. Я моцна хварэла, ня думала, што выжыву. Глядзелі мяне суседкі.

У гарачцы бачыла Ваш твар, такі спагадлівы. Нешта гаварыла ў гарачцы несамавітае, але не пытаюся ў мужа — што. Ён глядзеў толькі сябе, і мне нейк крыўдна. Сяньня ўжо другі дзень выходжу на двор. Слабею і вяртаюся, кладаўлюся. Я, здаецца, яшчэ моцна хворая. Учора на вуліцы нейкая жанчына адабрала мне сумку і занесла на наш ганак, а я памаленьку прыйшла. Найболей мучыла мяне тое, што так мала я напісала ў жыцьці, усяго пару кніжачак для сваяго народу. Мне было б цяжка паміраць, я адчувала гэта фізычна. Але я яшчэ жыву і веру: Вы цешыцеся, што я выжыла. […] Што ў мяне за хвароба — ня ведаю. Такі страшны грып ня мог быць. Мяне ніхто не лячыў. Толькі цяпер атрымоўваю лекі. За дзьве нядзелі ні ад каго не было ні слоўца, толькі сяньня — лісты ад Вас і ад нявесткі. Даруйце, што столькі пішу пра сябе, але я рада, што Вы ёсьць на сьвеце, што хоць нехта аба мне падумаў. Я вельмі рада, што праца Вашая прадаўжаецца. Ёй няма цаны! Бо вартаснае ўсё, што будуецца на фактах, на рэчаістасьці. Па-маяму, Вы добра зрабілі, што зьвярнуліся ў ЦК. Гэта адзіная аб'ектыўная ўстанова дзяржаўнага ўзроўню і разгляду, якая здольная спыніць усялякі самадзейны садызм ігнаценкаў[1]. Якая дзікая, зьвярыная тэндэнцыя: замест дапамагчы чалавеку ў яго досьледах і ў працы — груба спыняць, наклейваць ярлыкі і т. п. І гэта робяць вучоныя? Гдзе ж этыка, гдзе ж дыскусія, безь якое ня можа быць праўды? Навука — гэта не авантура! Цікава мне, які будзе канчатковы рэзультат гэтае справы. Я адурэла ад радыё і тэлеперадачаў. Паважнага нічога не магла чытаць, бо галава слабая. Думаю, што буду жыць… А Вы быццам працягнулі мне руку, каб я ачуняла. Дзякуй за паштоўку, яна цудоўная. Хачу, каб вытрывалі ў Есентуках, бо гэта добра для Вашага страўніка. Як доўга там зьбіраецеся быць? Мару, што заглянеце зноў да нас, калі ў гародчыку зацьвітуць туліпаны. Вы іх у мяне яшчэ ня бачылі. Мне цяпер жывецца спакойней, бо

я закінула зусім літаратуру, але Вы мне і гэта даруеце. Вы — добры і нядрэнна мяне ведаеце. Яшчэ кашляю, але раней было — як раны ў грудзёх. Няхай добра Вам адпачываецца! Падлячэцеся, каб лягчэй працавалася. Уся мая павага і сардэчнасьць — пры Вас.
Ваша Ларыса Геніюш.

Зэльва, 12 красавіка 1976 г.
Дарагі сябра Мікола!
Як жа нядобра, што так псуюцца вочы. Ці нельга нейк запабегчы гэтаму? Што кажуць лекары? Можа, гэта вынікі якога недастатку ў арганізьме, напрыклад, якіх вітамінаў? Што робіце ў гэтым напрамку, каб умацаваць свае вочы? Баюся думаць, што можа стацца… Даруйце ласкава мой крыху сумбурны апошні ліст. Проста мне хацелася сказаць Вам, што і ў цяжкой працы жняі былі свая рамантычнасьць, свая прывабнасьць, як і ва ўсім хоць крыху злучаным з прыродаю. Што датычыць Ф.Янкоўскага, дык добра зрабілі, што не зьвярталіся да яго, бо хто ведае, які ён чалавек, а для адное пагаворкі ці варта турбаваць чалавека. Спадзяюся, што Вы здаровыя і зноў узяліся за працу. У нас па-ранейшаму: хварэем пакрысе абое, але ходзім і працуем. З выдавецтва прыслалі мне карэктуру маёй дзіцячай кніжкі[2]. Надта моцна яе скарацілі, але выйшла няблага. Рэдагуе яе на грамадзкіх пачатках паэтэса Эдзі Агняцьвет, зь якою я нават незнаёмая. Пыталіся, ці не прыеду 26 красавіка па грошы. Выехаць з Зэльвы мне нельга — муж бездапаможны безь мяне. Ды і няма да каго ехаць, бо сяброў у мяне ў Менску няма. Яшчэ ўсё мяне лечаць. Спыніліся сардэчныя прыступы. Дзецям і ўнукам мы паслалі вызаў, але яшчэ няпэўныя, ці яны прыедуць. Жыцьцё нашае стала крыху спакайнейшым, але такое не забываецца. Хочацца мне выехаць з Бацькаўшчыны, каб хоць памерці паміж чэсных і добрых людзей. Не дзівецеся мне, бо гавару Вам тое, што зборнік адчуваю. Здаецца, нікому мы не зрабілі найменшай крыўды, а самыя столькі працярпелі… Пішэце, як Вашыя вочы? Як Вам працуецца? Глядзеце сябе! Едучы міма, не мыляйце нашае хаты. Вельмі хочацца пабачыць Вас ды пераканацца, што вачыма Вашымі яшчэ не найгорай. Муж шле Вам сваю прывітаньні. Жадаем Вам посьпеху ў працы і здароўя выдатнага. Няхай усё ў Вас будзе сьветла і добра.

[2] Зборнік дзіцячых вершаў “Добрай раніцы, Алесь” (1976), прысьвечаны ўнуку.

Вашыя Геніюшы.

Зэльва, 24 ліпеня 1976 г.
Даражэнькія!
Не адказала Вам на ліста таму, што яго не атрымала! Днямі прыйшлі кніжкі (6 экз.), за якія Вам вялікае дзякуй! Сардэчна прашу Вас — дастаньце яшчэ хоць крыху! Мне нават аўтарскіх экзэмпляраў не прыслалі. Надта ўжо скромненькая выйшла кніжка, нічога ня зробіш. Добра, што хоць такая выйшла. Алесіку будзе радасьць і памятка. За ганарар абяцала купіць яму гадзіньнічак. Спадзяёмся, што ў жніўні прыедуць, хоць пэўнасьці няма. Кніжачку маю прадавалі і тут, але мы ня ведалі. Калі даведаліся, дык у кіёску застаўся толькі адзін экзэмпляр. Была толькі ў кіёску. Каб ведалі, як яна мне патрэбная! Муж працуе толькі да 1 жніўня. Вельмі крыўдна, што яго проста груба выкінулі. Дзядочку час даўно адпачываць, але маглі зрабіць крыху далікатней. Будзе труднавата, бо адна пэнсія на дваіх… Толькі ж я ніколі не бядую. Думаю рыхтаваць да друку новую кніжку — для дарослых, але адпадае ахвота. Ёсьць на гэта прычыны. Нейк тут яшчэ трымаемся. Гарачыня ў нас. Я рада, што муж будзе ўдома, хоць ён моцна бядуе. Я цяпер палю гарод, вару, мыю, замятаю. Я ніколі ня мела часу хоць крышачку быць паэтам… Юльяну Сергіевічу[3] перадавайце ад нас шчырыя прывітаньні. Лёс, безумоўна, цяжкі, але, можа, яшчэ ня той дыягназ? Як думаеце? Заставайцеся з Богам і хоць слаўцо напішэце. Муж Вас вітае. З павагай —
Ларыса Геніюш.

[3] Сергіевіч Юльян (1910—1976) — паэт, пачынаў друкавацца ў 1940 г. разам з Л. Геніюш на старонках бэрлінскай газэты “Раніца”.

Зэльва, 16 верасьня 1976 г.

Дарагі сябра Мікола!

Дзякуй, што аказаліся. Я ўжо пачала непакоіцца: ці Вы здаровыя? І так, тое Сочы нічым Вам не заімпанавала? А як

сыну? Трымайцеся і глядзеце здароўя. Цудоўную стацыю (у сэньсе — цікавую) праз матэрыял аб Беларусі ў гіст[орыка] Тацішчава прачытала ў свой час двойчы! Чытаем з мужам кожную нават зацемку, Вамі напісаную. Усюды ёсьць думкі. Галоўнае — як з вачыма? Аб гэтым часта думаю. Справы мат[эрыяльныя] ў нас ня так дрэнныя. Даюць яшчэ 7 руб. з капейкамі на мяне, і разам выходзіць 92 руб. Горай тое, што муж ня ведае меры, калі зойдзе ў кнігарню. Учора прывалок, можа, пуд нейкіх кніг (аддаў 10 руб.!), зь якіх добрыя рэчы былі толькі Сьцяпана Александровіча і нешта для дзяцей Брыля. Часьць зь іх угаварыла панесьці памяняць хоць на Маркса, калі няма ўжо нічога вартага з нашай літарат[уры]. Кілямэтар пёр тыя кніжкі і нічога яму ня сталася, а ўдома адно стогне і енчыць. Абяцаў болей думаць, пакуль нешта купіць. Дарагі мой сябра, вельмі патрэбнае мне “Бел[арускае] нар[однае] адзеньне”[4] (некалькі аўтараў). Ці Вы не знайшлі б які экзэмпляр? Мы выпісалі, але малая надзея, што вышлюць, бо кніга вартасная, а тыраж малы. Дзеці і ўнукі ад’ехалі 22 жніўня. Было даволі весела, але я замучылася, начыста прыстала, бо ўсё даводзілася і даставаць, і прыгатаўліваць, і папратаць самой. Крыху зьдзівіла мяне неімаверная скупасьць і эгаізм дзяцей… Калі яны прыяжджаюць, дык у нас, бедных, заўсёды поўны стол, тады калі ў іх, багатых, толькі herbatka… Ня верыцца ім, што ў нас можа чагосьці бракаваць. А яно і ня вельмі бракуе. Тут патрэбная сякая-такая гаспадарнасьць, ды мы і ня п’ем. Можа, гэта галоўнае. Пісаў сын, што ў іх усе захопленыя [маёй] маленькай кніжкаю, якую павёз з сабою і скупа, як піша, яе дорыць. Найменей ёю захоплены сам Алесь. Яму падабаецца толькі гадзіньнічак. Дзіця яшчэ.[4] **Альбом М. Раманюка “Беларускае народнае адзеньне”** **выйшаў толькі ў 1981 г.**

Сьцяпану хоча быць літаратарам. Думаецца яму, што ён лепшы geniusz[5]. Я яму раджу глядзець болей мэдыцыны, каб ведалі, як змагаецца з сабою, каб ня піць… Жаль на яго. Сапраўды, алькаголь — гэта атрута. Хвароба неабходна лячыць у нашым цэлым грамадзтве. Напішаце, калі б Вас бачыць. Дзякуй, што хоць зусім пра мяне ня ўсе мае сябры наагул… Жывецца крыху спакойней. Ніхто ў нас не бывае. Каб крыху лепшае было здароўе, дык зноў узялася б за пяро. Можа, пачакаўшы. Думаю, што “Помнікі”[6] надрукуюць Вашую гісторыю такой далёкай пары. Навейшай, аб’ектыўнай, можа, і не надрукавалі б. Кніжачка [мая] прадавалася і ў

Зэльве. Першы раз нешта маё тут прадавалася. Алесь надта любіў дарыць “сваю” кніжку. Цяпер ужо яе няма. У нас увесь гэты час было як на поўдні: цеплыня, цішыня, сонца цэлы дзень. Пішэце, як з вачыма і наагул са здароўем? Глядзеце сябе, трымайцеся! Верце толькі сваім вачам і чэсным людзям! Заставайцеся з Богам! Муж сардэчна вітае Вас.
Ваша Л. Г.

[5] Geniusz (польск.) — геній.

[6] Маецца на ўвазе часопіс “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”.

[7] Зінаіда Кадняк — Дочка паэта Алеся Салаўя.

Зэльва, 25 сьнежня 1976 г.
Дарагі і паважаны сябра!
Кніжачку, якая так цікавіла мужа, мы атрымалі. Жонка вялікае. Муж крыху паправіўся. Быў сам у амбулаторыі, сяньня выбраўся да цырульніка. У дзяцей пакуль што ўсё добра. Нядаўна пісаў Міхась. Горай са мною. Маю зламаную нагу ў гіпсе. Хадзіць на мыліцах ня ўмею, і давядзецца месяц не

выходзіць з хаты. Я ўпала з гары. Пасьлізнулася драбіна. Крыху пабілася. Магло быць горай. Бядую не за сябе. Болей за мужа, якому патрэбны догляд кожную хвіліну. Ратуе нас суседка Зося — яна даўно як дочка нам. […] З чэскіх славістаў Белакоз[8] заўсёды цікавіў Ружычка, які, між іншым, пісаў, што Алесь[9] быў вельмі суровыя да сябе. Я многае забылася з 1928 г. — адным з нумароў “Жыцьця літэрацкага” ў Польшчы за 75 год, стацыя “Як з сабою размаўлялі Ягайла і Сонька”, кароткі, каб мне яе прыслалі. Ведаеце, Зофка Гальшанская-Навакоўская, польскіх каралёў. Палякі ўспомнілі аб гэтым у адрэзе рэцэнзіяў на Дні польскай культуры ў Беларусі. Ўдзячна ўспомнілі і падалі ў нумар газэты. Цікава, ці аб’ектыўна гэта прадставілі? Хочацца бачыць Вас, але нават на зварыць чаю, каб пачаставаць Вас… Сумна з усяго, што пачнеш? Стараюся быць спакойнай і думаю, што нейк яно будзе. Яшчэ раз вялікае дзякуй за кніжкі! Я ўжо Ваш даўжнік. Сардэчна вітаем Вас з Новым годам! Заўсёды са шчырасьцю да Вас — Геніюшы.

Зэльва, 11 красавіка 1977 г.

Дарагі і паважаны сябра Мікола!

Дзякуй Вам шчырае за памяць, за кніжачкі, якімі зачытваецца мой муж. Я — меней, бо такі быў час, што і пратала, і пякла, і смажыла. Смажыць, праўда, ня вельмі было што, але што да старых, дык мяса ім супрацьпаказана. Затое ёсьць салодкае. Часта Вас успамінаем і спадзяёмся, што Вы ёсьць і будзеце заўсёды хоць крыху прыхільныя да нас. Мужу зноў горай. Адну ноч было дрэнна зусім, ды і я стала адчуваць, што ёсьць у мяне сэрца. Падводзіць яно мяне, баліць вострым фізычным болем. А як Вашае здароўе, як зрок? Пісала жонка Алеся[7] і прыслала пару здымкаў сваёй новае хаты. Алесь прымае ўдзел у радыёперадачах, якія ў іх цяпер ёсьць і па-беларуску. Крыху меней стаў піць. А вясна надыходзіць паволі і яшчэ халадно. Сын папрасіў, каб прыслалі вызаў для ўсіх. Пішуць, наагул, яны вельмі рэдка. Белакоз[8] ляжыць у Мастоўскай больніцы. Адрэзаў (усадзіў у сячкарню) 4 пальцы на назе і часьць ступні. Моцна сьцёк крывёю. Ніхто ім у больніцы не цікавіцца, хоць ён хворы і на страўнік. Нага гоіцца дрэнна. Хацелася б паехаць да яго, але нельга пакінуць аднаго мужа. Даводзіцца часам выпрошваць

8 Белакоз — **настаўнік і дырэктар** — **Гудзевіцкага** — **літаратурна-** — **этнаграфічнага** — **музэя**

людзей з хаты, калі яны губляюць такт. Муж усё чакае “Фаўста” па-беларуску, але яго ўсё няма ў Зэльве. Немаведама, ці будзе? Калі б Вам трапіў калі ў рукі, дык прышлеце пару экзэмпляраў. Хоць за ранейшыя кніжачкі яшчэ не разьлічыліся з Вамі. Мне здаецца, што паэты старэюць, але талент не падлягае ні старасьці, ні распаду. Як Вы думаеце? Часам так хочацца пагутарыць з Вамі, і калі Вы яшчэ канчаткова не забыліся аб маім існаваньні, дык прыедзьце калі, альбо хоць напішэце аб сталічных навінах. Сяньня пачула такую фразу: “У сяле ўжо мала хто і застаўся, паразьбягаліся, як куры ад шуляка”.
Бывайце здаровыя! Прывітаньні ад мужа.
Ваша Ларыса Геніюш.

Зэльва, 16 лютага 1978 г.
Добры дзень, паважаны сябра Мікола!
З болем паведамляю Вам, што памёр дарагі наш Алесь Салавей. Пахавалі яго 26 студзеня 1978 г. на Беларускім могільніку, як пішуць, “у цудоўную пагоду”. Былі на беразе мора. Алесь паплыў далёка, а назад вярнуўся ўвесь сіні, нежывы… Пісаць мне аб гэтым надта цяжка. Напішу пасьля. Яшчэ памёр і муж маёй дваюраднай сястры Сьцяпан Эдуардавіч Каліноўскі, родам з Мастаўлянаў… Мы тут моцна прыхварэлі. Мяне “сьпяклі” амаль банкамі. Ем адныя таблеткі, часам аж енчу ад болю. Адныя кажуць, што — *отложение солей*, другія — *опоясывающий лишай*, а муж злосны — як гэта я пасьмела захварэць?.. Муж Данусі Бічэль моцна хворы на печань. Яму неабходна ў санаторыю. Ёй адмовілі, бо няможна даць пуцёўку мужу пісьменьніцы, а іначай дастаць ня можа. Дзеці нашыя даўно ня пішуць. Мужа, здаецца, на гэты раз выратавалі. Было яму дрэнна. На маю просьбу прыслалі яму з аблздрава кансультантку, і цяпер ён, як *ветеран труда*, пад апекаю тэрапэўта. Няхай жа будзе лёгкай чужая зямля нашаму Алесю, нашаму Салаўю…
З павагай Л. Г.

Зэльва, 21 кастрычніка 1980 г.
Шчырапаважаны сябра Мікола!
Пішу Вам наўгад. Адрасу Вашага цяперашняга ня ведаю. Дзякуй вялікае за памяць, за тэлеграму на маё 70-годзьдзе, за

“Нёман” і за “Голас Радзімы” ў сувязі з 1000-годзьдзем нашай дзяржаўнасьці. Дзякуй, што хоць Вы адзначылі гэтыя слаўныя ўгодкі. Я ведала пра іх. Гэтая дата — гонар наш і гонар славянства, аб чым забываць нам ніколі нельга хоць бы для адной аб’ектыўнасьці. Ня гуны і ня варвары былі мы ўжо 1000 год таму назад! Усё яшчэ думаю пра сьмерць П. М. Машэрава. Вельмі яго шкадую. Але слухайце, мой сябра, нешта датычнае нашай культуры і гісторыі і Вы са сваёй пільнай увагай вартаўніка нашых слаўных падзеяў упусьцілі. Вось што піша мне здалёк мая маладзенькая сяброўка-студэнтка, беларусачка, народжаная за мяжою: “Месяц таму на адным з унівэрсытэтаў ЗША была наладжаная навуковая канфэрэнцыя з нагоды 450-х угодкаў Літоўскага Статуту. Парадокс часоў і гісторыі, што гэткая канфэрэнцыя не адбывалася недзе на зямлі Беларусі, але ў ЗША. Усіх было 12 рэфэратаў навукоўцаў розных унівэрсытэтаў. Між іншым, пару гадоў таму ўвесь тэкст Статуту быў перакладзены зь беларускае ў ангельскую мову ды выдадзены для навуковых патрэбаў асобнаю кніжкаю”. Думаю, што гэтая вестка будзе для Вас цікавай. Мне цяпер крыху дрэнна. Хацелі пакласьці мяне ў больніцу, але я адпрасілася. Лечаць мяне тут сумленна, колюць бязьлітасна. Жыву амаль аднымі лекамі. Сэрца ня вытрывала… З павагаю да Вас — Ларыса Геніюш.

Зэльва, 11 лістапада 1981 г.
Добры дзень, шчырапаважаны сябра Мікола!
Дзякуй вялікае за мудрую стацью ў “Голасе Радзімы”. Даўно пара было выясьніць слова *Літва*. Гэта гістарычнае паняцьце, менавіта. Вельмі чакала, што адведаеце мяне. Хацелася з Вамі пагаварыць. Чуюся блага. Старасьць перамагае і цела маё, і дух. Цяжкія весткі і такое ж становішча сына і ягонай сям’і ў Польшчы сілаў не дадаюць. Дзякуй за добрае слова пра мае скромныя вершы. Але і такія цяпер ня пішуцца, ды людзям і не да вершаў. Людзі нэрвовыя, задуманыя альбо дакананыя ўсімі пагрозамі, якія нясе нам сучасная цывілізацыя. Плянэта здаецца малой, і раніць яе нідзе нельга. Калі пачнеш думаць, дык верш робіцца проста нэкролягам на заўтрашні дзень чалавецтва. І як і з чаго тут выкрасаць жыцьцядайныя надзеі для запалоханых пагрозаю вайны сэрцаў? Была нядаўна ў

Гудзевічах, гдзе крыху акрэпла ля сваіх добрых людзей і іх працаў у музэі. Праўда, сэрца шчаміла бязбожна заўчасная сьмерць амаль усяго маяго роду, хоць ты крычы… А пакуль на парозе зіма. Абслугоўваю сябе яшчэ сама, і ў хаце маёй цёпла. Мала чытаю. Падводзяць і мяне вочы. Часам заяжджаюць цікавыя людзі — мастакі, архэолягі, паэты, і гэта крыху скрашвае мой шэры быт. Сама я амаль не рушаюся зь месца. Рада, што ёсьць свая хата і што жыву, як хачу. Бракуе мне побач унукаў, але на гэта рады няма. Учора прыслаў мне пару слоў Забэль (Зыгмунт Абрамовіч). Была моцна ўзрушаная яго ўвагай. Час ад часу пішуць і далёкія сябры, якія сэрцам зьвязаныя з роднай нашай зямлёю, і яна для іх — бы алтар. Пражыўшы доўгі час на чужыне, я разумею іх і стараюся ім пісаць, ці хоць якую кніжачку выслаць. Дык чакаю Вас. Стукайце ў вакно, што ля ганку. Да сустрэчы.
Ваша Л. Г.

Зэльва, 24 лютага 1982 г.

Шчырапаважаны сябра Мікола!

Дзякуй Вам за ліста і за старонку з “Голаса Радзімы”, што Вы пішаце, — на вагу золата па сваёй аб’ектыўнасьці, сумленным дасьледаваньні першакрыніцаў. Усё чытаю з захапленьнем, хоць матэрыял гэты крыху ведаю. Буду цяпер чакаць “Полымя”. Толькі не прысылайце, бо нехта мне яго выпісаў, “Маладосьць” і “Беларусь” — таксама. Здаецца, зрабіў гэта нехта з маладых сяброў. Кудраўца ведаю як вельмі саліднага і разумнага чалавека. Ён рэдагаваў маю [кнігу] “Невадам зь Нёмана”. Што датычыць маяго далейшага існаваньня, то яно тут, у Зэльве, робіцца трагічным. Адзінота, наагул, вельмі сумнае явішча, а калі яшчэ чалавек мае адвагу думаць самастойна і жыць па-чалавечы, дык яго зьядуць жыўцом. Я мела тут вялікія непрыемнасьці, хлусьню і правакацыі. Ну, проста тэатр! На шчасьце, і ў гэтым грамадзтве ня ўсе дурні. Таму яшчэ сяк-так трымаюся. Да сына ехаць мне цяжка. […] Мне трэба ехаць да маіх далёкіх сяброў, і я хачу старацца, каб мне дазволілі. Я старая, крыўды нікому не зраблю, але хачу жыць і памерці па-чалавечы. Беларусь стала для мяне болем, ранаю ў сэрцы, маёю пакутаю… Колькі ж можна цярпець без прычыны? Праўды тут не даб’юся, бо ня п’ю гарэлкі, не хлушу, думаю сваёй галавою і жыву, як належыць

9 Зборнік “На чабары” (1982).

чалавеку. Нават не прашу, не хачу грошай, і маіх 33 руб. 75 кап. пэнсіі па с[ьвятой] п[амяці] мужу хапае мне. Такія цяпер не надаюцца, асабліва тут у нас, у Зэльве. Бывайце, сябра. Не забывайцеся пра мяне.
Ваша Ларыса Геніюш.

Зэльва, 18 ліпеня 1982 г.
Добры дзень, паважаны сябра Мікола!
Ліст Ваш дазволілі мне ласкава атрымаць. Не дзівецеся цяпер, што жыць, дыхаць і трываць мне тут несказана цяжка. Вашая вялікая "віна" ў тым, што бераце гістарычныя падзеі і факты зь першакрыніц. Казалі мне, што К. — выжыўшы з розуму яўрэй. Яны прывыклі да штампаў, і ім страх гістарычнае праўды, у якой іх твар — як гультаёў у дасьледаваньні і махляроў — выглядае некрытычна. Сяньня, здаецца, такі час, што можна казаць праўду, і яна на карысьць справе. Я параіла б Вам шукаць самому апоры і дапамогі ў нашым ЦК. Я чамусьці веру ў іх шырокі разгляд і розум. Я не выпісвала кніжкі зь Менску. Прыяжджала Данута Бічэль, якая замовіла мне яе ў Гародні. Як паявіцца там, дык яна мне прышле яе ў большай колькасьці. Пра Купальле і пра тое, што Вам даручана было запаліць вогнішча, я чула ад удзельнікаў. Вельмі ўзрушана гэтым. На ўсялякі выпадак захапеце ў кнігарні яшчэ пару маіх кніжак[9]. У Зэльве іх няма, і я няпэўная, ці будуць. Крыўдна, што знаёмая (жонка А. Салаўя) паслала мне крыху бархату без застрахаваньня. Укралі яго па дарозе, а можа, і ў Зэльве. Аўстралійцы пішуць і дзівяцца нашым парадкам на пошце, гдзе чэснасьці няма і на грош. Мне ўстыдно, бо лічу сябе эўрапейкаю. Для аўстралійцаў гэта незразумела. Яны так пасылаюць заўсёды. Нават джынсы. Як падняць у нас чэснасьць, культуру? Што з гэтага ўсяго будзе? Напішэце мне ласкава заўвагі да маёй кніжкі. Там многа зьменена, нават у сэнсе… Сына і ўнукаў па-ранейшаму не пускаюць. Дажджы ў нас бясконцыя. Настрой у мяне дрэнны, як і здароўе, а лячыцца ня маю ахвоты. Трымаюся крыху. Не зьвяртаю ўвагі на сваіх мучыцеляў. Устыдно мне за іх. Пішэце. Усяго Вам добрага.
Ваша Ларыса Геніюш.

Зэльва, 27 кастрычніка 1982 г.

Шчырапаважаны і дарагі сябра Мікола! **Танк.**
Вялікае дзякуй за ліст. Што да маёй суседкі, дык гэта асаблівая катэгорыя людзей без сумленьня, якімі кіруюць…
Мы церпім гэта ўжо 20 гадоў. Першы раз за ўвесь гэты час дайшло да сваркі. Калі я зьвярнулася, каб мяне ад яе баранілі, дык мела на ўвазе тое, каб баранілі мяне ад большага, ад галоўнага, ад тых, якія ёю кіруюць. Мне патрэбны спакой, і я за яго тут змагаюся. Здароўе маё зусім дрэннае. Зь цікавасьцю прачытала пра М.Пушчына. Што значыць праўдзіва падыходзіць да фактаў гісторыі, да асобаў, каб “хлусьні ды праўдай не назваць”! Жывецца мне цяпер крыху спакойней. Хаджу штодня на ўколы. Наконт сваяго выезду пакуль яшчэ думаю. Я зьвярталася ў гэтай справе да нашага ЦК — як самай высокай і адпаведнай інстанцыі. Учора прыяжджаў чалавек. Нашае ЦК, як заўсёды, аказалася разумным і велікадушным і на гэты раз. Выяжджаць мне ня раяць. Абяцаюць спакой, бясьпечнасьць, друкаваньне і т.п. Я крыху ўзварушана ўсім гэтым. Галоўнае — спрыяльным стаўленьнем да маёй асобы, да чаго я тут не прывыкла. Паглянем, што будзе далей. Тая жудасная ўборная як стаяла, так і стаіць. Над ею тры яблыні. Ад маяго гародчыка яе загарадзілі дошкамі. Ад смуроду не загародзіш… Пакуль што толькі словы харошыя, ну і суседка ўжо не нападае на людзей, якія прыходзяць у мой двор. Мне крыху перасталі рваць нэрвы. Многа выясьнілася з хлусьні адносна с[ьвятой] п[амяці] мужа і маёй асобы. Ня вераць, што ў час акупацыі нават простага слова *немец* не было ў маіх вершах! Не разумеюць, што ў той час можна было цуды напісаць *братом палонным*. Немцы былі занятыя сваімі перамогамі і на скромных беларусаў асаблівай увагі не зьвярталі. А вершы, а роднае слова, а цеплыня, а праўда былі патрэбныя людзям. Я зьявілася вельмі нечакана, сьмела, натхнёна. На мяне тады казалі — Жанна д’Арк. Усе прыяжджалі ў Прагу паглядзець — якая я і хто я. А беларуская чысьціня душы прарвалася ў горы і біла фантанам у цяжкі той год. Так, мусіць, было трэба. Але навошта, каму патрэбна мучыць мяне за гэта і сяньня? Я была з Заходняй Беларусі, і нормы думаньня сав[ецкіх] людзей мяне не абавязвалі. Яны мне былі чужыя. У Чэхах я сустрэла свабоду і дэмакрацыю і захаплялася ею. У Польшчы я такога ня бачыла.
У высокакультурнай Эўропе наша, тады толькі народная,

культура здавалася мне ня горшай! Тое, што я вынесла ад маіх бацькоў, кранала сэрцы разумных, сапраўдных людзей і ратавала мяне. Такі быў мой лёс. Усё гэта было мне наканавана. Мяне за апошні час давялі да бясьсільля. Ведалі, што робяць. Я ўжо ня здольная ўзьляцець на прывычную мне вышыню. Калі сапраўды дадуць мне спакой, дык буду дажываць у сваёй хаце свой пакутны век. Такія цяпер маі думкі. Ад дзяцей з Польшчы няма ніякіх вестак. Няма ні слова ад харошага М. Т.[10], які нядаўна там быў. Кругом поўная адзінота. Я вельмі хацела б, каб Вы зьвярнуліся да маіх знаёмых у Баранавічах на адрас: Баранавічы-7, вул. Вільчкоўскага, 98, 225320, тэл.: 7-58-66, Кароль Усевалад Сямёнавіч. Ягоная жонка — сумленны і выдатны акуліст. Я думаю, што яна мала горшая ад др. Бірыч. Я Вас прашу зьвярнуцца да іх ад маяго імя. А пасьля прытрымоўвацца яе парадаў. Зваць яе Екацярына Анатольеўна Кароль. Застаюся са шчырай павагай да Вас — Ларыса Геніюш.

Зэльва, 20 студзеня 1983 г.

Шчырапаважаны сябра Мікола!

Шкада, што не змаглі заехаць да мяне. Вельмі непакоіць мяне стан Вашага здароўя. Перадусім — вочы. Дзякуй вялікае за “Нёман”, за тое, што веды Вашыя дазваляюць [ня толькі] ацэньваць працы аб нашай мінуласьці, але і рашуча карэгаваць закаранелыя памылкі аўтараў, падобных Гурэвіч[11]. Сапраўды, Міндоўг быў перабежчыкам, а прыняўшы хрысьціянства і стаўшы князем Навагародка, мог заваёўваць Літву і інш[ыя] землі. Толькі непасрэдны зварот да летапісаў не дазволіць фальшаваць гісторыю. Богу дзякаваць, што Вы можаце сказаць праўду ў падобных пытаньнях. Чакаю Міхася Казлоўскага, але не прыяжджае нешта. Тое, што ён — Ваш прыхільнік, шчыра адчыняе яму дзьверы ў маю хату. Іначай я крыху баюся людзей, бо мела магчымасьць пераканацца... Зь ненавісьцю ж, калі наглядаю розныя хітрасьці і камбінацыі, калі людзі перастаюць быць людзьмі, і балюча мне робіцца з гэтага. Я хацела б дапамагчы кожнаму чалавеку чэсна і дастойна пісаць кароткае жыцьцё, а не наадварот. Я поўнасьцю адмаўляюся сваі ўчынкі, згодныя з маім сумленьнем, таму не баюся, але агідна мне сустракаць розную маральную нечысьць на рацэнзію ку. Дрэнна мне са здароўем, і мая трагічная адзінота ніводна на ім

[11] **Гурэвіч Фрыда (1911—1988)** — **археолаг і гісторык. М. Гумаловіч напісаў рацэнзію ку. яе кнігу**

адбіваецца. Было вясельле хрышчонага сына, гучнае вяселле. Я вытрывала на ім толькі дзякуючы ўколам хуткаю дапамогі. Сын, нявестка і ўнукі пішуць. Міхась аж рвецца сюды, а хлопец ён вельмі салідны. Вучыцца цяпер на 4-м курсе вэтэрынарыі ў Сельскагаспадарчай Акадэміі ў Ольштыне. Бывае і яму нялёгка, але мы ўсё спадзяёмся на лепшае, на болей разумныя парадкі ў сьвеце, на сустрэчу. Са шчырай павагай да Вас —
Ларыса Геніюш.

“Древний Новогрудок”. (1981)

Прадмова, публікацыя і камэнтары Міхася Скоблы

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатkу СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Анатоль Сідарэвіч

Дзе другі рукапісны зборнік вершаў Лясное Кветкі?

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ — філёзаф, літаратуразнаўца. Сталы аўтар «ARCHE». Апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул “Правобраз Акту 25 Сакавіка” (ARCHE, №2 2003).

У 1992 годзе ў Лёндане выйшла кніжачка Ларысы Геніюш “Вершы: Рукапісны зборнік з 1945—47 гг.”. У ёй зьмешчаны 41 твор паэткі. Сам рукапісны зборнік захоўваецца ў Беларускай бібліятэцы імя Ф.Скарыны.

Асобныя вершы з гэтага зборніка былі перадрукаваныя ў пазьнейшых выданьнях твораў паэткі: “Выбраныя вершы” (укладаньне Міколы Раманоўскага, Менск, 1997); “Выбраныя творы” (укладаньне Міхася Скоблы, Менск, 2000).

У камэнтарах да вершаў са зборніка “Выбраныя творы” М.Скобла піша, што шаснаццаць вершаў, пачынаючы з “Кусочка неба”, друкуюцца паводле лёнданскага выданьня, “дзе былі апублікаваны ўпершыню”. Пазьней сам камэнтатар меў магчымасьць пераканацца ў тым, што ягоная інфармацыя няслушная: некаторыя вершы, надрукаваныя ў лёнданскім зборніку, упершыню ўбачылі сьвет на 43—39 гадоў раней. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова пагартаць часопіс “Баявая

[1] Запруднік Я. Дванаццатка: Дакумэнтальная аповесьць пра дванаццацёх беларускіх хлапцоў у Нямеччыне, Вялікабрытаніі й Бэльгіі (1946—1954). Нью-Ёрк: Беларускі Інстытут

**Навукі
й Мастацтва,
2002.**

[2] *“Ідзі супраць долі”* — гэты верш надрукаваны ў ВТ пад загалоўкам “*Іду супраць волі свае нецьвяроза…”**

[3] *“Заўчора”* — гэты верш надрукаваны ў Лнд пад загалоўкам “Заўтра”.

Як бачым, у двух эмігранцкіх часопісах былі зьмешчаны 12 вершаў паэткі, якая знаходзілася ў гэты час за калючым дротам. У “Баявой Ускалосі” (№2) паведамлялася: “Гэтыя вершы “Б.У.” атрымала апошнім часам немаркаванай поштай з-за “зялезнай заслоны”, дзе нашыя браты вядуць несупынна барацьбу з акупантам”. Часопіс “Наперад!” паведамляў чытачам, што ён друкуе “вершы з Бацькаўшчыны”. Творы, зьмешчаныя ў №1 “Баявое Ўскалосі”, датаваныя

1947 годам, пад творамі ў №2 даты няма, а пад вершам “Кір” (№3) пазначана: “Конц. Маскоўшчыны, 1949” (скарот “конц.” расшыфроўваецца як канцлягер). Пад яшчэ адным вершам у тым самым нумары — “Заўчора” (у лёнданскім зборніку — “Заўтра”) — стаіць: “Конц. на Ўрале, зіма 1949 г.”. Ведама, гэтыя дзьве даты адразу ж спараджалі недавер: як тыя вершы маглі трапіць з канцлягеру за межы СССР? Пытаньне пра час напісаньня “ўскалосеўскіх” і “наперадаўскіх” вершаў разьвязалася з выхадам лёнданскага выданьня — гаворка ідзе пра рукапісны зборнік Л.Геніюш 1945—1947 гадоў.
У лёнданскім выданьні таго самага зборніка рукапісаў чамусьці не пазначана, калі той ці іншы твор апублікаваны ўпершыню. Цяпер мы можам сказаць, што прынамсі восем вершаў убачылі сьвет у 1949—1953 гадох. Але па-за лёнданскім выданьнем апынуліся яшчэ чатыры вершы, апублікаваныя ў “Баявой Ускалосі”. Гэты факт прымушае нас прызнаць слушнасьць рэдактарскае нататкі пра Лясную Кветку ў канцы першага нумару “Баявое Ўскалосі”. У той нататцы — на старонцы “Нашы аўтары” — чытаем: “Лясная Кветка — здольная паэтэса. Мае зборнік друкам і два зборнікі, падрыхтаваныя да друку”. “Зборнік друкам” — гэта кніжка “Ад родных ніў” (1942). Адзін із зборнікаў, падрыхтаваных да друку, выйшаў у 1992 годзе. Паўстае пытаньне: а дзе другі рукапісны зборнік?
Ёсьць таксама і іншае пытаньне: адкуль рэдактару “Баявое Ўскалосі” было ведама, што паэтка падрыхтавала да друку два зборнікі? Хочацца даведацца яшчэ наступнае: як і ад каго творы Лясное Кветкі трапілі ў рэдакцыі часопісаў “Баявая Ўскалось” і “Наперад!”? І апошняя пара пытаньняў: як і ад каго адзін з двух рукапісных зборнікаў трапіў у Бібліятэку імя Ф.Скарыны? (У прадмове да лёнданскага зборніка праф. Арнольд Макмілін піша, што рукапіс апынуўся ў распараджэньні бібліятэкі ў 1988 годзе, аднак не называе яго ранейшага ўладальніка.)
Ёсьць чатыры магчымыя шляхі пошуку адказаў на пастаўленыя пытаньні.
Першы: зборнікі Л.Геніюш перад яе арыштам трапілі на Захад дзякуючы камусьці зь беларусаў, якія ўцякалі з Чэхаславаччыны перад ці адразу пасьля камуністычнага перавароту. Гэты “хтосьці” мог перадаць вершы ў рэдакцыі часопісаў “Баявая Ўскалось” і “Наперад!”.

Другі магчымы варыянт: зборнікі трапілі на Захад праз брытанскага падданага Сыднэя Аларда — прыяцеля брата паэткі Аляксея Міклашэвіча, які па вайне жыў у Вялікай Брытаніі. Ва ўсякім разе вядома, што Л.Геніюш пасылала брату “пачатак свае кніжкі” зь вершамі пра Беларусь[4].

Трэці варыянт: імаверна, што пра два рукапісныя зборнікі Лясное Кветкі ведаў Часлаў Найдзюк. Наконт гэтага ён даў падказка ў камэнтары да вершу “Іду супраць долі нецьвяроза...” (у “Баявой Ускалосі” — “Ідзі супраць долі”). У камэнтарох да кнігі выбраных твораў М.Скобла пасля верш друкуецца “паводле аўтографа, перададзенага ўкладальніку Янкам Запруднікам”. Далей адзначаецца, што пасьля тэксту вершу, датаванага 17 ліпеня 1947 году і падпісанага крыптонімам *Л.Г.,* “ідзе напісаны паэткай ліст да Часлава Найдзюка”. З гэтых інфармацыяў можна зрабіць выснову, што перад самым камуністычным пераваротам у Чэхаславаччыне або адразу пасьля яго Л.Геніюш магла пераслаць свае рукапісныя зборнікі на Захад, дзе тады жыў Ч.Найдзюк. Найдзюк, які ня мог ня ведаць С.Хмару, мог пераслаць рэдактару “Баявое Ўскалосі” копіі сямі вершаў. Ня выключана, што яшчэ адзін верш з другога зборніка (“Непасланаму”[5], надрукаваны ў 1948 годзе ў часопісе “Сакавік”), у рэдакцыю таксама перадаў Ч.Найдзюк.

Чацьвёрты варыянт: зборнікі Л.Геніюш пасьля яе арышту перахоўваліся ў Чэхіі. Пра гэта ўскосна паведамляецца ў лісьце паэткі да Міколы Прашковіча[6]. У тым лісьце паведамляецца што ў 1963 годзе людзі зь Менску выйшлі на знаёмцаў Геніюшаў у Празе і, пакінуўшы расьпіскі (“паквітаваньні”), забралі ў іх каштоўныя дакумэнты, рэчы й вершы паэткі. У ліку рэквізаваных твораў Л.Геніюш называла сваю паэму пра Рагнеду. Ня выключана, што тады быў рэквізаваны другі рукапісны зборнік вершаў і што гэта ён значыўся ў каталёгу асабістае бібліятэкі палкоўніка КДБ А.Даніліка пад загалоўкам “Зь неапублікаванага” і ацэньваўся ім у адзін савецкі рубель. Картку з таго каталёгу бачыў М.Скобла, але пабачыць сам зборнік яму не ўдалося: недзе зьнік. З усяго гэтага можна таксама зрабіць выснову, што адзін зборнік (мы назвалі яго першым) у Чэхіі ацалеў і ў 1988 годзе трапіў у Бібліятэку імя Ф.Скарыны.

[4] **Л. Геніюш. Выбраныя творы. Менск: “Беларускі кнігазбор”, 2000, С.341.**

[5] **Гэты верш надрукаваны ў ВТ.**

Калі рукапісныя зборнікі Л.Геніюш перахоўваліся ў Чэхіі, апраўданаю ўяўляецца прыпіска ад рэдакцыі “Баявое Ўскалосі” пра тое, што яна атрымала вершы Л.Геніюш з-за “зялезнай заслоны”. Але й тут паўстае пытаньне: ці мог той праскі захавальнік рукапісных зборнікаў высылаць копіі вершаў Л.Геніюш на Захад, у беларускія часопісы? Якім чынам гэтыя творы апынуліся ў рэдакцыі часопісу “Наперад!” і былі апублікаваныя як “вершы з Бацькаўшчыны”, верагодна, здолеюць паведаміць нам ягоныя аўтары й рэдактары Яны Запруднік, Паўла Урбан ды Васіль Шчэцька. А як вершы рукапісны зборнік Л.Геніюш апынуўся ў Лёндане, мабыць, падкажа нам а. Аляксандар Надсан.

6 Л.Геніюш. Выбраныя творы. С.511—513.

Сяньня ж відавочна, што перад тымі, хто дасьледуе жыцьцёвы і творчы шлях Л.Геніюш, стаіць даволі складаная праблема. Гэта — без уліку таго, што па ўсім сьвеце (у Эўропе, Амэрыцы, Аўстраліі) раскіданыя лісты паэткі зь ейнымі вершамі.

А пакуль дасьледнікі будуць шукаць адказы на пастаўленыя пытаньні, прапаную чытачам вершы Лясное Кветкі, апублікаваныя ў “Баявой Ускалосі” і з таго часу нідзе не друкаваныя. Вершы, магчыма, з таго, зьніклага, другога рукапіснага зборніка.

Ларыса Геніюш

Пяць сыноў

Абліччам сьляза за сьлязою цячэ,
На вузкіх кроснах маці кужаль тчэ.
За акном гудуць вятры шумныя,
Тканьне цяжкае, думы думныя...
Было сакалоў-сыноў калісь пяць.
Было на каго старой маці ткаць,
А цяпер, ткучы, агартае жаль —
Чатырох ужо ў зямлі ляжаць.
— Той старэйшы быў надта вучаны,
Бараніць хацеў край замучаны.
Але сьмеламу быў падцяты лёт,
Без пары сынок пад сасонку лёг...
Тым шляхом яго, крывёй вышытым,
Долю здабываць пайшлі іншыя.

Усё ж народнага гора не змаглі,
На грудзёх зямлі, як дубы, ляглі,
Не заручаны, не жанатыя,
У барацьбе сьвятой рана сьцятыя.
І чацьвёртага павялі на ўсход,
Жаль крышыці дзесь аб сібірскі лёд.
— Можа, матчына пража зрэбная
Ўжо няшчаснаму й непатрэбная...
Калісь сыноў-сакалоў было пяць,
Было на каго старой маці ткаць...
А цяпер з усіх жыў усяго адзін,
Сьвежы, як раса, наймалодшы сын.
Дзіўны кліч з гары да яго прыйшоў —
Адляцеў шляхом сакалоў-братоў
Бараніці край, варагоў спыняць,
За народ за свой галаву аддаць...
— Матуля, ня плач. Трэба хутка ткаць,
Няма сыну чым раны завязаць.
Голаў пахіліў на руках сяброў,
Расьсяваючы на палоскі кроў.
Енку не чутно, хоць і боль у грудзёх,
Толькі дзесь шуміць горда родны сьцяг,
Уздымаецца ўсьцяж вышэй угару,
А пад ім устае Маці Беларусь.

На прадзедаў зямлі

Мы ў родную ральлю
ўрасьлі душы карэньнем,
стаім, як мур,
на прадзедаў зямлі.
Нам хмары сонца
не закрыюць ценем,
так будзем жыць,
як калісьць жылі.
Расстаўся ўжо адчай
з страхою саламянай,
супольна сочым усе
за хмараў чарадой.
Мір'ядамі лучын

гарыць ужо змаганьне.
На варце — з мук
народжаны герой.

Кліч Пагоні

Вы песьняў цікавейшых хочаце, ірдзівых,
у якіх ня ўняць красы і ня ўглыбіць дна;
вы новых хочаце мастацкіх пераліваў,
якіх людзкому сэрцу не абняць.
Ня дам вам іх. Ня ўмею болей слухаць
і водгульле лавіць з туманаў небыцьця
ды зьліцца зь ім у паднеб'і творчым духам
ня ўмею больш, бо прада мною сьцяг.
Здаецца мне: на аксамітных гонях
ля беламурых мест у тумане
празь пену хмар ляціць стралой Пагоня,
а мужны рыцар кліча і мяне.
Лепш голаў буйную за волю нам пакласьці,
душу чым гордую ў няволі загубіць.
Каб сонцам заўтра нам сьмяялась шчасьце,
Радзіму сяньня в ы й ш л і бараніць.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/07/05**
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 3 (26) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]
[image]

мастак. І абавязкова з палітычным кантэкстам — дадасьць сёй-той. Падобна, гэтае слова ў нас абазначае ня столькі від выяўленчага мастацтва (чым пэрформанс ёсьць сапраўды, нароўні з графікай, інсталяцыяй, аб'ектам і г.д), колькі радыкальны спосаб камунікацыі чалавека і грамадзтва. Пэрформанс узьнік ужо ў той час, калі тэорыя мастацтва страціла ўсялякую надзею зацугляць альбо хаця б больш-менш дасканала сыстэматызаваць практыку, а фундамэнтальнасьць "агульных сьцьверджаньняў" пачала няўмольна сыпацца пад ударамі "прыватных выпадкаў". Таму бальшыня тых, хто нешта чуў пра мастацтва дзеяньня, маюць уласнае меркаваньне наконт таго, чым яно ёсьць. І ці ня ў кожным друкаваным выданьні, дзе аглядаецца гэтая тэма, можна сустрэць адрознае ад усіх іншых яе азначэньне.
Дзеля таго каб не працягваць гэтай традыцыі ды не выдумляць новага, скарыстаемся ўжо існым. Паводле расейскай энцыкляпэдыі *"Культурология. XX век"*, пэрформанс — гэта *публічнае стварэньне артэфакту па прынцыпе сынтэзу мастацтва і не-мастацтва, якое не патрабуе спэцыяльных прафэсійных уменьняў і не прэтэндуе на даўгавечнасьць. Ягоная эстэтычная адметнасьць — акцэнт на першаснасьці і самадастатковасьці творчага акту як такога*.
Пад *не-мастацтвам* тут маецца на ўвазе выкарыстаньне пэрформэрамі тых прадметаў альбо наагул сфэраў чалавечай дзейнасьці, якія ня маюць першаснага мастацкага значэньня і набываюць яго хіба праз сваю ўключанасьць у мастацкі твор. Напрыклад, вазок угнаеньняў, падараваны Алесем Пушкіным Аляксандру Лукашэнку на пяцігадовы юбілей ягонага прэзыдэнцтва.

Што розьніць пэрформанс ад іншых відаў сучаснага мастацтва (інсталяцыі, рэды-мэйду і г.д.)?
Перадусім гэта ўжо памянёная вышэй *першаснасьць творчага акту*. У тых відах мастацтва, што ўзьніклі да (і пасьля) пэрформансу, творчы працэс разглядаўся ня болей як сродак атрыманьня самога твору. І менавіта апошні выносіўся на суд публікі. Мастак-жывапісец працуе ў цішы сваёй майстэрні, літаратар дзясяткі разоў перапісвае ўласны тэкст дзеля таго, каб урэшце атрымаўся шэдэўр. І толькі тады, калі доўгачаканы вынік дасягнуты, можна сьцьвярджаць, што мастацкі твор

нарадзіўся.
Для тых, хто займаецца пэрформансам, — як для героя анэкдотаў паручніка Ржэўскага — важныя ня “дзеці”, але сам працэс. Гэтыя мастакі не вырабляюць прадукцыі ні ў якім выглядзе (і апошнім сёньня шмат хто ганарыцца, бо калі няма прадукцыі, яе аніяк нельга прадаць — адсюль бадай апрыёрная некамэрцыйнасьць). Хаця, па вялікім рахунку, такое мастацтва таксама можа (ці нават павінна) быць вынікам пэўнай унутранай працы свайго аўтара[1].

Чым адрозьніваецца пэрформанс ад гепэнінгу?
Паняцьці амаль сынанімічныя. Адзінае, што ў другім заўсёды прымае ўдзел публіка. Прычым гледачы там нярэдка маюць абсалютна такія самыя правы, як і аўтары, і могуць у поўнай меры ўплываць на разьвіцьцё падзеяў. У адрозьненьне ад пэрформансу — мастацтва больш аўтарскага.
Ужо самое значэньне слова *“happening”* (з англ. *здарацца, адбывацца*) намякае на мастацкі акт, які зьдзяйсьняецца тут і цяпер ды мае збольшага імправізаваны характар. Гэта тэатральная (ці музычная, ці літаратурная) дзея, адна з мэтаў якой — наданьне пэўнаму часаваму адмежку альбо кантэксту іншым фрагмэнтам рэчаіснасьці статусу артэфакту мастацкага твору. Намер яе аўтараў — “узяць у дужкі” фрагмэнты і адасобіць ад астатніх падобных. Узьнікненьне гепэнінгу было яшчэ адной вяхой на шляху перакідваньня мяжы паміж мастацтвам і рэчаіснасьцю.
“Хросным бацькам” гэтага віду мастацтва лічыцца амэрыканец **Алан Капроў** (ён вынайшаў гэтае паняцьце ў 1958 годзе), аднак і да яго падобныя ідэі прыходзілі ў галаву амэрыканскаму мінімалісту Джону Кейджу ды мастаку Робэрту Раўшэнбэргу. Яшчэ ў 1952 годзе тыя ідэі былі рэалізаваныя ў вядомых акцыях, на адной зь якіх “гепэнінгісты” давялі ўдзяркнуты раяль — гэта таксама ўдарны інструмэнт.
У адрозьненьне ад пэрформансаў, гепэнінгі часьцей праводзяцца не ў галерэях, а “ў натуры” — на вуліцы, у супэрмаркеце, на сьметніку і г.д. Для іх асяродзьдзьдзьд

і шызоідная мастацкая гіпэракцыя з выразным палітычным падтэкстам, што адбылася ва Ўроцлаве ў 1987—1989 гадах. Замест сур'ёзных і таму нуднаватых пратэставых мерапрыемстваў, завадатары "альтэрнатывы" наладзілі нешта прынцыпова іншае: яны прапускалі празь мясарубку дэканструкцыі панылы сацыялістычны лад жыцьця, ператвараючы яго ў карнавал. Калі на 7 лістапада ў горадзе зьяўляліся натоўпы апранутых у бутафорскія строі матросаў ды рабочых маладых людзей, якія крочылі пад лёзунгам "Власть — народу", нават паліцыя разумела, што і да чаго.
І, арыштоўваючы "рэвалюцыянэраў", ставіла апошнюю кропку, даводзячы сытуацыю да абсурду.
Паколькі тэрмін "гепэнінг" зьявіўся раней за тэрмін "пэрформанс", сьпярша ім акрэсьлівалі і тое, што пасьля стала кваліфікавацца як пэрформанс. А потым наадварот: слова "гепэнінг" выйшла з моды і цалкам замянілася ва ўжытку словам "пэрформанс".

Пэрформанс — гэта не тэатар?

Пэрформанс і тэатар — гэта розныя віды мастацтва, кожны зь іх разьвіваецца па сваіх законах. Розьніца тут нятрудна ўбачыць, што рэпэтаваць свае дзеі некаторыя пэрформэры і тое, нядобрым тонам. У тэатры[2] актор мае пэўную ролю, ёю ён атрымлівае і сваё альтэр эга. Такая сытуацыя нівэлюе ягоную індывідуальнасьць. А мастакі-пэрформэры настойваюць, што ім удалося пераадолець гэтую "гульню" дзеля захаваньня "рэальнай экзыстэнцыі", кажучы, падчас сваіх выступаў яны ўсё ж застаюцца сабою і выражаюць *свае* пачуцьці альбо думкі — сродкамі дзеля выяўленьня чужых.

[2] Маюцца на ўвазе тэатры, дзе ролі выконваюць прафэсійныя акторы, а не аматарскія і эксперыментальныя калектывы, дзе ролі часта выконваюць бяз папярэдняй падрыхтоўкі першых, і другіх, робяць зазвычай непрафэсійна і блытаюць даволі прадмету гаворкі.

Што такое боды-арт?

Паняцьце было ўведзенае ва ўжытак паралельна з тэрмінам "пэрформанс", і па сваіх значэньнях яны спачатку былі вельмі блізкія.
Тое, што разумеецца сёньня пад "боды-артам", таксама асацыюецца ў людзкой сьвядомасьці з камэрцыйным матываваным працэсам нанясеньня фарбы на аголеныя целы мадэлек і дэманстрацыяй гэтых самых размаляваных целаў перад паўп'яной аўдыторыяй у начным клюбе. Аднак насамрэч

тэрмін ня толькі больш шырокі ды ўнівэрсальны, але і паходзіць зь іншай “опэры” — ультрананканфармісцкага мастацкага кантэксту шасьцідзясятых. Боды-арт — гэта ня від мастацтва, а мастацкі кірунак, прадстаўнікі якога выкарыстоўваюць цела ў якасьці асноўнага выяўленчага сродку. І самі творы, прыналежныя да яго, могуць быць пададзеныя ня толькі ў выглядзе пэрформансу, але таксама і як інсталяцыі, фатаграфіі, мультымэдыйныя праекты і г.д. Цялеснасьць заўсёды цікавіла мастакоў-пэрформэраў — альбо, прынамсі, вымагала ад іх выпрацоўкі пэўнага да сябе стаўленьня. Іначай і быць не магло: уласнае тулава стала для іх асноўным “інструмэнтам”. І менавіта дзякуючы яго выкарыстаньню пэрформэры адлюстроўвалі самыя розныя тэмы: жыцьця і сьмерці, матэрыяльнага і нематэрыяльнага, асобы і грамадзтва[3].

Хтосьці з мастакоў узьвялічваў уласнае цела, выяўляў ягоную прывабнасьць ды сэксуальнасьць, а хтосьці, наадварот, акцэнтаваў увагу на яго недарэчнасьці. Вельмі часта экспэрымэнты над уласным целам нагадвалі забавы мазахістаў. Тэма пераадольваньня межаў болю і цярпеньня была адной з магістральных у той час. Піянэрка боды-арту **Джына Пан** на сваіх першых пэрформансах (пачатак 60-х гадоў) паласавала ўласнае цела лязом, і пасьля гэтага падобны экстрэмальны досьвед паўтарылі безьліч мастакоў.

Калі ўзьнік пэрформанс і што на гэта паўплывала?

Гісторыя ўласна пэрформансу пачалася ў 60-я гады. Але ягоная перадгісторыя куды даўжэйшая. Да яе спрычыніліся ўсе тры найбольш уплывовыя авангардовыя кірункі пачатку стагодзьдзя — футурызм, дадаізм і сюррэалізм. Варта прыгадаць першую ў гісторыі мастацтва акцыю, зьдзейсьненую па-за межамі галерэй і тэатральных заляў, калі дадаісты выйшлі на вуліцу прадаваць разнастайныя сувэніры (кавалкі тканіны з дурнымі фразамі, размаляваныя пяціфранкавыя банкноты, кардонныя фалясы). Пазьней гэтая ідэя знойдзе шмат пасьлядоўнікаў[4].

У ліку непасрэдных папярэднікаў варта спамянуць “поп-артыстаў” зь іхнімі гепэнінгамі ды любоўю да *не-мастацкіх* прадметаў (згадайма знакамітую бляшанку Ўорхала) ды створаную ў 1954 годзе японскую арт-групу **«Гутай»**.

[3] Цікавую інтэрпрэтацыю займелі падобныя тэндэнцыі ў 80-я гады ў творчасьці мастакоў з Усходняй Эўропы (напрыклад паляка Ежы Трушкоўскага). Яны праводзілі паралелі паміж канкрэтнай праявай жорсткасьці (надрэз на скуры) і не настолькі матэрыялізаванай, але ўсё ж існай жорсткасьцю таталітарнай сыстэмы.

[4] Напрыклад, акцыя Артура Клінава падчас фэстывалю беларускага мастацтва ў Познані (сакавік, 2000). На старавечным рынкавым пляцы гэтага места мастак прадаваў рэчы, якімі, на ягоную думку, можна ахарактарызаваць сёньняшнюю сацыяльна-палітычную сытуацыю ў Беларусі: гранёныя шклянкі, гарэлку, вечкі для ўнітазу з партрэтамі… аднаго палітыка і г.д.

Якія мастакі-пэрформэры самыя вядомыя?

Іў Кляйн. Гэты знакаміты французскі мастак зьявіўся ў пэрформансу дзеля “спантанізацыі” творчага працэсу, пашырэньня рамак другога віду мастацтва — жывапісу, яшчэ толькі пачыналі лічыць, што ён безнадзейна “абрэкцыённы”. У кожным падручніку па мастацтве ёсьць згадкі пра “Антрапамэтрыі” — шэраг акцый (1958—1962), падчас якіх Кляйн ствараў свае палотны з дапамогай запэцканых фарбе аголеных натуршчыц. Ня менш вядомая і ягоная “Сінфонія пустэчы” (1958), калі некалькі тысячаў гледачоў прыйшлі на адкрыцьцё, мусілі задаволіцца голымі сьценамі галерэя нават прадала пару-тройку “няісных” твораў.

Ёзэф Бойс. Менавіта гэты нямецкі мастак быў першым, хто стаў акцэнтаваць увагу на творчым працэсе, а не канчатковых творах. Усё ягонае жыцьцё называюць вялікім пэрформансам. Калі верыць самому Бойсу, ён стаў успрымаць жыцьцё як пэрформанс падчас другой сусьветнай вайны. Яго самалёт быў зьбіты над савецкай тэрыторыяй, і паранены мастак выратавалі ад вернай сьмерці крымскія татары — прайшоўшы адным ім вядомым цудадзейным лекам з тлушчу і фэтраў. Гісторыкі мастацтва трохі сумняюцца ў праўдзівасьці гэтай прыгожай гісторыі, але ёй, адлюстраванай у многіх бойсаўскіх твораў, ужо нічога не пагражае.

Бойс належаў да міжнароднага мастацкага руху Фluxus, пачатак якому быў пакладзены ў 1961—1962 гадах, і ягоны прыпаў на сярэдзіну дзесяцігодзьдзя.

Найбольшую вядомасьць з гэтага кола мастакоў набыла **Ёка Она**. І, насуперак надоечы выказанаму ў «НН» меркаваньню Адама Глёбуса, найлепшым ейным творам, мусіць, быў усё ж ня шлюб з Джонам Ленанам, што зрабіў яе імя вядомым для ўсіх. І нават ня тыя акцыі ў ложку, якія яны з мужам праводзілі ў найбуйнейшых гатэлях сьвету, каб заклікаць чалавецтва жыць мірна (канец 60-х, Віетнам…). Асабіста мне больш за ўсё падабаецца раньняя праца Она “Жывапіс для ветру”. Яна ўтрымлівала ў сабе мяшэчак з насеньнем ды інструкцыю, згодна зь якой яго належала зьмясьціць “туды, дзе ёсьць вецер”, і зрабіць у ім дзюрачку.

Герман Нітч. Негалосны лідэр узьніклага пры канцы пяцідзясятых гадоў у Аўстрыі Інстытуту непасрэднага мастацтва. Асноўнай тэмай, што цікавіла ягоных

5 Тыя, хто цікавіцца пэрформансам, недаацэньваюць “абрэкцыённы” характар гэтага віду мастацтва. Ён дае магчымасьць творцу ўзаемадзейнічаць з гледачом. Сёньня бярэцца ў ужытак — відаць, каб усё жыцьцё мастацтва мэдыцыну.

“супрацоўнікаў” (трохі пазьней творчасьць гэтай групы займела назву “Венскі акцыянізм”), была жорсткасьць, якая разглядалася як інструмэнт самапазнаньня чалавека[5]. Пачынаючы з 1963 году, тэатар зьдзейсьніў больш за 80 акцый, прычым некаторыя імпрэзы цягнуліся некалькі дзён. Складовай часткай бальшыні зь іх было паступовае разьбіраньне тушы жывёлы і размазваньне крыві па целах удзельнікаў; часьцей за ўсё дзея суправаджалася музыкай і мела пэўную рэжысуру.

Марына Абрамавіч. Югаслаўская пэрформэрка, для творчасьці якой уласьцівае поўнае адмаўленьне ад усіх тэатральных умоўнасьцяў. Пачуцьці (у тым ліку і пачуцьцё болю), што адлюстроўваліся ёю падчас пэрформансаў, заўсёды ў поўнай меры сапраўдныя.

Бадай, галоўная тэма, якая заўсёды цікавіла Абрамавіч, — гэта стасункі паміж людзьмі. Выкарыстоўваючы разнастайныя алегорыі, Абрамавіч канстатуе брутальнасьць, хісткасьць гэтых стасункаў і разам з тым — кранальную патрэбу быць пачутым і зразуметым. Вялікую вядомасьць набыло фота аднаго з супольных пэрформансаў Абрамавіч і дацкага мастака Ўлая (“Адносіны ў часе”, 1977), дзе валасы аўтараў сплятаюцца разам і ўтвараюць адно цэлае, як бы ствараючы мост паразуменьня паміж асобамі.

Гілбэрт і Джордж (Гілбэрт Прош і Джордж Пасмар) — двое мастакоў, якія, бы той Ільф і Пятроў, складаюць непарыўны тандэм. Праславіліся дзякуючы стварэньню “жывых скульптураў”, дзе ў якасьці матэрыялу выступалі самі — як правіла, у строгіх ангельскіх строях ды пакрытыя залатой фарбай. Дусэльдорфскі пэрформанс з сэрыі “Скульптуры пяюць” (1970) цягнуўся каля 8 гадзінаў, і праз увесь гэты час мастакі выяўлялі ўласныя творы — ня толькі стоячы ў нерухомых паставах, але часам яшчэ і сьпяваючы арыі з мюзыклу “Пад аркамі”.

Які пэрформэр зьяўляецца самым радыкальным?

Доўгі час такім лічыўся венскі акцыяніст **Рудольф Шварцкёглер** (1940—1969). Зь лёгкай рукі ахвочых сэнсацыяў журналістаў ягоная сьмерць была расцэнена маляўніча, што… усе адразу ім паверылі. Шварцкёглер, загадкавых абставінах выкінуўся з акна. Калі гэта самагубства (што дагэтуль не ўстаноўлена), дык

[6] Ён **пачаў** **выкарыстоўваць** **у** **сваіх** **акцыях** **жывых** **птушак**, **а** **ў** **1965** **годзе**, **каліфарнійскага** **каёта**, **пераўтварылася** **фізічна** **знішчыць** **сваю** **карціну**.

незаплянаванае, зьдзейсьненае пад уплывам рамантычнага імпульсу. Дакладна вядома, што гэты мастак меў праблемы з псыхікай.

Статус найрадыкальнейшага пэрформэра імкнуўся атрымаць амэрыканец **Крыс Бэрдэн**. Сытуацыі, калі жыцьцё мастака і ягонай публікі пагражала рэальная небясьпека, **«Throbbing Gristle»** ўзьнікалі падчас ягоных акцый, але найчасьцей ён рабіў сьвядома. Бэрдэн пускаў па падлозе галерэі аголенага, коўзаўся па бітым шкле і прасіў свайго сябра стрэліць у яго з пісталета. Падчас пэрформансу “Trans-fixed” (1974) Бэрдэн ўкрыжавалі на старэнькім “Фальксвагене”, прыбіўшы далоні да яго капоту. На працягу акцыі “Скульптура ў трох актах” мастак папросту сядзеў на пастамэнце для скульптуры ў галерэі Фулера, анічога ня робячы і ня кажучы. Ён сядзеў там бязь нечага 43 гадзіны — пакуль ня грымнуўся на падлогу ад зьнямогі.

Але на ніве радыкальнасьці Бэрдэна вельмі хутка пераплюнулі. Падчас свайго пэрформансу ў Лос-Анжэласкім цэнтры сучаснага мастацтва (1976) удзельнікі групы **“COUM Transmissions”**[6] Джэнэсыс Пі-Орыдж і Козі Фані Т’юты выраблялі такое, што нават сам Крыс, які пры ўсім гэтым прысутнічаў, ня вытрымаў ды сышоў. Аголены Джэнэсыс ставіў сабе клізмы з мачы, крыві і малака, потым спаражняўся, а потым лізаў забруджаную ім толькі што падлогу. Так што, як бачым, меры пэрформанс ня ведаў.

Залаты век пэрформансу — 60—70-я гады. Ці праўда, што цяпер гэтае мастацтва знаходзіцца ў заняпадзе?

Сапраўды, цяпер на Захадзе яно не выклікае гэткага сьпёку, як год трыццаць таму. Выступы пэрформэраў адбываюцца пераважна ў невялічкіх галерэйках і не зьбіраюць мастацтвы. Пагатоў самі аўтары, большасьць зь якіх адмовіліся ад радыкальнасьці дзеля рэспэктабэльнасьці, сталі выклікаць сумнавата. Пэрформанс перастаў быць нечым новым і прагрэсіўным. Але гэта ня значыць, што ён перастаў існаваць. І нічога страшнага, што дзейнасьць амэрыканскай групы **«Survival Research Laboratories»** («Дасьледчыя лябараторыі па выжываньні»)[7] дужа нагадвае знакамітую акцыю **Тэнглі** “Прысьвячэньне Нью-Ёрку”[8], якая ладзілася ў 1960 годзе. Галоўнае, як той казаў, каб усё было з душой.

У пэрформансе ўдзельнічаюць групы фантасмагарычных машын, якія самі сябе,

Пэрформанс — мастацтва дарэшты аўтарскае, бо нескаючы вынікае з экзыстэнцыі свайго стваральніка. Беларускі пэрформанс — не выключэньне.

2

Па словах Людмілы Русавай, пэрформанс у Беларусі пачаўся з таго, што яны з мужам Ігарам Кашкурэвічам купілі байдарку. Так атрымалася, што менавіта падчас падарожжаў па рэчыцы Сажы і Дняпры абое ўсьвядомілі сутнасьць мастацтва, дзеяньня. Ці, перафразуючы сказанае толькі што, мастацкую сутнасьць дзеяньня — якім бы яно ні было, хай сабе нават зусім банальным. І насыцілі адчуваньнем гэтай, бадай, пэўнай, мастацкасьці той адмежак часу дарэшты. Было лета 1979 году. Трэба згадаць і яшчэ пра аднаго беларускага “протапэрформэра” таго часу — Генадзя Хацкевіча. Ён спрыяў патрапіць у Парыж — і паспрабаваў захапіць самалёт, выдаючы два кавалкі гаспадарчага мыла за выбуховае рэчыва. Замест Парыжу Гена патрапіў у вар’ятню.

апускаючы гледача ў атмасфэру “пыльнага карнавалу ў рукле, падчас якога вынайменьваецца пов. адзеньня. аргутны дым”, як напісалі пра пруну ў амэрыканскім даведніку “Індустрыяльная культура”.

8 Падчас гэтага пэрформансу, які адбываўся ў нью-ёрскім Цэнтры сучаснага мастацтва, вялізная махіна, якая ўяўляла відавочную алегорыю сучаснай тэхнакратычнай культуры, павінна была пасьлядоўна самазьнішчацца, крышачы самая сябе. Але ў выніку тэхнічнай

непаладкі пачаўся пажар, і пэрформанс быў спынены зьяўленьнем пажарных.

Жан Тэнглі — мастак, які праславіўся стварэньнем пачварных машынаў, поўнасьцю непрыдатных у якіх-кольвечы практычных мэтах. Некаторыя зь іх (сэрыя “Мэта-матыкс”) маглі, затое, маляваць, ствараючы “шэдэўры” ў стылі папулярнага тады нэаабстракцыянізму.

Калі і кім быў зроблены першы сьвядомы мастацкі пэрформанс у Беларусі?

Людмілай Русавай і **Ігарам Кашкурэвічам** у Віцебску ў верасьні 1988 году. Гэты тандэм стаў ініцыятарам сьвяткаваньня 110-х угодкаў з дня нараджэньня Казімера Малевіча і ў яго рамках справакаваў публічнае “ўваскрашэньне” гэтага мастака. У цэнтры глядацкай увагі знаходзілася вялікая “супрэматычная” труна, зробленая па эскізе Малевіча. Яе вечка ўздымалася, адтуль выходзіў чалавек (самае цікавае, што гэта была жанчына — Людміла Русава) і рушыў да сьцяны па белай папяровай сьцяжынцы, пакідаючы на ёй чорныя сьляды. Наступная фаза дзеяньня палягала ў тым, што пэрформэр як бы наноў ствараў самы вядомы твор Малевіча — “Чорны квадрат”, і ўрэшце ён губляўся ў натоўпе. Налета падобныя акцыі адбыліся таксама ў Менску і Маскве. А скончылася ўсё спаленьнем труны на ўскраіне малюткай вёскі Нямчынаўка.

Хто наагул займаецца гэтым відам мастацтва ў нас?

Вось амаль поўны сьпіс: Людміла Русава, Ігар Кашкурэвіч, Алесь Пушкін, Алесь Эроціч, Бісмарк, Віктар Пятроў, Галіна Васільева, Васіль Васільеў, Алег Ладзісаў, Лявон Вольскі, Андрэй Вараб’ёў, Максім Тымінько, Андрэй Логінаў, Ірына Зелянкова, Дзяніс Раманоўскі, Сяргей Ждановіч, Аляксей Іваноў, Юрась Барысевіч, Аляксей Лунёў, Аляксандар Родзін, Іра Малеціна, Тацяна Сьлінка, Аля Сідаровіч, Дзьмітры Майбарада. Групы і аб’яднаньні: «Бум-бам-літ», «Бэргамот»,

«Спэцбрыгада афрыканскіх братоў», «Тэатар псыхічнае неўраўнаважанасьці», «Экледысоп», «Солнце-цветы», «Еуе». Сьпіс быў бы няпоўны без цудоўнага тэатру плястычнага гратэску «Ін-Zest», які яшчэ нядаўна называўся проста «Жэстам». Апроч пастаноўкі спэктакляў, гэты калектыў час ад часу ладзіць уражальныя вулічныя відовішчы. Падчас аднаго зь іх (верасень 2000 году) амаль аголены кіраўнік тэатру Вячаслаў Іназемцаў танчыў бута на хісткай пажарнай лесьвіцы ва ўнутраным дворыку Беларускай акадэміі мастацтваў, рызыкуючы зваліцца з вышыні пятага паверху.

Пэўная частка пералічаных вышэй пэрсаналіяў ужо даўно пакінула родныя загоны ды набыла іншаземнае грамадзянства. Алесь Эроціч і Ігар Кашкурэвіч жывуць у Бэрліне, Іра Малеціна — у Маскве. Пра тое, што яны атрымалі там прызнаньне, нешта пакуль не чуваць[9]. Як і наагул пра іхную актыўную дзейнасьць. Астатнія таксама паказваюцца перад публікай ня тое каб часта. Бо няма ім дзе асабліва паказвацца. Мерапрыемстваў, якія б уключалі ў сябе дэманстрацыю пэрформансаў, у Менску кот наплакаў, ня кажучы ўжо пра іншыя беларускія гарады. Прагледзеўшы гэты сьпіс, нельга не спыніцца на адной важнай асаблівасьці. Калі за мяжой шмат якія аўтары, абраўшы мастацтва дзеяньня за спосаб самавыяўленьня, прынцыпова займаліся толькі ім, дык у нас гэтага няма. Абсалютна ўсе беларускія пэрформэры праявілі сябе ў нейкіх іншых галінах мастацтва. Сярод іх сустракаюцца як уласна мастакі, гэтак і літаратары, філёзафы ды нават музыкі (у нашым сьпісе ёсьць і прозьвішча лідэра гурту «NRM» Лявона Вольскага, які, праўда, “засьвяціўся” ў якасьці пэрформэра ўсяго пару разоў).

Прычыны, па якіх самыя розныя сур’ёзныя людзі раптам пачынаюць бавіцца розным “дурноцьцем”, натуральна, розныя ў кожным выпадку. Але агулам усіх прываблівае адно — той прынцыпова новы спосаб самавыяўленьня, які дазваляе пэрформанс. Такія аўтары, як **Васіль Васільеў** і **Аляксандар Родзін** (абодва зь іх маюць не абы-якое прызнаньне жывапісцы), сталі займацца пэрформансам ужо ў сталым веку. Прычым, што вельмі цікава, другі ў акцыі ў кампаніі з удвая маладзейшым за яго контракультуршчыкам **Мітрычам**. Іхні пэрформанс падчас якога апранутыя ў балахоны постаці дзьвюх маўкліва чыталі кнігі спасярод закінутых менскіх

[9] Гэта **тычыцца ўдзельнікаў усіх беларускіх мастакоўскіх аб’яднаньняў, і без дапаўненьняў**, якія **сьпіс** якіх быў

сапраўдным упрыгожаньнем першых “Навінак”.

Ну і што гэтыя людзі, пра якіх вялося вышэй, робяць? Кожны, натуральна, сваё. Пра ўсіх не напішаш, таму пакажу хаця б некаторых.

Тандэм **Русава-Кашкурэвіч** даўно распаўся. Праўда, ужо спамянулі вышэй, а што тычыцца Людмілы, год дзве таму яна, па ўласных словах, пераўтварылася з праваахоўніцы ў сузіральніцу. Хваравітая гатычная ўзьнёсласьць “хэндзіндаў” — ейных пэрформансах з экзыстэнцыяльнай праблематыкай. І ўсе яны, на мой погляд, прысьвечаныя адлюстраванню нюансьці мяжы паміж быцьцём і небыцьцём.

Напісаўшы гэтае, я адразу прыгадаў безжыцьцёвае аголенае цела мастачкі, абкручанае муміфікацыйнымі бінтамі, і не падлучаных ні да чога навушнікаў на галаве ў пэрформансе “Praecipitatio” (1999). Капэрты, якія Русава раздавала сябрам на фэстывалі “Навінкі-2000”, зьмяшчалі рэшткі абпаленыя толькі што валасы і нейкі радок, які не ўдалося засакрэчаны. Галоўная тэма, якая цікавіць мастачку, сьмерць. Культуролаг Юрась Барысевіч назваў ейную мастацкую дзейнасьць “гульнёй са сьмерцю”, але гэта пагадзілася толькі пры той умове, што калі гэта гульня, вельмі сур’ёзная.

І яшчэ некалькі рысаў, што маюць ахарактарызаваць практыку Русавай — ня надта простую дзеля паўсядзённага асэнсаваньня і ўсьцяж пабудаваную на асацыяцыях. Наведнікам пэрформансаў з сэрыі “Муміфікацыя” (2000—2001), якія ўяўлялі сабою чытаньне мастачкай тэкстаў з арт-кнігі “Наскрозь”, яна дарыла малюткія паперовыя караблікі, створаныя з тых самых тэкстаў. Падчас выступу на апошніх “Навінках” Русава разьдзерла кнігу на шматкі пад злавесны акампанэмэнт гістэрычнага сьмеху. Пастаянным удзельнікам яе пэрформансаў стаў ляльк — лялька, што ўвасабляе саму мастачку.

Выступы яшчэ аднаго аўтара старэйшага пакаленьня — **Віктара Пятрова** — у Менску праходзяць зусім затое яго ахвотна запрашаюць да ўдзелу ў розных фэстывалях (такіх, як “Рэзкае вяртаньне дэкаданцкіх дзе мастак рабіў “хірургічную апэрацыю”, паклі

папаўняецца з кожным годам.

[10] **жудасьцей дзяржаўных выданьняў** **назвалі тое што адбылося, “хэндзіндаў” — сьмехам** **[11]** **найпрыкм найлепшым** **рэчам зь непатлікімі ідэямі,** **якія ў Віцебску.** **Славамір Адамовіч, Андрэй Раманаўскі і** **іншыя** **“экстрэмалаў”** **[12]** **наладзіць** **[13]** **(тэкст**

зь небыцьця Рэч Паспалітую, ці велічэзны “зьлётны” тэрыторыя з усяго сьвету “Замак уяўленьня”, які штогоду “будуецца” ў Польшчы).

Ягоныя пэрформансы — гэта не абмежаваныя анархістамі сэнсавымі дэтэрмінантамі (але пры гэтым яшчэ і журналістамі паэтычныя) пасьлядоўнасьці дзеяньняў, што зьмяшчаюць гледача ў крохкую мэтафізычную прастору. Калі пушкінскі зь іх якісь прафан спытаў у мяне, пра што быў перформанс, буркнуў: “Пра нішто!”. І толькі потым сам сабе адказаў, што напэўна меў рацыю. “Nothing” — прамовіў тады, перад тым, як запаленая лямпачка была раскрыленая аб люстэрка.

У адрозьненьне ад сваіх вышэйпамянёных калегаў, беларускі манумэнталіст **Алесь Пушкін** зьвярнуўся да мастацкага дзеяньня зусім ня дзеля нязмушанай мэтафізычнай пазбаўленым сэнсаў вакууме. Ягонай мэтай была адраджэнскіх ідэяў — а хутчэй нават выяўленьне ўласнага да іх стаўленьня, дужа, трэба сказаць, 25 сакавіка 1989 году, у гадавіну ўтварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі, ён выйшаў на вуліцу Сурганава, сталіцы БССР, з плякатам, на якім тлуста быў пераканаваны сьцяг гэтай дзяржавы. Рэакцыя з боку той часткі апранаецца не як усе (і носіць, напрыклад, пагоны) цалкам прадказальная, і аўтара разам з двума дасьведчанымі ягоных прыхільнікаў неўзабаве зацягнулі ў каталажку нядоўгай бойкі, у якой прынялі ўдзел і выпадковыя мінакі, што кінуліся абараняць мастака і бел-чырвона-белы ён выступаў.

Судовы працэс над Пушкіным спрычыніўся да стварэньня першага ў Беларусі прэцэдэнту вольнага грамадзкага абмеркаваньня мяжы дапушчальнага ў мастацтве[10].

Нягледзячы на пераканаўчасьць словаў абаронцаў (у іх ліку быў і знакаміты мастак Алесь Марачкін), Пушкін атрымаў два гады ўмоўна. Гульня з уладай, якой адважна займаецца гэты пэрформэр, выступаючы ў адзіноце[11] супраць цэлай сыстэмы, увасобленай у сотнях міліцыянтаў, што складаюць асноўную публіку на ягоных вулічных пэрформансах, бывае[12] небясьпечнай за гульні са сьмерцю.

Яшчэ адна знакамітая акцыя Пушкіна была прысьвечана сьв. Язафату Кунцэвічу (12 лістапада 1994 г.). Ягоны

перформанс
будуецца
адзінагалосна
характарызаванае
журналістамі
як чарговы
пушкінскі
перформанс —
і, зноў жа,
нішто, зусім
не
беспадстаўна).
Зрабіць пазіцыю
перанакодзілі
цяпер усе
“правыя
фуражкі”
Айтару
Бацькаўшчыну
давялося
вучыць
ледзь
адчайна
добрым
дзясяткам
разоў
міліцыянтаў.
Антонина
тычылася,
пэўна, не
толькі

тых самых віцебскіх мясьцінах, дзе шмат гадоў таму цяпер мітрапаліт быў закатаваны сваімі ворагамі, і перадаваў ягоныя боль і цярпеньні. Алесь крочыў басанож па снезе, падстаўляў сваё цела пад струмені ледзяной вады і ўрэшце быў сплаўлены па Дзьвіне ў маленькім чаўне бязь вёслаў.

Сярод маладзейшых аўтараў варта спамянуць **Аляксея Іванова** і **Сяргея Ждановіча**. Першага больш за ўсё цікавіць плястыка, жэст як універсальны сродак камунікацыі, гульня са спалучэньнямі розных дзеяньняў. Сяргей, які апроч пэрформансу займаецца ці ня ўсімі відамі сучаснага мастацтва, кажа, што ў цэнтры ягонай увагі нязьменна застаюцца прастора і знак. Часам да іх далучаецца яшчэ гук — менавіта ён быў "галоўным героем" некалькіх ягоных твораў. Старыя нямецкія песьні гучалі з-пад кіпаў раскіданай па сцэне бабіннай стужкі, наслойваючыся адна на адну і такім чынам "самазьнішчаючыся" (2000). У пэрформансе, паказаным на леташніх "Навінках", Сяргей памыў падлогу клюбу «PallMall», дзе ўсё праходзіла, папрасіўшы публіку быць чысьцейшай[12]. Найбольш удалымі дэбютанткамі за апошні час сталі (на мой, вядома, погляд) **Тацяна Сьлінка** і **Аля Сідаровіч**. Іхні пэрформанс "Нарыхтоўка мюсьлі" ("Навінкі", 2001) уяўляў зь сябе досыць спэцыфічны досьвед пэрвэрсійнай лёгікі, спраектаванай на самыя звычайныя побытавыя справы. Зярняткі кавы, перамяшаныя зь пігулкамі ды нейкімі ніткамі, былі закатаныя на зіму ў слоікі з подпісам "Семкі" і закапаныя ў глей на Строчыцкім вадасховішчы.

Якія мерапрыемствы, прысьвечаныя пэрформансу, праходзяць у Беларусі?

Самым першым мерапрыемствам, якое паставіла на сябе мэту вылучыць гэтую зьяву з усяго масіву сучаснага мастацтва, быў тыдзень пэрформансу ў галерэі «Шостая лінія», прысвечаны Антанэну Арто (травень 1997, куратары Ірына Бігун і Вячаслаў Капёнкіна). У ім узялі ўдзел толькі пяць аўтараў: Людмила Русава, Максім Тымінько, Ірына Зелянкова, Ільля Сіняк і Алег Ладзісаў. Мерапрыемства мелася стаць штогадовым, але ня стала. Галерэя, вакол якой групавалася незалежнае жыцьцё Беларусі, у 1998 годзе спыніла сваё існаваньне[13]. Маштаб "тыдня пэрформансаў" быў перасягнуты толькі

[12] Галерэя, што паўстала на хвалі моды 1992 году, была адным з самых актыўных і прывабных для моладзі мясьцінаў. Пасьля 1998 году яе прымішчэньні ўжываліся рознымі арганізацыямі, але ніводная зь іх ня здолела ўтрымаць той атмасфэры, якая панавала ў "Шостай лініі".

[13] Афіцыйна галерэя была зачынена ў 2000 годзе, але фактычна яе дзейнасьць спынілася ў 1998 годзе, калі памяшканьні, якія ўжывала галерэя, былі перададзеныя ў выключнае карыстаньне Міністэрству культуры.

“Навінкі”, які, пачынаючы з 1999 году, штоверасцю праходзіць у Менску пад куратарствам Віктара Пятрова. Апрацоўшы ўсім аўтараў, у ім заўсёды бярэ ўдзел шмат замежнікаў. Э, прагледзеўшы фэстывальную праграму, можна спрасьці зьмястоўнае ўражаньне што да сытуацыі з пэрформэрамі ў сьвеце.

3

(адмыслова для скептыкаў)

Чаму пэрформэры вельмі часта выступаюць аразнаньня?

Прычыны могуць быць розныя. Напрыклад, апранаючы Алег Кулік[14] — гэта тое самае, што сабака ў штанах. Жывёла, не вядома, не апранаюцца — у адрозьненьне ад нас. А сябе далучае менавіта да іх. У амэрыканкі Рэбэкі Хорн ёй, чым трохі іншыя — выяўленьне хараства чалавечага цела. Але яно гарманізуе з навакольнай прыродай і злучае ў чалавекам (а Рэбэку Хорн злучае з нудыстамі, дадам я). А лучаснага польскі мастак Ежы Бэрась неяк зазначыў, што ён выступаюць перад публікай без анічога дзеля таго, каб выявіць свае неабароненасьць. І менавіта апошняя матывацыя (прыгадаецца тут біблійныя радкі пра выгнаньне з раю) і падаецца ў вясь час найпрыгажэйшай, гэтак і найактуальнейшай — як толькі для Бэрася, але і для мноства іншых пэрформэраў.

Тарановіч, больш вядомы як Эроціч) і крысьці падтрымцы ЗАТ «Белтэхналёгія», правяла 48 самых разнаньня навых прыкладаў — жывёлы, не нашым сябе меней, чым праектаў у рэчышчы сучаснага мастацтва, праведзеных у іншых месцах за ўвесь час яго пошукі існаваньня ў Беларусі.

[14] Расейскі (але ўкраінскага паходжаньня) куратар і пэрформэр, які на пачатку 90-х набыў сабе міжнародную вядомасьць дзякуючы ўласнай канцэпцыі “заафрэніі” ды

практычнай яе рэалізацыі. Яе сутнасьць у тым, што мастак, адмовіўшыся ад чалавечага статусу, пераўвасобіўся ў сабаку і стаў весьці адпаведны лад жыцьця, змагаючыся гэтак за правы братоў нашых меншых. Вось ужо шмат год ён езьдзіць па сьвеце, эпатуе абываталяў і кусае тых аматараў мастацтва, што зьбіраюцца на яго паглядзець.

[15] Мастачка, якая, апроч пэрформансу, займалася процьмай розных рэчаў — ад кніжнай графікі да стварэньня электрычных машынаў, што

могуць самі маляваць абстрактныя творы (па-мойму, гэта відавочнае запазычаньне ідэі ў Тэнглі).

Ці праўда, што пэрформанс — гэта такое спэцыфічнае хуліганства?

На Захадзе пэрформансам зазвычай займаюцца сур'ёзныя і рэспэктабэльныя людзі сярэдняга веку, якія маюць сем'і, мяшчанскія звычкі і рахункі ў банках. Але не адмовіць таго, што ўвагу публікі заўсёды прыцягвалі перадусім не яны, але тыя нешматлікія пэрформэры, якія лічылі *творчасьцю* самое правакаваньне грамадзтва. І ў гэтым выпадку часам сапраўды не абыходзілася без умяшальніцтва паліцыі. Асабліва тут вызначыліся прадстаўнікі г.зв. "маскоўскага акцыянізму"[16]. Ужо спамянуты намі Алег Кулік пару-тройку разоў трапляў у каталажку за нанясеньне сваім гледачам цялесных пашкоджаньняў (усё тыя ж укусы). Сур'ёзнымі неўсведамленымі для яго гэта, вядома, ня скончылася — пагатоў, тыя здадуцца адбыліся за мяжой. А вось ягоны найбліжэйшы калега Аляксандар Брэнер[17] такі адседзеў з паўгоду ў галяндзкай турме. Прычынай таму стала даляравая "свастыка", якую ён спрэевай фарбай на карціне Малевіча "Белы квадрат на белым тле" (Амстэрдам, музэй Стэдлік, восень 1996 году). Акрамя колькі б ён ні ліў кракадзілавых сьлёзаў у сваёй кнізе "Абасцаны пісталет", частка якой напісаная ў таварыскім беларусам жанры, як "турэмны дзёньнік", і кольчы называў сябе пакутнікам за чыстае мастацтва ды змагаром за ягонай музэефікацыі і камэрцыялізацыі, усьлед за Станіслаўскім тут будзе цалкам дарэчы паўтарыць: Бо Брэнер патрапіў ня толькі ў турму, але, што ў гэтым яшчэ і на першыя палосы выданьняў усяго сьвету. Куды ён і хацеў патрапіць, — хай ужо не адмаўляецца.

Але апісаныя вышэй прыклады — гэта, вядома, выключэньне. Далека ня ўсе, хто робіць пэрформансы, ли чаць сваей галоўнай задачай эпатаж публікі і, шырэй, грамадзтва. Я займаюся мастацтвам, а не правакацыяй, — літаральна так адказаў вам у

[16] **Тэрмін, уведзены намі для апісаньня адмысловага кшталту акцыянізму, які ўласьцівы Вячаславу Курыцыну, Аляксандру Шабурову, Аляксандру Бродскаму і іншым маскоўскім мастакам, якія называюць самі сябе "канцэптуалістамі". Іх пэрформансы, якія ў Маскве ня маюць ніякага розгаласу, часам выклікаюць скандалы ў Еўропе.**

[17] Расейскі пэрформэр, культуролаг і літаратар, які ў мінулым дзесяцігодзьдзі займеў гучную скандальную вядомасьць сваімі акцыямі, праведзенымі ў грамадзкіх месцах. Сярод іх — дэфэкацыя ў Пушкінскім музэі, поляны акт для помніка ўсё таму

ўжо не зусім шызафрэнік. А тэарэтычна яе абгрунтаваць **адлюстраваньне і ў пэрформансе.** напісаць падрабязную гісторыю — такую, што і прыстойнаму чалавеку будзе цікава чытаць… Гэткага ўжо адразу можна выпісваць. Большасьць пэрформэраў — цудоўныя тэарэтыкі. Яны ня толькі займаюцца сваімі “выкрунтасамі”, але яшчэ й пішуць з гэтай нагоды ўсялякія разумныя тэксьцікі.
Шмат хто кажа, што тэракт 11 верасьня быў найлепшым пэрформансам...
Прабачце за кансэрватызм, але я б паасьцярогся называць тое, што адбылося ў гэты дзень, *мастацтвам*.

І апошняе пытаньне: **чым гэта ўсё, уласна, карысна для нашай старонкі?**
Тым, што выяўляе новы, куды больш дасканалы і пераканаўчы, досьвед існаваньня на памежжы культуры. Ахвочых бавіць час у такіх досыць спэцыфічных варунках у нас цяпер не бракуе — бо далёка ня ўсім даспадобы “Славянскі базар”. Але ж ня ўсе маюць базысную інфармацыю, як гэта можна арыгінальна ды густоўна рабіць.
Пэрформанс дазваляе ўспрымаць мастацкую культуру як няспынны працэс, а не як сукупнасьць спрадукаваных “слыннымі папярэднікамі” вынікаў, што незаўважна для ўсіх пакрываюцца музэйным пылам і наўрад ці здатныя цяпер каго-кольвечы скалануць. Жыцьцё — гэта таксама працэс, а ня нейкая там “сукупнасьць”. А шмат каму з нас хочацца жыць.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатkу СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

Ігар Карашчанка

Гаруншчына

ІГАР КАРАШЧАНКА (нар. 1959 у Менску) — мовазнаўца й фалькалярыст. Працаваў у акадэмічным інстытуце этнаграфіі й фальклёру. Друкуецца ў «ARCHE» ўпершыню.

45-годдзю Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі імя Кандрата Крапівы прысвячаецца

У канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў *гаруны* тагачаснага Пуціўльскага павету Курскай губерні вучонымі Расіі, расійскай афіцыйнай статыстыкай і праваслаўным духавенствам разглядаліся як беларусы. Пасля другой сусветнай вайны расійскія даследчыкі (Чыжыкава і іншыя) назвалі іх ужо этнаграфічнай групай расійцаў. Гэта адбывалася на фоне выражанай адсутнасці інтарэсу да гэтай супольнасці з боку беларускіх даследчыкаў. Зацікавіўшыся гэтым, напрыканцы 1991 году я распачаў палявое вывучэнне супольнасці. Быў зроблены шэраг выездаў у мясціны традыцыйнага пражывання супольнасці ў Пуціўльскім раёне Сумскай вобласці Украіны ў 1991—1995, 1997 гадах. Вывучаліся населеныя *гарунáмі* паселішчы Новая Слабада (мясц. *Слабадá*), Лінова (*Лінóў*), Калíшчы, Свабода (*Серьбявíца, Сібілíца*), Буняґкіна (часткова *гарунская*) і некаторыя суседнія. Якімі пабачыліся этнакультурныя асаблівасці *Гарэншчыны* зблізку? Якія моўныя

асаблівасці тых, каго напачатку і, з вялізным перапынкам, у канцы стагоддзя лічылі і зноў называюць беларусамі? Ці даравальны такі перапынак увагі да беларускасці крыху аддаленай ад Беларусі супольнасці? Ці можна *гаруноў* падобна *тудаўляґнам* (ці рэальна — *Тудаўшчыґне*) Ржэўшчыны называць толькі групай беларускага паходжання? Ці гэта проста беларусы? Толькі *о́чань* асаблівыя. Беларусы, што жывуць ва ўмовах ускраіннасці. На гэтыя пытанні мы паспрабуем адказаць з дапамогай прыкладаў маўлення сучасных *гаруноў*. Шэраг асаблівасцяў збліжае яго з рысамі народных гаворак Віленшчыны, Гарадзеншчыны, Смаленшчыны, Ржэўшчыны.

У прыватнасці, тут бытуюць формы дзеяслова з суфіксамі *-ўшы, -дчі: мужа ана́ кре́пка зарядёўшы* (зараджаная) *была́, сара́е сало́май быў пакрыґўшы, с ра́зных у́ліц пазбіра́ўшы* (Лінова); *узышудчі ёсьть* (Новая Слабада). Параўнай: *старыґя люґдзі пазьміра́ўшы* (Міцкуны, Віленскі раён, Літва, запіс 1993 г.); *бйжанцы былн з Расйі прыйхаўшы* (Кяна, Віленскі раён, 1993 г.); *мой зяць был на войнй пошэґдшы* (Багдананцы, Троцкі раён, Літва, 1995 г.); *ні саўсйм атышудчі* (Кадзінка, Аленінскі раён, Цвярская вобласць, Расія — гістарычная Ржэўшчына, 1992 г.).

У некаторых выпадках (рэдка, зафіксавана ў вясельнай песні) ужываецца [у] на месцы гістарычных **о* або **ы*: *Вечйрнійі йдуць, Калнну лума́ють, Га́ньняну* (Ганну) *умува́ють…* (Новая Слабада, 1991 г.). Параўнай: *ма́сліцам пусным пума́жу* (Дудкіна, Сычоўскі раён, Смаленская вобласць, вярхоўі Дняпра, запіс пачатку 1990-х гадоў); *Я цупыґрка с Ругалёва, ты варна́ка з Халмяцэ, прыхадзі ка мне, варна́ўка, Я цібй пакалацэ … і лупа́тай по́ пляцэ* (наваколле с. Халмец, Аленінскі раён, Цвярская вобласць, 1992—1993 гг.). Прыкметна з’ява асіміляцыі: *я ачншшу; ана́ шшэ ж дйўка; с руннаю, с ма́тушкай…* (з песні); *…буршшыку у гуршшыку* (з песні пра *Цярёшыньку*). Параўнай: *с аннэґй чяґшкі* (Бачарова, былая назва — *Сапліўка,* Сычоўскі раён, Смаленская вобласць, 1991 г.); *хало́нна буэдзет; ба́бка в дзірі́вні анна́* (Баброўка, Аленінскі раён, Цвярская вобласць); *усё ў біннатыґ* (Пустошка, Аленінскі раён, Цвярская вобласць); *к уго́нніку* (святому угоднику) *ў Аста́шкава хадзі́лі* (*Церяхо́ўка*, Аленінскі раён, Цвершчына). У прыметнікавых і займеннікавых формах пад націскам ужываюцца канчаткі *-ей, -эй, -эю: да такі́й сті́пені; Сумскі́й убласті; на за́ўтра ў другі́й; гарадскі́я; с тэй стараныґ; у маладэґй ві́чер атво́дють; а тэй*

(той); *за маладэґю кулывэґю салóмаю перакрывáў; с аднэґю касóю; анá былá ўдавэґю, векавэхай* (Лінова), *вадую сьвятэґю* (*Серьбявіца,* 1992 г.). Параўнай: *у тэй палавіне* (Усадзішча, Навадугінскі раён, Смаленская вобласць, 1991 г.); *на Хамінэґй нядзíлі* (Ардылёва, мясц. *Рудулёва*, Сафонаўскі раён, Смаленская вобласць); *панучак залатэґй* (Аленіна, Цвярская вобласць, 1993 г.).

Спалучэнне *на зáўтра*, як у шмат якіх мясцінах Беларусі, Смаленшчыны, Ржэўшчыны, у вуснах мясцовых жыхароў часта гучыць як *на зáвтряга, на зáвтріга*. Гэта значыць, слова атрымоўвае дадатковае нарошчванне кампаненту *-га*: *кадá на зáвтряга нявíсту прівóзять* (Лінова). Некаторыя дзеясловы множнага ліку трэцяй асобы маюць канчатак *-ом*: *на балóта пайдóм; так і жывóм; мы сваіх пазавóм; ідум накладáть* (параўн.: *пóйдам, бýдам* у гаворках паўднёва-ўсходняй Беларусі). Пры вялікай колькасці лексем, што фіксуюць беларускасць побыту *гаруноў*, ёсць шэраг уласцівасцяў, якія дапамагаюць пазначыць статус гаворкі гаруноў як своеасаблівую пераходную гаворку. Шэраг лексем бяспрэчна беларускія, шмат якія формы *з беларускай*, а таксама *з паўднёварускай*. У гаворцы некаторых маладзейшых (сярэдніх гадоў) людзей прыкметна больш украінскіх ці *з украінскай* аформленых лексем (накшталт *пагáна* і г.д.). Заўважана рознаварыянтнае афармленне шэрагу лексем, часта ў гаворцы аднаго і таго ж чалавека. *Няхáй* у вуснах мясцовых жыхароў — *нехáй* і *ніхáй*. *Учóра* — гэта *учёра* і *вчёра*. *Янá — анá* і *інá*. Могуць сказаць: *ій* і *яй; ўжо* і *ўжэ; там* і *тáма; ті* і *чі*. Найбольшую разнастайнасць афармлення дэманструе лексема *яшчэ*. У вуснах *гаруноў* і іх бліжэйшых суседзяў можна пачуць: *шшэ, ішшэ, ішэ, шчэ, ішчэ* (*Вот ішчэ нахнба* — Лінова), *ішчё, яшчэ, яшшэ* (рэдк.) і нават *шэ*. Спецыфічная мясцовая лексема *тйты* (гэты вось, менавіта гэты; параўн.: *цйты* ў аўцюкоўскай гаворцы Калінкавіцкага раёну Гомельскай вобласці, *цнтый* у гаворках Маларыцкага раёну Берасцейскай вобласці; зафіксавана беларускімі мовазнаўцамі) можа гучаць як *утэґтай, тйтай, тйтэй* (Калішчы, 1995 г.). Праяўляюць разнастайнасць і іншыя падобныя ўказальныя формы: *тэґе* (тое вось), *с тутэй* (з вунь той), *утáм, утáма, тáмта* (вунь там), *тэтай, тут, утадыґ* (вунь тады) і інш. Гаворцы гаруноў характэрныя наступныя архаічныя лексемы: *адкэтаць*

(адчыніць), *закэтаць* (зачыніць), *раскэтаць* або *расхэтаць* (расчыніць), *кага́д* (*кага́д дроў* — стажок дроваў; ва ўсходняй Беларусі і на Браншчыне лексема ўжываецца ў значэнні ‘сцірта’, ‘капец бульбы’), *балсяґнка* (невялічкі гаршэчак; выраблялiся ганчарамі Лінова), *мала́й, мала́йцы* (кулінарнае), *Вісажа́ры* (астранам.) і інш. Слова *балсяґнка* ў значэнні ‘начынне’ бытуе ў Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці — гл. “Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны” Т.С.Янковай (Менск, 1982). Незалежна ад нашых даследаванняў у мясцовай пуціўльскай газеце «Прогресс» (№ 20 за 28 мая 1992) быў змешчаны артыкул мясцовага краязнаўцы і музейніка Аляксандра Ляпёшкіна, ураджэнца сяла Бываліна (па-мясцоваму *Бува́ліна*) “Горюны — это Белорусы”. Да прызнання беларускасці гаруноў напрыканцы XX стагоддзя падышлі і мясцовыя навуковыя сілы.

[image]
[image]

№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]

Уладзімер Ляхоўскі, Валеры Пазьнякоў

Што трэба ведаць кожнаму беларусу: удакладненні

150 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі. — Вільня: Наша будучыня, 2001.

Пра стварэньне папулярнай гістарычнай энцыклапэдыі Беларусі для шырокага чытача марылі яшчэ Вацлаў Ластоўскі, Язэп Лёсік, Уладзімер Пічэта. На думку апошняга, такое выданьне павінна ахапіць усе актуальныя пытаньні гісторыі Беларусі, стаць настольнай кнігай для настаўніка і вучня, а таксама для ўсіх, “хто цікавіцца гісторыка-эканамічным і культурна-палітычным мінулым беларускага народу”. Пры гэтым, заўважаў Пічэта, аўтарам пры папулярным асьвятленьні гісторыі Беларусі “трэба абапірацца на першакрыніцы і пазьбягаць кампіляцыяў”. Выдадзеная ў 1993 годзе кніга “100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі” назаўсёды ўвайшла ў беларускую гістарыяграфію. Задума аўтараў дадзенага праекту “паказаць праўдзівую гісторыю з гледзішча інтарэсаў Беларусі, імкненьне даць нарэшце народу

УЛАДЗІМЕР ЛЯХОЎСКІ (нар. 1964 г. у Менску) — гісторык. У 1993 г. скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Навуковы супрацоўнік Інстытуту гісторыі НАН Беларусі і па сумяшчальніцтве выдатны навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусі.

ВАЛЕРЫ ПАЗЬНЯКОЎ (нар. 1963 г. у Вялейцы) —

магчымасьць паглядзець на мінуўшчыну не чужымі, дрыжа. У нас доўга прывучалі, а сваімі вачыма” была своечасовая. У нас патрабаваў менавіта такіх кніг. Разьлічаная на шырокую аўдыторыю, калектыўная праца разышлася мільёнам накладам праз асобнае выданьне, публікацыі ў гаспадарчым “Звязда” і “Народная воля”.

Прайшло амаль дзесяць гадоў. Выдаўцы-складальнікі Зьміцер Санько і Іван Саверчанка вырашылі праўнівэрсытэт, гэтак зьявіліся цяперашнія “150 пытаньняў і адказаў”. Чытач папярэдняй кнігі пасталеў. У яго сапраўды зьявілася гісторыкаў нашмат болей за сотню пытаньняў. Нарэшце на іх адказаць. Кірунак кнігі застаўся ранейшым — раздавецтва навукова-асьветным. Сярод аўтараў кнігі — Уладзімер Арлоў, Алесь Жлутка, Уладзімер Казьбярук, Павал Лойка, Анатоль Сідарэвіч, Сяргей Тарасаў, Міхась Чарняўскі... Чытаецца зь цікавасьцю — гэта галоўнае.

Аддаючы належнае кнізе, хацелася б падыскутаваць зь некаторымі “пытаньнямі і адказамі”.

Вільня, на думку аўтараў кнігі, — старажытны горад крывічоў, Полацкага княства. Каб падмацаваць гэтае меркаваньне, суседняе Панямоньне на карце было “заселена” крывічамі, чаго папраўдзе ніколі не было. Гэтая тэрыторыя здавён была вобласьцю калянізацыі дрыгавічоў і належала да ўладаньняў тураўскіх князёў. Выглядае, што Вільня — “выспа” крывічоў сярод літвы і дрыгавічоў. Ці магло такое быць? Наўрад ці. Як і існаваньне астраўнога племені літвы ў тым жа Панямоньні. (Гэта старая гіпотэза Міколы Ермаловіча, якая зрабілася догматам для ягоных пасьлядоўнікаў.)

Шмат месца ў кнізе адведзена хрысьціянству і ўвогуле справам рэлігіі. Аўтары станоўча ацэньваюць каталіцтва, езуітаў, унію цэркваў. Слушна адзначаецца вялікі ўклад уніяцкай царквы ў беларускую культуру. Зробленая спроба па-новаму асьвятліць прыход хрысьціянства на Беларусь. Напрыклад, сьцьвярджаецца, што на пачатку XI стагодзьдзя была заснаваная Тураўская дыяцэзія, і была яна заходняга абраду (г.зн. каталіцкая). Гэтае палажэньне канкрэтызуецца так: “Першым біскупам у Тураве блізу 1010 году стаў немец Райнбэрн. <…> Пазьней Тураўскае біскупства згадваецца пад 1105 годам у Кіева-Пячэрскім патэрыку”. Тут трэба правільна

гісторыка. У 1985 ч. скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсытэту. Вядучы навуковы рэдактар выдавецтва “Беларуская зацьнаходзьдзя”.

расставіць акцэнты. У адной з рэдакцый Кіева-Пячэрскага патэрыка, складзенай у сярэдзіне XVII стагодзьдзя, захаваліся некаторыя дакумэнты Тураўскай япархіі. Сярод іх ёсьць грамата Ўладзімера Сьвятога пра заснаваньне япіскапства, якая мае дату “6513 год ад стварэньня сьвету”, г.зн. “1005/6 год ад Н.Х.”. Сапраўднасьць граматы, вядома, сумнеўная, але сам год заснаваньня катэдры ў Тураве дасьледнікі схільныя лічыць правільным. Ужо пасьля ў Тураве зьявіўся Райнбэрн, дый тое — толькі як духоўнік жонкі князя Сьвятаполка Акаянага — дачкі польскага князя Баляслава Сьмелага. У Польшчы Райнбэрн быў першым біскупам калабжэскім; далейшы яго лёс застаўся невядомым. Грунтоўных падставаў казаць пра Тураўскую каталіцкую дыяцэзію няма. Больш цікавыя зьвесткі пра хрысьціянства заходняга абраду далі вандроўнікі-варагі. Але ў гэтым выпадку трэба весьці размову не пра заходні і ўсходні шляхі хрысьціянства ў Беларусі, а паўночны (варагі) і паўднёвы (Бізантыя).
Каштоўныя дадаткі ў новым выданьні — матэрыялы пра смаленскія землі. Аўтары кнігі належным чынам адзначылі Кліма Смаляціча, Аўрамія Смаленскага, Меркурыя Смаленскага, князя Расьціслава Мсьціславіча. Толькі вось дапушчэньне, што каля 1130 году князь Расьціслаў заснаваў у Смаленску грэка-лацінска-славянскую акадэмію, носіць, хутчэй, легендарны характар. Яшчэ з галіны культуры: сучасная навука цьвёрда ўстанавіла, што сьвятыя Кірыла і Мяфод стварылі не кірыліцу, а глаголіцу.

Пераходзячы да часоў утварэньня Вялікага Княства Літоўскага, стваральнікі кнігі зноў прынялі канцэпцыю Міколы Ермаловіча пра старажытнае племя літву ў Беларускім Панямоньні і пра заваёву Навагрaдкам гэтай літвы. Відавочна, пабудовы Ермаловіча цалкам задавальняюць прыхільнікаў рамантычнага ўзнаўленьня мінуўшчыны Беларусі. Адсюль і сумневы ў сапраўднасьці акту Крэўскай уніі 1385 году, які, быццам бы, проста ліквідаваў Вялікае Княства, чаго “дапусьціць ня можна”. Адсюль і сьцьверджаньні, што Люблінская унія 1569 году — гэта толькі часовы вайскова-палітычны хаўрус.
У рэчышчы рамантычных пабудоваў знайшлі сваё месца і развагі Івана Саверчанкі пра Вялікае Княства Літоўскае як пра імпэрыю. На жаль, гэтае палажэньне не атрымала

абмеркаваньня сярод нашых навукоўцаў. Уяўляецца, што гэта думка шмат у чым справядлівая, дарма што пазьнейшая Рэч Паспалітая лічылася рэспублікаю. Сапраўды, нашая старажытная дзяржава мела многія рысы імпэрыі. Але мы ведаем, што кожная імпэрыя мусіць сканаць, і, прызнаючы за Беларуска-Літоўскім гаспадарствам статус імпэрыі, неабходна прызнаць, што ў ім стварыліся сілы міжнацыянальнай напружанасьці, якія ўрэшце і разарвалі яго. Між іншым, называючы прычыны скону Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага, аўтары кнігі вырашылі не акцэнтаваць увагі на міжнацыянальных супярэчнасьцях.

Вельмі важным было ўключэньне ў кнігу пытаньня пра “западноруссизм”. Аўтар адказу слушна вызначае ягоную рэакцыйную антыдэмакратычную сутнасьць, варожую беларускаму вызвольнаму руху, справядліва ставіць знак роўнасьці паміж тагачаснымі “западнорусами” і сёньняшнімі прыхільнікамі імпэрскае ідэалёгіі “единого русского народа” і “единой неделимой России”. Дзеля аб’ектыўнасьці, на нашу думку, трэ было адзначыць, што лягер прыхільнікаў “западноруссизма” ня быў маналітным, апошні складаўся з кансэрватыўнай і лібэральнай плыняў. На пачатку XX стагодзьдзя сярод “западнорусов” адбываецца ідэйнае разьмежаваньне. Зьміцер Даўгяла, Аляксей Сапуноў, Андрэй Сьнітка, Еўдакім Раманаў паступова станавіліся на беларускі нацыянальны грунт. Для ілюстрацыі можна прывесьці памятныя словы Андрэя Сьніткі, выказаныя ім на рэпліку аднаго расейскага “патрыёта” адносна “правінцыйнасьці” тутэйшых музэйных збораў: “Магчыма, гістарычныя знаходкі мінулага мясцовага паходжаньня ў чымсьці саступаюць музэйным рарытэтам Пецярбургу і Масквы, але яны прымушаюць біцца маё беларускае сэрца”. З другога боку, “западнорусы”-кансэрватары канчаткова перайшлі на пазыцыі расейскага імпэрскага шавінізму. Гэта добра характарызуюць словы сумнавядомага аўтара “Народнае манархіі” Івана Саланевіча, выказаныя ім пазьней у эміграцыі: “Я беларус на сто адсоткаў і магу ганарыцца тым, што мяне ўзгадавалі на Пушкіну, а не на якімсьці Янку Купалу; я маю пагарду да патрыятызмаў у павятовым маштабе і да нацыянальнага будаўніцтва з соймам у Менску ці ў Вільні”. У кантэксьце “западноруссизма” варта было б уключыць у кнігу і пытаньне

пра погляды краёўцаў-палянафілаў, прыхільнікаў аднаўленьня фэдэрацыйнай Рэчы Паспалітай.

Пабудова кнігі, форма падачы інфармацыі бездакорныя. Толькі ў адным выпадку некарэктна гучыць пытаньне: “Ці была БНР марыянэткавай дзяржавай?” Напрошваецца другое пытаньне: ці можна лічыць Беларускую Народную Рэспубліку дзяржавай у клясычным разуменьні гэтага слова? Нягледзячы на ўсю ідэалягічную аднастайнасьць, і ў савецкі час БНР вызначалі парознаму. Напрыклад, у шматтамовай “Беларускай Савецкай Энцыкляпэдыі” БНР характарызуецца як “*буржуазная рэспубліка* ва ўмовах акупацыі Беларусі нямецкімі войскамі”. У энцыкляпэдычным 5-томніку “Беларуская ССР” чытаем: БНР — “*спроба* (падкрэсьленьні нашы. — **У.Л**. і **В.П.**) нацыяналістычнай контрарэвалюцыі стварыць беларускую буржуазную дзяржаву”. У пачатку 1990-х гадоў атрымала права на жыцьцё іншая трактоўка: БНР — “*беларуская дзяржава*, абвешчаная ў 1918 годзе” (“Энцыклапедыя гісторыі Беларусі”. Менск, 1993). Дык як жа ў такім разе характарызаваць Беларускую Народную Рэспубліку, спытае чытач. Адкажам так: Беларуская Народная Рэспубліка як рэальная дзяржава з усімі клясычнымі атрыбутамі дзяржаўнасьці ў 1918 годзе, ва ўмовах пэрманэнтнай акупацыі, ня зьдзейсьнілася. Найбольшыя ейныя посьпехі бачныя на ніве разьвіцьця нацыянальнае культуры й асьветы, выдавецкае дзейнасьці. Вельмі сьціпла выглядаюць здабыткі БНР у справе арганізацыі нацыянальнага войска, арганізацыі фінансава-эканамічных інстытутаў. Пэўных вынікаў дасягнулі беларускія дзеячы ў дыпляматычнай чыннасьці. Але ж рэальна (дэ-юрэ) Беларусь нідзе не была прызнаная як суб’ект міжнароднага права. Астатняя Эўропа і ЗША тады, на жаль, засталіся глухімі да голасу беларускага народу. БНР можна ахарактарызаваць як палітычную інстытуцыю, утвораную ў 1918 годзе з арганізацыйных структураў першага агульнанацыянальнага форуму — Усебеларускага зьезду 1917 году, якая ставіла мэтаю дасягненьне рэальнай незалежнасьці Беларусі. З аб’ектыўных ды суб’ектыўных прычын беларуская нацыянальная эліта ня здолела тады зьдзейсьніць гэтую галоўную мэту вызвольнага руху, але яе лідэрамі была канчаткова сфармаваная ідэалёгія дзяржаўнае незалежнасьці Беларусі. “Права на незалежнасьць разумеецца само сабой, —

справядліва зазначаў Аляксандар Цьвікевіч. — Акт 25 Сакавіка не шукае для сябе апраўданьня... Ён сваім зьместам зацьвярджае правечнае права народаў Беларусі на волю... Праўда, дзякуючы Акту 25 сакавіка Беларусь ня стала незалежнаю дзяржавай... Ён стаў не законам, праведзеным у жыцьцё, але стаў законам беларускага жыцьця".

На нашую думку, не абгрунтаванае да канца ўключэньне ў кнігу ў якасьці станоўчага героя генэрала Станіслава Булак-Балаховіча. Постаць гэтая супярэчлівая. Паводле адных, напрыклад Ядвігіна Ш., генэрал увосень 1920 году рэальна тварыў беларускую дзяржаву пад бел-чырвона-белым штандарам. Паводле іншых, Балаховіч — "узурпатар і авантурнік" (Рэзалюцыя 1-й Усебеларускай палітычнай канфэрэнцыі ў Празе ў верасьні 1921 году). Езавітава і Душэўскага ён запэўніваў, што ён адданы беларускі патрыёт, а Савінкава і Мережкоўскага — што ён "расейскі праваслаўны чалавек, які ўсім сэрцам жадае змагацца за свабодную Расею". Няма падставаў абвінавачваць генэрала ў інсьпіраваньні пагромаў (былі выпадкі, калі Балаховіч судзіў пагромшчыкаў вайсковым судом; ён спрабаваў стварыць асобны "жыдоўскі швадрон"). Але што пагромамі ў Беларусі займалася "белае" афіцар'ё, якое ўваходзіла ў склад булакоўскіх фармаваньняў, — неаспрэчны факт. За гэта генэрал мусіць несьці адказнасьць.
З Булак-Балаховіча нельга рабіць нацыянальнага героя, але і ня варта мазаць яго адной толькі чорнай фарбай. Асоба гэтага дзеяча заслугоўвае сур'ёзнага аб'ектыўнага дасьледаваньня. Уключэньне ў выданьне інфармацыі пра мітрапаліта Мельхісэдэка слушнае і справядлівае. Чаму ў такім выпадку забыліся згадаць выбітных беларускіх ксяндзоў, што змагаліся за беларускую незалежнасьць? Тым больш што патрыятычна настроеныя беларускія каталіцкія сьвятары складалі шырокі грамадзка-палітычны рух, усіх іх нават не пералічыш, але, прынамсі, лідэраў Беларускае Хрысьціянскае Дэмакратыі Адама Станкевіча, закатаванага ў ГУЛАГу, і Вінцэнта Гадлеўскага, забітага СД, абмінаць было ня варта.
Як і мае быць у рамантычным творы, у кнізе шмат дзе адзначаецца вялікая роля беларускае мовы, якая, сапраўды, да пэўнага часу панавала ў дзяржаўным жыцьці ВКЛ. Аўтары здолелі знайсьці цікавыя прыклады яе высокага становішча.

Спрачацца можна хіба што з тым, што на беларускай мове пабачылі сьвет усе зборы законаў нашай дзяржавы, пачынаючы зь Вісьліцкага статуту 1432—1438 гадоў. Гэты статут сапраўды можна прачытаць на старабеларускай мове. Толькі гэта не арыгінал, а тагачасны пераклад з лаціны польскіх законаў. Увогуле, рэдактары і аўтары кнігі шмат увагі аддалі гісторыі беларускай мовы і літаратуры. І гэта зразумела, бо гісторыя нашай мовы — адна з асноўных частак нашай гісторыі ў цэлым. Грунтоўна і зь любоўю апрацаваная й мова кнігі, асабліва гістарычная тэрміналёгія. Напрыклад, замест звыклай ужо “кафлі” ўжываецца больш слушны тэрмін “кахля”, што больш адпавядае і нормам беларускай фанэтыкі, і тагачаснаму напісаньню. Тое, што цяпер паўсюдна пануе “кафля”, — недагляд нашых гісторыкаў і археолягаў, якія ў свой час пасьпяшаліся ўвесьці менавіта гэтую форму ў шырокі ўжытак. Выданьне багата аздоблена рэдкімі ілюстрацыямі і фатаздымкамі. Іканаграфічны шэраг выданьня — прадуманы і патрабавальны. Бадай упершыню тут грунтоўна распрацаваны ілюстрацыйны матэрыял да найноўшай гісторыі Беларусі. Асобнае пахвалы заслугоўвае паліграфія кнігі. Яе можна было б назваць бездакорнай, калі б кніга выйшла дзесяць гадоў назад таму. На сёньняшні дзень падобныя выданьні мусяць быць паўнакалёрнымі. Ня ўсё тут, праўда, залежыць ад выдаўцоў, ад іхных фінансавых магчымасьцяў. Можа, такім будзе наступнае выданьне, прыкладам, “200 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі”?

Не хацелася б сутыкаць ілбамі аўтараў “150 пытаньняў” і “Краіны Беларусі”, тым больш што рэдактарам абодвух выданьняў быў Зьміцер Санько. Безумоўна, апошняя кніга — гэта ўзор сапраўднай паліграфіі, да якога павінны цягнуцца ўсе астатнія. Але ж калі параўнаць кошты на друк гэтых выданьняў, дык задумаешся над тым, якая з кнігаў больш “народная”.

[image]
[image]

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн і майстраваньне **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Сяргей Балахонаў

“Архіпэляг постмадэрн”, або Аналізу халодная сьляза

Аналіз непазьбежна здаецца нечым халодным, нават калі яго робяць у глыбокім узрушэньні.
Томас Ман, “Доктар Фаўстус”

Хай дыхнуць халады, каб застыла сьлязіна...
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч,
“Блаславёная сям’я”

Мяне заўсёды дзівіла тое, як нашыя крытыкі заміж пастаноўкі сапраўды надзённых, актуальных пытаньняў да нашых жа літаратараў абсмоктваюць уяўныя, вымудраваныя праблемы. Вось у артыкуле магілёўскага выкладчыка філязофіі Аляксея Бацюкова “Штурханьне ў бок” (ARCHE, 2002, №2) гаворыцца, што сёньня адбываецца штурханьне ў бок беларускага літаратурнага працэсу з прычыны неразьбярыхі ў асноўных панятках і катэгорыях, якімі бяз ладу паслугоўваюцца крытыкі. Шаноўны аўтар шчыра дзівуецца, *чаму* нехта, гаворачы пра постмадэрнізм, не дае дакладных дэфініцыяў гэнага панятку, а абмяжоўваецца толькі агульнымі, хай сабе й патрыятычнымі,

фразамі пра тое, што *“сапраўды постмадэрнісцкія творы ў Беларусі, безумоўна, ёсьць…”* Прыточаная сп. Бацюковым проказь узятая з майго тэксту “Зноў пра кляты постмадэрнізм”. На ягонай падставе аўтар робіць высновы аб тым, што *“ўзровень філязофскае адукацыі пэўнай часткі нашае творчае эліты выклікае некаторы сумнеў”* і *“падобнае лёгкае абыходжаньне з тэрмінамі… выклікае… трывогу”*. Абурэньне ў аўтара выклікае і тое, што я ў пераліку імёнаў творцаў нібыта не адрозьніў мадэрністаў і постмадэрністаў. Мушу адцеміць, што ў той маёй караценькай рэпліцы на крытычныя тэксты Данілы Жукоўскага ў мяне не было амбіцыі рабіць дасьледзіны беларускай літаратуры канца ХХ стагодзьдзя. Пакідаю гэтую пачэсную працу для іншых. Але цяпер выпадае элемэнтарна тлумачыцца. Зыгнараваць падобнае *штурханьне пад дых* з боку сп. Бацюкова нельга.

Маё *лёгкае-лёгкае* абыходжаньне з паняткам “постмадэрнізм” вынікае адно з таго, што я ўжо даўненька ўсьвядоміў для сябе істу постмадэрнага мысьленьня, істу — уласна для мяне — постмадэрнізму ў літаратуры. Мне бяз розьніцы, можна даць азначэньне постмадэрнізму ў адзін радок ці нельга. Гэта, знаеце, як з каханьнем — калі закаханы, дык да лямпачкі праблемы з дэфініцыяй дадзенага панятку. Аднак відочна, што гэткі пасыл не задаволіць А. Бацюкова, а ў Д. Жукоўскага выкліча хвалю эмоцыяў, пацьвярджаючы яго тэзу пра новага творцу, які *“пачуваецца свабодным, у тым ліку ад абавязку заваёўваць аўдыторыю”*.

Пры ўсіх спрэчках пра постмадэрную сытуацыю можна ўсё-такі сказаць тое, што б характарызавала яе сэнсавую напоўненасьць. Дык жа, постмадэрная сытуацыя ёсьць, першай чарадою, сытуацыяй сьвядомаснай. Аднак разгортваецца яна ня ў масавай сьвядомасьці, а ў сьвядомасьці *пэўных* носьбітаў *пэўнага кшталту* пераканаьняў, якія (пераканаьні) не дамінуюць у рэчаісным жыцьці сучасных грамадзтваў. Як сваім часам Валянцін Акудовіч выславіўся пра *“Архіпэляг Беларусь”*, так сёньня мы мусім гаварыць пра *“Архіпэляг постмадэрн”*. Насамрэч, бо маем наяве выспачкі ПМ-сьвядомасьці ў моры сьвядомасьці традыцыйнай, якая вызнае адназначнасьць існаваньня строга ўцэнтраваных арыенціраў, непахісных аўтарытэтаў, адзінай абсалютовай праўды. Тым часам для ПМ-сьвядомасьці ёсьць уласьцівай страта ўсялякае цэнтралізаванае

арыентацыі, усялякіх аўтарытэтаў, усьведамленьне множнасьці (разнастайнасьці) праўды, разьбітасьці (расколатасьці) сьвету, зыходзячы з гледзішча кожнага асобнага чалавека. Навакольле такім парадкам паўстае не як сьветалад, а як сьветабязладзьдзе, хаос. Адпаведна носьбіты ПМ-сьвядомасьці і прадукуюць тэксты, якія адзначым як *постмадэрнісцкія*. Прыкметы ПМ-тэксту. (1) ПМ-тэкст шматслойны. Шматслойнасьць закліканая даць *праўду* кожнаму чытачу згодна з роўнем яго падрыхтаванасьці, адукаванасьці, абазнанасьці, эрудыцыі. Уявеце сабе вялізны торт, які смачны для ўсіх, але толькі некаторыя, зьеўшы кавалачак, могуць пасьля назваць усе ягоныя складнікі. Із шматслойнасьцю шчыльна зьнітавана (2) каляжнасьць, мазаічнасьць, цытатнасьць, інтэртэкстуальнасьць ПМ-тэксту. Гэта вынікае з тэзы аб вычарпанасьці мажлівасьцяў вымудраць новыя сюжэты і пераканнасьці ў патрэбе карыстацца (гуляць) традыцыйным сюжэтным наборам зь неўнікнёнымі (хай і не заўсёды яўнымі) спасылкамі на папярэднікаў. Нездарма Ўмбэрта Эка адзначыў, што *“кнігі прамаўляюць толькі пра іншыя кнігі, складаючыся зь іншых кніг”. Гульнёвы момант* падкрэсьлівае перавагу ў такіх тэкстах (3) парадыйнага спосабу апавяданьня, валадараньня адметнага кшталту іроніі. Да ўсяго трэба дадаць яшчэ адзін істотны момант: (4) унутры ПМ-тэксту патэнцыйна могуць супадаць рэальнае і віртуальнае, цяпершчына на роўных правох суседзіць (пераплятацца) зь (не)магчымай мінуўшчынай ды (не)ймавернай будучыняй, што зьяўляецца складовым элемэнтам *вялікае постмадэрнісцкае гульні*.

Вызначэньне таго, шматслойны тэкст ці нешматслойны, ёсьць справаю няўдзячнаю. Вось, напрыклад, тэксты Прафэсара Каркарана, у прыватнасьці “Кіно і немцы”. З аднаго боку, звычайная калекцыя словаў. Зь іншага, тамака знаходзім спасылкі на “Энэіду навыварат”, “Шляхціца Завальню”, “Гамлета”, “Мяне няма” Валянціна Акудовіча, “З нататніка, адшуканага ў кішэні” Хуліё Картасара, “Птушкі на цернях” К. Макалаў ды інш. Гэта толькі адзін маленечкі прыклад, а іх жа мноства! Добра, калі ад цябе нічога не хаваюць. Напрыклад, Юры Пацюпа ў “Юрлівых санэтах” робіць шмат рэальных, а не віртуальных зносак, папярэджваючы чытача пра тое, адкуль узяты кавалачкі, адкуль вынікаюць правобразы яго вершаў.

Андрэй Хадановіч — дарма Максім Шчур так на яго ўзьюшыўся — такога сабе не дазваляе, але ж стварае каляжныя тэксты, дзе нават малападрыхтаваны чытач адчуе нештачка знаёмае: Міцкевіч, Купала, Колас, Пушкін etc. Верагодна, гэткі дэмакратычны, калі не сказаць папулісцкі, постмадэрнізм Хадановіча і вабіць чытача й слухача.
Кожны з нашых постмадэрністаў па-рознаму тарнуе ў тэкстах цытатнасьць і каляжнасьць. І гэта станоўчае зьявішча. Толькі сацыялістычны рэалізм мог быць шэрым і аднастайным, калі цяжка было разабраць з ходу, што за аўтар перад табою, бо ўсе як адзін пісалі пра калгас ці фабрыку, а таксама пра мудрых партыйных функцыянэраў, што зьнянацку, прыпадобнена трансцэндэнтнай сіле, вырашалі галоўную ў творы праблему. Беларускія постмадэрністы, дарэчы, з ахвотаю бяруцца за дэканструкцыю спадчыны сацарту ды агулам савецка-імпэрскіх мітаў у літаратуры пэрыяду БССР. Аповесьць Валеркі Булгакава “Правільны выбар” ня тое каб была проста накрыпаная, але цалкам выбудаваная на савецкіх мітах і штампах пра партызанку ў Беларусі часоў другое сьветнае вайны. Аўтар *правільна выбраў* усё самае зашмальцаванае і абсурднае, што тыражавалася афіцыёзнымі чытанкамі і слоўнікамі савецкага варыянту беларускай мовы: *“на лобе ўпаўнаважанага з цэнтра праступілі чуць заўважныя кропелькі поту”, “гэта жалкае падабенства чалавека гатова было пайсці на ўсё, абы захаваць сваё нікчэмнае жыццё”, “ляснyя салдаты займаліся сваімі бягучымі справамі”, “гэтая падзея ніяк не паўплывала на выкананне задання разведчыкам”, “чырвоны водбліск ад недакурка заблішчэў у руках воіна”, “камандзір асобага батальёна СС “Відэргебаў” Роберт Кліма быў паталагічным забойцам”*. Нешта падобнае мы назіраем у расейскамоўных вершаванках А. Хадановіча з цыклу “Песни белорусских партизан”, дзе савецкі ідэалягічны хлуд ня проста паказаны ў поўнай сваёй немарасьці, але ўплецены ў вяночак красачак заходняе мас-культуры:

Ой, Тарзаны, лесные Тарзаны!
Хай жыве обезьяна Кинг-Конг!
Уходили в поход партизаны,
уходили в далекий Гонконг![7]
Ігар Бабкоў, у адрозьненьне ад згаданых творцаў, удала

эксплюатуе беларускія нацыяналістычныя міты, творачы заразом і зусім сьвежанькія. У сутонных лябірынтах раману “Адам Клакоцкі і ягоныя цені” мы не сустрэнем хіба што протамасона Францішка Скарыны, а так тутака і *“сыны крывіцкага народнага генія”* Адам Міцкевіч з Тодарам Дастаеўскім, і *беларускія* філяматы зь філярэтамі ды паўстанцы з эмігрантамі, што сьняць сны *пра адроджаную Польшчу*, а думаюць *пра Беларусь*, горад-прывід *Менск-Мінск-Mińsk*. Той жа зварот да нашай нацыяналістычнай міталёгіі адчуваем у “Лістох да беларускага сябра” Міхася Баярына.

Ўсё ж я любіў айчыну, ды нейкай дзіўнай любоўю.
Розум не асягне яе і ня зьменшыць час.
Мне падабаліся ў пушчах густых сумленныя ловы,
Сьнег і гучаньне мовы, й вялікі літоўскі князь.
Так, усё гэта мёртва, як вы мне тады сказалі.
Я у такім жа стане зараз, як і яна.

Наратар, занураны ў Аід-Тартар, зьвяртаецца да сваёй каханкі, прамаўляючы добра знаёмыя *сьвядомым беларусам* клішэ, бязьлітасна пераплятаючы іх з вобразамі клясычных мітаў. Маладзейшыя постмадэрністы ня грэбуюць ткнуць чытача носам у свой тэкст, мовячы: *“Гэта, мой любы чытэльніку, раман у дэталях!”*. “Рэканструкцыя неба” Вольгі Гапеевай — добры прыклад таму — калекцыянуе псыхалягічныя, сацыяльныя, сэксуальныя ды іншыя комплексы сучаснага беларускага грамадзтва: *“Нельга было не заўважыць, што большасьць зь іх звыкліся з маёй прысутнасьцю, а некаторыя нават спрабавалі заляцацца (ня столькі да мяне, колькі да маіх грудак), што тлумачылася дзіцячымі перажываньнямі, якія глыбока заселі ў памяці і рабілі зь мяне гэткую “Еву ў шкарпэтках”*.

Асаблівая іронія, як адзначалася, уласна, і робіць тэкст постмадэрнісцкім. Калі, да прыкладу, прыраўнаць структуру раманаў “Імя ружы” Ўмбэрта Экі і “Пляц Волі” Алеся Пашкевіча, то ў абодвух разох мы спаткаем цэлыя старонкі цытаваных гістарычных крыніцаў. Але італьянскі пісьменьнік напоўніў іх *усьмешкаю*, а беларускі — нават і намёку на *яе* магчымасьць не пакінуў.

І беларускія постмадэрністы ўсьміхаюцца на ўсе 33 зубы. Калі, прыкладам, Адам Глёбус (літаратар, які знаходзіцца на

перакрыжаваньні колькіх творчых напрамкаў) цалкам сур'ёзна, працягваючы традыцыі Басё, піша:

На веях маіх
Зьнікае сонечны пыл,
Вецер у хмарах,
то Валерка Булгакаў зьлёгку іранізуе як з традыцыі японскага вершаскладаньня, гэтак і з моды беларускіх літаратараў на яе перайманьне:

цэнтар гораду нічый
за домам горад
досыць тут жыць
мая баба,
а Прафэсар Каркаран папросту кпіць з тых акалічнасьцяў, прэзэнтуючы пародыю на пародыю:

Алесь Хацяновіч нарадзіўся
еў піў сраў сцаў
так і памёр незразумелым.
На жаль, многія крытыкі бываюць няздатныя ўспрыняць і зразумець ПМ-іронію, а ўчастых нават заўважыць. Пагатоў што некаторыя аўтары прымудраюцца яе дэманстрацыйна прыхоўваць. У *"Аповедзе №3"* Андрэя Дынька іронія іскрыцца ўжо ў першых абзацах, слоўная гама якіх нібыта мкнецца перадаць музыку Расіні, што гучыць дзякуючы дзявочаму голасу. Італьянскі сьпеў скаланае вечаровую ідылію *"найдальшага кутка славянскай Эўропы"*, маляўнічыя краявіды якога перацятыя *"палосамі дроту на дзяржаўнай граніцы"*. Італьянскі сьпеў бянтэжыць аўтахтонаў і дачасьнікаў зь ліку памежнае варты. Вонкава сур'ёзная хада аповеду пачынае захлынацца, быццам сьпявак, што ўбачыў у слухача зь першага шэрагу добранькі лімон: *"Опэрныя арыі тут, у ціхім краі, дзе, такое ўражаньне, ад часоў Траянавых — ніхто не сьпяваў! Гэта было ўсё адно што выйсьці на плошчу, стаць між царквой, касьцёлам і домам культуры ды... У пагранічнікаў мяняўся нарад на пасту, і ўсе пяцёра, нібы ваўкі, павярнулі галовы на голас. "Пяе, блядзь", — сказаў узброены да зубоў сэржант, камандзір заступаючага нараду, пачухаўся, плюнуў, выцяг бінокль, а камандзір здаючага нараду — начнога бачаньня, паглядзелі на*

вёску, і другі пацьвердзіў: “Пяе, блядзь”. Закаханых жаўнераў пабольшала на пяць”. Аўтар густа іранізуе і далей: у інтымную атмасфэру знаёмства наратара зь пяюхаю, калі чытач чакае чагось *маланкава эратычнага*, зьнянацку ўтыкаюцца прафэсійныя філялягічныя развагі з практычнай фанэтыкі: “*Гэты глыбокі акцэнт. З чаго ён утвараецца? Можа, глыбінныя галосныя задняга раду? закрытае “о”, спэцыфічнае “э”, блізкае ў адкрытых безнаціскных складах да “ы”?”*. Між іншага, нешта падобнае назіраем у Прафэсара Каркарана:

Які гэта цуд!
Сёньня ўначы я пабачыла,
Як Алесь глядзеў на мяне.
Глядзеў на мяне, а думаў пра іншага.
Пра Вітгенштайна.

А.Дынько, *преподнося* тутэйшую сагу пра Фарсайтаў — у сутнасьці сваёй надзвычай трагічную, — не адыходзіць ад постмадэрнісцкіх прыхваткаў, у т. л. і ад парадыяваньня. У сцэне спробы арышту супрацоўнікамі МГБ *“жаны баявога партызана”* Тэклі Фішбэйн яскравая пародыя на высокі стыль: *“І атрымалі ад яе па ядрах, і сагнуліся, каўтаючы ратамі паветра, і начальнік, і ягоны яфрэйтар”*. Ацаніць увесь цымус гэтага моманту могуць, здаецца, толькі чытачы-мужчыны, што на эмпірычным роўні знаёмыя з вытном ніжэй пасу. Сьлёзы скрозь сьмех — праўдзівы постмадэрнізм.

У рамане І.Бабкова іронія распарадкавана ня роўнай мераю. Але ўжо той факт, што галоўным героем твору ёсьць *сон (сон Беларусі і сон аб Беларусі)*, задае твору адпаведную танальнасьць. Жыцьцяпіс фармальнай цэнтральнай постаці твору Яна Адама Марыі Клакоцкага — ПМ-пародыя на размаітыя біяграфічныя зацемкі пра культурных герояў Беларусі XIX стагодзьдзя. Аўтар парадаксальна абыгрывае сытуацыю супярэчлівасьці гістарычных крыніц, зводзячы гэткую да абсурду: *“...Ва ўспамінах паўстанцаў апісваецца гісторыя, як ён (Клакоцкі — **С.Б.**) загітаваў цэлы эскадрон казакаў (разам з коньмі), якія заснулі і прапусьцілі рэшткі інсургентаў у кірунку Аўстрыйскае мяжы (праўда, паводле расейскіх рапартаў, заснулі менавіта інсургенты і ўсе да аднаго былі адпраўлены ў кірунку іншай мяжы — расейска-японскай)”*.

Вольга Гапеева не прамінула спарадыяваць беларускую мужчынскую літаратуру апошняга пятнаццацігодзьдзя з сваім фаляцэнтрызмам. Што праўда, маладой пісьменьніцы ня стала адвагі ўзьняць на п'едэстал вагіну, таму найчасьцейшымі ў "Рэканструкцыі неба" ёсьць прыгадкі грудзей, а дакладней грудак наратаркі: *"Сонца сядала не куды-небудзь, а за левы ўзгорак ейных грудак... Смочку так і расьпірала ад сваёй значнасьці і ганарлівасьці. Яна ведала: яе абавязкова нехта пацалуе, лізьне, папесьціць, а мо нават і пакусае"*.
Постмадэрнісцкі прыём сумяшчэньня-атаесамленьня аб'ектаў, зьлякалізаваных у рэальным і віртуальным сьветах, абыгрываньне межаў між рэчаісным сьветам і сьветам тэксту плённа выкарыстоўваецца беларускімі постмадэрністамі. Яскравым прыкладам таго стаўся раман І.Бабкова. На плашчыні тэксту ў адным карагодзе кружаць прэзыдэнт міжваеннай БНР Вацлаў Ластоўскі, беларуская паваенная парашутыстка-дывэрсантка Магдачка, нямецкі філёзаф Марцін Гайдэгер, беларускі мысьляр, што любіць Мінск за яго далікатную адсутнасьць, Валянцін А[кудовіч] et cetera. Вобразы раману, як у сапраўдным сьне, перацякаюць з аднаго ў другі, перамяняюцца, ператвараюцца, "мэтамарфозяцца".
Часава-прасторавы кактэйль — часты госьць у вершах Андрэя Хадановіча. Адна толькі назва "Выбраныя месцы зь ліставаньня Івана Жахлівага і Н.К.Крупскай" чагось вартая. Перапіска разначасавых герояў расейскай гісторыі не прывязаная да расейскага кантэксту, таму зусім ня дзіўна, што Надзея Крупская выбачаецца ў свайго аўгусьцейшага Brieffreund'а:

Перапрашаю найперш за колькасьць памылак:
кампутар Покуль ня можа, на жаль, правапіс рэдагаваць
(Артаграфічны кантроль у маім "адзінаццатым
вордзе" Для "тарашкевіцы" ёсьць, а для "наркамаўкі"
— не!)...
У апошніх публікацыях ("Альбы і сырвэнты") А.Хадановіч ня здраджвае гэтым прынцыпам. Яскравым прыкладам таго ж зьявішча — некаторыя вершы зь "Юрлівых санэтаў" Юр'я Пацюпы. У санэце "Дзікая ружа" француз XVIII стагодзьдзя маркіз дэ Сад займаецца ўкладаньнем рэестру *"сухіх мэтафізычных экзэкуцый"*, зьвяртаючы ўвагу на згадкі сучасьніка зь Беларусі япіскапа Георгія Каніскага, а таксама на

мэмуары наступніка (беларуса XIX стагодзьдзя) Альгерда Абуховіча, дзе ёсьцека цікавыя яму іскрынкі. Захапленьню сусьветназнанага вычварэнца няма межаў, і ён выслаўляе яго радком з хрэстаматыйнага верша беларуса XX стагодзьдзя: *“О, Беларусь, мая шыпшына!..”* Тое самае перапляценьне адзначаем на старонках “Нашай Нівы” апошніх гадоў у шэрагу публікацыяў пад рубрыкай “Сто мяхоў беларускай гісторыі” (аўтары — А.Скурко, А.Гардзіенка, Р.Равяка, У.Сьцебурака ды інш.). У тэкстах М.Баярына яно яшчэ больш ускладняецца за кошт лексычнай інвазіі старабеларушчыны і наватвораў.

Аляксей Бацюкоў пакеплівае з спробаў агледзець постмадэрнісцкія прыёмы ў даўнейшым нашым пісьменстве. Такое стаўленьне вынікае зь літаральнага разуменьня паняцьця постмадэрнізм (пасьля + сучаснасьць). Між тым постмадэрнізм, сутнасна будучы катэгорыяй духовай, ёсьць зьявішчам, не зафіксаваным у часе, кожная эпоха мае свой постмадэрнізм. Міхась Тычына, якога папікае А.Бацюкоў, безумоўна троху пагарачыўся, убачыўшы постмадэрнізм у Скарыны й Гусоўскага. Аднае цытатнасьці, як было адзначана, для гэтага малавата. Дзе ў прадмовах Скарыны льга абачыць усьмешку? А ў Гусоўскага? Іншая рэч Сімяон Полацкі. Ня ўся яго творчасьць, але паасобныя творы. Традыцыйна яго “віршы” лічацца маралізатарска-дыдактычнымі, дзе няма месца зубаскальству. Між тым тэксты “Блуднік”, “Асязаніе”, “Паслушлівыя жабы”, “Піянства” ды інш. цьвердзяць пра адваротнае. А ананімныя “Прамова Мялешкі” і “Ліст да Абуховіча”? Ці ўздатнімся мы хоць калі дарэшты зразумець іхны сьмех? Дасьледзіны апошніх гадоў схіляюць да мажлівасьці ўлучаць у шэрагі постмадэрнісцкіх тэксты Яна Баршчэўскага, часткова Ф.Багушэвіча (“Кепска будзе!” як кароткая гісторыя Беларусі), В.Ластоўскага (найперш “Лябірынты”), У.Караткевіча (“Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Ладзьдзя роспачы”). Калі мы працягваць адмаўляць гэта, то спрэчкі пра наш постмадэрнізм ніколі ня скончацца, а новае выданьне менскай энцыкляпэдыі “Постмодернизм” выйдзе з кіпаю інфармацыі аб расейцах, зь беларусаў жа ўзгадаюць зноў адно В.Акудовіча. Дзеля гэтага нам трэба ня толькі дыскутаваць міжсобку, але і брацца распрацоўваць — дзялянку за дзялянкай — усё тое, што яшчэ зеўрае сваёй *недалікатнай*

адсутнасьцю.
Сам А.Бацюкоў наракае, што ў нас крытыкі звычайна пішуць *“выключна навукова, безэмацыйна, рацыянальна”*, што такім чынам выходзіць *“нейкае абезжыцьцёўленьне твору, у той час як літаратура мае жыцьцёвую, экзыстэнцыйную аснову”*. Дык напачатку ж А.Бацюкоў ганіў кагосьцейкі за адваротнае, то бок за творчы, эмацыйны падыход да сучаснай беларускай літаратуры. Як гэта патлумачыць, мо правакацыйнасьцю аўтаравых замераў? Тады гэта здорава, бо ідзе пашырэньне дыскурсу беларускага постмадэрнізму, якога ўжо, здаецца, пры жыцьці нашага пакаленьня немагчыма будзе ні разьбіць, ні спыніць, ні стрымаць. Халодным ці гарачым будзе (ці падасца) кожны чарговы літаратурны аналіз, ня так істотна. Галоўнае — каб Беларусь, не зважаючы на ўвесь наш постмадэрнізм, заўсягды была для нас і ідэалам, і цэнтрам, і аўтарытэтам.

Гомель

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/06/28
[image]

Памяці Аляксандра Крывенкі

...**В**осьмага красавіка мне каторы раз за апошнія пару гадоў давялося быць у Кіеве. Усю ноч падаў сьнег, і на дзявяты пэрон кіеўскага вакзалу цягнік прыбыў засьнежаны і мокры. Праваднічка, зь якой ехаў ужо ня першы раз, вясковая дзеўка з фарбаванымі валасамі, аднекуль з Заходняй Беларусі, жалілася: празь які тыдзень трэба адмыкаць у вагоне на лета вокны, а тутака сьцюжа й непагадзь. Праваднічкі бываюць бяз дай прычыны такія гаваркія.

Восьмага красавіка быў аўторак, звычайны будны дзень. Магчыма, ад гэтай слаты на Хрышчаціку было троху менш людзей, як звычайна. Мокры сьнег запавольваў іх рух. У нейкі момант я таксама пацярпеў ад непагоды: на лаўкі каля помніка Панікоўскаму на вуліцы Праразной не было як усесьціся. Яны былі заваленыя сьнегам уперамежку з вадой. На Хрышчаціку я купіў плаўленых сыркоў і пайшоў іх есьці ў Інстытут філязофіі, што на Трохсьвяціцельскай. У гастраноме, апрача сыркоў, вока зачапілася на багаты асартымэнт рыбнай прадукцыі берасьцейскай фірмы “Санта-Брэмар”. Вечар рана завечарэў. Гэты дзень засядзе ў памяці зь іншай прычыны. Акурат восьмага красавіка недзе за сорак кілямэтраў да Кіева ў аўтамабільнай аварыі забіўся Аляксандар (Сашко) Крывенка. Тое, што ў Беларусі яго імя бадай нікому невядома, не прымяншае маштабу й калярыту гэтай постаці. Журналіст,

культурны й палітычны дзяяч, ён за якіясьці пятнаццаць гадоў свайго творчага жыцьця выдаваў “модны”, глянцавы часопіс “ПіК” (Політика і Культура), масавую і інтэлектуальную газэты “Поступ” і “Постпоступ”, займаўся рознымі тэлевізійнымі і радыёвымі праектамі (сьмерць яго засьпела на пасадзе кіраўніка “Громадського радіо”), не цураўся палітыкі й грамадзкай дзейнасьці.
Не сказаць, што былі добра знаёмыя з Сашком. Так, пару разоў сустракаліся ў Кіеве й Менску, пілі гарбату, гаварылі. Сашко жыва цікавіўся беларускім жыцьцём, распытваў у мяне розныя яго сакрэцікі. Апошні раз мы бачыліся ў Менску летась. 12 верасьня ён прыехаў да нас начным цягніком. Мы сядзелі ў летняй кавярні на Плошчы Перамогі, папівалі нешта, дыскутавалі. Потым ён пайшоў купляць беларускія кніжкі і накупляў іх цэлую торбу — Быкава, Глёбуса, Лукашука...
Нягледзячы на сваю культурную й палітычную вагу, Сашко трымаўся на роўных, не ствараў бар’ераў, не выпінаўся і хацеў падасца лепшым, чым ён насамрэч быў. Жывы чалавек у жывым сьвеце.
Пераглядаю яго леташнія лісты. 9 жніўня: “Ну і де ви, брати? У Київі вас не чути...” Яго апошні кароткі ліст прыйшоў сёлета 6 студзеня: “З православними привітами”.
Бывай, брацітка. Зямелька табе пухам.

Валер Булгакаў

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (26) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/06/28**
[image]